ЭЛЕКТРОННАЯ

ХРЭСТАМАТЫЯ

па вучэбным прадмеце

«Беларуская літаратура»

11

Змест

Янка Брыль.....3
Апавяданне «Галя».....3
Лірычная мініяцюра «Загадка».....17
Лірычная мініяцюра «Трохі пра вечнае».....18
Міхась Стральцоў.....21
Апавяданне «Сена на асфальце».....21
Ліст першы.....21
Дзядзька Ігнат.....23
Ліст другі.....26
Заўтра футбол.....28
Ліст трэці.....30
Пара касавіцы.....31
Апавяданне «На чацвёртым годзе вайны».....33
Апавяданне «Смаленне вепрука».....38
Іван Чыгрынаў.....44
Апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы».....44
Апавяданне «У ціхім тумане».....50
Раман «Вяртанне да віны».....57
I.....57
II.....59
III.....65
IV.....77
V.....92
VI.....107
VII.....110
VIII.....132
X.....148
XI.....151
XII.....155
XIII.....159
XIV.....166
XV.....167
XVI.....181
XVII.....193
XVIII.....202
XIX.....209
XX.....210
XXI.....213
XXII.....215
XXIII.....217
XXIV.....227
XXV.....230
Іван Навуменка.....233
Апавяданне «Сямнаццатай вясной».....233
Апавяданне «Хлопцы самай вялікай вайны».....240
Аповесць «Вір».....246

Георгій Марчук.....277
Навела «Канон Гарыні».....277
Навела «Канон Маці».....279
Навела «Канон Школе».....281
Янка Сіпакоў.....284
Аповесць «Кулак».....284
Алесь Андрэевіч Марціновіч.....313
Апавяданне «“Гетман-кларнет” на службе ў муз».....313

Янка Брыль

Апавяданне «Галя»

Калісьці, пры панах, гэта быў хутар. З шасцю дзесяцінамі добрага поля адразу за садам, з новым вялікім гумном, двума хлявамі і малой старасвецкай хатай. Без шчыта яна, наўкруг накрытая саломай, зялёнай ад моху, нізка насунутай на малыя прыплюшчаныя вокны. Так і глядзела на свет, як сам гаспадар, заўсёды зажмураны Данька, стары Хамёнак, бязлобая галава якога нібы ўрасла ў зімовую шапку – аблезлы, раней, калі верыць старому, гарадскі каракулевы каўпак.

Цяпер гэты каўпак недзеяшчэ ўсё валяецца на гарышчы, а сам Данька Хамёнак ляжыць на ўзгорку пад хвойкамі і муравой. Ад хутара застаўся толькі сад, скрыпучы журавель над зрубам студні і тая самая хата.

У хаце ад усёй Хамёнкавай сям'і ўцалела толькі нявестка Галя з дзецьмі, хлопцам і дзяўчынкай.

Спакойны жнівеньскі вечар. Сонца зайшло. Галін хлопец, падлетак Антось, пайшоў у поле да малатарні. На верхавіне старой ліпы за агародам пагасла чырвань на лісці; шпакі ўзняліся з голля і панеслі свой кірмаш у вёску. Пад паветкай за сенцамі, аддаўшы вячэрні ўдой, лягла на свежым подсціле карова. У хаце за сталом сядзіць чарнявая Сонечка, на поўны рот запіваючы хлеб сыradоем. Тонкія загарэлыя ножкі яе, як і ва ўсіх пастушкоў, папораны ржышчам. Сонечка памыла іх каля студні халоднай вадой, і ногі садзеюць да самых каленак. Яна то пацірае іх адна аб адну, то проста стрыжэ імі пад высокай лавай. Сонечка хоча гаварыць.

– Мамка, – кажа яна, – а сёння Лёня Сцяпанаў смяяўся з мяне. Ты, кажа, пані. Ты, кажа, хутаранка. А чаму? Чаму ён смяецца?

Галя стаіць, прыпёршыся да шафкі з посудам, амаль прысеўшы на яе. Над галавою Галі, на сцяне – стары гадзіннік. На запыленым цыферблаце яго напісана не нашымі літарамі нейкае слова. За ўсе гады, пакуль гадзіннік тут вісіць, ніхто нават не пацікавіўся, што яно азначае. Наогул па гадзінніку разбіраліся толькі мужчыны і Галя. Свякруха пражыла свае семдзесят год, ні разу не падумаўшы аб тым, якое сёння чысло... Даўжэйшая стрэлка гадзінніка адламалася яшчэ ў вайну, кароткая стаіць на адным месцы тыдні ўжо, мусіць, са тры. Жніво. Галіны рукі, загарэлыя да лакцёў, гудуць ад стомы. Галя яшчэ ўсё як быццам не дома. У памяці бясконцым ланцужком ідуць адзін за адным вузлы перавяслаў, закручаныя спрытнымі пальцамі, адзін за адным кладуцца на пожні цяжкія снапы. У вушах яшчэ цокат жняяркі, паасобныя словы, абрыўкі песень, смех, шум збажыны і шоргат іржышча...

– Мамка, чаму?

Галя прыпамінае словы дачкі.

– Чаму? – перапытала яна, яшчэ не гатовая да адказу. І Сонечка адказвае на пытанне сама.

– Мы, кажа, у вёсцы жывём, – гаворыць яна, жуючы, – а вы на хутары. І дзед твой быў пан, і тата пан, і ты таксама паненка.

– А ты скажы яму, што ён яшчэ дурны, – гаворыць Галя нейкім млявым, бяссільным ад стомы голасам.

Яна хацела гаварыць яшчэ нешта, але раптам змоўкла. Слых яе зноў улавіў той самы, на момант згублены гул. У хаце, пад старым гадзіннікам зноў засталася яна не ўся, нібы не ўся яшчэ вярнулася з поля.

– Ты еш, дачушка. Еш ды лажыся. Годзе.

– А ты куды пойдзеш?

– Я хутка прыйду.

Галя стаіць за вішняком, успёршыся рукамі і грудзьмі на шэрую жэрдку старой агароджы. Галя глядзіць у поле. Ногі ў церпкай, халоднай расе, вочы – недзе далёка, далёка... У пшаніцы, якая даходзіць да самага вішняку, сакочуць конікі. Далей недзе – лён стаіць у пучков; таксама многа, многа льну. Яшчэ ўсё цёплы, не астыў ад спёкі, пахне, – смачна пахне, нібы прысмажаны алей... А над пшаніцай, над лёнам, над хлебнай, спакойнай зямлёй – высока ў небе поўны, усім задаволены месяц.

Ды ўсё гэта так сабе, усё гэта – дзеля таго, каб далёка над полем разносіўся гул, грукатанне трактара. Там, дзе ён, дзе сядзіць за рулём той адзіны ва ўсім гэтым свеце, каму ад болю сэрца, ад цяжкай журбы хочацца крыкнуць:

– Ся-ро-жа-а! Ся-рож-ка-а!!

Ён даўно ўжо Сяргей, а не Сярожа, ён даўно ўжо забыўся, – відаць, выцер з памяці ўсё, што калісьці было. А ты крычы, ты ўспамінай, раздзірай сваю душу, дурніца, хоць да крыві...

А то ж было яно, было, калі ён быў і для яе Сярожка. Ох, як даўно гэта было! Не, не даўно, здаецца, толькі ўчора.

Галя толькі яшчэ на дзеўку бралася, калі ў іх вёску, Гаросіцу, прыйшлі з Касцюкоў краўцы-кажушнікі, два здаравенныя панурыя браты. Абодва ў доўгіх кажухах, нібы ў доказ таго, што не заўсёды шавец ходзіць без ботаў, абодва ў вялізных шапках, нібы па цэлай авечцы ў іх на галаве, абодва ў лапцях і вусатыя.

– Дзеўкі, глядзіце – Торбы ідуць! – заўважыла іх праз акно адна з дзяўчат-кудзельніц.

Кажушнікі і сапраўды так называліся – Торба. Цімох Торба і Ціхан Торба. Мала ведаючы іх – не пазнаеш, каторы Ціхан, каторы Цімох.

– І нейкі хлопец з імі, дзеўкі, гвалт! Дальбог, харошанькі! З гармонікам!

І праўда – з кажушнікамі ішоў дзяцюк... Ну, проста хлопчык! У кароткім кажушку, у ботах, з гармонікам за плячыма. Адна з дзяўчат пастукала галоўкай верацяна ў акно. Ён, вядома, пачуў, азірнуўся. Узмахнуў рукою і стаў, засмяяўся: «Добры дзень!» Можа, нават зайшоў бы ў хату, ды вось адзін Торба, што ішоў з драўлянай планкай–метрам у руцэ, азірнуўся таксама, нешта сказаў, і хлопец пайшоў. Дзіўным здалося дзяўчатам, а потым і ўсім у Гаросіцы, што ў аднаго з гэтых Торбаў ды можа быць такі сын. Такі беленькі, спрытны... Зусім нібы чужы каля тых двух вусатых здаравілаў.

Ён быў іхні пляменнік, сірата з далёкай вёскі. Завуць Сяргей, а прозвішча таксама дзіўнае, як у дзядзькоў, але прыгожае – Юрачка. Вельмі ж да твару яно Сяргею. Так яго і завуць: хто – Сярожа, хто – Юрачка.

Ну, спрытны быў, вясёлы Юрачка, харошы! Дзядзькі яго – вялізныя, а ўсё ж улазілі яны ў найменшую хату. Здымуць шапкі свае, кажухі, застануцца з аднымі вусамі, прысядуць да стала – толькі сапуць над аўчынамі. Так і жывуць на свеце – моўчкі. А Юрачку ў кожнай хаце было цесна. Вядома, не адзін – з гармонікам. Часамі нават да вечара не можа датрываць: уваткне іголку ў кашулю на грудзях, закруціць нітачку, азірнецца на дзядзькоў ды за свой інструмент. Усё рабіў спраўна. Гармонік у яго не так сабе, а ў цётчыну хустку закручаны. Разгорне хустку – гармонік ажно зіхаціць, а расцягне яго – раздасца кожная хата!

Адзін, два танцы прайграе – дзядзькі маўчаць. Пасля старэйшы Торба, Цімох, той, што з метрам хадзіў, прагудзе:

– Можа, годзе, Сяргей? Можа, людзі не любяць?

У адказ на гэта Юрачка крута, з разгону паварочваў вальс на «Мікіту».

Людзі, што ў хаце былі, здаецца, ураз маладзелі. Дзяўчаты – ну, тыя адразу гатовы былі рвануцца з прасніц ды замяцеліць падоламі. Сам гаспадар, калі ён не зусім стары, пачынаў непрыкметна паварушваць пад лавай наскамі ботаў ці лапцей. Нават бабка, што памятае прыгон, і тая высоўвала з-за коміна галаву... А Юрачка патрэсваў, як жаўранак, чубам і ўслед за музыкай падпяваў:

А Мікіта жыта вее,
Мікіціха муку сее,
Мікіта, Мікіта,
Клінам шуба пашыта!..

Молада, хораша, звонка спяваў гарманіст.

Толькі дзядзькі маўчалі. Нават шыць не спыняліся. Ды таксама не скажаш пра іх, што не рады, асабліва ведаючы, што і гармонік Сяргею купілі яны.

Вясёлы месяц быў тады ў Гаросіцы. Танцы, песні – штовечар! Шкада, што не хапіла ў іх аўчын на ўсю зіму...

Ой, мамачка! Для ўсіх вясёлы, а для Галі... ну, і не кажы...

Усё гэта – было.

Цяпер над полем ціхі, поўны месяц. Галіны ногі ў халоднай расе. Плечы стынуць пад тонкай сукенкай... А трактар гудзе і гудзе... Не пакінеш яго, не забудзеш, што гэта – Сярожа, яе Сярожа... Божа мой, як гэта горка, балюча ад думкі такой!.. А ён жа быў яе, яна была – яго, яны так хораша, так многа цалаваліся. Ды не многа, а тыдзень адзін, а ў тыдні ж толькі сем начэй.

Спачатку любіла Галя адна, баючыся сама сабе прызнацца ў гэтым, саромеючыся лішне пазіраць на яго, каб не падумалі ды не пазналі. Яна была наймалодшая ў іхняй дзявочай кампаніі. Сірата з самай беднай у Гаросіцы хаты Марылі Парабчанкі. Так іх і называлі спрадвеку – парабкамі. Бацькі ў Галі не было.

Ніколі не было, хоць ён і жыў недзе, а можа, і сёння жыве, не думае нават аб тым, што ёсць у яго дачка. На пашы дзеці лаялі яе брыдкім бязлітасным словам – байстручка. Ды з часам гэта слова абвалілася з яе, як шалуха. Прыгожай, спраўнай вырастала Галачка. У беднай сіраты – добра, хораша ў песні пяецца! – толькі чорныя бровы. Затое бровы – шнурочкам, вялікія карыя вочы, маленькія спрытныя рукі і лёгкія ножкі. Чырвоная хусцінка з вышытымі над ілбом пшанічнымі каласамі, неяк па-свойму, непаўторна завязаная на чорных густых валасах, была ў сірочай красе тым нечым вельмі важным, вельмі ўдала знойдзеным, з-за чаго вар'яцелі бадай усе гаросіцкія дзецюкі. А пойдзе ў танец Галачка – пастой ды паглядзі!

Спачатку Юрачка толькі глядзеў. Глядзеў і рэзаў на гармоніку амаль без адпачынку. Вядома, гуляць пад добрую музыку кожны ахвочы, а падмяніць Сярожу не было каму.

Ды вось у адну нядзелю прыйшоў з суседняй вёскі Качаны Іван Чарнагрэбень, які таксама мог іграць. Гэта ўжо быў пажылы кавалер, падпольшчык, шэсць год прасядзеў у турме, толькі ў гэтую восень вярнуўся. Маладзейшыя хлопцы ў Гаросіцы і асабліва дзяўчаты – хоць ён быў просты такі і вясёлы – з пашанай і неяк міжвольна, не змаўляючыся, гаварылі Івану «вы». На той час свайго гармоніка Іван не меў. Пакуль сядзеў у турме, маці прыйшлося крута, і сын напісаў ёй прадаць трохрадку на хлеб. Толькі пасля даведалася Галя, што Сярожка ўжо быў знаёмы з Чарнагрэбенем. Ды не толькі знаёмы...

Не раз хадзіў ён ноччу ў Качаны, ды без гармоніка: на нейкую ціхую справу... Але пра гэта ён не паспеў ёй нічога сказаць.

Цяпер, калі Юрачка паставіў на калені Івану свой гармонік, – абодва яны па-свойску ўсміхнуліся. Адзін з просьбай: «Мо рэзнеце, Іван Сцяпанавіч, на радасць ды на лёгкі скок працоўным?», другі – ад нейкай не па ўзросту Івана маладое ўцехі: «Рэзну, браце, даўно ўжо не рэзаў!»

І Чарнагрэбень рэзнуў. Не зусім яно так, як Сяргей, ды ўсё ж полечка «Галка» пайшла «з-пад карча», па-сапраўднаму.

Юрачка страсянуў галавой, устрапянуўся, як выпушчаны са жмені верабей, паправіў паясок на сваёй вышыванай кашулі і рушыў у кут, дзе сядзелі дзяўчаты. І хата, поўная хата людзей – насцярожылася. «Мяне возьме, мяне», – засвяціліся вочы, забіліся сэрцы дзяўчат. А ён падышоў да Галі. Проста і спрытна, як ён рабіў усё, Сярожа пакланіўся. З усмешкай, вядома, такой, што ў ёй і просьба і радасць:

«Нарэшце мы пойдзем!..»

І вось яны выйшлі ў круг, абняліся.

Мужчыны прыўсталі з лаў, маладзіцы нацiснулі з кута на сярэдзіну, моладзь нібы стаілася ў чаканні нечага, што ўбачыш не вельмі часта.

Дачакаўшыся такта, Юрачка тупнуў і – завірылі!.. Малыя боцікі яго то ледзь краналіся дошак падлогі, то раптам гулка і чотка – па паваротах улева ці ўправа – білі, як выгаворвалі, чачотку. Вакол яго светлавалосай галавы толькі мільгаў румяны тварык пад чырвонай хусцінкай. А ўсё ж такі можна было прыкмеціць, разглядзець і

залатыя каласы на чырвані, і чорныя бровы, і вусны, што так і не маглі стрымаць усмешкі сораму і шчасця... Усім было відаць, а Юрачку найлепш.

– Круг, дайце круг! – крычалі дзецюкі, хоць ніхто з іх не думаў пакуль што сам выходзіць у круг. А ён сціскаўся, не стрымаць яго было нават дзесяткам плячэй. Дзядзька Раман Кругляк, стары ўжо, сівы чалавек, узбіўся з валёнкамі на лаву і зверху, падняўшы палец угару, вось-вось гатовы быў крыкнуць: «Эх!»

Нібы пачуўшы гэты выраз усеагульнага захаплення, Юрачка заспяваў:

Чорна галка,
Чорна галка, –
Ты мая,
Ты мая!

На гэтым песню яго абарвалі.

– Правільна, Юрачка! Правільна! – загула, нібы ўздыхнула з палёгкаю, хата. І толькі тады ўжо, нібы давёўшы да поўнага ладу тое, што трэба было давесці, моладзь пусцілася ў танец.

Так пачалося іх каханне.

Гэта быў толькі ўступ да вялікага шчасця, што мела прыйсці, што пачалося ў тую ж ноч, калі ён цалаваў яе каля іхняга акна, а Галя закрывала твар рукамі і прасілася: «Сярожа, міленькі, не трэба...» Ды рукі гэтыя яму зусім няцяжка было разнімаць. А шчасця, гарачага, хмельнага шчасця ім ніяк нельга было ўдосталь напіцца, хоць прастаялі на снезе амаль да світання.

Праз тыдзень Юрачка пайшоў з дзядзькамі ў Касцюкі, дахаты.

І хто мог падумаць, што іх развітанне – навек!..

Цяпер вось стой ды слухай, як за пшаніцай, за вырваным ільном гудзе яго вясёлы працавіты трактар. Думай пра першую радасць сваю, крычы, звар'яцей ды крычы, каб успомніў цябе і прыйшоў. З ім калісьці цёпла было стаяць і на снезе, а цяпер табе, баба, холадна ўжо і на летняй расе. Ідзі, ідзі, дурніца, у хату, дарэмна стаіш... Няхай трактар гудзе, няхай не дасць табе заснуць да дня.

Галя ціха пайшла.

Дзверы – і ў сенцах, і ў кухні, і ў хаце – старыя, скрыпучыя. Як ты ні асцерагайся, усё роўна скрабянуць па сэрцы. У хаце змрочна. Стаіць-то яна вокнамі на поўдзень і на ўсход, але акенцы гэтыя глядзяць з-пад нізкіх капяжоў, нібы пануры чалавек, толькі пад ногі. Галя ідзе ў той куток, дзе ложак, наўздагад, на хаду ўжо расшпільваючы сукенку. Распрануўшыся, яна асцярожна абмацвае край ложка і асцярожна лажыцца. Ды ўся гэтая асцярога – дарэмная. Сонечка яшчэ ўсё не спіць.

Шчака на падушцы, рука пад шчакой, а вочы глядзяць у паўцемру. Галя знайшла рукой яе цёплыя плечыкі і прыгарнула малую – усю за раз, з усімі яе думкамі.

– Мамка, а дзе наш тата?

– Спі, дачушка, ён хутка прыедзе.

– Прыедзе, прыедзе... Я малая была – ты ўсё казала і цяпер усё кажаш. Мамка, а тата харошы?

– Харошы, харошы...

– А Лёнька, дурань, гаворыць, што тата не ў горадзе, што ён у астрозе сядзіць, што ён... Як гэта, мамка?

– Што?

– Ну, як гэта?.. Ой, я забылася.

– Ты вось спі. Заўтра зноў не захочаш уставаць.

– А Лёнька кажа...

– Сціхні! – крыкнула Галя. Нават і для самой сябе нечакана злосна, а што ўжо казаць пра малую. Сонечка ўздрыганулася і заціхла. Цяпер бы ёй якраз і заплакаць ад крыўды, але яна памаўчала хвілінку, а потым цёплая тонкая ручка яе працягнулася да Галінай шыі, трошкі напружылася, абняла і нібы самай моцнай сілай зноў прыцягнула маці да сябе.

– Я, мамка, буду спаць. І ты спі. Добра?

– Добра. Ты толькі адвярніся да сцяны. На гэты вось бачок...

Нялёгка Галі вымавіць адразу столькі слоў. Ды вось малая заціхла. І добра. Гэтак будзе лепш і ёй, і маці.

«Не трэба ёй пакуль што бачыць маіх слёз, не трэба ведаць, што думаю я пра таго, хто стаў на гора наша бацькам яе, а маім мужам... Давай, дачушка, лепш заснём...»

За нізкай столлю, за страхой – высока над хатай стаіць у небе поўны ціхі месяц. За пшаніцай, за пахам ільну спыніўся недзе ў полі трактар. Спі, маладзіца, не паспееш адпачыць, пакуль паблекне месяц. Спі, спяшайся заснуць, пакуль трактарыст і прычэпшчык закурваюць... Ды яна не паспела, вядома. І не старалася, відаць. І трактар зноў гудзе, зноў над палямі коціцца, як хвалі на вялікім возеры, яго бадзёрае грукатанне.

– Мамка, а я ўжо ведаю, – тата наш спекулянт... А што гэта, мамка? Ты спіш?

Галя маўчыць.

«Не ўсё гэта, не ўсё, што ён, твой бацька, спекулянт. Ды я пакуль што памаўчу. А ты лепш спі, не забівай галоўку думкамі. Няхай ужо маці – ёй варта, яна заслужыла – няхай лепш маці падумае...»

...Гарманіст Юрачка больш не прыйшоў у Гаросіцу – ні шыць кажухі, ні цалаваць сваю Галю, ні ўпотай ад яе хадзіць у Качаны. Нешта хутка пасля іх першага развітання камсамольца Сяргея паны пасадзілі за краты. Не аднаго, вядома, – узялі з ім разам і іншых, з Гаросіцы і з Качаноў. Другі раз пайшоў у турму і Іван Чарнагрэбень. У верасні трыццаць дзевятага года, вярнуўшыся ў родную вёску, Сяргей адразу ж пачуў, што дзяўчына яго – за другім.

Як гэта сталася, што малады Хамёнак, Данькаў сын, узяў дачку Марылі Парабчанкі?

Гледзячы збоку, для многіх гэта было ясна. Ён – закахаўся, відаць, так, што пайшоў супраць волі бацькоў. Ну, а на месцы Галі пайшла б за яго не адна. Такі, людцы мае, хутар, ды і хлопец – нічога не скажаш. А што свёкар ліхі чалавек, дык жа не з ім, не з Данькам слінявым жыць. Прыйдзе час і на Даньку.

Сама Галя ведала больш. Мікола лазіў за ёю даўно, яшчэ да Юрачкі. Гаворка пра арышт Сяргея і Галіны горкія слёзы былі днямі ягонай радасці. Спачатку яна, вядома, і гаварыць не давалася, а потым смутак патроху заглух. А Мікола налазіў – штовечар, то больш. Нават плакаў і страшыў, што кончыць, зарэжа і яе, і сябе... Заступіцца не было каму. Пра гэты замуж шчаслівы трубілі не толькі чужыя – і сваякі, і маці была на яго, Міколавым, баку... Першы раз ён узяў яе ледзь што не сілай. Адразу свет завязаў, заставалася толькі плакаць і моўчкі ісці за ім, у ім шукаць паратунку ад ганьбы. На Данькаў хутар яна прыйшла яшчэ з дзявочым выглядам. Калі ж маладзіцы ўжо нельга было больш схаваць таго, што стала прыкметным раней, чым у хаце чакалі, – у свёкравым вечным зудзенні толькі і чуваць было: «Байстручка, жабрачка, няўдаліца...»

Апошняе слова ён разумеў па-свойму. Яна была і спраўная, і працавітая, ды гэта ўсё – не тое. І жыць, і працаваць трэба толькі таму, каб быць багатым. Хамёнак жыў для гумна. Галава пад старым каўпаком і старасвецкая хатка патрэбны былі менш, чым гэтае гумно. Гумно павінна заўсёды быць поўнае. Дзеля гэтага трэба мець поле. Больш поля – большае гумно. Менш паспіш – болей зробіш. Не з'ясі, не зносіш – больш застанецца. Збіраючыся жаніць сына, Данька перасыпаў гумно, растачыў яго для тых снапоў, што прыйдуць сюды з пасажнага поля. А сын узяў ды звар'яцеў... Галя была для Данькі не сямейнік, яна толькі замяніла наймічку. Колькі яна ні працуй – усё гэта будзе не тое. Ніколі ёй не адрабіць за крыўду, за абразу, за ўрон, нанесены Данькавай гаспадарцы.

Мікола здаваўся іншым за бацьку толькі раней, да вяселля. Тут, на хутары, калі яна пераступіла з ім парог гэтай чортавай ямы, – Хамёнак застаўся Хамёнкам.

Свёкар Данька... Тры разы за ўвесь час ён быў ласкавы да Галі, гэты чалавек.

У першы дзень пасля вяселля свякроў зварыла чыгун бульбы ў лупінах і з чыгуном паставіла на стале. Данька зняў свой каўпак, прыгроб рукамі валасы, перахрысціўся і сеў за стол.

– Масла мо трохі растапі, – сказаў ён жонцы. Яна была паслухмяная, ціхая, верная, гадоў ужо сорак маўчала, як цягавіты, непераборлівы конь. Пайшла ў камору і вярнулася з лыжкаю масла. Яго аказалася мала на ўсю скавародку. Вяртацца зноў у камору, зноў лезці ў слоік – гэта было ўжо звыш сіл і прызвычаення. І старая схітрыла перад новым сямейнікам: павярнулася да стала спіной і плюхнула ў масла тры лыжкі гарачай вады. Усе заўважылі гэта, і кожны па-свойму маўчаў. Галя здзівілася, Міколу стала нават няёмка, а старому было прыемна ўдвая – і за хітрасць сваёй гаспадыні, і за тое, што гэтай хітрасці ніхто, як відаць, не заўважыў...

Чорнымі кіпцюрамі даўно нямытых рук ён абіраў сваю бульбіну і, прыплюшчыўшы вочы, маўчаў. Пасля пачаў абмачаць яе ў «масла». Штораз адкусіць бульбіну, то больш усё лезе са шчопцямі ў жыжку.

– Еш, нявестачка, еш, – гаварыў ён. – Дома ж у вас не было. У галечы расла. Абмачай.

Другая ласка прыйшла праз паўгода, у летнюю ноч. Міколы не было нешта дома, старая крахтала на печы, а стары яшчэ соваўся па двары. Пасля ён падзюбаў тымі самымі бруднымі шчопцямі ў шыбу і зусім нечакана паклікаў нявестку па імені:

– Галя!

Яна ажно ўздрыганулася.

– Ідзі сюды, Галя!

Здзівілася. Выйшла. «Чаго яму трэба?..» Данька патупаў па сцежцы туды, дзе ад поля – вішняк. Спыніўся. Яна падышла і спынілася воддаль.

– Ночка якая, га? – сказаў стары. – Канюшына як пахне Сымонава, ліха яго галаве!.. Столькі коп!.. Пайдзі ты, Галя, другую дзяружку вазьмі. Пойдзем, яшчэ разочак прынясём. Зімой лішні ахапак як знойдзеш.

Галя ўбачыла пад пахай у яго скамечаную дзяругу.

– Я ніколі не крала, – сказала яна. – Трэба вам, мала свайго, дык ідзіце.

Павярнулася і пайшла. Не чула нават, што ён там бурчаў. Вядома – што. Ён нездарма скідае свой каўпак, толькі хрысцячыся перад іконай, а разувае лапці раз на тыдзень, у суботу. Ён нездарма зрабіў вялікае гумно.

Трэцяя ласка прыйшла тады, калі яна нарадзіла Антося і, пасля цяжкіх родаў, ляжала цэлы тыдзень у ложку.

– Курыцу трэба зарэзаць, – на трэці дзень аб'явіла свякроў.

Гэтая думка, народжаная ў пакутах, не вельмі ўзрушыла Даньку. Не памагала і тое, што сын – дагэтуль такі паслухмяны, разумны – таксама настойваў на тым, што курыцу ўсё ж такі трэба зарэзаць. Была і курыца такая, не нясушчая, – хадзіла толькі ды сакатала чортведама чаго каля акон, нібы сама прасілася пад нож. Жонка і сын не адставалі. Нявестка, немач на яе, ляжыць, а бульба ўся яшчэ не капана... Стары паклікаў курыцу ў сені, зачыніўся, злавіў яе ў кутку і ўзяў сякеру. Прысуд быў выкананы на парозе. Тады Данька ўнёс яе ў хату, кінуў на падлогу і сказаў:

– Бярыце. Ешце.

Гэта было шаснаццатага верасня – апошні дзень панскай улады.

Паны ўцяклі, а Хамёнак застаўся. Данька не доўга патрываў. Не спаў, не разуваўся ўсю зіму, нават хрысціцца пачаў у сваім каўпаку. «Канец... Канец свету...» – крахтаў ён, лежачы на печы. Напрадвесні старога нарэшце памылі і вынеслі з хаты ўперад нагамі. Назаўтра Мікола ўзяў яго каўпак, шпурнуў з сяней на гарышча і стаў гаспадарыць сам.

Праз год памерла свякроў.

...Трактар гудзе. Поўны месяц высока стаіць над палямі. Адзін будзе гудзець усю ноч, другі – свяціць трактарысту да сонца.

Чарнявая Сонечка цёпла дыхае носікам маме ў плячо. Даўно заснула, успомніла слова, якім назвалі на пашы яе амаль невядомага бацьку. Няхай пакуль што спіць, няхай не ведае больш...

Галя ўстала. Хацела выйсці ў кухню, напіцца, але раздумала і падышла да акна. Не адчыняецца яно, і фортачкі няма. А ўсё ж тут лепш чуваць, як за прасторам калгаснай пшаніцы, за лёнам духмяным бяссонна, нястомна працуе трактар.

– Сярожа, – шэпчуць сухія, гарачыя Галіны вусны, – Сярожа, можа, зайшоў бы? Ну, хоць напіцца... Ды не, ён не зойдзе.

Ён заходзіў у гэтую хату адзін толькі раз. Гэта было напрадвесні сорак чацвёртага года. Нешта апоўначы Хамёнкавых разбудзіў стук у акно. Ясна – хто гэта: адны былі ў той час гаспадары начэй. Адчыняць і цяпер пайшла Галя. Сам гаспадар у такіх выпадках не ўставаў з пасцелі.

Следам за Галяй увайшло толькі двух, рэшта стаяла з коньмі на двары. Галя пабольшыла кнот у газніцы, а сама пайшла ў куток. Яе справа закончана, гаспадар будзе гаварыць сам.

– Добры вечар! Што, хворы? – спытаўся адзін з партызан.

– Ды так, таварышы, няхай яго немач...

– Сэрца?

– Не, яно, каб сказаць...

– Язва?

– У мяне, таварышы...

– Што ж, душа па радзіме баліць? Ляжы, ляжы. Я ведаю – ты спраўкі хочаш паказаць.

Партызан уключыў электрычны ліхтарык, і гаспадар заморгаў у святле.

– Усё нармальна, – сказаў партызан. – Хвароба працякае правільна. Барада запушчана, боты схаваны, самагоначка ёсць...

Мікола зразумеў гэта па-свойму.

– Ды недзе кропля ёсць, таварышы. Добра, што вы напомнілі.

– Ляжы, ляжы, Хамёнак, не ўставай. Няхай пастаіць самагонка твая. Заўтра заедуць бобікі. А можа, з імі і сам пан фельдфебель. А нам твае танцы ды спевы не трэба. Вахлак.

– Вось вы не верыце, таварышы...

– Ды што нам верыць – мы бачым, – перабіў яго партызан. – Бачым цябе наскрозь. У нас, брат, дакладна запісана ўся гісторыя тваёй хваробы, – і барадатай, і безбародай. Ты ўсюды ўсё адбываеш сваёй самагонкай. Народ абліваецца крыўю, а ты... Віляеш, як сука, і нашым, і вашым. Ды што нам з табой гаварыць. Дзе Каштанка? Пад'ём!

Хамёнак усё яшчэ цяжка, не збаўляючы выгляду хворага чалавека, узняўся і сеў на ложку.

– Галя, дай мне валёнкі.

Яна не хацела выходзіць з кутка. Хацелася нават шпурнуць іх, гэтыя знарок ірваныя валёнкі, у гэтую рыжую, знарок запушчаную бараду. Хацелася проста заплакаць ад крыўды і сораму... Аднак яна ўзяла з печы валёнкі і панесла іх перад сабой, каб хоць гэтак, хоць трошкі даўжэй не паказваць людзям, ад каго яна зноў зацяжарала...

– На, – сказала яна адно слова, якое здолела вымавіць.

І тады ён, Сярожа, сказаў:

– Добры вечар, Галя! І ты ад нас хаваешся?

Ах, ну чаму ты, дурніца, тады не сказала яму: «Забяры мяне, родны, адгэтуль!» Чаму не назвала яго тым іменем, якое даражэй табе за ўсе на свеце імёны, – Сярожа? Чаму?..

Таму, што і мову табе, і слёзы адняло ад жалю да сябе, ад сораму.

– Добры вечар, – сказала яна, апусціўшы вочы.

Вельмі добра, што пры газніцы было цемнавата, што ён не асвятліў яе ліхтарыкам. Відаць, хоць трошкі яшчэ паважаў ён яе – калі ўжо не Галю сваю, дык жанчыну.

Яна не пайшла за імі ў гумно, засталася ў сенцах, на парозе, у адчыненых дзвярах. Хутаючыся ў незашпілены кажушок, яна чула... не чула, а прагна слухала маладую гутарку вольных, шчаслівых людзей.

Уся Хамёнкава хітрасць аказалася тут проста смешнай. Два дні выскубаў ён у тарпе саломы схованку, тры месяцы пакутавала ў цемры раскормленая жарабіца. А тут адзін з гэтых хлопцаў пастукаў, відаць, у вядро і, нібы поп, прамовіў:

– Дзе ты там, грэшная душа? Выходзь на божае святло.

Каштанка зафыркала ў адказ, і гэтае фырканне пакрыў вясёлы смех і гоман на таку. Ён, Хамёнак, яшчэ ўсё ныў:

– З выгляду яна, і праўда, як быццам нічога. Ды, падла, без ног...

– Хэ! Та ў нэі дзійсно тількі чатыры ніжкы, хлопцы! – пачуўся прыемны голас аднаго з тых жартуноў, што хораша, відаць, спяваюць. Украінец. – Так шчо, таварышу ўзводны, – гаварыў ён, – моя біда, а ваш наказ залышыцця, мабуць, у сілі. Я конячку сідлаю, так?

– Сядлай, Арцём. Толькі хутчэй, – пачуўся голас Сярожы.

«Ён – камандзір. Я так і ведала», – міжволі з радасцю падумала Галя.

Тым часам той весялун, каго звалі Арцёмам, зняў з невялікага каня сядло і перанёс яго на іхнюю Каштанку.

– Эх, здоровенькы булы, ластіўко! – сказаў ён. – А мого Чалого ты, борода, бэры. Тількі не ў яму цю постаў. Прыйду – побачу, як тый його годуваты мэш. Він – заслужэны кінь. Ну, господы благословы!

Хлопец паставіў у стрэмя нагу, і вось на светлым фоне снегу вырас над іхняй Каштанкай яго сілуэт.

Наструненая павадамі жарабіца затанцавала па прыгуменні.

– Прощай, борода! – пачуўся яшчэ адзін голас. – Ты, кстати, эту пакость сбрей. Мы как-нибудь зайдем, проверим. Вообще, разочка два в неделю бриться – это на здоровье.

– Не слухай, дзядзька, які ён фельчар? Ты лепш пчол у ёй развядзі.

– Точно! Медку не будет, но заснуть не дадут.

– Паехалі! – зноў пачуўся голас Сяргея. Яны паехалі, а Хамёнак застаўся. Пакінуты стомлены канюк, якога ён трымаў за павады, узняў галаву, заржаў. Неяк сумна, балюча – услед іх маладому смеху, цокату мноства падкоў па аблыселым бруку дарогі...

– Не плач, ідзі лажыся, чаго ты... – гудзеў Хамёнак з-пад коўдры. – Ты думаеш, што мне яе не шкада. Такая, ліха ім, кабыліца!..

– Пайшоў ты к чорту! – сказала яна і палезла на печ.

Хамёнак маўчаў нядоўга.

– Ага-а! – пачуўся ў цемры яго зларадны голас. – Дык ты па ім, па гэтым шыбеніку! Ну, паглядзім!..

Ён і тады яшчэ страшыў, ужо ў канцы панавання чужынцаў, ужо напярэдадні вызвалення.

...За акном пачынае світаць. Вялікі, поўны месяц вось-вось пабялее, закончыць дзяжурства над полем, перадасць яго сонцу.

А трактар гудзе і гудзе...

«Зайдзі, зайдзі, Сярожа яшчэ раз. Апошні разок!..»

Галя глядзіць удаль, успёршыся на падаконнік.

А гул усё, здаецца, набліжаецца. Так, ён бліжэй, штораз бліжэй!..

«Ідзі, ідзі адтуль, дарагі мой, куды ты пайшоў пад песню свайго гармоніка на вуліцы, пад цокат падкоў на дарозе, – з той яснай стараны, адкуль ты не вяртаўся гэтак доўга!..»

Збылося!

Трактар спыніўся. Рокат замоўк.

Галя ўстала і адышла ад акна. Міжвольнымі рухамі рук яна адразу паправіла валасы, пасля – таксама міжвольна – закрыла рукамі твар.

Сяргей ідзе. Яшчэ ўсё малады, як і ў той час, толькі цяпер – у сінім заплямленым камбінезоне, з пшанічным чубам над блакітнымі вясёлымі вачыма, з кепкай у левай руцэ. Вось-вось зашалясціць пад яго ботамі росная трава, захрупае жвір каля прызбы, працягнецца да шыбы родная рука, застукае ціхенька ў шкло і – кончыцца ўсё, што было... Ідзі, ідзі, я чакаю даўно... ой, даўно!

Ды што гэта!..

Ну, а ты думала – што?..

Трактар гудзе зноў. І гэты гул цяпер штораз – далей.

Як гэта проста ўсё, як зразумела, што ён завярнуўся, – і як гэта страшна!..

Сядзь і сядзі каля акна. Хочаш – крычы, а хочаш – маўчы, пазірай. Ёсць і яшчэ адно, што табе засталося, – заплач.

І Галя выбрала апошняе. Не выбрала – яно прыйшло само. Прыпаўшы тварам да гарачых рук на падаконніку, яна заплакала – горка, наўзрыд. Плакала доўга, як дзіця, калі яго пакрыўдзяць і пакінуць у такой вось чужой і цёмнай хаце. А потым, як дзіця, стамілася ад слёз. Вярнулася стома на вочы, мякка, уладна, асела на душу... Жняя заснула. А трактар гудзе і гудзе...

...За садам – пшаніца. Багаты хлебны прастор. Над калоссем – густая парная імгла, праз якую спакойна глядзіць на зямлю негарачае сонца. Сёння, у нядзелю, яно нібы адпачывае само і хоча даць выхадны ад спёкі ўсяму, што жыве.

Такога мора пшаніцы не бачылі тут, на месцы нядаўніх палосак ды межаў, ніколі. Прыгнешся трохі – амаль зусім не варушыцца цяжкае ды непахілае калоссе, цёпла-вільготнае ў імгле, нібы спацела... Харошая пшаніца. Так і трэба! Над шчоткай меднага калосся – шэрыя, няўрымслівыя вераб'і. Дажылі да раскошы. Так і лётаюць, так і шчабечуць, так і садзяцца на каласы, нібы пчолы на кветкі. Толькі тыя заўсёды працуюць, гудуць сваю песню сур'ёзна, а вераб'і цяпер шчаслівыя, без клопату. Зусім легкадумны народ.

А трактар яшчэ ўсё гудзе і гудзе... Хто там змяніў гарманіста Сяргея?.. Каля студні мыецца Галін хлопец Антось. Нацягаў у карыта сцюдзёнай вады, зняў кашулю, і на ўвесь двор чуваць, як ён фыркае ды пакрэктвае ад здавальнення. Харошы хлопец, жывы, працавіты. Добра, што цягне яго да людзей. Сам, па сваёй ахвоце і пазаўчора і ўчора хадзіў з сябрукамі за вёску да малатарні. Антось выціраецца свежым кужэльным ручніком. І зноў, здаецца, на ўвесь двор чуваць, як аж рыпіць яго загарэлы твар, моцныя рукі, што заслужылі і сёння на адпачынак.

Галя вельмі любіць Сонечку. Галі ў маленстве ніхто не здымаў. Якія там маглі быць здымкі. Добра хоць, што люстэрка было ў Парабчанкі. Ды Галя глядзіць на Сонечку сваю, як у люстэрка. Такою, мусіць, толькі такою была яна сама калісьці, – з вялікімі вачыма, чорненькая шчабятушка...

Сонечка стаіць на пасцелі ў кароткай чысценькай кашульцы. Яшчэ ўсё сонная, ды ўжо з усмешкай на прыплюшчаных карых вачах, яна працягвае да Галі тонкія загарэлыя ручкі. Мама надзявае на іх маленькі крэмавы станік, потым зашпільвае яго, спрытна перабіраючы пальцамі белыя гузікі. А тонкія цёплыя ручкі малой ужо абвіліся за Галіну шыю. Чорнавалосая галоўка сама схілілася на маміна плячо. Ой, як прыпала б яна да падушкі!.. Ды нічога, Сонечка ўстане таксама ахвотна. Яна ведае, што цяпер жніво, што ёй і сёння трэба замяніць Антося, пакуль ён паспіць. На двары ўжо стаіць, чакаючы сваю пастушку, ласкавая, спакойная Падласка. У жоўтым чысценькім збанку стаіць на стале каля кубка цёплы сырадой.

– Ты, мамка, спала са мной?

– З табою. То ж мы разам з табою заснулі.

– Сёння, мамка, нядзеля?

– Нядзеля. Сукенку ты надзенеш новую, дачушка. Гэтую.

– А ты, мамка, пойдзеш у поле. Жыта дажалі, дык трэба ўжо авёс. І авёс, пшаніцу. Антось таксама пойдзе.

– Ён паспіць. Ён малаціў усю ноч.

– Антось наш вялікі. Ён у нас, мамка, харошы.

– Харошы, дочка, харошы.

– І я харошая, мамка. Я цябе слухаю.

– Ты – таксама, дачушка. Ты лепшая за нас усіх.

Галя падцягвае малой таксама, як і станік, свежыя, гладкія трусікі, а потым туліць да грудзей усю яе – такую родную, цёплую. «Сонейка маё! Чаму ж я не нарадзіла цябе ад таго, хто быў мой?!.»

А за акном – чуваць – гудзе, ракоча нястомны рабацяга-трактар... Хто там сядзіць за рулём? Хто там змяніў Сярожу?

– А я ўчора думала-думала, думала-думала, – шчабеча Сонечка, – і ўспомніла: спекулянт! А што гэта, мамка? Што?

– Вырасцеш, дочка, яшчэ трохі і тады зразумееш, тады я скажу. Ты – харошая, ты больш не будзеш пытацца?

– Не буду. Я Падласку паганю.

...Галя ідзе па расе каля пшаніцы, туды, дзе дарога ў поле.

«Не, ён – не толькі спекулянт, – у думках гаворыць яна, нібы яшчэ ўсё размаўляючы з дачкой. – Ён – баязлівец, злосны, плюгавы, шкодны чалавек. Ён ніколі не быў тваім бацькам, дачушка мая, не быў маім мужам. Ніколі!..»

Яна ўспамінае яго бараду. Кудлатую, рыжую, з пчоламі. Назаўтра пасля таго, як забралі Каштанку, ён доўга скроб тупою брытвай гэтую бараду, – крахтаў, стагнаў перад аблезлым трохкутнікам люстэрка, а ўсё ж такі скроб. І кожны тыдзень галіўся, да самага прыходу нашай арміі, штоночы чакаючы тых, што абяцалі прыехаць праверыць. Яны, вядома, не прыехалі, а ён, вядома, не змяніўся. Пайшоў на фронт. Ну, прастрэлілі трохі руку... Куды ён толькі ні тыцкаўся з гэтай рукой, каб давесці, што ён за савецкую ўладу! Куды ён толькі не ездзіў на свае гешэфты!.. Стоўбцы, Баранавічы, Менск... І вось сядзіць. Даездзіўся, дабурчэўся...

Можа, нядобра гэта, што яна не шкадуе яго? То ж бацька дзецям, пражылі столькі год... Ды не, не шкадуе, ні разу нават, здаецца, і не падумала. А трактар гудзе...

Хутка знікне імгла, і за пшаніцай, за лёнам адкрыецца чорны прастор свежай, духмянай раллі, стане відаць, колькі за ноч узняў зямлі яе Сярожа. А можа, гэта ён яшчэ сядзіць за рулём? Не, не ён. Нават трактар ракоча не там, – не даходзіць у сэрцы яго несціханы, бязлітасны, добры, любімы гул. Не, не ён.

Нехта ідзе па дарозе... Божа мой – ён!..

Галя хацела рвануцца, пабегчы туды, але спынілася – глядзіць... Сярожа ідзе без шапкі, у сінім расхрыстаным на грудзях камбінезоне – такі самы, якім яна нібыта бачыла яго праз акно.

«Не, ён не ўбачыць мяне!.. Не, не цяпер!..» Яна сышла са сцежкі ў пшаніцу. Сяргей ідзе і не бачыць над калоссем яе галавы ў белай хустцы, пад колер імглы. Ды ён сюды і не глядзіць... Толькі на яго, услед яму глядзяць Галіны карыя, сумныя вочы...

«Вярніся ты хоць як-небудзь назад, мая харошая, мая загубленая маладосць! Вярніся, заспявай мне вясёлую песню пра чорную галку, якая яшчэ ўсё твая, зірні мне ў вочы, і я сама падпалю гэты хутар, вазьму дзяцей, пайду з табой усюды, куды скажаш!..»

А пшаніца, якая пшаніца навокал! Густая, чыстая, высокая. Так і трэба!

Галя яшчэ не думае пра гэта: толькі адчувае. Мазольная спрытная рука жняі пайшла па каласах, і пяшчотныя дотыкі іх разбудзілі ў душы пачуцці светлай, харошай палёгкі...

«Іван Сцяпанавіч! Дзядзька Іван! Памажыце мне, дзядзька!»

Галіны вусны шэпчуць гэта, як даўно завучаныя словы. І дзядзька Іван, разумны Іван Сцяпанавіч, той самы Іван Чарнагрэбень, падпольшчык і гарманіст у мінулым, цяпер старшыня іх калгаса, глядзіць на Галю з-пад густых, ужо як быццам з сівізной брывей.

«Што ты хочаш, Галіна?»

«Дзядзька Іван, я не хачу там жыць, вазьміце вы мяне назад у нашу вёску. Зрабіце мне хатку, і мы з Антосем адробім, за ўсенька адробім. Здыміце з мяне яго прозвішча, дзядзька Іван. То ж вы і самі ведаеце ўсё – хто ён, хто я і хто мае дзеці...»

«Не плач, Галіна, не трэба. Уладзім».

А Галя плача. Ідзе па дарозе і плача. Праз імглу і праз слёзы, што засланілі ад яе гэты пракляты, яшчэ ўсё не зраўнаваны з зямлёю хутар, працягваюцца тонкія загарэлыя ручкі, цёпла кладуцца на шыю яе, і каля самага вуха чуваць:

«Ты харошая, мамка мая!»

Не, гэта ты харошая, ты, маё сонейка, ты лепшая за ўсіх! І доля твая будзе не такой, як у мамы. Ніхто не насмяецца з твайго жыцця... А трактар гудзе і гудзе...

Там – не Сярожка. Ды гэта нічога. Ноччу будзе зноў ён. Зноў будзе балець па ім яе душа, да самага світання...

Няхай сабе. Абы толькі гудзеў.

1953 г.

Лірычная мініяцюра «Загадка»

Напярэдадні вайны хлопец з Дона стаяў дазорам на Бугу. Пасля, пад націскам ворага, ён адступаў, уведаў бяздонную горыч разгрому і палону. Уцёк з-за калючага дроту і прыпыніўся ў самай звычайнай беларускай вёсцы. Небагатыя, ціхія людзі, з якіх і ён нядаўна пасмейваўся: «Бульба дробненькая, але многа!..» Яны накармілі яго і прыгрэлі. Разам з імі ён узяў неўзабаве вінтоўку, стаў партызанам. Разам з імі рабіў ён тое, што – збоку відней – і Радзіма, і ўвесь прагрэсіўны свет пачалі пасля называць гераізмам. Тут на гарачую кроў яго раны лягла халаднаватая чысціня палатна. «Кужэльненькага», як гаварыла беларуская маці, нястомная работніца, што плакала над ім. Замест ягонай – богведама, ці жывой? – мамані ў далёкай, таксама дзесьці зганьбаванай фашыстамі станіцы... Тут ён адчуў каханне – наша дзяўчына палюбіла яго, пайшла з ім з роднае хаты ў сцюдзёную пушчу...

Пасля – перамога! І ён не вярнуўся дахаты, на Дон. Хлопец нібы толькі цяпер заўважыў, як ён прырос да гэтай слаўнай лясной старонкі, як пасябраваў з людзьмі, якія памаглі яму выканаць святы абавязак савецкага чалавека. Вось ужо трынаццаць год узапар ездзіць ён у госці на ўсход, да роднага берага, да родных душ, і вяртаецца адтуль у Беларусь з тым самым дзіўным пачуццём – з дому едзе дадому, з радзімы цягне яго на радзіму...

Дзве іх стала, ці што?..

1957 г.

Лірычная мініяцюра «Трохі пра вечнае»

Над Нёманам – тры векавыя дубы. Пад першым я ляжу, гляджу на другі і на трэці. Стаіць іх тут, магутных ды прыгожых, больш, аднак мне хапае і трох. Нават і двух – таго, пад якім я прылёг у цяньку, дарагім пасля пыльнай, спякотнай дарогі, і бліжэйшага, на які я гляджу значна больш. На буслянку. Ёсць яна і на трэцім, далейшым дубе, нават і бусел там стаіць, нерухомы, як помнічак, але на гэтую, бліжэйшую буслянку, хоць і схаваную ў густой цёмна-зялёнай кроне, глядзіцца, лежачы, проста чамусьці лепш – нібы чакаючы чагосьці большага, чагосьці незвычайнага.

Канчаецца ліпень. Бусляняты гэтай парой амаль зусім ужо дарослыя, толькі зблізку адрозніш іх ад бацькоў.

На дубе маім, заслоненыя лістотай, дарослыя буслы ці бусляняты стаялі нябачныя, моўчкі, – я толькі здагадваўся, што яны там ёсць.

Потым здагадка спраўдзілася. Нечаканым, велікакрылым шах-мах. Буслы ўзняліся з-за лісцяной маскіроўкі і вось – з’явіліся на блакіце. Блізка, ледзь не рукамі іх дастаць. Даўно прывычны і такі заўсёды новы цуд.

Тут я іх пазнаў, маладых. Па дзюбах, па нагах – яшчэ не чырвоных, па тым, як яны, пакружыўшыся для размінкі над родным дубам, пачалі садзіцца на гняздо. Павіселі над ім, перабіраючы цыбамі, няўдала цэлячыся імі, каб хаця ж не міма.

А потым прыляцеў надубны гаспадар. Чырвананосы, чырвананогі, з жабай у дзюбе – ну, проста для малюнка ў дзіцячую кніжку. На гняздо ён сеў упэўнена, адразу. І тады – апошні доказ, што першыя два маладыя, – пачулася іх нецярплівае, нават яшчэ ўсё пястотнае сіпенне.

А мне ізноў успомніўся сёлетні сакавік.

...Мы яе неслі спачатку з крутога, коўзкага ўзгорка, а потым доўга па вуліцы, над глыбокай сцюдзёнай гразёю, над бруднай наледдзю, над раўчукамі, што мутна і весела булькалі насустрач нашаму сумнаму шэсцю.

Ёй ужо было знойдзена месца ў цясноце спрадвечных магіл. Яе там засыпалі жвірам. Маю старэнькую пакутніцу-сястру.

І ўвесь гэты час, пакуль мы ішлі і стаялі, звінеў у небе жаўранак. Здавалася, адзін усё, той самы ранні, што здуру прыляцеў ужо, не самому сабе, а камусьці на радасць.

Пасля быў вечар, нудота і гоман п’яных памінак, а потым – ноч і раніца. Я зноў прыйшоў у гэтую хату на ўзгорку, да якое прывык за жыццё, у якой упершыню мяне не сустрэла яна, старая гаспадыня.

Прыйшоў з нечаканым і дзіўным у гэты дзень праблескам радасці ў сэрцы і ў першым слове на парозе...

Чаго ж такая неадпаведная радасць?

Узыходзячы на круты, коўзкі ўзгорак, я – нібы хтосьці мяне штурхануў – зірнуў угару, туды, дзе побач з хатай, на агародзе пад самыя хмары ўздымаецца змалку знаёмая, старая ліпа.

На ліпу выкінуты быў – на самую вяршыню – белы сцяг вясны: там сядзеў першы сёлетні бусел. Вельмі ранні, яшчэ нечаканы.

Я пастаяў каля плота, шчасліва намагаючыся ўявіць ягоны шлях ад пірамідаў да нашых надрэчных лугоў.

Сашка, найменшы ўнучак мае сястры, ужо адчуў гэты вялікі цуд. Ён забаўляўся цяпер каля будкі з сабакам, натуральна шукаючы новай пацехі. «Хлопчык, відаць, не ўявіць бусліны вырайны шлях, як я. Куды яму з яго веданнем свету! А свежасць радасці жыцця ў мяне амаль такая ж, мусіць, як і ў яго ...»

Так думалася мне, пакуль на ліпе бялела, адпачываючы, мая зусім неспадзяваная радасць.

Белы сцяг вясны...

Тады ж адразу, адчуўшы гэта, я ўспомніў, што з'яву такую першы назваў так Міцкевіч, што, па-нашаму, па-пісьменніцку кажучы, гэта чужое. У яго толькі трохі інакш:

Bo już bocian przyleciał do rodzinnej sosny
I rozpiął skrzydła białe, wczesny sztandar wiosny.[1]

Не белы сцяг, а ранні. І не складзены так, як у гэтага, што на ліпе, а распасцёрты ў палёце.

Прыйшла вясна, а потым пачалося лета. Тыдзень за тыднем мяне непакоіў той сцяг. Ездзячы па многіх вёсках і палях, бачачы іх, буслоў, я ўспамінаў таго, на голай ліпе, і дакараў сябе, што вось жа ніяк не магу адчапіцца ад думкі, дзе тут, у радасці гэтай, маё, дзе чужое.

Гэтая думка, гэты шчымлівы клопат вярнуўся і цяпер, ліпеньскім сонечным адвячоркам.

Чаму гэта – літаратуршчына», кніжнасць», калі я, гледзячы на буслоў, зноў вось успамінаю Міцкевіча? Цяпер ужо не аднаго, а з Рыльскім. Яшчэ вясной ад неспакою свайго я перачытваў ягоны пераклад Пана Тадэвуша»: толькі тую мясціну, дзе даецца малюнак надзвычай ранняга вяртання з выраю.

Дочасно чорногуз на сосну прилетів,
Де вже не рік, не два гніздо його чорніло,
І крили розіп'яв, неначе прапор білий...

Акадэмік, які і ў сівай старасці мог па-малечы хвалявацца, злавіўшы от сабе акунька (я гэта бачыў тут, над Нёманам), Максім Тадэевіч любіў навуковую дакладнасць. Да «білого прапору» ім зроблена заўвага перакладчыка:

«Паэтычная вольнасць: у сапраўднасці бусел, маючы белае тулава і шыю, крылы мае чорныя. – М. Р.»

[1] (пол.)Бо бусел ужо паляцеў да роднай сасны
І расправіў белыя крылы, ранні сцяг вясны.

Ха, ха!.. Прыемна ўсё-такі і ў акадэміка знайсці пралік!.. Гледзячы з-пад дуба на буслоў у палёце, знізу пад крылы, бачу: яны не белыя, як у Міцкевіча, але ж і не чорныя, як у Рыльскага. Яны чорна-белыя. Во!

Але і гэта не ўсё. І тут я не зусім арыгінальны. Станіслаў Пігань, яшчэ адзін акадэмік, польскі, у заўвагах да Пана Тадэвуша», апраўдваючы паэта, піша:

«Крылы ў яго распасцёртыя», г. зн. бачныя знізу, робяць уражанне белых».

Але не ў гэтым для мяне галоўнае. Далей ён піша:

«Падобнае акрэсленне бусла з распасцёртымі крыламі як белакрылага знаходзім мы яшчэ ў Авідзія».

Вунь ажно дзе ды калі!.. Усе яны – украінец, паляк, старажытны рымлянін – ішлі ад жыцця, вялікая паэзія звязана з ім непарыўна, яна сама – жыццё, увекавечанае ў слове.

І нежыццёвым, непраўдзівым было б замоўчваць, як, гледзячы на тое, што я бачу сам, я і ўспамінаю сказанае – ад перажытага – іншымі, перажываючы яго па-свойму, зноў.

Клекачыце, буслы! Няхай жыве, як сонца, вечная паэзія! І тут, над нашай ракою.

1971 г.

Міхась Стральцоў

Апавяданне «Сена на асфальце»

Ліст першы

Часта я пытаюся ў сябе: як мы сустрэліся і чаму?

Памятаю, яшчэ калі вучылася ў школе, мне неяк не па-дзіцячы хацелася смутку, таямнічага, незвычайнага лёсу. Прайшлі гады – я спазнала смутак і зразумела, што навучыцца смутку нельга, як нельга навучыцца і радасці. На ўсё свой час. Яшчэ я ведаю цяпер, што з гадамі душа цішэе, лагаднее, супакойваецца, але не засынае: яна, як і раней, шукае радасці, толькі ведае ўжо, што хоча іменна яе. Вось чаму я думаю, што пасталелы чалавек большы рамантык, чым ён быў у раннім юнацтве. І калі я зразумела гэта, я сустрэла цябе. Раней бы мы не сустрэліся, бо не зразумелі б адно аднаго.

Памятаеш нашу першую сустрэчу?

Тою раніцай я заходзіла да сваіх знаёмых па апельсіны: яны недзе дастаюць іх, сказалі, што могуць дастаць і мне. А я падумала, што добра будзе занесці іх Лёльцы, сестрыной дачушцы: ты ведаеш, малой не вельмі соладка жывецца. Сястра даўно не ладзіць з мужам, усё не можа дараваць яму нейкія мужчынскія грахі – яны часта сварацца, а малое бегае ад бацькі да маці, не ведаючы, да каго хінуцца. А дзяўчынцы пяць год, і яна такая слаўная.

Той раніцай, памятаю, ішла я паўз кінатэатр. Памятаю, як пад ягоным дахам, недзе там, за шэрымі калонамі, заўзята чырыкалі вераб'і, унізе, ля ўвахода, прыбіральшчыца шчыравала з дзеркачом, а на сцяне, над ёю, ружова білася, то святлеючы, то робячыся гусцей, трапяткая сонечная плямка. І ўедліва-церпка пахла пылам. Я люблю, калі пахне пылам, а ў тую вясновую раніцу вуліца пахла яшчэ і свежымі булкамі, і духмянай кавай, і цвярозлівым халадком маладой зялёнай лістоты. Я паціху ішла сабе тратуарам і ўглядалася ў абліччы нячастых прахожых. Ты ведаеш, ты, можа, прыкмячаў гэта сцішанае, смужліва-мройнае ззянне, што бывае вясной на тварах у людзей, на тварах, ледзь кранутых першым загарам? Такое яшчэ можна заўважыць, зазірнуўшы чалавеку ў твар, калі на вуліцы ціхі і цёплы дождж. А ты заўважаў, што ў дождж хораша і лёгка думаецца, а на душы бывае так светла і ясна?

У тую раніцу ты быў такі спакойны, стомлена-ціхі нейкі, усмешлівы і лагодны. І ты так смешна і па-дзіцячы лёгка тады гаварыў. Памятаеш, калі я рассыпала на рагу вуліцы апельсіны і ты немаведама адкуль нахапіўся іх падбіраць?

Усё нібы ў тую раніцу спрыяла таму, каб мы сустрэліся з табою.

А якая была тады вясна! Дзе толькі не былі мы з табою тою вясной! У дождж да позняй ночы праседжвалі мы ў скверах, накрыўшыся тваім пінжаком, і, памятаеш, колькі разоў пачыналі думаць пра тое, каб некуды з'ехаць, далёка-далёка, у таямнічыя нікому не даступныя мясціны. Што за жаданні былі ў нас, няўжо каханню трэба, каб былі толькі яно і цэлы свет? Мы куплялі на вакзале білеты ўсё роўна на які

цягнік – і колькі незнаёмых вёсак, рэчак, лясоў і палян неспадзявана адкрылі мы так для сябе. А кінатэатры на ўскраінах горада – старыя, са скрыпучымі лаўкамі, з вышараванай нагамі, выбітай да ямак падлогай? А сеансы, на якіх ад суседа па лаўцы часам нясцерпна пахла гарэлкай, у час якіх ірвалася лента і рабілася цёмна, хоць выкалі вока, і тады ў зале ўсчыналіся свіст, крык, не вельмі далікатныя жарты. Ніхто не ведаў там нічога пра нас, і гэта было прыемна, як, мусіць, прыемна было якому-небудзь прынцу са старога рамана, пераапранутаму жабраком.

А потым у нас пачаліся нелады. Ты як бы помсціў за нешта мне, як бы знарок стараўся абразіць мяне – які ты быў жорсткі і ў той жа час нейкі разгублены ў сваёй халоднай зласлівасці. Мне было з табою так цяжка. Навошта ты рабіў гэтак?

Толькі пазней я здагадалася, што ты раўнаваў мяне, што ты баяўся мяне страціць. І тады, зразумеўшы, я даравала табе ўсё.

Гэта было ўжо летам, пасля таго як я паехала з нашага горада, сказаўшы, што мы надакучылі адно аднаму, што нам трэба адпачыць, пабыць на адзіноце, разабрацца ў сваіх пачуццях.

Я паехала тады да цёткі, у ціхі і зялёны гарадок – былы абласны цэнтр. Мне якраз і трэба было гэта – цішыня, вузкія вуліцы, гаршкі з кветкамі, падвешаныя да ліхтарных слупоў, санлівыя жанчыны ў кіёсках з газетамі. Усё проста, зразумела і трошкі сумна. І ніхто не здзівіўся б, каб аднойчы на вуліцы паявіліся хоць бы козы.

У тым горадзе ёсць рака, а ў яе за горадам, ля невялікай вёскі, упадае, выліваючыся ў тры ручвы, неглыбокая халодная рэчка. Над правым ручвом – пясчаны бераг, парослы лазой, за ім – гара з шатрыстымі цёмнымі соснамі.

Кожны дзень я хадзіла на тую рэчку купацца.

Ляжыш на беразе – трымціць, снуецца ў шырокіх ручвах вада, бялеюць на рачных астраўках валуны, сіняя тамлівая смуга вісіць над вадою там, дзе робіць паварот рака, дзе пад гарой насыпанага самазваламі пяску ракоча пад'ёмнік, грузячы баржы. Хлапчукі з берага ловяць вудамі рыбу. У полудзень заходзяць у рэчку каровы, стаяць у вадзе, махаючы хвастамі, – плыве, пялёхкае рака, і паволі плыве час, цягучы, як звон конікаў у вушах. О, салодкая, лянотная бяздумнасць, о, жыццё душы, дрымотнае, як звон вады, тамлівае, як сіняя намітка смугі! Вочы бачаць, чуюць вушы, і, ціха стаіўшыся, лечыцца душа. Млеюць ад гарачыні палі, цячэ, снуецца ў сонечных промнях рака, далёка на ўзмор'і тужаць аб свежым ветры караблі, і вось-вось скаланецца сонная сінь, павее вецер і пагоніць караблі ў краіну добрых сустрэч. І тады я таксама пастаўлю ветразь.

Так я вярнулася да цябе.

Лена

Дзядзька Ігнат

Я ішоў на спатканне з Ленай, калі на нашым двары ўбачыў дзядзьку Ігната.

Быў надвячорак. Дурманліва пахлі кветкі, вокны ў доме былі расчынены, і ў нечай кватэры задумліва вяла ціхую мелодыю радыёла. У двары на лавачках сядзелі жанчыны, мужчыны сумавалі побач з імі: курылі, нізка ўгнуўшы плечы, пыхкаючы дымам сабе ў кулак – той-сёй быў без кашулі, у майцы.

Дзядзька Ігнат стаяў ля нізкай агароджкі перад домам, глядзеў, як нейкі таўставаты чалавек у піжаме паліваў са шланга газон з кветкамі.

– Пастой, Віктар, раскажы, дзе быў, што бачыў, – не паварочваючы галавы, лагодным і роўным голасам сказаў да мяне дзядзька Ігнат. Я толькі што параўняўся з ім і хацеў быў павітацца.

Я стаў, лапнуў рукамі па кішэнях, успомніўшы раптам пра курыва, – дзядзька Ігнат зноў лагодна і спакойна сказаў:

– Яшчэ ўздумаеш рознымі «фільтрамі» частаваць – закуры лепш махры. – І падаў мне капшучок з кішэнькаю збоку: у ёй была акуратна нарэзаная газета. – Куры.

Я закурыў.

Лілася са шланга, пырскала вада, бубацела па лісці кветак – хораша пахла сырой зямлёй. Чалавек у піжаме, не гледзячы, вадзіў шлангам перад сабой – позірк яго быў недзе далёка: можа, чалавеку сумная была яго работа, а можа, быў у яго свой, асаблівы, аднаму яму зразумелы настрой, і ён пад безуважнасцю хаваў яго, не хацеў, каб здагадаўся пра яго хто іншы.

Усё здавалася трохі загадкавым, таямнічым там, дзе быў дзядзька Ігнат.

– Ну, дык як мая махорачка – Маскву ўбачыў, га? Гэта, брат, не тое, што твая трава. Па-мойму, дык мужчыне і курыць яе брыдка: лепш ужо мох са сцяны выскубаць... Хаця дзе ты ў горадзе той мох знойдзеш!

– Махорка як махорка, – знарок абыякава сказаў я. – Масквы не ўбачыў, але горла дзярэ.

– Значыць, нічога ты не разумееш... Во, як ён, – паказаў на чалавека са шлангам. – Я кажу: навошта кветкі паліваць, калі ноччу дождж будзе, а ён не слухае, рады, што занятак знайшоў.

– Адкуль вы ведаеце, што ноччу будзе дождж?

– Я, хлопча, сорак з лішкам у вёсцы пражыў – чаму не ведаць?

– На старой кватэры гэта было, – сказаў раптам чалавек у піжаме. – Сусед у мяне, бывала, нап'ецца, уключыць у пакоі прыёмнік на ўсю моц, ляжа на канапу і слухае. Жонка ягоная лаецца, сам бы яму, здаецца, у каршэнь надаваў, а ён: не ваша, кажа, справа, дайце мне асалоду адчуць – так яшчэ сам Пушкін некалі казаў... Дзе ён пра таго Пушкіна ўзяў – чорт яго ведае... Так і я. Можа, і я хачу асалоду адчуць.

– А гэтага табе ніхто не забараняе, – строга сказаў дзядзька Ігнат. – Гэта іншая справа. Я толькі пра дождж кажу.

– Дождж дык дождж... – сказаў чалавек у піжаме. – Не пашкодзіць і дождж.

– Заўтра футбол, – сказаў я. – Навошта той дождж?

– Футбол будзе днём, а дождж сёння ноччу, кажу, – паправіў мяне дзядзька Ігнат.

– Нашы заўтра выйграюць, вось пабачыце, выйграюць, – сказаў чалавек у піжаме. – Паспрачацца магу.

– Гэта як сказаць, – запярэчыў я. – Каманда прыедзе моцная, а нашы перад гэтым такую дурную зрабілі нічыю...

– А я думаю так: з моцнай камандай лягчэй гуляць. Нашы найчасцей слабым і прайграюць.

А дзядзька Ігнат сказаў:

– Не разумею я балельшчыкаў вашых ды хіба яшчэ рыбакоў – тых, што з вудамі цэлыя дні сядзяць... Бывала, паедзеш на луг, намахаешся касой за дзень, а ўвечары – за таптуху ды ў якую застаялую азярыну. На ногі лапці абуеш. Касіць і рыбу лавіць у лапцях найлепш. Ну, яшчэ, можа, кароў пасвіць... Дык я і кажу: набоўтаешся, вылезеш на бераг – і рыба ёсць, і сам нібы ў святой вадзе выкупаўся. А потым раскладзеш цяпельца ля будана ды ў чыгунок рыбу, у чыгунок... Эх, ліха табе!..

– Вам, дзядзька Ігнат, у вёсцы жыць трэба, – сказаў я.

– Можа, і пераеду яшчэ ў вёску – адкуль ты ведаеш, – чамусьці пакрыўдзіўся дзядзька Ігнат. – А ты што – без вёскі можаш пражыць?

– Чаму? Я ведаю, што без вёскі нельга, але і без горада нельга таксама. Што я думаю. дык гэта – каб тое і другое ў чалавечай душы прымірыць...

– Бач ты яго – прымірыць! – ужо зазлаваў дзядзька Ігнат. – Харошы мір, калі такія, як ты, з вёскі ўцякаюць, з зямлі, дзе бацькі іх горб нажылі.

– Я не ўцякаў, але калі на тое пайшло, дык у вёсцы можа якіх пятнаццаць працэнтаў насельніцтва жыць, – і хлеба, і малака ўсё роўна ўсім хапаць павінна...

– Гэта па-навуковаму, ці як?

– Можа, і па-навуковаму. А чаму гэта дрэнна?

– А таму дрэнна, – усхадзіўся дзядзька Ігнат, – што некаторыя думаюць, быццам батоны на вярбе растуць... А таму, што да зямлі пашаны няма. Адпрацуе на трактары калыглуз які, што дзесяць класаў скончыў і ў калгасе стаж зарабляе, каб з вёскі ўцячы, – адпрацуе змену ці менш, на чуб флакон адэкалону вылье – і да дзявок. Яму хоць трава не расці...

– Табе, Сцяпанавіч, старшынёй бы ў калгасе быць, – сказаў чалавек у піжаме. Ён кінуў ужо свой шланг, стаяў, склаўшы рукі на грудзях, і слухаў. – Па справядлівасці, Сцяпанавіч, кажу.

– А ты думаеш, не быў? – нібы здзівіўся дзядзька Ігнат. – Не старшынёй, дык брыгадзірам быў. Адразу пасля вайны... І ўспамінаць не хочацца, і каб не хацеў – успомніў бы: такі быў той час. Такую вайну на плячах вынеслі, столькі пакінулі сірот, матак няўцешных і ўдоў. Столькі аратаяў, цесляў на той вайне палягло... А ты застаўся, галавы сваёй не злажыў; ацалеўшы, дамоў прыйшоў. Табе трэба новае жыццё будаваць, удовамі табе камандаваць трэба... І вось прыходзіць да цябе ўдава і, каб прывезці дроў, каняку просіць і, здаралася, паўлітэрка з-пад палы дастае... Толькі я за

паўлітэрка тое не вінавачу яе. Не з хабарам яна прыходзіла, не сумленне тваё купляць. Ведала яна, як цяжка было таго каняку даць, спачування яна прасіла твайго. А чым яна аддзякаваць магла? Сама гародчык свой арала, карову ставіла ў плуг. Дровы з лесу на саначках вазіла, у калгас летам кожны дзень ішла... Пра тое я кажу, што на хабар не здольны просты чалавек. А што былі такія – і брыгадзіры, і старшыні, і падстаршынкі былі, што на людскім горы падчаровак гадавалі, тую ўдовіну гарэлку ў глотку лілі, бо надта шырокая была, – дык няхай ім абзавецца і на гэтым свеце, і на тым, калі ён ёсць, удовіна сляза...

Дзядзька Ігнат нервова тарганўў галавой, дастаў з кішэні капшук і закурыў.

– Значыць, так і не ўдалося табе, Сцяпанавіч, да старшыні дарасці? – як бы спачуваючы, сказаў чалавек у піжаме.

– Не ўдалося, – сумна ўсміхнуўся дзядзька Ігнат. – І ўсё праз гэтых удоў... Суседка ў мяне была, Арынкай звалі. Дробненькая, кірпатая, вечна ў ватоўцы хадзіла. Мужык не вярнуўся з вайны, хата ў акупацыю згарэла. Шкада мне было яе. Замуж другі раз не выйшла, а дзяцей аж двух ад розных прайдзісветаў прыблудных завяла. Паставіла хату. Што там за хата была, уявіць можна: два акны, а там, дзе яшчэ павінны быць вокны, – паабтыканыя мохам цурбакі...

У нас фінінспектар быў – п'яніца. «Куфрам» звалі. Па куфрах іншым разам лазіў, падаткі спаганяў. Ну, бывае, няма ў чалавека грошай, дык ты пачакай: свінчо, можа, якое прадасць, расплоціцца. Дык не... А залатыя ж у нас людзі, усё разумеюць, усё могуць змагчы. У самыя цяжкія гады яны ў нашу добрую справу верылі... Дык ты ж да іх павінен падысці па-чалавечы.

Але вось пачаў гэты службіст Арынку трэсці. Да таго разышоўся – карову абрытаў. Кабета ў слёзы – не жартачкі. Пачуў я, прыбег і – цяпер не шкадую і шкадаваць не буду – набіў таму гаду тоўстую морду. Набіў. Ну, пасля гэтага і ён пастараўся, каб мне жылося не гладка. Ледзь справу на мяне не завёў, пад палітыку падводзіў... А тут жонка ў мяне хварэць пачала. Сваяк, яшчэ да вайны з вёскі паехаў, у горад заве... Адным словам, паехаў я, слабасць душэўную паказаў... Слухай, Віктар, – сказаў раптам ён, – хочаш заўтра са мной на сенакос схадзіць?

– Гэта куды, дзядзька Ігнат, у вёску?

– Навошта ў вёску? На плошчы, на газонах, вунь якая трава парасла – навесці парадак трэба... Бачыш, у мяне і ў горадзе служба па душы.

– А ўставаць рана трэба, дзядзька Ігнат?

– Рана. Хочаш, пабуджу?

– Не, я сам устану. Не трэба.

– Ну вось і добра. А касу другую ў майго напарніка возьмем. Значыць, згода?

– Добра, дзядзька Ігнат, – сказаў я.

– Ну вось і добра, – сказаў ён. – А цяпер можаш ісці. Ідзі гуляй... Тваё дзела маладое... Ідзі.

І я пайшоў.

Ліст другі

Дружа, сёння ў мяне лірычны настрой: давай уявім сабе, што мы разам, давай сядзем побач – пагрэемся ля нядымнага агню нашай дружбы. Будзь блаславёная, нечаканая сустрэча, маўчыце, трубы, бубны і фанфары, – цішыня наўкол, і мы адны. Так. Чаго не стае нам яшчэ? Мо трошкі, трошачкі смутку – мы будзем успамінаць...

Мы вучыліся з табой у адной школе. Давай закінем за плечы яшчэ няцяжкую ношку гадоў і пойдзем туды, на парог сваёй першай навукі. Мы будзем ісці і лясной дарогай, і палявой, і сцежкай па беразе ракі, і ехаць на падводзе, але болей ісці пешкі. Няма чыгункі, няма шашы, і поезда няма, і аўтобуса – іх мы не ведалі тады.

Пойдзем пешкі.

Але, слухай, ты ведаеш, той нашай школы цяпер ужо няма. Помніш хату цёткі Аўгінні – старую, без гародчыка пад вокнамі: вокны на вуліцу, помніш шырокі мурожны двор і напаўраскрытую паветку? Хату цётка некуды прадала, сама пераехала жыць да замужняй дачкі ў суседнюю вёску. Але – нічога. Тая хата жыве ў нашай памяці: вось мы прыйшлі да яе і селі на парозе...

Ну што ж, звіні – я цябе чую і сёння, зроблены з шурпатай снараднай галоўкі школьны званок!

У тую восень, калі мы ўпершыню селі за парту, яшчэ ішла вайна. Недзе далёка былі нашы бацькі: чый ваяваў, слаў дадому пісьмы, а чый маўчаў – і тады ўсё некуды пісалі пісьмы нашы маткі. І вось адтуль, аднекуль, прыходзіў нарэшце адказ – вузкаваты лісток з друкаванымі літарамі, і ў ім, закрэсленыя чорнай рысай, нейкія словы, а тое, што аставалася, чыталася ўсюды аднолькава, чыталася так: прапаў без вестак.

Над гэткім лістком плакала ў тую восень мая маці.

Яна часта плакала ў той год: і раніцай, калі выпраўляла мяне ў школу, пачапіўшы палатняную торбачку з кніжкамі на маё плячо і даўшы ў рукі новенькую трохрублёўку на Чырвоны Крыж, і раніцай, калі не пускала мяне ў школу і я сядзеў цэлы дзень на печы, бо не было чаго абуць на ногі.

Над такой паперкай плакала ў тую восень і твая маці.

Але твой бацька не загінуў, ён вярнуўся: памятаеш, ты саромеўся казаць мне, што ён быў у палоне. Ты не мог дараваць яму гэта, і, навошта таіць, не мог дараваць і я.

Давай жа цяпер, дружа, паклонімся невядомай магіле майго бацькі, і камень той, кінуты на пакутную дарогу бацькі твайго, давай падбяром таксама. Ні мой, ні твой бацька не вінаватыя перад часам і перад вайной...

Многа чаго не разумелі мы з табою тады...

Што ж, звіні, звіні – я цябе чую і сёння, зроблены з шурпатай снараднай галоўкі школьны званок!

У хаце цёткі Аўгінні, у першай нашай з табою школе, скончылі мы чатыры класы і прайшлі, як кажуць, пяты калідор. Калідора папраўдзе не было; была звычайная

кухня з шырокаю печчу, са сталом, з лаўкаю для чыгуноў і для вядра вады. Калідоры былі потым, у іншых школах – сямігадовых і дзесяцігадовых, але ўжо не ў нашай вёсцы.

Раніцаю, ледзь пачынала віднець, увосень і зімою будзілі нас маткі: на камінку гарэў агонь і закіпаў на трыножцы чыгунок з бульбай...

І дагэтуль да самых малых драбніц помню я дарогі, па якіх хадзілі мы ў школу.

Як назваць нам тыя гады? Былі яны трудныя, бедныя, але яны не паўторацца: там, у звычайнай пасляваеннай вёсцы, пачыналіся з табою мы. Памятаеш, як зачытваліся мы Тургеневым, Чарнышэўскім, памятаеш, якую ўладу мелі над намі Рахметаў, Базараў? Не ведаю, як можна назваць гэтую пастаянную напружанасць душы, гэты парыў да самаахвярнасці, да радасці і нават да тугі – і гэта было, і я думаю цяпер: якія мы былі шчаслівыя, як многа было ў нас наперадзе, якое вялікае, таямнічае жыццё чакала наперадзе нас!

Тое жыццё, што было побач, мы не прымалі ў разлік. Да глыбіні душы абражалі нас несправядлівасць, падман і няшчырасць; не райская ідылія была наўкруг нас, але гэта было ў нас, у нашай вёсцы, а сапраўднае жыццё было недзе далёка; што яно было, мы не сумнявaліся, – яно чакала нас, і ніяк, ніяк не магло яно без нас абысціся! І недзе там, далёка, быў чалавек, якому мы верылі больш, чым сабе.

Цяпер мы ўжо не верым таму чалавеку. Ды яго ўжо і няма. Патроху ды памалу вучымся мы ва ўсім пакладацца на саміх сябе.

Памятаеш, за вёскаю, у бярозавым гайку, за якім пачыналася высокае камяністае поле, закапалі мы бляшаначку з-пад ваксы, і ў ёй – запіску са словамі Мікалая Астроўскага: «Самае дарагое ў чалавека – гэта жыццё...» Тады, помню, была восень, парывіста шумеў пад ветрам бярозавы гаёк. Мы закапалі тую запіску і, сцяўшыся ад хвалявання, ад трывожнай нязвыкласці толькі што зробленага, стрэлілі з самапала. Усё было ўрачыста, таямніча, і ўсё было падобна на клятву...

Што ж, пойдзем, дружа, пад нашу бярозку, давай возьмемся за рукі, пастаім, паслухаем ноч, цішыню і сябе саміх. Што б ні здарылася з намі, як бы ні пайшло далей наша жыццё, давай дамовімся з табою, дружа, што ніколі не скажам пра сябе словамі паэта:

Что я в ту пору замышлял,
Созвав товарищей-детей,
Какие клятвы им давал, –
Пускай умрет в душе моей,
Чтоб кто-нибудь не осмеял...

Давай дамовімся, дружа. Вось табе мая рука.

Твой Віктар

Заўтра футбол

Дзядзька Ігнат казаў праўду: ноччу быў дождж. Была навальніца.

На дождж пачало брацца яшчэ звечара. Мы з Ленай не сталі чакаць дажджу. Можна было схавацца ад яго ў кіно, але білеты на вячэрнія сеансы былі ўсюды прададзеныя. Я пасадзіў Лену ў перапоўнены тралейбус, і яна паехала. Я пайшоў дадому пешкі.

На горад насоўвалася цёмная маўклівая хмара. Было душна, вецер яшчэ не ўсчынаўся. Многа людзей вярталася ў горад – на матацыклах, матаролерах, у легкавушках. Над кінатэатрам бледна мігала рэклама. Ля кафэ на рагу вуліцы стаялі, сабраўшыся купкамі, святочна апранутыя хлопцы і дзяўчаты. Пахла парфумай, газіроўкай і цыгарэтным дымам. Кволым, нібы збалелым жоўтым святлом запальваліся ў дамах вокны. Нейкі дзядзька ў саламяным капелюшы нёс на плячы вудачкі, у руцэ ў яго была гаспадарчая сумка: з яе вытыркалася трава, у сумцы, мабыць, была рыба. Пасярод вуліцы стаяла міліцэйская машына: рэпрадуктар па-казённаму нудна даводзіў, што нельга парушаць правілы вулічнага руху.

Ні вулічныя, ні якія іншыя правілы парушаць мне не хацелася.

Я ішоў і думаў пра Лену, пра тое, што заўтра нядзеля і, значыць, будзе футбол. Білеты на футбол у мяне ёсць: мне і Лене. Я думаў, што заўтра раніцай, да футбола, калі распагодзіцца, мы паедзем з Ленай на возера. Там будзе людна, але мы, калі захочам, будзем адчуваць сябе нібы адны. Нам будзе добра. Мы будзем часта і падоўгу купацца, будзем, знясіленыя, ляжаць на беразе, потым я схаджу да латка па напітак і бутэрброды, а потым мы пойдзем на трамвайны прыпынак. У трамваі будзе цесна, нават трошкі цемнавата ад густой цеснаты загарэлых твараў, плячэй і рук; мы будзем стаяць побач, блізка прыхінуўшыся адно да аднаго, я буду глядзець у стомленыя, трошкі затуманеныя Леніны вочы, бачыць бледнаваты шрамок у яе на лбе, бачыць яе разгубленыя вусны блізка ад сваіх, і мне захочацца, вельмі захочацца пацалаваць яе, і яна здагадаецца пра гэта, будзе гарэзна глядзець на мяне і смяяцца.

Я думаў пра дзядзьку Ігната, пра яго дзіўную і такую зразумелую любоў да вёскі, і мне чамусьці было трошкі шкада яго. Я думаў пра тое, што я вось ведаў і горад, і вёску, спаў у будане на лузе і ў нумары гасцініцы, смаліў кабана і ведаў, як сякуць на зіму капусту, курыў ноччу са стомленым шафёрам у таксі і піў на вясковым вяселлі самагонку, спрачаўся пра Хемінгуэя і Ўрубеля, падоўгу прастойваў у залах музеяў, вучыўся ў інстытуце, на канікулах касіў у калгасе, радаваўся, расчароўваўся і каяўся, марыў стаць паэтам, а стаў аспірантам па разраду, як кажуць, прыгожага пісьменства. Але справа не ў гэтым.

Мне хацелася, даўно хацелася прымірыць горад і вёску ў сваёй душы, і гэта была мая самая патаемная і самая душэўная думка.

А можа, праўда дзядзькі Ігната, і чалавеку па-сапраўднаму трэба што-небудзь адно: горад ці вёска, месяц над хатай ці электрычны ліхтар?

Не, мусіць, не так. Я бачыў з самалёта неба: сонца залаціла перыстыя аблокі, і яны гарэлі чыстым незямным агнём. Кучавыя воблакі ляжалі ўнізе, здавалася, на самай зямлі – зямля была далёка, і далёка было відно наўкол, і здавалася, у нейкі міг страчвала над табою ўладу ўсё зямное, і здавалася, у нейкі міг ты пазнаваў вечнасць – халодную вечнасць, прывабную і чыстую, як залацістае ззянне аблокаў. А з неба ўсё лілося і лілося невыказна чыстае святло, і здавалася, вось-вось надломіцца нешта ў душы, і ты больш, чым жыцця, захочаш смерці, бо там, дзе душы кранаецца вечнасць, не існуе мяжы паміж жыццём і смерцю...

О зямля! Ты даеш нам тугу па небе, але не меншая наша туга па табе. З далёкіх і блізкіх дарог вяртаемся мы да цябе, і спеў жаваранка аглушае нас не меней, чым гул рэактыўнага самалёта. Неаднойчы так было і са мной, і часта я думаў: навошта выбіраць паміж жаваранкам і рэактыўным самалётам? Хіба ж нельга, каб было і тое і другое? І, мусіць, не ўся праўда ў дзядзькі Ігната, праўда ў таго, у каго яе больш.

Не, я не дакараў дзядзьку Ігната. Я думаў, што кожны чалавек павінен добра ведаць сваё месца на зямлі, што кожны, урэшце, мае права любіць нешта асабліва моцна, – няхай так: гэта ўсё ж лепш, чым не любіць нічога.

Не, я ўсё ж паважаў дзядзьку Ігната. Я ішоў і думаў, як заўтра мы пойдзем касіць на плошчу, як я вазьму ў рукі касу, якую даўно ўжо не браў, як гэта добра, што мы будзем касіць у горадзе. І мне здавалася, што заўтра са мною павінна здарыцца нешта асабліва значнае і важнае, што заўтра, можа, канчаткова вырашыцца мая даўняя спрэчка з самім сабой...

Ліст трэці

Добры дзень, Андрэй і Куліна!

У першых радках свайго пісьма саабшчаю вам, што мы жывыя і здаровыя, чаго і вам жадаем. Пісьмо ваша палучылі, за што дзякуй, а таксама, што не забываецеся на нас і завяце ў вёску, каб прыехалі ў гэтае лета. На гэта скажу, што не ведаю, бо адпачынак мне даюць заўсёды ўвосень: летам у мяне ў горадзе самая работа.

Толькі вы як бы адгадалі мае думкі: стары я станаўлюся і ўсё больш і больш пачынаю думаць пра нашу вёску, а як успомню, што там, дзе стаяла мая хата, чужы двор і чужая гаспадарка, дык і кажу сабе: дурны ты, дурны, чаго ты са свайго гнязда сарваўся, чаго пайшоў у белы свет як у капейку!

І старая мая на тое, каб назад вярнуцца, даўно падбівае. А вы ведаеце, што калі сам хочаш вярнуцца ды яшчэ калі жонка за тое голас падае, дык тут і думаць няма чаго.

Грошай трохі мы сабралі; каб купіць халупу, хопіць, а там, як кажуць, бог бацька; рукі ёсць, горб таксама, можна і новую хату паставіць.

Быў тут Піліпаў хлапечык у нас – такі дзівак, грошы, яшчэ студэнтам пазычаныя, прынёс. Даўно гэта было, а не забыўся. Я не пра грошы кажу, грошай тых старымі якіх пяцьдзесят рублёў, а толькі прыемна, калі чалавек харошы, ды яшчэ з тваіх мясцін. Я і не ведаў, што ён пасля інстытута ў нас у раёне ляснічым працуе. Вось гэта добра, што вярнуўся дамоў.

У мяне да цябе, Андрэй, мужчынская просьба. Як тады гэты Піліпаў хлапечык быў, пасаромеўся я слова сказаць, каб ён мяне, калі што якое, лесніком дзе прыстроіў. Скажы цяпер яму. Скажы, што я чалавек ціхі, любіцельскі: у лесе, можна сказаць, гадаваўся – і лес люблю. А то во і вы пішаце, што як піларараму ў нас паставілі, дык многа лесу без пары і толку на глум ідзе... Ён чалавек, я думаю, хоць малады, а з душой і павінен зразумець.

Навін у нас асаблівых няма. Хлопец наш малодшы служыць у арміі, астаўся яму служыць адзін год. А больш навін у нас ніякіх няма.

Адпішыце нам, а мы, як ад вас пісьмо палучым, адразу адпішам.

Бывайце здаровы.

Ігнат

Пара касавіцы

Яшчэ не хадзілі трамваі, тралейбусы, вуліца была пустая і мокрая ад дажджу. Недзе за горадам узыходзіла сонца. Яно не абзывалася яшчэ ў горадзе, але я ведаў: сонца ўзыходзіла. Таму-сяму, як і дзядзька Ігнат, я навучыўся ў вёсцы. Было чатыры гадзіны раніцы.

Далёка-далёка, у маёй і ў дзядзькі Ігнатавай вёсках, пастух выганяў наранкі кароў.

А мы ішлі з дзядзькам Ігнатам па мокрым ад дажджу тратуары, і на плячы я нёс касу. Касу мы ўзялі ў дзядзькавага напарніка, дасталі з падстрэшка дашчанай нізенькай пункі, крытай толем і рудой гарбатай бляхай. Было лета, і дзядзькаў напарнік спаў тут жа, у пуньцы: нам не трэба было заходзіць у дом.

Вуліца была пустая і мокрая ад дажджу. Было ціха. Па дарозе на плошчу мы ўбачылі толькі вартаўніка ля гастранома ды нейкага дзівака ля аўтамата з газіраванай вадой. Дзівак усё тыцкаў і тыцкаў пальцам у кнопку аўтамата, грукаў па ім кулаком, але вада не ішла. Дзіваку было год дзевятнаццаць: які-небудзь сасмяглы ад кахання студэнт. Салют табе, браце, і шчырыя пажаданні ўдачы! Перадавай прывітанне маёй студэнцкай маладосці! Мы прыйшлі на плошчу.

Далёка-далёка, у маёй і ў дзядзькі Ігнатавай вёсках, нехта здымаў з пляча касу. Узыходзіла сонца. Стаяла высокая, пасівелая ад туману і густой расы трава. Звінела пад мянташкай каса...

– Пачакай, – сказаў дзядзька Ігнат, спыніўшыся на краі шырокага газона, абсаджанага роўным кустоўем. – Давай пакуль перакурым. – І асцярожна палажыў касу на шызую, набрынялую холадам елачку. – Пачынаць буду першы я...

Ён гаварыў ціха. Раніцай нельга моцна гаварыць.

Я маўчаў.

– Паглядзі, як там у цябе на касільне пупок. Каб высака не быў.

– Не, у самы раз... Толькі ў нас гэта не пупок завецца, а лучок. У нас лепш...

– Як вядзецца, так і завецца. Лучок... А як у вас завецца распорка з сеткай, што да касы прыладжваюць, калі косяць грэчку? Вось гэта – дык завецца лучок!

– Як у нас завецца? Чакайце, дзядзька Ігнат... Не, нешта не ўспомню.

– Як успомніш, скажаш мне.

Ён нават не ўсміхнуўся. Сур'ёзна ён казаў ці кпіў з мяне? Але я не крыўдаваў на яго, мне нават чамусьці было прыемна, што ён правучыў так мяне.

– Дайце мне мянташку, – сказаў я, – пагляджу, можа, у маёй касе лапатуха якая завялася. Га, дзядзька Ігнат!

– Чакай, спярша я сам. Але давай лепш пакурым. Закуры махры.

– Давайце.

І вось мы стаялі, курылі моцную, аж займала дух, ядавітую махорку. Харошая была махорка!

Было ціха, была раніца, быў горад, і мы збіраліся ў гэтым горадзе касіць.

– Як трымаць касу, не забыўся? – пытаўся дзядзька Ігнат. – Эх, браце! І навошта табе кніжная навука? Марнуеш ты маладосць. Пайшоў бы я на тваім месцы ў грузчыкі, у плытагоны, у кавалі. Сілу б у плячах адчуў. Апетыт бы меў воўчы. Сіла была б, як у каня... Ты не смейся. Ты малады яшчэ, нічога ты не разумееш... Бывала, косіш: во гэтак, як сёння, – не так, канечне, я толькі для прыкладу кажу. Косіш, а потым нехта «перакур!» – крычыць. У рэчцы касу абмыеш ды ў цянёк пад куст. А тут дзеўкі пракосы раскідаць прыйшлі... Ведаеш нашых дзевак? Загарэлыя, крамяныя, паркалёвая кофта ды спадніца, але ж дзеўкі што трэба. Засмяецца дык засмяецца, гэта не тое што хі-хі ды ха-ха!.. Ляжыш пад кустом, а яны пацвельваюцца з цябе. Не ўтрымаеш ды да іх: ну, думаеш, пакажу. Бяжыш, схапіць каторую хочаш, а яны – уцякаць... Дагоніш, канечне. Але і кухталёў надае... Але нічога, зможацца. І вось як глянеш тады ёй у вочы... Толькі што гэта я, кавалер гарохавы, табе расказваю, ведаеш сам. Але, брат, паслухай, паківай галавою і – маўчы. Быццам нічога табе не гаварыў... Толькі, брат, маладосць, яна, брат, маладосць... Эх, касанём мы з табою!

Ён неяк пасвятлеў увесь, па-заліхвацку кінуў недакурак, нагнуўся, падняў касу, зашчаміў касільна пад пахай, узяўся рукой за палатно касы і паласнуў па ім мянташкай.

Джгінь-джгінь-шах! Джгінь-джгінь-шах!

Вясёлая, харошая, знаёмая з маленства музыка!

Ён падышоў да шнурка кустоўя, асцярожна пракасіў лапінку, павярнуўся, падняў над мокрай травою касу, прыгнуўся і – пайшоў...

– Насядай на пяткі, Віктар, насядай!

І тады, хвалюючыся, баючыся адстаць ад дзядзькі Ігната, узмахнуў касой і я...

……

Днём ужо, едучы на футбол, я выскачыў з тралейбуса на плошчы. Пякло сонца. Трава ў пракосах завяла. Па пракосах чорныя, аж бліскучыя, жвава скакалі шпакі. Пахла сенам. Вялізны і шумны ляжаў навокал горад. На плошчы па-лугавому, па-летняму пахла сенам.

Я павярнуўся і паціху пайшоў тратуарам, і тут, на тратуары, раптам таксама ўбачыў сена – невядома кім растрэсены клок падсохлага сена. Па-лугавому, па-летняму пахла сенам. «Сена на асфальце, – падумаў я, – сена на асфальце...»

Быццам доўга я шукаў нечаму слова і раптам яго знайшоў.

«Сена на асфальце, – узрадавана думаў я. – Вёска ў горадзе...»

1963 г.

Апавяданне «На чацвёртым годзе вайны»

И капля вод полна трагедий
И неизбежностей полна.
К.Случэўскі

Было гэта на чацвертым годзе вайны. Бабуля – высахлая, з учарнелым ад работы і старасці тварам – адсцябала матузамі малога ўнука за тое, што паабшчыпаў, не дачакаўшыся вячэры, акрайчык ацеслівага, спечанага з бульбы і ячменных шароек хлеба.

Малы не заплакаў, толькі не сваім голасам войкнуў, калі, уцякаючы ад матузоў, хацеў падшыцца пад ложак, – на хаду перадумаў нечага, разгубіўся, і тут яго дагнала, апошні раз балюча сцебанула старая.

Маці таўкла ў хаце проса; яна ўсё бачыла, і калі сын, разгубіўшыся, зыркаў па хаце здзічэлымі, спалоханымі вачамі, ёй здалося, што ён глядзіць на яе, моліць спагады, літасці, моліць заступіцца, і ў яе тады перавярнулася ўсё нутро, і яна падумала, што і сама часам гэтак жа сцябала малога, і цяпер пашкадавала, што рабіла гэтак.

Сын жа кінуўся ад ложка да дзвярэй, з усяе сілы ціснуў рукамі на клямку, біў у дзверы нагамі: маці бачыла, як дрыжаў у яго збялелы падбародак, як захліпаўся сын ад першых, крыўдлівых і роспачных слёз.

Моцна заплакаў ён ужо на двары.

І ёй тады, калі яна пачула гэты ягоны плач, чамусьці стала лягчэй, нібыта яна сама заплакала і ёй прыйшла са слязьмі палёгка.

Яна глянула на хату, на старую, што нечага мітусілася ў хаце, і больш за ўсё яе ўразіў свякроўчын твар – спустошаны і нейкі пакутліва нямы. І яна зразумела, што старая цяпер таксама шкадуе малога і што мітусіцца яна можа таму, што не ведае, куды ёй цяпер дзець матузы і што рабіць са сваімі рукамі.

І яна, маці, не стала глядзець на старую і знарок моцна загрукала таўкачом у ступе.

А старой і сапраўды было не па сабе. Яна не хацела, каб гэта заўважыла нявестка, і хутчэй пайшла з хаты.

Худы, як дошка, парсюк, што нудзіўся ля ганка, адразу ж кінуўся да яе на двары: яна крыкнула на яго, адпіхнула нагой – парсюк зласліва рохкнуў, патрухаў назад да ганка і, нудзячыся, пачаў торкаць лычом у сонечныя дзверы. «І гэты хоча есці, – падумала яна. – А дзе ж ты на ўсіх возьмеш?.. Няхай яно ўсё спрахне...» Яна злавалася і, зазлаваўшы, адчула раптам, што ёй няма чаго рабіць на двары. Але не хацелася вяртацца ў хату, і яна пайшла ў агарод.

Была вясна, было пуставата на градах, яшчэ ні разу не полатых, падзеленых роўнымі, яшчэ не вытаптанымі барознамі. Старая глянула на свежараскапаную прызбу, убачыла, што трухлее ў хаты ніжні вянец, – падышла бліжэй і, нагнуўшыся,

пачала выбіраць з зямлі падсохлы зверху руды баравы мох, якім уцяплілі на зіму прызбу, – выбірала мох і кідала яго ў баразну, бліжэй да плота, дзе кусціліся ўжо кіслец, пырнік, серабрыста-кволая лебяда, дзе ляжала, зламаўшыся, апаўшы на зямлю, нейкае бадыллё ад мінулага лета. Потым яна глядзела, як ўзяліся расці памідоры, капусны качан, высаджаны на насенне, думала, ці добры будзе гэты год. Стары Цімох, у якога на дубе буслянка, казаў, што, мусіць, будзе добры. Ён шмат чаго ведае, гэты Цімох: яшчэ на пачатку вайны казаў, што немец не набудзецца ў нас, бо так і ў бібліі напісана, і во спраўдзілася ж, глядзі, – гоняць немца нашы.

І рабіла, і думала яна цяпер спакойна, але спакой гэты быў несапраўдны нейкі, бо ведала, адчувала, што трывога жыве ў ёй, як у грудзях застарэлы кашаль, і страшнай здавалася ёй цяперашняя няўпэўненасць у сваім раней такім бясспрэчным праве караць.

Яна зноў выйшла на двор, пратупала ў пуню і па драбіне ўзлезла на вышкі. Было задушліва, цёмна пасля двара: поўзала па кутах на каленях, збірала ў прыпол курыныя яйкі. Ужо злазячы долу, абступілася на драбіне, збаялася, што можа разбіць яйкі, разгубілася і ўпала. Ударылася яна не вельмі балюча, балазе было нізка, цэлыя асталіся і яйкі, высыпаўшыся на прыцярушаны сенам сухі гной, але ёй чамусьці стала так крыўдна, так скамянела ў яе нутро, што яна не ўставала, не падбірала яек, сядзела і няўцямна глядзела перад сабой.

Пасля ўжо яна пачула, як на двары клікала малога нявестка, – спачатку строга, па імені, а потым няўпэўнена і спалохана:

– Сынок, дзе ты? Ідзі ў хату, не бойся!..

Малы не адгукаўся – мусіць, некуды збег, і старая, толькі цяпер зразумеўшы гэта, падумала, што, шукаючы малога, можа зайсці ў пуню нявестка, хацела ўстаць, але ёй балюча кальнула ў бок: яна заплюшчыла вочы, і нешта шырокае, імклівае шуганула ёй у вушы, пераняло дыханне. Яна не варушылася, і шум у галаве аціх, як бы прыйшлі аднекуль і бліжэй пасунуліся да яе сцены пуні, і яна, агледзеўшыся, убачыла, як ярка білася святло ў дзіравай страсе, пачула, як шчабяталі на двары ластаўкі. Ляпнулі сенечныя дзверы – пайшла ў хату нявестка, і старая схамянулася, перад вачамі паўстаў малы, тое, як кідаўся ён па хаце, бездапаможна ўгнуўшы ў плечы шэрую, стрыжаную пад нажніцы галаву. Яна бачыла ўсё гэта так выразна, і нічога ўжо на свеце не існавала для яе, акрамя гэтай безабароннай, беднай, няўмела пастрыжанай галавы. І яна шкадавала ўнука, шкадавала, што некалі даўно адсцябала гэтак жа матузамі сына, забітага цяпер на вайне: збіраючыся ў поле, затлумілася, забыла ў пограбе ключ, а потым, не могучы адамкнуць сенцы, вінаваціла ва ўсім сына; ён не прызнаваўся, і яна адлупцавала яго. Давялося вымаць прабой, каб улезці ў хату, а праз дзень, пайшоўшы па нешта ў пограб, яна знайшла ключ, і вось цяпер ёй балюча было ад таго, што ніколі ўжо не скажа сыну, што нізавошта пабіла яго тады, – і ёй ужо здавалася, што ў сынавай смерці вінавата і яна і што няўцешная і горкая будзе цяпер яе старасць. І цяпер ужо ёй хацелася, каб хто-небудзь пашкадаваў яе, каб хапілася, стала яе шукаць нявестка.

А нявестка тым часам была ў хаце, малола ячмень самаробнымі дубовымі жорнамі. Ёй хацелася забыцца ў рабоце, і яна, не разгінаючыся, круціла цяжкі скрыгатлівы круг, пакуль не заўважыла, што круціць занадта хутка – з латачка цякла не мука, а разам з шаройкамі пырскалі, шырока лажыліся на разасланую на падлозе хустку шэрыя крупы. Тады яна паспакайнела, стала менш засыпаць ячменю ў ступку і стала круціць жорны раўней.

Пайшла яна з двара, бо ведала: сын схаваўся недзе паблізу, але цяпер, калі яна паклікала яго, не выйдзе – выйдзе крыху пазней. Яна баялася толькі, каб ён, знясілены крыўдай і плачам, не сцішыўся дзе, не заснуў, і падумала, што скора трэба зноў выйсці, паклікаць яго. Тое, што на двары не было старой, таксама непакоіла яе. «Ат, старое, што малое», – нечакана раззлаваўшыся, падумала яна пасля і пайшла ў хату.

Скрыгаталі, аднастайна шоргалі жорны, і пад гэты шоргат прыходзілі да яе невясёлыя думкі – пра забітага мужа, з якім жыла ўсяго тры гады, пра сына, які не помніць бацькі: бацьку забралі на кадравую службу перад самай вайной, і хто тады ведаў, што сюды прыйдуць немцы, што столькі ў гэтай калатнечы паляжа мужчын. Калі ў фінскую вайну забіла Круцікавага Цімоха, бедавала ўся вёска, а цяпер у кожнай хаце хапае свайго гора. А можа гэта і добра, што сын не помніць бацьку: так будзе лепш яму, але ж затое колькі ёй трэба трывання, жорсткасці да сябе і да людзей, каб паставіць сябе ў жыцці, каб не даць у крыўду сябе і сына. Было б лягчэй, каб не быў такі свёкар – надта памяркоўны ды паблажлівы да людзей. А так – мужчына ў доме, але не гаспадар. Як распускалі калгас, бралі людзі сабе і кароў, і коней, і панарад, і хто парстчэйшы быў – цягнуў і вёў у двор лепшае. Свёкар жа толькі і паспеў узяць, што каня, ды і той – конь не конь. Абарванчык, празваны так за тое, што вырвалі ваўкі некалі паўсцягна. А вось сусед, гугнявы Зміцер, дык гэты – зух! Як адступалі нашы, прыйшоў дамоў; адседжваўся, пакуль не паставілі старастам, а як нявыкрутка выйшла немцам – падаўся ў партызаны. Кажа цяпер, што старастам па заданні быў, але дзе ж ты праверыш... Няхай бы хутчэй скончылася вайна, тады б усё стала відней...

Яна кінула круціць жорны, выйшла зноў паклікаць малога. Але малы, як і першы раз, не адгукаўся. «Ну, пачакай, – падумала яна, – не абыдзецца табе добра, калі, вымерхаўшыся, прыджгаеш дамоў». Успомніла пра старую і ціха, нясмела паклікала:

– Мама! Ці тут ты? Мама!..

І, счакаўшы, паклікала яшчэ.

Рыпнулі вароты і, сагнуўшыся, выйшла з пуні старая, моўчкі па-нядобраму гледзячы на нявестку, патупала да сянец. Ля ганка спынілася, паправіла на галаве хустку і буркнула нешта пра яйкі.

«Чаго гэта яна? – падумала нявестка. – І ёй, мусіць, моташна, і малому дрэнна. А мне хіба лепш?»

Яна выйшла за вароты і стала ўзірацца ў вуліцу, выглядаць малога. Але яго нідзе не было.

...Ён стаіўшыся сядзеў у алешніку, што атуляў лажок каля вуліцы, чуў, як клікала яго маці, але не выходзіў: нейкая помслівая асалода трымала яго ў кустах. Ён даўно ўжо не плакаў і за гэты час, як збег з двара, колькі разоў пачынаў думаць пра свае

ўцёкі з вёскі, надоўга, назусім, – толькі вось каб разжыцца хлеба і выкрасці суконную світку, а там – гайда ў мястэчка, і няхай тады шукаюць, няхай паплачуць і бабуля і матка. Яшчэ вось дзеда шкада, шкада, што не давядзецца пабіцца з «паліцаем» гэтым, Зміцеравым Васілём. Апошні раз дык здолеў яго, нават рассек гэтаму смаўжу губу, але потым, калі прыбегла «паліцаева» матка і стала крычаць і лаяцца, падурному расплакаўся, а гэты «паліцай», мусіць, радаваўся, бо падбрэхваў матцы і не ішоў з вуліцы. Ну, няхай, будзе яшчэ яму. Сёння вось пераначуе ў кустах, а заўтра падпільнуе «паліцая» і адплаціць за ўсё.

Ён адчуў сябе моцным і адзінокім, і гэта было прыемна яму. Успомніў, што сёння раніцай не ўзяў яго дзед у лес, і яму цяпер зусім не шкада было сыходзіць з дому, і ён падумаў, што трэба пакуль неяк ладкавацца нанач – стаў ламаць альховае голле і рабіць будан.

Тут, у будане, ён і заснуў – не чуў, як яго знайшла, перанесла ў хату маці. Прачнуўся ён ужо, калі яго клалі на чыстай палавіне хаты ў ложак і ўкрывалі посцілкай. Прачнуўся і не адразу сцяміў, што з ім, але першым ягоным адчуваннем быў страх. Ён не бачыў яшчэ ні бабулі, ні маткі, адчуваў толькі, што яны тут, ён думаў страхам і неспадзявана для сябе закрычаў: «Дзед, дзед!» – і заплакаў. І адразу ж цішыня ў хаце сказала яму, што дзеда няма, што ніхто не заступіцца, калі здарыцца тое, чаго так ён баяўся.

– Сынок, сынок, чаго ты? Не бойся, – спалохана гаварыла над ім маці і накрывала яго, мацала рукою ягоны лоб. Была нястрашная, вялікая і добрая гэта рука, і ён заплюшчыў вочы і, сцішыўшыся, так ляжаў – паспакайнелы і бяздумны. Яму стала невыказна лёгка, ён не бачыў, як глядзела на яго маці, ён толькі здзівіўся, калі адчуў, як закалацілася яе цела, як яна прыпала да яго, і тады нешта страшна і моцна тузанулася ў яе грудзях, дрыготка і моцна забілася ў горле.

– А сыночак мой, а сіраціначка мая, – жалілася маці, – ніхто цябе не пашкадуе, ніхто цябе не абароніць. А ці ж ты вінаваты, што бацька недзе злажыў галаву, што ніхто не ведае, дзе яго магілка... І гэты Зміцераў смоўж цябе б'е – чаго ж ты, сыночак, яму паддаўся?

Яна забылася ўжо, што нядаўна думала пра жорсткасць да сябе і да людзей, адчувала, што гэта нядобра – так гаварыць над сынам і плакаць, але не магла стрымаць сябе і душылася плачам. І яна не бачыла, як да адчыненых дзвярэй, што вялі на чыстую палавіну хаты, падышла старая, ціха стаяла там, горбячы плечы, – яна схамянулася, калі пачула яе ціхі, трывожліва выразны голас:

– Марусь, а Марусь?! Ідзі-тка сюды...

Яна адхіснулася ад малога, устала, паспешліва выціраючы слёзы, і пайшла да дзвярэй, не разумеючы, чаго хоча ад яе старая, але наперад абыякавая да ўсяго. І зноў каторы ўжо раз уразіў яе свякроўчын твар, пакутліва невідушчыя, стоеныя вочы. Яна не паспела яшчэ што-небудзь падумаць, як стараля здалося, пахіснулася перад ёй, сашчапіла ля твару рукі, і толькі тады яна зразумела: гора сваё не выплакаць ёй адной, старая плача пра тое, пра што плача і яна.

– Марусечка мая мілая, – не гаварыла, а шаптала, нібы дапытвалася ў некага, старая, – што ж нам цяпер рабіць без нашага Андрэйкі? За якія ж грахі асіраціў нас бог?

– Не трэба, мама, не трэба... Напалохаем малога.

Яны стаялі, як ніколі блізкія адна адной, падтрымлівалі адна адну за плечы і ціха плакалі – ужо не столькі ад гора, колькі ад гэтай роднасці адна адной.

А малы, адчуўшы нешта нядобрае, калі пайшла ад яго маці, саскочыў з ложка і цяпер стаяў у дзвярах і спалохана, разгублена глядзеў на іх. Многа разоў ён плакаў сам, і часцей ад крыўды на дарослых, але гэта было не так і страшна, бо тыя ж дарослыя пасля ўшчувалі яго і ўсё даравалі яму. І цяпер, калі перад ім плакалі бабуля і маці, яму здалося, што парушылася, разышлося, як вада, нешта зразумелае, звыклае, і яму чамусьці падумалася, што гэта ён вінаваты ва ўсім, і ўпершыню можа не столькі зразумеў, колькі адчуў ён, якая хісткая мяжа аддзяляе яго ад дарослых, і што, зразумеўшы гэта, трэба браць на свае плечы недзіцячы цяжар.

І ён тады кінуўся да бабулі і маці, угаворваў іх ушчуваў.

– Не плачце!.. Я не буду чапаць больш хлеба... Не плачце!.. Я не баюся Зміцеравага «паліцая»... Мама, гэта я так тады плакаў, а ты не плач...

...Было гэта на чацвертым годзе вайны.

1964 г.

Апавяданне «Смаленне вепрука»

Ідуць ужо халады, бяруцца прымаразкі – ападаюць інеем сырыя туманы. Чарсцвее зямля, і цёмным, ільсняна халодным зяленівам б'е ў вочы парадзелая пры дарозе трава. Ужо выпетрала зяблівa, пасівела ў гародчыках і пазванчэла бадыллё, і панішчымнела паветра. Неба ўдзень ужо ніжэй прыпадае, ціснецца да зямлі. Яшчэ выганяюць на пашу кароў – далей ад вёскі, у лес. Пад вечар жывёла не хоча вяртацца ў хлеў, цаляе адбіцца ў прапахлае бульбоўнікам і сцюдзёным капусным водарам поле.

І вечарамі, і ўранку марозліва, хмельна, бы першаком, пахне ў наваколлі дымам.

Такою парою ў вёсках свяжуюць вепрукоў.

Мне даўно хацелася напісаць адно апавяданне і назваць яго так: «Смаленне вепрука». Цяпер я ведаю, што, бадай, не напішу: баюся, каб тое, пра што хацеў напісаць, не прыцішылася няўзнак, а то і не згубілася там, у здзейсненай пісаніне, а яно ж мне самае важнае. Дык навошта ж тады згадваю і навошта пішу? Мне проста падумалася, што, можа, усё ж абзавецца на астачу нейкай логікай тое, што тут раскажу. Паглядзім.

Я жыў тады ў нечапанай частцы горада, калі надумаўся пісаць, у старым раёне, забудаваным няўклюднымі цагляными, а найбольш драўлянымі дамкамі, што ўсцяж патаналі ў садах. Цяпер мала засталося ад таго раёна – адны лапінкі, астраўкі, зацiснутыя кварталамі несамавітых бязверхіх дамоў. Засталіся ля новых будынін, побач з дзіцячымі пляцоўкамі, то крывая кашчавая яблыня, то вішня, што выросла ў дрэва, – купчастая ў кроне і тоўстая ў камлі. І засталася яшчэ вуліца, хоць і старая, але шыракаватая і роўная, бо быў гэта некалі брукаваны тракт. Назву яму памянялі, адхрышчваючыся ад даўніны, але не памянялі і нават забыліся даць назву базару, што месціцца пры той вуліцы і завецца ён па-старому – Конскі базар.

Увосень, кожнай раніцы ў нядзелю, чуваць было, як парыпваюць на маёй асфальтаванай вуліцы вясковыя вазы, як цокаюць капытамі коні і як вішчаць і рохкаюць у драбінах падсвінкі. Пазней, калі ўстанеш, расходзішся ад сну, паснедаеш, а потым пойдзеш па цыгарэты ў блізкую краму – не прабіцца будзе да прылаўка праз чужых, негарадскіх людзей. Таўканіна, гармідар, і нетутэйшыя дзядзькі гукаюць нечага ад касы да цётак, што стаяць у чарзе, і для большай пэўнасці на мігах нешта паказваюць ім... А на пустцы ля крамы ўжо атабарыліся цыганы. Жанчыны сядзяць з дзецьмі; гарлапаняць, нібы ў полі, увелькі з сваёй модай кудлатыя дзецюкі. Конь, выпражаны з калёсаў, цягне сена з драбін, клыча яго ды матляе галавой, нібы: «так, браткі, так!» – хоча сказаць гаманкой кампаніі падпітых мужчын. Нібыта конь той ведае, што цыганы ёсць цыганы, – ім усё можна...

Вось так было, а можа, бывае і цяпер на тым гарадскім лапіку, дзе застаўся Конскі базар, вось так было тою парою, калі ідуць халады, калі бяруцца ўранку прымаразкі – ападаюць інеем сырыя туманы.

Тою парою, калі ў вёсках свяжуюць вепрукоў.

І ў апавяданні павінна была згадвацца тая пара і павінна была чуцца вёска: пах падмерзлых трэсак на дрывотні, тарахценне трактарка ля фермы, і на шумавым фоне гэтым – гулкім ёкатам галасы людзей, спалоханы гэгат гусака на тарфянішчы, настылы звон калодзежнага вядра і нечакана – пругкі выпад ветру наўскасы, а над усім, а ва ўсім павінна была быць каменная, зацятая маўклівасць зямлі, травы і схаладнелага, шурпата-шызага неба. Вось што трэба было *загнаць у падтэкст*. А як загнаць, я не ведаў. Трэба было, каб адчувалася, як выходзіць на ганак чалавек, як ляскае за ім, а пасля дробна брынчыць клямка; ён чуе гэта, але і наваколле пачынае ўжо валодаць ім, і вось тут, на самай трэшчынцы ўвагі, услед за скавышлівым павевам ветру, сарока з-за пуні махнецца яму ў вочы тугою сваёй чарнатой, спалохаецца, кульнецца ўгору, востра бліснуўшы гэткай жа тугою беллю, і саслізне, падламаўшы крылы, у агарод, і на плот сігане адтуль, і трывожна зачачэкае, закалышацца там... «Бач, як бы чуе ўжо», – раптоўна падумае ён і ўспомніць свой сённяшні клопат і знарок безуважную жончыну стараннасць, калі раніцой стаўляла ў печ вядзерныя чыгуны з вадой... Ён падманна, нібы нейкі другі знайшоўшы сабе клопат, прыпыніцца на ганку і твар падставіць ветру, і вочы яго трывожна будуць убіраць у сябе наваколле, і нябачна накрэсліць там яму гонкі вецер і сум палёў, і халодны вобмарак травы, і перадзімовае трыванне дрэваў...

Так ён будзе стаяць, і ў яго будуць варушыцца бровы. Ён пачуе, як зарохкае ў пуні вяпрук...

...есці яму сягоння дадуць чым пазней, каб так, угаладаўшыся, лягчэй абмінуў ён здагадку пра тое, што прызначана яму на гэты дзень. Але ж гэта, можа, і насцярожвае яго. Ён яшчэ і не здагадваецца ні пра што, адно трывожыць яго, чаму гаспадыня, выходзячы з сенцаў на двор, не хоча падаць на ягонае рохканне голас, чаму з дурным кэрханнем, з бязладным лопатам крылаў пазляталі з седала і раней часу кінуліся да ганка куры. Пах пракіслага хлеба і паранкі чуваць яму, чутно, як нямірна сакочуць, не падзяліўшы нешта, куры на двары і цвёрда шкрэбае аб ганак дзюбаю певень, як разладжана, роспачным нейкім голасам, злуецца на курэй гаспадыня. Але аціхае пасля ўсё, і зноўку трэба чакаць і нудзіцца. Ды вось, нарэшце, тое, што не можа быць падобным на падман: тупанне ў сенцах, знаёмы шоргат мешалкі і галасы, і другі, глушэйшы і спакайнейшы голас, – гэта *гаспадар*. І адчыняюцца сенцы, і бухаюць дзверы, прадракаючы між нечакана хісткай, поўнай незразумелага сэнсу цішыні. У ёй і галасы інакш чуваць: таропка-сцішаны – гаспадынін і коратка-круглы, цёмны – гаспадароў. Тады зноў як бы рушыцца, абрынаецца ўсё, паглынутае новай, яшчэ больш незразумелай цішынёй. Гаспадара не чуваць (застаўся на ганку?), і ўсё бліжэй, бліжэй да пуні гаспадыніны крокі...

Ён пачынае хламкаць, сутаргава і рашуча, як бы напярэймы той няпэўнасці, што раптоўна пасялілася ўжо ў ім і гняце яго. І гэтак жа рашуча, як пачаў, у нейкі міг перастае ён есці і, злосна рохнуўшы, востра ўскідвае лыч і нюхае паветра, але хваравіта-няўцямна, тужліва глядзяць у пустату яго маленькія, кволыя вочкі, і ўжо чамусьці няможна даверыцца яму ні асцярожлівай ласцы ў гаспадыніным голасе, ні паспешлівай яе руцэ, што дрыготка казыча за вухам. Рашуча і злосна ён зарохкае зноў,

а потым нечакана жорстка калыхнецца ўбок аграмадна-гладкім сваім і грузным тулавам і напружыць карак, адступаючы назад і перастаўляючы пад сабой недарэчна круглыя, кароткія ногі. Каб умеў, падзівіцца мог бы ён, як тое рохканне неспадзеўкі слаба і нудліва абзавецца ў ім, не прарочачы ўжо нічога, акрамя бяды, бо не так убачыць ён, як учуе, што гаспадарова постаць непазбежна і цёмна набліжаецца ўжо да варот і забірае, засланяе сабою светлы прахон на двор. Не будзе ўжо гаспадыні, і застанецца ён сам-насам з гаспадаром. І будзе ён кідацца па пуні, рохкаць і тужыць, і нерухома будзе стаяць гаспадар, мусіць, беспамылкова зазнаўшы, што цяпер непатрэбны і марны быў бы любы падман: трэба лепей набрацца цярплівасці і чакаць, можа, нават выйсці за вароты, на двор – набрацца цярплівасці і чакаць. Ён і зробіць гэтак, і ўжо з-за варот пачуе, як ураз аціхне, перастане рохкаць вяпрук, як потым будзе бэрсаць ён лычом падсцілку, то прыслухоўваючыся, то пачынаючы непакоіцца зноў, як аберне ён цэбар з мешанкай, і, нарэшце, рашыўшыся, пойдзе да варот. Гэта будзе самы трудны міг, калі трэба спакойна хіснуцца з-за вушака напярэймы яму і выставіць перад сабою дула ружжа, і старацца не чуць, як у грудзях цёмна чохкае, шырыцца сэрца, і цэліцца, блізка наставіўшы дула, ва ўяўную плямінку пад брывом, пад кароткімі, белымі, пруткімі вейкамі, і бачыць тужлівую, амаль па-чалавечы асэнсаваную пакору ў тым, як, змірыўшыся з непазбежнасцю, усё чухае, чухае ён безабаронным каркам аб вушак... Вось і ўсё.

І далей ужо няцяжка будзе ўявіць працяг. Уявіць ладнаватыя санкі, ну тыя, і фасон і памер якіх чалавек свядома ды з разлікам падладжваў пад сваю мажлівасць ды пад свой імпэт, каб выпадкам можна было і добрую вязанку дроў па шаранку прывезці з лесу, каб і малое магло ўправіцца з імі на зледзянелай горцы, каб і нядужага дзядка можна было прытарабаніць марозікам дамоў з суседавай лазні. Вось і абернуць тыя самыя санкі, і ўскоцяць яго на іх, і павалакуць па рэдкіх лапіках ранняга снегу ці па камлыжнай восеньскай зямлі куды-небудзь за пуню, у алешнікавы зацішак на лажку, і непарадак нейкі ўраз угледзіць сарока ў тамтэйшым гаспадарчым жыцці – застракоча, зашастае па алешніку ды па платах.

Вось і ўсё. Вось што, акрамя ўсяго іншага, павінна было адчувацца, трызніцца ў тым апавяданні.

А сама задума мыслілася так: ну, скажам, недзе ў нейкім горадзе, у вялікім свеце сярод людзей, жыве *сын* – магчыма, жанаты, а можа, і не. У дзяцінстве, у сваім вясковым дзяцінстве, гэта быў надзвычай уражлівы хлапчук – хударлявы, бледны, шыракароты; парывісты і адначасна ціхмяны, зацяты і ў той жа час быстры на слёзы. Можна сказаць, што душа ягоная ўбірала ў сябе многа, і можна сказаць, што яна была надзелена здольнасцю разумення і хацення дабра, і разумення людзей, але не таго хцівага, саманадзейнага разумення, заручанага з адным днём, а другога, журботнага і трохі безнадзейнага, без выгодаў для сябе: яно благога чалавека прымушала шкадаваць гэтак жа, як і добрага, – хаця б за тое, што ён благі. Але гэта – пасля. Пачаць трэба было б з ранняга юнацтва, з той пары, калі чалавек адчуваць сябе можа бадай што вясновай пупышкай; вось толькі што ўзарвала тугую сваю абалонку яна, – о,

салодкі міг вызвалення, небяспечная ласка сонца ў трызненні далёкіх дажджоў! І навальніца прыйдзе, і сутаргава разарве неба маланка – не раз і не два, – і выблісне сонца, і ападзе цёплы дым над арэшынай, і не скажа маланка, для якой завязі згубны быў яе халодны зялёны прамень... Але вось – маладосць, і герой наш і жыць спяшаецца, і адчуваць жыццё прыспешвае сябе. «Бывай жа, родная засень, і родная хата, – думае ён, – і ты, маці, не глядзі так трывожна ўслед», – і галаву яшчэ не горача пячэ ранішняе сонца, і ў крыніцы, што так сцішна жыве пад засенню родных ліп, яшчэ так багата бруістай вады.

Расказаць трэба было пра юнака, які безразважна і смела рынуўся ў жыццё і не ашчаджаў сябе, шчыра беручы ад людзей і гэтак жа шчыра аддаючы ім сваё. Ды і што тут было ашчаджаць ці шкадаваць! Яму здавалася, што не можа быць на свеце чалавека, які, уведаўшы, не палюбіў бы яго: ну хаця б за гэтую ягоную прагу спагады і ласкі для сябе і для ўсіх! Толькі часам, у шумлівым разгары ягонай з людзьмі злагады і любові, нечакана задумлівым рабіўся ягоны пагляд, і здавалася тады, што цішыня, высокая і сцярожкая, вырастала за ім, і адчуванне было такое, нібыта нехта ў яго стаяў за спіной. І час надышоў, і пабурылася за спіною цішыня, і бяда пастукалася ў дзверы, і зазнаў ён тое, што хоць аднойчы ў жыцці зазнае кожны чалавек: і расчараванне, і адчай, і нудліва-вінаваты позірк сяброў, і нетрывалую ласку жаночага сэрца.

І вось сядзеў ён аднойчы ў добрага знаёмага ў ягонай кватэры за на скорую руку, без жаночай помачы накрытым сталом. Гаварылі, маўчалі, бралі чарку і маўчалі зноў. Гаспадар, лысаваты, цыбаты, біты жыццём і разумны чалавек, доўга нешта – ламаліся запалкі – не мог прыкурыць цыгарэту. Нарэшце натрапілася добрая запалка, і ён прыкурыў, і нечакана, з нейкай незразумелай горыччу, засмяяўся сам сабе, а потым сказаў:

– Ведаеш, быў я ў маці... Зіма. Сумнавата. Вечарам старая паставіць чыгунок з бульбай на камінак: сядзім з ёю, глядзім на агонь, гаворым ці маўчым – во як зараз з табой... І хораша неяк, то бяздумна, то трывожна мне. Закуру крамную папяросу, а яна патухне зноў. І зноў я запалкай чырк ды чырк. А маці тады ціха так кажа мне: «Дык няможна так псаваць запалкі, сынок... Можа, ад вугольчыка прыкуры, га?» І, ведаеш, аж скаланула мяне ўсяго... Не тое каб сорамна стала перад ёй, – не запалак жа маіх шкадавала яна мне, – а падалося мне, браце... – Ён лёгка, усмешліва зыркнуў на субяседніка і, нібы збаяўшыся сваёй той расчуленасці, зарагатаў: – Што скажаш, га? А каб жа ты ведала, думаю, колькі мы, такія харошыя, тых запалак рублёвых па рэстаранах ды піўных у адзін вечар кідаем, га?

І пасмяяліся, і памаўчалі, і ўзялі па чарцы яшчэ.

Пасля ўсталі яны з-за стала, і гаспадар хацеў праводзіць госця, але той адмовіўся, сказаў пра гэта прабачліва і ціха, і гаспадар зразумеў, што, можа, так і трэба, што пасядзелі і памаўчалі яны добра, а ў чым паразумеліся, здагадаецца кожны сам.

Тады госць наш развітаўся і памалу пайшоў на вуліцу. Вечарэла. Сонца нізка стаяла над горадам і лена, холадна біла ў вокны, у бляшаныя дахі дамоў залаціста-барвовым, безуважным святлом. Трамвай звінеў недзе, і пах, астываючы, нагрэты за

дзень асфальт, і пахла, можа, чуйней за ўсё, прапыленай цэглай і фарбай. Была пустою вуліца; ён ішоў, а даўгалыгі цень лажыўся на дарогу і соўгаўся паволі, нібы папіхаючы сябе, і раптам побач, ці не за драўляным плотам, у гародчыку, коратка і жаласна ціўкнула птушанё. Гэта як бы знак нейкі быў, і ён спыніўся і паглядзеў туды. Халаднаватая чырвань аблівала бэз, павеў скразняковага ветру калыхнуў лісцё, і цені ад яго затрапяталіся на жоўтай сцяне, і зноў прыцішана-жаласна ціўкала птушанё. Тады ён прыгледзеўся і ўбачыў яго. Ён бачыў яго блізка, тое сумна натапыранае, шэрае птушанё, гэтак бясконца, незразумела адзінокае ў знаёмай яму і, мусіць, не першы раз аблюбаванай засені падвечаровага куста. На сцяне, на лісці, на вялікіх прасцягах горада паміралa сонца, і што адчуваў, каму і на што жаліўся ён, гэты жывы маленькі камячок, натомлены за дзень нейкім сваім, зразумелым яму, а мо зусім і незразумелым клопатам? Што гэта было: страх, натужнае чаканне непасільнага празарэння ці чуйна, вусцішна і раптоўна адчутая адасобленасць ад усяго і разлад з усім? І ці не так трывожыць, гняце незразумелым нейкім сэнсам і самога чалавека тужлівая палоска расхінутай на захадзе вечаровай зары?..

Так падумалася яму, і ён сцепануўся ад іншай, непрадбачна вострай думкі, што прыйшла разам з гэтай, але якая ўжо, мусіць, жыла ў ім з той пары, як сядзеў у гасцях і браў чарку, і слухаў сябе і ў самім сабе гаспадаровы словы. Гэта думка *пра маці* была, яна так увачавідкі падступілася да яго, што зусім невыпадковым, несумненна і адзіна значным падалося яму імгненне, у якое цень ад бэзавага лісця калыхнуўся на сцяне і неспадзеўна ціўкнула за плотам птушка. У маркотным, дзіўна запаволеным одуме ішоў ён дамоў, і разам з ім думка пра маці ішла, ці, дакладней, памяць аб нейкай віне перад ёй, успамін пра марна растрачаную сілу любові, якая, можа, не сагрэла нікога. Бруілася крыніца пад засенню родных ліп, і, прыклаўшы руку да вачэй, углядалася ўдалеч маці...

З таго дня неспакой і трывога пасяліліся ў ім.

Аднаго разу яму сасніўся сон. Напачатку то быў лагодны сон, то было панаванне прыцемку на мяжы святла, калі ўсё азначала і ясніла сабой не лінія, адно абрыс, няўлоўна пэўны, нібы вобраз птушкі, якая толькі што пераляцела дарогу перад табой. Высокім полем, бярозавым шляхам нібыта ехаў на веласіпедзе ён, захмарана-ціхай і цёплай чулася наперадзе далеч, і гулі ў бярозавым вецці хрушчы. І так расхіналася насустрач невядомасці душа, і так было добра. Куды, куды, чаго ехаў ён? Але такім знаёмым, хоць і не знаёмым дагэтуль, быў краявід, так даверліва лашчыла вочы супакойнае неба, што немагчыма не думаць было, што ўсё гэта было ўжо некалі з ім, калі не ў сапраўдным, дык у душэўна прыдуманым жыцці. «Ага, дык гэта ж я еду дамоў, – нечакана весела, радасна здагадаўся ён, – вунь там скончыцца шлях і зачарнеецца вёска». І далей ехаў ён, але чамусьці не канчаўся шлях, і знаёмае, пакутна знаёмае нешта, чым свіціўся, жыў і вабіў краявід, ніяк не магло акрэсліцца ні здагадкай, ні сэнсам. Азірнуцца захацелася яму, ён ужо і намерыўся, але не мог. І тады як бы парыў ветру нечакана напружыўся, ураз раскідаўся ў яго за спіной: зашалясцела, зашастала, невядома адкуль узяўшыся і асыпаючыся долу, сіберна-

калянае лісце. Стала ціха. Холад і спусташэнне чуў ён за сабой. Падалося на момант, што ён заплюшчыў вочы, адно чуючы, як іначылася, незразумела іначылася ўсё наўкол яго, а можа, і ў ім; і страх працінаў ягонае сэрца. І ён тады ўбачыў... О, ён убачыў усё так дакладна – у той кароткі міг, калі нехта, дачасна схаваны ў ім, адным балючым штуршком расхінуў яму вочы і грудзі! І тады ён убачыў сцены, якія адразу пазнаў: прапахлыя павуціннем, негабляваныя сцены, і тапчан у куце, закіданы старой вопраткай, і старыя начоўкі на ім, і лаву ля дзвярэй, і вёдры на ёй, і на падлозе кашы з бульбай, і чыгуны, і цэбар з мешанкай, і вузкае, на адно бервяно прарэзанае акенца ў сцяне, і нейкі слоік на ім, і шклянку з гусіным тлушчам на ім (ён гэта ведаў), і адно замурзанае (ці не поклад?) курынае яйка... О, навошта, навошта такое знаёмае ўсё гэта, і навошта стаіць перад лавай маці, і навошта чыгуны каля яе ног, навошта яна павярнула галаву да яго, – о, які цёмны, невідушчы, цяжкі, нібы плёскат вады ў вядры, у яе пагляд! Ён хацеў ступіць да яе, але яна, засланяючыся, павяла рукой, і тады, нібы па хаценню яе, расхінуліся сцены, і трывожна, квола зашамацела, бліснула яму пад святлом ліхтара салома. То была пуня. Нейкая постаць стаяла на каленях, спіной да яго, і нешта хрыпела, трэпала па саломе за тою спіной, і сцішана блішчэла параскіданая ўсюды салома, і шкрэбаліся на седале куры... І чыгуны стаялі ў сенцах, і цэбар з мешанкай, і кашы з бульбай!.. Так ён прачнуўся ўночы. А ўдзень яму прынеслі тэлеграму.

Ва ўсіх нас ёсць ці была некалі маці, і, на жаль, не заўсёды добрыя прыходзяць да нас тэлеграмы...

Вось і ўсё. Ізноў ідуць халады, бяруцца прымаразкі – ападаюць долу інеем сырыя туманы. Яшчэ выганяюць на пашу кароў – далей ад вёскі, у лес. Пад вечар жывёла не хоча вяртацца ў хлеў, цаляе адбіцца ў прапахлае бульбоўнікам і сцюдзёным капусным водарам поле. І вечарамі, і ўранку марозліва, хмельна, бы першаком, пахне ў наваколлі дымам.

Такою парою пішу я эпітафію апавяданню, якое магло б называцца «Смаленне вепрука». О, вядома, не шмат логікі ў ім, але ж не шмат логікі і ў стратах, што прыносяць нам лета ці вясна, зіма ці восень. Ёсць, на жаль, рэчы, непадуладныя нам, але ж ёсць і суцяшэнне, ёсць і надзея. У таго, хто бярэ ў рукі пяро, надзея ёсць таксама. О, паэт да таго ж бывае яшчэ крыху забабонным. Наіўны, ён хоча перамагчы сапраўднасць, ён хоча верыць: я засцярогся ад бяды – бо сказаў. Дабро і надзея тут накрэслілі свой круг.

1973 г.

Іван Чыгрынаў

Апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы»

У Залужжы мне сказалі: «А Дземідзёнак пайшоў ад нас. Яго ўжо няма ў гарадку».

. . . . . .

Але ж куды падаўся Дземідзёнак?..

Можа, адзін я добра і ведаў гэтага чалавека.

Ён паявіўся ў нашым гарадку гады праз тры пасля вайны і пасяліўся ў хаце Дакуліхі, адзінокай старой, якая спачатку прыняла яго як кватаранта, каб мець за гэта на старасці якую капейку, бо яму ішла пенсія, але потым адмовілася ад тых грошай.

Я ж сустрэў Дземідзёнка, калі ён лічыўся ўжо на Ганчарнай вуліцы старажылам.

У нядзелю раніцай стаяў я на падворку і слухаў, як гудуць каля дзядзькавых вулляў пчолы.

– Дземідзёнак ідзе, – пачуліся раптам галасы.

Я азірнуўся і ўбачыў незнаёмага старога, які шыбаваў з клеткай у руцэ сярэдзінай вуліцы. Ён быў невысокага росту, згорблены, з белай бародкай і такімі ж белымі валасамі, што выбіваліся з-пад саламянага брыля. На незнаёмым была вылінялая сацінавая кашуля з манішкай, падпяразаная поясам з кутасамі, а на рубчыкавых штанах віднелася некалькі невялікіх латак. Стары хуценька перабіраў нагамі, быццам вельмі спяшаўся куды. Хадзіў ён на дыбачках, таму ўся яго шчуплая постаць у час хады падавалася наперад.

– Дземідзёнак!.. Дземідзёнак!.. – зноў пачуўся крык, і на вуліцу пачалі збягацца дзеці.

Але да старога яны не набліжаліся. Трымаліся крыху воддаль або ціснуліся за ім ззаду. А стары ішоў сабе ўздоўж вуліцы і, здавалася, не заўважаў іх. Тады я і прыгадаў, як у свой час таксама басанож бегаў з равеснікамі за дзівакаватым Цімкам. Цімка жыў на самым канцы Калгаснай вуліцы, але мы і туды забіраліся. І цяпер штосьці падобнае адбывалася.

«Неразумнае дзяцінства», – падумаў я.

А ўвечары, калі маці прыгнала карову з пашы, запытаў:

– Дземідзёнак... Хто гэта?..

– Як хто? Ну, Дземідзёнак і Дземідзёнак. У Дакуліхі жыве.

Было відаць, што яна не вельмі ахвоча да маёй размовы, але маўчаць не стала.

– І дзеці беглі за ім?

Я кіўнуў галавой.

– Паршыўцы! Лазой трэба сеч блазнюкоў! – Яна ўздыхнула і ўзялася пераплятаць свае косы. – Дземідзёнак такі ж, як і ўсе, чалавек. Праўда, можа, ён нейкі ўжо занадта дзівакаваты.

Маці скупілася на словы, і я адчуў, што яна больш клапацілася, каб сын яе не падумаў кепскага пра чалавека.

– Прыйшоў ён сюды аднойчы вясной і стаў жыць у Дакуліхі. А што за чалавек ды адкуль – каму рупіць. Ці мала людзей пасля вайны па наваколлі без прытулку хадзіла. Вайна нямногім так мінулася. І ў кожнага сваё гора. Можа, і яго гняздо параскідала. Ну, і прытупаў чалавек на нашу вуліцу дажываць свой век. Добра, што пенсія ў яго. Здаецца, і Дакуліха тады за гэтым пагналася...

Маці змоўкла. Ёй трэба было штосьці зрабіць у сенцах, і яна выйшла.

– А стары ён аказаўся ўвішны... Гэта я ўсё пра Дземідзёнка, – сказала яна, калі вярнулася. – Дык я кажу: Дакулісе на кватаранта пашэнціла. Бывае, дзянёк бегае вакол хаты, корпаецца то ў гародчыку, то двор падчышчае, ды і на вуліцы насупраць Дакуліхінай хаты не тое што ля іншых, – чыста. Здаралася мне заходзіць да іх. Ветлівы Дземідзёнак гэты. Толькі чамусьці неразгаворлівы. Панурыцца і маўчыць. Нібы кляймо на ім якое. Усё ж адзін ды адзін дзень пры дні. Але гэта б нішто яшчэ. Маўклівых на свеце таксама набярэцца, і, можа, больш чым гаваркіх. Ды прыспічыла яму па нейкай патрэбе пайсці ў нядзелю на рынак. То ніколі не хадзіў туды, а тут раптам пацягнула. Можа, што хацеў купіць сабе або Дакулісе. І вось якраз з таго часу чалавека быццам падмянілі. А ўсё з-за птушак. І хто іх там надумаў прадаваць, – сама не ведаю, бо ніколі ж раней я не заўважала, каб хто прыносіў птушак на рынак наш. Ну, там малако, яйкі, а то ж птушкі! Гандляваць птушкамі!.. Смяхоцце адно. Але ж ён купіў іх. І потым зачасціў на рынак. Убачыць птушку і купляе. А некаторым нібы аднаго гэтага і не хапала. Пачалі лавіць і прадаваць птушак. Сорам аж. Ну, а ён купляе іх і выпускае недзе.

Людзі тым часам языкі чэшуць:

– Дык ён жа перапрадае іх і гэтым самым вунь якую капейку зарабляе.

Ніхто ж не ведае, што небарака на сваю пенсію тых птушак купляе. Часам без куска хлеба бывае. Дакуліха сваім корміць. Нарэшце дайшло да таго, што пачалі прыносіць птушак яму дадому. Тады і не вытрымала Дакуліха. Спачатку сароміла, потым узяла палена ды аднаго прагнала з хаты, другога. Глядзіш, і перасталі хадзіць. Але ж стары не кінуў свой занятак...

З таго вечара я заўсёды выходзіў з хаты, калі чуў, як крычалі на вуліцы:

– Дземідзёнак!..

Дзеці кожны раз беглі за ім на рынак, і пасля я даведаўся, што яны былі таксама галоўнымі пастаўшчыкамі птушак.

Дземідзёнак хадзіў толькі пасярэдзіне вуліцы. Я прыкмеціў, што на ім заўсёды была адна і тая сацінавая кашуля, і праз некалькі дзён я ўжо мог сказаць, колькі на яго штанах накладзена латак. У нядзелю ён праходзіў паўз нашу хату двойчы – на рынак і адтуль. Пры гэтым ён ніколі не глядзеў па баках. Але аднойчы ён здрадзіў сваёй звычцы, калі гэта толькі было звычкай. Ён раптам паглядзеў на мяне. І, можа, таму, што для яго я на гэтай ціхай вуліцы быў чалавек новы, ён нечакана зняў свой руды брыль і павітаўся. З таго разу ён ужо не праходзіў міма, каб хоць не дакрануцца рукой

да свайго брыля. Рабіў ён гэта паспешліва, нібы шкадаваў патраціць на непатрэбную справу лішняга часу.

Паступова я пачаў лавіць сябе на тым, што ўжо не магу не думаць аб ім. Мяне неяк цалкам захапіў гэты пануры дзівак, і я, напэўна, шмат пражыў бы, калі б аднойчы ён не выйшаў на вуліцу са сваёй клеткай.

Што ж за чалавек ён?

У паводзінах Дземідзёнка мне хацелася бачыць адно звычайнае, няхай нават дзіцячае, захапленне адзінокага старога. Чамусьці не верылася, што ён вось так узяў ды ўзваліў на сябе клопат, які ў астатніх выклікаў спагадлівую ўсмешку. А можа, ён па прастаце сваёй адно палічыў за зло, а другое – за дабро і тады зрабіў свой дзіўны занятак – купляць і выпускаць на волю птушак – мэтай таго жыцця, якое яшчэ заставалася за ім, якое трэба было пражыць?

Мяне цягнула да Дземідзёнка, і я хутка гатовы быў разам з хлапчукамі бегчы за ім на рынак, хоць і лічыў, што яны гэтым крыўдзяць яго.

У далейшым амаль так і атрымалася...

Здарылася, што адзін раз Дземідзёнак не знайшоў на рынку птушак. Стары вяртаўся адтуль узрушаны.

Насупраць нашай хаты Дземідзёнак спыніўся. Ён пастаяў крыху непадалёку ад лаўкі, на якой я сядзеў, затым павярнуўся на Калгасную вуліцу. Тады я і рашыўся пайсці следам. Але ўсю дарогу, пакуль плёўся за ім, адчуваў, што раблю нешта не тое, і мне было сорамна.

Дземідзёнак між тым не звяртаў на мяне ніякай увагі. Стары, напэўна, нават не чуў за спіной маіх крокаў.

Тым часам кончыліся цагляныя будынкі, якіх тут панастаўлялі за апошнія гады, і зноў пачаліся драўляныя хаты, як і на Ганчарнай вуліцы. Адно, што на Калгаснай яны былі ўсе новыя, бо ў вайну вуліца цалкам згарэла, і цяпер людзі адбудаваліся.

Неўзабаве Дземідзёнак нырнуў у чыюсьці фортку, і на вуліцы я застаўся адзін.

Час цягнуўся марудна, тым больш што я апынуўся ў такім становішчы, калі не ведаў, як жа паводзіць сябе далей. Самае горшае, чаго я баяўся, гэта – сустрэцца тут з Дземідзёнкам твар у твар, бо дагэтуль, хоць і няёмка мне было, але ж я мог яшчэ думаць, што ён не заўважыў мяне. Некалькі разоў я памыкаўся было збегчы куды-небудзь, каб хоць на вочы яму не трапіць, але тая ж неадольная сіла, што пацягнула мяне сюды, цяпер трымала ля форткі, і я вагаўся ў нерашучасці, аж пакуль выйшаў Дземідзёнак з хаты. Было позна ўжо што-небудзь рабіць.

Дземідзёнак прайшоў моўчкі. Пакуль ён праходзіў міма, я стаяў, нібы вадой халоднай абліты.

У гэты момант з сенцаў выкацілася жанчына і гукнула праз двор:

– Колькі ён даў табе?

Адказаў ёй танклявы голас з хаты.

– А божухна! Дык ты ж танна аддаў! – заенчыла кабета.

– А што яны варты, вераб'і тыя, – спрабаваў нехта давесці.

– Варты! Варты! Закаркаў... Што табе, чужых грошай шкада? Не будзь дурнем. Хай пускае на вецер, калі ў яго многа іх!

Жанчына сказала гэтак і захіхікала, а мне, здаецца, упершыню зрабілася шкада Дземідзёнка.

Клетку з вераб'ямі – гэта былі сапраўды вераб'і – ён ледзь не прыціскаў да грудзей, быццам чалавек баяўся, што вось-вось падыдзе хто-небудзь і не падумае, адбярэ іх у яго.

Накіроўваўся ён за гарадок.

Выпускаў Дземідзёнак купленых птушак кіламетры за тры, там, дзе пачынаецца Зінкевічаў луг.

Свяціла яркае сонца, булькала ў рэчцы вада. Паветра тут было па-летняму настоена пахам красак, і некранутая яшчэ трава пагойдвалася пад сухім ветрам, і часам здавалася, што недзе на ўзлеску ледзь чутна калоцяцца блакітныя званочкі.

Я загледзеўся на гэтае ціхае харство прыроды і не заўважыў, як неспадзявана перамяніўся Дземідзёнак. Стары раптам выпрастаўся, памаладзеў, і ўжо ад таго, ранейшага Дземідзёнка, нічога і не засталося. Ён з нейкім не па гадах дзіцячым захапленнем пазіраў услед сваім птушкам, якія, трапечучы крыламі, пырхалі з клеткі, і твар яго ўвесь свяціўся.

Нарэшце я ўбачыў чалавека, які перажываў вялікую радасць...

Дамоў мы вярталіся, як харошыя знаёмыя, аднак размовы ў нас не выйшла. Затое цяпер нішто ўжо не перашкаджала мне заходзіць да Дакуліхі.

Там я і даведаўся пра самае галоўнае.

...Да вайны Дземідзёнак жыў пад Вітунём, там, дзе Лясныя Дачы.

Служыў ён лесніком.

Сям'і ў яго не было – дачка, якой споўнілася пад тую пару, можа, трыццаць гадоў, жыла замужам у горадзе, і ў яе гадавалася свая дачка. Да бацькі яе, відаць, нішто не цягнула, і яна ні разу не надумала прыехаць.

Тым часам пачалася вайна. Спачатку нішто не патрывожыла Лясныя Дачы, полымя вайны шугала далёка ад іх. Але праз дні вайна дакацілася і да Вітуня. Уначы было відаць, як палыхалі пажары па той бок Дняпра; грымела і варушылася наваколле.

Праз Лясныя Дачы пацяклі людскія натоўпы.

Людзей збіралася так многа, што часам нават думалася, ці не зрушыла гэта з месца цэлага паўсвету. Людзі ішлі і ехалі ў копаці і пыле – бежанцы, чырвонаармейцы. І на абочынах дарог разам з пабітымі гаршкамі валяліся закарэлыя крывавыя бінты.

Леснікова старожка, у якой жыў Дземідзёнак, у тыя дні была поўна раненых.

Сам Дземідзёнак ад рання да вечара прастойваў ля дарогі і ўсё ўглядаўся ў людскія твары, спадзеючыся сустрэць сваіх.

І яму пашанцавала, ён дачакаўся – прыйшла дачка. Яна прывяла з сабой трохгадовую дзяўчынку, якая да гэтага толькі ад маці чула, што ў яе ёсць дзедка і што ён жыве недзе на беразе ляснога возера. І, хто ведае, можа, яна не раз уяўляла сабе таго дзедку чарадзеем, а на самай справе атрымалася, што гэта – самы звычайны

дзед, якіх столькі дзяўчынка сустракала на сваёй вуліцы. Яна доўга з недаверам глядзела на старога, аж пакуль ён не ўзяў унучку на рукі. Дзіця так і заснула ў яго на руках – бруднае, схуднелае і стомленае, бо, відаць, за гэтыя дні нямала пратопала на сваіх ножках. А калі прачнулася, то быў ужо другі дзень і не было побач мамы. Дачка Дземідзёнка пайшла далей, туды, куды ішлі ўсе, а Аленку пакінула з дзедам. Хоць у яго і возера было прыгожае, якое чамусьці называлі Мёртвым, і лес стаяў кругом, Аленка плакала. Тады Дземідзёнак браў яе за ручку і вёў на дарогу, дзе па-ранейшаму ішлі і ехалі гнаныя горам людзі. Там яна суціхала.

А вайна падступала ўжо да самых Лясных Дач.

Паток бежанцаў патрохі радзеў, потым зусім спыніўся. І ў лесе ўжо сустракаліся пераважна толькі салдаты. Пасля і іх не стала, хоць яшчэ доўга чуўся пад Вітунём пошчак кулямётаў. Нарэшце настаў дзень, калі зрабілася ў наваколлі зусім ціха і на ўсе Лясныя Дачы засталіся толькі Дземідзёнак і яго ўнучка.

Рабіць цяпер не было чаго, ды і невядома, дзеля чаго будзеш рабіць, і Дземідзёнак сноўдаўся так па лесе, слухаў, як дзень за днём па-новаму пачыналі шумець хвоі: блізілася восень. Тады і прыйшлі да яго зноў людзі. То былі партызаны. Спачатку яны жылі ў лесніковай старожцы, але з надыходам зімы, калі выпаў снег, перабраліся за Мёртвае возера.

Зіма тая выдалася лютая, снежная. Мароз лез ва ўсе шчыліны, і ў старожцы даводзілася круглыя суткі паліць у печы. Дзед з унучкай з нецярплівасцю чакалі цёплых дзён.

Але аднойчы ў старожку ўварваліся немцы.

– Партызан?

Дземідзёнак паціснуў плячамі.

– Дзе хаваюцца партызаны?

– Не ведаю.

– Тады збірайся.

– А як яна? Адна застанецца? – Дземідзёнак паказаў на Аленку.

– Будзеш разумны, то не застанецца, – адказалі яму.

Старога пасадзілі на сані і павезлі ў Вітунь, а Аленку замкнулі ў старожцы.

Два тыдні яго вадзілі на допыт.

– Дзе партызаны? – пыталі кожны раз.

Дземідзёнак маўчаў. Тады яго кідалі на падлогу і білі. А ўначы, калі выпадала хвіліна заснуць, яму снілася ўнучка і тая прыцярушаная снегам сцежка, якая вяла паўз возера да партызанскіх зямлянак. Ён яшчэ спадзяваўся, што адтуль па гэтай сцежцы прыйдуць па дзяўчынку і з ёй нічога не станецца.

Два тыдні катавалі лесніка. І ўвесь гэты час ён мучыўся ад таго, што пакінуў дзяўчынку адну. Калі ж яго нарэшце выпусцілі на волю, то ён не знайшоў у сваёй халоднай старожцы ўнучкі. На падлозе ляжала адна скалелая сініца... Калі і як яна заляцела сюды, – Дземідзёнак не ведаў.

Да самага канца вайны заходзіўся ў горы стары ляснік. Колькі ні шукаў ён сваю ўнучку – знайсці не мог. Пасля вярнулася дачка. Пачуўшы страшную вестку, яна павалілася на лаўку і праплакала ўсю ноч. А раніцай пайшла.

Не мог, вядома, застацца ў старожцы і Дземідзёнак. Ён пакінуў Лясныя Дачы назаўсёды, каб нішто больш не нагадвала яму там аб непапраўнай страце.

...Дні праз два я паклікаў да сябе хлапчукоў і расказаў ім усё, што ведаў пра Дземідзёнка. Яны разышліся прыціхлыя, з апушчанымі галовамі. Мне здавалася, што гэтым самым я зрабіў нешта добрае, нават, калі хочаце, абараніў спакутаванага старога ад людской надакучлівасці.

Дзеці сапраўды больш не даймалі яго. Паступова перавяліся і птушкі на рынку. Неўзабаве іх ужо ніхто не прадаваў у гарадку, хоць Дземідзёнак па-ранейшаму бегаў туды са сваёй клеткай.

Падышоў час мне ад'язджаць, і я зайшоў развітацца з Дземідзёнкам. У сенцах мяне сустрэла Дакуліха.

– Ты можаш не заходзіць, – з дакорам зашаптала яна. – Чалавек вунь перажывае. А ўсё праз цябе. І навошта было гаварыць каму? Ён жа гэтымі птушкамі і жыў адно апошні час.

Дземідзёнак сядзеў насупраць акна. Ён не павярнуў галавы на мае крокі. І за тыя некалькі хвілін, якія прабыў я ў Дакуліхі, стары не прамовіў ніводнага слова.

Пакідаў я Дакуліхіну хату прыніжаны і разгублены.

...Я хацеў памагчы чалавеку загаіць рану. І так няўмела ўзяўся за гэта. Лепш бы не брацца зусім. Бо не кожная рана паддаецца лекам. Асабліва калі на душы...

З таго дня я Дземідзёнка не бачыў.

1961 г.

Апавяданне «У ціхім тумане»

Першапачатковая назва апавядання – «Маці».

Сонца амаль на вачах пабольшала, зрабілася чырвонае. На зямлі, ужо як на дражджах, выросталі цені; на вадзе, на самай сярэдзіне возера, пералівaліся, бліскаючы пазалотаю лускі, быццам жыравалі там касякі маленькіх рыбак.

Над Бароўкай, двароў на сорак вёскай, якая падступалася паўкругам да возера (па адзін бок яго стаялі хаты, а па другі – лес), неўзаметку асядаў вечар.

З бярозавага балота, што пачыналася за ніжнімі бароўскімі гародамі, выпаўз туман, і пацягнула яго, як заўсёды, па тарфяным полі на мост, перакінуты цераз роў, які падзяляў Бароўку на два канцы – канаплёўскі і канчанскі. Але сёння туман быў рэдкі, як дым.

Аднекуль з далёкіх заток раптам прыляцелі дзве качкі-мацярухі і закружылі ў пары над возерам. Штосьці трывожыла птушак. І яны доўга кружылі так, баючыся апусціцца на ваду.

Была тая зацішная пара перад заходам сонца, калі ў вёску яшчэ не вярнуліся з поля каровы, а людзі, прыйшоўшы з работы (якраз за доўгім логам кідалі ў гэты дзень стагі), паспелі ўгаманіцца.

У гэты час і прыйшла ў Бароўку старая Рэйдзіха.

Яе ўбачыла на гуцянскай дарозе Тараськова Ганна. Яна была за вёскай, у Чыкавых печах, зграбала там пад соснамі сухое шыгалле. Даўно ёй кінулася ў вочы адзікокая жаночая постаць на бязлюднай дарозе, але пазнаць, хто гэта, на ноч гледзячы, ішоў у Бароўку, доўга не ўдавалася. І толькі тады, калі Рэйдзіха павярнула на вузкую, утаптаную чалавечымі нагамі сцежку, каб паўз Чыкавы печы прайсці да выгану, па якім трапіш на бароўскую вуліцу, Ганна схамянулася.

– Божа мой... Гэта ж Рэйдзіха!.. – Яна адкінула ўбок граблі і ўтаропіла на яе свае здзіўленыя вочы, як на прывід які.

«І адкуль нясе старую нялёгкая», – падумала яна яшчэ праз момант і адчула, як у сэрцы шавяльнулася штосьці падобнае на прыкрасць.

Рэйдзіха таксама заўважыла Ганну. Яна спынілася крокаў за дваццаць і пазірала на яе, сляпуючы, з-пад рукі. Потым, ужо, мусіць, пазнаўшы, падышла бліжэй.

– Ганна!.. – сказала яна ціха, амаль прашаптала, і раптам заплакала, схапілася за фартух і пачала выціраць слёзы.

Згорбленая, маленькая Рэйдзіха стаяла перад Ганнаю босая – ногі былі парэпаныя, з пакручанымі пальцамі, як у вялікай птушкі, скінутай аднекуль з гнязда: яна цяпер чаплялася сваімі кіпцюрамі, каб перастаць нарэшце падаць, неяк затрымацца хоць тут, на зямлі. Палаплены зялёны андарак ледзь не даставаў ёй да пятак. Не была асабліза новаю і доўгая сацінавая кофта, якую Рэйдзіха насіла навыпуск, так, што з-пад яе толькі звісаў вышываны фартух. Затое на галаву была павязана прыгожая, яшчэ амаль не паношаная гарусоўка – чырвоная, з чорнымі махрамі.

Рэйдзіха ціха ўсхліпвала, а Ганна стаяла, бы скамянелая, і не ведала, што рабіць. Надта ўжо нечакана выйшла гэта сустрэча ў Чыкавых пячах. І трэба ж было здарыцца якраз, што не каму-небудзь – ці мала ў Бароўцы людзей, – а ёй, Тараськовай Ганне, давялося спаткаць Рэйдзіху. Але першыя словы Ганна вымавіла, на здзіўленне самой сабе, спакойна, без прытворства, нават трохі з радасцю:

– А я гляджу, хто гэта ідзе? Гляджу – і вачам не даю веры... Ажно гэта вы, цётка Матруна!

– Ды гэта я, Ганначка, я!.. – Рэйдзіха паспрабавала ўсміхнуцца, але ўсмешка ў яе атрымалася палахлівая і вымушаная. – Вось, прывалакла свае косці, – дадала яна і тут жа нібы спахапілася, папраўляючы сябе. – У Забор'е іду. Памаліцца трэба, свечку паставіць...

– Дык сёння ж, відаць, вы не паспееце туды.

– Не паспею, – згадзілася Рэйдзіха і ўзняла на Ганну свае заплаканыя вочы. – Скажы-тка мне, а гэта, ці жывая, ці не, што каля Сёмкі Парашчынага хата стаяла? Ну, як яе? Дай бог памяць... Аўдотка Мялехава!

– Не.

– І даўно?

– Пасля вайны адразу. Здаецца, на Пятра.

– Скажы-тка, а чаму б гэта яна? Не вельмі каб і старая была...

– Ды каб усё добра, то магла б яшчэ за комінам гадкоў пяць пасядзець. Але вайна, што зробіш...

– А я спадзявалася... значую ў яе.

– Ат, каб жа было толькі тае бяды, што начаваць дзе... У Бароўцы хат многа. Во колькі, глядзіце! – Ганна паказала рукой на вёску. – Ды хоць бы і да мяне зойдзеце. Хата вялікая і новая. На адну. Балазе, адбудаваліся нанова ўсе.

Пачуўшы гэтыя словы, Рэйдзіха апусціла галаву. Старая ніяк не чакала, што Ганна раптам пакліча яе да сябе. І яна прыціхла, быццам задумалася, як ёй паставіцца да неспадзяванага запрашэння. Нарэшце сказала:

– Хай табе шчасця дае Бог... А што ж Іван твой?

– Не вярнуўся Іван. Адна пяклуюся.

Рэйдзіха ўздыхнула. Ганна памарудзіла трохі, потым спытала:

– Ну, а як вы, цётка Матруна?

– Дзякаваць богу, сыта, адзета. Не я пазычаюся ў людзей, а болей суседзі з добрым і благім да мяне. – Рэйдзіха гаварыла гэта і, здавалася, зусім не клапацілася, паверыць ёй Ганна на слова ці не; яна прайшлася хуценька да памшэлага пня, які вытыркаўся з-пад кучы шыгалля, і села там. – Дзіцёнка перабаблю, кашу на ксцінах паб'ю, на хаўтурках павыю – павыюць і па мне добрыя людзі, – старая зноў схапілася за свой фартух, але на гэты раз яна не заплакала. – Ну, дзякуй богу, што ты развязала маё сэрца... з начлегам. От, ужо ніколі не думала, што давядзецца напрасіцца да цябе. А гэта ты навошта? – яна капнула нагой шыгалле.

– Трэба Ласюце пад бок паслаць, пакуль дажджоў няма.

– У цябе яна даўнавата?

– Не, пярвусцінка.

– Малако ж хоць дае?

– Трохі дае.

– То і добра.

Жанчыны разгаварыліся. Рэйдзіха неяк адразу паспакайнела. Вярнуўся неспадзявана ўнутраны спакой і да Ганны. У душы ў яе ўжо чамусьці не было таго ранейшага пачуцця да Рэйдзіхі, якое яна адчула, калі ўбачыла яе на гуцянскай дарозе, – яго быццам рукой хто адвёў.

У Чыкавых печах тым часам пашарэла. За Бароўкаю зайшло сонца. І тут, паміж рэдкіх дрэў, пачаў распаўзацца сіні вячэрні змрок. На захадзе, там, дзе зусім нядаўна было відно сонца, ускочыла маленькае воблачка. Яно было падобнае нечым на белую авечку, якая адбілася ад чарады. Знізу на яго яшчэ кідала сваю чырвань нябачнае ўжо сонца, і таму здавалася, што яно крывавіць.

* * *

Тое, што Рэйдзіха нечакана заявілася ў Бароўцы, дзе яе ніхто ўжо не бачыў, можа, цэлых трыццаць гадоў, больш таго, дзе яе ніхто не спадзяваўся нават бачыць – пра яе даўно не ўспаміналі ў вёсцы, бо к слову неяк не прыходзілася, – дзівіла не толькі Тараськову Ганну: навіна за якую паўгадзіну абляцела ўжо сорак бароўскіх двароў, і ў кожнай хаце толькі і гаварылі пра гэта.

Начавала Рэйдзіха ў Ганны. Пасля вячэры на скорую руку – хлеб з малаком – яна яшчэ пасядзела трохі на лаўцы пад вокнамі: людзям лішні раз паказалася на вочы, потым папрасілася на спачын. Ганна палажыла яе за грубкай, на свежым, толькі што напханым сенніку. І Рэйдзіха варочалася на ім з боку на бок, шаптала замест малітвы ў падушку:

– Прытаміліся мае ножачкі, апускаюцца мае ручачкі, баліць маё ўсё цела... Пара спакой даць старым касцям...

Сёння ўвесь час – і тады, калі падышла ў Чыкавых печах да Ганны, і пасля, ужо ў вёсцы, калі сустракалася са сваімі былымі суседзямі, – яна чакала, што вось-вось людзі пачнуць гаварыць пра яе сына. Гэтага старая баялася больш за ўсё на свеце. Але бог літасцівы быў, і ніводзін чалавек не напомніў пра яго. І цяпер яна, лежачы ў пасцелі, употай радавалася і, можа, першы раз за ўсё доўгае жыццё, як ведала бароўцаў, у душы ўдзячна была ім за іх кароткую памяць.

Але ці такая ўжо кароткая памяць у гэтых людзей?

...У Рэйдзіхі калісь быў муж – Лазар Рэйда, чалавек чорны і хмуры, як асенняе неба; быў таксама ў яе і сын – Яшка, такі ж чорны і хмуры, але ростам трохі ніжэйшы, ды і сілы ў ім было меней, чым у бацькі. Людзі казалі, што чарната ім перадалася ад дзеда, які быў смалакурам, а хмурасць... тут ужо можна было рабіць любыя здагадкі. І ўсё ж, відаць, самае першае, на што кожны ківаў, дык гэта тое, што Лазар Рэйда амаль усё сваё жыццё правёў у лесе. У пана ён служыў лесніком, пры савецкай уладзе таксама быў на той жа пасадзе. І праз усё сваё леснікоўства ён заставаўся жыць з сям'ёй

на адным месцы – пад Круглым, там, дзе пасярод сасновага бору стаяла леснікова хата, якую збудаваў для сваёй службы яшчэ пан Сарока, здаецца, ажно ці не прадзед апошняга бароўскага пана. Гэта – кіламетры за тры ад Бароўкі, і, можа, столькі было ад Круглага да іншых вёсак. Абход быў якраз самы большы з усіх. За дзень Рэйда толькі і паспяваў прайсці яго ўздоўжкі, так што ў чалавека, нават калі б ён захацеў, усё роўна не хапіла б часу, каб пабываць у знаёмых на вёсцы. Ды і сама служба вымагала якраз таго, каб ляснік паменш вадзіўся з мужыкамі, бо гэта ж менавіта ад іх паны і трымалі яго ў лесе. А Рэйда службу знаў. І нёс спраўна. За гэта пан яму нядрэнна плаціў, а мужыкі – клялі і не адзін раз спрабавалі пацэліць з ружжа ў яго шырокую спіну.

Тым часам вакол лесніковай хаты, на лугах, на якіх стаяла некранутая трава, ад рання да позняга вечара бадзялася плойма кароў. Гэта была ўжо Рэйдзішына гаспадарка. Каровы пасвіліся амаль па ўсім Круглым адны, а ўвечары, як толькі ў лесе рабілася цёмна, яны вярталіся дамоў, ледзь не валакучы па зямлі вымі, прапахлыя малаком. І не знаходзілася на іх ні напасці якой, ні тых жа ваўкоў, што нападалі на худобу вяскоўцаў і быццам не мелі таго ж самага нюху на лесніковых кароў. Пану таксама не рупіла палічыць, колькі ў яго лесніка было кароў, ды і коней, якіх той кожнае лета прадаваў цыганам. Пана цікавілі адны свежыя пні ў лесе. А іх, свежых пнёў, дык якраз і мала бачыла яго вока ў Рэйдавым абходзе, бо той трымаў мужыкоў у чорным целе – не даваў ім з панскага лесу ні сена, ні палена.

І праўда ці не, а паміж людзей ужо хадзіла чутка, што Рэйда неяк вёў гаворку са сваім панам, каб купіць у яго маёнтак. Так гаварылі ў Бароўцы. Але нічога з гэтага торгу ў іх не выйшла. Тым больш што неўзабаве пачалася адна рэвалюцыя, потым другая, і пасля гэтай апошняй рэвалюцыі ніхто ўжо не збіраўся ні купляць, ні прадаваць зямлі. Пан раптам некуды падаўся ў губернскі горад, а зямлю яго ў хуткім часе падзялілі мужыкі. Панскі лес адышоў дзяржаве. А лесніком у ім астаўся Рэйда. Яго не зачапілі, і ён нёс сваю службу, як і раней.

Змены ў лесніковым жыцці адбыліся гадоў праз дзесяць. Раптам у лясніцтве нехта дакапаўся, што Рэйда прадаваў дзяржаўны лес, і яго прагналі з Круглага. Тады ён прыйшоў у Бароўку і стаў шныраць па ўсёй вёсцы, выглядаючы месца, дзе лепш пабудавацца. Але месца яму не знайшлося – проста ніхто не захацеў дзеля такога выпадку пацясніцца, бо кожны меў на яго зуб за леснікоўства. І Рэйду нічога не заставалася, як паставіць сабе хату адразу за коўратамі, у канаплёўскім канцы, там, дзе да самых верхніх бароўскіх гародаў падыходзіць бальшак. Тут ён і дацягнуў да калгасаў. І калі сяляне пачалі ладзіць гаспадарку разам, ён пасміхаўся ўжо з іх, стоячы пасярод свайго двара, можа, самага ўпарадкаванага на ўсю Бароўку – кругом новай, на дзесяць акон, хаты была зроблена дашчаная, агарожа, праз якую чужое вока не магло нават глянуць. У калгас Рэйда не хацеў ісці.

– Баронь Божа, – аднекваўся ён, – чужое піць і ад чужога карысць мець.

Ды, урэшце, Рэйду не вельмі і клікалі да сябе аднавяскоўцы, акрамя, вядома, начальства, якому патрэбны быў у калектывізацыі поўны працэнт. І вось гэты працэнт

– ім цяпер стаў і Рэйдаў двор – не даваў выканаць план. Хто ведае, можа, якраз ён потым і вырашыў астатняе.

Аднойчы загарэўся калгасны кароўнік. Гарэў ён усю кароткую летнюю ноч, а раніцою, калі дым ужо рассеяўся, у Бароўцы паявіўся конны міліцыянер. Ён спачатку прагарцаваў па вуліцы на сваім вараным стаенніку, потым павярнуўся за коўраты, да Рэйдавай хаты. Там ён арыштаваў Рэйду і пагнаў яго пад наганам па пыльным бальшаку ў раён.

Роўна праз тыдзень пакідалі Бароўку і Рэйдзіха з сынам. Відаць, яны спалохаліся, што будуць «раскулачваць» іхнюю гаспадарку, і заспяшаліся пагрузіць свае куфры на калёсы.

З таго часу Рэйдзіха ў Бароўцы не паказвалася.

Але ў сорак другім годзе паявіўся ў Бароўцы Якаў Рэйда. Ён наляцеў на вёску разам з карным атрадам, у чужой вайсковай форме з чарапамі на рукаве. Рэйдзішын сын, ціхі і непрыкметны чалавек, якога ніколі не было відаць з-за бацькавай спіны, апынуўся раптам у немцах. Стаяў здраднік поплеч з нямецкім афіцэрам на высокім ганку былога калгаснага праўлення і зларадна пазіраў, як салдаты зганялі на пляц людзей з усяе Бароўкі. На гэтым пясчаным пляцы, дзе да вайны калгаснікі збіраліся пасля ўсходу сонца, каб атрымаць ад брыгадзіра нарад, цяпер была падрыхтавана вісельня. Каго надумалі немцы павесіць на ёй, бароўцы не ведалі аж да таго часу, пакуль не сышоў з ганка Якаў Рэйда. Ён падскочыў да старога Тараська і, штурхаючы аўтаматам у спіну, павёў яго да вісельні.

Тараська немцы павесілі. Але на гэтым яны не спыніліся. У той жа дзень згарэла ўся Бароўка. Рэйдзішын сын першы паднёс палаючы смаляк пад саламяную страху Тараськовай хаты. Потым яшчэ некалькі хат падпалілі нямецкія салдаты, якія хадзілі ўслед за ім. Астатняе дарабіў за іх вецер: якраз стаяў ветраны дзень, і полымя, пералятаючы, як жывое, з аднае страхі на другую, няшчадна зашугала па ўсёй вёсцы.

Пасля пажару Ганна, заходзячыся ў горы, хавала свайго бацьку. На папялішчы тым часам пагарэльцы пракліналі на чым свет стаіць і немцаў, і здрадніка, і маці, якая нарадзіла яго.

Якава Рэйду партызаны потым злавілі толькі на другое лета, калі быў разбіты пад Панькаўскай Будай карны атрад, у якім ён служыў з самага сорак першага года. Здрадніка прывезлі ў Бароўку і застрэлілі на краі бярозавага балота, там, дзе ледзь не круглы год цвякае пад нагамі іржавая вада.

* * *

Назаўтра, хоць ад стомы за ноч не ўляглася ламота ў касцях, Рэйдзіха ўсхапілася рана. Агледзеўшы з непрывычкі Ганніну хату, старая ўлезла ў свой шырокі андарак, потым асцярожна, каб не разбудзіць гаспадыню, прашмыгнула, як мышка, у сенцы, дзе на лаве стаяла кадка з вадой, апаласнула свой маршчыністы, рубцаваты твар і выйшла на ганак.

Туман яшчэ не паспеў зусім асесці, хоць на вёсцы яго і не было ўжо. Затое над возерам ён плаваў, як абястлушчанае малако: то паднімаўся, паказваючы цёмнае люстра вады, то апускаўся заслонаю, хаваючы ўсё ад вачэй. Лес, што падступаўся да возера з другога боку, здавалася, калыхаўся, стоячы на воблаках.

На ўсходзе па чыстым небе, толькі што адарваўшыся ад зямлі, узбіралася ўгору сонца. Але яно было нейкае цяжкое, бы перагружанае чым, і амаль не праменілася.

Вёска як бы драмала яшчэ. На вуліцы – ні душы. І толькі аднекуль здалёк далятала раз-поразу: лясь-лясь, лясь-лясь...

Хтосьці ладзіў касу.

Услед за Рэйдзіхай, праз колькі хвілін, на ганак выйшла з сенцаў гаспадыня. Ёй таксама не заспалася: як прагнала на ранкі за пастухом карову, дык ужо і не заплюшчыла ад таго часу вачэй.

– Благадаць тута, – пачуўшы крокі, прамовіла Рэйдзіха, і ў голасе яе прагучалі адначасова ўсхваляванасць і зайздрасць. – Чыстая благадаць!

Ганна сцепанулася ад ранішняга халадку і, павярнуўшыся да Рэйдзіхі, можа, упершыню за ўвесь час, як давялося ім быць разам, уважліва паглядзела ёй у твар – зусім ужо стары, збляклы, з маленькімі вачмі, у пустэчы якіх правальваліся ўсе яе патаемныя думкі.

– А ў нас заўсёды так было, – азвалася Ганна і тут жа пашкадавала, бо падумала, што Рэйдзіха яе словы можа ўспрыняць як папрок.

Яна пачала лавіць сябе на той думцы, што ўжо каторую гадзіну, з самага ўчарашняга надвячорка, паводзіць сябе з гэтай жанчынай так, быццам у нечым была вінаватая перад ёй і цяпер аберагае яе ад усяго, што, крый божа, можа прычыніць знячэўку старой непрыемнасць.

Рэйдзіха не стала бавіцца ў Ганнінай хаце – праз які час пачала збірацца ў дарогу. Ганна не адгаворвала. Але перад тым, як пераступіць парог і выйсці на вуліцу, старая раптам затужыла моцна і, уздыхаючы, захадзіла босая па хаце з кутка ў куток, як падстрэленая варона.

Ганна маўчала. Па праўдзе кажучы, у апошні момант ёй чамусьці ўжо нават хацелася, каб Рэйдзіха як хутчэй сышла з яе двара. Ёй здавалася, што, прымаючы Рэйдзіху ў сваёй хаце, яна тым самым рабіла нешта нядобрае ў дачыненні да суседзяў, хоць і ведала – ніхто не будзе дакараць яе, бо кожны на яе месцы зрабіў бы тое самае. Ды ці заўсёды дойдзеш да згоды паміж тым, што адчуваеш у сэрцы і што робіш? Але яна, вядома, таксама не падумала, каб хоць намёкам прыспешыць старую. Яна толькі сказала напаследак, што ў Забор'і, куды тая хацела падацца, царква ўжо даўно закрыта, бо спіўся поп, і туды цяпер ці варта ісці – адно нагам лішняе работы задасі. Рэйдзіха насцярожылася, кінула кароткі збянтэжаны позірк на Ганну і раптам зноў, як і ўчора, без дай прычыны заплакала, пачала камячыць у руках сваю гарусоўку, якую не паспела павязаць на галаву. Плачучы так, яна падышла да Ганны за крок і загаварыла скрозь слёзы. Гаварыла яна доўга, блытана, нават спачатку цяжка было дайсці да сэнсу яе слоў. Але паступова Ганна ўсё ж зразумела, што

хвалявала старую: тая на прамілуй бог, гатовая поўзаць ля ног, прасіла паказаць ёй... сынаву магілу.

...Да бярозавага балота Рэйдзіху павёў суседскі хлопчык, дзесяцігадовы Аўласаў Міцька. Яго ледзь угаварыла Ганна схадзіць туды з Рэйдзіхай. Рушылі яны па загароддзю, абыходзячы вёску з другога боку. Гэту дарогу выбрала сама Рэйдзіха. Ідучы ўслед за Міцькам, вакол якога круціўся вялікі чорны пёс, старая горбілася і спатыкалася, але ўсё прыбаўляла кроку, быццам уцякала куды, чуючы за сваёй спіной буру. Неўзабаве яны падышлі да бярозавага балота. Міцька трохі патупаў каля кустоў, потым спыніўся і з хлапечай абыякавасцю паказаў на дзірван:

– Недзе тут...

Сабака, пачуўшы гэтыя словы, успрыняў іх па-свойму, як каманду шукаць, і скокнуў да таго месца, куды паказаў рукою Міцька. Павіскваючы ад якойсьці незразумелай сабачай радасці, ён зашкроб сваімі вялікімі белымі лапамі па зялёным дзірване, і хутка з-пад яго вострых кіпцюроў пасыпаўся, як руда, балотны пясок. Але Рэйдзіха не дала капаць далей. Яна нечакана падскочыла да сабакі, пхнула са злосцю босай нагой і павалілася, бы падкошаная, на дзірван, прыпала да яго сваімі высахлымі грудзьмі. Яна не плакала. Затое часта і трывожна цяпер білася ў грудзях, гатовае вылецець адтуль назусім, яе кволае старэчае сэрца. Удары яго, напэўна, чуваць было нават праз тоўсты, паточаны чарвямі дзірван. Рэйдзіха штосьці шаптала, варушачы сухімі вуснамі. Рукі яе, жоўтыя і слабыя, сутаргава і бездапаможна коўзаліся па мокрай, яшчэ не высушанай ад расы траве, быццам намагаліся награбці на гэтым роўным шматгадовым дзірване магільны курганок.

Раман «Вяртанне да віны»

I

Ён выйшаў з хлява, стаў каля ганка. Ён рабіў гэтак кожны раз, калі збіраўся ісці з двара. Але сёння Міхалка чамусьці не спяшаўся выбегчы з хаты, быццам не толькі не чуў ягоных крокаў, але і не здагадваўся, што той ужо наважыўся падацца ў сваю штодзённую вандроўку па лесе, які пачынаўся першымі соснамі адразу ж за Гапчыным плотам, цягнуўся потым напрасткі да Бесядзі, а на левы і правы бок абступаў Мамонаўку наўкруг, засцячы невялікія, акурат нядаўнія расцяробы, палеткі.

Між тым праходзіў час, а Міхалка і праўда чамусьці не выходзіў на ганак, марудзіў, і гэта выклікала ў маладзенькага лася спярша звярыную нецярплівасць, затым неспакой, які выявіўся неўзабаве ў тым, што лось, нездаволена фыркаючы, вярнуўся назад у хлеў, – усё-ткі ў душы ён недзе спадзяваўся пакуль, што гаспадар і сёння не стане здраджваць звычцы, і калі не збярэцца ў лес разам, то ўжо няйначай вынесе на ганак абавязковы ў такіх адносінах мякіш хлеба. Так было заўсёды, вось ужо колькі месяцаў, лічы, з таго моманту, як адразу пасля зімы падросшы лось адчуў сваю звярыную сутнасць, пачаў нудзіцца на загароджаным вясковым двары, шукаць шляху на волю.

У першай вандроўцы з ім быў Міхалка і чорны сабака з чужога, але зусім блізкага двара; і яна выйшла нядоўгай, тая вандроўка; яны прайшліся ўсяго да дарогі, што вяла з пасёлка паўз рум на Бесядзі; далей хадзіць не дазволіў сабака – той увесь час чамусьці забягаў напярэймы, люта кідаўся ледзь не на пысу яму і, пырскаючы слінай, гучна брахаў перад вачамі, нібыта на самай справе баяўся, каб не здарылася так, што лось больш не захоча жыць на Міхалкавым двары; дзіўна, аднак ён паслухаўся тады настырнай сабачай насцярожанасці, вярнуўся дамоў: з таго дня так і пайшло кожны раз, нягледзячы, адзін ён ці з Міхалкам; галоўнае – пайсці і вярнуцца.

Сонца, між тым, сягоння ўжо стаяла высока над лесам, і раніца ў пасёлку пасля густой расы, што ападала цяпер на зямлю, бадай, яшчэ ад учарашніх пацёмкаў, нанава пахла спеласцю ліпеньскага лета.

Дзесьці зусім блізка, дробна і настойліва, як у адчаі, стукаў па дрэве дзяцелканаплянік, і гэты кволы гук, здаецца, быў адзіны з таго, што трывожыла затоенасць. Пасёлак цяпер рана прачынаўся і рана аціхаў зноў, бо каторы дзень людзі касілі, а ў такую пару мала каму выпадала заставацца без занятку. У касавіцу ўсім знаходзілася справа на лузе, нават такім, як Гапчын Міхалка. Таму хлапец і не з'яўляўся на ганку, не лашчыў свайго гадаванца, каб выпусціць за вароты.

Вароты таксама стаялі глуха напятыя. Але на пералазе, што паміж тынам і правым шулам варот, былі скінуты дзве верхнія жэрдачкі, пэўна, што назнарок, і лось хутка ўбачыў іх. Ён зноў выйшаў з хлява. Але не падаўся адразу да пералазу, пастаяў яшчэ колькі часу каля ганка, цяпер ужо ўсё роўна як дзеля прыліку, і толькі тады рушыў да пералазу. Яму не трэба было разганяцца, каб пераскочыць. І ён не стаў рабіць гэтага: падышоў да пералазу, падняў над ім пярэднія ногі, і апіраючыся на заднія, умомант перанёс сваё лёгкае цела на другі бок. Пры гэтым ён яшчэ

насцярожыўся, што зараз вось выскачыць з суседняга двара знаёмы сабака, будзе доўга і назойліва брахаць услед, калі наогул не пачне кідацца напярэймы. Ды дарэмна. Сабака таксама сёння быў на лузе з гаспадарамі. І толькі Гапчын галагуцкі певень, які заўсёды начаваў над ім у седале ў хляве, пляскаючы крыламі, узляцеў занепакоена на тын, сярдзіта, таму ажно давячыся, кукарэкнуў на ўвесь пусты двор, нібыта сапраўды здагадваўся, што адбываецца нешта нядобрае.

Але няхай хоць бы і певень. Лось не збіраўся бавіцца каля двара, да якога прывык ужо, як свойскі. І ён пайшоў, адразу трапіўшы на ледзь прыкметную сцежку, што імкнула адсюль па імху да стромага берага Бесядзі; мякка ступаючы доўгімі, спружыністымі нагамі, крочыў усё далей і далей ад пасёлка. Гэта была ўжо не тая бездапаможная і кволая істота, якую адбіў некалі за Верамейкамі Чубар у старога, нямоглага воўка. Цяпер гэта быў гадавалы лось, знешне вельмі падобны на свайго бацьку, застрэленага ў мінулую восень на верамейкаўскім сухадоле, побач з крыніцай, дарма што пакуль нашмат лягчэйшы і не такі дужы, зразумела, без вялікіх рагоў, але ўжо з першым грубіяністым пасынкам на гарбатай, задумлівай галаве. Карацей кажучы, звер ужо гатовы быў да самастойнага жыцця, хоць і не ведаў нават збольшага, якое яно, тое самастойнае жыццё.

Мінаючы адну за адной балацявіны, што засталіся тут, няйначай, ад колішняга рэчышча, маладзенькі лось за якое паўгадзіны нарэшце датупаў да знаёмай пясчанай стромы, адкуль адкрывалася вачам жоўта-зялёная шырыня забесядскіх лугоў; у гэтае лета ён ужо неаднойчы прыходзіў сюды ў сваіх вандроўках, як і цяпер, падоўгу стаяў над вадой, нібыта маючы ў душы намер кінуцца ўніз, каб пераплысці раку ды вярнуцца ў тую пушчу, дзе нарадзіўся і адкуль быў выгнаны вайной разам з бацькамі, усё яшчэ не адважваўся на гэтакі ўчынак і, можа, таму зноў і зноў вяртаўся сюды, на строму, зусім мала калі абмінаючы.

Уласна, ён быў адзін ва ўсім Забесяддзі, а значыць – на цэлым свеце. Але пра гэта яшчэ не ведаў. Таму яму пакуль хапала вясковага двара і тае ласкі, што меў. Ставала і тутэйшага лесу, і стромы, адкуль далёка відаць наўсцяж. І тым не менш з нейкага часу ў ім ужо вырастала незразумелая сіла, якую нельга было змагчы і якая ўсё часцей прымушала скаланацца, быццам упарта шукаючы выйсця сабе. Пра яе ён таксама пакуль мала што ведаў, дарма што гэтак надта проста сказаць пра звера. Але затое выразна адчуваў, што даймаць яна найбольш пачынала тут, на строме.

Усё-ткі – ёсць ён, інстынкт продкаў.

Сёння лось таксама адчуў у сабе гэтую неспакойную сілу, якая раптам моцна зварухнулася ў ім, і чым даўжэй ён цяпер стаяў, тым неадольней рабілася яна. Нарэшце, падпарадкоўваючыся ёй, лось зрушыў з месца – паціху, каб не сарвацца з пакручастай сцежкі, пачаў спускацца па чужых слядах к вадзе.

II

У Верамейках таксама ўжо каторы дзень касілі. Але сёлета пачалі тут касавіцу не так, як заўсёды, – хапалі спярша што было бліжэй к дому, пакідаючы далёкія лугі на потым. Затое з сухадолаў, што знаходзіліся ў шмат якіх месцах за вёскай, верамейкаўцы звезлі ў адрыны сена, лічы, за тыдзень. Здаецца, не паспявалі так хутка рабіць і пры калгасе. І гэта тады, як не ставала ў дварах мужыкоў – і з косамі, і з граблямі, і з вазамі завіхаліся бабы. У кожным разе так здавалася, бо мужыкоў у Верамейках сапраўды не пабольшала за гэты час, а тыя нямногія, што заставаліся ў вёсцы, былі нарасхват.

Сёння верамейкаўцы падаваліся касіць на заліўны луг, да Бесядзі. Хоць гэта было і не дужа далёка, усяго некалькі кіламетраў дарогі, але здавён павялося, што туды звычайна ехалі касцы не на адзін дзень, і не на два і працавалі, пакуль сена не апыналася ў стагах.

Гэты раз у дарогу выбраліся ў познюю раніцу – доўга кляпалі косы, якіх на аднаго мужыка выходзіла па некалькі, бо мала якая жанчына ўмела рабіць гэта; пасля разбіраліся са спісамі, па якіх належала дзяліць луг. Ды і ранейшай спешкі чамусьці не адчувалася, быццам людзі ўжо сапраўды здаволіліся тым, што пакасілі на сухадолах.

Зазыбавы выехалі з двара ўсёй сям'ёй – Дзяніс, Марфа, Масей. Але Марфа мелася к вечару вярнуцца ў вёску, каб не пакідаць без нагляду на ноч гаспадарку, асабліва жывёлу, таму яны пакаваліся не дужа рупліва, бралі з сабой толькі самае неабходнае, спадзеючыся, што іншае гаспадыня прынясе з дому пасля.

– Тае бяды, – сказала яна сваё звычайнае і чамусьці засмяялася, усё роўна як што мела ад гэтага сабе.

Дзяніс Яўменавіч тут жа гукнуў Кузьму Прыбыткова. Мусіць, той ужо чакаў ягонага голасу, бо адразу расчыніў вароты, вывеў за аброць у завулак запрэжанага каня.

– Ну во, – акурат вінавата сказаў стары, – думалася ўжо, што давядзецца да смерці сядзець на лаўцы, а тута сёлета…

Гаворачы так, ён, няйначай, хацеў пачуць ад Зазыбы нейкай ухвалы альбо бадзёрага спачування, на што звычайна здатныя суседзі адзін перад адным, але Дзяніс Яўменавіч ні пярэчыць, ні падтакваць не стаў, зрабіўшы выгляд, што заклапочана корпаецца на возе.

Тады Прыбыткоў пачаў клікаць з хаты нявестку.

– Хутчэй тама, а то во!.. Суседзі ўжо едуць!..

– Дык і няхай едуць, – расчыніўшы на вуліцу акно, акурат нездаволена сказала маладая кабета. – Хіба ж мы дарогі не знойдзем.

– Трэба разам, – буркліва сказаў на яе незгаворлівасць свёкар. – Ды ты вакно зачыняй! Зачыняй вакно, кажу, а то, нябось, так і пакінеш стаяць на дзень цэлы.

– Дак ужо, мусіць, і на ноч, – падышла да суседзяў па завулку Хрысціна Гаманькова, несучы на плячы граблі і белы клунак.

– Ну так, буду я начаваць на лузе, – азвалася яшчэ з хаты Кузьмова нявестка, – бытта мне тута не хапае месца.

– А як Марфа Давыдаўна? – паглядзела на суседку Хрысціна. – Насаўсім ці не?

– Дак дзе тама, – сказала Марфа, – гаспадарка ж яшчэ не звялася. Карову хоць трэба падаіць.

– Яно так, – згадзілася Хрысціна, – ды й, відаць, бабы ўсе павяртаюцца к ночы. Час не той, калі на дзяцей ды на гаспадарку забыцца.

– Даўжож…

– Але дзе ета мой Іванька? – спахапілася раптам Хрысціна. – Іван, а Іван?

– Зараз, мама! – пачуўся няспешлівы голас з двара. – Я даганю.

– Будзеш яшчэ даганяць! – нездаволена буркнула Хрысціна, але без сэрца, як дзеля парадку.

– Да ты сама вось кладзі граблі на калёсы, – сказаў ёй Зазыба.

– Ці ж я паеду? – усё роўна як здзівілася Хрысціна. – Калі ета я на луг ездзіла? Лепей і цяпера пайду. Дак граблі таксама панясу. Сваё плячо не адломіць.

– Як знаеш, – Зазыба ўсміхнуўся.

Нарэшце зачыніла за сабой дзверы ў сенцах і Кузьмова нявестка Анюта – значыць, можна ехаць.

Зазыба цмокнуў на свайго каня, торгаючы лейцамі.

– А ну-тка, бабы, і праўда сядайма! – крыкнуў тады як не маладым голасам Кузьма Прыбыткоў: ён глянуў на суседзяў гарэзлівымі вачамі і трохі выпрастаўся, нібыта растрос раптам збольшага свае гады – што значыць не за сынамі жыць.

Адзін Масей, здавалася, заставаўся абыякавым да гэтай сялянскай узрушанасці, сядзеў сабе спакойна на калёсах спіною да Кузьмовага двара ды слухаў як перамаўляліся паміж сабой суседзі ў завулку; ён памагаў бацьку цяпер ва ўсім – касіў кожнага дня на сухадолах свае палосы, з ахвотаю ехаў і сёння на далёкі луг.

Між тым па вуліцы прагрукаталі нечыя колы. Кузьма Прыбыткоў сказаў:

– Хтосьці паехаў ужо.

– Да ета бытта Іван Хахол, – падказала Зазыбава Марфа.

– То й мы рушым, – Кузьма пачаў падсцёбваць услед за Зазыбам свайго мышастага каня.

На краі вёскі, акурат супроць Кандрусевічавай хаты, дагнала іх Ганна Карпілава, цягнучы на луг ледзь не за спадніцаю двух сваіх хлопцаў.

– Дзе ж Андрэй? – спытаў Зазыба.

– Дак хіба ж яго так проста і адпусцяць, – зусім без прыкрасці, хутчэй з пахвальбой адказала Ганна. – Сілка Хрупчык нешта павёў яго назад у кузню.

– Ат, Хрупчыкі заўсёды многа спалі, – азваўся Кузьма Прыбыткоў. – Бывала й бацька яго, етага Сілкі, спіць-спіць, а тады кінецца ўслед, дак позна ўжо. Але ж настырны, сам не спяшаецца і чалавека затрымлівае.

– Ага, у кузні занятку хапае, – сказала на гэта Ганна Карпілава, але так, каб ніхто не быў вінаваты – ні Андрэй, ні Хрупчык. – Помню, Васіль Шандабыла таксама прападаў у ёй дні і ночы, нават у касавіцу – то ў таго нешта зломіцца, то ў етага. Дак у калгасе свая паласа не чакала. І без каваля пакосяць. А тута…

– Ета праўда, – згадзіўся Кузьма Прыбыткоў. – Я й сам пры калгасе ў старыя запісаўся.

– Затое цяпера ты малады! – павярнуўшыся да яго, бадай, трохі здзекліва сказала Анюта.

– Ну, малады не малады, – засмяяўся Зазыба, заступаючыся за старога Кузьму, – але ж памяняў дубец на касу. І ногі нібыта падужэлі. Хіба няпраўда, Кузьма?

– Проста расхадзіўся, – усё роўна як апраўдваючыся, сказаў Прыбыткоў.

– Нічога, дзядзька, – супакоіла яго Хрысціна Гаманькова. – Ляксейка памрэ, дак ты яшчэ, можа, на Ляксеісе жэнішся. Казалі ж, што малады некалі за ёй хадзіў.

– Успомніла што! – зноў засмяяўся на сваім возе Зазыба.

– Дак ці ж не так?

Але Кузьмовай нявестцы раптам зусім не спадабалася, як павярнулася гаворка, дарма што сама падала повад: яна нядобра глянула на Хрысціну, сказала:

– Вам абы жаніць каго… Лепей падумалі б пра што іншае. Вось, кажуць у Гончу ўчора прыязджаў з Бабінавічаў поп, дак дзяцей тама хрысціў.

– А што табе раптам за клопат? – спытала Ганна Карпілава, усё роўна як яе таксама мала цікавіла гэта. – У цябе ж, здаецца, дзяцей няма?

– Дак у братавай ёсць.

– Няйначай Анюта кумой хоча стаць, – сказала Хрысціна Гаманькова.

– Ну так, без кума таксама цяжка жыць, – засмяялася Ганна Карпілава.

– Ты во сабе знайшла, дак цяпера разумная. Але ці надоўга? Ён жа, здаецца, і так ужо адну ноч у цябе начуе, а другую немаведама дзе прападае.

– Анюта, – цыкнуў на нявестку Кузьма Прыбыткоў – не твая ета справа, дзе хто начуе і куды ходзіць.

– Ну, не мая, дак і не мая. Але дзяцей і ў нас усё роўна давядзецца хрысціць. Ад немцаў загад такі выйшаў – каго не перахрысцяць, таго забіваць будуць. Так што… Не мне плакаць пасля. Сама я – хрышчоная.

– О, госпадзі, – уздыхнула Марфа Давыдаўна. – Усе мы, Анюта, хто ў гадах, хрышчоныя. Так было раней. А вось дзеці… – Яна з журбой паглядзела на Ганчыных хлопцаў.

Гэта ўжо не навіна была ў Верамейках, што ў навакольных вёсках пачыналі хрысціць дзяцей; ведалі людзі і пра тое, што бургамістр Брындзікаў распісаў недзе чаргу для бабінавіцкага папа – каму належала везці дзяцей у царкву, а да каго Дворскі будзе сам прыязджаць. Верамейкаўцы яшчэ не ведалі, як ім выпадзе ў тым бургамістравым спісе, але паміж сабой ужо не толькі шушукаліся; словам, Анюта нічога новага цяпер не сказала; іншая справа зацятасць, якая прагучала ў яе голасе, але прычынай гэтага магла быць проста яе бяздзетнасць…

Слухаючы размову, Зазыба ўспомніў, як прыходзіў да яго нядаўна Раман Сёмачкін, які ўжо ад восені з ахвотаю насіў на сабе абавязкі старасты ў Верамейках. Староста ў той дзень прыехаў з Бабінавіч, да таго ж на добрым падпітку, таму бадзяўся па вёсцы з канца ў канец; ну а да Зазыбы прыцёгся як да свайго намесніка – якраз было напярэдадні касавіцы. Трэба сказаць, што Раман з даўняга ўмеў піць, але, нават

моцна выпіўшы, галавы не губляў, адно што многа гаварыў ды валачыўся па вёсцы; у такія хвіліны ён мог разважаць аб усім, абы толькі хто слухаў. Пра сёлетнюю касавіцу яны тады не адразу пачалі. Спярша Раман загаварыў пра хрышчэнне ў воласці, няйначай, з такім разлікам, што Зазыба стане нярэчыць. Зазыба, вядома, не стаў гэтага рабіць, наадварот, сказаў спакойна: «Што ж, богу богава». Ён і праўда не ведаў, як успрыняць навіну, тым больш што самога некалі таксама хрысцілі. Ён толькі дадаў яшчэ: «Нас жа з табой вазілі ў свой час да папа. І нічога». Ды Раман Сёмачкін не быў бы Раманам, каб не выказацца да канца: «Але ж вунь колькі не давалі хрысціць дзяцей. Лічы, у кожнай хаце нехрысці бегаюць». – «Штосьці я не чуў, каб вельмі не давалі. Проста стары поп у мястэчку памёр, а новага не знайшлі. Таму царква колькі гадоў і не працавала». – «Не працавала, ета проста сказаць. Яе забаранілі. Цяпер жа вось, пры новай уладзе, знайшоўся поп. Значыць, і тады маглі паставіць каго замест памершага». – «Гэта ўжо, Раман, дарэмшчына, – пакруціў галавой Зазыба. – Што царква пры савецкай уладзе была адцзелена ад дзяржавы, то праўда. Але каб забаранялі… Не. У другіх жа мястэчках вялася служба, і ніхто там не закрываў цэркваў. Нават я ведаю, што сёй-той з Верамеек яшчэ пазалетась вазіў малых у Забор’е. Пагалоўна. Нават тых, хто насіў піянерскія гальштукі». – «Пад пагрозай чаго не зробіш…» – «Дак і раней… З таго ж, здаецца, пачалося некалі». – «То, мусіць, чуў звон, да… Лепей спытаў бы вунь у Масея. Ён табе раскажа, як тое было некалі. А нам з табой трэба падумаць найперш, што з сенажацямі будзем рабіць – ці разам пакосім лугі ды гатовае сена падзелім на двары, ці…» – «Не, разам няварта, няхай кожны сваю паласу косіць». – «А бабы?» – «А ты не пячыся за баб, яны яшчэ хутчэй за нас, мужыкоў, са сваім управяцца. Вясной жа паказалі свае здольнасці на сяўбе». – «І ўсё-ткі, няхай бы на сходзе мужыкі рашылі». – «Без сходу ты не можаш? А ўрэшце, – засмяяўся Раман, – сход цябе, Зазыба, і ўратаваў мінулай восенню. Праўда, не сход, а праўленне, усяго некалькі чалавек». – «Колькі было, столькі і рашала. Нас пасля падтрымалі». – «Гэта тваё шчасце, што Гуфельд не стаў дакопвацца. Ды і палітыка зямельная змянілася ў немцаў цяпер не тая, што раней. Цяпер калгасы распушчаны. Як поле падзялілі, так і з лугам паступім». – «Але сход усё-ткі трэба склікаць». – «Можа, ты на сходзе станеш вучыць людзей галасаваць і за тое, хто хоча хрысціць сваіх дзяцей, ахто не?» – «А варта было б!» – «Ну-ну, Зазыба, ты з етым не жартуй, ета табе не абы-што, ета вялікая палітыка». – «Толькі невядома, хто яе выдумаў – ці такія вось, як вы з Брава-Жыватоўскім, ці немцы самі даўмеліся?»

Сход вясковы на другі дзень яны ўсё-ткі склікалі. Але верамейкаўцы згадзіліся з Раманам Сёмачкіным: сенажаць дзяліць на палосы. Урэшце, як хочаце, махнуў рукой Зазыба.

А пра тое, што пачынаюць хрысціць дзяцей па воласці, давялося сказаць Нарчуку. «Цяпер гэта лёгка рабіць, – разважыў камандзір партызанскага атрада. – Загадаў – і ўсё. Але ўмешвацца мы не станем. Не той час. Вельмі далікатная справа станавіцца цяпер паміж людзьмі і богам. Вайна прымушае людзей хапацца за ўсё. Кожны спадзяецца ўратаваць сябе, скарб. А тут клопат пра самае дарагое, пра дзяцей.

Ну а што наогул да гэтай задумы… Тут стараста ваш, Дзяніс Яўменавіч, мае рацыю – палітыка».

Сказаць, дык у горкім дурнап’яне разварушанага сена, якое вазілі з сухадолаў Зазыба неяк даволі лёгка забыў пра свае размовы – і з Раманам Сёмачкіным, і з Мітрафанам Нарчуком. І вось жанкі ў незразумелым запале раптам напомнілі пра гэта.

– Калі ета прыдумаў хто, што чалавек не ў свядомым жыцці выбірае сабе веру, а тады, як нічога не цяміць, – слухаючы кабет, сказаў раптам Кузьма Прыбыткоў. – Адсюль, няйначай, і нявер’е ўсё пасля.

– Канешне, у нечым і адсюль, – падтрымаў яго Масей, – але найперш, бадай, ад таго, што ўмешваюцца ў веру.

– Як ета? – насцярожыў вушы Зазыба.

– Сам жа бачыш, новая ўлада – пад пагрозай збіраецца хрысціць, ну а ранейшая… Я слухаў як вы размаўлялі з Раманам Сёмачкіным. Ты тады не згаджаўся з ім, даказваў што ў Бабінавічах царква не працавала пры савецкай уладзе таму, што рана памёр стары поп. Можа, у вас тут сапраўды было так. Вам відней. Але бачыць давялося іншае. На маіх вачах не толькі гвалтоўна зачынялі царкоўныя брамы, а ўзрывалі, палілі храмы, скідвалі і тапталі абразы. Ды пад рогат. Чаго каштаваў праваслаўнай царкве адзін судовы працэс над патрыярхам Ціханам?..

– Працэс, – нібыта не паверыў Зазыба. – Але ж я сам чытаў паперку – можна лічыць, завяшчанне тагачаснага першасвяціцеля. Ніякай скаргі на савецкую ўладу не было там.

– Дзе ты чытаў?

– У дзеда свайго, Сяголеткі. Ён жа адзін час у Бабінавічах быў царкоўным старастам.

– Ну і што там было?

– У кожным разе, скаргаў на савецкую ўладу не было.

– Ты, бацька, дарэмна абараняеш ад мяне савецкую ўладу. Яе цяпер трэба ад іншых бараніць. Але тое, што бачыў на свае вочы, маніць на стану. Я і палавіны не сказаў табе таго, што давялося бачыць.

– Але паслухай-тка…

Усе насцярожыліся. Скрозь тарахценне колаў аднекуль далятаў гул матора. Зазыба моўчкі нацягнуў лейцы на сябе, стрымаў буланага. Спыніў свайго каня і Кузьма Прыбыткоў.

– Няйначай, машыны едуць? – утрапёна прамовіў ён.

– А божачкі!.. – залямантавала следам за ім Ганна Карпілава, хапаючы з Зазыбавага воза дзяцей.

Другія кабеты таксама пасаскоквалі з калёс, збянтэжана ўтаропіліся на мужыкоў, чакаючы ад іх нейкай пэўнасці.

– Як думаеш, Яўменавіч? – спытаў Кузьма.

– Дык… – Зазыба не знаў, што сказаць.

Сама лепей было б павярнуць коні, з’ехаць з дарогі. Ды як? Па абодва бакі дарогу абступіла балота, ці, як у Верамейках казалі, – нізкае месца, парослае альхоўнікам, па якім нават пешаму нялёгка прашыцца, а тут падводы. Праўда, далей туды, можа, за паўкіламетра, была наезджаная калясьмі вузкая прасека, але таксама наперадзе, таму мала было надзеі непрыкметна праскочыць такую адлегласць. А гул з кожным імгненнем нарастаў.

– Вось што, бабы, – сказаў нарэшце Зазыба, – бярыце дзяцей і гайда. Ды хутчэй, хутчэй!

Жанкі скоранька пахапалі з вазоў свае рэчы і, доўга не думаючы, кінуліся на правы бок ад дарогі ў альшанік. Зазыба глянуў на Кузьму Прыбыткова, той паволі, быццам баючыся рэзкіх рухаў, круціў галавой, настаўляючы ўгору то адно, то другое вуха. І сапраўды, зразумеў тут жа Зазыба, гук даходзіў на дарогу аднекуль зверху, бо чуўся ўжо чысты і роўны. Наўрад ці мог ён здавацца такім, каб прабіваўся скрозь суцэльную сцяну ельніку, што пачынаўся наперадзе, адразу за альховай балацінай.

Значыць, самалёт. А той, няйначай, ляцеў высока, недзе яшчэ па-над Бесяддзю, але быў і цяпер добра відзён адсюль. Зазыба першы агледзеў яго, паказаў рукою Масею.

– Ага, самалёт, – усё роўна як расчаравана, кіўнуў той.

Пачакалі трохі, прыкідваючы, куды ляцець будзе далей, на іх ці міма, – на вока выходзіла, што збоч; Зазыба раптам саскочыў з калёс, падышоў да буланага, паправіў на ім збрую, нібыта цяпер у гэтым быў самы непарадак. Масей тым часам не зводзіў вачэй з самалёта; той па-ранейшаму ляцеў сваім шляхам; на небе не было ні аблачынкі, і Масей падумаў: «Нямецкі, раз ляціць на віду і зусім не высока». Быў момант, што ён нават цікавасць страціўда самалёта: звычайная справа, цяпер гэта нярэдкі выпадак; здаралася, што цэлымі днямі жалезныя птахі будзілі вёску сваім гулам, пралятаючы то па адным, то групамі на рознай вышыні. Масей хацеў сказаць бацьку, што трэба клікаць з балота жанчын, якія наўрад ці далёка паспелі адбегчыся ад дарогі, і раптам ад самалёта аддзялілася маленькая кропка, пасля другая, трэцяя і сталі падаць уніз. «Бомбы», – падумаў Масей, але не прамінула нават хвіліны, як гэтыя кропкі нечакана нібыта выбухнулі ў небе: вакол іх завіхурыла незлічонае мноства бліскучых кропак, якія чым бліжэй падалі да зямлі, тым больш запавольваліся, рабіліся падобныя на шматкі паперы. «Лістоўкі», – здагадаўся нарэшце Масей, сказаў бацьку; той чамусьці вінавата глянуў на сына, прамовіў нецярпліва:

– То добра. Вы тут з Кузьмой завіце жанчын, а я пайду. Якраз пераганю вас па дарозе за Топкай гарой.

– Ладна, – сказаў Масей, падбіраючы лейцы.

III

Зазыба не стаў выбіраць дарогі. Да прасекі адтуль заставалася яшчэ далёка, хоць паўкіламетра пры іншых абставінах лічылася б за нішто. Урэшце, можна было ехаць далей, але вось жа нешта ўзрушыла яго, няйначай, усё-ткі лістоўкі, што высыпаў раптам са свайго чэрава самалёт. Да гэтага не было выпадку, каб такое рабілі немцы. Значыць, на яго думку, ляцеў савецкі самалёт, і недзе над лугам цяпер падалі на зямлю савецкія лістоўкі.

Ломячыся напрасткі праз алешнік, Зазыба прыкінуў, дзе можна будзе натрапіць на лістоўкі, куды іх адносіць ветрам – хоць і невялікі, але вецер быў сёння з поўначы; па разліках выходзіла, што хутчэй за ўсё лістоўкі можна напаткаць на Цімохавай пожні, што цягнецца ад Цяменскага возера амаль да самага лугу. Дзеля гэтага неабходна было выйсці на грэблю і адтуль ужо шыбаваць далей, паўз Шурышча, дзе стаяў узімку атрад Нарчука. Зазыба так і зрабіў. На грэблі неспадзявана пабачыў Андрэя Марухіна. Той таксама кіраваўся з касою на плячы на луг праз Цімохаву пожню.

– А вы, Дзяніс Яўменавіч, як апынуліся тут? – спытаў Андрэй. – Вы ж, здаецца, паехалі з нашымі бабамі?

– Лістоўкі самалёт скінуў, – адно сказаў Зазыба.

– Дзе?

– Па-над Бесядцзю. Я так думаю.

– Самалёт мне таксама чуваць было адсюль, – сказаў Андрэй.

– Можа, што важнае скінуў. Самалёт жа быття наш быў.

Дзіўна, але Андрэй Марухін да Зазыбавага клопату – хутчэй здабыць лістоўку – паставіўся зусім спакойна, у кожным разе, не так, як Зазыба чакаў, калі гаварыў пра самалёт і лістоўкі; пра гэта Дзяніс Яўменавіч здагадаўся па ягоным твары, калі замест цікаўнасці ўзнікла чамусьці паблажлівая ўсмешка; яна раптам нібыта астудзіла Зазыбу, ён адвярнуўся ад прымака, хаваючы такім чынам сваю збянтэжанасць.

Сапраўды, адсюль Марухін самалёта не мог бачыць, бо дарогу, што вяла па грэблі на луг, скрозь абступалі таўшчэзныя дрэвы, найбольш елкі, засцячы неба з усіх бакоў. Зазыба вызначыў гэтую акалічнасць і акурат паспакайнеў, быццам знайшоў апраўданне і чужой абыякавасці, і сваёй збянтэжанасці. Але ў душы тым не менш адчуў пачуццё, падобнае на прыкрасць: і собіла ж наскочыць на сведку ці не дзіцячай цікаўнасці!.. Сам ён наперад цяпер не імкнуўся, спрабаваў патрапляць чужым крокам.

– А чаму вы думаеце, што гэта быў наш самалёт? – адчуўшы Зазыбаву насупленасць, спытаў праз нейкі час Марухін.

– Сам жа бачыў – лістоўкі скінуў, – жорстка адказаў Зазыба. – Немцам для такой справы самалёт не спатрэбіўся б. Яны і так цяпер могуць расклейваць тут іх, дзе захочуць.

– Гэта праўда, – кіўнуў галавой прымак. – Але мне хацелася бачыць сёння вас, Дзяніс Яўменавіч, вось па якой прычыне. Таму вас усё роўна як назнарок сюды вынесла. Скандзілаў лічыць, што я павінен назусім перайсці ў атрад.

– Ну што ж, ён камандзір, яму відней.

– Але ж як Ганне сказаць?

– Так і скажы. Ты ж мужчына, а яна цябе наняла.

– Да таго ж яна вось…

– Дарэмна. Ганне мы б памаглі скасіць ды прывезці і без цябе.

– Але ж…

– Нічога, вайна ёсць вайна. Жаночая спадніца – адно, а справа – іншае. Яны ж, скандзілаўцы, усё яшчэ каля Трусака?

– Кіламетраў за шэсць.

– Але ж ці не дужа далёка? Я гэтага не зусім разумею, што Скандзілаўскі атрад у адным канцы раёна, а Нарчукоў у другім.

– Нашы не хочуць злучацца.

– Чаму?

– Кажуць, што мясцовыя будуць замінаць.

– Але ж сумесна лягчэй дзейнічаць. Як яны не разумеюць гэтага, вайсковыя людзі?

– Тут не ў разуменні справа.

– А ў чым? Скажы!

– Прычына, як мне здаецца, у тым, што ў Нарчука і ў іншых камандзіраў яго атрада сем’і ў Крутагор’і.

– Так, пра гэта ўсе ведаюць.

– Яны там ужо як заложнікі. Немцы могуць дыктаваць праз іх сваю волю партызанам.

– Так ужо і дыктаваць?

– Ва ўсякім выпадку, магчымасць такую яны некалі скарыстаюць.

– А сярод вашых мясцовых многа?

– Камісар. Ціт Субоцін, здаецца, так. Прызнацца, я мала яшчэ каго ведаю. На сувязі з нашым атрадам тут цяпер будзе за мяне пляменніца Сідара Раўнягіна.

– Прося?

– Так.

– Знайшлі сякеру пад лаўкай! Свёкар – сувязны ў Нарчука, а Прося ў Скандзілава!

– Якраз і добра. У адным месцы будзе сыходзіцца сувязь. Лепшага і не прыдумаць.

– Ды ўжо ж…

– А вы быццам не здаволены?

– Як сказаць…

– Мне думаецца, што Скандзілаў з Нарчуком абгаварылі гэта раней. Прынамсі, з боку Сідара Раўнягіна пярэчання не было. Значыць, і з ім нехта размову меў. Ну і яшчэ – гавару я вам пра гэта. Зразумела, не па сваёй ініцыятыве. Скандзілаў загадаў каб і вы ў курсе былі.

– Але Ганне ты таксама скажы. Няхай не думае, што хаваешся ад яе. А то сам ведаеш – ці мала чаго людзі нагавораць. Ды і я віну буду адчуваць перад ёй – сам жа звёў вас. Дык цяпер нібыта і адказваць павінен.

– Не хвалюйцеся, Дзяніс Яўменавіч. Усё будзе як след. Дабро не забываецца. Ды і да хлопчыкаў я прыкіпеў.

– Але вяселле дарэмна мы не згулялі.

І Зазыба, і Андрэй Марухін, вядома, успомнілі цяпер, як збіраліся на пачатку зімы ладзіць вяселле. Аднак тады з вяселлем не выйшла. Не атрымалася і пасля.

Зіма хоць і выдалася сёлета з вялікім снегам і лютымі маразамі, але на прыроду шкодна не падзейнічала, як у той год, калі закончылася вайна з фінамі; прынамсі, сады – першае сведчанне – засталіся скрозь жывыя і цяпер ужо моцна пладаносілі. Зразумела, пасля вялікага снегу вясной было багата вады. І гэта таксама ўрэшце прыдалося, бо нікога не напалохала адсутнасць майскіх дажджоў, без якіх, звычайна лічыцца, не возьмеш добрага ўраджаю ў полі.

Між тым сеялі гэты раз зноў аднаасобна, як і ў дакалгасныя часы, акурат на тых палосах, што былі намераны ўвосень, калі дзялілі на душы жыта і ярыну. Зазыбу і цяпер больш за ўсіх давялося браць на сябе, бо Раман Сёмачкін, выбраны яшчэ ўвосень старастам, у гаспадарчыя справы стараўся не ўмешвацца, зваліўшы вясковы клопат на намесніка валаснога агранома. Сам жа ён потым часам пільнаваўся чаркі – абы станавілася вядома, што ў канчанскім ці канаплёўскім канцы нехта засыпаў солад у бочку, як яны з Брава-Жыватоўскім тут жа спяшаліся ў хату да першай кроплі; там звычайна і праседжвалі цэлыя дні, пакуль Раманава жонка не забірала свайго; Брава-Жыватоўскаму пасля рабілася сумна аднаму жлукціць самагон, і ён таксама падаваўся ў свае Падліпкі, адсыпаўся. З іншых верамейкаўскіх мужыкоў да старасты з паліцэйскім далучаўся часцей Мікіта Драніца, але кожны раз рабіў выгляд, што не мог адчапіцца ад вясковага начальства, што гэта Раман з Брава-Жыватоўскім яго змушаюць «вадзіць кампанію»; асабліва Мікіта пачаў апраўдвацца, калі пайшлі чуткі, што ў Шурышчы аб’явіліся партызаны. Трэба сказаць, Драніцава абачлівасць нават здзівіла Зазыбу. Аднойчы, яшчэ зімой, той спыніў на вуліцы Дзяніса Яўменавіча і, як заўсёды, плюскаючы бяздоннымі вачамі, сказаў ціха: «Ты б, Яўменавіч, як тэй таго, перадаў паклон і ад мяне». – «Каму ж гэта?» – зрабіў знарочысты выгляд Зазыба. «А то сам не здагадваешся? Ну, сваім, нашым, тым, што ў Шурышчы цяпера. Мая Аксюта казала…» – «Ці мала што твая Аксюта выдумаць можа», – не даў дагаварыць Зазыба. Але Драніца не спяшаўся адступацца, учапіўся кляшчом у Зазыбаў рукаў: «Ты, як тэй таго, дарэмна ета. Усе ж ведаюць, хто ў партызанах і чаго ты ходзіш у лес па начах». – «І Брава-Жыватоўскі з Раманам ведаюць?» – «Ад іх я не чуў пра ета, як тэй таго, во і нядаўна з імі ў Сілкі Хрупчыка выпіваў, дак нічога не гаварылі». – «А ты не сказаў часам?» – «Дак не маленькі, як тэй таго». – «Ну а Сілка Хрупчык? Што ён?» – спытаў Зазыба. «Дак, як тэй таго, усе ж у Верамейках ведаюць…» – «Ведаюць і маўчаць, а ты вось…» – «Дак я, як тэй таго, аднаму табе». – «Ну добра, – усміхнуўся Зазыба, – раз ты ўсё ведаеш, дык і мне скажы, што там за партызаны ў Шурышчы?» – «Крутагорскае начальства, як тэй таго. Ай не ведаеш? З самае восені ў зямлянках жывуць. Ну а ты

памагаеш. Да, здаецца, і каваль Марухін таксама звязаны з партызанамі. Але еты ходзіць у другое месца, кудысьці далёка, ажно за Бялынкавічы, дарма што за каваля сябе выдае». – «Сапраўды, Мікіта, Аксюта твая многа ведае, – пакруціў галавой Зазыба. – І калі яна толькі паспявае за ўсім?..» – «Дак ад людзей жа не схаваешся. Так што, як тэй таго, перадавай тама і ад мяне паклон, калі зноў пойдзеш, нябось, нашы агульныя знаёмыя сярод іх ёсць. Напрыклад, Чубар. Бытта бачылі яго колькі разоў за Бесяддзю, у Гончы. Казалі нават, што ета ён, як тэй таго, гнаўся напрадвесні за бургамістрам Брындзікавым, помніш, стралялі на дарозе ў мястэчка?» – «Помню, Мікіта, помню, але… – Зазыба пакратаў рукамі кончык свайго носа (з ім гэта часта бывала, калі задумваўся ці хваляваўся), спытаў: – Аднак лепей было б, калі б ты сам пашукаў сваіх знаёмых. Тут справа такая. Мы і раней, у добрыя часы, не збіралі паміж сабой сяброў, цяпер тым больш няварта гэта рабіць. Так што шукай сваіх сам. Урэшце, дарога ў Шурышча нікому не заказана. Ёсць жаданне даведацца, хто там, схадзі. Ападглядваць за мной ці за Андрэем Марухіным, скажу табе… Словам, і сам ніколі не рабі гэтага, і Аксюце сваёй перадай». – «Дак, як тэй таго!..»

Тая размова не была для Зазыбы нечаканай, ён сам здагадваўся, што ад верамейкаўцаў не схаваешся. Таму яна і не выклікала ў ім вялікай занепакоенасці, хоць, шчыра кажучы, небяспекай у ягоным становішчы пагарджаць ці варта было, дарма што партызаны сапраўды знаходзіліся блізка ад вёскі. Але ж і сам Зазыба цяпер заўсёды быў напагатове. Ды і немцы з паліцаямі не часта наведваліся ў забесядскія вёскі. Ва ўсякім выпадку, з таго разу, як выбралі старасту, у Верамейках яны за ўсю зіму не паказваліся.

Аднак з другога боку размова з Драніцам навяла тады Зазыбу на думку пагаварыць з Мітрафанам Нарчуком – як яму паводзіць сябе пры гэтакім розгаласе? Камандзір атрада доўга маўчаў, быццам не знаходзіў слоў у адказ альбо не ведаў, якое прыняць рашэнне. «З тваім знаходжаннем у вёсцы, Дзяніс Яўменавіч, – нарэшце сказаў ён, – трохі больш складана, чым ты ўяўляеш сабе. Тваю ролю ў нашай справе мы ўжо цяпер высока ставім. Канечне, гэта не значыць, што пры неабходнасці не забярэм цябе з Верамеек. Але атрад пачаў расці хутка. А вось… – Нарчук паглядзеў на Зазыбу як невідушчымі вачамі, тады дакрануўся да пляча: – Словам, пацярпі. Хоць бы да пятніцы. Тады сам зразумееш. Ну а тым часам апавясці нашых таварышаў – Абабурку ў Бабінавічах, Захара Доўгаля ў Гончы, Пацюпу ў Азёрным, няхай у гэту пятніцу прыйдуць сюды. Ды абавязкова. Трэба параіцца».

Зазыба так і зрабіў. Спярша злётаў у Азёрны, а тады па кругу ў Бабінавічы, Гончу. Заглянуў у Кулігаеўку, да Сідара Раўнягіна, але па сваёй ахвоце ўжо, бо Нарчук пра Сідара яму не казаў. Проста Зазыба хацеў вызнаць у таго, ці вядома яму што пра пятніцу. Аказалася, не. Таму яны проста пагаварылі пра сёе-тое, што датычыла вясковых спраў, тым больш што для сялянскай размовы іх заўсёды хапала, і вярнуўся надвячоркам дамоў.

У пятніцу, а гэта было, здаецца, пасля вербніцы, перад самым Вялікаднем, у Верамейкі да Зазыбы прыйшоў з лесу Павел Чарнагузаў, сказаў: «Дачакаемся тут усіх,

па каго ты хадзіў, а тады рушым у Кулігаеўку. Рашылі сабрацца там, у Сідара Раўнягіна». – «А дзеля чаго нас клічуць, калі не сакрэт?» – спытаў Зазыба. «Табе не сказаў Нарчук? На нараду», – адказаў Ягор. «М-да, – усміхнуўся Зазыба, – мы ўжо ад такіх слоў адвыкнуць паспелі. Нават Гуфельд і той цяпер нарад кожны месяц не збірае. Мусіць, немцам сапраўды не да таго. А пад Масквой фронт так і спыніўся?» – «Цяпер трэба ўжо гаварыць – паміж Масквой і Смаленскам. Ад Масквы вораг адступіў. Зрэшты, аб ваенна-палітычным становішчы сёння таксама будзе гаворка».

Пацюпа з Захарам Доўгалем прыйшлі ў Верамейкі амаль разам, з прамежкам літаральна ў некалькі хвілін. Затое бабінавіцкі Абабурка з'явіўся ў познюю раніцу. «Ат! – махнуў ён раззлавана рукой. – Прычапіўся падарозе з мястэчка адзін нямецкі халуй. Куды ды чаго? Ледзь адкараскаўся!» – «Але ж ты сляды хоць замёў?» – спытаў Абабурку Павел Чарнагузаў. «Здаецца, так». – «Тады хадземце, таварышы, а то мы апознімся», – сказаў партызан.

Нараду пачаў Мітрафан Нарчук. У напаўвайсковай форме, з новым рэменем цераз плячо, ён сапраўды падобны быў на камандзіра і гаварыў уладна, нават мала калі ўсміхаўся. «Вось мы і зноў сабраліся разам, – сказаў ён, – каб параіцца, як нам жыць у новых умовах. Багата каго з тых, каго мы прывыклі бачыць на даваенных нарадах, няма сёння тут па розных прычынах. Затое дадалося новага народу, якім яны таксама не менш даражылі, а калі сказаць праўду, дык, можа, і больш, беручы пад увагу незвычайныя ўмовы цяперашняй нашай дзейнасці».

У Сідаравай хаце сапраўды сышліся малазнаёмыя людзі, а то і зусім незнаёмыя, прынамсі, тых, каго ён помніў, Зазыба мог пералічыць на пальцах. Затое кінулася і нечаканасць – бліжэй да стала, за якім размясціліся камандзір атрада Мітрафан Нарчук, камісар Баранаў і начальнік штаба Касьян Бароў Дзяніс Яўменавіч раптам убачыў знаёмую постаць Сцяпана Мурача, таго настаўніка, што некалі, пры канцы мінулага лета, падвозіў да Белай Гліны. З таго часу яны не бачыліся, але гаворка, што адбылася тады паміж імі, не выходзіла ў Зазыбы з галавы, ён не адзін раз вяртаўся да яе, асабліва ў размовах з Масеем; больш таго, Дзяніс Яўменавіч прасіў нават Андрэя Марухіна, каб той адшукаў настаўніка ў Бялынкавічах. І вось цяпер Сцяпан Мурач сядзеў разам з іншымі актывістамі тут, у Сідаравай хаце, і гэтаксама, як і ўсе, слухаў Мітрафана Нарчука.

Камандзір тым часам, папраўляючы штораз рэмень на плячы, працягваў гаварыць рэчы, якія хоць не новыя былі, але тым не менш не прывычныя: «Вось ужо скора год, як ідзе вайна. Вялікая Айчынная. Вайна, якой не знала дасюль чалавецтва. Вайна супроць лютага ворага, які запаланіў нашу зямлю і цяпер спрабуе навесці на ёй так званы «новы парадак». Але ваша прысутнасць тут, дарагія таварышы, наша сумесная праца, якая пачалася нарэшце, здаецца, сур'ёзна і прадумана, гэтая вось нарада сведчыць якраз пра тое, што не толькі ўсталяваць, але нават хоць збольшага ўвесці свой «новы парадак» фашыстам не ўдаецца. І яшчэ адну важную акалічнасць хочацца адзначыць перад тым, як перайсці да канкрэтнай павесткі, – сёння ўжо можна з упэўненасцю сказаць: мы выстаялі ў крывавай барацьбе, нарэшце фронт спыніўся і цяпер стаіць ад Кольскага паўвострава да Чорнага мора. Хутка Чырвоная

Армія зноў пачне наступаць. Будзем спадзявацца на вясенне-летнюю кампанію, яна ўжо, няйначай, прынясе нам канчатковае вызваленне ад нямецка-фашысцкіх акупантаў».

Сёй-той пасля гэтых слоў стаў пляскаць у далоні, але неяк не адразу, а адзін за адным, таму камандзіру атрада давялося нават самому колькі разоў пачынаць пляскаць і пераставаць. Дзяніса Яўменавіча такая Нарчукова падтрымка апладысментаў ажно пацешыла, і ён чамусьці тут жа прыгадаў сабе, як праходзіла колісь нарада «мужоў даверу» ў воласці; тады прысутныя таксама пляскалі ў далоні вось гэтак, акурат не ўмеючы, быццам нанава прывыкаючы, жыдка і з перапынкамі, аднак у адрозненне ад сённяшняга выпадку ў мястэчку за сталом стаяў адмысловы дырыжор, які ўвесь час, пакуль ішла нарада, не выпускаў з рук пруткага шомпала. «Адвыклі мужыкі пляскаць», – пусціў на твар несхаваную ўсмешку Зазыба, але тут жа схамянуўся, зрабіў сур’ёзны выгляд, падумаўшы, што ўсмешка зусім недарэчы. Ён крутануў галавой, акурат праганяючы вясёлае насланнё, пачаў зноў уважліва слухаць Нарчука, які сапраўды скончыў уступ і падступіўся да галоўнага: «Напэўна, карысна будзе вам, таварышы, заслухаць справаздачу камандавання атрада аб баявых дзеяннях. Гэта – першае. Другое – я ўжо збольшага накрэсліў тут, ва ўступным слове, ваенна-палітычную абстаноўку ў краіне, але здаецца, ёсць патрэба паслухаць паведамленне пра гэта больш дэталёва. І трэцяе, бадай, самае галоўнае пытанне, – аб ваенна-гаспадарчых задачах, што стаяць цяпер перад партызанамі і працоўнымі на акупіраванай тэрыторыі».

Пачаўшы з самага заснавання атрада ў жніўні сорак першага года, Мітрафан Ануфрыевіч пералічыў па паперы, колькі было знішчана за мінулы час валасных упраў і паліцэйскіх станаў, колькі пакарана здраднікаў – бургамістраў, паліцэйскіх, старастаў, колькі забіта ў сутычках саміх немцаў… Уласна кажучы, падобныя звесткі ні для каго не былі навіной, у вёсках, па абодва бакі Бесядзі, людзі звычайна ведалі, што рабілася вакол, злашча, ні немцы, ні партызаны асабліва не трымалі свае баявыя аперацыі ў сакрэце, не пакідалі ў няведанні мясцовае насельніцтва. Іншая справа, на чый баявы рахунак сапраўды запісваліся поспехі тых аперацый. Нарчук і сам зразумеў што тут штосьці трэба ўдакладніць, калі нават не растлумачыць да канца. Таму неўзабаве выпусціў з рук паперку на стол, акінуў цёмнымі вачамі запоўненую Сідараву хату, сказаў: «Вядома, страты, нанесеныя ворагу за мінулую восень і за гэтую зіму, не абмяжоўваюцца нашым пералікам. Вы ж, напэўна, усе ў курсе, што на паўночным усходзе, у Каніцка-Трускаўскіх лясах, пачаў дзейнічаць новы атрад, які ўзначальвае капітан Чырвонай Арміі Скандзілаў. Дарэчы, прадстаўнік з таго атрада і на нашай нарадзе прысутнічае, вось, – ён паказаў адразу перад сабой, у першым радзе, – таварыш Мурач. Такім чынам, сувязь з атрадам вайскоўцаў мы маем, аднак яшчэ належыць паставіць справу так, каб узгадняць усе дзеянні. Справа гэтая не надта лёгкая, хоць на першы погляд яна і можа здавацца лёгкай. Тут неабходны нейкі новы орган, які б займаўся і сувязямі паміж атрадамі, і ўзгадненнем іх дзейнасці, і зборам розных даных. Ну, такі, як, напрыклад, падпольны райком партыі. Але ж, – уздыхнуў

Нарчук, – амаль увесь склад нашага падпольнага райкома загінуў летась у Машавой. Уласна кажучы, жывы застаўся адзін я. І толькі таму, што быў на заданні за межамі раёна. На сённяшні дзень камандаванне атрада мае дакладныя звесткі, што і як здарылася тады ў Машавой, як немцы выйшлі на членаў падпольнага райкома. Дарэмна яны ўсё яшчэ распускаюць чуткі, што немку ў Машавой, жонку тамашняга бургамістра, забілі райкомаўцы. Маўляў, на гэтым і папаліся. Між тым таварыш Пацюпа, які знаходзіцца тут, сярод нас, можа пацвердзіць, што нашы таварышы да забойства бургамістравай жонкі ў Машавой не маюць ніякага дачынення. Так, прычынай правалу райкома стала забойства немкі. Але толькі ўскоснай. Дакладней кажучы, з яго пачалося ўсё». – «Ну а канкрэтна, што канкрэтна вядома пра?..» – зварухнуўся на ўслоне незнаёмы Зазыбу чалавек; Нарчук кіўнуў яму галавой, перавёў позірк на Пацюпу, які сядзеў на табурэце паміж вокнамі на вуліцу; той выпрастаўся, паклаў шапку на табурэт: «Як было на самай справе? Я сапраўды магу пацвердзіць – да забойства Зімаровай жонкі ні Яфрэменка, ні Рыгайла, а тым больш Касьян Манько з Цішчанкам і Якубовічам не маюць ніякага дачынення. У забойстве дзейнічалі двое партызан са спецатрада Карханава, ну, таго, што прыходзіў да нас сюды з Масквы ўвосень. Праўда, і яны гаварылі, што выйшла ўсё знянацку, быццам несвядома, немка сама кінулася паміж імі і бургамістрам». Здаецца, Пацюпа яшчэ хацеў нешта дадаць, але Нарчук сам стаў гаварыць далей: «Свядома ці несвядома, а выпадак той меў трагічныя вынікі. Бургамістр, які ўцёк ад партызан праз акно, паклікаў з Баронькаўскага бальшака немцаў. Два члены падпольнага райкома – Яфрэменка з Рыгайлам – адразу былі схоплены і пакараны на калгасным двары ў той жа дзень. На астатніх падпольшчыкаў немцы зрабілі засаду пасля. Знайшліся людзі, якія дапамаглі фашыстам ажыццявіць задуму. Людзі праклянуць іх, тым часам як справядлівая гісторыя аддасць належнае забітым. Ніякімі паклёпамі не ўдасца зняць арэол герояў з нашых таварышаў. Доўга нам здавалася, што сакратар райкома Касьян Манько застаўся жывы – яму ў Крутагор'і сапраўды ўдалося ўцячы ад катаў. Кажуць, хтосьці з паліцэйскай аховы дапамог. Але дарэмна. Лёс аказаўся няшчадны і да яго. У Краснапольскім раёне, куды ён прыйшоў, таксама знайшоўся здраднік, выдаў яго. Там, у засценках гестапа, Касьян Касьянавіч і загінуў. Увогуле, здраднікаў у нас… Што гаварыць, ад здраднікаў мы нясём самыя адчувальныя страты. Часам думаеш: на што спадзяюцца такія людзі? Ім жа ніхто не даруе здрады – калі мы цяпер не здолеем выкрыць і адпомсціць, дык пасля, як настане канец, не пазбегнуць расплаты. Тады за іх возьмуцца следчыя прафесіяналы. І тым не менш рэчаіснасць пацвярджае: здраднікаў немцы паранейшаму знаходзяць і даволі ўмела скарыстоўваюць іх ледзь не ў кожнай сваёй акцыі, звязанай з паляваннем на савецкіх патрыётаў. Сёння няма часу аналізаваць прычыны калабарцыянізму, але на наяўнасць яго звярнуць вашу ўвагу мы палічылі патрэбным. Акупанты цяпер спрабуюць выдаць гэтую з'яву за разнавіднасць грамадзянскай вайны, якая нібыта пачалася паміж партызанамі і мясцовым насельніцтвам. Зразумела, што такім чынам яны імкнуцца выдаць жаданае за сапраўднае. Ім не ўдасца ні скарыць нас, ні пасварыць. Ім не дапамогуць ні зброя, ні правакацыі, на якія яны вялікія мастакі. Адна такая правакацыя

правалілася ўжо, я маю на ўвазе банду ў Сілічах. Стварылі яе немцы, дарма што самі ж і пакаралі верхаводаў».

Слухаючы Нарчука, Зазыба ўспомніў, што некалі так вось гаварыў у Гончы Касьян Манько; тады ён нават слова гэтае ўжыў – калабарцыяністы; сэнс яго Зазыба зразумеў і той раз хутчэй па гучанні ды змесце размовы – аднак жа здраднікі, падумаў ён цяпер, як ні называй, заўсёды застаюцца здраднікамі; праўда, Манько свае развагі засноўваў тады на пачатку акупацыі, калі ўсё бачылася на будучае; цяпер, наадварот, тое, што ўяўлялася некалі як магчымае, станавілася явай. І гэта было жахліва, хоць Зазыба, з другога боку, і тады, і цяпер прымушаў сябе дадумваць сітуацыю, а значыць, і думаць трохі іначай, яно, калі можна сказаць так – глыбей і далей. Праўда, гэта зусім не сведчыла, што ў нечым ён не згаджаўся і з Манько, і з Нарчуком, не падзяляў іхняй заклапочанасці. Не. Тут было іншае – у адрозненне ад сакратара падпольнага райкома і камандзіра партызанскага атрада, якія ў сваіх разважаннях моцна трымаліся цяперашняй рэчаіснасці, Дзяніс Яўменавіч разумеў яшчэ і тое, што рэзкі падзел людзей на «сваіх» і «чужых» быў абумоўлены ў нечым мінулым, даваенным жыццём, і калі ён цягнуўся адтуль, з мінулага, то мусіў пераходзіць затым, даваць сябе адчуваць, стаўшы не менш жахлівай з’явай, таксама і ў будучым, пасляваенным жыцці. Але тое жыццё яшчэ належала адстаяць… Пра сілічоўскую банду, аб якой нагадаў цяпер Нарчук, Зазыба першы раз даведаўся ад бабінавіцкага Абабуркі. Гэта ўжо было на згоне зімы, аднак яшчэ стаялі халады, а вясковыя вуліцы туліліся пад вялікімі сумётамі, што лёгка даставалі стрэхі пабудоў. Банда дзейнічала пад выглядам партызан, рабавала насельніцтва ў навакольных вёсках. Стварыў яе мясцовы бургамістр Казлоў. Уваходзілі ў банду валасны пісар Адам Собаль, паліцэйскі Пракапенка і яшчэ некалькі чалавек, што жылі ў вёсцы, але былі прышлыя, з ліку так званых прымакоў, якія аселі пасля адступлення Чырвонай Арміі. На спажыву бандыты звычайна хадзілі ў масках, зробленых са старых панчох альбо пашытых знарок дзеля гэтага, паводзілі сябе груба і бесцырымонна, наперад ведаючы, што ніякая небяспека, а тым больш пакаранне ім не пагражаюць. Прынамсі, з боку немцаў. Хутчэй за ўсё, што і партызан яны не апасаліся, балазе зімой тыя знаходзіліся за Бесядцзю, сядзелі ў сваёй зямлянцы, мала калі выходзячы з лесу… Словам, прастору для бандыцкай дзейнасці бургамістравай шайцы хапала. І ўдзельнікі яе з кожнай ноччу рабіліся ўсё больш нахабнымі. Нарэшце перасталі ездзіць падалей ад вёскі, пачалі тузаць сваіх, сілічоўскіх. На гэтым і пагарэлі. Пасля аднаго такога «налёту» да бабінавіцкага каменданта Адольфа Гуфельда прыйшла раптам з Сілічоў кабета, паскардзілася, што ўначы ў яе забралі сынаву адзежу. «Гэта партызаны, – сказаў камендант. – Ты да іх ідзі скардзіцца. Можа, і вернуць назад». – «Дак не ж, – стаяла на сваім кабета, – ета нашы мужыкі, вясковыя, рабуюць. Аднаго сама пазнала, дарма што панчоху на морду нацягнуў». – «Каго?» – спытаў Адольф Карлавіч. «Дак, – памялася кабета, але вытрымала калючы камендантаў позірк, сказала, – вашага паліцэйскага, Пракапенку». Камендант быў уражаны зацятай сялянскай настойлівасцю, найбольш, можа, што ў яго гэтак прасілі заступніцтва, перамовіўся тут жа з другім немцам, што

знаходзіўся ў пакоі, ляснуў па стале шомпалам: «Добра, старая, я зараз сам паеду да вас у воласць, аднак ведай: калі не знайду нарабаванага ў першага ж з тых, на каго ты пакажаш, літасці не чакай – буду ўласнаручна сцябаць вось гэтай штукай (паказаў шомпал) да таго часу, пакуль не выпусціш духу». Беднай жанчыне, канечне, адступаць ужо не было куды, і яна заківала галавой у знак згоды. Маўляў, цярпець дык цярпець, абы дабро дамоў вярнуць. У Сілічы з Бабінавіч ехалі цэлым атрадам на шасці санях – два немцы папарадзе і куча паліцаяў за імі, якія трымалі пры сабе старую, акурат ведзьму, і ўсё рагаталі, прадчуваючы нешта вясёлае і незвычайнае. Але старая аказалася шчаслівай – у Пракапенкавай хаце сярод гары нарабаванага барахла сапраўды была знойдзена сынава адзежа, як і гаварыла кабета; яна даказала гэта па знаёмых метках. Ад паліцаевага двара сцежка павяла да хаты валаснога пісара Адама Собаля, адтуль – да яго брата, потым да самога бургамістра Казлова. Бабінавіцкім паліцаям у той дзень хапіла ў Сілічах работы да самага змяркання – шукалі патаемныя сховы па хатах ды хлявах, цягалі адтуль сялянскае дабро, пакавалі на сані, каб везці ў мястэчка. Асабліва шмат нарабаванага знайшлі ў Адама Собаля. Давялося Гуфельду адпусціць кабету дамоў, а членаў банды арыштаваць. Больш таго, траіх бандытаў ці не на другі ж дзень камендант загадаў расстраляць. Адпусцілі з Бабінавіч толькі бургамістра Казлова. Далі магчымасць таксама збегчы аднаму з Сабалёў. Гэтая акалічнасць адразу насцярожыла людзей, значыць, немцы гуляюць у тайную гульню, бо, няйначай, самі мелі дачыненне да сілічоўскай банды, дарма што паказваюць на партызан…

Нарчук цяпер у дачыненні да банды абмежаваўся агульнымі развагамі, дадаўшы, што падобныя правакацыі немцы наладжваюць і ў іншых раёнах, аднак акалічнасць складвалася кожны раз для іх не лепшым чынам.

Нарэшце Мітрафан Ануфрыевіч наблізіўся да галоўнага, да гаспадарчай дзейнасці. «Калі зыходзіць з тых даных, якія маем у атрадзе, – сказаў ён, – то абстаноўка на фронце складваецца на нашу карысць. Вораг адступіў ад Масквы. Па-ранейшаму мужна абараняецца паўночны порт на Баранцавым моры Мурманск. Не здаецца Ленінград. На Чорным моры вось ужо многа месяцаў абараняецца Севастопаль. Як можна зразумець, расстаноўка сіл і ваенна-палітычнае становішча вызначаюцца цяпер вынікамі папярэдняга перыяду вайны. І мы з вамі, знаходзячыся ў тыле, павінны дбаць ужо не толькі пра баявую, масава-палітычную, але і гаспадарчую дзейнасць. У новых умовах яна становіцца, можа, самай галоўнай, прынамсі, вельмі надзённай задачай, у сувязі з гэтым наша ўвага павінна быць павернута да вясенняй пасяўной кампаніі. Чырвоная Армія хлеба нам сюды не прынясе. Яна прынясе вызваленне, а не хлеб. Пра хлеб мы абавязаны падумаць самі. І для Чырвонай Арміі, і для сябе. Улічваючы цяперашнюю аснашчанасць сельскагаспадарчай тэхнікай, наўрад ці варта спадзявацца, што мы ўзаром тыя плошчы, якія звычайна засяваліся ў мірныя гады. Аднак, тым не менш, нам неабходна і сёлета заняць пад збожжавыя, бульбу і тэхнічныя культуры тысячы гектараў. Справа нялёгкая. Прашу выказвацца».

Побач з Зазыбам падняўся з услона чалавек у падшытых скурай валёнках, махнуў перад сабой шапкай. «Аднак цяжкасці не толькі ў адсутнасці тэхнікі, таварыш камандзір, – сказаў ён змрочна, акурат яшчэ раздумваючы, ці правільна робіць, выступаючы. – Не будзе насення. У нас, напрыклад, у вёсцы людзі даядаюць апошняе збожжа. Вялікія былі пастаўкі немцам увосень». – «Мы пра гэта ведаем, – кіўнуў галавой Нарчук. – Але са становішча трэба выходзіць. На тэрыторыі раёна знаходзяцца тры ссыпныя пункты. Праўда, яны пад аховай у немцаў. Давядзецца браць збожжа сілай і раздаваць насельніцтву. Хацелася б ведаць, якая колькасць насеннага матэрыялу спатрэбіцца кожнай вёсцы. Неабходна ўжо сёння прыкінуць па спісах». – «А немцы? – спытаў усё той жа чалавек у падшытых скурай валёнках. – Ці не падставім мы гэтым самым пад удар сялян?» – «Вядома, – згадзіўся Нарчук, – перашкаджаць палявым работам яны ў нейкай ступені будуць. Асабліва пасля таго, як страцяць збожжа. Але давайце падумаем разам, я нездарма сказаў – у нейкай ступені. Ім жа таксама патрэбны будзе хлеб з новага ўраджаю. Пры гэтым неабходна ўлічыць, што адыходзіць з нашай зямлі сваёй ахвотай яны не збіраюцца. Так што ім таксама выгадна, каб сяляне і сёлета засявалі свае палосы, на адны дзяржаўныя гаспадаркі, у якія перайначаны былыя саўгасы, яны не стануць спадзявацца. Цяжка сёння прадбачыць, чым адкажуць на наша пачынанне і на нашу спробу захапіць збожжа на ссыпных пунктах, але на ўсе іхнія захады належыць адпаведна рэагаваць. Ва ўсякім разе, пад удар насельніцтва мы не збіраемся ставіць, будзем усімі сіламі абараняць вас. Скандзілаўцы таксама ў сваёй зоне будуць напагатове». – «А чаму самога Скандзілава няма сёння тут? – спытаў усё той жа чалавек. – Хіба не запрашалі?» – «Мы ездзілі да іх. Яны цяпер за Трусакам. Але скандзілаўцы адмовіліся прыехаць. Прыслалі вось прадстаўніка».

Гэта крыху азадачыла прысутных. Але на далейшую гаворку, здаецца, не падзейнічала. Людзям падабалася быць разам. Да таго ж адкрыта абмяркоўваць надзённыя справы.

Гаварылі ў Сідаравай хаце ажно да цёмнага. Разыходзіліся з пасёлка ўзрушаным натоўпам і ўжо за ваколіцай далей брылі па адным, кожны ў сваю вёску. Зазыба хацеў запрасіць да сябе ў Верамейкі Сцяпана Мурача, але той адмовіўся, сказаў, што ёсць справа ў раённым атрадзе.

Сапраўды, пасяўная вясной прайшла мала не па плану камандавання партызанскага атрада. Збольшага хапіла і насення, хоць адбіць у немцаў удалося толькі адзін ссыпны пункт, што знаходзіўся ў Забычанні. Але на хуткае вяртанне Чырвонай Арміі надзеі не збыліся.

Немцы выкарысталі зіму, каб забяспечыць сваім войскам новы ўдар на поўдні. Для гэтага асноўныя магутнасці ваеннай прамысловасці былі аддадзены ў распараджэнне вермахта. У маі фашысцкае камандаванне апярэдзіла наступальныя аперацыі савецкіх войск у Крыме, затым кінула свае бранявыя армады на Харкаўскі напрамак. І ўжо ў чэрвені паў Севастопаль. Затым настала чарга такіх гарадоў, як Валчанск, Купянск… Шостая армія Паўлюса рушыла на Дон, каб наблізіцца да Волгі…

У гэты час камандуючы ахоўных войск групы армій «Цэнтр» быў моцна заклапочаны становішчам у тыле вермахта.

Нягледзячы на бліскучыя поспехі на фронце, дакладваў ён у штаб сухапутных войск, абстаноўка на тэрыторыі тылу працягвала пагаршацца і цяпер настолькі абвастрылася, што загад Сталіна «стварыць у тыле нямецкай арміі невыносныя ўмовы» не далёкі ад свайго ажыццяўлення. Узяты ў палон афіцэр парашутыстаў даў такія паказанні: «У Маскве цяпер надзеі на далейшы ход вайны абапіраюцца на два пункты: а) утварэнне другога фронту ў Еўропе; б) знішчэнне немцаў на акупіраванай тэрыторыі з дапамогай партызан; з гэтай мэтай пры галоўным камандаванні Чырвонай Арміі нядаўна створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху». Словы палоннага пацвярджае той факт, што партызанская барацьба па-ранейшаму разглядаецца балыпавікамі як важны інструмент вядзення вайны. Таму па псіхалагічных і палітычных матывах, на падставе ўказання фюрэра, у нас у далейшым забараняецца ўжываць слова «партызан»… Гаворка ўвесь час павінна весціся пра звычайных бандытаў… Між тым фюрэр мае даныя, што асобныя ваеннаслужачыя вермахта, якія ўдзельнічаюць у барацьбе з партызанамі, за свае паводзіны прыцягваюцца да адказнасці. Па гэтым пытанні фюрэр загадаў: 1) Калі барацьба супроць партызан не будзе весціся самымі жорсткімі метадамі, у нас праз нейкі час не будзе больш сіл, каб справіцца з гэтай заразай; войскі ў такой вайне павінны ўжываць любыя сродкі, не лічачыся ні з жанчынамі, ні з дзецьмі, абы нашы меры прывялі да поспеху; адступленне ад гэтага правіла з’яўляецца здрадай супроць нямецкага народа і супроць нямецкіх салдат на фронце, якія на сабе адчуваюць вынікі партызанскіх дзеянняў; 2) З гэтага часу ні адзін немец, які ўдзельнічае ў барацьбе з партызанамі, не можа быць прыцягнуты ні да дысцыплінарнай, ні да судовай адказнасці за свае дзеянні.

Становішча ў тыле армейскай групы «Цэнтр» грунтоўна абмяркоўвалася на нарадзе камандзіраў дывізіі ахоўных войск з начальнікам арганізацыйнага аддзела галоўнага камандавання сухапутных войск. Зразумела, было б лепей, каб гэтая актыўнасць пачалася раней, аднак доўгая спрэчка з камандаваннем армейскай групы аб вяртанні батальёнаў якія ў часе маскоўскага контрнаступлення рускіх прыдаваліся франтавым часцям, перашкаджала нам. Цяпер мы зноў зрабіліся гаспадарамі становішча. Тым больш што ўсмірэнне тэрыторыі тылу, згодна з фюрэрам, як мы зразумелі, не будзе толькі абавязкам генерал-кватэрмайстра, а ў роўнай ступені і абавязкам аператыўнага аддзела галоўнага камандавання.

З ацэнкі абстаноўкі, якую намалявалі камандзіры ахоўных дывізій, вынікае, што побач з невялікімі аперацыямі (неадкладныя акцыі) наспела неабходнасць сістэматычна праводзіць буйныя аперацыі… Пасля кожнай такой аперацыі трэба рабіць выніковыя зводкі – падлік страт праціўніка, захопленых трафеяў колькасці ўзятай жывёлы, нарэшце, падлік уласных страт. Для ўдзелу ў аперацыях ёсць неабходнасць прыцягваць палявыя і мясцовыя камендатуры. У сувязі з гэтым кожнай камендатуры належыць стварыць ударную групу (мясцовую гвардыю) з ліку жандараў і паліцэйскіх з паліцыі службы парадку. Пытанне аб паліцыі службы парадку

на сённяшні дзень стаіць такім чынам: яна цалкам падпарадкоўваецца камендантам палявых або мясцовых камендатур, але вайсковым часцям дазваляецца браць падраздзяленні паліцэйскіх у камендатур на час аперацый, у такім разе ваеннае кіраўніцтва імі ажыццяўляецца камандзірамі дывізій альбо спецыяльна прызначанымі для гэтай мэты афіцэрамі (інспектарамі); ёсць сэнс на сярэднія кіраўнічыя пасады прызначыць рускіх камандзіраў, таму што цяпер дывізіям неабходна мець на ўвазе патрэбную колькасць іх.

У склад ахоўных войск на нашай тэрыторыі ўключаны таксама наступныя мясцовыя фарміраванні: а) 102-гі казацкі батальён, які мае два кавалерыйскія эскадроны, два эскадроны веласіпедыстаў, артылерыйскі ўзвод на коннай цязе, узвод супрацьтанкавых гармат; агульная колькасць батальёна – 1043 чалавекі; б) батальён «Бярэзіна», батальён «Днепр», батальён «Волга», батальён «Дзвіна»; кожны з гэтых батальёнаў складаецца з чатырох стралковых рот – разведузвод веласіпедыстаў, узвод сувязі, санкаманда, паўбатарэя і супрацьтанкавы ўзвод з чатырох гармат; колькасць кожнага батальёна – 1000 чалавек.

Для ачышчэння тэрыторыі тылу неабходна ажыццяўляць наступныя баявыя аперацыі: 1) сіламі 203-й ахоўнай дывізіі – аперацыя № 5 (паўтор у вялікіх маштабах аперацыі, што праводзілася згодна з загадам для ачышчэння ад бандытаў тэрыторыі паміж ракой Бярэзіна і дарогай Бабруйск – Мінск у межах тэрыторыі размяшчэння дывізіі – пачатак 17.8); 2) сіламі 286-й ахоўнай дывізіі – аперацыя № 9 (паўторнае шырокае прачэсванне мясцовасці на поўнач і на поўдзень ад чыгуначнай лініі Мінск – Орша – пачатак прыкладна 1.9); 3) вышэйшы начальнік СС і паліцыі запланаваў аперацыю № 36 (ачышчэнне тэрыторыі па абодва бакі Дняпра ў раёне Стары Быхаў, пачатак – прыкладна 4.9); 4) сіламі 201-й ахоўнай дывізіі будзе праведзена аперацыя № 33 (адразу за аперацыяй «Грыф» № 30), неабходна ўсмірыць раён Сянно – Бешанковічы – Чашнікі; пачатак – прыкладна 1.9); 5) сіламі 221-й ахоўнай дывізіі маем намер працягваць аперацыю «Балотная кветка», у выніку якой неабходна знішчыць партызанскія банды ў лясах паміж рэкамі Дзясна і Сож.

IV

Ужо з першых крокаў на лузе Дзянісу Яўменавічу, які ўсю дарогу ад лясной грэблі прайшоў з Андрэем Марухіным, стала вядома, што лістоўкі ўпалі на зямлю нямецкія. Ён зразумеў гэта і адразу неяк ажно ахляў. Лістоўкамі была ўсыпана ўся прастора ад ракі да Бесядзі. Яны ляжалі скрозь на траве, на лазовых кустах, на былых бачажынах, мяклі ў вадзе па старыках, якія завуцца тут дзербамі, віселі на алешніку, што рос абапал ракі. Між тым дарэмна Зазыбу здавалася тады, з дарогі на луг, што яны белыя. Напраўду выйшла – светла-сінія. Тэкст быў надрукаваны па-руску, вялікімі літарамі, без загалоўка, але палова першага радка выглядала чарнейшай.

Зазыба пакруціў у руках лістоўку, нібыта яшчэ не верачы, што не «наша», стаў учытвацца. Немцы хваліліся поспехамі сёлетняга наступлення. Пісалі пра шостую армію, якая з баямі выйшла на Дон, кіруючыся да берагоў Волгі… Часта паміналі Харкаў, Астрагожск… Прыводзілі лічбы савецкіх дывізій, якія трапілі ў акружэнне і цяпер, у пачатку ліпеня, перамолваліся ў катлах «доблеснымі германскімі войскамі». І ўсё гэта параўноўвалася з летняй кампаніяй сорак першага года.

«А што ж нашы?.. – падумаў Зазыба з тугой. – Няўжо і праўда немцы зноў бяруць верх?»

Але далей не было калі разважаць – да яго з усіх бакоў ішлі людзі, чуліся блізкія галасы, і Дзяніс Яўменавіч паспеў толькі яшчэ страпянуцца душой. Тым часам яму здавалася, што верамейкаўцы пачнуць даймаць яго пра лістоўкі, гаварыць пра тое, ці праўда гэта, што ў іх напісана, а ён не гатовы да такой размовы, ні пацвердзіць, ні абвергнуць нічога няздольны, аднак ні адзін чалавек чамусьці нават не абмовіўся пра іх, усе рабілі выгляд, што нічога асаблівага не здарылася, – ну, праляцеў самалёт, скінуў паперчыны, засмеціўшы луг, дык ці ж бедаваць цяпер, як кажуць, сабака брэша – вецер носіць. Але сам Дзяніс Яўменавіч не мог так думаць. Ды і ў стрыманасць іншых не дужа верыў, відаць, проста вяскоўцы паспелі перакінуцца словамі пра ўсё, а тады рушылі да яго. І ўсё-ткі ён быў здзіўлены, што не з лістовак яны пачалі, а з таго, як трэба мераць палосы і з якога краю ставіць віткі з калкамі.

Канечне, пра лістоўкі верамейкаўцы таксама не забыліся. Загаварылі пра іх. Але пазней. Нібыта неспадзеўна ўспомніла пра іх Роза Самусёва, сказала:

– Самалёт еты… мог бы прыляцець другі раз, а то цяпера во сена будзе з паперай.

Дзіўна, але ў натоўпе нехта раптам засмяяўся з яе слоў. Тады Кузьма Прыбыткоў, седзячы на калёсах, падаў параду:

– Няхай пройдуцца людзі, хто на ногі скарэйшы, ды збяруць.

– Дак траву паклычам, – запярэчыў Сілка Хрупчык. – Ды й пакупацца сяму-таму давядзецца. Не ўсе ж яны трапілі на сухое.

– Сілка праўду кажа, – заківаў галавой Іван Хахол. – Лепей кожны пасля збярэ на сваёй паласе. А то яшчэ і падумае, можа, з паперай малако смачнейшае стане. Ды і каровы за зіму грамаці набяруцца.

– Ты жартаўнік, Іван, – сказаў на гэта Кузьма Прыбыткоў, – ад такой паперы і ад такога малака нуда адна ў чалавеку будзе.

Дзяніс Яўменавіч паглядзеў з радасцю на Кузьму, усміхнуўся куточкамі вуснаў усё роўна як толькі дзеля сябе, сказаў:

– Так і рашылі. Будзем палосы мераць, а там… Дзе наша трынога?

Іван Гаманькоў збегаў да нейчага воза, прынёс казла. Але Зазыба не адразу падаўся з ім па лузе, згледзеў спярша Масея, што стаяў з Андрэем Марухіным, падышоў.

– Ну а што ты думаеш пра гэта? – спытаў ён сына. – Нябось, прачытаў?

– Думаю, бацька, думаю, – чамусьці рэзка, нават адчужана сказаў Масей. – А думаю я пра тое, што і ў гэтым годзе вайне не настане канец.

– Мяркуючы па тым, – паківаў апушчанай галавой Андрэй Марухін, – што напісана, немцы выкарыстаюць лета для новых заваёў. Апёкшыся зімой на Маскве, яны, не інакш, выпрацавалі новыя планы. І ім, відаць, спадарожнічае там, на поўдні, поспех. Іначай не сталі б яны зараней хваліцца. Адна справа з дня ў дзень крычаць аб перамогах увогуле, у вайну штабы сапраўды многа хлусяць, іншая – цяпер, у канкрэтным выпадку…

– А які ён цяпер, канкрэтны выпадак? – з выразнай нездаволенасцю спытаў Зазыба, якая адразу ж падобнай стала на звычайную прыкрасць.

– Ды ў лістоўцы, Дзяніс Яўменавіч, скрозь канкрэтнасць, – адказаў Марухін. – Наўрад ці хлусяць немцы.

– Значыць, не хлусяць?

– Думаю, што не. Яны апярэдзілі нашых.

– Але не трэба мітынгу, – чамусьці раздражнёна, усё роўна як спрабуючы памірыць бацьку з Андрэем Марухіным, умяшаўся ў гаворку Масей.

– Дык ён, бадай, і атрымаўся, мітынг, – зусім не зважаючы на Масееву нездаволенасць, усміхнуўся Зазыба. – Ай не чуў, як твае аднавяскоўцы толькі што гаварылі? Дарэмна, часам слухай. Кожны сабе наўме, але не-не дый праўду скажа.

– Ну, нам з табой на аднавяскоўцаў, бацька, пашанцавала. Сапраўды, што ні чалавек, то з’ява.

– А і не смейся, – сказаў Зазыба.

– Я не смяюся.

– Але вось пра што я думаю, – перапыніў іх Андрэй Марухін. – Поспехі на фронце зноў ускружаць галовы фашыстам. Хутка і мы тут адчуем. Яны не захочуць мець у сваім тыле ні партызан, ні ўвогуле…

– Ды ўжо ж… – згадзіўся Дзяніс Зазыба. – Але ж з другога боку калі паглядзець, дык таксама… Ці ж яны дасюль з гэтым мірыліся?

– Цяпер не пачатак вайны, Дзяніс Яўменавіч. Цяпер іншыя ўмовы. Працягваць лягчэй, чым пачынаць.

– Не скажы, Андрэй. Мера ёсць усяму і ўсяму ёсць мяжа.

Падышоў Мікіта Драніца. Сваю неразлучную ватоўку ён трымаў на левым плячы, усё роўна як намагаўся гэтым выраўняць постаць; ватоўка яго, у гарачыню,

выглядала недарэчнай, як недарэчным было і ягонае нечаканае з’яўленне; з адной кішэні ватоўкі тырчэлі складзеныя ўпоперак лістоўкі.

– Я ета, як тэй таго, – плюскаючы нахабнымі вачамі, пачаў Мікіта, але Зазыба не даў дагаварыць, спытаў, паказваючы на кішэню, з усмешкай:

– Ты гэта на раскурку столькі назбіраў ці як?

– Не, як тэй таго, – заматаў вялікай галавой Драніца, – яны непрыгодны для курыва. Ета каб газетная папера, а то дужа тлустая. Ета я, як тэй таго, Брава-Жыватоўшчыку з Раманам Сёмачкіным пакажу.

– Дзе ж яны?

– Затрымліваюцца, як тэй таго. Але перадавалі, каб мы дзялілі пакуль без іх луг.

– Давяраюць нам?

– Дак, як тэй таго, сухадолы ж дзялілі без іх. Значыць, і тута абыдземся. Невялікая страта, як тэй таго.

– Глядзі, Мікіта, – жартам, з выразнай насмешкай, сказаў Зазыба. – Будзеш адказваць, калі што.

– Ды не бойся, як тэй таго. Я ета чую, гучыць недзе. Паглядзеў у неба, а тама самалёт. Думаю, чый ета? Каб савецкі, дак не ляцеў бы адкрыта. А ета, выходзіць, нямецкі, як тэй таго. Ну і сыпануў з дзвярэй. Я нават бачыў лётчыка, як тэй таго, калі дзверы на баку адчыніліся. Але ён не толькі тут кідаў. Здаецца, і на Зінкевічавым лузе, як тэй таго, пасля сыпаў. Праляціць трохі і сыпане.

– Ці паспеў жа ты прачытаць, што ў іх?

– У-у, – махнуў рукой Драніца, – тута такое напісана, што ажно ўваччу мутна. Зноў немец папёр, як тэй таго. Цяпер наўрад ці стрымаюць яго нашы.

– Зямля наша вялікая, Мікіта, – сказаў задзірыста Зазыба, – усю не захопіш. Дзе-небудзь ды спаткнецца. Але тады ўжо назусім.

– Ты, як тэй таго, так думаеш? Ну глядзі, Зазыба, а то мая Аксюта кажа – не дай бог, як… У іх жа цяпера радасць, у немцаў.

– Ды і па табе суму не відаць.

– Дак, як тэй таго…

Дзялілі сенажаць шумна, з палёгкай і зайздрасцю адзін да аднаго – залежала гэта ад таго, каму якая выпадала паласа, ці то з асакой і кустамі, ці скрозь на прагале, з густой і пахучай травой, што была ў самай сіле, не перастаяла і не выдахнулася. З казой хадзіў Андрэй Марухін, як сапраўдны каморнік, гуляючы кавальскімі мускуламі на голых руках, з кропелькамі поту на чарнявым твары і з нейкім асаблівым запалам, які тлумачыўся хутчэй маладосцю, чым захапленнем, а можа, тым і другім разам. Зазыба ледзь паспяваў за ім са спісамі, усміхаўся з Андрэевай зварушлівасці, думаў відаць: мала цябе, хлопец, лашчыць па начах Ганна. Трэці за імі спяшаўся Іван Хахол, торкаў у зямлю надпісаныя калкі. Справа гэтая кожнаму была знаёмая, даволі накатаная ў практыцы, калі, можна сказаць так, – яшчэ з дакалгаснага мінулага, а цяпер з сухадолаў дзе Зазыба разам з Андрэем Марухіным і Іванам Хахлом таксама выконвалі ролю межавальнікаў. Астатнія верамейкаўцы адчувалі сябе вальней,

прынамсі, да таго часу, пакуль даходзіла да кожнага чарга; тады гаспадар браўся за сякеру, забіваў глыбей у зямлю межавыя калкі, ставіў побач вітку. Адсюль ужо – маё.

Зазыбам, як і належыць суседзям, паласа выпала побач з Прыбытковай.

– А можа, Дзянісавіч, – засмяялася тым часам блізка каля Масея Кузьмова нявестка, – можа, і няварта, каб паміж намі мяжа была? Пакосім разам абедзве, а тады ўжо і раскінем, як трэба. – Яна ўжо разгарэлася на сонцы, дыхала жарам і маладосцю.

Кузьма паглядзеў на яе скоса, зрабіў нездаволены твар, але змоўчаў нібыта і праўда хацеў, каб не трымацца паміж суседзямі межаў.

– Гэта трэба бацьку майго спьггаць, – раздумліва і ўсмешліва прамовіў Масей.

– Дак дзе ён цяпера, той бацька, – хоць і жартам, але стаяла на сваім Анюта. – Цяпера ён доўга будзе па лузе хадзіць. А мы спытаем у маці. Марфа Давыдаўна!

Марфа Давыдаўна пачула, што яе завуць, кінула ад вазоў:

– Што тама ў вас?

– Мы во з Масеем змаўляемся, каб не дзяліцца палосамі паміж нас.

Марфа Давыдаўна ўсміхнулася, сказала:

– Змаўляцца трэба было даўней.

– Дак я ж ета для спарнейшай работы, – сумелася ад гэтых слоў Анюта. – Гуртам, кажуць, і бацьку лягчэй пабіць.

– І я пра ета, – зусім без прыкрасці зноў усміхнулася Масеева маці.

Кузьма Прыбыткоў нарэшце крактануў з іхняй размовы, вытыркнуў з зямлі касу, выцер яе травой, якую высмаргнуў пад нагамі.

– Каб паставілі ўжо віткі і ад Бесядзі, то й пачынаць можна, – сказаў ён.

Канечне, усе на лузе пакуль чакалі, калі пачаць. Таму Марфа Давыдаўна скарыстала момант, прапанавала:

– Вы б перакусілі, мужыкі, пакуль нельга касіць. Атады адразу і наваліцеся.

– І то праўда, суседка, – усміхнуўся на гэта Кузьма, паглядаючы з-пад рукі на сонца, якое краналася ўжо на другі бок неба. – Анюта, паказвай, што брала?

Але нявестка здзіўлена зірнула на свёкра, спытала:

– Дак хіба мы не будзем чакаць Дзяніса Яўменавіча?

– Каму што, – не паслухалася яе Марфа, дастала з-пад свайго воза кошык, павязаны палагном, стала на каленкі, пачала распакоўваць.

Адставаць было нядобра, не па-суседску, і Анюта таксама ўзялася за свой кошык, але ж колькі часу яшчэ рабіла выгляд, што ёй сапраўды будзе не ставаць за абедам Дзяніса Яўменавіча, быццам не Кузьма Прыбыткоў быў у яе свёкрам, а другі чалавек, той жа Зазыба.

Між тым Марфа Давыдаўна паспела першай распакаваць кошык, таму пачала разгортваць на траве, з таго боку, дзе патроху ўжо вырастаў цень, свой абрус, вышываны па краі. Да пакосу вясковыя людзі звычайна захоўваюць усё лепшае з ежы, што ёсць у гаспадарцы; гэта не парадак, калі чалавек, які з дня ў дзень махае касой, не з’есць кавалак сала, яешню, карацей – тое, што дае сілу. На далёкіх лугах дык і ўвогуле

касцы раскашавалі – палілі гіа вечарах вогнішчы, варылі з адборнай мукі кулеш на бараніне. Сёння на абрусе тут таксама з'явілася нямала прысмакаў… Анюта паглядзела, як вымала Марфа Давыдаўна свае, акурат павінілася:

– А ў мяне сянні дак… не паспела.

– Ну во, – сказаў расчаравана на гэта Кузьма Прыбыткоў, – усю раніцу ад печы не адыходзіла, а палучыўся пшык! – Але ўбачыў нарэшце, што дадавала да сала Анюта, расплыўся ва ўсмешцы: – У-у, сцюдзень!..

А нявестка не стала чакаць другіх слоў – як павінілася дарэмна толькі што, так і пахвалілася:

– Знарок пакідала свіныя ногі. Раней, бывала, адразу на халадзец іх, а сёлета… Дак і тое сказаць – мужыкоў жа ў хаце было двое.

– Так, так, – заківаў галавой Кузьма Прыбыткоў, памаўчаў, праганяючы з твару нядаўнюю здаволеную бесклапотнасць, затым сказаў: – Ды і які я цяпера ядок, хоць і адзін, хоць і на аднаго Аксюта гатовіць. Во, бывала, раней, калі мы з прадольнай пілой па ўсім наваколлі хадзілі, дак тады етага, што выстаўлена тута нам, на аднаго, можа, толькі б хапіла. Дзела няпростае, паспрабуй, пацягай пілу – ці то зверху, ці то знізу, аднолькава цяжка. Але ж у той час адно жыццё было, цяпера іншае. І я маладзейшы тады быў, дак…

Нібыта спалоханая, што Кузьма цяпер надоўга разгаворыцца, Марфа Давыдаўна пачала дзяліць на кавалкі мучную яешню, падсоўваць кожнаму па краях абруса драўляныя лыжкі для кіслага малака, халадца. Перад тым як узяцца за лыжку, Кузьма Прыбыткоў пражагнаў сябе, пракашляўся, быццам даваў гэтым прыклад. Елі моўчкі, з сялянскай няспешлівасцю, не замінаючы адзін аднаму; бралі рукамі, клалі перад сабой: бліжэй паложыш – хутчэй дастанеш.

Кузьмова нявестка сядзела якраз насупраць Масея, і ён раз-поразу падымаў вочы на яе, спярша спадылба, пасля зусім назнарок. Дзіўна, але яна сёння неяк неспадзеўна разварушыла ў ім цікавасць да сябе, прымусіла думаць. Цяпер яна была спакойная, без ранейшай знарочыстасці і гуллівасці, рухі яе былі марудлівыя, вуглаватыя і прастадушныя, ні даць ні ўзяць сама сціпласць. За гэты час, як Анюта сядзела па той бок абруса, Масей паспеў разгледзець багата што – і зеленаватыя вочы пад высокімі дугамі броваў і акурат не сялянскі выраз твару з упадзінамі шчок, і нізкія нераскормленыя грудзі… Здараецца ж так, людзі нямала жывуць побач, а добра не ведаюць адзін аднаго. Вось і Масей. І ўвосень мінулую, і потым праз усю зіму пад вокнамі ў завулку, таксама ў хаце, калі стаў бываць, адно чуў яе голас, здавалася, завельмі крыклівы, а то іншы раз бачыў як яна ў кажушку хадзіла кудысьці на вёску. Але Масей ужо ведаў, што гэта Кузьмова нявестка, бралі яе гады за тры перад вайной з Віроўкі за меншага Кузьмовага сына, Івана, які цяпер на фронце… Так і жылі яны дасюль, бадай, не сказаўшы адзін аднаму слова, быццам за вялікім перавозам, куды няпроста дабірацца.

– Тата, – раптам сказала Анюта, – я вось што падумала. Ці не застацца і мне тута на ноч? Марфа Давыдаўна ўсё роўна пойдзе ў вёску, дак і нашу карову падоіць.

– Як сама знаеш, дзеўка, – абыякава адказаў свёкар.

Даўшы за пачастунак кабетам дзякуй, ён нарэшце пачаў закурваць. Масей таксама ўскочыў на ногі, пацягнуўся да Кузьмовага хромавага каптура, што нагадваў маленькі гармонік. Дзіўна, але рашэнне Анюты не ісці ў вёску, застацца тут, штосьці ўскалыхнула ў ім, усё роўна як ён чакаў гэтага, аднак не мог прызнацца сабе.

– Дак ці ж ты, Дзянісавіч, ета па-сур'ёзнаму думаеш курыць? – усміхнуўся Кузьма.

Масей прамаўчаў але ўсё ж узяў з Кузьмовых рук каптур, скруціў з буйнапарэзанага самасаду цыгарку і стаў чакаць, пакуль стары высякае з крэмня агонь. Марфа Давыдаўна з Анютай тым часам прыбіралі посуд, узяліся абтрэсваць абрус.

Хоць людзей на лузе і было багата, але галасоў не далятала. Нагрэтае паветра трымцела густым марывам, здавалася, што ад гэтага яно ажно звінела. За Бесяддзю таксама быў луг, праўда, нешырокі, і на ім, ля самай пясчанай гары, што засціла сабой далягляд, стаялі копы. Па правы бок ужо, лічы, на схоне гары, вытыркаліся за дрэвамі крайнія хаты Гончы.

– Якая раскоша, – сказаў раскурыўшы сваю самакрутку, Кузьма; памаўчаў тады зноў сказаў: – Многа я пахадзіў дзе, а вот такой прыгажосці, як у нас, здаецца, не бачыў. А ці чуў ты, Дзянісавіч, што некалі ў старыя часы Бесядзь бытта называлася іначай?

– Задунаем называлася. Пра гэта я чытаў. Але то сапраўды было ў далёкія часы. Тут жа, па нашых мясцінах, калісьці шлях па вадзе пралягаў з варагаў у грэкі. Плавалі людзі з поўначы на поўдзень, вазілі на лодках тавары, гандлявалі. А на ноч спыняліся на перавалоках, на сушы. Ну вось, на тых перавалоках і ўзнікалі прыстанішчы – так званыя бяседы. Мусіць, тады і пачалася новая назва ракі. Не так жа сабе ўздоўж яе цяпер многія вёскі завуцца то проста Бесядзь, то Новая Бесядзь, то яшчэ як-небудзь, але з тым жа коранем.

– Ну а чаму Задунай раптам?

– Гэтага я дакладна не ведаю. Толькі думаю, што жыў тут некалі, яшчэ да радзімічаў народ, які прыйшоў з-за Дуная. Нездарма ж у нас кожную трэцюю песню і зараз яшчэ спяваюць пра Дунай. Няйначай, смутак аб далёкай прарадзіме. Словам, гэта я так думаю, а як яно на самай справе было, не ведаю. І ў кнігах, якія трапляліся мне, не напісана. Ёсць толькі гэтае сведчанне, што рака наша сапраўды даўней называлася Задунаем.

– Эйш ты, аказваецца, чалавечая памяць не такая ўжо і доўгая. Адны кнігі могуць яе змацаваць.

– Бадай што…

Масей успомніў што перад смерцю Парфён Вяршкоў таксама вось гэтак пытаўся ў яго пра далёкае мінулае, няйначай, у старых людзей сапраўды абуджаецца нешта такое, што прымушае іх нібыта апомніцца, заглянуць у глыбокую замглёнасць стагоддзяў можа, прадчуванне блізкай магілы, якая назаўсёды абарве час і зробіць тутэйшае жыццё няпэўным, нават дарэмным, а можа, яшчэ што. Таму сённяшняя

Кузьмова цікавасць зусім не здзівіла Масея, таму ён і адгукнуўся на яе лёгка. Але помніў Масей, што з Парфёнам яны тады не дагаварылі, той хацеў яшчэ аб чымсьці спытаць яго, клікаў у сад…

У параўнанне з Парфёнам Вяршковым Кузьма Прыбыткоў вядома, не ішоў. Парфён быў можна сказаць, чалавек асаблівы, з сапраўдных вясковых мудрацоў якім, здаецца, нічога не каштуе дайсці да сэнсу такіх рэчаў і з'яў якія наогул не багата каму даюцца. У яго была свая мадэль пазнання жыцця, свой сакрэт спасціжэння, якога хапала на ўсё, на вялікае і на малое. Кузьма такім дарам не валодаў хоць у розуме яму таксама не адмовіш, але ён заўсёды знаходзіўся ва ўладзе гэтага розуму, захопленага будзённасцю, штодзённым клопатам, што не надта ўзвышае ні само жыццё, ні чалавека ў ім. Звычайная рэч, жыве сабе хтосьці, і ўсё тут, дарма што і сам прыстойны, працавіты, і дзеці ў яго нязломкі.

Пра кнігі Кузьма цяпер праўду сказаў хоць сам іх не чытаў, адно мог вывесці на паперы каракулі. Але тое, што ён пачаў гаварыць далей, бянтэжыла Масея, здалося яму нечаканым. А ён узяў ды спытаў раптам:

– Ці ж давялося табе, Дзянісавіч, калі бачыць, дзе пачынаецца ета Бесядзь наша, дзе канчаецца?

– Толькі на карце.

– І мне таксама не давялося. І ў Гомелі быў, і за Гомелем, а то і там, дзе яна ўпадае ў Сож, а там, адкуль выцякае, не быў. А між тым чалавек адзін мне расказваў, што бачыў – з-пад куста. Ета – Чубар. Хоць што я гавару, можа, ты яго нават не ведаеш, калі ён не пабыў яшчэ ў вас. Дак еты Чубар заступіў некалі ў нас у калгасе на бацькаву пасаду старшыні. Твайго бацькі. Зараз еты Чубар у партызанах. Прыйшоў аднойчы зімой да нас, Ангота якраз выгнала самагон. Ну, мы й пасядзелі за чаркай. Гаварылі, здаецца, пра ўсё-пра тое найперш, што было, а то найбольш, што будзе. Дак Чубар нечага раптам сказаў мне: «А знаеш, кажа, быў мінулай зімнаю восенню на вытоках Бесядзі. Маленькая яна тама й квяленькая, у чалавечую руку велічынёй, але ж таксама бруіць, выходзіць, што здалёку сюды ета вада цячэ. Наваг пада льдом. І ведаеш, кажа ён, што я падумаў: ета як цяперашняя нямецкая акупацыя, здаецца, што ўсё накрыла, усё скавала, а ў нас жыццё б'ецца і змаганне шырыцца». Спярша я не зразумеў, што б ета значыла. Пасля стаў думаць. А й праўда. Нечага мне не хапае ў жыцці, можа, апошняга: на свае вочы пабачыць той куст, з якога бруіць наша рака. Дзіўна, канешне, але што зробіш? Дзівацтва наогул уласціва чалавеку, асабліва калі ў старым узросце. Маладыя етага, здаецца, не разумеюць. Але для мяне той выток цяпера – як святая крыніца. Здаецца, дастаў бы з-за печы свой цапок ды й патупаў усцяж усяе Бесядзі, нават не так важна, ці вярнуўся б пасля. Праўда, цікава, Дзянісавіч?

– Так, дзядзька Кузьма, – даўно ўсміхаючыся, сказаў Масей. – Але тады і мяне бярыце з сабой.

– У такую дарогу натоўпам не ходзяць.

Пачуўшы гэта, Масей раптам з прыкрасцю падумаў: як гэта яго не хапіла на такую простую рэч, каб сказаць штосьці іншае, адпаведнае Кузьмоваму адчуванню,

бо такім людзям, як іхні сусед, зусім не ўласціва прытворная ўзнёсласць. І яшчэ адно здзівіла Масея ў гаворцы са старым. Гэта – прасветленасць, што адчувалася ў словах. Яны і раней нярэдка размаўлялі вось так, адкрываючыся адзін аднаму ў шчырасці, але тады, бадай, не было гэтай прасветленасці ні ў Кузьмовым голасе, ні ў ягоных словах.

Між тым Прыбыткоў памаўчаў, азіраючыся па баках, тады сказаў:

– Дні доўгія цяпера. Калі ета раніца была, здаецца, даўным-даўно.

Анюта, якая вымыла пад кустом посуд пасля абеду, спынілася каля мужчын і раптам спытала:

– А калі ета быў сёлета Мяфодзій?

– На тым тыдні, – сказаў свёкар, – а заўтра – Купалле.

– Дак, можа, і касіць нельга? – занепакоена паглядзела на яго Анюта. – Свята ж?

– Ета такое свята… яшчэ ад старых багоў. Так што… Усё роўна вялікі пакос настаў. Значыць, людзі будуць касіць і заўтра. Даўней заўсёды касілі, будуць і цяпера.

Нарэшце, з таго боку, дзе паміж алешын і навіслых ракіт рабіла частыя павароты Бесядзь, паказаліся вялікім натоўпам верамейкаўскія мужыкі. Рухаліся яны хутка, мала затрымліваючыся на адным месцы, – торкал і на новых межах калкі і крочылі далей. Але мералі палосы з таго боку яшчэ недзе на сярэдзіне ўяўнай вёскі. Тым не менш Кузьма Прыбыткоў пачаў распараджацца:

– Ты, Дзянісавіч, падавайся туды, бліжэй да капцоў, а як вызначаць нашы палосы, стаўляй віткі. Да каб прыкметныя, каб відаць адусюль было. Тады і пройдземся ад віткі да віткі. Ты – адтуль, я – адсюль. Да глядзі пільна, каб не збочыць, а то… Тута трэба рабіць усё, як па струнцы. Ета Анюта хоча паскідаць усё ў адно, у кучу, а мы во з Марфай, дак…

– Ну, ты на Марфу, сусед, не ківай, – з усмешкай сказала Марфа Давыдаўна, – ты сам, няйначай, засумаваў за етыя гады па межах?

– Не дужа каб, – смыкнуўшы шчакой, махнуў рукой Прыбыткоў. – Ета каб сілы хапала, а так… На ўсё свой час.

Масей узяў з Кузьмовых калёс тры доўгія бярозавыя дубцы, паслухмяна рушыў да Бесядзі. З ім была памкнулася ісці таксама Анюта, але свёкар гукнуў яе раўнівым голасам назад.

Здавалася, ці многа мінула часу, як яны надумаліся абедаць, а потым размаўлялі, аднак у прыродзе адбыліся змены, і гэта Масей адчуў хутка – знікла з паветра, адляцеўшы кудысьці, марыва, больш яно не асмужвала, не мітусілася ў вачах, і таму вакол нібыта пасвятлела, нават дрэвы, што раслі на гары за Бесяддзю, стаялі там цяпер як аточаныя з усіх бакоў. Затое раптам запахлі нясцерпна краскі ў траве; чым далей смурыжыў іх нагамі Масей, цаляючы напрасткі, тым мацней ішоў ад іх гарачы дух, ажно кружыў галаву.

Усё роўна як наперад выгадваючы, Масей падышоў да Бесядзі якраз у той момант, калі вясковыя каморнікі пачалі забіваць калкі на іх паласе; бацька, узмакрэлы ўвесь, усміхнуўся яму – маўляў, вось табе, сынку, надзел, цяпер толькі працуй; але Масей яшчэ зрабіў некалькі крокаў следам за вяскоўцамі, нібыта дзеля прыліку, тады вярнуўся, пачаў торкаць у зямлю дубцы, накручваючы на канцы пасмы з травы. Апошні дубец ён паставіў з боку Кузьмовай паласы, нацэліўся вачамі на ўзлесак, дзе

засталіся вазы, і патупаў туды, увесь час дробна і насцярожана ступаючы. Кузьма таксама рушыў з таго канца лугу насустрач, але гэта замінала Масею, стары засціў сабою і так ледзь бачную адсюль вітку. Нарэшце яны сышліся абодва недзе на сярэдзіне, засмяяліся, што гэтак прыдатна выйшлі адзін аднаму насустрач. Зноў разышліся і цяпер ужо з сярэдзіны пачалі пратоптваць след у абодва канцы. Паколькі Масей павярнуў да Бесядзі, то менавіта яму давялося пракладваць і апошнюю бакавую мяжу.

Кузьма Прыбыткоў пачаў касіць ад лесу – зашоргаў літоўкай, акуратна і роўна кладучы на левы бок ад сябе густую, як мядзведжая скура, траву.

Перад тым як пачаць свой рад па паласе, Масей узяў на Кузьмовым пракосе ўжменю травы, выцер нагрэтае на сонцы палатно касы; лязо ён не стаў цяпер вастрыць, толькі адвязаў ад пупка мянташку, сунуў у кішэню. «З богам!» – зусім весела сказаў ён сабе і моцна націснуў правым плячом на кассё. Каса маланкава ўжыкнула справа налева, і ўжо праз момант Масей зразумеў, што трава сапраўды тут не перастаяла, значыць, высільвацца моцна не давядзецца, хопіць адно ўтрымліваць на руках касу.

– Ужык-ужык, ужык-ужык…

Дасюль Масей лёгка адрозніваў вакол сябе староннія гукі, нават ціхія, цяпер наадварот – чуў адно гэтае «ўжык-ужык». І чым далей адыходзіў ад свайго табара, тым больш адмяжоўваўся ад усяго ранейшага, нібыта ўпадаў у забыццё. Неўзабаве ён апярэдзіў Кузьму Прыбыткова, і калі першы раз спыніўся памянташыць касу, той быў ужо далёка ззаду.

– Ужык-ужык, ужык-ужык…

Кашуля на спіне ў Масея паступова макрэла.

– Ужык-ужык, ужык-ужык…

Але стомы ён зусім не адчуваў усё роўна як работа і праўда рабілася сама па сабе, не каштавала аніякага намагання.

Недзе на сярэдзіне паласы Масея дагнала Марфа Давыдаўна. Яна падышла да яго з граблямі ў руках, акурат збіраючыся раскідваць скошаную траву, хоць ддя гэтага яшчэ не настаў час, сказала:

– Ты б, сын, не ўлягаў так. Навошта спяшацца? Паспеем скасіць. Ды й бацька скора сваю работу скончыць. Тады разам і будзеце касіць. Ато ж…

Масей спыніўся, ласкава глянуў на маці. Пасля павёў вачамі па лузе. Ужо скрозь на палосах шчыравалі касцы – то дзяды, як Кузьма Прыбыткоў, то падлеткі, накшталт Івана Гаманькова, то кабеты, якіх на луг найбольш набілася. Але ўсе касілі, быццам змоўленыя, з аднаго канца, пачаўшы з узлесся. Стоячы на пракосе, Марфа Давыдаўна, няйначай, усё яшчэ чакала, што скажа сын. Аднак Масей зноў ласкава ўсміхнуўся ў адказ, выцер і патачыў мянташкай касу, моўчкі занёс яе з правага боку, стараючыся не прапусціць перад сабой на зямлі ні травінкі, ні муравінкі.

– Ужык-ужык, ужык-ужык…

Так ён і касіў, захоплены ўвесь работай, лічы, да самага сутоння, пакуль каля Бесядзі не падышоў да яго бацька. Дзяніс Яўменавіч спыніўся стомлены, паглядзеў

прыжмуранымі вачамі на пракосы, што ляжалі з канца ў канец роўнымі шнурамі на паласе, ухвальна кіўнуў сыну.

– А я цалюткі дзень паклаў, бадай, на нішто, – сказаў, акурат адчуваючы віну за сабой. – За столькі гадоў людзі адвыклі ад палос, а тут зноў.

– І без абеду, – хутчэй сцвердзіў, чым запытаў Масей.

– Дыўжо ж…

– Ну а мы паелі тым часам.

– І добра зрабілі. Але хадзем да вазоў трэба матку дамоў адпусціць, калі яна яшчэ не пайшла. Гаспадарка ж…

– Ды не, чакае цябе, каб накарміць.

– Дарэмна. Хадзем, усё роўна пракос ужо скончыў.

Ступаючы побач з сынам па галым, акурат выскубленым лузе, Дзяніс Яўменавіч, няйначай, за працягам сваіх слоў успомніў, як доўга зарасталі тут пры калгасе пасля аднаасобнага жыцця межы. Але ён не стаў болей гаварыць Масею пра гэта. Пачаў пра нямецкія лістоўкі, пра тое, што ў іх напісана.

– Значыць, цяпер гэта да наступнай зімы, – прамовіў ён, як сцвердзіў.

– Гэта пра што ты? – павярнуўся да бацькі Масей. Але Зазыба проста не адказаў. Працягваў разважаць, быццам сам з сабой:

– Я тыя землі ведаю, мы тыя стэпы ў грамадзянскую ўздоўж і ўпоперак прайшлі і праскакалі. Ды і не адзін раз. Там абы скрануўся з месца, абы падаўся назад, нічым не спыніш, не стрымаеш. Да самай Волгі, да самага Каспія роўная дарога.

Масей нарэшце зразумеў, што трывожыла гэты раз бацьку, падтрымаў размову.

– Мяркуючы па лістоўках, – сказаў ён, – сапраўды можна падумаць, што немцы памкнулі цяпер на Волгу і на Каўказ. Якраз твой Каспій.

Дзяніс Яўменавіч уздыхнуў.

– А раптам яны сапраўды праз нас прарываюцца ў Індыю? Пісалі ж газеты!

– Якія?

– Ну, цяперашнія. Іхнія.

– Але ж ты летась не верыў у гэта?

– Дык… Вера – яна таксама…

– Вера, бацька, заўсёды застаецца верай. Але я разумею, чаму ты раптам сказаў пра Індыю. Так, немцы на пачатку вайны сапраўды гаварылі і пісалі, маўляў, вызвалім вас ад балынавіцка-жыдоўскага прыгнёту, а тады далей пойдзем. У Індыю. А гаворыш ты цяпер пра гэта, бо спрабуеш суцешыць сябе хоць чымсьці.

– Ну, я не сказаў бы зусім так.

Масей акурат не пачуў бацькі, працягваў гаварыць далей:

– Старыя байкі заўсёды здаюцца людзям паратункам. Летась шмат аб чым гаварылі – і немцы, і мы ўсе, бо летась усё было проста: Гітлер усёй сваёй сілай пёр на Маскву. Нават выгляд не надта рабіў, што менавіта ў Беларусі ды ў Падмаскоўі шукае дарогі ў Індыю. Дык вось, каб ведаў, бацька, ён і цяпер не ў Індыю праторвае дарогу, дарма што накіраваў войскі на паўднёвы ўсход. Яму патрэбна каўказская нафта, якую дасюль атрымлівала Масква, і Волга, па якой каўказская нафта дастаўлялася ў Маскву. Значыць, ім патрэбна ўсё тая ж Масква. Значыць, яны не адмовіліся захапіць яе. Але

пачакаем, як будуць разгортвацца падзеі далей. Зразумела адно – немцы не хлусяць, хутчэй за ўсё, што іх танкавыя арміі сапраўды выйшлі на поўдні на аператыўны прастор. Ну а што да наступнай зімы, то таксама ці варта шукаць менавіта ў ёй суцяшэнне. Не думаю, што ты да канца паверыў, што мінулая зіма прымусіла Гітлера адступіць ад Масквы.

– Ды што ты мяне ў маёй веры ўмацоўваеш?..

– Пачакай, бацька. Дай дагаварыць. Урэшце, сам пачынаў размову. Я вось касіў, і мне было добра. Я чалавекам сябе адчуваў, пакуль улягаў тут касой. Ведаеш, чалавекам. Але дазволь мне быць чалавекам і ў поглядах, якія ты захацеў, няйначай, пачуць па дарозе сюды. Дык вось. Вядома, умовы, у якіх адбываюцца ваенныя дзеянні, заўсёды ўплывалі на іх. Некалі Батый з-за бездарожжа адступіўся ад Ноўгарада. Напалеону зіма таксама не спрыяла ў яго паходзе ў Расію.

– Дык я пра гэта і кажу. Можа, ты і праўду гаворыш, што суцяшаю сябе. Алеж…

– Трэба думаць, што Гітлер хоча ўсё вырашыць яшчэ да надыходу зімы.

– Ты ў гэта верыш?

– Я так думаю. А гэта не адно і тое ж. Калі верыць, то ў нечым і падзяляць. А я гэтага рабіць не маю права ды і не магу, бо справа ідзе не толькі пра канкрэтную ўладу, але і пра зямлю, якая мне таксама дарагая. Заваёўнікі, якія б яны ні былі і ў які б час ні прыходзілі, ніколі не разумелі чужога народа, як і гэты народ са свайго боку не разумеў іх. Новая палітыка ў такой справе таксама мала чаго дае. Народ перш за ўсё думае не пра палітыку, якую прапаноўваюць яму, а пра саміх заваёўнікаў пра тое, што яны ўварваліся ў яго межы і топчуць яго зямлю, нішчаць яго маёмасць, забіваюць яго суайчыннікаў, сярод якіх кожны чацвёрты – яго брат, яго сват, а то проста родзіч ці даўні знаёмы. У такіх выпадках народ заўсёды патрыёт, ён на нейкі час нават здольны забыць жахі, у якіх жыў дасюль. Гісторыя таму сведка. Цяпер, здаецца, ён таксама ў большасці сваёй забыў, чаго нацярпеўся ад савецкай улады. Але тут свае разлікі.

– Хіба што свае, таму паміж народам і ўладай не трэба станавіцца, сын, – яўна здаволены застаўся Дзяніс Яўменавіч. – Ты вось складна і добра гаворыш сянні, бо ведаеш многа, а чаму ніколі з мужыкамі нашымі так не пагаворыш? Усё ваюеш са мной?

– Наша вайна з табой нікога не забівае, яна нішто ў параўнанні з той, што шугае цяпер у свеце.

– Гэта праўда.

– Ну а чаму з мужыкамі не гавару, дык тут… як табе сказаць? Мужыкі нашы таксама не без розуму ў галаве, ведаюць, што да чаго. Думаеш, яны так сабе не накінуліся сёння на гэтыя лістоўкі? Думаеш, непісьменныя? Сам жа бачыў, што толькі Мікіта Драніца напакаваў лістоўкамі свае кішэні. Астатнія – ані блізка. Таму і валяюцца лістоўкі яшчэ і цяпер на лузе. Добра, калі хто неўпрыкмет перакінуў з свае паласы на чужую.

– Ну а ты? Дзе твае? Табе ж, няйначай, таксама траплялiся пад ногі?

Масей засмяяўся:

– Той, хто скідваў іх, мусіць, ведаў куды цэліць. Ведаў, што на тваёй паласе будуць марна ляжаць. Таму, здаецца, усяго адна і трапілася. Так што…

Дзяніс Яўменавіч таксама засмяяўся, ажно ляпнуў ад здавальнення па спіне сына.

Усё роўна як усцешаныя, яны нарэшце падышлі да вазоў. Кузьма Прыбыткоў сядзеў на аглоблі, курыў. Ён так і не здолеў прайсці да канца дарогі пракос. Марфа Давыдаўна з Анютай стаялі побач, аб нечым ціха размаўлялі.

Дзяніс Яўменавіч папракнуў жанчын:

– Чаму не пайшлі ў вёску? Навошта чакаеце да самага вечара?

– Дак хацелі ж пакарміць цябе, – акурат за дзвюх – за сябе і за Анюту – сказала Марфа.

Але Анюта таксама не ўтрымалася, пачала тлумачыць:

– Марухін казаў, што пойдуць з Масеем рыбу лавіць. Юшку варыць будзем.

– Якая вам юшка? Якая ўжо рыба? Зараз цёмна стане. А калі закарцела юшкі пакаштаваць, то няхай заўтра сабе ловяць, на світанку.

– Ці ж рыба ляжаць будзе да вечара? – паглядзела не як жаласна на Зазыбу Анюта.

– Нікуды не дзенецца, – адказаў той. – Толькі трэба будзе пакласці ў крапіву ды ў цень, пад кусты. Будзе ляжаць, як свежая. Ды з душком таксама не пашкодзіць. Душок – ён у галаве. Нездарма ж кажуць, што рыба тухне з галавы. А галаву можна выкінуць. Невялікая страта.

– А мне ў галаве толькі й смаку, – засмяяўся Кузьма Прыбыткоў. – Але Яўменавіч праўду кажа, ішлі б вы ўжо, бабы, дамоў. Каровы тама недзе пачынаюць мычэць.

– Дак во дачакаюся Ганну Карпілаву, разам пойдзем, – сказала Марфа Давыдаўна.

– А што Анюта? – паглядзеў на Кузьмову нявестку Зазыба.

– Дак яна хоча застацца з вамі. Даручае гаспадарку мне, – сказала Марфа Давыдаўна.

– І што яна цікавае тута знайшла раптам? – паціснуў плячамі Кузьма Прыбыткоў.

– А можа, й знайшла, – сказала насуперак Марфа Давыдаўна. – Заўтра ж Купалле, дак ці не сёння ж у ноч маладыя шчасця шукаюць, папараць-кветку…

– Дзе ўжо яно, тое маё шчасце? – усё роўна як з адчаю махнула рукой Анюта. – Дачакацца б мужа з вайны.

Гэтыя словы раптам збянтэжылі ўсіх, акурат кожнаму зрабілася няёмка, што пачалі чаўпці нешта такое, што ўсім абыходзіла і што датычыла адной Анюты.

Марфа Давыдаўна, можа, першая адчула недарэчнасць, схамянулася і сказала:

– Дак ты, Дзяніс, абедай сам тута. Ды ўжо й павячэрайце разам. Масей з Кузьмой, мусіць, таксама ўходаліся з косамі, сядайце ўсе. Анюта вам пакажа, што засталося ад абеду. Я падамся к Ганне. Адтуль і пойдзем у Верамейкі.

– Даўно б так, – падахвоціў яе Зазыба.

Анюта тут жа кінулася распакоўваць кошыкі, нібыта баялася, што яе таксама пашлюць у вёску.

Дзяніс Яўменавіч тым часам пахадзіў вакол свайго воза, акурат шукаючы чагосьці, тады сеў на аглоблю, але не на тую, дзе сутуліўся Кузьма Прыбыткоў, на другую. Масей застаўся стаяць, дарма што гулі ад напружання ногі.

Хтосьці на краі лугу, па правы бок, запаліў вогнішча, і дым ад яго, як туман, паплыў па пракосах ніжэй да Бесядзі, распадаючыся паступова на лёгкія шматкі, як бывае з аблокамі ў пагодлівы дзень.

Сёй-той з верамейкаўцаў яшчэ касіў, дабіваў пачаты пракос, якога хапала на цэлую вярсту; было чуваць, як правілі мянташкамі косы.

Хоць вакол ужо і ўзялося сутонне, але сонца толькі цяпер схавалася за гару, што ўзвышалася па той бок Бесядзі. Заходзіла яно сёння паволі, з нейкай нянавісцю залівала супакоеным святлом зямлю пад сабой. Цяпер небакрай, моцна чырванеючы, палаў увесь.

Анюта праўду казала: Масей таксама чуў, як Андрэй Марухін хваліўся ўчора, што сёння будзе рыбу лавіць на Бесядзі, каб зварыць на вогнішчы юшку, але Сілка Хрупчык, які меўся прывезці на луг браднік, падвёў каваля, не захапіў на свае калёсы рыбацкую снасць. Шкада было Ганчыных хлопчыкаў, пры якіх адбывалася тады размова і якія ўвесь дзень, пакуль дзялілі палосы, чакалі рыбалкі. Андрэй дужа перажываў гэта. Таму неўзабаве, як толькі Ганна выбралася разам з Марфай Давыдаўнай у Верамейкі, заспяшаўся да Зазыбава табара. Прывёў ён з сабой і Ганчыных хлопчыкаў.

– Дык адмяняецца рыбалка, – сказаў ён з расчараваннем, але чамусьці ўсё роўна як для аднаго Масея.

– Ты лепей пра паласу сваю падбай вунь, – буркнуў на гэта Кузьма Прыбыткоў. – Рыба ў вадзе пачакае, а вось трава…

– Ён жа дзеля людзей стараўся, – заступілася за Андрэя Анюта.

– І праўда, дзядзька Кузьма, у чым мая віна? – пацікнуў плячамі Марухін.

– Ды нічыя, – казаў далей Прыбыткоў. – Але ж вось і паласа засталася нечапаная, і дзеці дарэмна рыбу чакалі.

Але расчараванне на дзіцячых тварах ніхто не бачыў, можа, хутчэй таму, што ў іхнім напаўсіроцкім жыцці такіх няспраўджаных спакусаў было шмат і яны ўжо мала верылі, што ўвогуле здараюцца ў свеце цуды. Тым не менш за Андрэевы рукі Петрык з Васільком трымаліся, як за бацькавы, здавалася, ім хапала і гэтага.

– Кабеты нашы пайшлі ўжо? – патрывожыў Андрэя Дзяніс Яўменавіч.

– Ага, пайшлі.

– То сядай з намі, вячэраць будзем.

– Ды я паспеў ухапіць ужо.

– Але вам і чарка сянні належыць, – пераводзячы позірк з Зазыбы на Марухіна, усміхнуўся Кузьма Прыбыткоў.

– Значыць, няма, калі ніхто не кліча, – жартаўліва, зусім без шкадавання падхапіў Кузьмовы словы Дзяніс Яўменавіч. – А ты, Андрэй, і праўда не саромся, сядай за вячэру ды і хлопцаў сваіх побач усаджвай.

Марухін памуляўся, але сказаў з ахвотаю, пазіраючы на Ганчыных хлопчыкаў:

– Тады б і нашы прысмакі сюды, га?

– Калі ўжо хадзіць!.. – буркнуў Кузьма Прыбыткоў. Але Ганчыны дзеці раптам заўпарціліся, не захацелі чужога, і ўсе ўгаворы дарослых сунуць ім хоць штосьці ў рукі

засталіся дарэмныя. Андрэй Марухін засмяяўся з іхняй упартасці, пагладзіў кожнага па галоўцы.

– Бачыце, – як у захапленні, сказаў Марухін, – мы – гордыя.

Даўшы вяскоўцам дабранач, каваль павёў хлопчыкаў на сваю паласу, пачаў ладзіць там на ноч буданок.

Прыбытковы з Зазыбамі доўга маўчалі, пакуль Анюта не парушыла цішыню.

– Ета не гонар, ета сіроцкая непрыкаянасць, – сказала яна, уздыхаючы, – дарма што прымак во стараецца. – Анюта не сядала вячэраць з мужчынамі, акурат баючыся абдзяліць каго, затое ўвіхалася каля вазоў, то хутка вярталася да касцоў. Масею гэты раз таксама не дужа хацелася есці, бадай, з абеду яшчэ быў сыты, да таго ж адбівала смак лёгкая ламата, што паступова бралася ў целе. Але Масей яшчэ з сухадолаў ведаў – даволі будзе неўзабаве прылегчы, сцішыцца ды заснуць, як стомленасці, у тым ліку і ламаты гэтай, не стане.

Пасля вячэры і яны пачалі ладзіць начлег. Старэйшым – Кузьме і Дзянісу Яўменавічу – выпала легчы на калёсах; Анюце мужыкі скідалі на скорую руку штосьці падобнае на шалаш; ну а Масей мусіў абначыцца пад возам.

Ужо іншыя ляжалі на сваіх месцах, а Масей усё насіў з пакосаў траву, пасля накрыў яе коўдрай, якую бралі з дому, і лёг у ботах і ватоўцы. Цела яго адразу нібыта здранцвела, зрабілася нячуткім ні зверху, ні сыспаду; адчулася хораша, утульна, быццам сапраўды гэтага не хапала сёння; яму падумалася ўжо, што праз хвіліну-другую засне. Але дарэмна. Пасля нядоўгай сцішанасці, паўсоннага замарачэння ў галаве раптам пасвятлела, вярнулася ранейшая яснасць, заснавалі думкі.

Ноч выдалася цёмная і цёплая. Такія ночы нярэдкія на пачатку ліпеня, яны хутка прыходзяць і гэтак жа скора адыходзяць.

Дыхалася пад калёсамі лёгка; ды й не дзіва: скрозь ляжала прывялая трава, чаруючы рознымі пахамі. Але ўсё гэта здавалася звыклым, будзённым і зусім не перашкаджала роўна і спакойна дыхаць, злашча, што неўзабаве аднекуль ад ракі прабілася свежасць, спярша нясмелая і нетаропкая, таму ледзь чутная, затым больш адчувальная, нібыта недзе нараджаўся вецер.

У лазовых кустах, туды, пад самую Бесядзь, абудзіўся напалоханы верамейкаўцамі драч – каралевіч лугоў. Голас яго хоць і не адразу стаў смелы, аднак увачавідкі мацнеў, рабіўся прарэзлівы і скрыпучы, акурат птушка помсціла людзям уначы за сваю нядаўнюю змушаную стоенасць.

Здаецца, першы раз за лета Масей адчуў сябе такім здаволеным. Найбольш ён зразумеў гэта цяпер, апынуўшыся ў адзіноце пад бацькавым возам. Дзіўна, але ранейшая адзінота не прыносіла падобнага адчування, увесь час яму чагосьці не хапала, у душы часцей былі прыкрасць ды гарката, чым радасць. Адкуль яны браліся, Масей ведаў, бо жыў тут, у Верамейках, пакуль не сваім жыццём, займаўся не сваёй справай. Ён быў перакананы, што ягонае сапраўднае жыццё абарвалася недзе там, у Мінску, калі першы раз зачыніліся за ім дзверы турмы…

Як суцяшэнне яму прыходзіла іншы раз на памяць даўно пачутае: жыццё – гэта ўспамін. Аднак раней ён не разумеў гэтага. І толькі цяпер даў сабе рады – жыць сапраўды можна ўспамінамі, дарма што ад іх таксама не заўсёды прыходзіць радасць.

Горай было ад усведамлення, што такое жыццё нічога не зычыла ў будучым, нібыта чалавек, углядаючыся ў яго, рухаўся наперад спіной, за якой зеўрала пустата…

Можна было параўнаць сябе з гэтым драчом, што не пераставаў будзіць на лузе летнюю ноч; можна было суаднесці сваё жыццё з нейчым іншым, чужым, але такім жа неўладкаваным і жорсткім, як і ягонае; можна было, нарэшце, суцешыць сябе тым, што цяпер жыццё наогул для ўсіх стала нялёгкае, нават жахлівае, бо іначай як назваць гэтую вайну, а да таго ж таксама было не меней яжоўскіх ды сталінскіх жахаў… Але нельга было адмаўляць, што сённяшні дзень прынёс нечаканую задаволенасць, усё роўна як радасць, якая ўвайшла ў яго і звонам кос, і пахамі лугу, і бляскам вачэй Анюты Прыбытковай…

Накрычаўшыся, нарэшце заціх драч.

Масей паляжаў яшчэ колькі часу са сваімі думкамі, таксама пачаў засынаць. Ён нават добра адчуваў гэта.

Хвілін праз дзесяць убачыў сон. Сніўся сельскагаспадарчы лагер у Сібіры за Марыінскам, прафесар Дзягель. Бадай, гэта быў першы такі сон з часу зняволення, а пасля і вызвалення. Але прафесар чамусьці прысніўся мёртвы, быццам Масей не ведаў яго жывога, акурат не ехаў з ім болей як дваццаць сутак у таварным цягніку з Магілёва. Прафесар Дзягель у Масеевым сне, як і ў сапраўднасці, сядзеў з адкрытымі вачамі каля сцяны прамерзлай зямлянкі, а на твары яго, як і тады, астывала ўсмешка – ніхто не падумаў бы, што чалавек ужо мёртвы… Памёр Дзягель, відаць, пад раніцу, але не на сваіх нарах; сканаў чамусьці каля сцяны, дзе ў невялікім бярвенчатым прамежку стаяла бочка з капустай, якую зняволеныя атрымалі ўвечары на ўсю грамаду, на зямлянку, але, паколькі капуста была мёрзлая, чакалі, пакуль адтае. Хто ведае, можа, прафесар, прачнуўшыся, хадзіў глядзець натую бочку і яго там заспела смерць… Убачыўшы ўранні яго і не пазнаўшы, што мёртвы, Масей нават нейкае смешнае слова кінуў, здаецца, пра чаргу, якую нібыта заняў прафесар… Але тут жа схамянуўся, падышоў і пакратаў за плячо…

Масееў сон цяпер нечакана быў перапынены – Масей раптам адчуў, што нехта пацягнуў за руку. Расплюшчыўшы вочы, убачыў над сабой чалавечую постаць. Хутчэй за ўсё, што ён адчуў яе і толькі тады расплюшчыў вочы, пазнаў Анюту. Нагнуўшыся над Масеем, яна трымала пры губах палец левай рукі, а правай цягнула Масея ўстаць.

– Хадзем, Дзянісавіч, шчасця шукаць, – ціха шаптала Анюта, – сянні ноч купальская, дак усе мусяць шукаць шчасця…

Масей адразу паддаўся ёй, акурат сапраўды чакаў, што Анюта павінна была прыйсці ды пазваць.

V

Не паспела назаўтра выбіцца з-за лесу сонца, а верамейкаўцы, што былі на пакосе і заставаліся начаваць на лузе, ужо як і не спалі.

– Лясь-лясь, тук-тук, – чулася то ў адным баку лугу, то ў другім.

На траве пад лесам, куды не сягалі яшчэ сонечныя промні, цёмным серабром ляжала раса, але ў адрозненне ад мінулых ліпеньскіх світанкаў чамусьці не дужа багатая, нібыта схапілася толькі цяпер вось, на самым золку, таму не здолела набрацца ні моцы, ні вагі ці, як бы сказаў Кузьма Прыбыткоў – не паспела вырасці. Але тым не менш была яна такая ж халодная, як і ўчарашнюю ноч, дарма што сапраўды слабейшая. Ляжала скрозь нечапаная, бо ніхто яшчэ не ступаў нагою на луг, і блішчэла пакуль толькі тым краем, дзе стаялі за Бесяддзю копы. Па той бок ракі пакошаны луг ужо цалкам знаходзіўся ва ўладзе сонца.

Кладучыся спаць учора, ні Кузьма Прыбыткоў, ні Дзяніс Зазыба не падумалі пра коней, і тыя пасвіліся недзе ўсю ноч адны. Цяпер Кузьма Прыбыткоў спахапіўся, кінуўся шукаць, але слядоў не было блізка. Гэта ўстрывожыла старога. Ледва не бядуючы, ён вярнуўся да свайго табара, нейкі час дакараў і сябе, і Зазыбу, называючы абодвух недарэкамі і пеньцюхамі. Зазыба не пярэчыў старому, але тут жа пабудзіў Масея:

– Коні, здаецца, прапалі!..

Хоць Масею сёння і не да коней было, аднак ён адразу прахапіўся, выпаўз з-пад калёс, быццам уся віна на ім ляжала.

– Як гэта прапалі? – спытаў ён, ціскаючы пальцамі цяжкія павекі.

– А так і прапалі, што ніхто ўчора не паклапаціўся, – сказаў Кузьма Прыбыткоў, – бо гаспадары нікчэмныя. Пусцілі жывёлін на волю, а назад вярнуць забылі. Цяпера во шукай, дзе яны?

– Трэба шукаць, – пацёр кончык свайго носа Зазыба. – Ты, сын, збегай на Цімохаву пожню, помніш, дзе гэта? А мы тут пабегаем.

Масей нарэшце ачомаўся, пачаў атрэпваць з адзення наліплую траву. Пасля таго, што здарылася ўначы, яму гэты пярэпалах быў, вядома, дарэчы, адпала неабходнасць паддобрывацца перад усімі, губляцца ў здагадках, ці засталася тайнай іхняя з Анютай адлучка з табара. Анюты не было відаць, мусіць, яна яшчэ спала. Гэтая акалічнасць таксама нібыта суцешыла Масея, і ён памкнуўся ўзяць з Кузьмовай рукі аброці. Але той не аддаў, тузануў да сябе, сказаўшы ўсё роўна як у злосці.

– Дзе табе аднаму? Давядзецца ісці мне таксама. Але чаму ты, Дзяніс, лічыш, што яны на Цімохавай пожні? – утаропіўся ён на Зазыбу. – Думаеш, тама трава лепей?

– Ну, лепей не лепей, – сказаў Зазыба, – а сенажаць самая блізкая там, хоць варта, канешне, пахадзіць і па ўзлеску. Магчыма, яны недзе блізка тут абначыліся, дарма што ты слядоў не знайшоў. Можа, стаяць сабе і не шманаюць.

– Добра, Масей, – згадзіўся Кузьма, – ты прабяжыся па ўзлеску, а я тым часам на пожню. Не можа быць, каб яны далёка зайшлі. Але ж таксама злыдні – што б на лузе пасвіцца, дак…

Ні на ваўкоў, ні на людзей, якія паквапіліся б на коней, здаецца, ніхто нават не падумаў, хоць здарыцца магло аднолькава і тое, і другое.

Масей кінуўся наўпрост да лесу, адразу абрасіўся ў густой халоднай траве; мокрыя штаніны прыліплі да ног, выклікаючы дрыжыкі ў целе. Аднак цягнулася гэтак нядоўга. Дастаткова было Масею вышыбаваць на ўзлесак, ступіць з дзесятак крокаў па мяккім, спружыністым імху, як макрэча адразу перастала даймаць: у лесе, пад шатамі дрэў, на якіх завісала раса, аказваецца, было зусім суха.

З другога боку паўз лес кіраваўся насустрач у шэрым армяку Сілка Хрупчык. Яшчэ здалёку Масей заўважыў, што Сілка ўсміхаецца яму, быццам ад радасці, што Масей таксама ўжо на нагах.

– Нябось, коні шукаеш? – беручы сябе за сухую руку, спытаў Сілка.

– Ды вось, за ноч сышлі некуды, – прызнаўся Масей.

– Дак вы павінны мне, – не пераставаў усміхацца Сілка. – Сянні будзеце частаваць ці калі? Ета ж я пасвіў усю ноч іх – і вашага, і Кузьмовага, і свайго.

– Дзе яны? – няверліва страпянуўся Масей.

– Дак вунь, супроць маёй паласы. Стаяць сабе, ані хны.

– Ну вось, а Кузьма на Цімохаву пожню падаўся. Трэба неяк вярнуць старога.

– Нічога з ім не стане, – ужо зарагатаў Сілка, – няхай звалочыцца. Другі раз будзе пільнаваць. А я, прызнацца, думаў, што вы ведаеце, дзе вашы коні, раз не шукалі звечара. Выходзіць, не. Дак і праўда павінны мне. Але навошта яны вам етак рана?

– Думалі, што прапалі.

– Куды яны тута прападуць? І за вушы ад такога мурагу не адарвеш. Ступай, Дзянісавіч, скажы бацьку, каб не трывожыўся. Цэлыя вашы коні. Нічога з імі не здарылася. Дый пра пачастунак таксама скажы, не забудзь.

Але Масей не здаволіўся пачутым. Схадзіў да Сілкавай паласы, паглядзеў. Коні сапраўды стаялі між дрэў на ўзлеску, няйначай, яшчэ драмалі, бо зусім не зварухнуліся на Масеевы крокі.

– Ну што? – пацвельваючыся, спытаў Сілка Хрупчык, калі Масей вярнуўся на тое месца, дзе сустрэліся. – Не паверыў мне?

– Дык…

– Але Карпілішын прымак учора гаварыў, што вы бытта збіраліся з ім рыбу лавіць пасля касьбы?

– Брадніка ж не было.

– Ета мая віна, ета я закруціўся й не ўзяў, дарма што дакляраваў. А браднік у мяне, Дзянісавіч, ёсць. Адмысловая рэч. Я й сам пашкадаваў учора, што схібіў раптам. Можа, хто паедзе сянні ў вёску, дак я накажу. Дзеці тама ведаюць, дзе ён схаваны. Дак вечарам разам і паловім. Рыбы тута ў затоках процьма, балазе, ніхто цяпера не займаецца ёю. Мужыкоў тых няма, што рыбу раней лавілі. Цяпер ёй тута вольніца.

Было відаць, што Сілку Хрупчыку даспадобы прыйшлася сустрэча з Масеем у такую рань – сапраўды, калі яшчэ трапіць выпадак. І ён не кранаўся з месца. Загароджваў сабой дарогу Масею. Пагаварыць ён любіў, зрэшты, як амаль кожны вясковы чалавек, абы сапраўды выпадала звычайная прычына ці якое здарэнне.

Сухая рука яго вісела ўніз, быццам нежывая, няйначай, яна заўсёды замінала чалавеку ў рухах, а найперш не дазволіла некалі вырасці, развіцца фізічна як след, хоць мужчыны ў іх родзе былі рослыя і дужыя. Пазіраючы шэрымі вачамі на Масея, Сілка нібыта лашчыў яго, але пра рыбу нарэшце перастаў гаварыць, бо заруліла іншае. Ён дастаў з кішэні армяка ўчарашнюю лістоўку, акуратна складзеную ў чатыры столкі, патрымаў у руцэ, усё роўна як задумаўшыся, тады спытаў:

– А што ты, Дзянісавіч, думаеш пра ета? Нябось, таксама чытаў?

– Чытаў.

– Ну і што? Бальшавікі наўрад ці справяцца з немцамі?

– Чаму толькі бальшавікі? – паціснуў плячамі Масей. – Ваююць жа не адны бальшавікі.

Сілка, бадай, не чакаў, што Масей вось так адзавецца на яго словы, таму раптам збянтэжыўся, пачаў папраўляцца:

– Дак я ета… я таксама разумею, што не адны бальшавікі на фронце ваююць. Але ж… Ну так цяпер заведзена гаварыць.

– Кім гэта?

– Дак…

Масею стала шкада чалавека, што той раптам збянтэжыўся, відаць, Сілка ўсё-ткі разлічваў пачуць у адказ другія словы, можа, нават хацеў такім чынам дагадзіць нядаўняму савецкаму вязню… Выйшла ж наадварот – Масей раптам паказаў незразумелую, амаль бацькаву ўпартасць, якая нават яму нагадвала адным часам і насцярожлівую недаверлівасць, і несхаваную знарочыстасць. Гэта вось і адчуў Масей, таму прадоўжыць размову не адразу здолеў, проста не ведаў, як памяняць і тон яе, і напрамак, дакладней, як утрымацца ў ранейшым рэчышчы і як пры гэтым гаварыць. На памяць прыйшлі ўчарашнія размовы – і тая, што адбылася неўзабаве пасля прыезду на луг паміж ім, Андрэем Марухіным і бацькам, і пазнейшая, ужо на змярканні, калі Дзяніс Яўменавіч скончыў дзяліць луг і сын з бацькам ішлі на ўзлесак, дзе стаялі калёсы, разам. «А чаму ніколі з мужыкамі нашымі вось так не пагаварылі?» – спытаў тады бацька. «Сапраўды, чаму?» – падумаў цяпер Масей і неяк нядобра ўсміхнуўся сабе.

– Ведаеш, Сіланцій, – сказаў нарэшце Масей, адвёўшы позірк ад лістоўкі на сухую Сілкаву руку, – у вайне ўсяляк бывае, Асабліва ў зацяжной. Такой, як цяпер. У ёй то адзін раптам падолее на нейкі час, то другі, здаецца, сёння знаходзіцца наверсе, заўтра, наадварот, – другі. Так што адказаць пэўна на тваё пытанне – ці справяцца бальшавікі з цяперашнім нямецкім наступленнем – цяжка, можна сказаць, немагчыма. Дзеля гэтага трэба пабыць па меншай меры ў генеральным штабе Чырвонай Арміі. Што да немцаў, дык тут, здаецца, усё зразумела. Яны вунь і ўлістоўках пішуць, што робяць і куды накіроўваюцца, зноў не лічаць патрэбным утойваць свае планы. А вось чырвоныя… Словам, наперад цяжка што-небудзь напэўна сказаць. Канечне, пагроза вялікая. Але фронт жа не толькі на поўдні. Можа здарыцца, што чырвоныя ў адказ нанясуць удар у нейкім іншым месцы.

– Але ж ета калі яшчэ нанясуць? – з разважлівай няверлівасцю прамовіў Сілка, засоўваючы назад у кішэню лістоўку. – Брава-Жыватоўскі кажа, што цяпера ўсе войскі ў Сталіна сцягнуты на поўдзень, на галоўны напрамак. Але ж во нічога не атрымліваецца ў яго, дарма што… Не, Дзянісавіч, па ўсім відаць, што балылавікам ужо й праўда кранты… ну, нашым, ну, чырвоным… Дак… Брава-Жыватоўскі ж дарэмна не стане гаварыць!..

– Ну, Брава-Жыватоўскі зразумела, а ты? – сказаў Масей.

– Дак, – усё роўна як утрапёна выкаціў шэрыя вочы Сілка, – ён жа лепей ведае, недарэмна ледзь не кожнага дня ў Бабінавічы да Адольфа наведваецца. Раней дак і начаваў тама, а цяпера во зноў пасмялеў. Спіць дома.

– Усе мы тут, Сіланцій, аднолькавыя стратэгі, – зусім памяркоўна, без долі раздражнёнасці, але з пагардлівай усмешкай паківаў галавой Масей. – Што Брава-Жыватоўскі, што Мікіта Драніца… А Думаеш, камендант усё ведае, дарма што Адольфам завецца. Вось каб з самім Гітлерам Брава-Жыватоўскаму пагаварыць выпала!

– Дак…

– Той Адольф, той сапраўды сёе-тое ведае. А бабінавіцкі?.. Не думаю.

– Ну, Гітлер… канешна, Гітлер ведае, – бадай што ў захапленні калыхнуўся трохі назад Хрупчык. – Ды й Сталін… Ты тута, Дзянісавіч, рацыю маеш. Я таксама не заўсёды схільны слухаць Жыватоўшчыка. Але ж цяпера во етыя лістоўкі.

– Вядома, вялікай радасці яны людзям не прынеслі…

– Дак не тое, што вялікай, а можа, ніякай, – запярэчыў Сілка. – Я ета так. Я ета проста. Сустрэў во цябе, дай, думаю, спытаюся. Нездарма ж у савецкай турме сядзеў. Канешна, якія мы тута страцегі. Страцегія – ета тама, а тута… Ці ж багата ўчора скасілі?

– Адзін касіў.

– Ну так, бацька ж быў заняты ўвесь дзень на перамерах. Да што вам! Цяпера во возьмецеся, дак за адзін дзень усю паласу ўдвох пакладзеце. Ета мне… Дак што адной рукой… Адной рукой не накосіш. Выручае толькі жонка. Яна і косіць у мяне, і грабе. А я… так… Праўда, пры калгасе дак нічога было. На касьбу, зразумела, не пасылалі. І жонцы тады не трэба было касіць. Не, як для мяне, дак калгас па рабоце быў нядрэнны. Інвалідства маё мела вагу, ну а… жонка, дак баба… А цяпера во трэба самім касіць, бо й наняць няма каго. Казаў Марухін, што падсобіць, але ж таксама во з Дзянісам цэлы дзень учора струбіў.

– Камусьці і тое неабходна было рабіць.

– Дак я… я не супроць. Я ета так… Проста, што абяцаў прымак памагчы. А можа б, і ты, га, Дзянісавіч? Я як убачыў цябе тута, дак узрадаваўся. Дай, думаю, пра коні скажу, спытаюся. Ну, а што належыць да лістовак, дак тута можна і так сказаць: сабака брэша – вецер носіць.

– Ды не, Сіланцій, тут іначай, – пакруціў галавой Масей. – Тое, што вецер носіць, гэта праўда, а вось… што сабака брэша… На хлусню гэта не падобна.

– Дак што, значыць, усё-ткі кранты бальшавікам? – нібыта ўскочыў нанава Хрупчык.

– А я падумаў ужо, што цябе найбольш хвалюе твая паласа?

– Мяне, Дзянісавіч, хвалюе аднолькава і тое, і другое. Але трэба яшчэ з бацькам тваім пагаварыць. Па ім я заўсёды пазнаю, што да чаго… Калі, напрыклад, пачынае крычаць і хвалявацца, значыць, так яно і ёсць. Ды й справа знайшлася во – я вашы коні папасвіў, а вы мне пасобіце касіць. Хіба не так?

– Але я чуў, што бацьку згаворвала Хрысціна Гаманькова, – сказаў Масей, хоць нічога такога не чуў. – Як-ніяк – суседзі, у адным завулку жывем. А за Іванам яшчэ трэба падкошваць.

– Дак… Але ўсё роўна з Дзянісам трэба пагаварыць, будзе якая рада ці не. Ну, хоць бы наконт немцаў.

– То ступай, гавары, калі халоднай расы не баішся. А я сапраўды пабягу на Цімохаву пожню. Трэба старога Кузьму назад вярнуць, раз коні ў цябе знайшліся.

– Кажу, не забурчыць лішне кіла ў твайго Кузьмы, калі крок ці другі зробіць, – ужо без жартаў і з адчуваннем непрыязнасці сказаў Хрупчык.

Дарогі ім у адзін бок па ўзлеску выпала небагата, таму неўзабаве яны разышліся. Сілка патупаў краем лесу, чамусьці ўвесь час спыняючыся, нібыта сапраўды выгадваў як сушэй прайсці да Зазыбавай паласы, а Масей павярнуў направа, дзе за рэдкімі вялікімі дрэвамі пачынаўся сасновы падлесак. Сасняк быў яшчэ мала вышэйшы за даросла чалавека і ні разу не працярэбліваўся свядомай рукой, таму Масею часта даводзілася згінацца, адводзіць ад сябе калючае, халоднае ад расы голле. На палянцы, парослай шурпатым лішайнікам, раптам кінуліся вачам разгоны маслякоў – маладых і крамяных, бліскучых ад расы. Масей ажно спыніўся на момант пры гэтым, але не стаў дакранацца, толькі падумаў як пашкадаваў што грэх вось так праходзіць вясковаму чалавеку міма, ухапіць бы ў шапку ці прыпол… Тым не менш Масей «запомніў» месца, хоць, вядома, рабіць і гэтага не варта было: калі яны пачалі расці ўжо, грыбы, дык не ў адным сасняку пракінуліся. Але вось падлесак кончыўся, Масей раптам апынуўся на дарозе, добра наезджанай калясьмі, здзівіўся, шкадуючы, што не ведаў яе дасюль, іначай не трэба было б шыцца скрозь малады зараснік, пасярэбраны расой. Тым часам Цімохава пожня знаходзілася ўжо недзе блізка, пра гэта Масей здагадваўся па старым сваім уяўленні, але нечаканая дарога нібыта збіла яго з панталыку. Хвілін колькі ён стаяў і пазіраў у абодва канцы, што знікалі кожны за сваім павароткам, аднак прыгадаць нешта пэўнае, што б вывела памяць на новую здагадку, не мог. Тады Масей пачаў прыкідваць, адкуль і куды магла весці дарога. Наезджана яна тут, няйначай, у апошнія гады; ведаць пра яе Масей, канечне, не мог. Але ён ведаў пра іншае, напрыклад, пра тое, як увогуле вясковыя людзі пракладваюць шляхі да сваіх паселішчаў і наадварот – акрамя зручнасці звычайна і карыслівасць сваю захоўваюць, ні адно патрэбнае месца далёка не абмінуць. Значыць, і Цімохава пожня, самае вялікае ўрочышча ў гэтым лесе, таксама ці засталася ўбаку, наўрад ці абышла яе, не зачапіла нейкім краем новая дарога. Іншая справа, дзе яна, тая пожня? Масей павагаўся яшчэ колькі часу на дарозе, пераступіў на другую абочыну яе. «А проста ж было рабіць, – усміхнуўся ён. – Варта было выйсці

яшчэ на лузе на Кузьмовы сляды. Урэшце, можна было таксама абмінуць краем гэты сасняк, не лезці, акурат з завязанымі вачамі, у сярэдзіну». Падумалася разам з тым, што вельмі змянілася ўсё тут, пакуль ён столькі гадоў адсутнічаў, пераязджаў у «сталыпінскіх вагонах» з Еўропы ў Азію і назад. Таму ўжо нібыта выходзіла, што гэты лес і не яго быў…

Сонца тым часам акурат выслізнула з-за дрэў, што асланялі з другога боку дарогу, высвеціла насупраць паўзверх сасняк з маладымі макаўкамі, у якія ператварыліся нядаўнія шышкі-парасткі. Ужо даўно гаманіла навокал птаства, якога Масей чамусьці нават не чуў дасюль. Некалі ён добра адрозніваў адзін ад аднаго галасы птушак, умеў падрабляцца пад іх, але цяпер у вушах усё злівалася, гучала агульным хорам, а прабівалася сваім голасам, здаецца, адна чачотка, бо спявала недзе зусім блізка. Масей паспрабаваў цяпер уявіць сабе гэту маленькую, бы камячок, птушачку з шаравата-бурым адзеннем і малінавай шапачкай. Ды дарэмна…

І ўсё-ткі трэба было шукаць Кузьму, можа, гукаць. Але дастаткова было Масею зрабіць паўтараста крокаў, павярнуўшы налрава, як за дрэвамі адкрылася Цімохава пожня: раптам заззяла наперадзе ў прагалах, успыхнула на сярэдзіне бліскучым святлом, якое, здавалася, станавілася на дыбкі, адбіваючыся вясёлкай на высокім небе. Зразумеўшы, што гэта сапраўды тое месца, якое ён шукаў, Масей чамусьці ажно страпянуўся душой ад гэтакай нечаканасці, дарма што ўвесь час свядома ішоў сюды з лугу. Нечаканасць стала радасцю. Хутчэй за ўсё яна і прымусіла страпянуцца. Але не сама па сабе, а таксама неспадзяванай акалічнасцю. Аказваецца, усё галоўнае тут, у гэтым лесе, заставалася, як раней, нішто не перамясцілася і нікуды не падзелася. Іншая справа, што пазнаваць гэтае ўсё даводзілася нанава і нібыта ў іншым абліччы.

Цімохава пожня называлася здаўна так, але чаму, напэўна, ніхто ў Верамейках цяпер не помніў. Падобная акалічнасць гаварыла толькі пра бясконцасць жыцця, якйе віравала на берагах Бесядзі спрадвеку: штосьці яно прыносіла ў гэты свет, штосьці – уносіла зноў і так неўпрыкмет для людзёй паварочвалася вакол свайго нябачнага стрыжня і паварочвалася… Верамейкаўцы даўно ўжо не касілі пожню, лічы, з таго часу, як яна адышла да лясніцтва, што знаходзілася ў Зацішшы. Праўда, адбылося гэта не без крыку з боку верамейкаўцаў, сялянскі сход ажно колькі разоў стукаўся ў дзверы розных устаноў і ў воласці, і ў павеце, але дарэмна, пожню пакінулі за лясніцтвам. Масей нават помніў тую тузаніну сваіх аднавяскоўцаў. Бацька тады яшчэ знаходзіўся ў Чырвонай Арміі, на сходы хадзіў дзед Яўмен. І, можа, якраз таму, што Цімохава пожня была страчана для вёскі, верамейкаўцы неўзабаве пачалі другую «вайну» за сенажаць, цяпер за Зінкевічаў луг…

Дарога, як і спадзяваўся Масей, сапраўды ўсяго толькі краем узбівалася на пожню, але Кузьмы Прыбыткова на ёй не відаць было. Ні постаці, ні слядоў. Затое зусім блізка, у густой траве, з якой была пазбівана раса, стаяў маладзенькі лось. Убачыўшы яго, Масей сцяўся ўвесь, спыніўся на месцы, баючыся патрывожыць звера. Дзіўна, але яму нават захацелася, каб той яшчэ доўга не глядзеў у яго бок, каб не знайшлося аніякай прычыны зверу спалохацца ды збегчы.

Зусім не кратаючыся, Масей стаяў на дарозе і, усё роўна як спадылба, ціхутка назіраў нейкі час за ласём. Нарэшце той павярнуў галаву, убачыў чалавека.

Доўга не думаючы, Масей самахоць памкнуўся наперад, ступіў у мокрую траву. Але лось, на здзіўленне, не адскочыў, толькі яшчэ больш сцішыўся, акурат сілячыся пазнаць, хто гэтак рана з'явіўся на пожні. Масей прыветна махнуў рукой, рашыў падысці бліжэй, маючы намер неяк выклікаць у звера давер да сябе. Праўда, ён не ведаў, як гэга рабіць. Адно – хатняя жывёла, там спрадвечны клопат з ёю. А тут. Тым не менш Масей не спыняўся, пасоўваўся далей. Хутка ён адчуў, што цела ад напружання нібыта пачынала дранцвець, страчваць адчувальнасць. Такое здаралася з ім і раней, але даўно, у маленстве, калі знаходзіў на зямлі птушынае гняздо, да якога трэба было нячутна падкрасціся… Масей разумеў, што гэта вельмі рэдкая з'ява – сустрэць лася. Ласі даўно перавяліся ў Забесяддзі. Яму няўцям было, што гэты перазімаваў у Мамонаўцы, таму не баіцца людзей. А маладзенькі лось тым часам сапраўды рушыў чалавеку насустрач. Нарэшце яны – і чалавек, і ачалавечаны звер – настолькі зблізіліся, што Масей заўважыў у ягоных вачах сваю постаць. І яшчэ ён убачыў, як адбіўся раптам у гэтых вачах цэлы свет за ім – і край сенажаці, адкуль Масей рухаўся, сляды на ёй ад яго ног, і лес, што ўставаў за дарогай, і неба над лесам, якое пачынала набіраць сінечу…

– Ну што, брат, – быццам такому ж разумнаму і добраму, як сам, сказаў Масей, але, бадай, усё яшчэ ад разгубленасці, ад усведамлення бездапаможнасці, бо не ведаў, як далей паводзіць сябе перад зверам.

А той спыніўся перад ім – струнке, з доўгімі пярэднімі нагамі і амаль белаю поўсцю з-пад нізу, якая была мокрая ад расы, і ўжо чорная, з сярэбранымі бліскаўкамі па баках і на спіне; на гарбатай, але прыгожай галаве ў яго пачыналіся рогі, таму скура на штычковай грушы выглядала патрэсканай, лупілася. Ілядзеў ён на Масея зусім лагодна і ціхамірна, ажно не верылася, што гэтакім можа быць звер.

– Ну што, брат, – стрымліваючы рухі, зноў прамовіў Масей і зноў злавіў сябе на тым, што не разумее, як паводзіць сябе тут.

Канечне, калі б Масей здагадаўся, што лось з самае восені жыў сярод людзей, то не прымушаў бы цяпер сябе скамянела рухацца альбо гэтаксама стаяць на адным месцы, але ён гэтага не ведаў, таму ні на што пэўнае не рашаўся. Здавалася, што не знойдзецца таксама іншая сіла, якая б парушыла незвычайнае іхняе процістаянне, калі можна так сказаць, няйначай, аднолькава роўнае на даверлівасці і цярплівасці. Масей адкінуў назад галаву, падставіў твар сонечным промням. За той час, як ён ішоў па лесе, а затым стаяў тут, на пожні, ранішняя халаднаватая пранізлівасць, якую павялічвала вялікая раса, пачала страчвацца патрохі, хоць раса яшчэ і блішчэла скрозь і выглядала па-ранейшаму халоднай, але было чуваць, як знізу на ўгрэвах ужо струменіла парнасць, напаўняючы вільготнай цеплынёй паветра.

Трымаючы ўлагоджаны твар на сонцы і не расплюшчваючы нагрэтых вачэй, Масей зразумеў раптам, што вось так можна прастаяць тут доўга, нават забыцца пра ўсё, злашча, што само становішча, у якім ён агпынуўся, падышоўшы да лася, сапраўды спрыяла радаснай сцішацасці і забыццю. Затое Масееў слых стаў цяпер больш

чуйным, быццам самахоць насцярожаным; зрабіўся ён такім не сам па сабе, а хутчэй таму, што Масей чакаў, што лось першы парушыць іхняе недарэчнае процістаянне, прадпрыме нешта такое, што выведзе абодвух з незвычайнага становішча. Але не. Лось па-ранейшаму не варушыўся. І калі Масей праз колькі часу зноў паглядзеў на яго, то ўбачыў у вачах адно і тое ж – і сябе, і лес, і неба над ім. Гэтыя вочы былі зусім не падобныя на вочы звера. То былі чалавечыя вочы, са смуткам і даверлівасцю, з чаканнем чагосьці такога, што было незразумела пакуль чалавеку.

Нарэшце Масей не вытрымаў гэтага позірку, ступіў бокам направа, усё роўна як даючы дарогу, якую замінаў дасюль. Толькі і цяпер лось не крануўся з месца. Тады Масей, быццам у адчаі, крута павярнуўся і, смурыжачы нагамі траву, падаўся назад па сваіх слядах. Пры гэтым ён чамусьці верыў, што лось таксама рушыць следам. Але той застаўся стаяць. Гэта Масей зразумеў адразу, як выбраўся на дарогу і не пачуў за сабой чужых крокаў. А не пачуўшы, неяк абмяк, апусціў пацяжэлыя плечы, нібыта ў нечым ашукаўся.

* * *

З лесу Масей выйшаў ціхі, з задумлівым тварам, на якім блукала, не адсвечваючыся, загадкавая ўсмешка. Неспадзяваная сустрэча на Цімохавай пожні з маладым ласём адным часам і ўзрушыла яго, і збянтэжыла. Але не той нечаканасцю, якая ўзнікла адразу, калі Масей убачыў лася; цяпер яна перайшла ў новае пачуццё, звязаняе ўжо з паводзінамі звера, з яго чалавечай даверлівасцю, што, зразумеў нарэшце Масей, – ішла ад адзіноты. Ён многа, бадай увесь час, як вяртаўся на луг, думаў пра гэта і ажно шкадаваў небараку, гатовы быў нават папракаць сябе, што пакінуў на пожні. Думаў ён і пра тое, што ўчарашні дзень, і сённяшняя ноч, а цяпер і раніца вось напоўнілі яго чымсьці такім, чаго не ставала дасюль, быццам далучылі да нечага зусім нязведанага, даўшы па-новаму адчуць непрыкаянае жыццё.

Ён падумаў нават, што нарэшце пачне пісаць, зоймецца той справай, якая не давалася яму па-сапраўднаму вось ужо колькі гадоў, лічы, з таго моманту, як прыйшлі па яго сярод ночы двое з дазволам на арышт… Той верш, які ён пачаў летась, неўзабаве пасля вяртання ў вёску, чамусьці так і не склаўся да канца, не стаў творам, дарма што радкі з яго часам і цяпер, праз многа дзён, з’яўляліся ў галаве, абпальвалі горыччу душу. Аднак далей, як за «агонь збавення» і «адчыненыя дзверы турмы», яны не падаваліся, шалёна супраціўляліся, засцячы думку. Аднаго разу, пры добрай чарцы, здаецца, яшчэ зімой, Масей нават бацьку абмовіўся пра свае творчыя цяжкасці. Але той не быў бы Зазыбам, каб не сказаў сваё: «Што ж ты скардзішся, сын! Значыць, не пра тое пішаш. Ды і дзе ты цяпер будзеш друкавацца? Не ў немцаў жа? Дык мы, здаецца, з табой да гэтага яшчэ не дайшлі, га?» – Масею здалося тады, што гэтым бацькава цікавасць да ягоных клопатаў і абмежавалася. Выйшла ж не так. Дзён праз колькі Дзяніс Яўменавіч сам нечакана загаварыў: «А што, сын, дзе ж падзелася тое, што ты напісаў дасюль? Ну, да таго, як з табой здарылася бяда?» – «Тое, што было надрукавана, па ідэі, – сказаў яму Масей, – павінна жыць сваім жыццём, незалежна ўжо цяпер ад акалічнасцей. А вось іншае… Ну, тое, што паспеў напісаць да арышту… было забрана ў мяне. Значыць, павінна недзе ляжаць у судовай справе. Хоць дзе

цяпер тыя судовыя справы? Відаць, прапала ўсё – можа, затаптана ботамі, а можа, згарэла ў якім-небудзь ваенным пажары». Размова тая паміж імі была кароткая, пачалася і закончылася літаральна такімі вось словамі, ды і ўзнікла яна сапраўды нечакана, акурат як не да месца, аднак Масей чамусьці зрэдзьчасу пра яе ўсё-ткі ўспамінаў нават удзячны быў бацьку, што зняў калі не ўвесь пакутлівы пажар, то хоць частку яго. Да таго ж у той дзень здарыўся даволі рэдкі выпадак, калі яны разышліся з адчуваннем паразумеласці. Прынамсі, так здавалася Масею, бо спрэчкі на розныя тэмы, пра розныя бакі жыцця, якое датычыла сям'і, вёскі, нават вайны ў яе канкрэтных і абстрактных праявах, звычайна не выклікалі паміж іх вялікіх разыходжанняў, а тым больш не пакідалі на душы прыкрасці; але крый бог зачапіць пры гэтым, абвінаваціць у нечым савецкую ўладу!.. Зрэшты, нездарма ж нават учора Дзяніс Яўменавіч кінуў папрок сыну, маўляў, усё ваюеш са мной!.. «Якая тут вайна!.. – сумна ўсміхнуўся Масей. – Проста чалавек павінен мець права на штосьці сваё ў жыцці, зыходзячы з таго, якое яно ў яго выходзіць. А мне пакуль жывецца, як кажуць у Верамейках, ні ў сіта, ні ў рэшата…» Але сапраўды, пра што пісаць? Можа, бацька і праўда меўрацыю, гаворачы, што прычынай творчага крызісу з'яўляецца ідэйная нявызначанасць; праўда, сказаў ён тады іначай, як толькі і мог сказаць; значыць, не пра тое пішаш, сын: але ж у той час для яго, Масея, гэта было самым важным, і радкі пра «агонь збавення» з'явіліся не столькі вынікам усвядомленай неабходнасці, колькі прагай спакутаванай душы, якая хацела справядлівасці, нават адплаты; здавалася, у наяўнасці былі і глыбокае пачуццё, і жаданне выказацца, выліць на паперу гэтае пачуццё, нарэшце, задаволіць такім чынам, аднавіць зняважаную справядлівасць, аднак усё гэта не знаходзіла тым не менш сабе адпаведнага выйсця, нібыта захрасла недзе ўсярэдзіне, пачало паступова запякацца ў горычы… Няйначай, праўду кажуць, што адзенне моль з'ядае, а сэрца – горыч… І яе не так сабе пазбавіцца, гэтай горычы, дарма што бацька заўсёды даводзіць, маўляў горыч таксама ачышчае чалавека… О, як многа нагаворана людзьмі за вякі!.. І ўсё нібыта як на выбар, кожнаму – сваё: слова лечыць, слова калечыць!.. А паспрабуй разбуры цянёты, вырвіся з іх!..

Была некалі ў Масея задума напісаць гістарычную аповесць пра сялянскае паўстанне пад кіраўніцтвам Вашчылы, якое адбывалася дзвесце гадоў таму назад тут, у былым Крычаўскім старостве, што належала тады князю Гераніму Радзівілу. Падказаў тэму прафесар Замоцін. І, можа б, Масей нават напісаў яе, бо пачаў вывучаць матэрыялы. Але ў Мінску іх было зусім мала. І гісторыкі раілі ехаць у Маскву або ў Ленінград, дзе павінна была захоўвацца судовая справа Вашчылы, якая нібыта вялася ў Кіеве, куды кіраўнік паўстання быў дастаўлены ў лютым 1744 года пасля таго, як перабег паміж Сілічамі і Латакамі польска-рускую граніцу. Арышт перашкодзіў Масею па-сапраўднаму заняцца аповесцю, а першыя накіды засталіся ў паперах. Праўда, Масей паспеў усё ж з'ездзіць у вёску, дзе жыў Вашчыла, у Мурын Бор, што за Крутагор'ем, кіламетраў за дзесяць; стаіць яна на беразе возера, якое ўтварае рэчышча Жадунькі; Масей доўга хадзіў па вёсцы, размаўляў з пажылымі дзядзькамі, наведаўся на могілкі, думаў, што там нешта захавалася ад таго часу, але дарэмна: Вашчылавых слядоў нідзе не знаходзілася, больш таго, пра самога кіраўніка

паўстання ў Мурыным Бары нічога не ведалі, нават ніхто не чуў, што такі чалавек наогул некалі мог апынуцца тут. Толькі адзін стары, ужо зусім сівы чалавек, пачаў успамінаць, што сапраўды ведаў аднаго Вашчылу, печніка, але той быў не з гэтай вёскі: «О, мы пахадзілі з ім навокал, колькі печаў і грубак у хатах склалі, гаспадары, мусіць, яшчэ і цяпер недзе дзякуй кажуць. Я – цесляром, а ён мулярам. Скажу, адмысловы спецыяліст у сваім дзеле. А вось дзе ён цяпера, сказаць не магу. Ета ў маладыя гады было, калі яшчэ хадзілася лёгка, бывала, сякеру за пояс ды й нацянькі, абы толькі работа знаходзілася. А яна-ткі й была, работа, людзі то аддзяляліся, то нанова будаваліся, бо на сваёй зямлі жылі. Ну а цяпера… Дак цяпера я не ведаю, дзе Вашчыла». Масей хацеў растлумачыць старому, што ягоны знаёмы не той чалавек, сляды якога ён шукае, але чамусьці не стаў рабіць гэтага, адно ўсміхнуўся сабе, падумаў, што трэба наведацца яшчэ ў Сілічы, дзе Вашчыла быў войтам. Аднак з'ездзіць тады ў Сілічы не здолеў, ну а пасля ўжо стала зусім не да аповесці.

Заняты такімі думкамі, Масей нарэшце вышыбаваў да сваіх вазоў. Бацька касіў. Пачаў ён ад Бесядзі, каб згарнуць у адно траву з двух сярэдніх пракосаў, свайго і Масеевага. Кузьма Прыбыткоў таксама брынкаў нз сваёй паласе старой, ужо даўно злізанай, але тым не менш вострай літоўкай. Каля вазоў заставалася адна Анюта. Яна завіхалася каля вогнішча, гатавала сняданак – нешта сыходзіла парай у казанку, што вісеў над бляклым полымем пад закуранай жалезнай трывогай, пахла кропам і яшчэ нейкай зялёнай аздобай, на якую далей ужо не хапала Масеевага нюху.

Марфа Давыдаўна яшчэ не вярнулася з вёскі – балазе, рана, да таго ж на яе былі пакінуты ўчора ажно дзве гаспадаркі.

Анюта не пачула Масеевых крокаў. Яна сядзела спіною да лесу, памешвала вузкім апалонікам у казанку і штосьці зусім ціха спявала.

Дзіўна, але Масею, як толькі ўбачыў яе, раптам зрабілася ўсё роўна нібыта не па сабе, адным часам і сорамна і трывожна, хоць тое, што здарылася паміж імі ўначы, ляжала віною аднолькава на абаіх. Ды і ці віна гэта была? Ва ўсякім разе, яны не адчувалі яе за сабой ні тады, калі ішлі ўпоцемку ў лес, ні пасля, як вярталіся па самым золку ў табар. У тыя хвіліны іх поўніла, як і належыць, іншае пачуццё, дарма што кожны недзе ў душы разумеў, што пераступіў гэтым нейкую мяжу, якая не застанецца цяпер без выніку, можа, нават ускладніць не толькі іхняе асабістае жыццё, аднак і адносіны паміж суседскімі дварамі ў завулку. Але калі праўду казаць да канца, то ўжо адразу пасля нечаканай іхняй блізкасці Масей адчуў у сабе штосьці падобнае на сарамлівую вінаватасць, якая нібыта яшчэ больш спусташыла яго істоту, асабліва як раптам, ціха ўсхліпваючы, заплакала Анюта. Ён няўмела пачаў суцяшаць яе, блытаючыся ў словах, але Анюта неспадзявана сама супакоіла яго. «Дурненькі, – сказала яна, – ета я ад шчасця».

Тым не менш цяпер Масеем зноў авалодаў сарамлівы неспакой, што і ўначы. Ды таксама ненадоўга, усяго да таго моманту, як Анюта нарэшце пачула за спіной ягоную прысутнасць – адразу ўсхапілася на ногі, павярнулася ўсёй постаццю: вочы яе пад высокімі дугамі броваў былі спакойныя, з выразнай удзячнасцю, хоць, можа, трохі больш зялёныя, чым учора; а калі і праўда лічыць, што вочы – люстра душы, то і

сама Анюта выглядала такой жа спакойнай, нібыта на самай справе паміж імі нічога не здарылася. Ёй можна было пазайздросціць – валодаць сабой здольны не кожны. Масей усміхнуўся, спытаў:

– Пра што спявала?

– Калі?

– Ды толькі што.

– Хіба ты чуў? Ета старая песня – пра Хведара і Дуню. Мая бабка Хадоська знала яе, таму мяне навучыла. А пяецца ў ёй пра тое, што за возерам жыў мужык Карпуня, у яго быў сын Хвядуня, а ў Хвядуні жонка Дуня. І яшчэ пра тое, як падбілі яго злыя людзі, абвінавацілі яе ў здрадзе, і зарэзаў ён Дуню…

– І собіла ж табе сёння ўзбіцца на гэту песню!

Анюта адчула Масееву збянтэжанасць, памаўчала, акурат сама зніякавелая, тады раптам засмяялася, лёгка і весела, губы яе нібыта расцвілі пры гэтым, твар зрабіўся шчаслівым, зусім дзявочым; а калі перастала смяяцца, стала адным часам старэйшая: дзявочыя губы і вочы сталай жанчыны. Прамовіла:

– Ну што ж, раз не падабаецца ета, дак слухай другую. Вось станеш касіць, і я заспяваю – «Там Масейка сена косіць, тонкі голас пераносіць…» Нябось, чуў?

– Чаму ж не? Але, здаецца, толькі гэтага і не хапала, што запець пра нас на ўвесь луг?

– Дак… Сянні ж наогул спяваюць. Купалаў дзень.

– Бачу, табе вельмі хочацца пець. Але не трэба ўспамінаць такія песні.

– Ладна, ета я так… Падумала раптам. А ты ўсё-такі ступай касіць, Масей, а я і праўда пець пра цябе следам стану, – засмяялася Анюта, акурат паказваючы гэтым сваю безразважлівасць.

Масей хацеў расказаць Анюце пра маладзенькага лася на Цімохавай пожні, але стрымаўся. Пастаяў колькі часу, быццам у нерашучасці, каля вогнішча, абвалакваючы цёплым, мутнеючым позіркам Анюту, тады страсянуў галавой, акурат зноў ад наслання. Падышоў да калёс і расшпіліў на грудзях вагоўку, якая станавілася непатрэбнай ужо.

Касу яго таксама бацька паспеў накляпаць. Уторкнутая кассём у лугавы дзірван, яна стаяла на ўчарашнім пракосе, блішчэла на сонцы, адбіваючы ад сябе зіхоткія промні, ажно сляпіла вочы.

Масей узяў і памянташыў расплюшчанае малатком лязо, затым выраўняў з двух бакоў; рабіць гэта ён умеў як і кожны селянін, дарма што час мог ужо і адвучыць, але дзедава навука, аказваецца, пакуль трымалася моцна ў ім, дарэчы, не прыйшлося Масею сёлета вучыцца таксама нанава ні араць, ні скародзіць, ні стагаваць…

Трава ўсё яшчэ была вільготная, таму падатлівая, і ад першага ўзмаху, які зрабіў Масей зухавата, з усяго пляча, з ціхім хрустам, быццам зусім не раздумваючы, каса ўгрызлася ў густую зялёную мякату, адкінуўшы яе на левы бок, на край учарашняга пракоса; Масей зноў занёс над травой касу і ўжо з меншым націскам пусціў яе на наступны паўкруг, ледва паспяваючы падцягваць левую нагу. Шоргат касы адразу падзейнічаў на яго, пачаў супакойваць.

З Гончы – і зусім неўпрыкмет – прыляцеў на луг бусел, стаў кружыць над палосамі, усыпанымі людзьмі, што адпуджвала яго; але тым не менш, звесіўшы чырвоную дзюбу, а затым і выпрастаўшы такія ж чырвоныя ногі, за кожным кругам працягваў зніжацца ды зніжацца.

Заняты работай, якая цалкам захапіла яго, адцягнула ўвагу на сябе, Масей заўважыў бусла толькі тады, як той, праляцеўшы над ім, чырканўў па зямлі сваім ценем. А бусел узяў раптам ды, як дар божы, апусціўся на іхняй паласе. Трава даставала яму да распасцёртых крылаў, таму на нейкі момант здалося, што птах завіснуў на ёй. Але вось ён падскочыў вышэй травы, склаў крылы, зноў дастаў нагамі зямлі. Толькі і цяпер, калі нібыта ўжо ўладкаваўся, дамогся для сябе зручнасці, густая трава па-ранейшаму замінала рухацца, блытала крокі, таму яму даводзілася проста прадзірацца скрозь кучму. Нарэшце бусел выбавіўся з травы на ўчарашні Масееў пракос, хутка і неяк смешна калываючыся, пакрочыў па ім насустрач касцам. Масей амаль з дзіцячай усмешкай паўзіраўся ўслед буслу, патачыў касу, зноў пачаў касіць. Бусел між тым знайшоў, што яму патрэбна было на лузе, падскочыў на сваіх доўгіх чырвонух нагах, узмахнуў крыламі, падаўся на гняздо ў Гончу. Неўзабаве адтуль пачуўся радасны клёкат. Уласна кажучы, клёкат гэты прымусіў Масея зноў пашукаць вачамі бусла на паласе, але таго ўжо не відаць было тут, і Масей зразумеў, што прылятаў ён сюды з-за Бесядзі. У Верамейках свайго бусла сёлета не было ўжо, буслянка пуставала з таго самага часу, як увосень зляцела з яе апошні раз і не вярнулася назад старая бусліха.

Як і ўчора, над лугам зноў вельмі хутка ўтварылася ліловая смуга – паветра нагрэлася, над узлобкамі замітусілася ўваччу.

Чалавечыя думкі неспадзяваныя, зрэшты, гэта часта здараецца і з учынкамі, таму Масей тут жа забыў пра буслоў, у галаву раптам прыйшло іншае, але, няйначай, як выткалася з ранейшай асновы – зноў пачаў разважаць сам з сабой пра Крычаўскае паўстанне, пра Вашчылу і яго паплечнікаў. З запісак Меера было вядома, што Івана Карпача, атамана Ветра і другіх паўстанцаў паводле Радзівілавага суда пакаралі напрадвесні таго ж 1744 года. Але ніхто не пакінуў ні вуснага, ні пісьмовага следу, куды падзеўся сам Вашчыла. Замуціў ваду, праліў нямала крыві і знік назаўсёды… Тых звестак, што ў Меера, не хапала нават для таго, каб хоць збольшага высветліць яго асобу. У народзе не засталося аб ім ні гучнага слова, ні жаласнай песні… А між тым у Забесяддзі і цяпер спяваюць песні пра Сцяпана Разіна, Багдана Хмяльніцкага, Усціна Кармелюка… А Вашчыла ж з іхняй кагорты. Дык, можа, проста не ў тым народзе з’явіўся? «Але ж прафесар Замоцін у свой час гаварыў, што кіраўнік Крычаўскага паўстання памёр недзе ў Старадубе, па дарозе з Кіева ў Мглін, куды яго везлі на разбіральніцтва ў змешаную руска-польскую камісію. Цікава, адкуль у яго былі гэтыя звесткі?»

Думаючы так, Масей непрыкметна дамахаўся касой да бацькі. Бацька таксама ўсё роўна як з ахвотаю перастаў касіць.

– Што, сын, – спытаў ён, – дарэмна мы цябе зганялі на пожню?

– Не зусім. Ведаеш, каго я там сустрэў? Лася.

– Дак… Гэта, відаць, будзе той лось, што застаўся адзін каля нашай крыніцы. Бацьку яго забілі мінулай восенню. Чалавек тут у нас адзін такі быў тады. З Раманам Сёмачкіным з арміі дэзерціраваў. Бегаў, як ашалелы. Дак ён і застрэліў даруслага лася, а гэты малым застаўся. Хіба не чуў?

– Гэта да майго прыходу было.

– Здаецца, так. Ну так. Вось ён, небарака, у Мамонаўцы і выжыў за зіму. У Гапкі Азаравай. Ну, той, што… Хоць адкуль табе ведаць? Муж яе, Раман Азараў, загінуў у фінскую. Дык вось гэты лось… Кажуць, хлапец Гапчын даглядаў яго цэлую зіму. А цяпер, няйначай, небарака, недзе сышоў з двара. Што ні кажы, а звер.

– А чаму ты кажаш – небарака?

– Дык як іначай? Застаўся ж адзін. Ну, няхай малы. Не такая бяда. З малога даруслы вырасце. Але ж адзін. Ласёў у нас дасюль ніхто не бачыў. Можа, гэтыя адны тут з’явіліся. Дык якая радасць? Так і праходзіць бабылём да самай канчыны. Ато й зусім хто-небудзь застрэліць, як і бацьку, цяпер нямала людзей са зброяй ходзіць. І ва ўсіх рукі свярбяць. Тым болыц забароны ніякай.

Кузьма Прыбыткоў, які параўняўся з Зазыбамі, таксама рашыў дапасці да размовы.

– Вы ета пра што? – спытаў ён.

– Дак… – памуляўся Дзяніс Яўменавіч. Тады Масей сказаў:

– Лася бачыў на пожні, як па вас хадзіў.

– А-а-а, – усміхнуўся Кузьма, – ета Мішкаў. Мамонаўскі. Я ета адразу сцяміў. Нават трывожыць не стаў. Паглядзеў з краю і пайшоў сабе ціха назад. Каму ж другому тута быць? Цяпера будзе хадзіць па наваколлі. Але ж на луг да нас не паказваецца. Канешне, звер, тута нічога не скажаш. Сам па сабе. Дак і ты бачыў, Масей?

– Ага.

– Але ж я падумаў… Ну, вы… дак вы маладыя, вам нічога не каштуе прайсці да канца свае пракосы, а мае ўжо ногі дрыжаць. Ці не пайсці нам паснедаць?

– І то праўда, – сказаў Дзяніс Яўменавіч. – Анюта, нябось, ужо чакае нас?

Масей паглядзеў на бацьку, тады на Кузьму Прыбыткова. Вочы ў таго былі чырвоныя, здаецца, нават нібыта не варушыліся. А сам ён выгляд меў акурат скашчавелы, нечым падобны быў на таго бусла, што нядаўна прылятаў з Гончы, мусіць, не так сабе давалася яму касьба… Праўда, што старасць – не радасць. Старыя людзі звычайна мала спяць, і Масей падумаў: можа, Кузьма нават чуў уначы, як яны з Анютай хадзілі на пагулянку ў лес?..

– Пра што я хачу спытаць, дзядзька Кузьма, – раптам нечакана для самога сябе пачаў Масей.

– Дак гавары, – падахвоціў яго Прыбыткоў.

– Вы стары чалавек, нямала пажылі на гэтым свеце…

– Дак і што?

– А яшчэ болей, бадай, пачулі.

– Ну-ну…

– Дык ці чулі вы калі-небудзь пра Вашчылу?

– Пра якога Вашчылу? – зрэнкі вачэй у старога варухнуліся, у іх з’явілася штосьці жывое, але ён яшчэ доўга глядзеў на Масея, быццам не мог даўмецца, чаго дамагаецца той.

– Ну, пра таго… Гэта даўно было. Тут у нас паўстанне некалі было. Вашчыла кіраваў у ім.

– А, ты вунь пра што, – здагадліва кіўнуў Кузьма і гэтым здзівіў Масея, які хоць і пытаўся, але, здаецца, не чакаў, што слова яго гэтак адзавецца. – Дак ета й праўда даўно было. Яшчэ бытта да майго дзеда, а можа, і больш таго. Раней жа не па кніжках помнілі, а так, з вуснаў у вусны каб. Ты мне, я табе. Дак і з етым Вашчылам. Разбойнік ён быў. Пабіў крычаўскіх жыдоў. Здаецца, ён тама, у Крычаве, найбольш і дзейнічаў. Яшчэ цяпера тамашніх кабет вашчылкамі завуць.

– Чаму вашчылкамі? Чаму кабет?

– Ну, ета я ўжо не ведаю. Сам можаш здагадацца. А от што завуць так, то да. Я тама, у Крычаве, у васкадроне колісь служыў. Полк стаяў кавалерыйскі. Таксама даўно было. Бадай, Дзяніс яшчэ тады, прабачце, у ложку мачыўся, пешкі пад стол хадзіў. Га, Дзяніс? Ета й праўда яшчэ вуу-унь калі было, як кажуць, за царом Гарохам. Дак мы, бывала, жартавалі, хлопцы ж маладыя былі, няхай што салдаты, хадзем, маўляў, да вашчылак. Але ў нас тута, у Верамейках, ніхто пра Вашчылу, бадай, і не ведае. Ага, быў такі Вашчыла. І жыдоў крычаўскіх бытта ён пабіў. А чаму раптам ты, Дзянісавіч, успомніў?

– Бо раней цікавіўся.

– Але ж, бачыш, чаго толькі мы за зіму ету з табой не перагаварылі, а пра Вашчылу ні разу. Быў такі чалавек некалі, быў. Але пра яго трэба пытацца ў Крычаве. Няйначай, тама ведаюць больш.

Дзяніс Яўменавіч дачакаўся, пакуль скончыцца размова паміж сынам і Прыбытковым, сказаў, расплываючыся ва ўсмешцы:

– А я і не ведаў, Кузьма, што ты таксама ў кавалерыі служыў.

– Дак не адзін жа ты. Але ета яшчэ задоўга да японскай. Пасля ні разу й не прызываўся. І ўсе войны прайшлі без мяне.

– Знайшоў пра што шкадаваць. Затое гэтай вось хопіць на ўсіх.

– На ўсіх то на ўсіх, але ж грыміць яна вунь дзе, а мы нібыта і ў старане. Пакуль што немцы аднымі лістоўкамі нас даймаюць.

– У вас, у верамейкаўцаў, заўсёды шыварат-навыварат.

– Чаму ета раптам у «вас»?

Але Зазыба не адказаў, давёў пачатае:

– Раз не вам, то і нікому, раз не ў вас, дак і нідзе. Ці ж мала дастаецца людзям і тут, у акупацыі?

– Хто і ведае. Але ж гора многа, а смерць адна.

– Хіба што.

Вогнішча каля вазоў ужо не гарэла. Тлела. Каля яго акрамя Анюты стаяў з вінтоўкай Хведар Пацюпа. Зазыба зразумеў, што гэта па яго.

VI

– А ты, Пацюпа, вось так на віду і ходзіш з вінтоўкай? – спытаў здзіўлена Кузьма Прыбыткоў партызана, калі яны з Зазыбам падышлі да вогнішча.

– Дык што тут дзіўнага? – паціснуў плячамі Пацюпа, акурат зняважаны.

– Дзіўнага нічога, – сказаў, усё роўна як таксама паціскаючы плячамі, Прыбыткоў, – але ж наш паліцэйскі дак…

– Што ваш паліцэйскі? – насцярожана перапыніў старога Кузьму Пацюпа.

– Дак таксама не выпускае з рук вінтоўкі. Можа, цяпера недзе тута, на лузе. Ці вы па дамоўленасці так – спярша з вінтоўкай адзін пройдзе, пасля другі? Спярша паліцэйскі, пасля партызан, няйначай, каб дарогі не скрыжаваць?

Зазыба ад Кузьмовых слоў ажно зарагатаў паглядаючы на Масея, які таксама хаваў усмешку пад ссунутымі брывамі. Пацюпа нават не адразу здолеў што сказаць, хоць па ім відаць было – Кузьма моцна падкалупнуў яго, можа, нават збянтэжыў. Але вось Пацюпа бліснуў чорнымі, як у цыгана, вачамі, у якіх, здавалася, заскакалі помслівыя агеньчыкі, прамовіў:

– Не хвалюйся, дзядзька Кузьма, ваш Жыватоўшчык, як вы яго завеце, дачакаецца свайго, не размінемся. – Прытым у голасе яго, на здзіўленне ўсім, не пачулася аніякай крыўды на старога, нібыта Прыбыткоў сапраўды дамагаўся ад яго менавіта гэтага.

Тады Кузьма яшчэ сказаў:

– Ага, забівай свой свайго, каб чужыя баяліся.

– Нешта я цябе не разумею, таварыш Прыбыткоў – ужо з прыкрасцю паморшчыўся Пацюпа. – Ці ты паліцая шкадуеш, ці…

Кузьма паглядзеў на партызана доўгім, нібы вывучаў позіркам, пашамкаў патрэсканымі губамі, але колькі часу памаўчаў нібы раздумваючы, гаварыць што-небудзь у адказ альбо не. І ўсё-ткі сказаў:

– Што тута разумець? Само зразумела. Пакуль вы будзеце ганяцца адзін за адным, то чужым вольна стане.

– Дык што, Брава-Жыватоўскі, па-твойму, свой?

– А й не чужы. Ён жа не немец.

– Затое здраднік. Гэта яшчэ горш, чым немец.

– Як паглядзець.

– І ты, Дзяніс Яўменавіч, ходзіш з такім чалавекам? – зірнуўшы на Зазыбу, паціснуў плячамі Пацюпа.

– Ну, чалавек гаворыць, як разумее, – павёў брывамі Зазыба: вядома, ён не схільны быў цалкам падзяляць Кузьмовых слоў, аднак і нападаць на старога не думаў – ад яго даводзілася чуць і не гэта.

– Ну, разумець можна адно, а гаварыць трэба як належыць, – чамусьці цішэй, чым звычайна, таму ажно злавесна сказаў Пацюпа. – А то можна і дагаварыцца.

– Ты мяне не палохай, Пацюпа, – таксама ціха, але без Пацюпавай злавеснасці сказаў Прыбыткоў. – Вінтоўкі тваёй я не баюся. Мне ета ўжо не страшна. Бойцеся вы,

маладзейшыя. Вам жыць пасля. Пастраляеце вось так адзін аднаго, пасля і дзеці вашы не разбяруцца, што да чаго. А немцам ета, нябось, на руку.

– Ты за дзяцей таксама не хвалюйся. Калі самі не разбяруцца, то іншыя падкажуць.

– Ета ты мала пажыў, Пацюпа, таму так гаворыш. Варожасць паміж людзей звычайна не канчаецца з вайной. Ета як… Зрэшты, што мне табе гаварыць, раз сам не разумееш. Ета каб была мая ўлада, дак я б пазабіраў у вас етыя вінтоўкі, паламаў да выкінуў у грэблю. А то ваяваць дак вы не захацелі. І ён во бегае тута, й ты. Ваяваць трэба было тама, на фронце. Ваююць жа другія, дак…

– Ну, каму дзе ваяваць, гэта не твая справа, – ужо зусім са злосцю сказаў Пацюпа. – А дзейнічаць тут ты нам не забароніш.

– А я й не думаў рабіць етага, – не спыняўся Кузьма. – Проста к слову прыйшлося.

– Ну, тваё слова… – пакруціў галавой Пацюпа. – Няйначай, бабінавіцкі Адольф пахваліў бы. Але ад мяне пахвалы не дачакаешся. Глядзі толькі, каб яшчэ з кім не загаварыў так.

Пад яго пільным і злым позіркам, які нібыта прашываў наскрозь, Кузьма пераступіў з нагі на нагу, затым уздыхнуў:

– Як кажуць, на першай сустрэчы ды сварлівыя рэчы. Давай-тка мы, Дзянісавіч, – звярнуўся ён да Масея, – пакосім яшчэ. Ато еты Пацюпа… і рады не дасць, і снедаць пашкодзіць. Няхай-тка яны з тваім бацькам тут разбіраюць свае справы. Нябось жа да Зазыбы аднекуль прышкандыбаў?

Масей таксама ўзяўся за касу, якая ўжо была перад сняданкам уторкнута мысам у мяккі лугавы дзірван, – дзіўна, але ў часе размовы, якая пачалася раптам паміж Пацюпам і Кузьмой Прыбытковым, ён чамусьці быў на баку бацькі, які супакойваў Пацюпу, не даваў яму моцна накідвацца на суседа, акурат баяўся, што яна сціхне гэтак жа нечакана, як узнікла; але паступова Кузьмовы словы, ягоная настойлівасць прымусілі Масея зразумець: урэшце ж нехта павінен мець тут разважлівы голас, дарма што скіроўваць даводзілася яго ўсё роўна як у пустэчу.

Тым часам Зазыба з Пацюпам перакінуліся словамі, аб чымсьці ціха дамовіліся, і Зазыба сказаў сыну:

– Мяне, бачыш, клічуць. Касі адзін. І ўчора я табе не пасабіў, і сёння не вельмі каб. Але як прыйдзе з вёскі матка, няхай ужо раскідвае неўзабаве пракосы. Каня нашага я таксама вазьму. Так што…

– Надоўга ты? – спытаў Масей, усё роўна як спрабуючы выклікаць бацьку на большую даверлівасць.

– Яшчэ не ведаю. Паедзем вось у Зацішша. Словам, ты сам знаеш, што рабіць тут.

Масей кіўнуў: маўляў, добра. Тое, што па бацьку прыйшоў сёння Пацюпа, не было нечаканасцю. Але было шкада, што здарылася гэта цяпер, падчас касьбы.

У Анюты быў гатовы сняданак, і яна захвалявалася, калі мужчыны сталі разыходзіцца ад вогнішча. Гукнула наўздагон свёкру:

– Тата, а паесці?

Кузьма не павярнуўся, зрабіў выгляд, што не пачуў. Але Масей вінавата ўсміхнуўся Анюце. Ва ўсім яе абліччы была нейкая разгубленая замілаванасць, якая мела патрэбу ў абароне і ласцы. Масей адзначыў гэта, але таксама падумаў: цяпер, з сённяшняй ночы, яму ў Анюце заўсёды будзе кідацца ў вочы тое, што схавана ад іншых.

Кузьму Прыбыткова ён дагнаў ужо тады, як таму засталося ступіць апошнія дзесяць крокаў, каб уткнуць у траву касу. Дагнаў і здзівіўся, што стары не астыў яшчэ ад спрэчкі з Пацюпам. Відаць, яму моцна зацяло, бо не паспеў Масей слова сказаць, як Кузьма сам пачаў гаварыць:

– Ета яны, дурныя, не ведаюць, як чалавеку бывае страляць адзін у аднаго. Хоць што я кажу – адзін жа ў Махно служыў, сам Жыватоўшчык прызнаваўся недзе, дак, можа, прывык яшчэ тады. А Пацюпа ў энкэвэдэ быў. Калі самому не даводзілася караць, то ўжо, няйначай, нагледзеўся таксама, як іншыя ета рабілі. У нас у васкадроне, калі служыў у царскай арміі, фельфебель шашкай засек мужыка, дак пасля часта сярод ночы прахопліваўся, усё стагнаў ды жагнаўся. А выйшла зусім нечакана, ён, можа, не хацеў етага рабіць. Паслалі нас у адзін маёнтак, на Смаленшчыне, мужыкі тама супроць памешчыка бунтавалі, лес секлі. Дак нас туды й паслалі. Тама ета й здарылася. Мужык той кінуўся з сякерай на яго, а яму, фельфебелю, нічога не заставалася, як шашкай у адказ. Думаеш, за суседа слова кідаў? У газетцы нашай, раённай, пісалі, дак таксама шашкай свой вордзен зарабіў. Герой. Ну дак тады, у грамадзянскую, адно было, яно й праўда – за волю нібыта людзі адзін на аднаго ішлі, за зямлю біліся, за… чортведама яшчэ за што за якое. А цяпера? За што цяпера? Нехта за тое, каб адпомсціць савецкай уладзе ды немцам памагчы, а другі, каб таго ж немца сапраўды перамагчы. А як па мне, то няхай прападае ён пропадам, еты немец, каб за яго яшчэ кроў сваю праліваць. Гэта такія, як Пацюпа, думаюць, што ета вайна такая ў нас тута – пабралі ў рукі вінтоўкі ды й палохаюць вясковец вяскоўца. Не, вайна яшчэ і ў нас сябе пакажа, яшчэ ўбачаць яе твар, ета пакуль немцы да канца не разглядзелі, што да чаго. Можа, нават чакалі етага свайго наступлення на поўдні. Непарадку яны ў сваім тыле не дапусцяць. У кожным разе, паспрабуюць не дапусціць. Перастануць нарэшце заклікаць – парцізаны, выходзьце з лесу, кідайце зброю, усё вам даруецца… Не, вайну добра чуць, але цяжка бачыць. Яна грашамі корміцца, затое весяліцца крывёй. І часта крывёю не тых, хто вінаваты ў ёй.

VII

Зацішша, куды паехалі Зазыба з Пацюпам, уяўляла сабой невялікі пасёлак, што ўваходзіў да вайны ў Верамейкаўскі сельсавет, але сяляне жылі там сваім калгасам. Найбольш сярод іх былі дваровыя людзі, што працавалі раней на мясцовага пана; адразу пасля рэвалюцыі яны кінуліся былі ў камуну, але ненадоўга – з камунай у іх нічога не выйшла, таму падзялілі зямлю і жылі колькі гадоў аднаасобна, пакуль не заварушыліся ў наваколлі з калгасамі.

Ад Бесядзі туды было кіламетры два, не болей, увесь час лесам, і Зазыба на Цімохавай пожні пагнаў каня наўскач; калёсы на каранях, што выпіналіся на дарогу, заляскалі, затарахцелі, дарма што сядзелі на іх два чалавекі і штосьці важылі.

З галавы ў Зазыбы не выходзіла размова, што ўзнікла на лузе паміж Пацюпам і Кузьмой Прыбытковым, ён цяпер нібыта дадумваў яе. Тады Зазыба прамаўчаў, кінуў адно слова, жадаючы прытушыць спрэчку, але голасу яго не хапіла, можа, таму, што кожны з іх успрыняў Зазыбаву спробу ўмяшацца па-свойму. Што да Кузьмы, то стары, няйначай, палічыў яе за падтрымку. А вось Пацюпа… Пацюпа, здавалася, яшчэ і цяпер сядзеў надзьмуты, нездарма ж маўчаў, хоць, з аднаго боку, размаўляць пры шуме калёс таксама не было як. Раней – калі пачалася акупацыя – Зазыба абмяркоўваў усё важнае з Парфёнам Вяршковым. Ва ўсялякім разе, Парфёнава думка заўсёды была для яго карыснай, без яе нібыта не хапала ўвогуле закончанасці ўсім думкам, бо жыццё падкідвала матэрыял для разваг часта. Іншая справа – Кузьма. Гэта быў чалавек другога складу. І думкі яго звычайна не сягалі далей сённяшняга дня, здавалася, іх хапала толькі каб следаваць за падзеямі, якія адбываліся цяпер, у гэтую хвіліну. Ды і мяняліся яны хутка, прынамсі, абы паварочвалася для гэтага новым бокам жыццё. Але адмовіць у разважлівасці Кузьме таксама нельга было, дарма што часам стары спрабаваў у размове стаць над жыццём, над тым, што ўжо зрабілася яваю. Вось і сёння гэта выявілася выразна – хто ж цяпер знойдзецца, каб прымірыць партызана Пацюпу з паліцаем Брава-Жыватоўскім?.. Не, тут ужо кожны пойдзе да канца. Хіба што Брава-Жыватоўскі раптам спахопіцца. Але ж такіх, як Брава-Жыватоўскі, знайшлося ўжо нямала: у Бабінавічах на двух немцаў ажно паўсотня паліцэйскіх, мясцовых ці прышлых, што па розных прычынах апынуліся ў тутэйшых вёсках! Дзіўна, але, разважаючы так, Зазыба раптам, нават нібыта без усялякай прычыны, ад Пацюпы з Прыбытковым перакінуўся думкамі ў грамадзянскую вайну, калі сам ваяваў, чамусьці ўспомніў свайго баявога сябрука, Даўгалёва, дарэчы, нечым падобнага на Пацюпу; такога ж смуглага і зацятага, з хуткімі, усё роўна як калючымі, вачамі – перад атакай той заўсёды крычаў: «Агнём і шашкай, а попел конскімі хвастамі падмяцём!»

Даўгалёў быў з Мокрага, гэта зусім недалёка ад Верамеек, адно перайсці на той бок Гразівец. Загінуў Даўгалёў яшчэ на пачатку вайны, недзе пад Жытомірам. Але Зазыба запомніў з таго часу, як яны хадзілі з Унечы дамоў. Цяпер цяжка сказаць, хто прыдумаў гэтае падарожжа першы, аднак выбраць прычыну ды пайсці з ёй у штаб да Шчорса, каб адпусціў з палка, дапамог ім адзін хахол, які пачуў ад кагосьці пра іхні намер. Той хахол і гаварыў пра іх са Шчорсам. Праўда, ні Зазыба, ні Даўгалёў так і не

даведаліся дакладна ад яго, пра што ў іх ішла гаворка. Ды гэта і не надта цікавіла тады. Галоўнае, што яны раптам атрымалі звальненне на тры дні, маглі разлічваць на іх. Але ні да Мокрага, ні да Верамеек дайсці не ўдалося. Даўгалёў быў хлопцам, не тое што Зазыба, у якога ў Верамейках жыла сям'я. Гэтая акалічнасць якраз і стала прычынай, што затрымала іх у дарозе. Яшчэ задоўга да Мокрага пачаў Даўгалёў захаджваць у сустрэчных вёсках да знаёмых, а тыя частаваць… Так яны частаваліся ўсе тры дні, якія належалі ім, і Зазыба не мог ні адчапіцца ад Даўгалёва, каб пайсці аднаму ў Верамейкі, ні выцягнуць таго з гасцей… На трэці дзень давялося павярнуць назад, злашча што далёка ад Унечы не ўдалося адысці. Бадай, то быў самы недарэчны і ў нечым па добрым часе смешны выпадак у Зазыбавым жыцці, але ў галаву цяпер ён з'явіўся не таму. Амаль вось пра тое, аб чым спрачаліся на лузе Кузьма Прыбыткоў з Хведарам Пацюпам, гаварыў маладому і захмялеламу Зазыбу ў Душаціне адзін стары чалавек, вобліку яго Дзяніс Яўменавіч чамусьці ніколі не помніў. Праўда, не акурат пра тое. Але тым не менш – прывід грамадзянскай вайны некаторых людзей палохаў ужо… У жыцці шмат што паўтараецца, няхай хоць і недакладна.

Ці не адразу за Цімохавай пожняй пачаліся пяскі на дарозе, але буланы Зазыбаў конь колькі часу яшчэ спрабаваў бегчы з ранейшай лёгкасцю, затое ўжо збіваўся з нагі, пакрываўся потам.

Сонца свяціла з таго боку, дзе сядзеў Зазыба. Як паволі пачынаўся дзень, так хутка ўбіраўся цяпер у сілу.

Сасновы лес, што не адступаўся ад самай пожні, быў з падсочкай. Сонца паспела растапіць смалу ў бляшаных лейках, і яна моцна пахла.

– Гэта ў вас, у верамейкаўцаў, апошні луг? – у пацішэлым лесе спытаў нарэшце Пацюпа.

– За Папоўкай таксама гектараў сорак ёсць, – з ахвотай адказаў Зазыба. – Таго яшчэ не пачыналі.

– Ая вось думаю, што самому б трэба… Жонка адна там недзе спраўляецца.

– Ды ўжо ж…

– А трава сёлета добрая, можна было б накасіць.

– І няма каму памагчы?

– Дзеці малыя, а я от партызаню… – Пацюпа памаўчаў, тады зноў загаварыў: – А сын твой, што ж?

– Таксама косіць.

– Бачу, што косіць.

– Дык…

– Ён жа нібыгга сядзеў дасюль?

– Ну, калі гэта было!

– А цяпер?

– А цяпер от косіць.

– А маладзіца гэта, што каля вогнішча, нявестка твая?

– Чаму раптам нявестка?

– Маладая, прыгожая. Дык чыя яшчэ, калі не твая?

– Якраз і не мая. Гэта – Кузьмова. Меншага сына яго, што на фронце недзе.

– Бач ты! А не падобна на вясковую, быццам і праўда гарадская. Ну, я і падумаў – твайму якраз пара.

– Лёгка ў цябе, Пацюпа, усё атрымліваецца. Глянуў і адразу сцяміў. А я от з імі жыву, кожнага дня бачу абаіх, а падабраць пару з іх не даўмеўся. Вось ужо праўду кажуць – сілы няма, а ў вочы лезе.

– Ды што тут сіла! Але ладна – кінулася так у вочы. Ды і яны нешта ж адно на аднаго, нібыта свае, пазіралі. Ну я і падумаў. А ў гэтага старога сапраўды сын у Чырвонай Арміі?

– І не адзін. Старэйшы таксама ваюе, калі, канешне, жывы. Ды і пра малодшага таксама нічога невядома.

– А што ж сам ён? Плявузгае абы-што. Нібыта сыноў ужо не чакае – ні за парцізан не стаіць, ні…

– Стары чалавек, што з яго ўзяць. Цяпер калі б кожнага паслухаў, дык галава ўспухла б, бо душа ў людзей пухіры пускае. А тут яшчэ ўчора гэтыя лістоўкі. Ці ўзяў жа ты з сабой хоць адну, каб у атрадзе паказаць?

– Няўжо думаеш, што ў атрадзе дасюль не бачылі іх?

– І то праўда. А пра Кузьму дык ты не надта. Чалавек думае, што благі мір лепей за добрую бойку.

– Які мір? Хто пра гэта думае? Усё роўна перамога будзе за намі!

– Дык і Кузьма, няйначай, на гэта спадзяецца. Але ж тут, у нас… Раней ён меў клопат, каб ужыцца ў новы лад. Цяпер у яго, бачыш, іншае наўме – каб мы адзін аднаго дужа не пабілі. Ну а заўтра ці пазаўтра стане гаварыць і зусім па-другому, як я разумею, дык думкі яго не ад яго залежаць. Яны – вынік таго, што вакол робіцца. Ну а лёгкія яны цяпер не могуць быць. У вайну чалавек увогуле многа думае. Гэта ў радасці пяе ды весяліцца. А ў горы найбольш думае. І не кожны свае думкі хавае. І не кожнаму яны падабаюцца. Таму і Кузьма плявузгае, як ты кажаш.

– Ну так, ён сее, а ты падсяваеш.

– Ты, Пацюпа, чым далей, тым горай. Пры чым тут я? Ды і на Кузьму ты дарэмна злуешся. Яно ж сапраўды так – першая сварка заўсёды лепей за апошнюю.

– Ага, вас паслухаеш…

– Як ты не разумееш? Кузьма – звычайны чалавек, са сваімі выдумкамі, са сваімі забабонамі. Пра такіх кажуць: ходзіць жабраком, а есць з перцам. Так што… Ты лепей скажы мне, ці доўга фашысты тон будуць задаваць у вайне?

– Накапілі сілы, вось і задаюць.

– Нашы мужыкі кажуць, што да зімы іх цяпер не скінуць.

– Няйначай, Прыбыткоў таксама выдумляе?

– Ёсць жа і іншыя людзі ў вёсцы.

– Куды ім да яго!

– Але, бачу, моцна ён цябе даняў?

– Пабачым. Урэшце, я ддя цябе не аўтарытэт. Пагавары пра вайну з Нарчуком. Ён – камандзір, яму відней. Ды і прыяцель твой. Хоць… таксама іншы раз меле не падсяваючы.

– Вось ужо праўду гавораць, што за маўчанне хутчэй гасцінца дадуць. Дык і ты…

На выездзе з лесу стаяў партызанскі вартавы, якраз каля межавога капца, дзе разыходзіліся землі лясніцтва і калгасныя. Зазыба быў здзіўлены вартавому, але ж адным часам нібыта і ўсцешаны. Пацюпа саскочыў з калёс, схадзіў да вартавога, аб нечым параіўся.

– Ну што? – спытаў Дзяніс Яўменавіч.

– Як і было дамоўлена, – з выразнай здаволенасцю адказаў Пацюпа. – Адразу паварочвай да лясніцтва.

Будынак лясніцтва стаяў на краі пасёлка, паміж лесам і калгасным садам, які па схіле спускаўся да рэчкі. У Зацішшы таксама цякла Машоўка, яна і ўпадала тут, за паўвярсты ад лясніцтва, у Бесядзь. Але Нарчука ў будынку лясніцтва не аказалася. Партызаны, што тоўпіліся на двары, сказалі, што Мітрафан Ануфрыевіч пайшоў кудысьці на смалзавод, які знаходзіўся на другім канцы пасёлка, каля дарогі ў Кавычачы. Затое на двары з партызанамі Дзяніс Яўменавіч убачыў Радзівона Чубара. Той таксама адразу ўбачыў Зазыбу, падышоў да былога свайго намесніка па калгасу, святлей, чым звычайна, паглядзеў, затым не стрымаўся, падступіўся да буланага і, як даўняга знаёмага, з радасцю паляпаў рукой па грыве.

– У цябе гэты? – глянуў Чубар з той жа радасцю на Зазыбу.

– Хіба ж ты ўсіх нашых коней помніш? – усміхнуўся Зазыба.

– А што? Гэта калі-і-сьці было, што нібыта не помніў. А цяпер вось пазна-а-аў буланага. Як гэта яго яшчэ верамейкаўцы звалі?

– Ды так, здаецца, як і ёсць – буланым.

– Не-е-е, – засмяяўся Чубар і замахаў рукой, – гэта ты, Дзяніс Яўменавіч, сам не ведаеш! Была нейкая назва. Вось толькі забыў. Але ты, як вернешся ў Верамейкі, пацікаўся. Мне ажно карцець будзе, ці праўду я кажу. Была ўсё-ткі назва і ў гэтага, была. – Ён зноў ласкава паляпаў па карку буланага, але спытаў пра іншае: – Значыць, учора пераехалі на гэты луг касіць, да Бесядзі?

– Ага, сухадолы пакасілі. Учора падзялілі на палосы за Топкай гарой.

– Ну і як?

– Што як?

– Ну-у-у…

– Травастой багаты. Як улепшыя гады. Але касіць не надта ёсць каму.

– Канешне, мужыкоў цяпер у вёсцы мала, а ўдовы ды салдаткі…

– От і памаглі б. Высыпалі б з лесу на луг ды… Косы ж у запасе ў кожным двары ёсць.

– Ты пра гэта скажы, Дзяніс Яўменавіч, камісару. Гэта яго парафія.

– Чым лынды біць, то лепей сапраўды наняцца пожню касіць.

– Але пра лынды ты не кажы, а то незалюбяць, асабліва пры Нарчуку. Ты проста гавары – трэба памагчы верамейкаўскім бабам, ну а я як былы старшыня калгаса быццам неўпрыкмет, падтакну, пахвалю.

Зазыба пасмяяўся з Чубаравых слоў, кіўнуў галавой, што, маўляў, так ён, урэшце, і зробіць, тады супакоіўся, спытаў:

– Не ведаеш, навошта я спатрэбіўся?

– Ведаць-то я ведаю, – наморшчыў Чубар лоб, – але дачакайся камандзіра. Яму па пасадзе належыць пра гэта гаварыць. Скажу толькі, паедзем мы з табой і нас чакае далёкая дарога.

– Што значыць далёкая?

– Ну, гэта так, дзеля прыгожага слоўца. Не такая яна ўжо і далёкая. Хоць, з другога боку, таксама як паглядзець. Цяпер нават кароткія дарогі зрабіліся доўгімі, бо небяспечна на іх стала.

– Не, што б адразу пра ўсё сказаць, дык… А дзе ж камісар?

– Яго з учарашняга дня ў атрадзе няма. Падаліся кудысьці з Паўлам Чарнагузавым. Сам ведаеш, хоць атрад пакуль і не вельмі, але не кожнаму трэба знаць, хто ды куды накіроўваецца. Ты лепей раскажы, што новага ў Верамейках нашых?

– Дык… што новага? Калі кожнага дня там жывеш, дык, здаецца, і навін не ведаеш, нават калі яны і ёсць. Жывуць людзі, працуюць.

– А Брава-Жыватоўскі не надта назаляе?

– Ён жа не дурны, ведае, што партызаны блізка. Але дома, кажуць, не начуе.

– Дзіва што. А старастам – Раман Сёмачкін?

– Ён.

– Чаму ж ты не стаў?

– А навошта гэта мне?

– Трэба ж, каб свой чалавек быў.

– Дык і ён не чужы.

– Не чужы, але ж і чужы. Чорт яго ведае, што ён думае і што носіць у сабе.

– Але ж калі б я ў Верамейках старастам стаў, то першаму табе гэта не спадабалася б.

– Ну, спярша, можа б, і не спадабалася, але потым зразумеў бы.

– Не так усё проста, як здаецца. Некалі мы з Касьянам Манько доўга размаўлялі пра гэта. Ён мяне якраз агітаваў зрабіцца старастам у вёсцы. Але разумеў, што гэта няпроста. У яго тады многа планаў розных было. Хацеў усё паставіць у раёне так, каб гаспадары мы тут былі і ў акупацыю. Аднак бачыш, што на справе выйшла. І сам не ўбярогся. Думаеш, сапраўды загінуў?

– Відаць, так. Вярнуўся пасля пабегу з Крутагор’я да сябе ў вёску, і там хтосьці яго выдаў. Людзі бачылі, як яго забіралі немцы, а вось што з ім зрабілі, ніхто не ведае. І мёртвага ніхто не бачыў усё роўна як канцы ў ваду. Немцы гэта ўмеюць рабіць. Відаць, нейкі ў іх быў разлік стварыць вакол яго тайну. Вось і стварылі.

Памаўчалі, тады Зазыба спытаў:

– Ці працуе ж зараз смалзавод?

– Не, – адказаў Чубар. – Але ёсць звесткі, што немцы надумалі аднавіць работу. У Бялынкавічах пусцілі ўжо. Цяпер збіраюцца гэты пусціць. Толькі не паспеюць. Сёння яго будуць узрываць. Таму Нарчук і пайшоў туды з хлопцамі.

Зазыба падумаў, што Нарчук прыйдзе ў лясніцтва, няйначай пасля таго, як справіцца з узрывам смалзавода. Але той вярнуўся раней.

– Вось што, Дзяніс Яўменавіч, – сказаў ён, выціраючы рукой узмакрэлую галаву, – стала вядома, што за Канічамі, у Жалезніцы – гэта лес так называецца, помніш? – схавана раённая друкарня. Не ўся, аднак шрыфт і друкарскі станок там ёсць. Можа, і папера. Таму вам з Чубарам трэба ехаць туды, забраць усё, што маецца ў схованцы, і прывезці ў атрад. У Бялынкавічах вы знойдзеце мясцовага настаўніка Мурача. Ты, Зазыба, здаецца, ведаеш яго. Помніш, ён яшчэ ў Кулігаеўцы на нарадзе вясной быў?

– Так, я яго ведаю.

– Дык Мурач вам пакажа, дзе схавана друкарня.

– З ім дамоўлена?

– Так, але нават калі і не заспееце яго ў Бялынкавічах, то ўсё роўна трэба знайсці, дзе б ён ні быў. Такое вось вам заданне, таварышы, на сённяшні дзень. Ды і на заўтрашні. Словам, як паспееце. А друкарня нам цяпер вельмі патрэбна. З ёй у нас справы пойдуць весялейшыя. І вось што яшчэ, Дзяніс Яўменавіч, нам спатрэбіцца твой сын. Чалавек пісьменны. Значыць, павінен таксама заняцца справай. Спадзяюся, не стане адмаўляцца? – І, не чакаючы адказу, зноў спытаў: – Дарэчы, дзе ён цяпер?

– На лузе, сена косіць.

– Таксама па цяперашнім часе не лішні занятак для паэта, – усміхнуўся Нарчук. – Але з ім гаворка будзе пасля, калі прывяжаце друкарню. Ну, збірайцеся ў дарогу, таварышы. Глядзіце там, каб усё было добра. Чубар паедзе са зброяй, а ты, Зазыба? Можа, і табе выдаць вінтоўку? Нябось, не забыў, як страляць?

– Забыць не забыў, – расплыўся Зазыба ва ўсмешцы, – але, бадай, не трэба. Абыдземся адной вінтоўкай. Як, Радзівон Антонавіч?

– Калі давяраешся мне?..

– Значыць, дамовіцеся, – сказаў Нарчук. – Едзьце.

Зазыба завярнуў каня за аброць на двары лясніцтва, вывеў на дарогу, якая тут жа схілілася пад горку, таму Дзяніс Яўменавіч з Чубарам адразу селі побач на калёсы, звесіўшы ногі. Спёка ўжо стаяла моцная, здавалася, усё нікла ад яе навокал, нават пад вербамі, якія кідалі на дарогу цені, цяжка было прадыхнуць паветра. Але за мостам, што павісаў над плацінай, за якой стаяў млын, неўзабаве пачаўся лес. Гэты лес цягнуўся адсюль ажно да Калодліва, той вёскі, што знаходзілася на палавіне шляху паміж Зацішшам і Бялынкавічамі. Да яе было кіламетраў сем, і гэтыя сем кіламетраў належала цяпер праехаць Зазыбу з Чубарам у гарачы час. Праўда, к дарозе наперадзе двойчы зусім блізка падступалася Бесядзь, але гэтая акалічнасць мала што мяняла. Зрэшты, гнаць каня таксама не мела сэнсу.

– Паспеем, – сказаў Чубар, і Дзяніс Яўменавіч адпусціў лейцы.

Кажуць, хатняя дума ў дарогу не гадзіцца. Але якраз з яе Зазыба і пачаў успомніўшы, што не схадзіў учора ўранку да старога Цітка, які па гадах сваіх ужо сапраўды, без старэчага прытворства, няздатны быў на цяжкую працу, таму праседжваў цёплыя дні на прызбе, дык гэты Ціток чагосьці хацеў ад Зазыбы, таму прысылаў у завулак да іх сваю Цітчыху, і тая прасіла Дзяніса Яўменавіча абавязкова заглянуць да іх; Зазыба паабяцаў тады, аднак ранішнія турботы, звязаныя з паездкай на луг, начыста выбілі з галавы гэты клопат, дарма што пасля, ужо на лузе, калі мералі сенажаць на палосы, зноў успомніў. Думалася, што сёння якраз і будзе час, каб наведацца ў вёску, бо на колькі тае паласы ім холіць удваіх з Масеем? Але нечаканы выклік у Зацішша перайначыў планы. І паласа засталася на аднаго Масея, і ў вёску Зазыба не паспяваў. Пра гэта вось Дзяніс Яўменавіч чамусьці ўзяў ды сказаў цяпер Чубару, нібытаўзнікла неадольная патрэба павініцца перад жывым, няхай хоць і староннім чалавекам.

– Значыць, Ціток яшчэ жывы? – перапытаў Чубар, але так, акурат узрадаваўся гэтаму.

– Жывы, – адказаў Дзяніс Яўменавіч. – А от Парфён Вяршкоў памёр.

Відаць было, што гэтая навіна ўразіла Чубара, колькі часу ён маўчаў, тады спытаў:

– Ну а Мікіта Драніца, што той?

– Усё рвецца сустрэцца з табой, але дружбу нібыта водзіць з паліцаем і старастам.

Чубар засмяяўся, сказаў:

– Якая ў яго дружба! Кідаецца чалавек, бо, мусіць, не ведае, да якога берага прыстаць. Урэшце, ён заўсёды такі быў, да начальства ліпнуў. Але, кажаш, рвецца сустрэцца? А ты звядзі нас як-небудзь.

– І што ты будзеш мець з гэтага?

– Проста цікава паглядзець.

– Хіба што. Ну а сам чаго не прыходзіш у вёску?

– Дык…

Зазыба павярнуў галаву, глянуў на Чубара.

– Але ты змяніўся, Радзівон, – сказаў ён праз момант з усмешкай. – І твар твой нібыта памякчэў з выгляду, і сам увесь, здаецца, перамяніўся. Я гэта прыкмеціў яшчэ там, каля лясніцтва.

– Гэта таму, што мы даўно не бачыліся, таму так і здаецца табе, Дзяніс Яўменавіч. Проста ўзрадаваўся табе. А ўрэшце, можа, ты і маеш рацыю, можа, і сапраўды змяніўся я. Не чалавек гоніць жыццё перад сабой, а час падганяе яго. Я і сам іншы раз адчуваю ў сабе штосьці новае ды ўсё роўна як баюся прызнацца. Толькі нікуды не дзенешся, прызнавацца прыходзіцца. Вось тады і пачынаеш разумець, што жыццё ў цябе дасюль было нейкае… нібыта крадзенае. Сям’і не завёў, дома свайго не маю. Вось, выходзіць, што ўсё сваё нашу з сабой. Раней неяк гэта не заўважалася, адно пёрся напралом, здавалася, усё яшчэ наперадзе. А на паверку выйшла не так. Асабліва гэта робіцца зразумелым, калі пачнеш усведамляць, што наперадзе цяпер,

акрамя кулі, у цябе нічога няма. Вядома, не кожная куля твая, можа, нават яшчэ не адліта на заводзе, можа, нават і зусім не будзе адліта, але тым не менш, ужо незалежна ад гэтага, заўсёды жывеш з такім адчуваннем, што ідзеш увесь час насустрач смерці. Жыў ці не жыў, а памірай, чалавек.

– Увогуле – так, – кіўнуў Зазыба.

– А з другога боку, была б сям'я… Таксама радасці не багата меў бы. Я па сваіх бачу. І ў Нарчука сям'я ў Крутагор'і, і ў Чарнагузава, і ў Афончанкі… Ці ж ім лёгка цяпер? Планавалі вывесці іх з горада, але немцы таксама не дурні, вачэй з іх не спускаюць. Вось і жывуць усё яшчэ там, заложнікамі. А тут ваяваць трэба. І невядома, чым усё гэта скончыцца.

– Мне адзін чалавек гаварыў нядаўна, ды што нядаўна, яшчэ ўчора, што скандзілаўцы якраз таму і не хочуць злучаць байцоў у адзін атрад, кажуць, нібыта знаходжанне партызанскіх сем'яў у горадзе будзе скоўваць ініцыятыву, перашкаджаць дзейнічаць атраду.

– Ну, ці мала якую прычыну яны маюць на ўвазе? Але выключаць падобную магчымасць таксама не даводзіцца. Хоць сам я думаю іначай. Проста скандзілаўцы не хочуць страціць самастойнасць, бо з ёй звязана шмат што, а галоўнае – хочаш, ваюй па-сур'ёзнаму, а хочаш так сабе, ацірайся па лясах ды вёсках. Дарэчы, многія ў тую восень амаль гэтак і рабілі. Толькі падзеі пад Масквой прымусілі некаторых спахапіцца. Ну а Скандзілаў дык, відаць, і проста не рашаецца апынуцца ў падпарадкаванні ў Нарчука, маўляў, свой атрад стварыў, а тут, аказваецца, нібыта і ні пры чым. Яму нашы прапанавалі стаць начальнікам штаба аб'яднанага атрада. Пакуль не згадзіўся. Вось і стаім паасобку – яны ў Батаеўскіх лясах, мы тут. А ўвогуле, як мне здаецца, яшчэ не настаў час злучацца. Тут, як і ў кожнай новай справе, трэба, каб само жыццё, самі падзеі падказалі правільнае рашэнне. А вось ці будуць перашкаджаць сем'і дзейнічаць атраду?.. Увогуле, гэта на тэрыторыі тылу, як гавораць немцы, праблема з праблем. Яна будзе закранаць перш за ўсё сапраўды мясцовых. Над іхнімі сем'ямі, сваякамі заўсёды стане вісець пагроза. Думаеш, Пацюпу не боязна за сваіх дзяцей? Канечне, боязна. Лягчэй за ўсё быць у партызанах прышлым, увогуле – не тутэйшым. Я гэта адчуў, трапіўшы ўвосень у маскоўскі атрад, – ніякі пабочны цяжар нікога не ціснуў, нішто не блыталася пад нагамі, нішто не скоўвала. Ім нават боезапасы, часам харчы, скідвалі з самалёта, што прылятаў з-за лініі фронту. А наш атрад – мясцовы. У нас усё іначай: сам думай, сам дзейнічай, сам і жыві, як здолееш.

– Але ж ці ўсе разумеюць гэта?

– У нас?

– Хоць бы і ў вас. Пацюпа, бачу, ходзіць бадзёра, на ўвесь рост, не тоіцца?

– Дык хіба ж ён сутуліцца павінен, плакацца? Па вінаватаму выгляду не заўсёды ўгадваецца душа. А тым болей па бадзёраму. У яе заглянуць трэба. Тады, можа, хоць збольшага зразумееш. Вайна, Зазыба, шмат што перайначыла.

– Твая праўда, мутнай стала вада ў аблоцах.

– Ды і не чыстай. Кажаш, Пацюпа? А вось мне ён не адзін раз скардзіўся на сваю долю. А што да таго, ці да канца ён усведамляе сваё становішча?.. Дык у нашай справе да канца прадбачыць усё немагчыма. Таксама як пры пажары. Асабліва на балоце, калі торф загараецца. Нябось, сам назіраў?

– З гэтым я згодны, Радзівон. Гэта калі б пажар сам падпальваў, а так… Ты правільна кажаш. Цяпер многія за розум пачынаюць хапацца. Узяць хоць бы гэтае цяперашняе наступленне нямецкае. Пасля Масквы мужыкі былі акрыялі духам, а ўчора, пасля лістовак… зноў захісталіся.

– Не вераць, што наша армія вытрымае?

– Не тое што не вераць, а, можна сказаць, усё роўна як сумнявацца пачынаюць. У нас учора ды і сёння на лузе ўсялякія размовы адбываюцца. Ажно цікава паслухаць. Пацюпа таксама быў з Кузьмой Прыбытковым счапіўся. Пасля і мне ад Пацюпы дасталося.

– За што?

– А за тое, што маўчаў пры іхняй сварцы. Ды і Кузьма гэты, скажу табе, філосафам раптам стаў. Раней за ім гэтага не заўважалася. Ты ж помніш?

– Раней за ўсімі многага не назіралася.

– А ты ў радавых ходзіш, Радзівон?

– Ды яшчэ не было асабліва кім камандаваць. Атрад невялікі. Камандзіраў хапае. Ды і не рвуся надта. Праўда, калі вяртаўся сюды ад лініі фронту ў мінулую восень, то думаў стварыць свой атрад. Без гэтага не ўяўляў сваю дзейнасць. Але потым усё павярнулася не так. Спачатку ў спецатрад да Карханава трапіў, дарэчы, ён у сапраўднасці іншае прозвішча мае – Мядзведзеў, пасля да Нарчука прыбіўся. Ды і колькі гэтых атрадаў патрэбна тут? Даволі аднаго моцнага. А вось камендантам у Верамейкі магу прыйсці. Нашы цяпер носяцца з ідэяй стварыць у кожнай вялікай вёсцы партызанскія камендатуры, каб выгнаць адтуль бургамістраў і паліцэйскіх, аднавіць савецкую ўладу з поўным яе функцыянаваннем.

– А немцы?

– Па-першае, у іх ніхто не стане пытаць, а па-другое, будзем абараняцца.

– Лёгка сказаць.

– Не толькі ж зімаваць ды летаваць мы тут, на акупіраванай тэрыторыі, засталіся.

– Гэта так. З камендатурамі ў вёсках, бадай, правільна зробіце. Сапраўды, немцаў ды паліцаяў трэба павыганяць з вёсак, каб і блізка не смярдзела ўсялякая поскудзь, а яна ж не толькі смярдзіць, але і дзейнічае. А вось што да вялікіх ці малых партызанскіх атрадаў, якімі ім быць, тут больш складана. Я са свайго вопыту скажу. Некалі, у грамадзянскую, Шчорсаў атрад таксама лічыўся партызанскім. Праўда, тады ўмовы іншыя былі. Усё не так, як цяпер, было. Але Шчорс малыя атрады аб’ядноўваў Пасля дывізію з тых атрадаў меў. І гэта было правільна, бо правільнасць баявая практыка паказала. Прыйдзе час, і вы са скандзілаўцамі аб’яднаецеся. А там і яшчэ хто-небудзь захоча далучыцца. Ну а наконт таго, каму начальнікам быць над кім, з гэтым таксама разбярацеся. Галоўнае, каб фронт утрымаўся. Ад гэтага будзе ўсё

залежаць. Дарэчы, у тым ліку і паводзіны акупантаў. Пасля ж таго, што здарылася пад Масквой, сядзелі амаль усю зіму ў гарнізонах, быццам гніды прышчаміўшы.

Цяпер, няйначай, трэба чакаць і тут іхняй актыўнасці, раз на фронце поспехі намеціліся.

Кажуць, разумны таварыш – палавіна дарогі.

Здаецца, за ўвесь час, як яны ведалі адзін аднаго, а час гэты вымяраўся гадамі, Зазыба першы раз вось так мірна, з вялікай цікавасцю і спакоем размаўляў з Чубарам. Узяць хоць бы даваенныя гады, ды і пасля, пры апошняй сустрэчы, што адбылася ў Мамонаўцы, у Гапкі Азаравай, – усё неяк не ладзілася ў іх, атрымлівалася, быццам абодва адно толькі рабілі, што не згаджаліся паміж сабой, больш таго, Чубараў максімалізм нават палохаў Зазыбу. Мала паразумеліся яны таксама зімой, як Чубар прыходзіў у Верамейкі з Батаеўскіх лясоў ад Карханава-Мядзведзева. Праўда, да канца Дзяніс Яўменавіч так і не дазнаўся, чаму крутагорскія партызаны не прымалі ўдзелу ў нападзенні на Хоцімск. Цяпер быўдобры выпадак спытацца. І ён не прамінуў выкарыстаць магчымасць.

– Што я хачу спытаць у цябе, Радзівон Антонавіч, – сказаў Зазыба, – здаецца ж, нашы тады, зімой, не пайшлі з табой да Карханава?

– Не, – адказаў Чубар, – паабяцалі, што неўзабаве збяруцца і прыйдуць, але масквічы не дачакаліся іх. Раённы цэнтр давялося Карханаву браць без іх. Праўда, мясцовыя партызаны, хоцімскія, таксама дапамагалі, а вось нашы, крутагорскія, не прыйшлі. Пасля ўжо, калі я зноў апынуўся тут, у Шурышчы, Нарчук тлумачыў, што ў саміх былі нейкія неадкладныя справы тут, таму і не паспелі далучыцца да аперацыі, але наўрад ці так. Мне ад Карханава дасталося. Я і праўда паверыў Нарчуку, заспяшаўся назад, каб далажыць, што крутагорцы далі слова быць неўзабаве, а яны падвялі.

– Чаму ты не застаўся ў такім разе з Карханавым?

– Дзмітрый Мікалаевіч параіў мне быць на акупіраванай тэрыторыі. Пасля бою ў Хоцімску атрад зноў рушыў да лініі фронту, ну а мне ён сказаў, каб я далучаўся да мясцовых партызан, палічыў, што тут ад мяне карысці будзе болей. Падумаў я спярша, каб застацца з хоцімскімі таварышамі, але падаўся сюды, бліжэй да Верамеек. Хоць, канечне, сказаць лёгка, дзе ад каго карысці больш бывае – на фронце ці ў партызанах. Цяжэй зважыць тую карысць. Некалі я сустрэў далёка адсюль камісара аднаго вялікага, вайсковага. Дык той таксама агітаваў мяне вяртацца дамоў, вось гэтую вінтоўку даў за таго часу і нашу яе.

– У цябе ж і раней вінтоўка была?

– Тую я здаў як выйшаў за лінію фронту. Дык камісар той цікавыя рэчы расказваў нібыта партызаніў яшчэ ў грамадзянскую, але, мусіць, на Далёкім Усходзе, я так з яго слоў зразумеў. Казаў што нават штосьці пісаў да вайны ў Генеральны штаб аб партызанскай барацьбе на акупіраванай тэрыторыі: як яе весці, якую тактыку выбіраць. Але сутнасць усёй размовы, якую вёў са мной, заключалася ў адным – кожны ўзброены чалавек павінен забіць у гэтай вайне свайго немца, ці то баец ваюе

на фронце, ці то ў партызанах. Маўляў немцам жа таксама лік ёсць. Дык вось, я свой рахунак пачаў абавязак свой нібыта ўжо выканаў можна і адпачыць. Скажу па тайне, Зазыба, нешта не падабаецца мне заставацца ў Нарчука…

– Чаму так?

– Цяжка сказаць, але абстаноўка ў ягоным атрадзе нейкая… ну, як бы табе давесці – спёртая, ці што. Паветра часам бывае такое, не прадыхнуць. Гарадскія неяк па сабе, а нам, вясковым, не заўсёды ўсё кажуць.

– Тады дрэнна.

– Але гэта толькі табе кажу. Крый бог, да Нарчуковых вушэй дойдзе.

– Не клапаціся. Праз мяне такое не здарыцца. Аднак ты вось сказаў пра свайго немца. Я ўжо не пытаюся, дзе гэта здарылася і як было. Сам на вайне быў і сам страляў. Ну а за таго, хто не паспеў, хто загінуў раней часу, можа, не стрэліўшы ні разу, на вайне падобнае скрозь бывае, хто за таго застрэліць немца?

– Значыць, аднаго мала?

Бесядзь у гэтым месцы, дзе яны ехалі, падступала ўпрытык да лесу, і дарога пайшла паўз стромы бераг, які нагадваў насыпаны вал. Такі ж вал узвышаўся і на тым баку лугу, ад Белай Гліны. Пойма ракі ляжала тут як у чашы, што мела два вузкія вытокі па рэчышчы Бесядзі. Вясной яе ўсю залівала вадой, і яна гады рабілася ў гэтым месцы падобнай на возера, якое звычайна трымалася ледзь не ўкоптаркі да самага канца разводдзя. Тут на Бесядзі быў другі рум, адсюль таксама ганялі плыты ў Сож. Цяпер траляванага лесу не было тут, нават лягары за восень і зіму паспелі парасцягваць людзі па дварах, не тое што добрае бярвенне; і толькі старая кара, скручаная на сонцы, ляжала чорнымі кучамі на беразе, нагадваючы пра колішнюю сплаўную справу, ды яшчэ стаяла воддаль сплаўная кантора, але без акон і дзвярэй, уся наросхрыст.

Зазыба ўспамінаў, як верамейкаўцы прыязджалі летась сюды, на гэты рум; тады яны ездзілі ў Белую Гліну аднаўляць мост на Дзяражні, але мост быў закончаны да іх у Белай Гліне, і хтосьці з верамейкаўцаў падказаў вяртацца ў вёску па гэтай дарозе; Дзяніс Яўменавіч таксама прывёз з тае паездкі сабе добрых жэрдак на латы.

– Тпру, – спыніў Зазыба каня.

Нягледзячы на спёку, з ракі цяпер, хоць яе і засланяў ад дарогі стромы бераг і яна цякла глыбока пад ім, дыхнула летняй вадой, але нямоцна; Зазыба адчуў не халадок, а хутчэй кволую свежасць, якая праганяла духату, што ажно стукала ў скроні; упіраючыся абцасамі ботаў, Чубар спусціўся па пясчаным абрыве да ракі, размачыў у вадзе два сухары, што ляжалі ў яго брызентавай торбе, вярнуўся тым жа шляхам назад на дарогу, падаў адзін сухар Дзянісу Яўменавічу.

– Давай перакусім, а вады можна напіцца з крыніцы, – сказаў ён з хлапечай радасцю, але не сеў на калёсы, застаўся стаяць, трымаючы ў адной руцэ вінтоўку, у другой – сухар; хруснуў зубамі сухар, патрымаў у роце адкусаны кавалак, усё роўна як смакаваў ці не ведаў, што рабіць, тады хутка зжаваў і праглынуў. – Правізіяй мы з табой не запасліся ў дарогу, – усміхнуўся Чубар, – будзем пакуль на сухім пайку. Цяпер ужо, мусіць, да вечара, а там хто-небудзь пакорміць.

– Я так думаю, што і ўвогуле давядзецца нам да прыцемак пачакаць недзе каля Бялынкавіч? – глянуў на яго Зазыба.

– Можна будзе пачакаць, а можна і проста ехаць, – кіўнуў Чубар. – Дакументамі я запасся, – сказаў ён яшчэ праз нейкі момант і ў пацверджанне сваіх слоў дастаў з кішэні «талстоўкі» светла-сінюю павязку паліцэйскага.

– Думаеш, у Бялынкавічах цябе ў твар ніхто не ведае? – насмешліва смыкнуў на гэта шчакой Зазыба.

– А думаеш, усе ведаюць, што я цяпер у партызанах?

Зазыба няпэўна паціснуў плячамі. Сухар быў мяккі, няйначай, зусім нядаўна з чарана ці з печы, пах свежым хлебам, і Дзяніс Яўменавіч хутка, са смакам, з’еў яго, падумаўшы, што сам мог бы штокольвечы ўзяць у дарогу. Успомніў і ўсміхнуўся: падарожніку пост не шкодзіць, наадварот. Затым з той жа ўсмешкай разважыў – як многа чалавек напрыдумваў чаго наперад, абы суцешыць сябе… Пакуль Чубар хадзіў да ракі, а найбольш цяпер, калі стаяў насупраць, Зазыба паспеў свядома і неўпрыкмет угледзецца ў яго – сапраўды, Радзівон Антонавіч нават знешне перамяніўся за гэты год як бадзяўся далёка ці блізка ад Верамеек: твар стаў не такі поўны, як раней, хоць трэба адзначыць, што дужа тлустым ён ніколі ў яго не быў; постаць таксама страціла былую друзласць, што асабліва кідалася ў вочы пры вялікім росце – «талстоўка», з якою ён не расставаўся, выглядала раскашнаватай цяпер; вочы яго не тое што патухлі неяк, але пазбавіліся колішняй пагардлівасці ў позірку, можна сказаць, чалавек быццам памякчэў ад гэтага.

– Урэшце там пабачым, – сказаў Чубар, даеўшы сухар. – У нас цяпер дзе стаў, там і стан. Можна будзе, як ты кажаш, і пачакаць да вечара.

За румам зноў пачынаўся пясок, Чубар пра гэта ведаў, таму не захацеў садзіцца на калёсы. Шырока і вольна ступаючы па абочыне, ён хутка пакрочыў наперад, ажно Зазыбу давялося спяшацца на кані.

Цяпер мала хто ездзіў па гэтай дарозе; трава абапал была, быццам вымытая, нават без пылу.

Млявасць, што панавала ў лесе, даўно ўжо прымусіла змоўкнуць птушак. Стаяла цішыня, здавалася, яна ажно звінела.

Але нездарма кажуць, што толькі з хмары выпадае гром. Акурат скрозь немач, аднекуль даляцеў раптам чалавечы голас. Зазыба насцярожыўся, гатовы стрымаць каня. Чубар таксама пачуў гоман, спыніўся. Стала зразумела нарэшце, што чалавек недзе не размаўляў і не крычаў, а ўсё роўна бы енчыў, якраз у тым баку, куды вяла дарога, якая за румам пачала шырэць, падвойвацца, бо тут яе абступалі таўшчэзныя, з пачарнелай карой бярозы, што засталіся з ранейшай прысады, калі на гэтым месцы, замест цяперашняга лесу, было калодліўскае поле. Зазыба яшчэ помніў яго, яно толькі называлася калодліўскае, але належала пану і пры ім было засаджана лесам. Бярозамі тады пазначаны быў шлях. З таго часу гэтыя дрэвы шумелі сабе абапал старога шляху, прываблівaючы ўлетку ў сваю лістоту не толькі дробнае лясное птаства, а і вераб’ёў, што прыляталі сюды з вясковых гумнаў.

Калодліва таксама было прырэчнай вёскай. Ад Зацішша яно знаходзілася кіламетраў за сем, значыць, ужо недалёка, таму можна было падумаць, што чалавек цяпер енчыў недзе там. Але ці так? Да плачу раптам далучыўся другі голас, раззлаваны і крыклівы, нібыта другі чалавек дамагаўся чагосьці ад першага.

Людзей нашы паязджане згледзелі хутка. Іх было на дарозе трох. Адзін стаяў на выспачцы пад бярозай, два другія ў цывільным трымаліся побач, маючы пры сабе зброю, вінтоўкі.

Дзеля перасцярогі Чубар клацнуў затворам сваёй вінтоўкі, даслаў з магазіна ў патроннік зарад.

– Ты сабе, – сказаў ён Дзянісу Яўменавічу, – едзь, а я пільнавацца тым часам буду. Глядзі ва ўсім на мяне. Як буду рабіць я, так і ты. Дарэмна не паслухаўся Мітрафана, не ўзяў вінтоўку сабе. Але няхай думаюць, што яна ляжыць у цябе на возе. Рабі выгляд, што ляжыць. А я буду напагатове.

Двое з вінтоўкамі былі як заюшаныя, таму не пачулі ні тупату каня, ні шоргату колаў. Першы згледзеў Чубара з Зазыбам чалавек, што стаяў на каленях. Ён не тое каб узрадаваўся, убачыўшы іх, аднак перастаў енчыць, змоўк і, акурат забыўшыся на сваіх крыўдзіцеляў, уталопіў спакутаваныя вочы на пад’язджаючых людзей. Гэта прымусіла глянуць у іх бок і тых двух. Адзін, ніжэйшы, адразу ўскінуў вінтоўку, пісклява крыкнуў:

– Стой!

Але Чубар ужо таксама трымаў напагатове зброю. Зазыба напяўся ўвесь, глянуў на другога чалавека, рослага і чорнага з выгляду, відаць, каўказца, які зыркаў бліскучымі вачамі то на Чубара, то на яго, Зазыбу, але вінтоўку ні на аднаго не наставіў. Гэта супакоіла Зазыбу. Аднак на Чубараву параду ён не забываў – мацаў правай рукой за сабой на драбіне, быццам у яго там сапраўды ляжала зброя. Між тым маларослы зноў крыкнуў:

– Стой! Пароль давай!

– Які табе пароль? – глуха, усё роўна як ахрыпшы, сказаў з прыкрасцю Чубар. – Хіба не пазнаеш, Патоля?

Ад Чубаравых слоў, а найболын, мусіць, ад таго тону, якім былі вымаўлены яны, чалавек раптам ажно падскочыў, пасля адразу неяк ахляў, і тады Зазыба ўбачыў, што твар у яго нейкі васковы, нават скура на галаве, пакрытая рэдкімі валасамі, і тая была ў гэтай васковай жаўцізне, якая ці то пачынала лушчыцца, ці то заўсёды заставалася такой. Было відаць, што Патоля (як назваў яго Чубар) таксама пазнаў хто апынуўся перад ім. Але вінтоўку не апусціў і не адхінуў, працягваў недаверліва лыпаючы вачамі, узірацца ў Чубара. Нарэшце зноў з ранейшай непрыступнасцю сказаў:

– Ну, пазнаў ці не пазнаў а пароль гавары!

Чубар засмяяўся:

– Не ведаю, які табе пароль трэба. Мы тут пакуль без пароляў жывём.

– Хто гэта – мы?

– Ну, мы. А вы адкуль?

– Ты, Чубар, не дуры, гавары пароль, а то хто вас тут разбярэ, партызаны вы ці паліцаі? – Стаяў на сваім Патоля, але па голасе яго ўжо можна было адчуць, што ў «пароль» ён цяпер проста гуляў.

– Ты сам не дуры, Патоля, – цярпліва, але з пагрозлівасцю ў голасе сказаў Чубар, – тое ж можна сказаць і пра вас, тым больш што ў мяне падстаў для гэтага больш, чым у цябе.

– Якія ў цябе падставы, што ты вярзеш?

Паставіўшы прыкладам каля ног вінтоўку, Чубар кіўнуў галавой на чалавека, які працягваў укленчваць пад бярозай:

– Што гэта за чалавек, і што вы робіце з ім?

Патоля нарэшце зразумеў, што ніякага пароля не дачакаецца ад Чубара. Дзіўна, але гэтая акалічнасць, дакладней, не сама, а факт усведамлення яе, раптам пачала вырашаць далейшае. Патоля таксама адвёў сваю вінтоўку, крутануўся да спадарожніка, што па-ранейшаму, усё роўна як складзены, стаяў крокаў за пяць з вінтоўкай на плячы, па-блазенску, але з выразнай бездапаможнасцю ўсміхаўся невядома каму.

– А ты што глядзіш, вочы талопіш? – накінуўся Патоля на свайго спадарожніка; але той не адказваў, адно ўсміхаўся; таму Патоля зноў павярнуўся да Чубара, але гэты раз сказаў зусім мірна: – Ды вось, злавілі тут адну падлюку.

Усе перавялі позіркі на чалавека пад бярозай. Было відаць, што той, стоячы доўга на каленях, страціў багата сілы; твар яго быў потны, з доўгімі пісягамі бруду; вочы блішчэлі, і ў тым бляску месціліся адным часам і страх і самота, але самота не столькі мяккая, колькі ўжо нежывая, зацятая ў сваёй безвыходнасці. Чалавек маўчаў, нават не спрабаваў выціснуць з сябе слова. Наваліўшыся задам на лыткі босых ног, небарака, здавалася, няздольны быў адарвацца ад іх, выпрастацца.

Цяпер вось Зазыба больш пільна паглядзеў на яго і пазнаў. То быў калодліўскі штунда. Хоць Зазыба ў Калодліве часцей бываў праездам, але гэтага чалавека ведаў: хтосьці паказваў на яго ў калодліўскай краме. У вёсцы ён быў, здаецца, адзіны, хто спавядаў такую рэлігію; прыехаў аднекуль з Клетак, дзе з даўняга часу жылі баптысты.

Штунда таксама пазнаў Зазыбу. Млява, акурат цераз сілу, усміхнуўся яму, але без аніякай надзеі.

Зазыба прымусіў сябе ўспомніць, як гэта было, што ён першы раз убачыў у Калодліве штунду – ён вяртаўся з Крутагор’я, але не тым шляхам, што вёў у Верамейкі праз Белую Гліну, і з ім ехаў дамоў Парфён Вяршкоў. Здаецца, ці не Вяршкоў і паказаў тады штунду ў краме, што стаяла на ўзгорку блізка да пераезду праз Бесядзь. Але прозвішча яго той раз не называлася, таму Зазыба і не помніў. А калі хто і сказаў, то хутчэй за ўсё, што яно не ўтрымалася ў галаве.

Між тым Чубар таксама звярнуў увагу, што чалавек на каленях увесь час плюскае вачамі на Зазыбу. «Няйначай, ведаюць адзін аднаго», – падумаў Радзівон Антонавіч і з запытаннем паглядзеў на Зазыбу. Але Дзяніс Яўменавіч ніяк не зрэагаваў на гэта, здавалася, што ён нават не адчуў што Чубар нечага хоча ад яго.

– Дык кажаш – падлюку злавілі? – не то з недаверам, не то з падкрэсленай цікавасцю перавёў позірк Чубар спярша на Патолю, затым на яго спадарожніка.

Патоля маўчаў, акурат даючы магчымасць Чубару пераканацца самому, што яны сапраўды злавілі нягодніка, які заслугоўвае неадкладнага пакарання. Дзіўна, але чалавек пад бярозай таксама больш нічым не выдаваў сябе, сядзеў задам на лытках, і ўсё.

– Ну а ты, Дзяніс Яўменавіч? Што ты скажаш? Табе знаёмы гэты чалавек?

– Нібыта з Калодліва. Тамашні штунда.

– Ну і што, што з Калодліва? – зноў ускінуўся Патоля: у вачах яго ўспыхнула лютасць, але тут жа і пагасла, бо ўжо ў наступны момант Патоля сказаў з прыкрасцю: – Слухай, Чубар, ехаў бы ты сваёй дарогай, а то!.. Мы самі тут разбярэмся, што да чаго. Не ты яго злавіў, не табе і суд вяршыць! – Зазыбу ён, здавалася, зусім не браў пад увагу.

– Ну, на суд і расправу ты скоры, гэта я ведаю, – павадзіў растапыранай рукой Чубар паміж сабой і Патолем, – меў магчымасць пераканацца. Гавары, што ён натварыў, гэты чалавек?

– А ты вось паглядзі! – Патоля дастаў з кішэні штаноў скрутак папер. – Распіскі. Браў з партызан і з паліцаяў. Каго накарміў, у таго і браў. Сёння ў партызан, заўтра ў паліцаяў. А можа, у адзін дзень і ў тых, і ў другіх. І ўсе ў кубельцы складваў. Адзін кубелец меў для партызан, другі – для нямецкіх пасобнікаў.

Чубар з Патолевых слоў засмяяўся. З новай цікавасцю паглядзеў на калодліўскага баптыста.

– Але нас не правядзеш, – не зважаючы на Чубараў смех, працягваў Патоля, – у нас вочы пільныя. Нездарма ж называюць нас чэкістамі. Вось і дагледзелі, выцягнулі гэтыя паперкі з кубельцаў. Ды калі б толькі гэта? Ато ж паслухай, што ён гаворыць, вушы вянуць. Вядзём у атрад, дык таксама ўпіраецца, кажа, тут забівайце. Стаў на калені і стаіць, як ашалелы, адно енчыць.

– А навошта ён вам у атрадзе? – беручы паперкі з рук Патолі, спытаў Чубар.

– Там разбяруцца з ім!

– У які атрад?

– Ёсць атрад!

Чубар патасаваў паперкі ў руках; сапраўды, то былі распіскі, у якіх значылася, што «жыхар вёскі Калодліва Сцяпан Малюшкін» такога-та чысла і такога месяца «аказаў дапамогу харчам» такім-та… Але хто выдаў іх, гэтыя распіскі, пазнаць нельга было, бо замест прозвішчаў стаялі адны незразумелыя кручкі… Нарэшце Чубар перастаў перабіраць паперкі, падняў усмешлівыя вочы на Патолю:

– Адкуль ты ўзяў, што тут разам і партызанскія і паліцэйскія распіскі?

– Дык сам жа прызнаўся.

– Ну-тка, раскажы, Патоля, як ён прызнаўся.

– А што расказваць. Папаўся, дык няхай адказвае.

– І што, толькі ў іх, гэтых паперках, правіннасць яго?

– Хіба мала?

– Ды і небагата.

– Гэта як для каго. А для гэтага… Нездарма ж у атрад не хоча ісці. Мы яго цягнем, а ён упіраецца, кажа, зброі нельга браць у рукі, нібыта рэлігія ў яго такая. Значыць, па нашай рэлігіі можна змагацца з фашыстамі, а па яго – не? Нам вось з Гурамам можна кляшчоў карміць у лесе, а гэтаму нельга?

– Ты, Патоля, супакойся, – сказаў Чубар, усё роўна як канчаткова на сябе браў разбор справы; паглядзеў на Зазыбу: – Значыць, табе знаёмы чалавек?

– Так, гэта калодліўскі баптыст.

– А ты што маўчыш? – спытаў Чубар штунду. – Тваё прозвішча Малюшкін? Твае распіскі?

– Дак а што я? – Чалавек паварушыў плячамі, быццам хацеў, але баяўся скінуць з іх доўгі цяжар, затым усё-ткі паволі ўстаў на ногі, спярша на адну, пасля на другую; голас у яго быў хрыплы і заплаканы, рукі і цяпер яшчэ ўздрыгвалі; было відаць, ён пакуль не верыў, што небяспека мінулася. – Прыйшлі, папрасілі паесці, а тады етыя паперкі дасталі.

Чубар засмяяўся:

– А ты з іх таксама ўзяў распіску за абед?

– Дак…

– Ладна, сядай на калёсы.

Чалавек паслухаўся, сеў на калёсы. Зазыба тарганўў лейцамі каня, праехаў міма Чубара з Патолем.

– Мы самі з ім разбярэмся, – сказаў Чубар Патолю.

– Хто гэта мы? – ускінуўся той.

– Ну, мы вось. Я і таварыш Зазыба.

– Ніякага Зазыбы я не ведаю. Цябе вось ведаю. Дакладней, некалі ведаў. А цяпер хто цябе зразумее? Можа, ты ў паліцыю ўступіў?

– Не плявузгай абы-што. Лепей скажы, адкуль ты ўзяўся? Што ў цябе за атрад?

– У Шамякінскім цяпер, – быццам з неахвотаю адказаў Патоля.

– Дзе ён стаіць?

– За Панькоўскай Будай.

– Адкуль ён прыйшоў?

– З-за лініі фронту.

– Дык ты ў ім?

– А то ж… Вось прыйшлі ў разведку з Гурамам. Дарэчы, грузін. Шукаем мясцовых партызан.

– Нешта ты толькі тым і займаешся, што шукаеш мясцовых партызан. І тады, увосень, шукаў і зараз.

– Тады мы, здаецца, разам з табой шукалі.

– Але ўвесь час у нейкія недарэчнасці трапляеш. Тады, у Машавой, нарабіў спраў і зараз вунь чорт ведае што надумаў! Навошта табе спатрэбіўся гэты баптыст? Ну і што, што распіскі патрабуе за абед? Маглі не даваць, а маглі і не абедаць.

– Але ж ён не толькі нас корміць!

– Корміць таго, хто ў хату прыходзіць. Не сам жа ён вас знайшоў, а вы да яго прыйшлі. Паліцэйскія таксама шастаюць.

– А што, на табе кляймо партызанскае?

– Затое паліцэйскія ў форме ходзяць.

– Дзе ходзяць, а дзе і не.

– Калі вочы не зусім бачаць, то галавой трэба думаць.

– Яно і відаць, што ты галавой моцна думаеш.

– Добра, на сёння хопіць. Трэба сваіх даганяць. Але мы яшчэ з табой, Патоля, пагаворым.

Чубар усё роўна як узрадаваны, што можна нарэшце адкараскацца ад Патолі, кінуўся даганяць Зазыбу, які паспеў ужо ад'ехаць крокаў на дзвесце. Але хутка штосьці занепакоіла Чубара, і ён вярнуўся. Патоля з грузінам стаялі на тым жа месцы паміж бярозамі. Гурам (гэтае імя Чубар запомніў адразу) нешта даводзіў свайму спадарожніку, а той у адказ махаў перад сабой дзвюма рукамі, акурат апраўдваўся ці адбіваўся такім чынам. «Эйш ты!» – усё роўна як у захапленні прамовіў сабе Чубар, але ўжо праз момант з прыкрасцю падумаў, што лёс сапраўды неяк дзіўна зводзіць яго з гэтым апантаным і маларазважлівым чалавекам, і кожны раз чамусьці вось так, пры незвычайных, а можна сказаць – пры трагічных акалічнасцях: тады, у Машавой, калі загінуў падпольны партыйны камітэт, і цяпер таксама мелася здарыцца нешта жахлівае… Чубар на момант нават уявіў, як тое жахлівае магло адбыцца, уявіў і сцепануўся ўнутры. «І ходзіць жа па зямлі такая натапыраная істота!..» Ды ўрэшце – ці адна? Да такіх натапыраных істот Чубар, урэшце, мог залічыць і сябе, прынамсі, колішняга, таму што выпадак з ваенурачом, які здарыўся мінулым летам, цяпер таксама ўсё часцей прыгадваўся Радзівону Антонавічу з прыкрасцю, якая абуджала ў душы не толькі неспакой, але і віну, дарма што паводзіны свае ў тых абставінах, свой стрэл на пясчаным лядзе ён заўсёды спрабаваў тлумачыць, нават апраўдваць хутчэй нейкім замарачэннем, якое раптам засланіла свядомасць, хоць на самай справе гэта было не так, бо рабілася ўсё тады назнарок, з патрыятычных меркаванняў, з імкненнем прадухіліць нешта нядобрае, што магло мець непажаданыя, шкодныя вынікі… Зрэшты, Патоля, мусіць, таксама чымсьці падобным кіраваўся і ў Машавой, калі забіваў жонку бургамістра, і цяпер, у Калодліве, як забраў на расправу мясцовага баптыста… Да таго ж на тое сваё забойства Чубар ужо глядзеў акурат праз далёкую замглёнасць, якая сама па сабе стварала магчымасць не дужа абвострана глядзець на паводзіны ў недарэчнай сутычцы з хворым чалавекам. А між тым Чубар пабыў яшчэ раз на тым месцы, дзе ўсё адбылося тады, дакладней, не на той самай выспе, што навісла над лугам каля Бесядзі, а насупраць, у вёсцы, якая знаходзілася па другі бок ракі. Трапіў ён у тыя мясціны ў зімовую пару, калі ўжо стала ляжаў на зямлі снег. Яны ішлі тады з Гусевым у Батаеўскія лясы, выканаўшы заданне Карханава – вывелі ў размяшчэнне часцей генерала Бялова групу камандзіраў і палітработнікаў, якія апынуліся ў акружэнні: Шпакевіч паляцеў з дакументамі за лінію фронту на самалёце, а Чубар з Гусевым рушылі наперад. Але выпала так, што накіраваліся яны адразу не да

вярхоўя Бесядзі, адкуль да Батаеўскіх лясоў бліжэй; проста дарога да сярэдняга цячэння Бесядзі ў той час была бяспечней, чым дзе, пра гэта ім сказалі чырвонаармейскія разведчыкі, якія добра ведалі абстаноўку; і вось Чубар зноў пайшоў у Забесяддзе амаль тым шляхам, што і летам. Вёску, а яна называлася Шыркі, Радзівон пазнаў адразу. У ёй яны і начавалі з Гусевым. Гаспадар, яшчэ зусім малады селянін, здаецца, мала чым старэйшы ад Чубара, прыняў іх у хату без асаблівай насцярогі, якая тады скрозь панавала, нават не спытаў словам – хоць бы пра тое, хто такія ды адкуль; за вячэрай Чубар доўга размаўляў з ім і ўсё хацеў вывесці гамонку нейкім чынам на свой клопат, але не здолеў: ці лёгка прызнацца, што некалі тут, за ракой, ты забіў чалавека?.. А такое жаданне чамусьці было, Чубар не мог растлумачыць, адкуль яно ішло, чым выклікана. Можа, нават слабай надзеяй, што ваенурач пасля яго стрэлу застаўся жывы. Ва ўсякім разе, ноч у Шырках ён правёў неспакойна, часта прахопліваўся і падоўгу думаў. І ўжо ў тую бяссонніцу зразумеў, што вайна не аднаго яго зробіць вінаватым, дарма што хтосьці ўсвядоміць гэта раней, а нехта пазней.

Чубар дагнаў Зазыбу, сеў на калёсы, затым сказаў баптысту:

– А ты не мог пасцерагчыся са сваімі паперкамі!.. І навошта яны здаліся табе?

– Дак… – Чалавек ужо выглядаў спакойным, быццам не вырваўся толькі што з бяды, але сядзеў на возе адчужана і яўна не хацеў гаварыць.

– Я яму таксама пра гэта, – сказаў Зазыба, падганяючы лейцамі каня.

– А што я магу, – азваўся баптыст, – калі сянні адны прыходзяць, заўтра другія, а то і на адным дні па некалькі разоў. І кожны лічыць сваім правам спавядаць – у што верую, да каго душа ляжыць і што збіраюся рабіць. А я верую ў аднаго бога. Цяпера ў каго вінтоўка, за тым і права. Етыя таксама во…

– Знайшоў калі бога шукаць, – усміхнуўся Зазыба.

– А я не шукаю. Бог заўсёды са мной. Мне застаецца толькі ўмацоўваць сваю веру. Алюдзі перашкаджаюць.

– Незразумела толькі, хто каму перашкаджае.

– Дак етыя таксама. Прыйшлі спярша як людзі, а тады ўсхадзіліся. Пачалі палохаць. Такі ты да еткі. Нарэшце забралі з хаты, маўляў, акрамя кулі нічога я не заслугоўваю. Але я сям’ю кармлю да ўсім астатнім, хто прыходзіць, у хлебе не адмаўляю. Ну а што датычыць?.. Дак сказана нездарма, не адзіным хлебам сыты чалавек.

– Куды ж яны цябе вялі? – спытаў Чубар, усміхаючыся.

– Куды? Куды? – злуючыся, зварухнуўся на калёсах штунда. – На расстрэл вялі, але каб далей ад вёскі. Вам яны няпраўду сказалі, што ў нейкі атрад. У іх, можа, яго і няма, таго атрада. Але я далей бярозы ўжо не захацеў ісці. Рашыў што будзе, то й няхай. Добра, што вы…

– А як гэта ты дадумаўся распіскі браць за гасціннасць?

– Чаму за гасціннасць? Мне накарміць чалавека абедам няцяжка было. Ну а паперкі… Дак трэба ж таксама штосьці за душой мець, нейкае апраўданне. Зброі ж мне ў рукі нельга браць, вера такая…

– Нябось ад мабілізацыі ў армію недзе схаваўся? – не пераставаў дапякаць Чубар, і чым даўжэй гэта рабіў, тым мацней запаляўся.

– Чаму схаваўся? Я па хваробе не пайшоў.

– Але ж распіскамі збіраўся апраўдвацца не толькі перад нашымі, але і перад немцамі? Ад іх ты таксама браў?

– Немцы ў нас не часта бываюць. Ды й не пойдуць яны есці ў такую хату, як мая. Лепей на вуліцы пастаяць да паядуць. Ета не паліцаі.

– Што немцы, што паліцаі – адным мірам мазаны. Значыць, наперад разлічваў, якая ўлада верх возьме ў вайне, перад той і апраўдваўся б?

Але на гэтыя Чубаравы словы баптыст не стаў адказваць. Тады Чубар з несхаванай грэблівасцю адвярнуўся ад яго, падумаў: «Спадзяецца нягоднік патрапіць паміж сваіх і чужых».

Больш ён не чапаў калодліўскага мужыка. Неўзабаве той саскочыў з калёс, пакланіўся:

– Мне адсюль недалёка ўжо, дак я пайду. Дзякуй, добрыя людзі. Няхай беражэ вас гасподзь.

– А то паедзем разам, – паспрабаваў затрымаць яго Зазыба. – Нам усё роўна праз Калодліва ехаць.

– Не, я сам.

– Ну сам, дык сам, – адчапіўся ад яго Зазыба. Штунда тут жа адстаў ад воза, сігануў з дарогі ў сасоннік, адразу прапаў там у гушчары.

– Непрыемны чалавек, – быццам услед яму прамовіў Чубар.

– Чалавек як чалавек, – сказаў на гэта Зазыба. – Гэта мы ад людзей іншы раз лішне патрабуем, а яны проста людзі. І колькі ні збірай іх у адно, а яны кожны па сабе. Асабліва цяпер. Ну а што за чалавек быў той?

– Патоля?

– Няхай Патоля. Але бачу – знаёмы табе?

– Таксама, бачыш, чалавек. Гэта ён немку ў Машавой забіў. Я ж тады таксама ў Машавой быў.

– Дык ты, мусіць, дакладна ведаеш?

– Я пры тым не прысутнічаў. З Касьянам Шандовым у садзе знаходзіўся. Ты ж Шандова машаўскога помніш

– Ну, садоўніка.

– Дык мы з ім заставаліся ў хатцы. А гэты Патоля яшчэ з адным партызанам пайшоў у вёску на разведку. Зрэшты, што тут расказваць! – Чубар махнуў рукой. – Пра гэта ўсе ведаюць. Але пасля таго Карханаў яго з атрада прагнаў. І вось цяпер нягоднік у нейкім новым атрадзе.

– Як мне падалося – страшны чалавек, – пакруціў галавой Зазыба.

– Так, развагі ў ім, на жаль, мала.

Было відаць, што Чубару стала нецікава гаварыць пра падзеі, пгго адбываліся мінулай восенню ў Машавой, а таму і пра Патолю. Зазыба на нейкі час застаўся адзін з думкамі. А тыя снаваліся ў ягонай галаве спярша вакол шалудзівага партызана, які, аказваецца, меў непасрэднае дачыненне да машаўской трагедыі; нядобра магла скончыцца справа ў яго і сёння, з гэтым калодліўскім штундам; але найбольш здзівіла Зазыбу, што Чубар таксама апынуўся нейкім чынам у Машавой і быў ледзь не сведкам, як забівалі бургамістраву жонку; канца размовы, якая адбывалася паміж Чубарам і Патолем пад бярозай, Зазыба не чуў, таму не ведаў, што за Панькоўскай Будай, са слоў Патолі, з'явіўся партызанскі атрад, але тое, што тут, на гэтай дарозе, шасталі ўзброеныя людзі, якія таксама называлі сябе партызанамі, прымусіла падумаць якраз пра гэта; Дзянісу Яўменавічу нават карцела спытаць Чубара, бо нездарма ж Радзівон Антонавіч абмовіўся, што ягоны знаёмы цяпер у другім атрадзе, значыць, атрад той знаходзіцца недзе ў Забесяддзі; аднак Зазыба рашыў пакуль памаўчаць, не трывожыць Чубара, таксама як і не вымагаць больш падрабязнага спавядання пра мінулагоднюю машаўскую трагедыю; рашэнне Зазыбава было выклікана хутчэй за ўсё тым, што Чубар пасля апошніх сваіх слоў нібыта зніякавеў раптам, сядзеў цяпер побач пануры, акурат прыгнечаны чымсьці; усё гэта ў Зазыбавых развагах склалася хутка – і пра Патолю, і пра партызан, і пра Чубарава нежаданне гаварыць далей, склалася і адышло разам, і ён тут жа перакінуўся ў думках на іншае, успомніўшы, што не сказаў перад ад'ездам Масею, каб той не чакаў яго, а скідваў сена ў копы; ды і начаваць на лузе сыну без яго няварта было, пра гэта таксама належала сказаць, але ў спешцы не прыйшло тады яму ў галаву.

* * *

Ехаць да Бялынкавіч заставалася яшчэ далёка, тым больш па гарачыні. Зазыба моўчкі сцёбаў раз-пораз лейцамі па сцёгнах каня, той кідаўся пасля гэтага адразу ледзь не наўскач, але хутка прыставаў, неўпрыкмет пераходзіў на лёгкі трушок, і калі зусім пераставалі тарахцець калёсы, абапал дарогі зноў можна было чуць, як вяртаўся да свайго ціхага і патаемнага жыцця лес, дарма што па-ранейшаму яшчэ пакуль смягла і нікла ўсё ў ім, – недзе ўжо рупліва стукаўся ў дрэва дзяцел, штосьці шамацела ў блізкім чарнічніку, можа, уцякалі з дарогі спалоханыя яшчаркі, гулі чмялі, а найбольш спрабавалі падаваць галасы птушкі, асабліва чамусьці вылучаўся сярод іх юрок, быццам яму меней за ўсіх перапала ад сённяшняй спёкі.

Гэтак жа моўчкі і ціха Зазыба з Чубарам неўзабаве праехалі Калодліва, здавалася, вёска стаяла без людзей, бо ніхто не толькі не выйшаў на вуліцу, а і не выглянуў з акна. Праўда, ехаць па вуліцы давялося нядоўга, усяго напачатку, пасля дарога забірала направа і зноў знікала ў лесе. За гумнамі Чубар сказаў Зазыбу з усмешкай:

– Дарэмна мы, Дзяніс Яўменавіч, адпусцілі баптыста, якраз час папрасіцца на абед. Але як думаеш, узяў бы ён з нас распіскі?

Зазыба засмяяўся:

– Мусіць, яму сёння не да іх.

– Думаеш, гэты выпадак чаму-небудзь навучыў яго?

– У кожным разе, ахвоту адбіў. Цяпер калі і будзе ў каго браць, то ўжо, няйначай, з вялікай абачлівасцю. Ну а пра абед? Дык без абеду сярод жывых людзей не застанемся. Прыедзем у Бялынкавічы, там і падсілкуемся.

– А ты добра ведаеш таго настаўніка, да якога мы едзем?

– Мурача? Ну так, гаварыў аднойчы з ім. Здаецца, чалавек нішто, бо іначай Нарчук не пасылаў бы нас да яго. Відаць, дамоўлена. А чалавек ён… сапраўдны, дарма што мне ўсяго адзін раз пагаварыць з ім давялося.

– Але я вось пра што зноў думаю, Зазыба. Ці абавязкова нам ехаць адразу ў Бялынкавічы? Можа, сапраўды спынімся спярша недзе блізка, а ты сходзіш да Мурача. А то хто ведае, што там можна напаткаць. Ва ўсякім выпадку, совацца туды, як з завязанымі вачамі, няварта.

– Ну а паліцэйская павязка твая? Не дапаможа? – усміхнуўся Зазыба.

– Ат, – махнуў Чубар рукой. – Нездарма кажуць, што чым далей у лес, тым страшней чалавеку. – Ён памаўчаў трохі, тады пачаў тлумачыць: – Канечне, справа не ў страху, хоць на яго, бадай, адны дурні не звяртаюць увагі. А вось пасцерагчыся ніколі не лішне. Адна справа сустрэць небяспеку па дарозе, другая… Словам, з гэтым таксама ўсё ясна.

– Ну што ж, можна і праўда так зрабіць, як ты гаворыш, – раз ясна, – згадзіўся Зазыба: ён і сам недзе думаў, што яны не адразу паедуць у Бялынкавічы, можа, да вечара нават пабудуць у лесе, аднак пакуль не гаварыў Чубару, бо дарогі і часу яшчэ хапала, а Радзівону Антонавічу, аказваецца, таксама гэта рупіла.

За Калодлівам зноў пачаліся пяскі, конь натужваўся ўвесь, везучы калёсы з двума седакамі ўгору. Па левы бок ад дарогі цяпер стаялі дубы, на іх было шмат зялёных жалудоў, яшчэ дробных, з шурпатымі шапачкамі; дубы раслі скрозь, засцячы шырокую пойму, пасярод якой цякла Бесядзь. Зазыба ведаў гэтыя мясціны, як і свае, бліжэйшыя да Верамеек, таму ўжо наперад прыкідваў у галаве, дзе лепей Чубару атабарыцца на той час, пакуль ён будзе хадзіць у Бялынкавічы і адтуль.

З гэтага боку ў Бесядзь упадала яшчэ адна рэчка, Зубар. Назва гэтая адразу выводзіла чалавечую думку на звера, на зубра. Але зуброў тут і блізка ніхто не бачыў, хіба, можа, у даўнія часы, а даўнія часы на тое і называюцца даўнімі, што замглёны. Маглі ж неяк захавацца ў стаянцы старажытнага чалавека ў Гончы косці маманта? Дык хто ў такім разе забараніў сюды дарогу зубрам? Між тым Зазыба не помніў каб хтосьці іначай расказваў пры ім, адкуль узяла гэтая рэчка назву…

Нарэшце ў галаве Зазыбы замацавалася думка, што прыпынак перад Бялынкавічамі лепш будзе зрабіць якраз на Зубары, можа, нават у вусці, адкуль недалёка быў мост. Зазыба сказаў пра гэта Чубару. Той кіўнуў галавой. Але не паспеў Зазыба праз якое паўгадзіны выпрагчы каня з аглобляў на паплаўцы, як на Бесядзі, трохі вышэй за вусце, пачуліся галасы. Дзяніс Яўменавіч кінуўся ў той бок, выглянуў з лазовых кустоў На бродзе праз Бесядзь перапраўляліся немцы. Трымаючы верхняе адзенне і зброю ў руках, яны пераходзілі адзін за адным на той бераг. Там ужо стаялі гарматы і дзве легкавыя аўтамашыны. Гарматы былі на коннай цязе. Гэта Зазыба

адзначыў адразу. Але немцаў перабралася праз раку яшчэ небагата. Затое ланцуг, які пачынаўся адсюль з гэтага берага, усё рухаўся і рухаўся. Здавалася, што яму не будзе канца на бродзе.

Ціха, каб не рабіць шуму, Зазыба захінуў кусты, патупаў на сагнутых нагах назад.

– Што там? – зусім не асцерагаючыся, спытаў Чубар. Дзяніс Яўменавіч паднёс палец к губам, шапнуў:

– Немцы! Перапраўляюцца на той бераг.

Чубар ад здзіўлення ўскінуў бровы, але не саступіў з месца, толькі хутка азірнуўся вакол сябе.

– Адкуль яны ўзяліся? – ужо таксама шэптам спытаў ён.

– А халера іх ведае! Можа, з Бялынкавіч?

– Чаму тады не пераправіліся там? Там жа мост на Бесядзі?

– А яны, відаць, адразу сюды з чыгуначнай станцыі. Дарога ж з Белага Каменя таксама сюды ёсць.

– Значыць, нейкі манеўр. Запрагай, Дзяніс Яўменавіч. А я пакуль сам гляну.

Зазыба кінуўся па каня, якога навязаў перад гэтым за лейчыну на лужку, каля Зубара. Буланы чамусьці стаў упірацца, але Зазыба змусіў яго пайсці за сабой…

Чубара не было ажно колькі хвілін. Нарэшце ён вярнуўся, выцер рукавом лоб. Сказаў пошапкам:

– Маглі напароцца.

– Што будзем рабіць?

– Трэба камусьці вяртацца ў атрад, – разважыў Чубар. – Ідзі ты, Зазыба, а я на тваім кані паеду ў Канічы.

– Нічога не знойдзеш ты адзін там!

– Тады ты едзь, Дзяніс Яўменавіч.

– А што, гэтая справа наша не можа пачакаць?

Чубар паціснуў плячамі. Прамовіў чамусьці зусім пра іншае:

– Вось табе баптысты, вось табе і садысты.

VIII

Калі Масей нарэшце палажыў налітую вільготнаю сілай траву ў два пракосы, з Верамеек прыйшла маці. Ужо стаяла, можна сказаць, позняя раніца. Аше работы вялікай на лузе для жанчын яшчэ не было – і ўчарашняя трава, і сённяшняя выглядала амаль аднолькава, толькі ранейшая трохі прывяла зверху.

Вядома, што Марфа Давыдаўна найперш кінулася распытваць пра бацьку, аднак Масей мала што мог сказаць, толькі тое, што ведаў: прыходзіў, маўляў Пацюпа з Азёрнага, і яны паехалі кудысьці разам, здаецца, у Зацішша.

– Як заўсёды, па важнай справе!.. – акурат раззлавана, сказала на гэта маці, але тут жа і спахапілася, быццам павінілася, бо прывыкла з даўняга, што муж заўсёды карыстаўся ў людзей вось такім попытам: прыйшлі – сказалі – пайшоў, прыйшлі – паклікалі – пайшоў, прыйшлі – забралі; ёй толькі зарупіла і цяпер, ці надоўга ён знік гэты раз. А пакуль што да чаго, схадзіла да Ганны Карпілавай, дарма што вярталіся з Верамеек у адной гурме – ці то не дагаварылі па дарозе, ці то сапраўды ўзнік клопат, тады рашылася нарэшце, стала раскідваць граблямі траву па паласе, каб сохла, ператваралася ў сена.

Сонца ўжо з’ела к таму часу расу, над лугам зноў стаяла дрыготкае марыва.

Так яны і рабілі – Масей завіхаўся з касой у адным канцы лугу, ля самай Бесядзі, Марфа Давыдаўна ў другім, яшчэ пад лесам, дзе быў іхні табар.

Пасля сняданку касілася не так, як учора, нават не гэтак, як ад самага ранку, – не было тае, учарашняе, захопленасці самой работай, садніла нага, якую пашкодзіў у маленстве і якая давала аб сабе знаць нечаканым чынам, нават нельга было ўведаць, адкуль гэтая вярэдлівасць раптам бралася. Да таго ж нечага стаў сёння прыгадвацца сон, не дагледжаны ўначы; прыходзіў на памяць, тады зноў знікаў, быццам праганяў яго шоргат касы; уласна, сон гэты быў самой рэальнасцю, бо прыйшоў з сапраўднага лагернага жыцця. І цяпер Масей, дарма што ўрыўкамі, нібыта працягваў бачыць яго ў розных месцах, а ўсё далей.

З прафесарам Дзягелем Масей быў знаёмы па Мінску, той выкладаў адзін год у іх новую гісторыю, але тады, пры вольным жыцці, яны, здаецца, нават не пастаялі адзін супроць аднаго па справе, не перакінуліся зацікаўленым словам, прынамсі, Масей не помніў, каб паміж імі сапраўды ўзнікалі сур’ёзныя размовы. Сышліся яны ўжо на этапе, у цягніку, што вёз зняволеных у Марыінск. Дарога туды з Магілёва (а этап той збіралі якраз у Магілёве) заняла больш за дваццаць сутак, таму часу, зразумела, выпала шмат, тым больш што вагон пакідаць не дазвалялася; асуджаныя толькі рабілі, што спалі на нарах у «сталыпінцу» ды размаўлялі. Праходзіў прафесар па 76-м артыкуле, гэта значыць за групавую агітацыю. А 76-ы артыкул крымінальнага кодэксу Беларусі прадугледжваў тэрмін зняволення да дзесяці гадоў Меней не давалі. Гэтым жа цягніком у Сібір «ехалі», праўда, у розных вагонах, беларускія пісьменнікі Змітрок Астапенка, Барыс Мікуліч, Станіслаў Шушкевіч, Алесь Звонак, Уладзімір Хадыка, Масей Сяднёў Міхась Багун, рэдактар «Чырвонай змены» Іларык Дуброўскі… Словам, знаёмых у цягніку хапала. Але Масей болыл за ўсё трымаўся прафесара Дзягеля. Часам сыходзіўся паміж нараў таксама з Алесем Гронакам. Алесь

быў старэйшы за Масея, ужо вядомы паэт. Аднак з ім размовы адбываліся найбольш пра паэзію, пра тое, якая яна ёсць і якой павінна быць. Гронак быў па натуры аптыміст, калі падобнае вызначэнне ўвогуле магчыма ў такой справе, палітыкі ўхіляўся, таму, напрыклад, лічыў што зняволенне іхняе нядоўга мецьме, бо павінны ж нарэшце ў Крамлі разабрацца з гэтакай недарэчнасцю, каб вярнуць людзей да ранейшай дзейнасці. Дзіўна, але такіх аптымістаў у вагоне было нямала. Таму Масея вельмі цікавілі думкі Дзягеля, хоць яны часам ажно палохалі. Прафесар лічыў (і не ўтойваў гэтага), што ў Крамлі наўрад ці зацікаўлены цяпер хто ў такім «разбіральніцтве», што ўсё робіцца Сталіным і ягонай хеўрай свядома, іначай не адбывалася б гэтая «недарэчнасць» на працягу столькіх гадоў; глядзіце, казаў прафесар, нават з намі едуць зноў у Сібір тыя, хто ўжо адзін раз адбыў вызначаны тэрмін; сапраўды, гэтых судзілі паўторна і, за малым выключэннем, усё за адно і тое ж… Значыць, хтосьці быў моцна зацікаўлены ў бясконцасці судовых працэсаў камусьці выгадна было кідаць людзей у турмы ды развозіць па лагерах… Такім чынам, хтосьці па-другому глядзеў у краіне ўвогуле на людзей – альбо як на звычайны жывы матэрыял, які пакуль што непрыдатны для грамадскага будаўніцтва, альбо проста як на танную рабочую сілу, што зрабілася патрэбнай на поўначы, у Сібіры, на Калыме і г. д. Але хутчэй за ўсё, сцвярджаў Дзягель, у краіне ажыццяўляўся «няспынны тэрор», той, за які заўсёды стаяў Троцкі і які цяпер, пасля выгнання Троцкага, ажыццяўляе пад «ленінскім прыкрыццем» Сталін… Вядома, Масею нязвыкла было слухаць гэта, няйначай, нават жахліва, але Дзягель усё роўна як хацеў паступова прывучыць маладога чалавека да падобных разважанняў, таму паўтараў свае словы зноў і зноў; тым часам іншы раз здавалася, што прафесаравы перакананні перайшлі ўжо ў зацятую злосць, якая замінае чалавеку глядзець на людзей у краіне калі не з меншай рашучасцю, то ўжо больш абачліва, ці што… Хочаш ці не, але аптымізм Гронака, які недзе межаваў са знарочыстай неразборлівасцю, успрымаўся лягчэй, чым Дзягелева змрочнасць. І, можа, таму праз некалькі месяцаў Масей падаў у Вярхоўны Савет СССР апеляцыю на перагляд сваёй справы… Гэта здарылася ўжо ў лагеры, за Марыінскам.

У Марыінск цягнік дапяўся марозным вечарам. Іначай дзіўна было б, каб Сібір не сустрэла людзей так. Эшалон, які са звычайнага «этапа» ператварыўся паступова ў «беларускі этап», апынуўся на чыгуначнай станцыі не першы; іх, такіх эшалонаў з вязнямі з усёй краіны, ужо стаяла на рэйках каля двух дзесяткаў. У Марыінску знаходзіўся размеркавальны лагер, і новых зняволеных трымалі ў цягніках нядоўга, адно пакуль ішоў пералік. Але цягнікі ўсё падыходзілі і падыходзілі на станцыю. Ім проста не было канца, дарма што ўсе будынкі ў горадзе, прыдатныя хоць збольшага для ўтрымання людзей, былі перапоўнены; у некаторых зняволеныя нават спалі стоячы, а да бочкі, каб апрастацца, дабіраліся па галовах; на вуліцу зняволеных выпускалі толькі тады, як прывозілі страву – зусім рэдкую поліўку, якая на турэмнай мове завецца «баландой»; але ў адрозненне ад турэмнай «баланды» ў размеркавальным лагеры, у які быў ператвораны ўвесь Марыінск, поліўку, якую давалі зняволеным, і «баландой» немагчыма было назваць: проста мутная вада, адно

што нядаўна кіпела ў катле. Пакуты Марыінскага лагера мала хто мог вытрымаць. З Масеевых знаёмых сканалі там некалькі чалавек, у тым ліку і Міхась Багун. «Беларускі этап» узялі на ўлік даволі хутка, прынамсі, ужо на другі дзень зняволеных загналі ў былую лесапільню. У той лесапільні стаяла яшчэ адно збудаванне, памерам, можа, дзесяць на дзесяць, якое чамусьці называлі ліцейным цэхам. Вядома, ніякага абсталявання там не было, адны сцены ды дах, затое ўнізе быў выкапаны катлаван, і ў гэты катлаван канвойныя напіхалі людзей ці не з усяго эшалона. На вуліцу з катлавана можна было трапіць па абмерзлых дашчаных усходках, па іх жа даводзілася вяртацца назад, але ўжо абдзіраючы на сабе скуру і мяса. Да таго ж амаль кожнаму цяпер, на зваротным шляху, памагалі канвойныя, цаляючы прыкладам у карак. Пераадольваць гэты шлях трэба было па тры разы на дзень – за сняданкам, абедам і вячэрай. Шкадуючы нагу, Масей прапусціў колькі «альпійскіх паходаў» па ежу, не стаў вылазіць з катлавана, аднак вельмі хутка адчуў што пачаў слабець; між тым наперадзе яшчэ чакала дарога да пастаяннага лагера, які недзе ўжо быў вызначаны «беларускаму этапу», таму Масей хутка адумаўся, перастаў прапускаць абеды. А тым часам лагернае начальства ў Марыінску ўсё яшчэ ўдакладняла нечага спісы зняволеных, тусавала і адбірала кудысьці змарнелых людзей; здавалася, канца не будзе гэтаму здзеку, як і сібірскаму марозу, што гатовы быў кожную хвіліну ператварыць жывую істоту ў мёрзлы камяк. Нарэшце спісы былі ўдакладнены, бадай што нават і нанава складзены, знявольным выдалі сухі паёк – падрабку цукруды кавалку хлеба. Усе ў катлаване зразумелі, што размеркавальнаму лагеру настае канец. Мала хто верыў, што далей будзе лягчэй, але выбрацца з катлавана хацелася. І вось на чацвёрты дзень па абедзе калона рушыла з Марыінска. Раён быў стэпавы, навакол ані дрэўца, як кажуць, каціся, куды хочаш, не затрымаешся. Канвойных вакол калоны налічвалася небагата, затое лютавалі аўчаркі, якіх недзе вырошчвалі дзеля такога прызначэння ў гадавальніках, няйначай, навучаючы на асуджаных людзях. Канвойныя таксама мала чым адрозніваліся сваёй лютасцю ад аўчарак. Па дарозе зняволеныя мала калі перагаворваліся, бераглі сілы, а для адносін адзін з адным хапала кінуць слова-другое, але ні цяжкасці, ні прысутнасць канвойных з аўчаркамі, ні боязь страціць сілы і быць прыстрэленым ці зацкаваным тымі ж аўчаркамі не адбівалі здольнасці разважаць. Тым больш самому з сабой. Масея найперш уразіла гэтае мноства аўчарак. Зразумела, што ўзнікла ў галаве пытанне – адкуль яны тут бяруцца? Але гэтая вось акалічнасць якраз і лёгка паддавалася тлумачэнню. Куды мацней займала іншае: дзе і на якой мяжы адбывалася ў асяроддзі людзей размежаванне на такіх, як Масей ці прафесар Дзягель, і такіх, як гэтыя канвойныя ці начальства ў лагеры? Па якіх чалавечых законах яно ішло і чым абумоўлівалася? Дык якраз вось на такія пытанні самастойнага адказу пакуль альбо зусім не знаходзілася, альбо ланцуг Масеевых разваг зноў і зноў сутыкаўся з тлумачэннем усяго, што адбывалася ў краіне, прафесара Дзягеля... Здагадкі ледзянілі душу не менш, чым сібірскі мароз цела, апранутае абы ў што; у такім паліто, якое было на Масею, наваг на беларускім марозе доўга не пратрымацца б. А тут!.. Да таго ж Масея ўвесь час не пакідала слабасць, якая пачалася яшчэ ў Марыінску. Тым часам першы прывал намячаўся кіламетраў праз сорак, у

Арлове-Розаве. Недзе на паўдарозе туды Масей раптам адчуў сябе зусім блага, абамлеў і рухнуў пад ногі таварышам па калоне. А калі апрытомнеў, убачыў над сабой аўчарку. Тая стаяла пэрэднімі лапамі ў яго на грудзях, цяжка дыхала ў твар. Побач чуліся галасы канвойных. «Што будзем рабіць?» – «Трэба канчаць. З яго ўжо не хадок». – «І адкуль такія хлюпікі бяруцца на нашу галаву? Цяпер думай, як спісаць яго». – «Імі запоўнена ўся Сібір». – «Ды і акрамя Сібіры, здаецца». – «Але ж таксама жывая істота, бачыце, вочы расплюшчыў». – «Пашкадуй, пашкадуй, дык ён стане блытацца вось гэтак пад нагамі ўсю дарогу. Трэба канчаць». Сабака тым часам нерухома стаяў на грудзях, можа, чакаў каманды, каб учапіцца клыкамі ў горла. Тарачае дыханне яго Масей моцна адчуваў на сваім твары, але няйначай што гэтае дыханне і супакойвала яго сваім цяплом, чамусьці сапраўды зрабілася не страшна ні аўчаркі, ні канвойных, а разам, здаецца, і смерці. Вядома, Масей разумеў, што гаворка паміж канвойнымі ішла найперш пра яго смерць, але на ўсю глыбіню яе не ўсведамляў нібыта сапраўды пакуль яшчэ не верыў, што вось-вось яна настане, што пасля размовы канвойных на самай справе ўсё скончыцца на гэтай сібірскай дарозе для яго смерцю. Дзіўна, але і ўспамінаць нікога не стаў, дакладней, нішто і ніхто не ўсплыў у памяці – ні вёска, ні маці, ні бацька… Праўда, было шкадаванне, дармо што не надта выразнае, – чаму нікога са зняволеных няма побач, адны канвойныя ды сабака? Дзе прафесар Дзягель, дзе Алесь Гронак? І наогул – дзе калона, бо не чуваць нават тупату ног? «Але што будзем рабіць?» – пытаўся ўгары ўжо знаёмы Масею голас аднаго з канвойных. «Усё роўна дыхляк. Табе ж кажуць, адно замінаць будзе», – адказваў яму другі. «Гэта так, – згаджаўся першы, – але, можа, тады хто з вязняў возьмецца дапамагчы яму?» – «Якая яшчэ дапамога? Кожны сам ледва ногі валачэ!» – «Урэшце, няхай і яго валакуць, – акурат загадвае новы голас, затым крычыць: – Гэй, хто там у яго сябрам будзе? Хто возьмецца дапамагчы?» Праз нейкі момант сапраўды пачуліся крокі, Масей убачыў у галавах прафесара Дзягеля.

Той стаяў і моцна моршчыў лоб, на які была насунута цёмна-сіняя пілотка з апушчанымі на вушы абкладамі. Раней прафесар хадзіў проставалосы, ці то згубіў недзе шапку, ці, можа, зусім не меў, у кожным разе ў вагоне Масей ніколі не бачыў яго ў шапцы і цяпер чамусьці здзівіўся гэтай пілотцы, быццам у тым, што яна была на галаве ў Дзягеля, заключалася нейкая новая сутнасць. «Ну што, – сказаў прафесар, – аслабеў хлопец?» Масей памкнуўся расцяць вусны, але не здолеў, не сабраў моцы, адно вінавата ўсміхнуўся. Гэтым часам, хрустаючы снегам, падышоў яшчэ хтосьці. Масей скасіў вочы, пазнаў Іларыка Дуброўскага. Рэдактар нечага замітусіўся над ім. Тады ўсё роўна як спалохана загадаў: «Забярыце аўчарку!» Аўчарка, мусіць, была паслухмяная нават чужому голасу, абы ў ім гучаў загад, таму адразу ж плюснула, акурат у вінаватасці, чырвона-жоўтымі вачамі і скочыла ўбок з Масеевых грудзей. Прафесар Дзягель прасунуў рукі пад Масеевы плечы, прыўзняў яго, тады падхапіў пад пашкі, каб паставіць на ногі. Галава ў Масея яшчэ кружылася, і ад белага снегу, які ён убачыў нібыта ўпершыню, у вачах заскакалі чорныя плямкі. «Сам можаш ісці?» – спытаў Іларык Дуброўскі, але прафесар Дзягель не стаў чакаць, пакуль Масей

збярэцца адказваць, страсянуў яго, усё роўна як спрабуючы ўшчыльніць чалавечае цела, а тады рашуча і неяк па-маладому ўзваліў жыватом сабе на спіну. Калона між тым стаяла крокаў за дваццаць, чакала. Прафесар Дзягель данёс да яе Масея, і яна зноў рушыла па дарозе. Але Масей усё яшчэ адчуваў сваю слабасць, таму не прасіўся на ногі; саромеўся, што забірае ў прафесара апошнія сілы, аднак злазіць з плячэй не спяшаўся; і прафесар нёс Масея кіламетры са тры, пакуль зусім не задыхаўся; Масей гэта нарэшце адчуў расшчапіў на шыі ў Дзягеля рукі, дакрануўся нагамі да зямлі. Пастаяць на месцы яму не далі канвойныя. Масей адразу ж пачуў за спіной нечую каманду, таму ступіў першы крок, другі… «Ну, цяпер я сам», – сказаў ён прафесару Дзягелю. Так яны і дайшлі да Арлова-Розава: Іларык Дубровскі ўшчыльную па левы бок ад Масея, прафесар Дзягель – па правы… На прывале прафесар Дзягель прымусіў Масея з'есці два драбкі цукру, лічы, увесь іхні запас: «Гэта табе дапаможа. Да «Чырвонага аратага» засталася палавіна дарогі. Заўтра будзем на месцы». – «А чаму вы гаворыце – да «Чырвонага аратага?» – спытаў Масей. «Кажуць, што там сельскагаспадарчы лагер, туды нас вядуць». Масей не надта спадзяваўся, што два драбкі цукру вернуць яму сілы, але прафесар меў рацыю – ужо ўвечары, у вартоўні, якая стаяла ў Арлове-Розаве на беразе ракі і ў якой апынуліся на ноч зняволеныя, ён адчуў сябе лепей; шкада, што на другі раз не было ўжо ні цукру, ні хлеба, тады як да месца прызначэння заставалася яшчэ столькі, колькі ад Марыінска да Арлова-Розава. Значыць, ісці далей давядзецца галоднаму. І тым не менш Масей дайшоў. Чырвонааратайскі лагер знаходзіўся пасярод стэпу, кіламетры за тры ад вёскі; праз вароты, якія былі адчынены, канвойныя прывялі калону за калючую агароджу, спынілі. Старшы пачаў тлумачыць: «Набліжэнне за крок да варот лічыцца крокам за вароты. Вартавым на вышках загадана страляць без папярэджання». Дарэчы, тыя вароты так і заставаліся заўсёды адчыненыя, быццам назнарок, дзеля спакусы людзям і выпрабавання. Уначы іх асвятляла ахова пражэктарамі, удзень за імі таксама цікавалі з вышак тыя ж вартавыя. У лагеры меліся дзве зямлянкі: у адной ужо даўно жылі «камінтэрнаўцы» – былыя работнікі Камінтэрна, другая стаяла пустая. Сюды і пасялілі «беларусаў». Алесь Гронак і тут, калі зайшоў у прамерзлую, усю ў наледзі, зямлянку, не страціў свайго аптымізму: «Нічога, жыць можна». Масей з прафесарам Дзягелем нары выбралі побач. Нарэшце пачалося лагернае жыццё. Удзень зняволеныя хадзілі на працу – вазілі з жывёлагадоўчых фермаў гной пад вясенняе ворыва, капаліся ў парніках, рыхтуючы глебу пад расаду, секлі на рацэ Кыя лёд, даставалі з вады бярвенне, а ўночы «падслухоўвалі» на «чацвёртай кашары» стрэлы: там знішчалі «камінтэрнаўцаў». Рабілася гэта чамусьці заўсёды ноччу, а перад тым, надвечар, у хатку, што стаяла трохі наводдаль ад лагера, кожны раз прыязджаў з «цэнтральнай сядзібы» адзін і той жа энкавусавец, па прозвішчы Паўлаў. Казалі, што гэта ён кіраваў расстрэлам на «чацвёртай кашары». Але з «беларускай» зямлянкі тым часам нікога не бралі. Патроны ў лагеры пакуль выдаткоўваліся на адных «камінтэрнаўцаў». Затое «беларусаў» забіраў на могілкі голад. Прафесар Дзягель памёр у сакавіку. У Сібіры тады яшчэ стаяла зіма, і зусім нішто не паказвала, што недзе ўжо наступае вясна. Пахаваў прафесара Дзягеля Масей у тым жа рове, дзе закопвалі

«камінтэрнаўцаў»; вёз нябожчыка на санках і ўсё хацеў закрыць яму вочы, але чамусьці баяўся, можа, нават таму, што не хацеў, каб знікла з твару ўсмешка, з якой памёр чалавек…

Тая ўсмешка была на ягоным твары і сёння, калі раптам убачыў Масей прафесара ў сне…

* * *

Абедалі дзве сям'і разам. Але цяпер без Дзяніса Яўменавіча. Уласна, сёння яны сумяшчалі разам абед і сняданак, які парушыў Хведар Пацюпа ўранні. Кузьма Прыбыткоў таксама прагнаў да Бесядзі свае два пракосы, а нявестка яго тым часам раскідала скошаную траву, трымаючыся падалей ад Масея. Яна выдавала сябе нейкай вельмі вінаватай; хоць не кожнаму гэта кідалася ў вочы. Праўда, Марфа Давыдаўна адразу прыкмеціла, што з Анютай сёння нешта робіцца, яна часта апускае пры сустрэчы вочы ды і паводзіць сябе іначай. Але не была б на тое жаночая інтуіцыя. «Канешне, – падумала яна, – іх штосьці адбылося з Масеем». Марфа Давыдаўна здагадалася пра гэта, аднак спярша засталася ў душы спакойная і толькі пасля, калі яны з Анютай гатавалі абед на вогнішчы, яна адчула раптам да Кузьмовай нявесткі нешта падобнае на грэблівасць: сапраўды, ці ж робіцца такое паміж суседзямі?.. «Але ж і Масей, – падумала яна зноў, – кот марцовы. Спярша да Ганны Карпілавай заляцаўся, цяпера вось да Анюты!.. Ну, да Ганны яшчэ куды ні ішло, але да замужняй?.. Няхай муж той недзе далёка, і маладой бабе хочацца, аднакжа суседзі!..» Паабуралася гэтак, тады перастала, маўляў, тае бяды!..

За абедам расказала, што робіцца ў вёсцы. Аказваецца, прыходзілі ў Верамейкі яшчэ ўдзень учора чужыя партызаны. Самі казалі, што з атрада нейкага Шамякіна. Брава-Жыватоўскі з Раманам Сёмачкіным, пачуўшы ад кагосьці пра партызан, адразу недзе схаваліся, дарэмна толькі Параска за прымака паплацілася: кабету партызаны нібыта моцна палохалі за паліцая; гразіліся, што заб'юць наступны раз, калі прымак яе немцам і далей не адмовіцца служыць… Але і да звычайных людзей наведваліся – у Міколіхі Макавеевай забралі восеньскае сала; у Гаўрыліхі – мужаў кажух; дарэмна Гаўрыліха маліла-прасіла, так і не вярнулі кабеце кажух, дарма што Гаўрыла старшынёй сельсавета быў; ну а ў Ляксейкі памянялі каня – свайго, кажуць, нейкага шалудзівага паставілі ў хлеў, а Ляксейкавага пад сядло ўзялі; словам, новыя партызаны, што прыйшлі аднекуль здалёку, ці не з-за лініі фронту, паказалі сябе такім вось чынам…

– Можа, яны і ўсе гэткія будуць, – разважыла следам за Марфай Давыдаўнай Кузьмова нявестка.

– Канешне, чужы – не свой, – згадзілася з ёю Марфа Давыдаўна.

– А свой – не чужы, – быццам у нейкую патаемную адпомсту сказаў стары Прыбыткоў, беручы лыжкай на хлеб кавалак яешні.

Жанчыны заківалі галовамі са згодаю на Кузьмовы словы.

Анюта тым часам дадала:

– Ды ў іх і змова нібыта ёсць з паліцаямі. Можа, нават з немцамі, каб адзін аднаго не чапаць. Чужых забівай, а сваіх не чапай.

Пачуўшы гэта, Масей усміхнуўся.

– Чаму ты ўсміхаешся, Дзянісавіч? – заўважыў усмешку Кузьма Прыбыткоў.

– Ды так, – адказаў Масей.

– Хіба што, – з разуменнем пагадзіўся стары. – Кабеты праўду кажуць: Нарчуковы партызаны – свае, савецкія. А етыя, што прыйшлі аднекуль…

– Дык і гэтыя ж, няйначай, савецкія? – паглядзеў на яго з запытаннем Масей.

– Ну і што? – піхаючы пальцам у рот яешню, паціснуў плячамі Прыбыткоў. – Савецкім таксама нешта належыць на зямлі. Вось і бяруць, вось і трасуць. А дзе ж ета сянні Мікіта Драніца? Нябось, злякнуўся недзе, што дружбу з Брава-Жыватоўскім завёў? Цікавы час настае, га, Дзянісавіч? Але адкуль етыя чужыя партызаны зноў узяліся? Кажаш, Давыдаўна, з атрада Шамякіна? Дзіўна, летась па Забесяддзі шасталі да позняй восені карханаўцы. Выходзіць, бальшавікі не баяцца немца, дарма што ён цяпер, здаецца, бярэ верх?

– Адно другое тлумачыць, – сказаў Масей. – Наадварот, чым мацней будзе немец наступаць на фронце, тым актыўней стануць дзейнічаць варожыя ім сілы ў яго тыле.

– Ага, тут як у памоўцы той – ты мяне ў лоб, а я цябе з хваста, – разважыў Кузьма Прыбыткоў, згаджаючыся тым самым з Масеем. – Але я вось пра што думаю, бабы, ці варта цяпер гаспадарку ў вёсцы на ноч адну пакідаць?

– Дык ці ж яна адна застаецца? – запярэчыла Марфа Давыдаўна. – Вэнь колькі народу ўчора назад адсюль вярталася. Значыць, і начавалі многія ў вёсцы.

– Ну так, – не залюбіў гэтакай заспакоенасці Кузьма Прыбыткоў, – мы тута сабе спакойна косім, а там чужыя людзі па хатах шастаюць. Брава-Жыватоўскі няхай сабе. Рамана Сёмачкіна таксама шкадаваць ці варта. Самі ведалі, на што ішлі. Хоць з другога боку – старасту ж мы самі выбіралі. Мог стаць нават бацька твой.

– Ты ўжо Дзяніса раўняеш з Раманам Сёмачкіным? – страпянулася Марфа Давыдаўна.

Але Кузьма Прыбыткоў супакоіў:

– Я не пра тое, Марфа. Я пра тое, што стараста ўсё ж не паліцай. Ну а што яшчэ яны рабілі ў Верамейках, партызаны?

– Анюта Жмэйдава таксама скардзілася, што нібыта па сала да іх прыходзілі, але кубел пусты аказаўся.

– Не такі ён у іх пусты, – акурат нездаволена ўсміхнулася Кузьмованявестка. – Схавалі недзе тое сала. Жмэйдавы не стануць на віду трымаць хоць што, калі дайжа маленькая пагроза ёсць.

– Не, мы сянні не станем начаваць на лузе, – нарэшце сказаў Кузьма Прыбыткоў. – Як думаеш, Дзянісавіч? Бачу, Андрэя Марухіна таксама не відаць ужо на паласе.

Марфа Давыдаўна глянула ў той бок, дзе была паласа Ганны Карпілавай: сапраўды, паміж пракосаў завіхалася адна Ганна.

– Час не мядзведзь, – прамовіла на гэта Анюта.

– І ты пра ета ведаеш! – незалюбіў свёкар.

– А чаму ж мне не ведаць? – ці не з зацятасцю азвалася на яго словы Анюта. – Ета мядзведзь не часта ў сваёй бярлозе з боку на бок варочаецца, а час…

Кузьма ўсмешліва паглядзеў на нявестку, затым сказаў, акурат цыкнуў:

– Ты ела б, а го!.. – Стары перавёў позірк на Масея: – Можа, і табе пасцерагчыся, Дзянісавіч, пакуль бацька не вернецца?

– А што бацька? – Масей адсунуў ад сябе міску, з якой сёрбаў кіслае малако, паклаў на кавалак хлеба лыжку.

Але Кузьма не паспеў адказаць яму. Сказала маці:

– А тое, што сусед праўду кажа. – Пры гэтым Марфа Давыдаўна глянула на Анюту, быццам тая была вінавата ў Масеевай няцямлівасці.

Дзіўна, але дасюль Масею і ў голаў не прыходзіла, што некалі паўстане такая праблема. За бацькавай спіной было спакойна гэты час жыць, здавалася так яно і будзе працягвацца вечна, балазе, сялянская праца, якая пачалас з вясною, дакладней, у якую Масей увайшоў цалкам вясной, стала нарэшц прыносіць задавальненне, аказваецца, адной гэтай працай можна было за поўніць чалавечае існаванне. Якраз вось гэтага Масей яшчэ не ведаў. У кожным разе, занятку цяпер яму хапала, ён рады быў яму, як нейкаму нечаканам збавенню. Нават пра сваё лагернае жыццё ў «Чырвоным арата і» за вясеннія і летнія месяцы напрач забыў успамінаў, можа, недзе адным толькі краем, калі нейкія цяперашнія рэаліі альбо мінулае выклікалі асацыяцыі.

Але ні Кузьмова насцярога, ні маўчанне не ўстрывожылі яго; толькі на момант падумаў, што не выключана магчымасць, можа здарыцца і такое, аднак боязі не ўзнікла. Урэшце, ужо колькі чаго выпадала ўжыцці, што, здавалася, горшага не бывае. Хіба адна смерць. Дык і яе Масёй чамусьці ўспрымаў каторы год спакойна, дакладней, ставіўся да яе спакойна – не тое што пагарджаў, проста не задумваўся, і ўсё. Зняволенне навучыла ўсё-ткі шмат чаму. Акрамя таго, Масею іншы раз здавалася, што ён ужо аднойчы паміраў, хоць сказаць пэўна, калі і як, не мог, у тым ліку не мог назваць напэўна і той выпадак, што здарыўся на этапе ў Сібіры. Можа, проста прымаў за смерць магчымасць памерці. Таму і адказваў цяпер амаль абыякава:

– Пакуль трэба касіць, а там…

Кузьма ўсміхнуўся:

– Яно, Дзянісавіч, і праўда, з перапуду чортведама што нарабіць можна. Нават сябе насмяшыць, не тое што людзей. Помню, мы з братам натрапілі аднойчы на нейкую банду. З пілой прадольнай на заробкі тады хадзілі. А бандаў у той час, трэба сказаць, хапала. Можа, як цяпера партызанаў. Ну і напароліся ў лесе. Якраз хату аднаму мужыку памеліся зрубіць. Выбралі ўжо некалькі дрэў памецілі. Стаім і разважаем, як валіць будзем, а яны, адкуль ні вазьміся, шусь да нас з-за кустоў. Хто такія? Ну, кажам, пільшчыкі. А вот мы зараз пабачым, якія вы пільшчыкі. Адзін, мусіць, самы праворны, кідае на сук вяроўку, пятлю робіць. Бачым, нявыкруткі. Павесіць ні за што ні пра што могуць. Дак мы і ўкленчылі перад тымі бандытамі з братам, сталі

прасіцца, ледва не слёзы ліць. А тыя рагочуць. Нарэшце адзін, што быў у жоўтым скураным галіфэ, няйначай, атаман, здзекліва гаворыць: цяпер бачым, што пільшчыкі. Ну, мы й лататы куды вочы глядзяць, абы нягоднікі не перадумалі. І вось той выпадак заўсёды помню, Дзянісавіч, а ў старасці нават саромецца яго стаў. Чамусьці сорамна, і ўсё тута, што таксама ўкленчваў. Так што… Ты ета праўду кажаш, трэба касіць… Перастаялая трава не надта які корм для жывёлы. Цяпера во у самым саку. Сячэш, дак ажно пырскае. Як казаў ветфельчар Кудраўцаў ты ж яго помніш, – вітаміны.

– Ага, трава набрыняла, – падхапіла з нейкім прасветленым позіркам Марфа Давыдаўна. – І сохне таксама добра. Падвернем яшчэ па разу, а тады і ў копы можна будзе скідваць.

Кузьма паклаў лыжку на край абруса ў знак таго, што з абедам можна канчаць, павёў вачамі па палосах – і па сваёй, і па Зазыбавай, сказаў:

– Але ж па кончыку, здаецца, застанецца на заўтра.

– Тае бяды, – махнула рукамі Марфа Давыдаўна.

– Ая задыхаюся, – прызнаўся Кузьма.

– Дак парыць, – бліснула вачамі нявестка.

– Ёсць адкуль вільгаці брацца, – кіўнуў свёкар. – То пагончык сустрэнеш, то тоню ў асацэ адкрыеш, а ўсё ж з іх угору ды ўгору пры гарачыні імкне. Але задыхаюся я, бадай, не ад вільгаці. Гады. Дай трава сянні нібыта паклычаная стала, не тое што ўчора. Ай няпраўда, Дзянісавіч?

Масей усміхнуўся. Кузьма ад гэтай усмешкі ягонай чамусьці пажвавеў:

– Памяні соль, каб далі хлеба. Ну, дзякуй вам, гаспадынькі. Вячэраць, дасць бог, сапраўды, можа, дома будзем.

Між тым на лузе пачуліся бязладныя галасы, усё роўна як дзеці з нечага закрычалі раптам, а людзі пачалі паказваць на лес. Высокі слуп чорнага дыму займаў там белае, акурат выцвілае, неба. Вынікаў ён як не з таго боку, дзе знаходзіліся Верамейкі. Таму ўсе, хто сядзеў цяпер каля Прыбытковага воза, падумалі, вядома, што занялася вёска. Але Кузьма неўзабаве заспакоіў:

– Ета, здаецца, у Зацішшы.

І тым не менш трывогі зусім не патушыў. Трывога – яна таксама, як нечаканы пажар.

Спяшаючыся, кабеты пачалі хуценька збіраць з абруса рэшткі абеду. Масей адышоўся крокаў на колькі ўбок, стаў там, схіліўшы галаву, быццам пажар лепей было яму слухаць, чым глядзець. Але ўвесь час таксама прыкідваў ужо, дзе гарыць. Выходзіла, сапраўды дыміла штосьці ў Зацішшы – якраз можна было ўгадаць тую малую адлегласць, якая разводзіла абедзве вёскі. Ды і не вясковыя хаты гэта гарэлі, бо дым, які моцна, штуршкамі, шугаў за лесам, зусім не падобны быў на саламяны: дарма што таксама клубіўся, але выгляд меў чорны, усё роўна як утвараўся з сасновых ці яловых карчоў.

Аднекуль з’явіўся на кані Сілка Хрупчык, падскочыў да Прыбытковага воза, закрычаў:

– Гарым! Гайда ў вёску!

Але Кузьма ступіў да Хрупчыкавага каня, тузануў за повад на аброці:

– Не палохай людзей, Сіланці! Бачыш, гарыць трохі збоч Верамеек?

Сілка крутануўся, пачаў нібыта нанава ўглядацца ў дым, што акурат выпампоўваўся з-за лесу.

– Але ж праўда, – усё роўна як здзіўлена заўсміхаўся нарэшце ён, – штосьці не падобна, што ета ў нашых Верамейках.

– Во, нарэшце і да цябе дайшло, – сказаў Кузьма Прыбыткоў. – Але ж можна і ўдакладніць, га?

– Як?

– Ты ж на кані ўжо, дак злятай. Да не ў Верамейкі гані, а ў Зацішша. Ці не смалакурня ета гарыць?

Кузьмова прапанова хоць і з’явілася для Сілкі Хрупчыка нечаканасцю, але ён не стаў пярэчыць, толькі на момант нагнуў галаву, быццам яшчэ ў нерашучасці, тады пачаў таўчы босымі пяткамі пад пахі каня, скіроўваючы яго на зацішанскую дарогу.

Масей падступіўся да Прыбыткова, спытаў:

– Што рабіць мецьме, дзядзька Кузьма?

– Дак… – Стары тузануўся неяк, пацёр рукой няголеную шчаку. – Дома нам трэба быць, вось што рабіць! У час пажару гаспадар каля сваёй хаты павінен стаяць, далёкі ён, той пажар, ці блізкі. Бачыш, вельмі моцна гарыць, га? Адну копаць у неба прэ. Няйначай, смалакурню хтосьці падпаліў.

– Калі ета Сілка аб’едзе і Зацішша, і Верамейкі, – сказала Марфа Давыдаўна. – Трэба дамоў бегчы.

– А навошта ета ехаць з Зацішша ў Верамейкі? – здзіўлена паглядзеў на яе Прыбыткоў.

– Дак…

– Пабачыць, што пажар у Зацішшы, і вернецца, – з упэўненасцю, што якраз гэтак і зробіць Сілка Хрупчык, сказаў Кузьма. – Колькі тут ехаць?

– А я, бацька, пайду ў вёску, – занепакоена сказала Анюта. – Марфа Давыдаўна як хоча, а я пайду.

Кузьма ўсё роўна як няверліва глянуў на нявестку, затым на Марфу Давыдаўну.

– Няхай збегае, – кіўнула тая, – а я і за вашым сенам пакуль дагледжу.

– Што тут ужо бегаць, – нарэшце разважыў Кузьма. – Няхай застаецца ў вёсцы, раз наважылася. Ды й мы таксама будзем патрохі збірацца. Копы заўтра складзем. Ладна, дачка, ідзі.

Анюта ўскінула на воз абрус з посудам, узяла граблі. Сказала чамусьці вельмі ціха:

– Дак я тады і праўда пайду?

– Ступай, ступай, – замест свёкра падахвоціла ў дарогу яе Марфа Давыдаўна.

Не згаворваючыся, мужчыны тым часам пабралі косы, падаліся зачынаць новыя шнуры. Па дарозе Кузьма спытаў Масея:

– Каса твая добра бярэ? А то вазьмі бацькаву. Той сянні не паспеў затупіць. Дарэмна кляпаў лічы, увесь світанак.

– Не, мая таксама яшчэ рэжа, – адказаў Масей.

– То папрацуем, а то колькі глядзець на еты пажар? Вачамі ўсё адно яго не патушыш.

– Сапраўды, не патушыш! – Масей ажно засмяяўся ў душы з гэтых Кузьмовых слоў. Яны сталі раптам акурат забаронай нават азірацца назад, не тое што далей стаяць ды талопіць вочы ў той бок. Але тым часам Масей неяк зусім хутка ўспомніў як першы раз бачыў пажар. У вёсцы гэтая з'ява таксама жахлівая, як і паўсюль. Не паспееш згледзець вокам, а полымя паспявае выкаціць усю вуліцу, бо колішняе малазямелле прымушала людзей сяліцца, быццам авечак ціснуцца адна да аднае ў спёку. Верамейкі таксама будаваліся пры малазямеллі, дарма што і новых двароў таксама хапала ў вёсцы, але ставіліся яны пераважна на старых сядзібах. Гарэла тады Лукашкова хата. Стаяла яна ў тым жа завулку, што і іхняя, Зазыбава, таму пажар амаль увесь час гарэў у Масея на вачах. Было гэта ўначы, і яго, Масея, вынеслі з хаты, кінулі ў дзедавым кажуху пад грушу. Так ён і праляжаў там да ранку, няйначай забыты, бо ніхто не ўспомніў пра яго амаль усю ноч, балазе, дарослым хапала справы. Дыму на тым пажары Масей не бачыў, толькі трапяткое, ажно гарачае полымя; вакол Лукашковай сядзібы мітусіліся людзі, а на грушы, пад якой ляжаў Масей, трывожна шамацела лістота. Як цяпер разумеў Масей, дык пажар той адбыўся недзе ў познюю восень, бо на грушы, акрамя лістоты, ужо нічога не было. Не засталося і страху ад яго, адзін выразны ўспамін, ад якога, калі з нейкай прычыны раптам дападала памяць, вось гэтак, як сёння, пякло лоб, які, мусіць, вытыркаўся тады з дзедавага кажуха.

Сілка Хрупчык між тым абярнуўся хутка – з Зацішша адразу памчаў назад на луг, таму касцам неўзабаве давялося вяртацца да воза. Сапраўды, гарэла ў Зацішшы, палаў смалакурны завод, які надумалі знішчыць партызаны, каб не дастаўся немцам.

Верамейкаўцы паслухалі праўду з Сілкавых вуснаў, пачалі сцішана разыходзіцца. Толькі Іван Падзерын затрымаўся даўжэй каля Прыбытковага воза, злосна сказаў, каб чулі Масей з Кузьмой:

– Етым парцізанам таксама закарцела з агнём пагуляць!.. Цяпера будзем лучыну паліць.

Няйначай, што не адзін Падзерын гэтак падумаў пра партызанскую аперацыю ў Зацішшы, але выказаўся адкрыта толькі ён. Стары Прыбыткоў таксама маўчаў, можа, хацеў нават, каб свае адносіны да яе выказаў Масей. Але той сцяўся, нібыта робячы выгляд, што ўсё гэта, у тым ліку і вынікі, якія мецьмуць ад пажару, яго ўжо зусім не турбуюць. Нарэшце Кузьма не вытрымаў, сам азваўся:

– Бачыш, Дзянісавіч, якая яна, вайна ета. І адзін робіць, думаючы, што правільна, і другі, а ў накладзе застаецца мужык. Ета ж чаму партызаны падпалілі зацішанскую смалакурню?

– Хто ж іх ведае.

– А тут і ведаць не дужа трэба. Бо немцы збіраліся пусціць яе ў ход. Начальніка прызначылі. Пракопа Папруйчыка, ну, таго, што апальшчыкам да вайны тама быў. Дак

партызаны цяпера во апярэдзілі. Кату пад хвост з дымам пусцілі. Таксама пра нешта думалі, няйначай, каб немцу каламазь не дасталася. Цяпера атрымаюць каланіцу. Ну а нам, мужыкам, дак… Еты Падзерын праўду кажа, давядзецца лучыну паліць, хоць шкіпінар таксама не карасін. Словам, ні сказаць нікому, ні параіць. Адно пазірай ды сапі ў нос. Нездарма ж немцы ў сваіх газетах пішуць, што вызваляюць народ ад бальшавікоў а бальшавікі, наадварот, сцвярджаюць, што абараняюць той жа народ ад фашыстаў. Ну, бальшавікі – ета зразумела, ад таго, што іх больш, чым іншых, а фашысты адкуль, Дзянісавіч?

– Доўга расказвянь, дзядзька. Адклядзем гэта на пазней. Яа наступнай зімы. Прыйду да вас у хату, сядзем ды і станем гаварыць.

– І то праўда, Дзянісавіч. На што ўжо нашы мужыкі гаваркія ў апошні час былі, асабліва летась, калі яшчэ немцаў не было, а цяпера вось… Бачыш, Падзерын таксама вякнуў каб не ўсе пачулі. Праўду людзі кажуць – не гуляй шапкай, бо галаве балець стане. Але ж і бацька твой недзе позніцца, бачыш. Прывык я да яго ў жыцці. З’ім неяк лягчэй бывае, калі раптам што.

– Я таксама без бацькі цяпер быццам не заўсёды ведаю, што гаварыць, – засмяяўся Масей.

– Бачыш, які ў нас твой бацька. Але я ўжо думаў летась – далучыць Брава-Жыватоўскі з бабінавіцкім камендантам яго да немцаў. А тут адкуль ні вазьміся партызаны етыя пайшлі.

– На двух зэдліках яшчэ нікому не ўдавалася доўга сядзець.

– Дак ён і не дужа сядзеў, каб на двох…

– Гэта я так. Да прыкладу. Каб паразважаць.

– Цяпера партызаны не сцерпяць, каб нехта вельмі хітры быў. Я неяк чытаў лісток іхні, дак адкрыта пагражаюць таму, хто да немцаў імкнецца. Маўляў, і мы, ета значыць партызаны, за гэрбус возьмем, і савецкая ўлада пасля здраду не даруе. А немцы таксама сваё.

– Там, па той бок фронту, няйначай, лягчэй чалавеку. А тут – лічы, грамадзянская вайна.

– Ага, абапал чырвоныя і немцы, а пасярод мы – мужыкі са сваімі заечымі душамі, не ведаем, да якога берага прыстаць. Як думаеш, Дзянісавіч, хто выйграе?

– У якім сэнсе?

– Ну, той, хто ў партызаны, дапусцім, ідзе, ці той, хто ў паліцыю падаецца, да немцаў?

– А-а, ты вось пра шго. Тут, здаецца, усё проста, дзядзька Кузьма. Нават вельмі проста. Расію яшчэ ніхто не заваёўваў надоўга. Ды і цалкам таксама. Так, па частках здаралася. Але не ўсю. Гітлеру таксама нічога не свеціць у нас. Ну год, ну два, ну тры немцы тут пратрымаюцца… Не, я нават не хачу загадваць наперад.

– Дак ты лічыш, што цяперашнія поспехі часовыя ў яго?

– Бадай што. Адсюль і адказ на тваё пытанне – хто будзе мець выйгрыш? Хутчэй за ўсё, што…

– Ні тыя, ні другія?

– Так.

– Але ж перамогуць, як ты кажаш, рускія?

– А вінаватыя будуць усе, хто тут, у акупацыі, заставаўся.

– Дак ета ж страшна, Дзянісавіч! Дак ета ж лепей цяпера хоць у етым пажары, што ў Заціншы, згарэць!

Між тым пажар патрохі аціхаў за лесам. Слуп чорнага дыму хоць і клубіўся яшчэ, аднак памяншаўся ўвачавідкі, асядаў, быццам з вялікай неахвотаю, нахіліўся, распаўзаўся на бакі, займаючы неба шырэй і шырэй. Цяпер з таго боку ўжо дзьмуў вецер, на лузе з'явіліся новыя пахі, наймацней закіпелай смалы. Дыхаць станавілася цяжэй нават здаровымі лёгкімі. Кузьма Прыбыткоў пачаў кашляць.

Масей зайшоў ад лесу ў канец паласы, убіў касу ў сухую траву. Штосьці бразнула аб лязо. Масей прыкра паморшчыўся, быццам накалоўся на што босай нагой, прыўзняў над зямлёй касу. На паточаным мурашніку, які зрэзала каса, ляжала, бліскаючы пашкоджаным месцам, заржавелая гайка. «Ну вось, яшчэ гэтага не хапала!» – акурат ускіпеў у душы Масей, гатовы вылаяцца; паставіў кассём перад сабой касу, глянуў на свежую шчарбінку, роўную пазногцю. «Трэба ўсё-ткі ўзяць бацькаву касу», – падумаў ён. Схадзіў да воза, узяў бацькаву літоўку, вярнуўся на месца, дзе зазубрыў сваю, пачаў зноў касіць. Хутка Кузьма Прыбыткоў застаўся далёка ззаду. Але гэта ўжо чамусьці не грэла Масеева самалюбства. Чым мацней шоргаў касой па траве, тым выразней адчуваў ліпкі халадок на лапатках пад кашуляй. У вушах стаяў толькі той шум, што рабіў вакол сябе сам. Здавалася, што ў ім Масей патанаў цалкам і ніяк немагчыма было ўшчыльнуцца сюды камусьці іншаму. У адрозненне ад учарашняга, пасля абеду сёння таксама не адчувалася ў рабоце радаснай узнёсласці, як і зранку – адна зацятасць, ад якой моцна напружваліся рукі і ногі. Адбывалася на паласе, як кажуць, звычайная цяжкая работа, сэнс якой заключаўся ўсяго ў тым, каб скончыць адзін пракос ды пачаць новы. Відаць, праз гэта без асаблівай узрушанасці быў успрыняты таксама прыход на луг з Цімохавай пожні маладзенькага лася. Той выйшаў з лесу якраз у той момант, калі Масей, дапяўшы да Бесядзі, абкошваў над вадой алешыну. Перазімаваўшы і, бадай, пералетаваўшы ў Мамонаўцы, маладзенькі звер зусім не баяўся людзей, ішоў сабе праз палосы без насцярогі да Бесядзі ды падскокваў часам, палохаючыся лугавых жаб, якія ажно шалелі на пеньчуках травы ад нечаканай, таму, можа, радаснай для іх волі. Няйначай, яго выгнаў з пожні дым, а можа, проста даймала смага, і ён ішоў да ракі напіцца, ведаючы дарогу. Але ж верамейкаўцы бачылі напаўдаростага лася ўпершыню. Здаецца, мала хто не чуў у вёсцы, што ў Мамонаўцы яшчэ ў мінулую восень на двары Гапкі Азаравай знайшло прытулак тое ласяня, што засталося адно пасля забойства старога лася на сухадоле каля крыніцы, але сустракаць небараку вось так не даводзілася. І вось гэты маладзенькі лось раптам з'явіўся на далёкім лузе за Топкай гарой.

– Глянь-глянь! – чулася над лугам здалёку, хоць людзі, трэба сказаць, і не дужа крычалі пры гэтым.

Дзіўна, але нават малыя хлапчукі, такія, як у Ганны Карпілавай, не рашаліся гнацца за ім, можа, не да канца верачы, што звер сапраўды прыручаны ўжо і што яго не надта спалохаеш, калі нават пачнеш падыходзіць бліжэй.

Абкасіўшы алешыну, Масей не стаў хапацца за наступны пракос. Хоць для яго і не было асаблівым дзівам з'яўленне маладзенькага лася, аднак і ён стаў назіраць за ім, праводзячы зрокам да Бесядзі і назад. А звер сапраўды доўга не затрымаўся каля ракі, адно напіўся ды чамусьці пакратаў штычком зямлю пад берагам, быццам хацеў пабадацца.

Тым часам на бераг ракі вычаліў пракос свой і Кузьма Прыбыткоў.

– Ну дак бачыў, Дзянісавіч, падрасло за зіму ласяня?

– Гэта мой стары знаёмы.

– Адкуль жа?

– Сёння на Цімохавай пожні бачыў, калі па коні хадзіў.

– А-а, я забыў, што ты ўжо расказваў, – зразумела кіўнуў Прыбыткоў, выціраючы травой касу. – Старая памяць. Што з яе возьмеш? Ну дак бачыш, падрасло. Цяпера выжыве, калі, вядома, не натрапіць наякога злыдня.

– Так.

– Але ж таксама трымаецца, бачыў? Як бог. Прайшоўся паміж людзей і вокам не маргнуў.

Масей у адказ усміхнуўся, таксама пахваліў маладзенькага лася:

– Прыгожы, нягоднік, нічога не скажаш!

– Чаму адразу і нягоднік?

– Гэта ў мяне бывае вышэйшай адзнакай захаплення. Прыяцель мой некалі так гаварыў. Нават свайго сына ад захаплення называў нягоднікам.

– Ну, тады што ж, тады няхай па-твойму і еты будзе нягоднікам, – згадзіўся Кузьма і засмяяўся, няйначай, адразу з усіх – лася, Масея і таго ягонага прыяцеля.

Захопленыя размовай пра лася, мужыкі не заўважылі, як ад сваёй паласы, сігаючы па раскіданай траве, рушыў да іх у суправаджэнні Гапчыных хлопчыкаў Андрэй Марухін. Учора ён абяцаў прынесці з вёскі браднік. Цяпер той браднік Андрэй трымаў на плячах. Праўда, задужа доўга чалавек хадзіў па яго, бо адсутнічаў на касавіцы, лічы, цэлага паўдня. Але і Кузьма Прыбыткоў, і Масей разумелі, што браднік – гэта так; няйначай, Марухін хадзіў кудысьці па больш важнай справе, можа, у сувязі з новымі партызанамі, што прыходзілі ўчора ў Верамейкі. Да таго ж сёння – не ўчора, альбо наадварот, – учора Андрэева абяцанне палавіць рыбы на юшку выклікала ля вогнішча, можна сказаць, усеагульнае захапленне, асабліва ў дзяцей Ганны Карпілавай, якія душы не чулі ў гэтым чужым чалавеку; сёння было не так, нават дзеці неяк стомлена глядзелі на браднік, калі Андрэй прынёс яго спярша на сваю паласу, затым – на Зазыбаву.

– Ты нашага бацькі не бачыў дзе? – спытала ў Андрэя Марфа Давыдаўна.

– Не, – адказаў той.

– Што ў вёсцы?

– Анічога.

– Так ужо й нічога?

– А што вы хацелі, Марфа Давыдаўна?

– Дак кругом вэн гарыць, а Дзяніса ўсё няма…

– Дзяніс Яўменавіч не згубіцца. Не малы.

– Бывае, што й дарослыя губляюцца. Асабліва калі во цяпера. Сам жа таксама недзе бадзяўся?

– Браднік шукаў.

– Дак ці ж так доўга браднік шукаюць? Ды й навошта ён цяпера?

– Я таксама яму кажу ета, – падтрымала гаворку Ганна Карпілава, якая прыйшла да суседзяў следам за прымаком. – Не да рыбы становіцца, не да юшкі. Таго і глядзі, што самому юшку пусцяць. А паласа тым часам някошаная стаіць.

– Паласу мы пакосім, Ганна, – сказаў на яе словы Масей.

Але тая ўсё роўна як раззлавалася раптам.

– Колькі ўжо ты будзеш касіць маю паласу! – Гэтыя словы ў яе вуснах цяпер прагучэлі неяк у два сэнсы: з аднаго боку – дакорліва, з другога – усё роўна як адчайна, маўляў, навошта табе, Масейка, у нашыя справы лезці.

Па яе тоне, а найбольш па выразу твару, на якім адбілася ці не пакута нават, Масей адчуў, што дарэмна гэтак няўдала далучыўся да размовы; стала адразу ніякавага, акурат яго падлавілі на даўнім заляцанні; тым больш што пасля Ганчыных слоў і Андрэй Марухін неяк дзіўна паглядзеў на Масея.

Але вось крактануў Кузьма Прыбыткоў, і ўсё акурат пастала на месцы – і гаворка, што прымала, бадай, ужо непажаданы паварот, і тыя, хто прымаў у ёй удзел.

– Сянні не толькі твая паласа застанецца недакошанай, Ганна. Бачыш, нашыя таксама, дарма што ўвесь час з Масеем хапаліся. Ну а што да юшкі, дак тута Ганна праўду кажа – моцна ўсхадзіліся вакол нас чужыя людзі, так і свярбяць у сяго-таго рукі. Я ета зразумеў яшчэ, як прыходзіў сюды ўранні Пацюпа. Мы, Андрэй, таму рашылі ехаць на ноч у Верамейкі. Так што, браднік твой…

– Трэба толькі Дзяніса дачакацца, – як пра штосьці застарэлае, сказала Марфа Давыдаўна і абвяла ўсіх акурат умольным позіркам.

* * *

З дзённіка баявых дзеянняў ахоўных войск групы армій «Цэнтр». 1.7.1942. 221-я ахоўная дывізія, якая сумесна з падраздзяленнямі 286-й дывізіі заканчвае правядзенне чарговай аперацыі, паведамляе аб руху буйных сіл праціўніка ў раёне на поўдзень ад Почапа. Відаць, справа ідзе аб сілах, што былі выцеснены з суседняй вобласці армейскага тылу, дзе зараз праводзяцца значныя аперацыі. 203-я ахоўная дывізія паведамляе аб пачатку аперацыі пад кодавай назвай «Майкефар» («Майскі жук»), Паўсюды баі з праціўнікам. 2.7. Камандуючы генерал і шэф едуць у Магілёў для агляду 600-га казацкага батальёна і размовы з вышэйшым начальнікам СС і паліцыі. Прысутнічае аддзел I «а» 203-й ахоўнай дывізіі. Часці мясцовай паліцыі будуць удзельнічаць у аперацыі «Майкефар» для блакіравання з поўначы. 3.7. 221-я ахоўная

дывізія паведамляе аб далейшым узмацненні бандыцкай дзейнасці ў раёне на поўдзень ад Почапа. Дывізія атрымала ўказанне ўмацаваць мясцовыя апорныя пункты і перш за ўсё гарнізон у Почапе. Паступаюць паведамленні пра бандыцкую актыўнасць у раёне Краснае, на шасейнай магістралі VIII. Кіраўніцтва бандытамі знаходзіцца ў руках ваеннапалонных, якія ўцяклі з лагераў. 4.7. Без асаблівых здарэнняў. 5.7. Дзённыя паведамленні сведчаць аб далейшым абвастрэнні абстаноўкі. Нягледзячы на ўзмоцненую ахову адбываюцца нападзенні на цягнікі з забеспячэннем і на абозы. Растуць выпадкі мініравання дарог. 6.7. Камандуючы генерал на самалёце ляціць у Гомель, у 221-ю ахоўную дывізію. Генерал-маёр Ландэ, якому да гэтага часударучана камандаванне дывізіяй, зараз прызначаны яе камандзірам. Генерал-лэйтэнант Пфлюгубайль пераведзены ў рэзерв фюрэра. Аддзел I «а» паведаміў 286-й ахоўнай дывізіі, што дзвесце добра ўзброеных партызан перасеклі шашу за 23 кіламетры на паўночны захад ад Рослаўля. Відаць, гаворка ідзе аб рэштках бандытаў, знішчаных у часе аперацыі «Вальдкэтар» 2-й танкавай арміі. 7.7. Камандаванне 2-й танкавай арміі паведамляе, што вызваліць для нас 350-ы пяхотны полк і 3-ці батальён 213-га артылерыйскага палка пакуль не мае магчымасці. Камандаванне 4-й арміі паведамляе, што змушана затрымаць адпраўку 704-га каравульнага батальёна.

X

Зазыба похапкам запрог буланага, вывернуў з калёсамі на паплаўцы паміж густога зарасніку да бялынкавіцкай дарогі, але тым не менш выязджаць на яе замарудзіў. Немцы маглі апынуцца ўжо і там. У такім разе заўсёды лацвей агледзецца чалавеку вакол, нават калі і прыспешвае нейкая справа, а на апошні выпадак – хоць вухам дапасці на якую хвіліну да наваколля, паслухаць. Аднак галасы, здаецца, і праўда ўвесь час даляталі сюды па вадзе з аднаго пясчанага плёса, дзе немцы знайшлі пераправу, да таго ж знарок прыглушаныя, значыць, пераправа адбывалася скрытна, і Чубар з Зазыбам натрапілі на яе выпадкова, можа, не так выпадкова, як нечакана. Але тады можна было лічыць, што якраз выпадковасць і развяла іх з немцамі.

Чубар тым часам нячутна палез у лазовыя кусты. Зазыба памкнуўся быў штосьці сказаць наўздагон, але перадумаў, балазе, на самай справе нічога важнага не было, каб затрымліваць чалавека, ды і самому неабходна было выбірацца адсюль, таму Зазыбу сапраўды, нарэшце, нічога не засталося, як выехаць на бялынкавіцкую дарогу, пільна ўглядаючыся ў два канцы. Немцаў не было відаць. Зазыба тарганўў за правую ляйчыну, ціха цмокнуў, каб панудзіць буланага, але калёсы раптам затарахцелі на каранях, давялося зноў прыцішваць каня. Ехаць з такім шумам па лясной, звілістай дарозе адразу зрабілася страшна, дарма што заставалася малаверагодным, каб немцы паспелі непрыкметна праехаць тут. Аднак жа нездарма кажуць: таго, хто асцерагаецца, і бог у дадатак беражэ. Па ўсім выходзіла, што лепей было б з'ехаць з гэтай дарогі. Зазыба падумаў і павярнуў каня, паганяючы яго праз лес да Бесядзі, паўз якую ў Калодліва вяла яшчэ адна дарога, хоць і не такая шырокая ды торная. Праўда, недзе тут была яшчэ і трэцяя дарога, але каб даехаць па ёй да таго ж Зацішша, дзе Зазыба спадзяваўся напаткаць партызан, то давялося б праехаць ажно некалькі вёсак, прынамсі, дзвюх ужо ніяк не мінаваць – Панькоўскую Буду, а затым Кавычачы, дакладней, трэцюю частку іх, усё таго ж Мялька. Адна справа – хутчэй трапіць да партызан, другая – мазоліць сабою людзям вочы. Таму зразумела, што нетаропкі Зазыба з усіх трох дарог выбраў у думках другую, яна пры цяперашніх умовах здалася зручнейшай. Толькі як адсюль, з вусця Зубара, узбіцца на яе? «Ат, было не было!» – махнуў Зазыба рукой. Конь спярша лёгка сышоў з бялынкавіцкай дарогі, а далей не стаў слухацца вазака, сам пачаў выглядаць прагаліны паміж дрэў, якіх акурат хапала, каб не зачапіцца калясьмі; колы з ціхім хрустам зашуршэлі па сухім моху, але і праўда нягучна, прынамсі, таго шуму, які цяпер рабілі і конь сваімі капытамі, і колы, не хапала, каб вельмі парушыць зацятую цішыню, што ўсё яшчэ стаяла ў лесе; Зазыба нават падумаў, што гэта на руку, бо не трэба залішне высільвацца ды прыслухоўвацца. Разам з тым самастойнасць каня давала магчымасць не толькі арыентавацца на мясцовасці – ужываючы геаграфічную тэрміналогію, аднак і падумаць над акалічнасцямі, што раптам прымусілі Дзяніса Яўменавіча вяртацца назад, а Радзівона Чубара застацца ў вусці аднаго з прытокаў Бесядзі. Зазыбу патрэбна было заспець партызан у Зацішшы. Гэта найперш. Але магло стацца, што іх там ужо не было. Значыць, шукаць іх у такім разе патрэбна будзе ў іншым месцы, добра, калі б у тым жа Шурышчы. Таму Зазыба адразу ж пачаў прыкідваць у галаве, куды кіравацца. І пакуль

ён безвынікова разважаў, буланы вывез яго к Бесядзі. Дарога тут была ледзь прыкметная, сёлета па ёй, бадай, ніхто не ездзіў; ішла яна паміж глыбокай поймай ракі і сасновым лесам, тулялася сярод дрэў.

А між тым трывога ў душы вырастала. Асабліва моцна адчуў яе Дзяніс Яўменавіч, калі ўспомніў пра сваіх на лузе. Канечне, сказаць пэўна, у які бок пасля пераправы рушаць немцы – на Кубракоўку ці на Белую Гліну, вызначыць нельга было, але Дзянісу Яўменавічу тым не менш чамусьці здавалася, што хутчэй за ўсё іх трэба чакаць ніжэй па Бесядзі, значыць, ужо сёння яны могуць дасягнуць Гончы, адкуль верамейкаўскі луг як на далоні.

І ўвогуле – уведаць бы намеры немцаў?.. Толькі цяпер, на гэтай глухой дарозе, Зазыба здолеў уявіць учынак Радзівона Чубара, які застаўся пільнаваць нямецкую пераправу. Але як стане паводзіць сябе Чубар у далейшым, калі немцы пераправяцца на другі бераг Бесядзі, угадаць адсюль наўрад ці магчыма было. Тым не менш Дзянісу Яўменавічу чамусьці думалася, што к вечару недзе Чубар таксама вернецца ў атрад, бо не кожны адважыцца пайсці следам за немцамі адкрыта ды яшчэ з вінтоўкай. Разважаючы так, Зазыба падумаў і пра тое, што гэта добра, што Мітрафан Нарчук звёў іх сёння ў Зацішшы, знайшоў на двух тое заданне. І хоць па дарозе здарылася перашкода, аднак галоўнае адбылося – пасля доўгага расстання яны паспелі ў гэтай дарозе адным часам і паразумецца і знайсці паміж сабой, бадай, большае, чаго не хапала ім у даваенным жыцці, якраз даверлівасці, якая ў складаных умовах край патрэбна. Пра гэта Зазыба пачынаў ужо думаць, як яны ехалі ў Бялынкавічы, каб адтуль, забраўшы настаўніка Мурача, рушыць у Канічы. Аднак тады такое адчуванне яшчэ мала чаго дадавала ў іхнія адносіны, акрамя, можа, звычайнай здаволенасці, што нарэшцткі настала магчымасць слухаць адзін аднаго без зласлівай раздражнёнасці, якая раней магла тлумачыцца альбо не супадзеннем поглядаў, альбо проста неаднакавасцю характараў; цяпер прыходзіла новае ўсведамленне: вайна сапраўды многа што перайначыла.

Між тым не ўсё яны паспелі перагаварыць да Зубара. Гэта Зазыба адчуваў асабліва зараз. І чым выразней адчуваў, тым мацней хацеў далейшага паяднання; такая патрэба станавілася нібыта новым адчуваннем, якое вымагала здаволенасці. Дзяніс Яўменавіч гатовы быў нават прызнаць, што з даваеннага жыцця ён застаўся нечым вінаваты Чубару, акурат знарок не хацеў разумець яго тады, а ўжо няйначай што не ўлічваў маладога ўзросту, нявопытнасці, максімалізму і гэтак далей. Словам, з сённяшняга дня нібыта адкрывалася новая паласа ў жыцці.

Буланы, якога паганяў Дзяніс Яўменавіч аднымі лейцамі, ужо ляніўся, прынамсі, ніяк не мог набраць хуткасць. Ды і сама дарога, вузкая, ледзь пазначаная, замінала рухацца: як толькі буланы пачынаў разганяцца, аглоблі чаплялiся за кусты, што ўвесь час навісалі над каляінамі, альбо колы наязджалі на леташнюю ці пазалеташнюю заваль. Трапілася і яшчэ адна перашкода, але яна якраз і вывела Зазыбу зноў на бялынкавіцкую дарогу недалёка ад Калодліва, лічы, ужо каля крайніх двароў, – то

была звычайная ямка, выкапаная ўпоперак каляін, якую нельга было аб’ехаць, бо абапал блізка тоўпіліся дрэвы. Таму нічога не заставалася, як павярнуць каня ў лес.

Няйначай, малыя і вялікія нязручнасці гэтыя шмат забралі часу, бо калі нарэшце зноў паказалася бялынкавіцкая дарога, сонца стаяла ўжо недзе над Верамейкамі…

Дзіўна, але Дзяніс Яўменавіч толькі цяпер адчуў пах таго дыму, што ўжо каторую гадзіну распаўзаўся ад зацішанскай смалакурні па ўсім Забесяддзі задумлівымі хвалямі. Але ж не было відаць і чорнага воблака, што перад тым сягала пад неба. Таму Зазыбу падумалася: мусіць, недзе загарэўся ад сённяшняй спёкі лес. Ці ж хто вытрымае яе? Нават у голаў не стукнула, што гэта згарэла ў Зацішшы смалакурня.

Згадаўшы зноў пра немцаў, якія ўпотай перапраўляліся на Бесядзі, – а ўжо, няйначай, і пераправіліся, – Дзяніс Яўменавіч усё роўна як нанава стаў перажываць усё спачатку: і боязь ехаць вось так адкрыта па гэтай дарозе, і сваю трывогу за Масея і жонку; пра Чубара ён тым не менш чамусьці не ўспомніў; затое за апошнім павароткам дарогі, дзе канчаўся лес, раптам яму заманулася, што нехта паклікаў адтуль.

XI

Чубару не першы раз даводзілася назіраць за немцамі з такой вось хованкі. Пачалося з таго жыта, у якім Радзівон хаваў летась загінуўшага чырвонаармейца. Пасля і яшчэ шмат калі выпадала вось гэтак таіцца альбо ў кустах, альбо за плотам, асабліва тады, як выводзілі з Гусевым акружэнцаў за лінію фронту. Дакладней сказаць, вытрымцы ён навучыўся-ткі, нават у блізкай прысутнасці немцаў ці паліцаяў не адразу хапаўся клацаць затворам, тым больш што затвор у ягонай вінтоўцы даўно знаходзіўся на ахоўніку, даволі было адвярнуць рукаятку. Уласна, Чубар і цяпер гэтак зрабіў, няхутка і лёгка, акурат самахоць, тады лёг на белы мучністы пясок; з ракі тут нельга было ўбачыць яго, можа, толькі з высокай стромы, якая ўзвышалася на правым беразе Бесядзі. Аднак адтуль небяспекі таксама не магло быць, бо немцы перапраўляліся трохі вышэй таго месца, дзе Зубар злучаўся з Бесяддзю, і строма заставалася ў баку ад пераправы. Тым часам самому Чубару адсюль, з лазовай схованкі, назіраць было зручна. Немцы ўсё яшчэ рухаліся ўпоперак ракі, адзін за адным, грымаючы зброю і адзенне над галавою ў руках. Іх бы Чубару пачаць лічыць. Але рабіць гэта было цяжка. Нават няцяжка. Дарэмна. Падліку падцаваліся толькі тыя, што ўваходзілі ў ваду з левага берага. Шмаг немцаў паспела пераправіцца ўжо, іх немагчыма было лічыць увогуле ў натоўпе. Аднак ні артылерыі, ні бронемашын там не было таксама – кудысьці зніклі, відаць, немцы спяшаліся. Але чаму яны выбралі для пераправы гэты брод? «Можа, у іх карты гэткія падрабязныя, – падумаў Чубар, – а можа, праваднік вядзе з нашых?» Нездарма кажуць, што самы незразумелы для чалавека чалавек – гэта ён сам. У кожным разе, Чубар цяпер таксама быў не той, што ў пачатку вайны, а злашча – як старшынстваваў у Верамейках пасля Зазыбы. Але што прыкметна, мяняцца ён стаў якраз з мінулай восені, можа, нават яшчэ ў нечым і раней, гэта Чубар мог сказаць пэўна. Пачалося, здаецца, з таго, што ў душы падчас вялікага хвалявання пачало ўзнікаць даволі дзіўнае адчуванне, нават хутчэй не так самаадчуванне, як штосьці акурат жывое, і гэтае жывое нібыта бралася раптам шкрабаць па сэрцы. І тады адбывалася неспадзяванае перайначанне – што зусім нядаўна было напоўнена сэнсам, раптам пазбаўлялася яго, што ўчора яшчэ мела нейкае значэнне, сёння рабілася дарэмным, а то і нікчэмным. Спярша Чубар насцярожваўся, супраціўляўся гэтаму, аднак паступова пачаў разумець, што ёсць рэчы, у тым ліку, няйначай, і гэтае новае адчуванне, якія маюць не толькі сваю прычыну, а і сваё апраўданне. Не так жа сабе восенню ўсё часцей і часцей стаў з’яўляцца ў сне мінулагодні ваенурач, якога застрэліў на пясчанай выспе ў Расіі. Нейкі час сны бянтэжылі, ажно пакуль не прывык да іх, дакладней, пакуль не палічыў непазбежнасцю, з якой давядзецца жыць. А тут яшчэ гісторыя з немцам, што працаваў камендантам на бялынкавіцкім спіртзаводзе… Гісторыя – гэта к слову. Але Чубар не запэцкаў тады рукі крывёй, балазе, ахвотнікаў расквітацца з немцам і без яго хапіла. Напрыклад, Нарчук першы выхапіў наган з брызентавай кабуры… Чубар стаяў і глядзеў, як са скроні, чамусьці зусім нястрашна, пырснула кроў… Адбылося гэта ў красавіку, калі сышоў снег, і партызаны маленькай гурмой па тупкай зямлі, на якой не

відаць было слядоў, падаліся, як тыя ваўкі-пераяркі, на свой першы промысел. Зіму ўсю яны, лічы, перасядзелі ў зямлянцы, у вёскі наведваліся толькі ў завейныя ночы, каб выведаць што-кольвеч пра немцаў ды папоўніць запасы харчу, якога заўсёды не хапала, дарма што забеспячэннем атрада займаўся не адзін Зазыба. Таму вясну ў Нарчуковым атрадзе сустрэлі з энтузіязмам, калі можна так сказаць, хоць атрад за зіму колькасна і не вырас. Але ў Бялынкавічах ім пашанцавала. Хтосьці падказаў, што на спіртзавод прыехаў з Бабруйска немец, які стаў адным часам і камендантам і галоўным спецыялістам прадпрыемства, і што гэты немец у чыне лейтэнанта паспеў займець у мястэчку палюбоўніцу з былых жонак чырвоных камандзіраў. Партызаны якраз і заспелі яго ў той кабеты. Палюбоўніцы яны не зачапілі, але немца забралі з сабой. Забівалі яго зусім недалёка ад гэтага вусця, дзе цяпер ляжаў Чубар, толькі па той бок бялынкавіцкай дарогі. Немец увесь час кідаўся штосьці растлумачыць забойцам, часта паўтараў – камуніст, сацыял-дэмакрат, аднак ніхто з партызан не валодаў нямецкай мовай, таму ягоныя спробы давесці нешта не мелі ніякага поспеху, а калі папраўдзе, то і не маглі яны мець яго – вельмі ж хацелася партызанам нарэшце запісаць на свой небагаты рахунак яшчэ адну ахвяру!.. Дзіўна, але твар таго нямецкага афіцэра ў сне таксама нібыта насоўваўся на твар ваенурача, і Чубар дасюль не мог даўмецца, чаму гэта паўтаралася. І ўвогуле ён не мог зразумець як след, што з ім рабілася цяпер, злашча, што і жыў ён, і дзейнічаў самым звычайным чынам, гэта значыць, як і заўсёды, дарма што ў ваенных умовах, моцна ўскладнёных варожай акупацыяй.

А самае непрыемнае было ў цяперашнім жыцці ў тым, што не дужа лёгка, а то і немагчыма было пераводзіць злосць у радасць. Чалавеку нельга хадзіць увесьчас са злосцю ў душы. Чалавек тады сохне і дранцвее, ператвараючыся ў небяспечную істоту. Лютасць павінна хоць бы вагацца на шалях, каб не заўсёды браць верх над радасцю.

Цяперашнія Чубаравы разважанні таксама былі на мяжы злосці і радасці, але першая давала адчуваць сябе тым не менш мацней. Ды іначай яно, бадай, і не магло быць.

Немцы між тым усё рухаліся тонкім ланцугом па вадзе. Тупалі марудна, як назнарок, і Чубар не мог прымусіць сябе лічыць іх, знаходзячы кожны раз прычыну для гэтага…

Пры ўсім пры тым Чубар думаў, што залёг у бяспечным месцы. Але не. Раптам штосьці варухнулася ззаду ў кустах. Ён гэта пачуў добра. Нават прыкінуў – няйначай, Зазыба вярнуўся нечага… Але азірнуцца ўжо не паспеў. Моцны ўдар патрапіў яму па патыліцы. Бліснулі іскры ўваччу. Затым стала балюча і цёмна.

У такім стане ён, вядома, не мог бачыць, якія чалавекі ў нямецкай форме, але пры рускай гаворцы, узялі яго ды павалаклі з лазовых кустоў, быццам парсюка таго на смаленне, на пераправу.

* * *

За Калодлівам Зазыба пагнаў каня не шкадуючы: торгаў раз-пораз лейцамі, нокаў-цмокаў, але буланы і цяпер варушыўся не дужа; да таго ж сёння ў яго чамусьці заёкала селязёнка.

На палянах у Панкоўскім лесе, усё роўна як іуман пасля цёплага дажджу, плаваў сівы дым, на зямлі лапінамі ляжала сажа. Цяпер Зазыба ўжо мог думаць, што чад, няйначай, утварыўся ад пажару на зацішанскай смалакурні. Але навошта спалілі яе? Дзяніс Яўменавіч з'едліва ўсміхнуўся, маўляў, забілі зайца – не забілі, а шуму многа нарабілі!.. Тым часам, акрамя партызан, паліць смалзавод тут не было каму, бо немцы якраз прымушалі як хутчэй аднавіць на ім работу. Зазыба мог меркаваць наперад, што ў навакольных вёсках, якія карысталіся паслугамі смалзавода, не даспадобы будзе такая ініцыятыва, незалежна ад каго яна зыходзіла – без шкіпінару ды дзёгцю якое жыццё селяніну? Зіма сёлетняя, напрыклад, паказала, што лучына – далёка не самы лепшы сродак для асвятлення хаты. І ўвогуле ў акупацыі вельмі моцна пацвердзілася старадаўняя ісціна, што сапраўды чалавеку нельга заракацца ні ад турмы, ні ад сумы. Разбурыць, аказваецца, няцяжка, але як на разбураным жыць? Сорам казаць, але Дзянісу Яўменавічу самому давялося ўзімку вазіць колькі разоў сала ды яйкі ў Крутагор'е. Праўда, не соль ды мыла былі галоўным у тых паездках. Зазыбу даручылі ў Нарчуковым атрадзе наведвацца ў партызанскія сем'і, якія вярнуліся яшчэ ўлетку з няўдалай эвакуацыі і жылі цяпер у горадзе. Таму Дзяніс Яўменавіч вазіў нямала чаго і ў райцэнтр, таксама як і прывозіў адтуль у вёску, балазе выменяць сялянскія прадукты на патрэбныя нямецкія рэчы можна было лёгка, а важна – не надта дорага. Словам, у гаспадарцы цяпер, як ніколі, усё прыдавалася. Зазыба часта ўспамінаў бабінавіцкага краўца Шарэйку, які нават не апраўдваўся ў мінулае лета за нямецкае шытво на стале. Мікіта Драніца, які таксама выпрасіў у Брава-Жыватоўскага пропуск у Крутагор'е, хваліўся пасля ў Верамейках: «А што немцы? Ды ім толькі пакажы: за два яйкі – іголка для ручной работы, за пяць – для машынкі. У іх етых іголак колькі хочаш. Ды й другога барахла хапае, таксама солі, запалак… Як у тых местачковых яўрэяў раней. На абмен магазін адкрылі. З рук салдаты гандлююць – гер, гер, а тады ў кішэню сабе цап». Ды што Мікіта? Усе вёскі ўцягваліся ў новае жыццё, якое звалася цяпер «новым парадкам», хоць парадку якраз і не хапала. Проста не назіралася яго. Нават па гэтым смалзаводзе відаць!.. Як ні круці, а пацвярджалася ісціна: не наглытаўшыся дыму, ля вогнішча не сагрэешся…

Зазыба даўно разумеў што ягоныя думкі, разважанні аб жыцці, аб часе, уладзе і так далей заўсёды выпрабоўваліся на разрыў, аднак цяпер да ўсяго яшчэ і абараняць іх часцей за ўсё патрэбна.

Хоць Дзяніс Яўменавіч і часта ездзіў у мястэчка і горад, аднак да немцаў усё-ткі па-сапраўднаму прыгледзецца не здолеў. Што ж да партызан?.. Тут іншае. Тут, як кажуць, свае людзі, якіх ведаў раней. Але ж узаемаадносіны былога крутагорскага начальства, якое з прыходам немцаў пайшло ў партызаны са сваімі сем'ямі, дзівілі.

Сёння Зазыба таксама нездарма спрабаваў высветліць у Чубара, ці ўплывае на дзейнасць раённага атрада гэтая акалічнасць, усё-ткі – жонкі і дзеці некаторых партызан жывуць у варожым стане, а самі яны тут, у лесе? Канечне, Зазыба і сам ведаў, што ўплывае і што гэтая праблема больш значная, чым можа здавацца, але ён не хітрыў з Чубарам; гэткім чынам яшчэ раз карцела пераканацца, наколькі ўсведамляюць яе іншыя і як наогул падобнае заложніцтва стане адбівацца не толькі на далейшых справах, а і на самім жыцці, бо ўжо рабілася зразумела, што лёс датычыў не адных крутагорскіх кабет ды дзяцей – усяго народа, які падпаў пад акупацыю. Пры такім заложніцтвс ахвяры могуць быць незлічоныя. Але цяпер не гэта, дакладней, не адно гэта займала Дзяніса Яўменавіча. Дарэчы, як і ўранні, калі ехаў на адным возе з былым верамейкаўскім старшынёй. А і тое, што непасрэдна датычыла паводзін людзей. Напрыклад, не хацелася тлумачыць толькі страхам перад расплатай за мужава знаходжанне ў Чырвонай Арміі палюбоўныя адносіны бялынкавіцкай кабеты з нямецкім інтэндантам. Ці ж адным страхам за мужава знаходжанне ў партызанах можна было апраўдаць, што адна з жанок стала прымаць у сябе ў Крутагор'і па вечарах ледзь не па чарзе нямецкіх салдат… Ды і само знаходжанне партызанскіх сем'яў у раённым цэнтры не падцавалася цалкам абгрунтаванню – як бы ні сачылі за імі паліцаі ды немцы, а вывесці кабет з дзецьмі адтуль магчымасць заўсёды знайшлася б. Значыць, такое становішча задавальняла пакуль і тых, і другіх. Да таго ж людзей не прымусіш маўчаць. Хадзілі чуткі, што ў Нарчука нібыта мелася нейкая дамоўленасць на гэты конт з начальнікам паліцыі Рослаўцавым, які змяніў Жмэйду: маўляў, вы нашых сваякоў, што жывуць у вёсках, не чапайце, а мы ў адказ вашых тут не закранем… Праўды і домыслаў хапала. Таму іншы раз надзвычай цяжка было вылушчыць з іх сапраўднае зерне тае ж праўды.

У тым, што падобныя развагі цяпер вывелі Дзяніса Яўменавіча на не надта, скажам проста, лёгкія рэчы, былі і свая заканамернасць, і свая паслядоўнасць. А тут яшчэ гэты пажар на смалакурні, гэты чад!..

Відаць, думкі, змрачнейшыя адна за адну, снаваліся нават самі па сабе аж да канца дарогі, але раптам абарваліся: Зазыба страпянуўся – чуліся стрэлы; спярша адзін, затым другі, а праз якую чвэртку хвіліны пасыпаліся гарохам, усё разам ды разам, мала калі перашчукаючы. Узніклі стрэлы з правага боку, акурат як пад'ехаць Зазыбу да былога панскага маёнтка, з якога і праўда мала чаго засталося – найбольш гаспадарчыя мураванкі ды цагляныя падмуркі. Адсюль ужо лёгка было адгадаць, што стрэлы даляталі не з Зацішша. Былі яны далёкія, прыглушаныя лесам. Значыць, разлягаліся сюды аднекуль з Гончы, можа, далей. Зноў страпянулася бацькава душа.

XII

Касцоў на верамейкаўскім лузе стрэлы гэтыя таксама заспелі знянацку.

Масей ішоў да Прыбытковага воза. Яму рупіла іншае.

Што Ганну Карпілаву дарэмна ён вывеў з раўнавагі, гэта ён усведамляў. Як кажуць, няхітрая справа. Але ён не зусім разумеў яе ўзрушэнне. Калі яна загаварыла раптам на высокім голасе, ён адчуў спіной, як насцярожыліся стары Кузьма, маці, а найбольш Андрэй Марухін, які, канечне ж, вінаваты быў, што бегаў недзе і мала касіў на сваёй паласе. Але ў Ганчынай узлаванасці Масей улавіў разам з тым непрыязнасць, быццам і яго віна была тут. А можа, у яе штосьці засталося на яго з восені? Ад той сувязі, што ўзніюта і хутка скончылася паміж імі? Шляхоў для тлумачэння Ганчынай нястрыманасці знайшлося б і далей нямала. Але Масей нарэшце спыніўся на адным – такім вось чынам кабета, няйначай, хацела ў прысутнасці чалавека, з якім цяпер жыла, правесці размежаванне паміж былым палюбоўнікам і сабой.

З прыкрасцю, што ўсё не пакідала яго, Масей азірнуўся назад: маці з Кузьмой Прыбытковым усё яшчэ заставаліся на месцы, ускрай сваіх палос, аб нечым гаварылі, а Ганна Карпілава з прымаком стаяла ўжо на сваёй пожні, што вылучалася на лузе паміж іншых, як хахол на казацкай галаве: сапраўды, суседзі, нават тыя, дзе не было ў дварах мужчын, паспелі калі не скрозь пакласці траву, то частку, а Ганчына ўсё яшчэ цягнулася стаячай травой ад лесу да Бесядзі. «Трэба ўсё-ткі памагчы заўтра Андрэю, – усміхнуўся, акурат з нейкай зацятасню Масей, тады перадумаў нанова: – Урэшце, бацька паможа». Выйшаўшы ў думках на бацьку, Масей з дакорам падумаў што маці дарэмна хоча дачакацца таго з якойсьці незразумелай паездкі, тым больш – Кузьма Прыбыткоў, адпусціўшы нявестку ў вёску, здаецца, таксама ўжо нудзіўся па дому. Значыць, абкосіны сапраўды давядзецца спраўляць заўтра.

У адсутнасць бацькі Масей разважаў ужо як гаспадар.

На ўзмежку Масей смарганўў злетаваную сушаніцу: каробачкі яе трывожна зазвінелі, ажно здалося, што гэта яны так на ўвесь луг, і ён на момант супыніўся, спрабуючы суцішыць іх. А тыя пашумелі ды самі і перасталі. Аднак Масей усё роўна як з неўразуменнем пастаяў яшчэ на месцы, тады здзіўлена ўсміхнуўся, падчапіў касой расліну, зрэзаў і зусім без жалю выкінуў на галы прамежак. Дзіўна, але і трывожны звон сушаніцы, і нечаканая, амаль несвядомая расправа над ссохлай раслінай прынеслі Масею ледзь не палёгку ў душу, звёўшы найперш за ўсё ўнутраную ніякаватасць да самага простага: у чалавека заўсёды ёсць што-небудзь на сумленні, бо грэх і жыццё – брат і сястра. Канечне, гэта занадта сказана. І тым не меней Масей не стаў пераконваць сябе ў адваротным, а злашча – яшчэ каго.

Неба над лесам паступова ачышчалася і ачышчалася ад смалакурнага дыму, можна сказаць, ён ужо амаль не засціў небакраю з таго боку, і толькі ўедлівы пах угарнасці стаяў яшчэ зусім блізка, патыхаў адтуль, не даваўся кволым павевам ветру з-за Бесядзі, які ўсчынаўся недзе на строме, употай шалясцеў над лугам, кожны раз заціхаючы на ўзлеску.

Сонца перамясцілася цалкам на той бок Бесядзі, стаяла паміж Папоўкай і Дзербай і ўсё яшчэ горача праменілася. Але дзень хваляць пасля таго, як сонца зойдзе.

Масей усміхнуўся. У Сібіры ён доўга не мог прывыкнуць, як там прачыналася ўранні сонца і заходзіла ўвечары. Чамусьці кожны раз, пакуль ён там быў асабліва калі сядзеў у лагеры ў Марыінскім, яму здавалася, што з'яўлялася яно на небе не там, дзе належыць, быццам усход памяняўся месцамі ці наадварот. Што значыць не свая зямля! Адзін час яму нават думалася, што гэты занятак – вяртаць сонца на яго месца – ператворыцца са штодзённай зацятай забавы ў асаблівую пакуту, якая будзе павялічваць астатнія, што выпалі на долю. Аднак амаль на ўсё бывае «аднак». Паступова Масей прызвычаіўся, не прывык, а прызвычаіўся да сонечных усходаў і заходаў у Сібіры, акурат да цеснай вопраткі ці мулкіх ботаў. Таму ў Беларусі давялося зноў прывыкаць да ранейшага сонцавароту. І ўсё-ткі канчатковы працэс адаптацыі адбыўся толькі тут, як Масей апынуўся ў Верамейках: усё стала знаёмым – і Вялікая Мядзведзіца над пуняй, і сонца пры вячэрнім схіле над Замасточчам, і ранні світанак над Ілінішчам. У Забесяддзі колькі ні стой, дзе ні хадзі, нават як ні пераскоквай цераз галаву, а Захад будзе для яго на захадзе. Усход на ўсходзе. Масей любіў сваё Забесядцзе з яго рэзка кантынентальным кліматам, з вялікімі маразамі ўзімку і гарачымі днямі ўлетку; тым больш што гэта было, бадай, адзінае месца амаль на самай сярэдзіне Еўропы, адкуль можна назіраць паўночнае ззянне. Гэтай зімой верамейкаўцы таксама глядзелі яго, хоць некаторыя і ўспрынялі прыродную з'яву як нядобры знак.

У вайну ўвогуле шмат якія адзнакі прыроды ва ўяўленні людзей мянялі сваю сутнасць, прынамсі, са звычайных і лёгка растлумачальных рабіліся ледва не лёсаноснымі. Народ зноў станавіўся вельмі забабонным, бо верай у розныя прымхі, забабоны людзі не толькі спрабавалі адгадаць свой лёс, сваю будучыню, а і супакойвалі сябе, шукалі надзею для выратавання. Нездарма кажуць, што жыццё падобнае на балотную ваду – адно ўзмуці яе, не скора астоіцца…

Недзе Масей чытаў, што думка нагадвае неспакойную лісу, якая, колькі ні ганяй і ні палохай яе, заўсёды ўратавальны ход прарые сабе.

Тым не менш Масей не апёкся аб свае думкі і не пашкадаваў пра іх. Наадварот, нібыта нанава ўпэўніўся ў нечым. Напрыклад, у той жа любові да краю. І яшчэ – Масей раптам зразумеў, што дзякуючы так званай малой радзіме, дзякуючы Бесядзі, Верамейкам і гэтаму лугу за Топкай Гарой, дзякуючы маладому ласю і, можа, ужо трохі Анюце Прыбытковай, далучыўся да нечага такога, што незваротна і свята, што на звычайнай мове завецца проста паўнатой жыцця. Яму было адным часам і самотна, і хораша, як пры вялікім адкрыцці, можа, нават пры даўжэзным, трагічным зыходзе. А ён і праўда недалёка быў, той зыход. Пройдзе потым шмат гадоў, Масей вернецца сюды зноў. Але тады ягонае Забесяддзе будзе ўжо бязлюднае, у вялікай хваробе, якую ва ўсім свеце назавуць Чарнобылем!..

Масей нарэшце спыніўся на краі сенажаці, спыніўся мянташыць касу, каб занесці над гарачай травой. І ў гэты момант па нейкай утрапёнай цішыні зразумеў,

што на лузе зноў адбываецца штосьці незвычайнае. Затрымаўшы ў руцэ мянташку, павёў позіркам спярша па палосах, затым сігануў позіркам далей, за раку. На гары, паміж Гончай і пасёлкам, стаялі коннікі. Зразумелая справа, што Масею адразу кінулася ў галаву – адкуль? І яшчэ – партызаны ці немцы? Масей павёў вачамі далей. З Гончы на мост выпаўзала цэлая калона. Першай у калоне рухалася аўтамашына, за ёй ехалі падводы, у прамежках тупалі людзі, за імі – гарматы. Сапраўды, пазнай іх адсюль – хто? Масей зноў паглядзеў на гару, дзе гойсалі коннікі. Няйначай, яны таксама дзівіліся адтуль, хто гэта здранцвеў пры выглядзе іх на зарэчным лузе.

Між тым цішыня сярод верамейкаўцаў і праўда стаяла як здранцвелая. Але вось адзін коннік, выехаўшы трохі наперад, падняў на ўзровень галавы карабін (коннік, то і карабін), прыцэліўся кудысьці ў левы бок перад сабой і стрэліў. Гук ад стрэлу пераляцеў цераз Бесядзь, але не разлёгся далесу, таму, здавалася, не выклікаў пачуцця небяспекі. Затое куля пачала раптам свідраваць паветра, наводзячы пранізлівым, акурат жывым віскам жах. Але нездарма кажуць: куля, якую чуеш, не твая. «Немцы, немцы!» – закрычалі на лузе. Услед за гэтымі крыкамі Масей таксама нарэшце здагадаўся – сапраўды немцы. Тут жа Масей убачыў і чалавека, па якім ужо ўроссып стралялі з гары: той шыбаваў па лузе ад пераезда, што знаходзіўся супроць моста, па якім усё яшчэ рухалася калона. Кулі вішчэлі роем, а чалавек усё бег і бег; было відаць, што ён забіраў улева, туды, дзе паміж Дзербай і Бесяддзю раслі ў балацявіне ракітавыя кусты. Пэўна, што там ддя яго быў паратунак. Але не. За якую сотню крокаў ад той балацявіны чалавек раптам першы раз спатыкнуўся, тады другі… Адсюль, дзе стаяў Масей, упаўшага нарэшце ўцекача не было відаць, аднак з гары немцам, няйначай, усё на лузё бачылася як на далоні, бо страляць яны не пераставалі.

Дзіўна, але ўтарапелыя верамейкаўцы, якія ўжо зразумелі, што да чаго, кідацца ў лес не хапаліся, стаялі на сваіх палосах і назіралі за тым, што адбывалася ў іх на віду. Можа, і ім пакуль, як і Масею, здавалася, што рабілася ўсё – і на тым баку Бесядзі, і тут, на лузе, моцна запаволена, таму выглядала, як штосьці штучнае, прынамсі, ні страху, ні разгубленасці. І раптам у кагосьці з верамейкаўцаў вырвалася: «Уцякайма, а то пастраляюць!» Лічы, у адно імгненне пасля гэтага луг проста ўзбурыўся галасамі. Людзі замітусіліся, а яшчэ праз момант сыпанулі к лесу.

Усхваляваная Марфа Давыдаўна падскочыла да сына, пазвала:

– Хадзем, сынок, адсюль, бяжым у дес, а то й праўда застрэляць!..

З другога канца сенажаці, ад Бесядзі, ужо шкандыбаў сюды з касою Кузьма Прыбыткоў.

– Во, – усё роўна як усклікнуў ён, калі нарэшце падбег, – і ў нас вайна праўдашняя пачалася!

– Па кім яны?

– Га, – павярнуўся да Масея стары, – дак хіба ж хто ведае?

Немцы раптам перасталі страляць, можа, ад здзіўлення, што гэтак устрывожыліся на лузе сяляне. Але праз момант зноў пачалі страляць. Кулі цяпер чуліся ў другім баку – лявей, недзе ў канаплёўскім канцы лугу.

Следам за маці Масей таксама кінуўся наўцёкі, балазе, лес недалёка быў. На краі яго, як схавацца за дрэвамі, Масей азірнуўся, утарапеў: замест таго каб ратавацца ў лесе, Кузьма Прыбыткоў лавіў на лузе напалоханага каня.

Хтосьці загаласіў у лесе, нехта стаў зваць. «Забілі, забілі!» – чулася скрозь дрэвы, але каго забілі і ўвогуле, ці забілі, ніхто не ведаў. Тым больш што спалоханага не перакрычыш.

Але вось за ракой прагучалі апошнія стрэлы. Змоўклі здзічэлыя кулі.

Кажуць, ва ўсякай бядзе хоць нехта, але павінен быць вінаваты.

XIII

Зазыба ўехаў у Зацішша яшчэ пад гукі стрэлаў. Але партызан у пасёлку не заспеў.

Каля хаты мясцовага паліцэйскага стаялі натоўпам бабы. Зазыба спыніў каня, падышоў. У кругу зацішанскіх кабет ляжаў застрэлены сын паліцая. Куля вырвала навылёт яго правую скроню, але рана ўжо не крывавіла. На мураве кроў загусла, стала моцна чарнець. На твар мерцвяка наляталі мухі.

Ніхто не плакаў. Вакол забітага стаялі адны чужыя. Гэта Зазыба заўважыў адразу, як падышоў. Але ў натоўпе знаёмых жанчын было шмат. Дзяніс Яўменавіч тут жа згледзеў старую Лукашыху, Арыну Дыскіну, Марылю Вусніч, Кацярыну Кудраўцаву… Уласна кажучы, мала каго з зацішанскіх кабет ён цяпер не назваў бы, можа, калі маладзейшых ды тых, што прыпыніліся ў пасёлку з мінулага лета, з часу эвакуацыі. Твары ў кабет былі змрочныя – у якой назнарок, а то часцей поўныя сапраўднага жалю, і толькі дзеці, здавалася, яшчэ не разумелі, што ў пасёлак такім вось чынам прыйшла першая ахвяра вайны, – бегалі вакол, нават смяяліся…

Адсюль, ад паліцаевай хаты, відаць было згарэлую смалакурню. Жалезны кацёл яшчэ выдыхаў з сярэдзіны сваёй дым, які, аднак, цяпер не шугаў угору, адразу ападаў, нібыта абліты вадой, на зямлю і тады ўжо распаўзаўся вакол, кучоміўся, чапляючыся за што льга; кацёл стаяў не толькі гарачы яшчэ, але і да чырвані распалены, адтуль ажно сюды, на вуліцу, патыхала. І тым не менш дыму ў пасёлку было меней, чым у лесе.

– Хто яго? – спытаў Зазыба пра мёртвага хлопца.

– Дак… – хацела сказаць штосьці ў адказ Арына Дыскіна, але з натоўпу пачуўся другі голас:

– Дак хто ж? Парцізаны!..

Тады Зазыба яшчэ спытаў:

– Чые? – Аднак і сам здзівіўся такому свайму запытанню.

Але дарэмна.

– Дак хто ж іх цяпера ведае? – буркліва адказаў той жа голас. – У нас жа ў пасёлку сваіх няма. Гавораць, што крутагорскія. Некаторыя людзі пазналі, дарма што морды адварочваюць.

Дзіўна, але Дзянісу Яўменавічу чамусьці ажно не хацелася, каб паліцаевага сына забілі Нарчуковы партызаны, тым больш што ў Забесяддзе, як казаў Чубар, прыйшоў новы партызанскі атрад. Пры гэтым Зазыбу і ў голаў не прыходзіла спытаць зараз, што ўвогуле адбылося ўпасёлку. Ды і за што забілі паліцаевага сына, лічы, яшчэ дзіця? Няўжо толькі за тое, што быў сынам паліцая? Падобнае ўжо здаралася, у тым ліку і ў грамадзянскую вайну, што сына каралі за бацьку, а бацьку за сына, асабліва пасля, у часе раскулачвання, але Дзяніс Яўменавіч ніколі – ні раней, ні пазней – не хваліў у душы савецкую ўладу за гэта. Урэшце, самога ж пазбавілі старшынёўства ў калгасе праз Масея…

Зазыбу належала цяпер спытаць у зацішанскіх кабет і яшчэ пра адно: у які бок з пасёлка падаліся партызаны? Справа, дзеля якой ён перапыніў паездку ў Жалезніцу, з-за якой вярнуўся, не цярпела затрымкі. Але спытаў пра іншае:

– Дзе ж Косця?

Гэта мясцовага паліцая так звалі.

– Дак уцёк жа, – буркнула ўсё гая ж старая.

– Ну а Матруна? – паглядзеў на яе паўз галовы Зазыба, спрабуючы пазнаць, хто гэта.

– Матруна падхапіла дачок ды таксама наўцёкі. Цяпера во чакаем, калі вернецца. Абмываць жа хлапца трэба ды на могілкі несці. Хаваць трэба, раз забілі. Ды й паплакаць над нябожчыкам час ужо.

Тады Зазыба нарэшце спытаў, бадай, пра галоўнае:

– За што яго забілі?

– А ў нас не пыталіся! – усё роўна як запальчыва сказала Кацярына Кудраўцава, якая трымала на руках малое дзіця.

Зазыба з дакорам глянуў на яе, паціснуў плячамі:

– Як гэта, забілі чалавека, і ніхто не бачыў, за што?

Тады падняла сваю проставалосую галаву старая Лукашыха, неяк зверавата бліснула вачамі на былога старшыню:

– Чаму ета не ведаем? За паперкі забілі, якія ён клеіў на сценах.

Зазыба спытаў:

– За тыя, што ўчора самалёт раскідваў?

– Дак хто ж яго знае!.. Але я бытта чула на свае вушы, як крычаў крутагорскі Чарнагуз на Косцевага хлопца – мы табе пакажам, пісака, мы цябе зараз да сценкі самога прыклеім заместа етай лістоўкі! Ну во і прыклеілі!.. Я ета думала, што яны адно пагражаюць мальцу. Ці мала якія свавольствы ў етакім узросце могуць быць у несмысля, а тута раптам чую – бах, бах, ажно два разы.

– Ага, стралялі, здаецца, два разы, – пацвердзіла Лукашысіны словы Арына Дыскіна.

– Адзірка ў галаве дак і праўда адна…

– Дак…

Цяпер усе ўжо гаварылі як з ахвотай.

Між тым Дзянісу Яўменавічу карцела ўвесь час спытаць у каго і пра тое, куды падаліся партызаны. Але і на гэтае пытанне адказала Лукашыха.

– Мы не дужа глядзелі за імі, – сказала яна. – Пажару во нарабілі, бадай на ўсё наваколле, можа, нават за Бесядзь пайшоў, а самі цяпера…

– Па кавычанскай дарозе пайшлі, – падказала Кацярына Кудраўцава. – Ды не сумнявайцеся, Зазыба, гэта нашы былі, крутагорскія.

– Я не сумняваюся, – чамусьці акурат ні з таго ні з гэтага заспяшаўся Дзяніс Яўменавіч… – Адзе ж вашы мужыкі?

– Бытта сам не ведаеш? – зноў азвалася тая бурклівая старая, якую Зазыба ўсё яшчэ ўгадаць не мог. – Маладых па набілізацыі пабралі, а старыя шушунікі дак такія

во, як і мы. Дак етыя таксама, няйначай, пахаваліся: маўляў, і вочы нічога не бачылі, і вушы не чулі. А з маладых быў адзін еты рослы падлетак, дак і яго забілі. Ты б ета, Зазыба, заявіўдзе, няхай бы пакаралі за ета каго трэба, а то ж дзе ета відаць, каб дзяцей забівалі? Якая яшчэ віна ў такога? У етых жа парцізан нябось таксама дзесьці начальства ёсць? Дак… А можа, хіба ўжо без руськага начальства? Дак…

Астатнія кабеты, якія нарэшце разарвалі свой круг ды абступілі адзінага на ўсю вуліцу мужчыну, заківалі галовамі: маўляў, старая праўду кажа – дзе цяпер шукаць той абароны, таго паратунку? Іледзячы на іх, Зазыба падумаў раптам: выходзіць пакуль, што немцы з паліцаямі самі па сабе, партызаны – таксама нібыта не свае, крутагорскія…

Як чалавек Зазыба быў з мудрэйшых, гэта наўрад ці стаў бы хто аспрэчваць, але і ён яшчэ няздольны быў угадаць наперадзе таго крывавага замарачэння, якое праз год, паўтара звядзе са свету вялікую частку ягонага народа… Для многіх аказалася, што забіць чалавека – няцяжка!.. У жыцці багата што паўтараецца, дарма што адна і тая ж з’ява завецца па-рознаму. Можа, якраз па гэтай прычыне Зазыбу раптам заманулася, шго на яго памяці ўжо адбывалася нешта падобнае – і кроў на траве, і рана шматкутная, акурат пакалечаная зорка…

Але Дзяніс Яўменавіч ведаў тым часам: людзі памыляюцца, думаючы, што чалавек не можа памерці абы-калі, ён памірае тады, калі настае яго час… Ну а гэты падлетак, паліцаеў сын? Хто яму наканаваў такую смерць? Дзе той суддзя, што займеў права забраць ягонае жыццё?

Жанчыны глядзелі на Зазыбу, маўчалі, бадай, чакаючы, што скажа ён. Вядома, ён пагаворыць з Нарчуком, скажа камандзіру партызанскага атрада, што гэта апошняя справа – ваяваць з дзецьмі, дарэчы, як і з дапамогаю дзяцей. Можна здагадацца таксама ўжо наперад, з чаго пачне Нарчук… У жыцці ўсё можна апраўдаць на словах. Але сумнявацца заўсёды лягчэй, чым верыць… Ды і праўду не заўсёды робяць шабляй… Пра гэта Зазыба даўно ведаў хоць сам і моцна некалі памахаў ёю…

Усё роўна як назнарок парушаючы маўклівасць дарослых, спярша захныкала, потым заплакала малое дзіця Кацярыны Кудраўцавай. Нехта з жанок падказаў маці:

– Ты пакармі яе.

– Ага, пакармі, – заківалі галовамі другія жанчыны, нібыта здаволеныя, што хоць у адной з іх знайшоўся іншы занятак.

– Нічога, патрывае, – тым не менш сказала ветэрынарыха, але хутка перадумала – выйшла з натоўпу.

Зазыба таксама акурат выпіхнуўся з жывога кола. Сказаў:

– Вы тут глядзіце, бабы, а мне няма калі, ехаць трэба.

– Дак…

– А што ж нам рабіць з етым дзіцём забітым?

– Ну праўда, не пакідаць жа яго тута аднаго?..

Зазыба пастаяў, усё роўна як шукаючы ў думках адказу на гэтае пытанне, але сказаў зусім пра іншае:

– Я хацеў папярэдзіць вас, бабы, – немцаў нядаўна бачыў у лесе за Калодлівам.

Натоўп страпянуўся. Аднак утарапенне не доўга трымала людзей.

– Дак чаму ж ты маўчаў? – пляснула ў далоні старая Лукашыха.

– Ага, чаму?

– Дак чаму?.. – узбурыліся жанчыны.

– Бо не ведаю і цяпер, куды яны едуць, – без усялякае віны сказаў Зазыба. – Перапраўляліся на той бок Бесядзі.

– Дзе?

– Ну там, дзе Зубар упадае ў Бесядзь.

– Хвала богу, не да нас!.. – здавалася, за ўсіх разважыла ўсё тая ж Лукашыха.

Але гэта нікога не супакоіла. Пачалі акурат пытацца:

– Адкуль табе ведама?

– Дак…

– Маглі туды пераехаць, а хто ім забароніць вярнуцца?

Сказала сваё слова Арына Дыскіна, але яўна спрабуючы напалохаць:

– Ну вось, спярша партызаны пастралялі ды папалілі тут, цяпер немцы захочуць здзекавацца.

Тады зноў ажыла старая з бурклівым голасам.

– Арына праўду кажа, – нецярпліва азвалася яна і тут жа сказала, што ёй рупіла:

– Але што ж будзем рабіць з етым забітым хлопцам?

Паліцаеў сын тым часам патрохі ўжо чарнеў тварам, аднак выгляд усё яшчэ меў жывога чалавека; калі б не рана на скроні ды мухі, то можна было падумаць, што гэта ён употай ляжыць у натоўпе, слухае вакол сябе самую цікавую ў ягоным жыцці гамонку…

Ніхто не стаў адказваць старой, можа, таму, што страх заўсёды мацней за надзею. Зазыба палічыў што яму сапраўды ўжо няма чаго рабіць тут, пайшоў да калёс. Тады азірнуўся, быццам адчуў віну за сабой. Ды і як іначай – паявіўся ў пасёлку пасля партызан адзін мужчына і той кудысьці спяшаецца, не даўшы рады кабетам?

Было відаць ужо, што ніхто не хацеў заставацца далей каля нябожчыка, а тым больш – браць без бацькоў на сябе клопат па пахаванні: бабы таксама крануліся разыходзіцца па дарогах. Зазыба бачыў што толькі адна постаць даўжэй пастаяла на месцы. Але і яна неўзабаве зварухнулася, паглядзела на, Зазыбу. Дзяніс Яўменавіч пазнаў яе. То была Ганна Піханава. Да вайны яна працавала ў райземаддзеле аграномам. Часам наведвалася па рабоце і ў Верамейкі. Праўда, тады старшынёй у калгасе працаваў ужо Чубар. Тым не менш Зазыбу, як загадчыку гаспадаркі, таксама ўжо хапала спраў якія зводзілі іх. Але ў мінулую восень раённая аграномка нейкі час жыла ў Зацішшы. Калі да Крутагор’я падыходзілі немцы, яна таксама кінулася ў бежанства, паклаўшы на багажнік веласіпеда ўвесь свой скарб. З далёкім бежанствам у яе не выйшла: абоз, з якім яна накіроўвалася ў Расію, немцы не прапусцілі далей Старадуба. Вяртацца ў Крутагор’е Ганна Іванаўна не рашылася адразу, таму ўгаворвала сяброўку, інжынера лясной гаспадаркі Марфу Зяленскую, падацца ў забесядскія лясы. Так яны і апынуліся ў Зацішшы. А неўзабаве начальнік разведкі

партызанскага атрада Павел Чарнагузаў угаварыў іх вярнуцца ў Крутагор’е. Ну а ўжо зімой у былы райцэнтр ёй вазіў даручэнне ад Нарчука Дзяніс Яўменавіч.

– Дзень добры, таварыш Зазыба, – павіталася дзяўчына яшчэ на адлегласці.

– Што вы тут робіце? – таксама даўшы «дзень добры», спытаў Зазыба.

– Я вось… Ну, словам, не паспела. Але мне край трэба ў атрад!

– Трэба… – Дзяніс Яўменавіч усміхнуўся. – Мне таксама патрэбна. А дзе ж іх цяпер шукаць, тых партызан нашых?

Паварочваючы каня на дарогу, Зазыба памаўчаў нейкі час. Тады Ганна Піханава сказала:

– Можа, зробім так, Дзяніс Яўменавіч: я збегаю ў Кавычачы, раз зацішанцы кажуць, што партызаны туды падаліся, а вы – у лагер? Уласна кажучы, у мяне галоўнае ў данясенні – таксама немцы, якія з’явіліся ў раёне. Нашы, крутагорскія, ужо сталі баяцца адкрыта высоўвацца з горада, а гэтыя… Гэта асобая каманда эсэс.

– Колькі іх? – спытаў Зазыба.

– Па звестках – дзве роты. Палавіна – немцы, палавіна – рускія. Камандзіры таксама два: адзін немец, другі рускі.

– Адкуль яны?

– Па нашых звестках – з раёна Почапа. Там яны ўдзельнічалі ў карнай аперацыі. Палілі вёскі, людзей.

Сказаўшы гэта, Ганна змоўкла. Зазыба зразумеў яе маўчанне па-свойму – нешта збянтэжыла дзяўчыну.

– Знаеш што, дзеўка, – усё роўна як выручаючы яе ў нечым, пачаў Зазыба, – паедзем разам у лагер, няйначай, яны там. Ды і стралялі ж у тым баку.

– Так, стралялі недзе на Бесядзі, – кіўнула Ганна Піханава.

– Маглі яны, – больш вызначана сказаў Дзяніс Яўменавіч. – Ды й немцы маглі паспець туды, пакуль я ехаў сюды ды блытаўся паміж Бялынкавічамі і Калодлівам. Сядай, паедзем. – Другі раз назваўшы Ганну на «ты», Зазыба ўжо зусім лёгка паказаў на калёсы.

Гэты пераход на свойскія адносіны, бадай, найболын падзейнічаў, бо Ганна адразу акурат павесялела, скочыла на калёсы. Буланы хоць і быў моцна заезджаны, ажно не паспяваў прасыхаць, аднак цяпер нават не кінуў касога позірку на вазака, крануў з месца; калёсы, нібыта самі, з’ехалі па травяністым схіле на пясчаную дарогу, якая неўзабаве, перад былым панскім садам, што адышоў пасля да лясніцтва, разыходзілася на два бакі; на левым павароце, як нашым паязджанам апынуцца каля лясніцтва, стаяў знаёмы ляснічы па прозвішчы Кучароў. Уранні ў лясніцтве Зазыба не бачыў Кучарова. Прынамсі, тады ён не трапіў на вочы яму. Паставілі ляснічым у Зацішшы яго немцы. Але ж і да вайны ён працаваў тут на гэтай пасадзе. З аднаго боку – спецыяліст. З другога… Якраз вось гэтае «з другога», можна сказаць, і стала прычынай, што новыя ўлады нанава даверылі пасаду чалавеку, які паслужыў ужо балынавікам. Справа ў тым, што брат яго быў паліцаем у Панькоўскай Будзе. Дзіўна, але партызанам ён таксама падышоў нечым. Зазыба хацеў паздароўкацца з ляснічым,

але той чамусьці адвярнуўся, зрабіў выгляд, што яму край нешта прыспела ў гэты момант паглядзець у садзе. Зазыба з прыкрасцю ўсміхнуўся: «Ат, няхай сабе, дзяцей з ім мне не хрысціць!..»

Вялікая гэта рэч – жыццё! І канечне ж, гэтатаму, што надвое мысліць…

У Шурышча – вялікую выспу, што знаходзілася ў яловым лесе каля Цяменскага возера, – можна было трапіць з Зацішша праз луг, але Зазыба ведаў туды і другі шлях. То была нават не дарога ў звычайным сэнсе, хутчэй – доўгая межавая прасека. Але пнёў на ёй, здаецца, Зазыба не помніў. Таксама як ніколі і не зарастала яна, усё роўна як не асыпалася на яе пад восень лясное семя. Таму Зазыба і павярнуў адразу з Зацішша на гэтую прасеку. Але ў Шурышчы партызан не было.

Хоня Сыркін, бабінавіцкі яўрэй, які з двума сынамі малоў у партызанскім лагеры на жорнах грэчку, пазнаў Зазыбу і доўга з недаверам пазіраў на Ганну Піханаву, хоць мог бы і яе ўспомніць, дарма што да сельскай гаспадаркі ў мястэчку мала меў дачынення: у вясковай мясцовасці людзі звычайна адразу і надоўга запамінаюць адзін аднаго, абы толькі сустрэцца.

– Мы тута адны, – нібыта апраўдваючыся ў нечым, казаў Хоня Зазыбу, чамусьці часта плюскаючы чырвона-чорнымі вачамі. – А вось куды нашы пайшлі?.. Дык Мітрафан Ануфрыевіч яшчэ ўчора казаў што будуць паліць у Зацішшы смалзавод.

– Смалакурню яны спалілі, – пачухаў патыліцу Зазыба.

– А мы тут во і за ахову, і за млынароў. На бліны мелем.

– Даўно ты ў атрадзе?

– Ды не. Але страшна ў мястэчку стала жыць. Хоць яўрэяў там паболела. Чужыя аднекуль прыехалі. Таксама з бежанцаў. Дык мы тут во і мелем. Праўда, хлопцы? – паглядзеў ён на сваіх падлеткаў тым самым звяртаючы на іх Зазыбаву ўвагу.

Хлопчыкі, здавалася, мала слухалі гамонку дарослых.

– Мелем, – паўтарыў Хоня. – Нездарма ж кажуць: калі клічуць асла на вяселле, то знай – альбо вады не хапае, альбо дроў. Мае во мальцы не хочуць жорны круціць. За зброю таксама ўпотай хапаюцца. А я кажу… Ды што я кажу, каму гэта цікава? Калі з яўрэя паздзеквацца, як не цяпер?

Штосьці непрыемнае падалося Дзянісу Яўменавічу ў гэтых словах, хлуслівае, таму перайшоў у гаворцы на іншае, каб не пакрыўдзіць дарэмна чалавека:

– А хто страляў?

– Здаецца, немцы, – ужо зусім без знарочыстай прыніжанасці адказаў Сыркін. – Хлопцы мае бегалі на луг, я пасылаў іх, каб паглядзелі, дык з Топкай гары было відаць, што немцы стралялі з-за Бесядзі па нейкім чалавеку. Бадай, забілі.

Зазыба павярнуўся да сваёй спадарожніцы:

– Ну, што будзем рабіць, Ганна Іванаўна?

– Дык… Ноч жа, глядзіце!..

– Можа, паедзем са мной у Верамейкі?

– Не, лепей я застануся тут. Мне супроць ночы няма як бегаць.

– А хто такая? – раптам занепакоіўся яўрэй. – Я павінен ведаць, каго пускаю ў зямлянку.

– Не хвалюйся, – супакоіў Зазыба. – Да камандзіра прыйшла. Свой чалавек.

– Што ж, раз ты гаворыш, – паціснуў плячамі Сыркін, – няхай застаецца. Аднак…

Піханава ўскінула галаву:

– Толькі ў мяне да вас справа, таварыш Зазыба.

Ля калёс, калі яны ўдваіх адышліся ад жорнаў сувязная сказала Дзянісу Яўменавічу:

– Цяпер усё можа быць. Таму хоць з вамі трэба дамовіцца канчаткова. А вы раскажаце потым, як убачыце партызан. Вы ж так ці іначай, а ўбачыце.

– Буду ж рупіцца.

– Тады вось. Пра асобую каманду эсэс вы ведаеце. А вось яшчэ што. Пра гэта Чарнагузаў даўно прасіў даведацца.

– Ну-ну.

– Пра камсамольцаў ён прасіў дапытацца, якіх сабраў вакол сябе Віннікаў. Чарнагузаў нейкі час трымаў з імі сувязь.

– Гэта ж які Віннікаў? Адзін Віннікаў служыў у міліцыі?

– Бацька. Дык гэты Віннікаў скалаціў у горадзе групу, пачалі збіраць зброю, сачыць за немцамі. Але іх выдаў Лабыка. Пайшоў і заявіў у камендатуру. Хлопцаў ужо збіраліся ўзяць. Толькі яны самі апярэдзілі. Нехта падказаў ім, што пагражае. Словам, давялося ўцякаць. Пайшлі яны глыбокай восенню к лініі фронту. Там недзе і загінулі. Пра гэта вось і скажыце ў атрадзе, калі я не здолею. Ну, бывайце, Дзяніс Яўменавіч. А што гэты яўрэй? Ваш знаёмы?

– Так, з Бабінавіч. Ты не хвалюйся. У кожным разе я заўтра тут буду.

Дзяніс Яўменавіч думаў, што заспее сваіх на лузе. Але там ужо верамейкаўцаў не было. «Каго ж забілі?» – успомніў ён Хоневы словы.

Раптам зазнібела сэрца.

Сонца ўжо садзілася за гару па той бок ракі. Заходзіла чыста, на добрае надвор’е.

XIV

З дзённіка баявых дзеянняў ахоўных войск групы армій «Цэнтр». 8.7. Камендант Смаленска атрымаў загад аб ачышчэнні раёна на поўнач і паўночны захад ад Смаленска і правядзенні буйной аперацыі «Нордполь-1 і 2» («Паўночны полюс-1 і 2»), 9.7. 203-я ахоўная дывізія дакладвае аб працягванні аперацыі «Майскі жук». Камандуючы аперацыяй палкоўнік фон Зэйдліц-Курцбах – камандзір 608-га ахоўнага палка забіты ў час аперацыі… 10.7. Адцадзены загад аб правядзенні аперацыі «Адлер» («Арол») для ачышчэння Клічаўскага раёна. Камандуючы аперацыяй – камандзір 286-й ахоўнай дывізіі. Часці: тры групы-палкі 203-й і 286-й ахоўных дывізій і вышэйшага начальніка СС і паліцыі. 11.7. Без асаблівых змен.

XV

Чубар прачынаўся ўначы ўжо каторы раз. Але дасюль заўсёды сам. Цяпер жа, амаль пад ранне, сон яго быў перабіты кімсьці яшчэ, хто таксама апынуўся ў гэтым царкоўным сутарэнні з маленькімі квадратнымі кратамі пад столлю.

Было чуваць – чалавек усё роўна як плакаў. Але глуха і невыразна, нават хто – мужчына ці жанчына, нейкі час не ўдавалася адгадаць. Нарэшце плач спыніўся, Чубар чамусьці падумаў, што ў склеп з ім трапіў мужчына. Хутка той пачаў кашляць, аднак таксама глуха, усё роўна як чалавек не хацеў, каб хто чуў яго. А паколькі сутарэнне было вялікае, метраў на дзесяць у даўжыню (гэта Чубар ухапіў вачамі яшчэ ўчора, калі яго кінулі сюды), то прысутнасць другой жывой істоты здавалася далёкай. Між тым світанак ужо наступаў.

Чубару моцна рупіла – хто ж патрапіў у такое становішча, як і ён? Хоць, з другога боку, што значыць «у такое становішча»? Пэўна пакуль можна было сказаць, што яны тут, у гэтым склепе, абодва вязні. Чалавек паварушыўся ў сваім кутку, тады зноў пачаў хліпаць. Нарэшце Чубару падалося, што той моліцца. Вось і выразныя словы: «Госпадзі Ісусе Хрысце, дзеля малітвы твае маці і ўсіх святых зжалься нада мной. Хвала табе, божа наш, хвала табе. Святы божа, святы моцны, святы несмяротны, зжалься нада мной. Амін. Найсвяцейшая тройца, зжалься нада мной. Госпадзі, памілуй, госпадзі, памілуй…» Гэтае «госпадзі, памілуй» чалавек паўтараў шмат разоў, ажно падумаць льга было, што камусьці зацяло, як на патэфоннай кружэлцы. Праз нейкі момант зноў пачалася малітва ў трывожных уздыханнях: «Слава айцу і сыну і святому духу, і цяпер і заўсёды, і на векі вечныя. Амін». Пакуль небарака плакаў і ўздыхаў, Чубару таксама трывожна рабілася. І не таму, што павінна было гэтак падзейнічаць. Чубар набожнасцю не вызначаўся нават у дзяцінстве, калі яна прыходзіць да чалавека разам са страхам. З богам ён расквітаўся даўно, яшчэ ў каморніцкай школе, дзе была моцная камсамольская ячэйка. Супакоіла Чубара цяпер іншае: раптам ён зразумеў, што новы вязень толькі яшчэ пачынае прывыкаць да гэтага сутарэнйя, да цемры. Можа, нават пакуль не біты, не мардаваны. Як кажуць, не дужа вялікая ўцеха, а тым часам для Чубара такая акалічнасць чамусьці мела сэнс, хоць, варта таксама сказаць, растлумачыць яго ён не здольны быў. Але як чалавек трапіў сюды? Чубар не чуў, каб адчыняліся дзверы ці грукаў хто блізка, злашча, што спаў амаль похапкам.

Тады Радзівон сам паварушыўся ў сваім кутку, нібыта даючы гэтым зразумець новаму вязню, што ў склепе яшчэ ёсць жывая душа. Моцна працяло бок і патыліцу. Раны зноў засмылелі, аднак сцішана, акурат пасля гаючых лекаў. Ды і блізкая прысутнасць другога чалавека адцягвала ўвагу ад іх.

На памяць зноў прыйшоў учарашні дзень.

Свядомасць да Чубара вярнулася на другім баку Бесядзі. Ён ляжаў тады на пяску са страшным болем у галаве, увесь мокры. Над ім, нібыта чэрці ў пекле, крыўляліся і рагаталі людзі ў чырвонаармейскай форме. Чубару ўзрадавацца б – свае! Але ж на пераправе ён бачыў салдат і ў нямецкім адзенні. Ды і адкуль тут узяцца «сваім»? За

многа кіламетраў ад фронту? Праўда, зімой Чубару давялося бачыць чырвонаармейскія часці ў прыфрантавым тыле. Але то было далей туды, паміж Іпуццю і Дзясной. Тым часам Забесяддзе яшчэ мінулай восенню апынулася ў глыбокім тыле. Цяпер і таго горай – фронт адыходзіў за Курск, Арол… Немцы адкрыта гаварылі, што імкнуцца на Волгу і Каўказ… Значыць, пра «сваіх» у Забесядцзі і гаворкі не магло быць. Тым не менш над Чубарам цяпер рагаталі людзі ў чырвонаармейскім адзенні, выкрыкваючы ў нейкім экстазе рускія словы. Чубар хацеў павярнуць на пяску з боку на бок галаву, каб хоць збольшага зразумець, што робіцца вакол яго. Дзе там!.. Не павярнуць шыі!.. Тады Чубар абапёрся на локаць правай рукі, паспрабаваў прыўзняцца. Гэтае намаганне аказалася недарэмным. Але ў той самы момант, як убачыў у прамежках паміж чалавечымі постацямі дзве грузавыя аўтамашыны з тупымі радыятарамі, а трохі збоч – гарматы, што стаялі ў яміне пад дубамі на невялікай адлегласці ад ракі, хтосьці з усёй сілы грукнуў яму па рэбрах з левага боку. Ад гэткага ўдару Чубар на момант сцяўся, здаецца, ажно заплакаў у душы, аднак паспеў-ткі ўгледзець і той бот – на тоўстай, акурат гумовай падэшве, з кароткай халявай. Дзіўна, але за гэты момант паспеў ён падумаць таксама і вось пра што: наўрад ці ацалеюць цяпер рэбры… Менавіта падумаць, бо паварушыцца яшчэ раз ён ужо не ў стане быў, адно дазволіў сабе выпрастаць правую руку, каб шчыльней прыліпнуць спіной да пяску. Бот, што ўсё роўна як прабіў яго наскрозь, тым часам ужо стаяў з другім такім жа. Падобныя боты Чубару даводзілася бачыць на забітых немцах. Але ж і іншыя галузнікі, што тоўпіліся вакол яго, адзетыя былі гэтак жа: чырвонаармейская гімнасцёрка, няпоўныя галіфэ і… нямецкія боты. Чубара больш ніхто не чапаў. Паводзінамі людзі гэтыя нагадвалі дзікуноў, якія толькі што выцягнулі з ракі вялікую рыбіну, а тая задыхалася, хаўкаючы жабрамі.

Між тым у рыбы няма слёз, яна не плача, дарма што заўсёды знаходзіцца ў вадзе…

Чубар ужо не сумняваўся – ён у палоне. І ўзялі яго ў палон на тым беразе Бесядзі нейкія людзі ў чырвонаармейскім адзенні і ў нямецкіх ботах; неўпрыкмет падкраліся і ўдарылі па патыліцы, няйначай прыкладам вінтоўкі. Усё гэта цяпер можна было асэнсаваць, яшчэ раз моцна жахнуцца; Чубар гэтак і зрабіў, а ўсвядоміўшы, рашыў не падманваць сябе: і ранейшы ўдар па патыліцы, і цяперашні ботам па рэбрах толькі пачатак… Пры жорсткіх адносінах немцаў да партызан нічога суцяшальнага наперадзе ўжо не прадбачылася. Уласна, гэта быў канец, дарма што людзі, якія захапілі яго, няйначай, недзе самі апыналіся ў такім вось становішчы. Аднак Чубар не мог стаць упоравень з імі, ён няздольны быў вось так рагатаць і выскаляцца над чалавекам, бо разумеў што вышэйшасць, якую атрымліваеш на час, абарочваецца пасля пакутамі ўнутранымі і знешнімі праз змушанасць або вольны выбар. Дакладней, здраднікам Чубар станавіцца не збіраўся.

Менавіта адсюль да яго вельмі хутка прыйшло разуменне безвыходнасці. З’явілася такое адчуванне, нібыта жьтццё яго ўжо ўсё прамінулася, што ўсё, што яму наканавана было на гэтым свеце, скончылася. Дакладней, канчалася ў маючых быць пакутах, у стане бездапаможнасці, якая суправаджалася вялікай самотай і пякучым

болем. Гэтыя людзі ўмелі біць, акурат між іншым, мімаходам, прынамсі, ведалі, куды трапляць прыкладам ці ботам. Думаецца, што кулакамі яны таксама не горш працавалі. І самае жахлівае тое, што яны, бадай, не ўяўлялі сабе, на чым спыніцца і ў радасці сваёй, што нарэшце злавілі партызана (а ў гэтым яны не сумняваліся), і ў злараднасці – маўляў, паглядзім, як ты будзеш выкручвацца, які шлях выбераш?

Між тым Чубар недарэмна думаў, што тут не адны рускія добраахвотнікі – павінны быць і немцы. Так і выйшла. Праз нейкі час да шумнага натоўпу, дзе ляжаў Чубар, падышоў чалавек цалкам у чужой форме. Чубар не чуў што той сказаў і на якой мове, аднак можна было меркаваць, што ўсе яго зразумелі, бо пачалі тут жа, бы з падцятымі хвастамі, разыходзіцца, і толькі двое засталіся на месцы. Адзін сказаў, піхаючы вінтоўкай Чубара: «Раз папаўся, сука, то вядзі сябе як след – альбо памірай чалавекам, альбо пераходзь на наш бок». – «Дзе гэты ваш бок?» – набраўся смеласці спытаць Чубар. Але добраахвотнік незалюбіў. «Выёся? – з'едліва ўсміхнуўся ён. – Н-ну, выё-шся, пакуль час ёсць. Скора мы цябе, як вепрука, падсмалім. У-уставай!» Чубар сеў але на ногі стаць не здолеў: закружылася галава, у вачах з'явіліся чорныя мятлушкі, у грудзях спёрла. Як ні спрабаваў Чубар удыхнуць паветра глыбей, не мог рассунуць лёгкімі разбітыя рэбры. «Ну, ну, уставай, падла», – зноў так жа з'едліва, але, здавалася, без асаблівай злосці, загадаў той жа голас. Другі добраахвотнік, што дасюль маўчаў, але ўсміхаўся, нібыта пазайздросціў напарніку: «Хіба не бачыш? Яму не да таго! – Аднак тут жа і сам скамандаваў: – А ну-тка ўставай! На допыт завуць. Гер маёр ужо даўно чакае». І сапраўды, афіцэр у нямецкай форме ўсё яшчэ стаяў побач. Аднак Чубар і пасля гэтых слоў працягваў сядзець, нават моцна не зварухнуўся, каб неяк стаць. Тады гэты, другі добраахвотнік, раптам паддзеў яго ззаду рукамі пад пахі, пачаў выпрастваць Чубара, моцна ўпіраючыся нагамі ў пясок. Перасільваючы боль, Чубар паддаўся намаганню, устаў. Адчуванне ў яго было кепскае, адольвала неймаверная слабасць, быццам пасля доўгага катавання, якое выпетрала яго, забрала ўсю ўнутраную моц. Праз гэта нават жахліва стала – мала ж на што хапіла яго!.. І тым не менш, калі добраахвотнік адпусціў Радзівона, ён утрымаўся на нагах, затым зрабіў крок наперад і, грабаючы мокрымі мысамі ботаў пясок, патупаў да дубоў, што карэніліся ў вялікай круглявай яміне з пляскатым дном. Такім чынам, яго не вялі і не падпіхвалі. Ён сам рухаўся, хістка перастаўляючы ногі, таксама як і сам выбіраў шлях. Аднак няйначай кіраваўся ў патрэбным напрамку, бо тыя, хто яго суправаджаў, ішлі следам, нават не абапал, а за спіной, і ніяк не папраўлялі. Радзівон мала на што звяртаў увагу ў варожым стане; сапраўды давала аб сабе знаць абыякавасць, якая з'явілася ледзь не ў той момант, калі расплюшчыў вочы, і якую пасля ўжо, у наступныя хвіліны, ён ці не свядома захоўваў у сабе, падумаўшы, што прыйшоў час развітацца з жыццём. Чубар быў упэўнены, што яго і праўда вядуць кудысьці на допыт. Але допыту, якім той звычайна бывае, не адбылося. Як толькі Чубар дапяў да дуба і павярнуўся пад ім тварам да сваіх канвойных, аднекуль падышоўдругі немец. Адзін з канвойных крутануўся да яго, адрапартаваў: «Гер маёр, перад вамі бандыт-партызан. Разам са мной у затрыманні ўдзельнічалі радавыя

другой роты асобай каманды Юркавец і Тупікаў. Дакладвае унтэр-афіцэр Пуплікаў». Змешваючы нямецкія словы з рускімі, маёр заківаў галавой: «Гут, гут, унтэр-афіцэр. Будзеце прызначаны да ўзнагароды. Камандаванне не пакіне вашы заслугі без увагі». Пахваліўшы падначаленых, ён змераў зачэпістым позіркам злоўленага партызана, спрабуючы заглянуць у вочы, але Чубар не даўся, апусціў галаву. Тады немец грэбліва пляснуў яго рукой па шчацэ, але не моцна, усё роўна як шкадуючы – ці то сваёй рукі, ці то партызана. Дзіўна, аднак Чубара гэта зусім не збянтэжыла. Прывычней было б чуць тут крыкі, пагрозы. І не таму прывычней, што Чубар некалі ўжо зведаў штосьці падобнае, не, хутчэй па ўяўленні, па расказах, як адносяцца акупанты да партызан, калі бяруць у палон. Да таго ж Радзівон ужо цяпер ведаў, што нанава перайсці Бесядзь яму не давядзецца… Спадзявацца ж, што партызаны вызваляць, таксама не было ніякай падставы. Прынамсі, ад сваіх ён такой дапамогі не чакаў. Вымольваць жыццё здрадніцтвам? На гэта Чубар пайсці не мог, дарма што ведаў: многія цяпер шукалі сабе паратунку розным шляхам. Няйначай, што і гэтыя канвойныя думаюць, што іх зберажэ лёс.

Нарэшце немец загаварыў. Але таксама без прымусу, акурат гуляючы:

– Ну, што вы нам скажаце? З якога атрада, дзе стаяць вашы, партызаны?

Чубар маўчаў.

Тым часам к дубу падышлі яшчэ немцы, можа, гэтая акалічнасць стала прычынай, што афіцэр раптам павысіў голас:

– Які ваш атрад? Хто камандзір? Дзе ён знаходзіцца?

Да таго ж гэты раз ён гаварыў па-нямецку, бо побач стаяў перакладчык, і сэнс запытання, такім чынам, Чубар зразумеў з другога голасу, а гэта нібыта зменшыла пагрозу. Немцы пачакалі, што Чубар скажа ім, тады аб нечым загаварылі між сабой. Маёр зноў спытаў а перакладчык давёў сэнс:

– Вы хоць ведаеце, што для лясных бандытаў у нас палоннага рэжыму няма?

Чубар расклеіў перасохлыя вусны, выціснуў з сябе:

– Ведаю.

– Значыць, пан партызан хоча сыграць ролю героя? – маёр павярнуў галаву да унтэр-афіцэра Пуплікава, глянуў на яго амаль невідушчымі вачамі, у якіх пачынала вірваць злосць, загадаў: – Звязаць яго і не спускаць вачэй! Вы адказваеце за бандыта. Спадзяюся, па дарозе падрыхтуеце яго да наступнага допыту. Скажыце яму яшчэ раз – нам патрэбны звесткі пра мясцовых партызан. Як бачыце, з вас, унтэр-афіцэр, спрос за гэтага чалавека асобны.

Маёр дачакаўся, пакуль перакладчык перадасць апошняе слова, затым дапытліва зірнуў на Чубара, але ад далейшай размовы тым не менш адмовіўся. У суправаджэнні цэлай світы ён рушыў направа ад дуба, і Чубар доўга яшчэ бачыў ягоную вузкую спіну, балазе, што галаву ў той бок Радзівону не трэба было паварочваць. Больш Чубара не чапалі.

Тым часам пачуліся каманды. Рускія і немцы пачалі разбірацца па падраздзяленнях.

Канвойныя скруцілі Чубара лейцамі па руках і нагах, мігам ускінулі на нейкія мяшкі на возе, хутчэй за ўсё – з хатнім начыннем; за кучара на гэтай падводзе быў вясковец з насуплеными белымі брывамі, якія, здавалася, ніколі не рухаліся на твары.

Чубар думаў, што яго павязуць кудысьці асобна, каб адразу ж пасадзіць у скляпенне ці ў якое іншае збудаванне, дзе можна будзе трымаць пад вартай, але не – калёсы, на якія яго ўскінулі, крануліся з месца ў агульным абозе і не выязджалі з калоны. Лежачы на калёсах ды яшчэ тварам угору, нельга было вызначыць, куды накіроўвалася ад Бесядзі каманда. Аднак неўзабаве Чубар пачуў, як нехта блізка назваў вёску – Кубракоўка. «Значыць, немцы пабаяліся ехаць лесам», – сцямiў Радзівон і тут жа падумаў пра іншае: яму дасюль чамусьці здавалася, што вёска гэтая знаходзілася вышэй таго месца, дзе ўпадаў Зубар у Бесядзь. Праўда, ён ніколі ў Кубракоўцы не быў, заўсёды здаралася трапляць міма, бо з Бялынкавіч балынак у Крутагор’е ляжаў трохі ўбаку.

У Кубракоўцы калона не спынілася, дарма што крыку, енку хапіла, а найбольш свінога віску ды кыркання курэй…

У Кубракоўцы на воз да Чубара падсеў унтэр-афіцэр Пуплікаў – няйначай для пастраху піхнуў свайго зняволенага, пасля чамусьці засмяяўся. Прызнацца, Радзівона трохі дзівіла, што той не адразу кінуўся выконваць загад начальства – рыхтаваць да наступнага допыту ўзятага ў палон партызана. Хоць што значыць – да наступнага? Чубар зусім не падманваўся, тады, пад дубам ля Бесядзі, адбылося штосьці накшталт пачатковай рэпетыцыі. Да сапраўднага допыту належала рыхтавацца. Але дзе той пачнецца? На чарговым прывале ці недзе ў іншым месцы, куды яго павязуць? Пакуль Чубар разумеў адно – гэты рускі унтэр-афіцэр сапраўды павінен быў згодна з загадам нямецкага маёра падрыхтаваць яго да будучага здзеку. А што здзеку на допыце пры цяперашнім Чубаравым настроі пазбегнуць не ўдасца, можна было не сумнявацца. На шчасце ці, можа, якраз на бяду, Радзівон многа чаго цяпер разумеў, шмат пра што здагадваўся. Аднак не меў ні розуму, ні мудрасці, як суцешыць сябе, дарма што і роспачы пакуль не адчуваў: рашыўшы адзін раз, што з ягонага становішча дастойнага выйсця няма, на другі ён ужо не разлічваў. Ды і ворагі нібыта патакалі яму ў гэтым, ва ўсякім выпадку, не спяшаліся давесці справу да развязкі.

Нарэшце унтэр-афіцэр Пуплікаў сказаў нязлосна:

– Ну, падумаў над прапановай гер маёра?

Чубар спярша рашыў і цяпер маўчаць, але хутка перадумаў, можа, у адказ нават на спасцярожлівасць гэтага чалавека, якую можна было ўспрыняць і як своеасаблівую памяркоўнасць, калі не спагадлівасць. Канечне, веры мала было, але ж…

– Пра што мне трэба было падумаць? – быццам з неўразуменнем спытаў Чубар, не жадаючы выдаць сваю знарочыстасць, нават непрыязнасць.

Відаць, падобныя размовы для Пуплікава не новыя былі, бо ён тут жа выказаў сваю недаверлівасць да Чубаравага неўразумення:

– Не трэба прытварацца. Маёр жа, здаецца, правільна паставіў перад табой пытанне? Ну а мне да таго ж хочацца ведаць, хто ты, адкуль, як прозвішча і гэтак далей.

– Дык… – Чубар хацеў пачаць слоўную гулянку з унтэр-афіцэрам, але раптам штосьці перахапіла ў горле, акурат здушылі слёзы; добра, што добраахвотнік не прыспешваў.

Памаўчалі колькі часу. Але не доўга. Унтэр-афіцэр нерухома пасядзеў на возе, звесіўшы ногі праз бакавую гнушку, тады паляпаў рукой па мяшках.

– Ды ты, бачу, ужо нарабаваў па вёсках, – сказаў ён кучару.

– А чаму не ўзяць, калі валяецца? – усё роўна як раздражнена адказаў той.

– Што валяецца, а што і не, – Пуплікаў зноў паляпаў рукой па мяшку. – Праўда, партызан?

– Не ведаю, – сказаў Чубар.

– Ну а хто ты – ведаеш?

Чубар сашчапіў зубы.

– Значыць, не хочаш рассакрэчваць сябе? Што ж, твая гасподня воля на гэта. Мы, рускія, падобныя адзін на аднаго – спярша запіраемся, ні ў чым не прызнаёмся, каб, крый бог, дрэнна не падумалі аб нас, пасля, як паспрабуем шампалоў на спіне ці калодак на яйцах, адразу лапкі ўгору, маўляў, не вынес катавання. Думаеш, я не ўпарціўся? Але ў мяне трохі іншае становішча было, чым у цябе. Я – ваеннапалонны. Я – з арміі. А ты – партызан. Па-іхняму – бандыт. Па загаду фюрэра цябе навату палон нельга браць. Цябе вешаць трэба адразу. Я гэта к таму, што… Словам, сам чуў – гер маёр даручыў перад допытам пагаварыць мне з табой, падрыхтаваць.

– Я так разумею, што ў пекла?

– Гэта твая справа, як разумець. Патрэбны дадзеныя пра мясцовых партызан, і ты дасі іх. Ну а тады ўжо можна будзе падумаць і пра тваё будучае.

– А ўсё-ткі?.. Сярэбранікі і мне можна будзе атрымаць?

– Ты думаеш, мы ўсе тут добраахвотнікі? Не, нас таксама і голадам марылі, і на допыт вадзілі. І вось пайшлі новаму парадку служыць. Затое на нешта можам разлічваць. Ну а наконт сярэбранікаў…

– Так, сёння нібыта што і свеціць, а заўтра, глядзіш, у цемру трапіш. Хіба вы сапраўды спадзяецеся, што немцы назаўсёды ў нас?

– А хіба ты не ведаеш, што яны зноў наступаюць?

– Чытаў лістоўку.

– Значыць, павінен разумець, што да чаго. Што не ўдалося ў мінулым годзе, дакончаць сёлета.

– Гэта яшчэ бабка надвае варажыла. А як наступленне і цяпер праваліцца?

– Не павінна. Пад Масквой навучыліся.

– І ўсё-ткі, на што вы спадзяецеся?

– На тое, што, разбіўшы балыпавікоў, немцы нам аддадуць уладу ў Расіі. Канечне, штосьці і сабе возьмуць, не без таго, ну маёнткі некаторыя, заводы, астатнім мы станем валодаць.

– Ну, а ўлада якая будзе?

– Наша, руская.

– Значыць, ні савецкая, ні нямецкая?

– Можна сказаць і так. Думаеш, мы служым новаму парадку і ні аб чым больш не думаем? А партызаны ўсе за бальшавікоў, за савецкую ўладу?

– А як жа іначай?

– Шастаючы па лясах, вы нічога не ведаеце. Ужо нават генерал Жукаў і той абяцае распусціць калгасы. А генерал Уласаў здаўся немцам.

– Ну, калгасы – яшяэ не ўся савецкая ўлада. А пра генерала Уласава… Не чуў пра такога генерала…

– Без калгасаў балынавікі не змогуць. Ды ладна, мы гэта дарэмна такую дыскусію зацеялі. Давай лепей пра цябе. Я шчыра кажу – калі дасі немцам каштоўныя дадзеныя пра партызан, то можна будзе выдаць цябе за перабежчыка, які свядома пакінуў банду ў лесе. Так што думай, таварыш партызан. Але калі што не так, то я ўжо казаў табе там, на беразе ракі: альбо памірай чалавекам, альбо…

– Чаму ж сам не выбраў смерці?

– Я выбраў іншае. Цяпер твая чарга.

– Ладна, дзякуй на добрым слове. Я таксама выберу сваё. Ты лепей скажы – дапамагчы мне хочаш?

– У чым?

– У выбары свайго шляху.

– Кажы ясней!

– Ці не мог бы прыстрэліць мяне?

– Вось так, на возе? А за што?

– За пабег.

– Як жа ты пабяжыш, калі звязаны?

– То развяжы.

– Многа ты захацеў. Было там, за ракой, не спаць.

Уласна кажучы, гаворка з Чубарам для унтэр-афіцэра Пуплікава скончылася нічым. Ён гэта зразумеў і саскочыў з воза, сказаўшы камусьці:

– Ты пільнуй гэту падлу, а то… Словам, бальшавік вышэйшай пробы.

Было чуваць, як побач з калёсамі затупалі другія ногі.

Калона ўжо рухалася балыпаком. Як можна было меркаваць па часе, патрачаным у дарозе ад Кубракоўкі, карнікі набліжаліся ўжо недзе да Гончы.

Другі канвойны не прыставаў да Чубара. Толькі спытаў адзін раз:

– Ну што, дагаварыліся?

Цяжка сказаць чаму, але Радзівон не стаў адказваць, бо ўнутранага супраціўлення пры гэтым не адчуваў. Няйначай, што пасля размовы з Пуплікавым пачынаць яшчэ адну не мела сэнсу, бо чапляцца абы за што Чубар не хацеў, таму як подласць не бывае абмежаванай – яна праглынае ўсяго. Але якраз цяпер у Чубаравай памяці ўсплыла яшчэ адна мудрасць, якую ён пачуў некалі ад Карханава: эгаізм

любога грамадства складаецца, акрамя ўсяго іншага, з таго, што яно захоўвае ў сваім памінальным спісе толькі тых, хто заслужыў удзячнасць альбо наадварот. Тады Чубар не надаў гэтай мудрасці асаблівага значэння. Ды і гаварылася яна зусім у іншай сітуацыі. Затое цяпер, здаецца, засвяцілася ўсёй поўняй. І ўвогуле – што яму было раней да ўдзячнасці ці няўдзячнасці? Была партыя, і быў ён у ёй. Існавала дысцыпліна. Дзейнічаў не толькі напрамак думак, аднак і выбару. І ў рэчышчы гэтага напрамку належала жыць, працаваць.

Між тым маўчанне – гэта таксама адказ, часам нават больш жорсткі і не двухзначны, чым самыя праўдзівыя, рашучыя словы.

Дзіўна, але пакінуты сам-насам, а найбольш закалыханы на мяккіх мяшках няроўнай дарогі, Чубар раптам заснуў. Прытым ён сам чуў, што засынае – то праваліцца ў забыццё, то зноў вернецца. Але сон авалодваў усё мацней і мацней. Нарэшце змог. І тым не менш спаў Чубар нядоўга. Прачнуўся ад стрэлаў. Хацеў прыўзняцца на возе – дарэмна: цяпер болем працяло ўжо ўсю верхнюю частку цела, нават у вачах зрабілася цёмна і моцна ўдарыла ў напечаную сонцам галаву. Радзівон адчуў сябе зусім бездапаможным, здавалася, раней было куды лепей. Аднак, чуючы стрэлы на гары, якія не ўшчукалі, а наадварот памнажаліся, ён усё ж прымусіў сябе павярнуцца на правы бок: аказваецца, нямецкая калона ўз’язджала па мосце на гару, што за Гончай; якраз на віду быў па той бок Бесядзі верамейкаўскі луг, на ім людзі. На ладнай адлегласці нікога ўгадаць яму не ўдалося, аднак душа адразу зайшлася, да таго ж Чубару здалося, што немцы страляюць па вяскоўцах. І ён жахнуўся: чаму людзі не разбягаюцца, не ратуюцца? «Ну што ж вы?..» – крыкнуў немым нутром Радзівон на сваіх аднавяскоўцаў і ў гэты момант убачыў, як ад Бесядзі праз луг бег нейкі чалавек. Значыць, немцы стралялі па ім. Было відаць, што імкнуўся ўцякач да ракітавых кустоў, якія засцілі сабой невялічкую дзербу; ад той дзербы ўжо не надта многа было да лесу.

Але вось чалавек упаў. Чубар заплюшчыў вочы – няйначай, куля дагнала небараку. Дапамагала гэтак падумаць і тая акалічнасць, што на гары раптам перасталі страляць. Моцна шкадуючы незнаёмага ўцекача, Чубар праз нейкі момант зноў паглядзеў у той бок. І як на тое, чалавек каля дзербы зварухнуўся, але не ўскочыў на ногі, а хутка папоўз наперад, цярэбячы ў траве сцежку. Тады на гары зноў пачалі страляць – то кучна, то па адным. Нарэшце заварушыліся і верамейкаўцы, сыпанулі к лесу.

Калона не спыняла руху, дарма што відовішча магло захапіць хоць каго. Калёсы, на якіх везлі Чубара, таксама без затрымкі пераехалі мост. Далей дарога ішла ўгару, аднак абапал яе пачыналіся стромыя абочыны, якія закрывалі сабой бачнасць. Таму неўзабаве прапаў з вачэй спярша амаль апусцелы ўжо верамейкаўскі луг, затым і наогул усё вакол, акрамя неба, што ледва не ўшчыльную ляжала на абочынах, утвараючы глухі праезд. Між тым карнікі ўсё яшчэ стралялі на гары. І па тым, што стрэлы не ўшчукалі, можна было меркаваць, што чалавек, на якога вялося паляванне, пакуль жывы.

Калёсы з Чубарам тым часам выехалі паўз могілкі на ўзгорак. Стала відаць, што галава калоны паварочвала адсюль на Бабінавічы. Вызначыўшы гэта, Чубар чамусьці

ажно ўздыхнуў з палёгкай. А яшчэ праз нейкі момант пачуў, што настала цішыня – ні стрэлаў, ні ўзбураных галасоў. Але ў Чубаравай душы спакою не з'явілася. Наадварот, Радзівона раптам агарнула такая самота, якой ён не адчуваў яшчэ сёння, нават і ў тыя хвіліны, калі зразумеў на беразе Бесядзі, што трапіў у палон. Прычынай яе хутчэй за ўсё было ўбачанае тут: і бязлітасныя стрэлы на гары, і ўцёкі ад іх нейкага чалавека, і бездапаможныя верамейкаўцы, што, быццам патрывожаныя птушкі, ратаваліся ад стрэлаў… Але ж там была воля!.. Бадай, усведамленне яе, дакладней, разуменне недаступнасці яе для яго, цяпер узмацніла прыгнечанае адчуванне. Уласна кажучы, штосьці падобнае – уцёкі і стрэлы, якія давялося толькі што назіраць, магло здарыцца і з ім, калі б Чубар меў магчымасць памкнуцца да волі.

Дзіўна, але пра сёе-тое з гэтага думаў цяпер не адзін Чубар. Раптам у галавах крактануў і заварушыўся кучар, якога дасюль чамусьці ніхто не браў пад увагу; Чубар ад цяперашняй прысутнасці таго ажно сцяўся, быццам чакаў што побач апынецца яшчэ хтосьці. Але вось кучар загаварыў – глуха, як у рукаў.

– Ну вот, – сказаў кучар, – цяпер сам пабачыў, як яно бывае. На чалавека ідзе паляванне, бы на ваўка. Нябось, і праўда забілі таго небараку, а ты сам прасіўся.

– Дык і што? – з нечаканаю ахвотай адгукнуўся Чубар. – Чым ляжаць вось тут, на тваім возе, ды слухаць…

– Пакуль на возе ляжыш, то жывы.

Сказаўшы так, кучар на нейкі час замоўк. Тады зноў крактануў. Аднак цяпер гэтым і абышоўся. Затое ўжо нібыта цягнула за язык Чубара:

– Ці то шкадуеш мяне, ці то ворагам маім памагаеш?

– А я сам па сабе. Мяне вось мабілізавалі ў абоз. Дак я і сапраўды ў такім разе ні іхні, ні ваш.

– Але вязеш іх? Значыць…

– Яшчэ нічога не значыць. Але таксама бачу – доўга памірае чалавек… Яно і звер… Але ж чалавек… Так што дарэйна сам просішся.

– Гэта ўжо мая справа, – сурова сказаў Чубар, але не стаў злавацца, бо не дужа хапала на гэта тае сілы. Між тым кучар імкнуўся давесці сваё.

– Я к таму, – нібыта апраўдваючыся, пачаў ён, – што ведаю цябе.

– Не кажы абы-што! – агрызнуўся Чубар. – Адкуль табе ведаць мяне?

На кучара павышаны Чубараў голас, здавалася, не падзейнічаў. Але гаварыў ён па-ранейшаму, як павучаў:

– Ды ўжо не схаваешся, раз трапіў. Будуць вазіць па вёсках, паказваць людзям, хто-небудзь ды й пазнае. Так што…

– Усё-ткі, адкуль ведаеш?

– Ну, ведаю.

– Даўно з імі ездзіш?

– А цяпер, як у старыя шальваркі, загадаюць – едзеш. У немцаў, бачыш, сваіх коней не хапае. А тут яшчэ гэтыя… Здаецца ж, свае, рускія, а таксама, выходзіць, як

немцы. Ну а коні?.. Дык гэта яшчэ няблага, што бяруць з гаспадаром, а то б пішы – прапала.

– Што вязеш?

– Ды так, абы-што.

– Відаць, мужыкоў па вёсках рабуеце?

– Дак… усяму сваё. А каму тым часам дак нічога ўжо і не патрэбна.

– Дак ты падбіраеш?

– А нас тут, у абозе, шмат.

– Развязаў бы мяне? Га?

– А ты яшчэ крыкні, каб усе чулі! Навошта і мяне пад расстрэл падводзіць? Думаеш, даруюць? Нездарма ж вока з цябе не спускаюць.

– Сочаць?

– Раз папаўся, то… Цярпі. І мяне не стаўляй у нязручнае становішча.

– Ну, ладна, забудзем пра гэта. Але адкуль мяне ведаеш?

– У раёне мне паказвалі адзін раз. Да вайны, зразумелая справа. Вунь, кажуць, новы старшыня верамейкаўскага калгаса. То з таго і помню. А цяпер каля Бесядзі, бачу, вяжуць ды ка мне на воз кладуць.

– Адкуль жа сам?

– Гэта няважна. Табе ўсё роўна, бо ты ўжо не сведка ў маёй справе.

– Ну, не сведка, дык і не сведка, – ці то незалюбіў, ці то згадзіўся Чубар і перастаў пытаць. Бадай што кучару таксама не выпадала больш гаварыць з ім.

З палавіны дарогі з Гончы ў Бабінавічы яны ўжо маўчалі.

Чубар думаў, што па прыездзе ў мястэчка з ім зноў пачнуць знясільваючыя размовы, у якіх будуць палохаць сапраўдным допытам, маўляў, гэта мы пакуль так сабе, спадзеючыся, што знойдзем у адказ зразуменне, гэта яшчэ кветачкі, а ўжо затым, калі не знойдзем паразумення… Здаецца, без катавання, але ўжо адны такія літасцівыя размовы выпетрывалі душу і знясільвалі. Толькі дарэмна была Чубарава насцярога. Увечары ніхто не стаў займацца ім. Прывезлі ў мястэчка, развязалі ды кінулі, быццам жывёліну, у гэтае вось сутарэнне. Усю ноч ён знаходзіўся тут адзін. А пад ранне ў склепе апынуўся хтосьці яшчэ.

Нарэшце малітвы і ўсхліпванні заціхлі. Але ў адзіноце, без насцярогі. Можна было падумаць, што чалавек усё яшчэ не здагадваўся, што побач з ім знаходзіцца другі зняволены. Праўда, Чубару чамусьці пры гэтым таксама не хацелася выдаваць сваю прысутнасць. І не дзеля гулянкі ці якой выгоды. Проста не з’яўлялася такога жадання, і ўсё. Думкі, як тыя грувасткія аблокі, зноў пачалі запаўняць галаву. Зрэшты, яны кожны раз вось гэтак выплывалі аднекуль, як толькі ён прачынаўся і ўсведамляў дзе знаходзіцца, тады адплывалі ў іншую далячынь. Аднак цяпер яны адрозніваліся ад ранейшых, што прыходзілі сёння ўначы, нейкай сваёй фізічнай цяжкасцю. І, можа, таму Чубару не ўдавалася ўжо засяродзіцца на нечым пэўным.

На дварэ тым часам наставала раніца – пад столлю ў сутарэнні пачынала святлець праз акенца ў кратах. Дзіўна, але Чубар нібыта чакаў гэтых хвілін. Раптам яму зрабілася падуладным лавіць зрокам, як паступова, аднак імгненне за імгненнем

асядала святло зверху, разбураючы цемру ў сутарэнні. Аказваецца, на ўсё патрэбны пэўны час і адпаведнае месца. Ва ўсякім разе, раней Чубар не ведаў што нават святло можна дзяліць на такія вось кароткія штуршкі, якія здольны не толькі дзяліцца, а і рухацца. Працуючы ўвесь час, як кажуць, пад адкрытым небам, ён успрымаў змены святла і цемры, дня і ночы, нарэшце, лета і восені, зімы і вясны, як дадзеныя, што дзейнічаюць механічна, дарма што іншы раз альбо апярэджваюць самі сябе, альбо спазняюцца.

І ўсё-ткі Чубар і цяпер надоўга зачапіўся за адну думку, якая ўсё тым жа воблакам выплыла аднекуль з-за небакраю памяці.

Прыгадалася раптам, як ён прыйшоў назусім у атрад Нарчука. Было гэта яшчэ зімой, калі Мядзведзеў рашыў адвесці сваіх партызан зноў на Арлоўшчыну, каб недзе там перайсці лінію фронту. Чубар не ведаў, якія прычыны былі на гэта, дарма што к таму часу ўжо захоплены быў уначы Хоцімск. Крутагорскія партызаны тады не прымалі ўдзел у нападзенні на прыгранічны раённы цэнтр: здаецца, і слова пэўнае далі Чубару, аднак у Батаеўскія лясы не прыйшлі. Гэтая акалічнасць чамусьці моцна падзейнічала на Чубара. Можа, нават зрабілася галоўнай прычынай, якая змусіла яго вярнуцца ў Забесяддзе. У кожным разе, у часе размовы з Карханавым-Мядзведзевым, які вельмі хацеў мець у сваім спецатрадзе Чубара, Радзівон раптам акурат сумеўся, дакладней, не так сумеўся, як проста задумаўся. Аказалася, гэтага хапіла, каб камандзір атрада таксама нешта зразумеў. «Ладна, рашай, як сам знаеш, Радзівон, – сказаў Карханаў, – бачу, у цябе другія планы». Вывеў Чубара з Батаеўскіх лясоў к Трусаку Шпакевіч, абодва пагаварылі трохі – Шпакевічу таксама хацелася трапіць на сваё Палессе… Тым часам Чубару можна было атайбавацца ў раёне ў атрадзе Скандзілава, што ўжо стаяў недалёка ад Трусака. Аднак ён мала каго ў тым атрадзе ведаў, можа, аднаго Ціта Субоціна. Таму і прыйшоў сюды, у атрад Нарчука, да якога некалі быў прыпісаны і які ўмяшчаўся пакуль у адной невялікай зямлянцы. Трэба сказаць, што Чубар з першага дня ў атрадзе Нарчука даў зразумець, што ён не так сабе з’явіўся, а тым больш не збіраецца адседжвацца ў лесе, у іхняй зямлянцы, бо мае канкрэтнае даручэнне Цэнтра. Што такое Цэнтр, ніхто дакладна тады не ўяўляў сабе. Але за гады савецкай улады ўсе прывыклі, што Цэнтр павінен быць. І падразумявалася пад ім заўсёды Масква, прынамсі, штосьці ў Маскве. Адсюль і простая логіка: паколькі спецатрад Карханава ішоў сюды, у Забесяддзе, з сталіцы, то і камандзір яго меў самае непасрэднае дачыненне да Цэнтра. Цяпер, ва ўмовах нямецкай акупацыі, слова гэтае вымаўлялася нават больш значна, усё роўна як нанава, з новым значэннем. У кожным разе, не так, як у мірны час; але на ім можна было цяпер адным часам і спекуляваць, і больш сур’ёзна любую неабходную справу рабіць. Неба – высока, Масква – далёка, акурат як за сямю замкамі. Маючы намер актывізаваць дзейнасць крутагорскіх партызан, Чубар якраз і пачаў выкарыстоўваць магічнасць гэтага слова – Цэнтр, таксама сваю былую прыналежнасць да маскоўскага спецатрада, кажучы простай мовай, займацца звычайнымі інтрыгамі: напрыклад, час ад часу адлучацца з атрада, робячы выгляд, што падаецца на сувязь з нейкімі

людзьмі, якія знаходзяцца на акупіраванай тэрыторыі з мэтай каардынацыі баявых дзеянняў усяго народнага супраціўлення і г. д. І тым не менш страху на крутагорскіх партызан не нагнаў. Тыя як заселі ў зямлянцы ў Шурышчы, куды перавялі іх з Цыкуноў Зазыба з Абабуркам, так заставаліся ў ёй, лічы, да самага шарана. Харчам іх забяспечвалі часцей такія сувязныя, як Дзяніс Яўменавіч з Верамеек, Захар Доўгаль з Гончы, Абабурка з Бабінавіч. У чым-чым, а ў добраахвотных памочніках недахопаў не было. Былі сувязныя ў партызан і ў Крутагор'і. Тая ж Ганна Піханава. Гаварылі, што Чарнагузаў праз кагосьці там быў звязаны нават з начальнікам паліцыі Рослаўцавым. Да самога ж Чубара ў атрадзе паставіліся насцярожана, аднак трывалі і яго неўтаймаванасць, і яго дзікаватыя паходы ў невядомасць – а раптам сапраўды чалавек мае на ўсё гэта паўнамоцтвы?..

Уласна кажучы, насцярожанасць гэтая не прайшла цалкам нават цяпер, калі ў Чубаравых «інтрыгах» не было патрэбы, бо мясцовых партызан пачалі ўжо ўспрымаць як рэальную сілу. Прынамсі, у Забесялдзі. Праўда, сіла гэтая выклікала ў адказ небяспеку для насельніцтва. З'яўленне партызан у тым альбо іншым месцы амаль заўсёды мела адпаведную рэакцыю з боку немцаў – карнікі абавязкова наведваліся туды, дзе пабывалі «бандыты», шукалі вінаватых, заносячы ў гэты даволі адвольны спіс кожнага, на каго падзе хоць якое падазрэнне. Так што дзейнасць партызан магла не толькі радаваць людзей, а і палохаць. Нездарма ж кажуць: спаць пад адной коўдрай – гэта яшчэ не значыць глядзець адны і тыя ж сны… Акрамя таго, тым жа сялянам даводзілася трываць усялякія інквізіцыі як з аднаго, так і з другога боку. Перад вайной у Верамейках паказвалі кінафільм «Чапаеў». Дык там вяскоўцы скардзіліся легендарнаму начдыву: маўляў, што ж выходзіць, Васіль Іванавіч, белыя – рабуюць, чырвоныя, даруйце, таксама?.. Куды падзецца мужыку? Штосьці падобнае назіралася цяпер. Прыклад таго ж кучара, які размаўляў з Чубарам у дарозе, як найлепш пацвярджаў гэта: хапай, што на вочы трапіць!.. Партызаны таксама ажыццяўлялі рэквізіцыі – спярша, вядома, бралі для сябе, пасля ўжо для брата, для цешчы і свата… Асабліва ў тых вёсках, што размяшчаліся ў так званай нейтральнай паласе, дарэчы, вельмі ўмоўнай, але ж сапраўды паміж нямецка-паліцэйскімі станамі ў населеных пунктах і партызанскімі стаянкамі ў лясах…

У думках Чубару лягчэй было пераходзіць з адной крайнасці ў другую, чым старацца разважаць так, каб адна падзея вынікала з другой, адзін учынак абумоўліваўся другім; аднак ён трывала ведаў, што ва ўсякай бядзе павінен быць вінаваты і што кожны потым вяртаецца да віны сваёй.

Дзіўна, але сёння Радзівон Антонавіч мог прызнацца сабе, ды і не толькі сабе: сумнявацца таксама нялёгкая справа, прынамсі, пасля вялікай веры ў штосьці пэўнае; усведамленне гэтага прыйшло да Чубара, няйначай, з адзіноты; ён і ў мірны час, уласна кажучы, быў адзінокі чалавек, дарма што жыў і працаваў у калектывах: цяпер жа адзінота была ўсё роўна як непазбежнай; значыць, думаў ён, адзінота не толькі атручвае чалавека, яна і ратуе яго, і вылечвае.

Якраз адзінота дапамагла Радзівону таксама зразумець яшчэ адно: у вайну вельмі лёгка атруціцца чалавеку яе трупным дыханнем.

За час свайго мінулагодняга і сёлетняга бадзяння Чубар сапраўды шмат перадумаў, багата што адкінуў прэч, нават выкінуў са сваёй памяці і не хацеў ужо вяртацца назад, але праўду кажуць людзі – чалавек ніколі не забывае дзяцінства…

Раней ён, напрыклад, ніколі не бачыў у сне маці. Яна не снілася яму… Увосень мінулага года яна раптам з'явілася ў сне – з заплюшчанымі вачамі, уся ў гарадскім, хоць бачыць яе ў такім адзенні жывой, здаецца, яму не даводзілася. Маці аб нечым гаварыла з ім, аднак назаўтра Чубар не мог успомніць і слова з тае размовы… Пасля Радзівон стаў бачыць яе ў снах часцей. І ўсё пытаўся: чаму пакінула аднаго на гэтым свеце? Маці таксама штосьці гаварыла яму ў адказ, але зноў усё роўна як нема, бо да раніцы забывалася. Бацька Чубару не сніўся зусім. Можа, таму, што Радзівон к гэтаму часу страціў нават воблік гаго са сваёй зрокавай памяці, не мог прыгадаць з выразнасцю, як бацька выглядаў, што насіў, як гаварыў…

І яшчэ было адно, што дзівіла: сіратой Чубар адчуваў сябе толькі ў маленстве, калі многа парабкаваў, ды цяпер вось. У сталым узросце адчуванне сіроцтва мінулася, можа, праз тую захопленасць грамадскім жыццём, якая прыйшла ў каморніцкай школе. Менавіта ж адтуль лёс, лічы, малога яшчэ хлапца лёг на рэйкі, якія прывялі яго ў Забесядцзе.

Сёння Чубару нішто не снілася. Ён і рады быў гэтаму адным часам і не рады. Але ж і спаў ён нямнога. Можна сказаць, адно кавалачкамі прыхопліваў таго сну.

Чалавек, якога немцы падсадзілі да яго ў склеп, ужо, няйначай, спаў, бо храпеў і варочаўся, дарма што справа ішла да раніцы. Кажуць, чужы сон памагае заснуць другому. Гэты блізкі сон неўзабаве падзейнічаў і на Чубара. А калі Радзівон зусім пры святле зноў прачнуўся, таго чалавека, які расхваляваў яго і памог заснуць яшчэ раз, ужо не было побач – як з'явіўся нячутна ў царкоўным сутарэнні, так і знік. Можна было падумаць, што начаваў з ім нейкі пярэварацень. Але ж Чубар на свае вушы чуў, што хтосьці маліўся, уздыхаў і варочаўся, тады спаў і храпеў. Пабочная патаемнасць не так сабе!.. Няйначай, немцы падсаджвалі ў сутарэнне свайго далавека.

Напраўду яно якраз так і выйшла. Чубар пераканаўся ў гэтым адразу, як яго прывялі ўранні на допыт у валасную ўправу, дзе ўжо сядзеў маёр з асобай каманды СС, былі ва ўправе таксама камендант Гуфельд і бургамістр Брындзікаў. Немцы нейкі час размаўлялі, кудысьці пасылалі бургамістра, а Чубар стаяў пры канвойным, насцярожана слухаў чужую мову, якая трывожыла сваёй няроўнасцю і ўсё роўна як картавасцю. Нарэшце маёр успомніў пра партызана.

– Што вы нам сёння скажаце, пан Чубар? – зусім без звераватасці спытаў ён.

Невядома чаму, але Чубар з гэтай знарочыстай памяркоўнасці ўсміхнуўся.

Ён разумеў, што доўга маўчаць гэты раз яму не дадуць. Тым больш што загаварыў і Гуфельд.

– Дарэмна вы гуляеце ў хованкі, пан партызан, – з'едліва сказаў ён, беручы са стала аркуш паперы. – У нас тут дакладныя звесткі пра вас. Чубар Радзівон Антонавіч, былы старшыня калгаса «Іскра», член камуністычнай партыі, партызан мясцовага

атрада. Ад вас, як бачыце, патрабуецца адна фармальнасць: сказаць, дзе стаіць цяпер атрад Нарчука, колькі бандытаў у ім, якая зброя?

Бургамістр Брындзікаў тым часам стаяў паміж немцамі, ківаў, як заведзены, галавой, маўляў, ты гэта, Чубар, сапраўды дарэмна!..

Кажуць, чалавека іншы раз можа выратаваць нават хлусня, але тады яна павінна быць большай за праўду. Чубар падумаў пра гэта і раптам здрыгануўся, усё роўна як нанава вярнуўся з непрытомнасці. Усведамленне таго, што яго нарэшце канчаткова паставілі на край прорвы, захалынула душу.

XVI

Зазыба дарэмна ганяўся за атрадам. Ужо настала ноч, а ён так і не даведаўся, дзе знаходзіліся крутагорскія партызаны, хоць паспеў наведацца і ў Кавычачы, і ў Вараноўку, і ў Гутку. Затое ў Верамейках ужо таксама ведалі, што ў наваколлі з'явіліся нейкія партызаны. Праўда, згадвалі пра гэта нібы паміж іншым, а то ўсё бедавалі аб спаленай сваімі партызанамі зацішанскай смалакурні ды забітым паліцаевым сыне: з'яўленне па той бок Бесядзі карнага атрада таксама згадвалася найбольш з тым, што на лузе быў падстрэлены немцамі старэйшы Пахамкоў сын з Кавычач. Дарэчы, прывёз яго ў Верамейкі Дзяніс Зазыба – наехаў на хлопца па дарозе з Шурышча, недалёка ад Цімохавай пожні. Сядзеў небарака з прастрэленай нагой пад таўшчэзнай сасной, няйначай, чакаў, пакуль хто-небудзь забярэ: сілы хапіла толькі на тое, каб дапяцца сюды ад дзербы. Хлопец сам сказаў Зазыбу, хто ён і адкуль. Тады Дзяніс Яўменавіч пасадзіў параненага на воз, прывёз у Верамейкі. А з Верамеек ужо ў Кавычачы, балазе, што якраз у Кавычачах у Зазыбы найперш была справа: туды ж падаліся партызаны з Зацішша. Стары Пахамок спярша разгубіўся, убачыўшы параненага сына, але адразу ж і накінуўся на яго, маўляў навошта табе здалася тая Гонча, сваіх дзевак у вёсцы мала? Аказваецца, той заляцаўся ў Гончы да нейкай дзеўкі, а гэты раз натрапіў на немцаў… Зазыба, вядома, спытаў у Пахамка пра партызан. «Былі, былі, – заківаў галавой Пахамок. – Але пайшлі, ведаеш, пайшлі кудысь». Тады Дзяніс Яўменавіч аб'ехаў другія вёскі. Але, як кажуць, таксама ні гуку, ні следу ад партызанаў. «Былі, былі, а як жа, былі, але пайшлі», – казалі паўсюды мужыкі. Уся надзея, такім чынам, была на Ганну Піханаву, якая заставалася на ноч у Шурышчы. Уласна кажучы, так яно і выйшла. І ўжо Нарчук пасылаў уранні па Зазыбу з Шурышча. Спярша Мітрафан Ануфрыевіч хацеў каб Дзяніс Яўменавіч з'ездзіў у Бабінавічы, каб паглядзеў там на свае вочы, што да чаго. Аднак Павел Чарнагузаў пераканаў камандзіра, што найперш трэба наладзіць сувязь з новым партызанскім атрадам. «Сваімі сіламі не толькі немагчыма затрымаць эсэсаўскую каманду, але і падужацца як след», – даводзіў Павел Ягоравіч. У выніку ў Бабінавічы да Абабуркі пайшоў хтосьці іншы: да Скандзілава ў Трусак таксама быў накіраваны сувязны. Зазыбу ж выпала ехаць ў Панькоўскую Буду, дзе хутчэй за ўсё можна было знайсці прышлых партызан. Да Зацішша Зазыба ехаў хутка, але нездарма кажуць – з чужога каня злезеш нават на грэблі; так яно і выйшла: за былым панскім маёнткам партызанскі конь раптам пачаў прыставаць; спяшаючыся, Зазыба падганяў яго лейцамі, гучна «нокаў», бадай, на ўвесь лес, ды мала чым памагаў справе; нарэшце выбіліся з сіл і конь, і вазак; Зазыба хацеў выпрагчы каня, каб папасвіўся трохі, ужо вызваліў дугу з левага гужа, аднак штосьці заляскала на бялынкавіцкай дарозе, і ён, з трывогай паслухаўшы, адмовіўся ад свае задумы – заціснуў нанова клешчы, ускочыў на калёсы і зноў «занокаў», мала на што спадзеючыся.

Дзіўна, але ў сённяшняй мітусні, ды і ва ўчарашняй, пад канец дня і ўвечары Дзяніс Яўменавіч, здаецца, ні разу не ўспомніў пра Чубара. Да таго ж у Шурышчы пра Радзівона таксама ніхто не абмовіўся словам, усё роўна як такі партызан зусім не

лічыўся ў атрадзе, можа, таму Дзяніс Яўменавіч і дасюль быў спакойны за яго, не так спакойны, як не заклапочаны, каб не сказаць абыякавы, няйначай, чалавек недзе заняты, раз няма ў атрадзе. Нікога ж не хвалюе яго адсутнасць. Але цяпер гэты шум на бялынкавіцкай дарозе быццам штуршком вярнуў Зазыбу да ўчарашняй паездкі з Чубарам. Стала трывожна на душы, з'явілася дакорлівае пачуццё – гэта ж трэба, нават пацікавіцца ў партызан не паспрабаваў!..

Раззлаваны на самога сябе, Дзяніс Яўменавіч не мог супакоіцца ўжо да самай Панькоўскай Буды. У гэтай вёсцы ў яго быў знаёмы мужык, дарэчы, як і амаль у кожнай, што далёка ці блізка знаходзіліся ад Верамеек, нездарма ж столькі гадоў пражыта было на свеце. Мужыка звалі Іванам, па прозвішчы Партноў. Раней той працаваў на самой Будзе, але яшчэ перад вайной вытворчасць па нейкай прычыне была спынена, і Партноў перайшоў у кал гас. Зазыба з пазамінулага года яго не бачыў, аднак быў упэўнены, што можа заспець чалавека ў вёсцы: кульгавых на вайну не бяруць. Іванаў двор збудаваны быў акурат пасярэдзіне Панькоўскай Буды, але па загараддзю туды можна было трапіць і адразу, як выехаць з лесу, адшукаўшы коўраткі, якія гаспадар зрабіў на свой двор з глухога боку. Зазыба так і паехаў. Толькі адчыняць коўраткі не давялося. На двары ўжо стаялі другія калёсы, праўда, распрэжаныя, без каня, але на іх пад плашч-палаткай ляжаў мёртвы чалавек. З гэтага боку, адкуль пад'ехаў Зазыба, тырчэлі босыя ногі, чорныя, усё роўна як моцна пабітыя, а найперш сведчылі, што належалі яны сапраўды нежывому чалавеку, альбо памершаму, альбо забітаму. Акрамя калёс ды нябожчыка на іх, на двары нікога не было, нават каня, на якім, няйначай, прывезлі аднекуль гэтага чалавека, таксама Зазыба не бачыў. Зразумела, што колькі часу, але зусім нядоўга, Дзяніс Яўменавіч утрапёна падзівіўся з таго, што раптам убачыў тады нібыта ачомаўся, пачаў прывязваць лейцамі каня да коўратак, увесь час адчуваючы ў сабе здранцвелую зніякавеласць, якая, вядома ж, не дадавала рашучасці, дарма што Зазыба не сумняваўся, што трапіў туды, куды ехаў. Нарэшце, ён акурат перамог сябе, падаўся па двары, да ганка. Дзверы ў сенцы былі расчынены, таму Зазыба далей ганка не пайшоў – хапіла гукнуць у прыцемак, што поўніў сенцы. Голас адразу быў пачуты ў хаце, дзверы адтуль амаль у той жа момант грукнулі, па дошках мокрай падлогі затупалі цяжкія, але ўсё роўна як няўпэўненыя ногі. Па гэтым ужо Зазыба зразумеў, што ішоў хтосьці незнаёмы, прынамсі, не кульгавы гаспадар. І сапраўды, на ганак выйшаў з сенцаў не Іван Партноў а нейкі чалавек з вінтоўкай у правай руцэ. Вочы ў яго былі неспакойныя; адразу саскочылі з Зазыбы, забегалі па двары, акурат спрабуючы ахапіць позіркам больш таго, што знаходзілася цяпер на ім.

– Хто такі? – груба спытаў ён Зазыбу і малым пальцам левай рукі тыцнуў сабе ў вуха.

Канечне, такое запытанне, няхай нават грубае, не з'явілася нечаканым для Дзяніса Яўменавіча, няйначай, чалавек якраз з гэтага і павінен быў пачаць, аднак адказаць на яго чамусьці зрабілася для Зазыбы няпроста, можа, ад унутранага супраціўлення, што было абумоўлена адсутнасцю на ганку гаспадара; да таго ж нябожчык, які ляжаў ззаду на калёсах, не пераставаў бянтэжыць Зазыбу, дакладней,

усё роўна як знарок не даваў забыць аб сабе. Чалавек між тым зноў уталопіўся вачамі ў Дзяніса Яўменавіча, але ўжо з выразнай нецярплівасцю. Тады Зазыба з несхаванаю неахвотай нарэшце расклеіў свае шчыльна сцятыя губы, сказаў амаль гэтак жа нелюдзіма:

– Мне гаспадара.

– Ахто тут гаспадар сёння? – быццам сапраўды няўцям, здзівіўся чалавек.

– Дык… – Дзяніс Яўменавіч хацеў узысці яшчэ на прыступку, стаць упоравень, каб не даць глядзець на сябе ў цемя, але чалавек таксама нібыта адчуў Зазыбава жаданне, памкнуўся наперад, заступіў дарогу.

– Дык хто тут гаспадар?

– Як хто? – Дзяніс Яўменавіч паціснуў плячамі, адчуваючы, што пачынае злавацца.

– Ну так! – Усё роўна як неўпапад, але ўжо зусім зверавата сказаў чалавек.

Зазыба азірнуўся – няўжо на калёсах пад плашч-палаткай ляжыць Іван?

Дзіўна, але гэтая думка працяла яго першы раз, як апынуўся на двары, дасюль чамусьці не звязвалася адно з адным, нават у голаў не прыходзіла, што нябожчык і гаспадар могуць трапіць у аднолькавае становішча, хоць на самай справе якраз пра гэта ў самым пачатку і павінна была з’явіцца думка, прынамсі, да таго часу, пакуль не ўбачыў узброенага чалавека, які цяпер нібыта навісаў на ім, стоячы на верхняй прыступцы ганка.

У гэты момант ягонага роздуму зноў грукнулі дзверы ў сенцах – нехта выходзіў з хаты. Але цяпер у Зазыбы чамусьці ўжо не было спадзявання, што ідзе гаспадар. На ганку апынуўся другі чалавек з вінтоўкай. Быў ён маладзейшы за таго, што гэтак насядаў на Зазыбу; але ў гэтага, тым не менш, была барада. І выгляд у яго быў не такі змрочны, як у першага.

– Што тут у нас? – спытаў ён, усё роўна як у абодвух.

– Ды вось… гаспадара хоча.

– Так, я прыехаў да гаспадара, – пацвердзіў Зазыба.

– Гаспадара зараз няма, – сказаў чалавек з барадой, – так што… А вы хто?

– Ну, Іванаўзнаёмы…

– Давядзецца вам пачакаць яго.

Спакойны тон і добразычлівая памяркоўнасць супакоілі Зазыбу. І Дзяніс Яўменавіч тут жа падумаў – значыць, гэта не гаспадар ляжыць пад плашч-палаткай, раз адсутнічае недзе, бо навошта тады было гаварыць, што давядзецца яго пачакаць. Чалавек з барадой тым часам сказаў:

– Вы б зайшлі ў хату.

Пасля гэтага і той зварухнуўся, што выйшаў на ганак першы, але грубага тону да Зазыбы не змяніў:

– Давай, праходзь! А то хто ведае – для гаспадара ты, можа, і праўда друг-таварыш, а для нас…

Цяпер Зазыба ўжо мог пэўна здагадацца, што размаўлялі з ім партызаны, якія займалі Іванаву хату; на калёсах, няйначай, таксама ляжаў забіты партызан; але боязь памыліцца, натрапіць на каго-небудзь іншага, непажаданага, напрыклад, на тых жа паліцаяў, якія ў вёсках не заўсёды мелі форму, а то і проста на бандытаў што часам выдавалі сябе калі за партызан, калі за паліцаяў, стрымлівала яго прызнацца, з чым прыехаў сюды, у Панькоўскую Буду. Тым больш няварта было спяшацца з гэтым цяпер, калі недзе павінен быў хутка вярнуцца дамоў Іван Партноў. Таму моцна не задумваючыся, хто перад ім – партызаны ці паліцаі, Дзяніс Яўменавіч нагнуў галаву наперад, каб не грукнуцца лобам аб верхні вушак, асцярожна пераступіў парог і ў прыцемку намацаў клямку на дзвярах у хату. Насуперак таму, чаго найперш можна было чакаць, ніхто з ганка не кранўўся следам за ім, не стаў суправаджаць, але ў хаце за сталом сядзеў трэці чалавек; гэты таксама меў зброю пры сабе, і таксама вінтоўку, якая прыторкнута была праваруч да сцяны, ужо амаль на куце; сашчэпленыя рукі яго нерухома ляжалі на зялёнай цыраце, якой быў засланы стол, і ён, бадай, невідушча, але зацята талопіў вочы на іх, нават не падняў галавы, каб паглядзець, хто зайшоў у хату. Тады Зазыба крактануў, выдаючы сваю прысутнасць, аднак і пасля гэтага той не зварухнуўся, а калі нарэшце праз якую хвіліну адарваў позірк ды глянуў на ўвайшоўшага, Дзянісу Яўменавічу стала зразумела, што чалавек п’яны. Сцяміўшы гэта па мутных вачах, Зазыба падумаў, што і той чалавек, які калупаў на ганку пальцам у вусе, няйначай, таксама п’яны, дарма што здагадацца пра гэта было цяжка, проста стаялі яны адзін перад адным тады не ўпоравень, Дзяніс Яўменавіч ніжэй, а той вышэй, ды і ў голаў Зазыбу чамусьці не прыйшло такое. Цяпер жа гэта было больш чым відавочна. Зазыбу ад такога зразумення адразу зрабілася непрыемна. «Набярэшся цяпер з п’янымі клопату», – акурат жахнуўся ён у скрусе, але пакуль чалавек маўчаў, было часу падумаць таксама: здаецца ж, трэці сярод іх, з барадой, усё-ткі цвярозы!.. Пастаяўшы ў няверлівасці колькі часу пад цяжкім позіркам у парозе і не дачакаўшыся размовы, Зазыба рашыў знайсці сабе ў хаце іншае месца – ступіў колькі крокаў да ўслона, што стаяў паўз вокны на двор, сеў там, паклаўшы пад руку сабе зняты толькі цяпер з галавы картуз. Было такое ўражанне, што чалавек за сталом сядзеў, страціўшы мову, бо Дзяніс Яўменавіч і цяпер, бадай, мала спадзяваўся, што той працярэбіцца думкай праз п’яны тлум. Але ж сказана было ісці ў хату, каб чакаць тут гаспадара. Так што – не свая воля. Зрэшты, досыць ужо нават таго, што незнаёмыя людзі болыц не чэпяцца. Гэта Зазыбу здавальняла пакуль. Адно было нязручна – чалавек усё яшчэ не зводзіў з яго свайго цяжкага пагляду, можа, не зусім выразна бачыў, хто зайшоў у хату, а затым самачынна прымасціўся на ўслоне. Але дарэмна Зазыба ўсё роўна як суцяшаў сябе. Чалавек за сталом нарэшце таксама пачаў з таго самага, што і яго хаўруснікі.

– Хто такі і чаго трэба?

– Мне сказалі, што магу пачакаць гаспадара.

– Хто гэта сказаў?

– Ну, вашы…

– А хто?

Першыя словы, якія былі вымаўлены, варочаліся ў ягоным роце з цяжкасцю, замаруджана, акурат знарок ён іх расцягваў ддя большай важкасці альбо нават пастраху, але затым гаворка пачала набываць звычайную роўнасць, ужо на апошнім запытанні мала адчувалася, што чалавек п’яны.

– Я прыехаў, – сказаў дзеля парадку, але быццам з неахвотай Зазыба.

– Адкуль? – не пераставаў пытацца п’яны, якому, няйначай, ажно радасна было, што мог у такім стане весці, можна сказаць, допыт.

– З суседняй вёскі, – адказаў Зазыба.

Гаворка была такая, нібыта абодва яны ішлі пры гэтым па клявай кладцы над рэчкай і вельмі баяліся зваліцца ў ваду.

– З якой?

Зазыбу нарэшце абрыдла гэтая гулянка ў пытанні-адказы, і ён сказаў:

– З Гумніцкай.

– А-а-а, – сказаў чалавек і ўсё роўна як здаволены схіліў над сталом галаву: здавалася, што цікавасць да размовы нарэшце прапала ў яго ўжо зусім, аднак не. – А мы вось тут, бачыш, – пачаў ён акурат скардзіцца, – на засаду напароліся. Пецьку паліцаі ў Барэйках забілі. Каля першых двароў. Ведаеш, дзе Барэйкі?

– Чамужне?

– Дык вось забілі Пецьку. Каля першых двароў. З засады. Толькі мы ўехалі на конях у вёску, а яны… Словам, забілі Пецьку. Але мы іх пераловім. І яйцы паадразаем. Кажуць, адзін з тых паліцаяў, што страляў першы, сёння вяселле гуляе, дык нашы пайшлі туды. Зловяць і жанілку адрэжуць, выхаласцяць, няхай тады пахваліцца. Я так і сказаў хлопцам: не забівайце яго, проста, хрэн на самым вяселлі адрэжце і нявесце ў насоўцы падарыце.

Як кажуць, адным часам і грэх і смех, а тут яшчэ і жах, але Дзяніс Яўменавіч ніяк не азваўся, сядзеў унураны, маўчаў. Тады і партызан (цяпер ужо гэта пэўна было, што партызан) страціў цікавасць гаварыць.

Нарэшце пачуліся новыя галасы на двары. Зазыба глянуў збоку праз акно, убачыў Партнова. Той ставіў рыдлёўку да плота і з кімсьці размаўляў, але таго, другога, з акна не было відаць. Затое па голасе можна было пазнаць, што зна- ходзіўся чалавек недзе за коўратамі, там, дзе стаяў нявыпражаны з аглобляў Зазыбаў конь. «Людзі вакол чужыя, – праскочыла ў галаве думка, – хоць бы часам не паквапіліся». Але падумалася пра гэта без трывогі, бо са з’яўленнем гаспадара, бадай, ужо можна было адчуць сябе іначай, чым з незнаёмымі людзьмі, ва ўсякім разе, не вельмі турбавацца хоць пра таго ж каня. Прынамсі, так хацелася верыць. Ну а што дзядзькі п’яныя, дык таксама… Таварыш на возе ляжыць забіты.

Зазыба ўжо адарваўся ад услона, каб выйсці ў двор, але ўбачыў, што Партноў сам чыкільдыкаў да ганка. Зазыбу ён пазнаў адразу, яшчэ з сенцаў, калі толькі расчыніў у хату дзверы.

– От каго ўжо не чакаў! – усклікнуў ён, становячыся здаровай нагой на парог. – Дак ета твой конь за дваром стаіць? Здароў, здароў Яўменавіч!

Яны ўзяліся, пацiснулі адзін аднаму рукі. Гаспадар яшчэ з няўтойнай радасцю сказаў:

– Дак пагаворым… А я от…

Скончыць яму перашкодзіў п’яны партызан, які адкінуўся спіной да сцяны, спытаў:

– Магілу выкапалі?

– Дак… справа няхітрая, – ад нечага смыкнуў шчакой Партноў. – Можна запрагаць ды везці нябожчыка.

– Не твая справа. Начальства ведае, што і калі рабіць. Скора прыедзе.

– Але неяк не па-чалавечы, – ці то запярэчыў, ці то проста сказаў Партноў – Труны не зрабілі.

– Дзе тых трунаў цяпер на ўсіх набрацца.

– Дак ці ж ета цяжка?

– Ну, цяжка не цяжка!.. Салдат жа. Вунь у плашч-палатку загорнем, і ўсё. Хіба першы раз?

Партноў пацiснуў плячамі. Зноў смыкнуў той жа шчакой.

– Як знаеце. – І растлумачыў Зазыбу: – Я ета магілу для забітага памагаў капаць. Але што ў цябе?

– Словам перакінуцца прыехаў.

Зазыбаў адказ, відаць, насцярожыў чымсьці партызана, бо той зноўускінуўся, паказваючы на Дзяніса Яўменавіча.

– Дарэчы, а хто гэта? Адкуль ён?

– Чалавек. Свой.

– Што значыць свой?

– Ну, можа, паважней нават, чым ты.

– Але нешта ён дужа патаемны, гэты твой госць.

– У кожнага свая справа.

– Цяпер няма сваіх спраў – ужо зусім як цвярозы незалюбіў партызан, – кожная свая справа ды каго-небудзь другога датычыць.

Аднак гаспадар не настроены быў слухаць чужыя павучанні, сказаў Зазыбу:

– Хадзем-тка мы, Дзяніс Яўменавіч, каня твайго ў лепшае месца паставім, а то й папасвіць можам. Ай не маеш часу?

– Нават не ведаю, як сказаць.

– Ну дак хадзем.

Іванава незалежнасць, якая адчувалася і ў паводзінах, і ў гаворцы, тым не менш неяк насцярожвала Зазыбу, за кожнае слова чамусьці даводзілася непакоіцца. У сенцах, калі яны выйшлі з хаты, якраз пра гэта і сказаў ён. Але Іван адно махнуў рукой:

– Ат, кожнае гаўно не ўлашчыш.

На двары зноў нікога не было.

Іван адчыніў на задворак коўраткі, прапусціў наперад Зазыбу:

– Дык што ў цябе, Дзяніс?

– Партызаны патрэбны.

– Дак от жа яны.

– Ну, мне…

– Цвярозы хто?

– Во-во!

– У вёсцы цяпер толькі етыя трое, што ў мяне. А так… усе, здаецца, у лесе. Кажуць, нядрэнны хлопец быў, а от жа… Кажуць, паліцай арцюхоўскі застрэліў з-за плота. Дак мае от і заліваюць з учарашняга гора. Балазе, самагонку недзе знайшлі. Як прывезлі небараку сюды, так і пачалі пытацца на вёсцы – у каго самагон?

– А я ўжо думаў што крута мне давядзецца з п’янымі. Чакаў цябе, чакаў, але добра, што хутка справіўся.

– Дак… Не адзін. Дак навошта табе партызаны?

– Па-першае, адкуль яны з’явіліся ў вас?

– Як я зразумеў, дак, здаецца, з-за фронту. Але дзе ён цяпера, той фронт? Вунь лістоўку вецер аднекуль прынёс з вашага боку, дак немцы ачухаліся пасля зімы, зноў наступаюць. Няйначай, усё-ткі хочуць Маскву ўзяць, злашча, што з другога боку, аднекуль з поўдня. Мае таксама сянні пра ета разважалі. Аказваецца, страшная сіла, етыя немцы.

– Але ты дакладна ведаеш, што твае партызаны з-за лініі фронту?

– Ну, гавораць жа самі.

– А хто ў іх камандзір?

– Нейкі капітан. З энкэвэдэ. Ці то Кажамякін, ці то Шамякін. Дак етыя табе патрэбны?

– Мне хоць якія, але гэтыя, бадай. Так, відаць, гэтыя.

– Дак пабачыш сянні на могілках. Я пакажу табе камандзіра. У хворме ходзіць. Ета я ім параіў забітага пахаваць на нашых могілках. А то не хацелі, маўляў трэба ў патаемным месцы, а то выкапаюць паліцаі ці немцы ды паздзекуюцца з цела. Але ўсё-ткі са мной пагадзіўся. У сухой зямлі ляжаць – не ў балоце.

У Зазыбы бракавала часу – як таго вымагалі абставіны. Нарчук прасіў хутчэй вярнуцца ў атрад. Тым часам пахаванне тут магло адбыцца не раней, як па абедзе. Ва ўсякім разе, як помніў Дзяніс Яўменавіч, у вёсцы мала калі хавалі нябожчыкаў у першай палове дня. Вядома, партызанам неабавязкова захоўваць сялянскія традыцыі, але мала чым верагодна: вёска заўсёды накладае свой адбітак – ці то звычаем, ці то яшчэ чым.

Зазыба сказаў:

– Але ж у мяне часу мала. Ты не ведаеш, дзе штаб у іх?

– Не, – крутануў галавой Партноў. – А табе і праўда карціць як хутчэй?

– Ведаеш, па той бок Бесядзі аб’явіўся карны атрад. Ці не будуць немцы перапраўляцца сюды, на наш бок.

– А-а, ета і праўда дзела. – Іван задумаўся. – А можа, етым сказаць, дарма што выпіўшыя?

– Які з іх толк?

Але Партноў крутануўся на здаровай назе, заспяшаўся ў хату. Следам за ім адтуль выйшаў партызан:

– Дзе твае немцы?

– Яны як мае, так і твае, – незалюбіў Зазыба.

– Гэта мы яшчэ пабачым! – груба сказаў партызан. – Дык дзе яны?

– Там, – няпэўна махнуў рукой Зазыба, каб адчапіўся.

– У страха вочы вялікія, вось што я табе скажу.

– Можа, і праўда вялікія. Але мне трэба да вашага камандзіра.

– Вось прыедзе на Пецькава пахаванне, ну і пабачыш, калі трэба.

Тады ўмяшаўся ў гаворку Партноў:

– Ты, Паўтаракін, дарэмна ета. Зазыба не стане хлусідь ды паніку падымаць.

– А ну вас, – махнуў рукой партызан, – як знаеце, так і рабіце. Мне пахаваннем трэба займацца. Такі загад. Чалавек жа недарэмна забіты. – Павярнуўся на ганку і зноў падаўся ў хату.

Партноў пачухаў патыліцу:

– Тут ёсць сярод іх талковы. З барадой. Не бачыў?

– Бачыў.

– Можа, таго знайсці? Ды ён і не дужа п’яны. Але ладна, Дзяніс, вышэй пупа не падскочыш і далей свайго ценю не пабяжыш. Мне хтосьці казаў што сын твой нарэшце вярнуўся дамоў?

– Ага, вярнуўся. Жыве цяпер з намі.

– А як ета тваю жонку завуць?

– Марфай.

– От бачыш, стаў забываць. А мая сянні пайшла ў Каменку. Ты ж ведаеш Каменку? Дак пайшла. Вярнуўся там адзін чалавек з палону. Кажа, па хваробе адпусцілі. Дак захацела спытаць у яго пра брата свайго, Ігната. Разам па мабілізацыі пайшлі. Дак, кажаш, жыць можна і пры новай уладзе?

Зазыба, канечне, гэтага не гаварыў, але не стаў папраўляць даўняга прыяцеля, толькі ўсміхнуўся ды сказаў шматзначна:

– Цяпер жа яно часам і не надта зразумела, у каго яна і якая.

Іван Партноў з яго слоў ажно зарагатаў:

– Ета праўда: як партызаны ў вёсцы, то, здаецца, іхняя, старая, а потым паліцаі з немцамі пануюць. Праўда, немцы дак і не дужа часта бываюць тут, дарма што бальшак з Бялынкавіч на Баронькі не дужа далёкі, затое паліцаі… Етыя, бывае, не вылязаюць з нашай Буды. То на нашым пасёлку ў каго-небудзь самагонку глушаць, то на тым. Кучароў з Дзяржынння частуе, дак… Але неяк хутка ён пярэваратнем зрабіўся. Яшчэ ўчора ў партыі быў, а сянні ў паліцаях, немцам служыць. Вось і ўчора мне цераз аднаго тут перадаваў, каб не дужа з партызанамі етымі валэндаўся. А я што – прывезлі на двор забітага, от і клопат. Дак, кажаш, сын вярнуўся ўсё-ткі. Як жа ён там?

– Жыве, па гаспадарцы памагае. Цяпер сена косім.

– Я не пра ета. Ну, як там, у турме?

– Турма – не бацькаў дом.

– Але ж во неяк выбавіўся? Пашанцавала ці тэрмін выйшаў?

– Здаецца, і тое, і гэта, – не стаў прызнавацца Зазыба. – Галоўнае, жыве цяпер з намі.

– У Гаўрылінцы ж таксама летась адзін уцёк з савецкай турмы. Дак той расказвае – ой-яй-ёй! Такі жах, што ажно не верыцца. Мы сабс тут жывём і не знаем, што Берыя са Сталіным ледва не ўсю краіну ў Сібір ды на Поўнач перасяліў. Значыць, твой не расказвае?

– Ну так… гаварыў… але… дзе тая праўда? Людзей многа – адзін тое бачыў, другі гэта, так што…

– Значыць, твой не расказвае?

– А я не дужа й пытаюся. Цяпер і без гэтага жахаў хапае.

– І то праўда. Дак, кажаш, немцы па той бок Бесядзі. Не крутагорскія?

– Здаецца, не, карнікі. Я іх бачыў, калі перапраўляліся ўчора каля Кубракоўкі.

– А што ты маеш да етых партызан?

– Не я, а нашы партызаны. Нарчук з Чарнагузавым.

– Ты ім памагаеш?

– Дак…

– А-а-а… – з разуменнем паківаў галавой Іван.

З таго боку двара, ужо недзе насупраць Іванавай хаты, пачуліся галасы. Хтосьці моцна смяяўся ў натоўпе, а то ўсё гаварылі ўзбуджана, перабіваючы адзін аднаго. Нарэшце адчынілася фортка паміж варотамі і сцяной хаты, двор пачаў напаўняцца партызанамі.

Сярод іх Зазыба ўбачыў і тых двух, што аціраліся тут раней – барадатага і таго, што першы размаўляў з ім на ганку, калупаючы пальцам у вусе. Смешна, але ён і цяпер рабіў тое самае, усё роўна як яму свярбела ці было поўна серы, якую цяжка даставаць.

Барадаты падышоўда коўратак, заякімі стаялі Зазыба з Іванам Партновым, кіўнуў Івану:

– Загадана – запрагаць!

– Запрагаць, дак запрагаць, – чамусьці падміргнуў Партноў Дзянісу Яўменавічу.

Партызаны тым часам не пераставалі гаманіць і на двары, але ўжо ніхто не смяяўся, відаць, стрымлівала блізкасць забітага. Зазыбу добра было чуваць, пра што ішла размова, дарма што паасобку, як кажуць, у кожнай кампаніі свая. Тым не менш Дзяніс Яўменавіч здолеў улавіць галоўнае. За выключэннем, можа, гэтых двух, што заставаліся ў вёсцы, усе астатнія сапраўды хадзілі ці то ў Арцюхі, ці то ў Кісялі, ці то ў Манастырок лавіць таго паліцая, што застрэліў з-за плота ў Барэйках ляжаўшага цяпер на калёсах пад плашч-палаткай партызана. П’яны Паўтаракін – Зазыба запомніў, як называў яго ў хаце Іван Партноў, – аказваецца, не так сабе пагражаў: учарашняга забойцу партызаны і праўда «накрылі» на вяселлі і не толькі зрабілі на вачах у нявесты кастрацыю, а і больш таго… І вось цяпер яны ўспаміналі пра гэта, як пра звычайную забаву… Не тое каб шкадуючы паліцэйскага, але Зазыба ажно жахнуўся, чуючы

партызанскую пахвальбу, дарма што на грамадзянскай вайне таксама нагледзеўся рознага паскудства… У недавярстве тады амаль аднолькава спаборнічалі як белыя, так і чырвоныя… Але тое, што пачуў ён цяпер, здаецца, пераўзыходзіла сваім цынізмам усё іншае…

Іван Партноў тым часам вывеў з хлява мышастага каня, стаў запрагаць, разганяючы па баках партызан, якія тоўпіліся пасярод двара. Хтосьці падышоў да калёс, нацягнуў на ногі забітаму плашч-палатку, адкрыўшы галаву. Зазыба глянуў туды, акурат жадаючы схапіць зрокам абрысы твару, але ўбачыў толькі распухлыя шчокі, ацеслы нос, дакладней, твар у чалавека ўжо быў знявечаны смерцю, адны валасы на галаве засталіся, як і раней, чорнымі, іх зусім не зачапіў тлен, нездарма кажуць, што валасы ў мёртвага чалавека ніколі не мяняюцца колерам і нават у магіле нейкі час працягваюць расці.

Многа на сваім жыцці бачыў Зазыба чалавечых смерцяў, – і на вайне, і так, жывучы ў вёсцы. Прызнацца, ён і не баяўся нябожчыкаў, мог без страху ў душы глядзець на іх; але ўсё-ткі найбольш уразіла яго адна смерць, смерць ягонай маці: раней ён і ўявіць не мог сабе, што памёршы чалавек можа ляжаць у труне, быццам у сне – нават з усмешкай і ўсё роўна як са здаровым колерам твару. А маці так і ляжала, нібы жывая, ажно боязна было апускаць яе ў магілу, засыпаць зямлёй.

Іледзячы цяпер на забітага партызана, Дзянісу Яўменавічу чамусьці якраз гэта і прыйшло на памяць, няйначай, падзейнічаў на яго выгляд нябожчыка. Да таго ж параўнанні, таксама як і ўспаміны, рэдка калі залежаць ад чалавека, вярней, не заўсёды ва ўладзе яго.

Нарэшце конь быў запрэжаны, але Іван Партноў не адразу стаў выязджаць на вуліцу: расчыніўшы на дзве палавіны вароты, ён тут жа вярнуўся да Зазыбы.

– Дак… ты ж таксама, Яўменавіч, на могілкі разам ідзі, раз трэба. Можаш і на кані. А можаш і тут пакінуць яго. Я от зараз вызвалю двор, а ты ўедзеш. Словам, глядзі сам.

Зазыба паслухаўся Івана, і калі той вывез забітага на вуліцу, заняў сваёй фурманкай вызваленае месца на двары.

На могілкі народу сышлося шмат – і партызанаў, і вясковых. Бабы стаялі пад бярозамі, плакалі па хлопцу, быццам па сваім. Партноў паказаў Дзянісу Яўменавічу камандзіра атрада, які прыскакаў на чале кавалькады на танканогім, быццам вытачаным, высокім кані пад жоўтым рыпучым сядлом. Надзеты ён быў у вайсковае – у дыяганалевае сіняе галіфэ і ў такую ж дыяганалевую, але цёмна-зялёную гімнасцёрку, падпяразаную тоўстым рэменем са спражкай, пасярод якой блішчэла начышчаная меддзю пяцікутная зорка; на пятліцах гімнасцёркі знакі адрознення былі агульнавайсковыя – на кожнай па адной цёмна-вішнёвай шпале. Сам ён быў невысокага росту; вялікі палец правай рукі трымаў трохі воддаль ад спражкі пад рамянём; рухаўся імкліва, але неяк бокам, усё роўна як увесь час адчуваў на сваім шляху нябачную перашкоду, якую патрэбна было пераадольваць; на твары яго, бадай, зусім простым, які ў натоўпе не заўсёды можна адразу адрозніць альбо надоўга запомніць, здавалася, не было ніякага пачуцця, быццам камандзір сапраўды

знаходзіўся не на пахаванні свайго партызана, а так – збочыў з дарогі выпадкова на могілкі, каб даведацца, дзеля чаго тут сабраўся народ. І над магілай гаварыў не ён. Развітальнае слова сказаў другі чалавек; гаварыў ён нядоўга, але не прамінуў паведаміць мясцовым жыхарам, што ўжо забойца панёс пакаранне, дадаўшы, што прыйдзе той час, калі і іншыя здраднікі і іх гаспадары знойдуць сабе няслаўны канец на савецкай зямлі. Словам, усё было зроблена і сказана, як на вайне. Але Зазыбу, таксама як і Івану Партнову, не спадабалася, што чалавека клалі ў зямлю без труны. Нават камякі зямлі, якія мякка і амаль нягучна шлёпаліся, падаючы ў яму на плашч-палатку, здаецца, не выклікалі жалобнага пачуцця, якое ўзнікае тады, калі трапляюць на драўлянае вечка труны. Нарэшце, калі, збіваючы лістоту на бярозах, прагучэлі апошнія стрэлы з вінтовак, а вясковыя кабеты зноў заплакалі галасамі, тады Зазыба стаў прабірацца між людзей да камандзіра. Той хацеў накіраваць яго да кагосьці іншага, няйначай, таксама з камандзірскім званнем, але Зазыба крутануў галавой і амаль сілаю прымусіў выслухаць сябе.

– А чаму ваш камандзір не прыехаў? Дарэчы, як яго прозвішча?

– Нарчук.

– Сапраўднае?

– Так. У нас іначай нельга, бо мы ўсе тут адзін аднаго ведаем, таму няма ніякай патрэбы гуляць у мянушкі.

– Не мянушкі, а клічкі, – паправіў капітан. – Дык чаму сам ён не прыехаў?

– Ну, трэба ж за немцамі сачыць. Распараджэнні аддаць. План прыдумаць, як не пусціць карны атрад на гэты бок Бесядзі.

– Ён у вас, як відаць, стратэг. Але мы на маршы. Мы – спецатрад і рухаемся ў Чачэрскія лясы. А тут проста затрымаліся на дзень-два пасля вялікага пераходу. Так што, немцы вашы нам не страшны. Мы сёння тут, а заўтра адзін чорт будзе ведаць, дзе…

– Нашы прасілі, каб вы прыехалі, а то…

Аднак камандзір спецатрада, здаецца, ужо зразумеў, што адчапіцца ад Зазыбы проста так не ўдасца, таму перапыніў:

– Нікуды я не паеду. Ды і чаму я павінен верыць, што гэта не правакацыя? Можа, у лавушку хочаце заманіць! Словам, калі вашым таварышам патрэбны мы, то няхай сюды прыязджаюць. Тут і абгаворым.

Зазыба ў разгубленасці пераступіў з нагі на нагу, хацеў зноў пачаць пераконваць камандзіра спецатрада, цяжка перажываючы, што той не паддаваўся на ўгаворы, але дарэмна; сказаўшы апошнія словы, капітан крута павярнуўся і, ледва не подбегам, рушыў да свайго каня, якога трымаў на краі могілак партызан, – чамусьці ў чорнай кубанцы, дарма што было самае лета і ўжо стаяла на дварэ паўдзённая спёка. Бачачы Зазыбаву няўдачу, нават разгубленасць, да яго падышоў Іван Партноў:

– Ну як, Яўменавіч?

– Аніяк, – ужо не хаваючы злосці, адказаў Зазыба. – Ці то мяне за дурня прымае, ці то сам…

– Ціхаты, – азірнуўся Іван Партноў, баючыся, што пачуюць другія партызаны, якія яшчэ тоўпіліся каля магілы.

Зазыба пасля гэтага і сам нібыта насцярожыўся, глянуў туды.

– Але мне хутчэй трэба ехаць, – сказаў ён змрочна, кратаючы пальцам кончык свайго носа.

– Дамоў? – спытаў Партноў.

– Так.

Іван забраў сваю рыдлёўку, што стаяла, уторкнутая ў дзірван каля магілы, і яны падаліся к дарозе, што вяла ў вёску. Партноў бачыў, што Зазыба сапраўды збянтэжаны, таму не чапляўся з размовай, і яны ў добрай хадзе вельмі хутка апынуліся каля Іванавага двара.

– Можа, паабедаем, га? – спытаў Іван, але Зазыба адмоўна крутануў галавой, не стаў заходзіць у хату; тады гаспадар хуценька вынес яму акраец хлеба, ухапіў на гародзе агуркоў, а ў дадатак яшчэ і жменю салодкага гароху. – Ты ж глядзі, асцярожна, Дзяніс, – ужо ледва не наўздагон крыкнуў Партноў, а потым доўга стаяў каля коўратак, шкадуючы, што стары таварыш паехаў усё роўна як у крыўдзе, ва ўсякім разе, нездаволены і раззлаваны сустрэчай з камандзірам спецатрада.

Дзяніс Яўменавіч таксама праклінаў сваю сённяшнюю паездку ў Панькоўскую Буду; атрымалася яна дарэмнай, больш таго, расчаравала, можа, у самым галоўным: у спадзяванні на паразуменне людзей ва ўмовах варожай акупацыі, а найперш уразіла амбітнасць, калі гаварыць нават самай далікатнай мовай, тых, каго засылалі сюды з-за лініі фронту па розных вайсковых і невайсковых ведамствах. Відаць, у сувязі з гэтым прыйшла на памяць і мінулагодняя крывавая трагедыя ў Машавой...

XVII

Дзіўна, але допыт на гэтым спыніўся. Камандзір карнага атрада раптам страціў да Чубара ўсякі інтарэс, быццам сапраўды забыў пра свае пагрозы, аддаўшыся цалкам размове з мясцовым немцам у цывільным. Нават камендант Гуфельд усё роўна як застаўся пры гэтым убаку. Маёр і ягоны субяседнік часам перапынялі гаворку гучным смехам, які пераходзіў у рогат. А Чубар усё стаяў па гэты бок гіерагародкі з вытачанымі балясінамі, што падзяляла валасную кантору на дзве часткі – адну для наведвальнікаў, другую для бургамістра з пісарам, – і патрохі супакойваўся, акурат нанава рабіўся да ўсяго абыякавым. Дарэчы, гэтак жа выглядала памяшканне і тады, калі размяшчаўся ў ім сельскі Савет.

Праўда, быў тут і яшчэ адзін пакой, але знаходзіўся ён заўсёды на становішчы, можна сказаць, святая святых, дзе стаяў сейф, а побач стол, за які дапускаліся толькі даверaныя асобы, каб выпіпь бутэльку ці папляткарыць пра местачковыя справы. Немцы ў той пакой у прысутнасці Чубара не заходзілі – і допыт вялі, і размаўлялі паміж сабой увесь час тут, за перагародкай, няйначай, што не баяліся ўжо, шго злоўлены партызан зразумее іх; загое бургамістр Брындзікаў адчуваў сябе акурат не ў сваёй талерцы: то выбягаў наогул па нейкай патрэбе з валасной канторы, то хутка вяргаўся, заскокваў заклапочана ў задні пакой, але і там доўга не затрымліваўся; Чубару не хацелася глядзець на бургамістра, бо ў такім разе ў Радзівонавых вачах былы старшыня местачковай спажывецкай кааперацыі мог бы шмат убачыць пра сябе.

Тым часам варта падкрэсліць, што Брындзікаў таксама нядужа таропіўся на старога знаёмца – зразумела, да сяброўскіх адносін у іх ніколі нс даходзіла, але пры сустрэчах не цураліся адзін аднаго, здаецца, раз ці, можа, нават два здаралася ім выпіваць на раённай маёўцы ў Кручкоўскім гаі. Што значыць жыццё з яго зменлівасцю і парадоксамі – паклікаць бы тады цыганку ды раскінуць карты на тым жа святочным абрусе на зялёнай траве паміж соснаў ды спытаць, што каму выпадзе ўжо ў недалёкай будучыні?!

Назіраючы бургамістраву мітусню, вярней, больш адчуваючы яе, чым назіраючы, Чубар раптам пачуццёва зразумеў, што ўсярэдзіне ў яго пачынае ўзнікаць штосьці падобнае на злараднасць, менавіта, на злараднасць, а не на зайздрасць, дарма што пагроза чакала якраз ягонае жыццё, а не гэтага Брындзікава. Прынамсі, цяпер, бо Чубар быў перакананы, што здрадніцтва не толькі асуджалася ў рэшце рэшт, аднак і каралася. Рана ці позна, а ўсяму бывае прысуд – маральны, крымінальны, палітычны… Праўда, не кожнага дасягае караючая рука. У жыцці здараецца, што звычайны нягоднік пры спрыяльных умовах можа не толькі захаваць сябе ў грамадстве, якому нанёс маральныя ці матэрыяльныя страты і якое яго шукае, але нават вылезці наверх таго ж грамадства… Няпоўныя дваццаць гадоў, што прамінулі пасля грамадзянскай вайны, шмат што ў гэтым сэнсе паказалі.

Уласна кажучы, у нейкай ступені грамадзянская вайна працягвалася і цяпер, пераходзячы ў гэту. Канечне, сяму-таму з цяперашніх здраднікаў таксама ўдасца схавацца ад пакарання пасля гэтай вайны, зямля вялікая, ёсць куды падацца і з

нячыстым сумленнем, і з крывавымі рукамі, толькі што з таго, – калі не сама пагроза, то прывід яе будзе такога чалавека заўсёды суправаджаць.

Але самае дрэннае ва ўсім гэтым будзе заключацца ў тым, што страх і нянавісць так альбо іначай пяройдуць да дзяцей, потым да ўнукаў, якія таксама стануць насіць іх патаемна ў душы… Адно няўцям заставалася цяпер Чубару – чаму немцы пасадзілі ўначы да яго ў царкоўнае скляпенне нейкага віжака? Бо апазнаць яго мог зусім проста гэты ж Брындзікаў?

Нарэшце немцы пагаварылі, маёр ад задавальнення ажно паляпаў цывільнага па плячы, тады звярнуў увагу на арыштаванага, дакладней, захопленага ў палон са зброяй у руках.

– Мы тут, пан партызан, надумалі адзін ваяж ажыццявіць, – сказаў ён з усмешкай. – Паляціш з намі. Ацяпер – вэк. – Апошняе датычыла найбольш вартавога, што стаяў увесь час за спіной Чубара. Вартавы паклаў на плячо Чубару руку, вывеў у двор валаснога праўлення, дзе па правы бок пад павеццю стаяла двухколка без каня. Чубар сеў туды пасля таго, як вартавы паказаў пад павець пальцам. Паколькі немцы не спяшаліся квітацца з ім, Чубар па гэтым ужо мог меркаваць, што цягнуць нездарма, няйначай, збіраюцца ўцягнуць яго ў нейкую авантуру. Ну а калі і не ў авантуру, то выкарыстаць з выгадай для сябе.

Валасны двор не меў вакол сябе высокай шчыльнай агароджы, акрамя гэтай павеці, з левага боку стаяў звычайны паркан з жэрдак, пакладзеных паміж калкоў на бярозавую гужбу, і Чубару з-пад павеці былі відаць сялянскія гароды паўз рэчку, што цякла праз мястэчка аднекуль з-за Равенска, і далей – Цыкуны, змешаны лес, дзе ў мінулую восень да самага снегу хаваліся крутагорскія партызаны. Чубар прыйшоў у атрад пазней, ужо ў Шурышча, пасля таго як мядзведзеўцы ўначы выбілі з Хоцімска нямецка-паліцэйскі гарнізон і нейкі час трымалі пад сваёй уладай раённы цэнтр. Цяпер Чубару ў ягоным становішчы па часе было пашкадаваць, што не пайшоў тады разам з мядзведзеўцамі за лінію фронту. Але свой палон ён успрымаў, як звычайную выпадковасць. Відаць, так наканавана было і ў жыцці, і тым не менш Чубар не з’яўляўся фаталістам, хоць непазбежнасць не адмаўляў. Усё-ткі гэтым светам, бадай, хтосьці кіруе. Падумаўшы так, ён чамусьці горка ўсміхнуўся, дарма што не здолеў бы растлумачыць чаму – менавіта хутчэй за ўсё зноў жа праз сваё незайздроснае цяперашняе становішча.

Прыстаўлены да яго немец нічым не чапаў яго, стаяў сабе крокі за тры ад двухколкі, у якой сядзеў партызан, і думаў нейкую сваю нямецкую думу. Уцячы адсюль Чубару нельга было – вартавы ўзброены вінтоўкай, да таго ж, няйначай, трымае сябе ўнутрана напагатове. Вядома, калі б не гэта вінтоўка, якую ён паклаў руляй на сагнутую ў локці левую руку, можна было б падужацца, балазе, немец трапіўся, варта сказаць, нягеглы ў параўнанні з Чубарам, які цягнуў на двух такіх. Задумлівая сцішанасць вартавога па ўсёй верагоднасці была, бадай, сапраўды знешняй, паспрабуй толькі падазрона зварухнуцца, як тут жа наскочыш на плоскі штых, які немец паспее павярнуць да цябе.

Праз нейкі момант Чубар нават перастаў думаць пра ўцёкі, справа гэта пэўна не мела б поспеху, тым больш што напароцца на штых ніколі не позна. Да таго ж іншы раз чалавек хоць і несвядома, аднак усё-ткі знарок марудзіць з небяспечнымі ўчынкамі, акурат і на самай справе спадзяецца альбо адтэрмінаваць нешта жахлівае, альбо пусціць справу на волю лёсу, маўляў, няхай будзе, як выйдзе. Дзіўна, але і свая сцішанасць на ранішнім сонечным угрэве нечакана прывяла яго арганізм у дрымотны стан, злашча што зноў раптам адгукнуўся ў патыліцы, а затым і ва ўсёй галаве начны боль, яму і ўдзень моцна балела знявечанае вінтовачным прыкладам месца, аднак уначы, бадай, найбольш, асабліва калі даводзілася варушыцца; між тым па дарозе сюды з царкоўнага скляпення той боль чамусьці заціх, акурат у чаканні новага (а Чубар не сумняваўся, што сёння будзе новы допыт, пры якім наўрад ці абыдзецца без катавання); там, у канторы, калі адбываўся допыт, які, праўда, хутчэй нагадваў своеасаблівы флірт, чым сапраўдны допыт, болю таксама не адчувалася; і вось цяпер ён адгукнуўся. Але думаць не замінаў дарма што і скрозь дрымоту, можа, не так думаць, як успамінаць падзеі, у якіх некалі сам прымаў удзел.

Напрыклад, спярша расплывіста, затым з большай выразнасцю, ажно пакуль не ператварыўся ў абвостраны ўспамін, у галаве з’явіўся адзін выпадак, які знешне нагадваў сённяшні, гэта значыць, амаль тое, што адбывалася цяпер з ім, Радзівонам Чубарам, пад павеццю, яшчэ ў сельсавецкай, а цяпер валасной двухколцы. З таго часу ўжо мінула з дзесятак гадоў. Так, з кароценькім хвосцікам. Але пра хвосцік гэта паміж іншым. Галоўнае, што помнілася пра той выпадак, бы сёння. Чалавек тады акурат вось гэтак сядзеў пад павеццю, але не на двухколцы, а на сялянскіх драбінах, і ён, Чубар, стаяў, як гэты немец, на варце з вінтоўкай пры назе і наганам у вялікай скураной кабуры. Было гэта ў час Бешанковіцкага паўстання.

У той год па ўсёй краіне пракаціліся антыкалгасныя бунты. Паднялiся сяляне супроць калгасаў і ў сельсаветах Бешанковіцкага раёна, перакідваючыся на тэрыторыю Лепельскага, Талачынскага… На падаўленне паўстання з Віцебска туды былі кінуты войскі, атрады ДПУ, хапала работы міліцыі… Зразумела, што, як і па ўсёй краіне, Бешанковіцкае паўстанне было задушана, пра яго мала калі ў даваенныя гады ўспаміналі, тым больш што на падобныя тэмы тады наогул не кожны адважваўся гаварыць. Але ж усё, з чым чалавек сутыкаўся ў жыцці, што рабіў ці быў сведкам, заставалася з ім назаўсёды, калі, вядома, здольна была ўтрымліваць памяць. Чубар на памяць сваю пакуль не скардзіўся.

Калектывізацыя стаяла яшчэ не толькі ў памяці, а і ўваччу. Прыняў ён удзел у ёй яшчэ ў каморніцкай школе, але падчас Бешанковіцкага паўстання вучыўся ў Віцебску, у абласной партыйна-савецкай школе. З гэтай школы на падаўленне сялянскага выступлення таксама набіралі камуністаў. Гэта проста сказаць «набіралі». У атрад залічалі толькі па рэкамендацыі партячэйкі. Такая рэкамендацыя была выдадзена і Радзівону Чубару, актыўнаму і зусім яшчэ маладому хлопцу, які з усім жарам душы гатовы быў змагацца з працiўнікамі савецкай улады. Праўда, Радзівона тады трохі

здзівіла, што гэтых «праціўнікаў» сярод бешанковіцкіх сялян апынулася ажно зашмат. Без крывавых сутычак не абышлося. Нямала было арыштавана мужыкоў, расстраляна, як кажуць, на скорую руку, а найболын вывезена ў Сібір, на Поўнач, дзе толькі ставала калючага дроту ды назіральных вышак.

Чалавека таго, пра якога цяпер прыгадаў Чубар, схапілі ў Бачэйкаве. У грамадзянскую вайну ён быў дзянікінскім афіцэрам, затым настаўнічаў, а ў часе антыкалгаснага паўстання ўваходзіў у кіруючую тройку. Як ён тлумачыў на допыце – настаўнік не можа заставацца ў баку ад народнай справы. І яго тады вось гэтак жа, як цяпер і Чубара, вывелі пасля допыту ў двор, пасадзілі на драбіны і прыставілі ўзброенага слухача партыйна-савецкай школы ў якасці вартавога, якому б не знасіць галавы, калі б адзін з кіраўнікоў паўстання раптам уцёк.

Кажуць, чаканне смерці горай за самае смерць.

Чубар помніў вочы дзянікінскага афіцэра, а пазней – настаўніка, які вучыў сялянскіх дзяцей недзе да самай грамадзянскай вайны. У іх стаяла цяжкая туга, ад якой нават ворагу рабілася не па сабе. Ну а што арыштаваны быў ворагам для Чубара, а Чубар, у сваю чаргу, такім жа ворагам для арыштаванага, і сумнявацца не даводзілася. Дык вось ад тае цяжкой чалавечай тугі ў вачах асуджанага на смерць ворага калгаснага ладу, значыць, разам і савецкай улады, у маладога Чубара як не халадзела ўсярэдзіне, дарма што класавае пачуццё было выхавана ў ім яшчэ змалку. Відаць, дзянікінскі афіцэр таксама думаў тады аб збаўленні, можа, таксама ў душы песціў надзею вырвацца з-пад варты на волю. Але ён, як і Чубар цяпер, не мог разлічваць на поспех…

Сонца тым часам паступова ўбіралася ў сталую раніцу, цені на гародах панад рэчкай увачавідкі скарачаліся, рабілася горача. Сёння зноў як і ўчора, дзень абяцаўдобрае надвор’е, якраз для сенакосу. Падумаўшы пра гэта, Чубар успомніў Зазыбу. Учора яго адарвалі ад касьбы… Ды і другіх верамейкаўцаў немцы прагналі стрэламі з луга… Але ці паспеў Зазыба трапіць учора ў атрад? Канечне, сілы ў партызан не тыя, каб мерацца з немцамі. Чубар карнікаў не лічыў, аднак іх было нямала, бадай, да дзвюх рот з артылерыяй і браневікамі. Іншая справа, што Нарчук таксама можа ўзмацніць свой атрад – найперш звязацца са скандзілаўцамі, потым пашукаць і той атрад, што з’явіўся, па словах Патолі, з-за лініі фронту. Да такога дадумацца, бадай, няцяжка было, дарма што вопыту баявых дзеянняў у партызан пакуль аніякага. Адно наскочыць уначы на малалікі паліцэйскі стан у вёсцы, зрабіць засаду на аднаго, няхай нават двух немцаў, альбо выцягнуць з-за печы якога-небудзь інтэнданта, што прыйшоў без зброі да фрау, як гэта здарылася ў Бялынкавічах. Зусім другое сутыкнуцца лоб у лоб з эсэсаўскай камандай, дарма што палову яе складалі былыя чырвонаармейцы.

Эх, стратэгія, стратэгія, ваенная навука!..

Мінулай восенню Чубар вяртаўся ў Забесяддзе арганізаваць свой партызанскі атрад. Уласна кажучы, пасля сустрэчы ў лесе непадалёку ад Шыраеўкі з групай акружэнцаў, якія выносілі з акупіраванага тылу палкавога камісара, ён і паводзіў сябе, як будучы камандзір партызанскага атрада, але пасля сустрэчы з Зазыбам у

Мамонаўцы даведаўся, што такі атрад у раёне створаны яшчэ перад адступленнем адсюль Чырвонай Арміі. Гэтая акалічнасць змусіла яго зменшыць і актыўнасць – калі сапраўды ёсць атрад пры падпольным райкоме партыі, дык лепей пачакаць, пакуль атрад нарэшце вернецца ў раён з задання, а тады ўжо дзейнічаць, зыходзячы з новых патрэб, але адмовіцца ад думкі, якая не толькі глыбока запала ў душу, а і вынашана была за час доўгага блукання да лініі фронту, пасля назад, у Забесяддзе, ужо нялёгка было; цалкам астудзіла ягоны арганізатарскі запал знаходжанне ў спецатрадзе Мядзведзева: аказалася, што карысць у барацьбе супроць акупантаў можна з поспехам прыносіць будучы радавым партызанам, уласна, так яно і сталася, бо Чубара ў атрадзе выкарыстоўвалі ў самых адказных заданнях, якія хоць і не кожны раз звязаны былі з баявой дзейнасцю, але важнасць іх не меншай была для агульнай справы. Зноў камандзірскі сверб з’явіўся ў Чубара, калі ён адстаў ад мядзведзеўцаў і прыйшоў да крутагорцаў у Шурышча. Нават не жаданне камандаваць кіравала ім тады, не; хутчэй за ўсё то было імкненне абудзіць актыўнасць сярод мясцовых партызан, якія амаль не ўсю зіму праспалі ў зямлянцы, абклаўшы данінай вакольныя вёскі.

Смешна цяпер успомніць, але Чубар тады выдаваў сябе ледзь не за прадстаўніка Цэнтра, дзеля чаго часта адлучаўся з Шурышча, прыносячы праз дзень-два дзіўныя распараджэнні. Аднак і гэта на мясцовых партызан не дзейнічала. Здаецца, з усіх перажываў за бяздзейнасць атрада толькі камісар Баранаў, які таксама, як і Чубар, настойліва патрабаваў ад Мітрафана Нарчука адчувальных акцый.

Чубару мала было бачна, што з-пад павеці праз нізкі паркан – усяго гэтыя гароды ды асмужаны ўжо, нягледзячы на раніцу, недалёкі лес. У гэтым прасцягу стаяла яшчэ нейкая пабудова, мусіць, адрына, бо абапал яе, на роўнай адлегласці, вытыркаліся капелюшамі два стажкі сена. Паўзлес ішла дарога на Папаратню, і па ёй за гэты час, як глядзеў туды Чубар, праехаў мужык верхі на кані; конь неяк ускокваў адразу на чатыры нагі, акурат намагаючыся скінуць седака. Дзіўна, але нават у такую невясёлую хвіліну, ды яшчэ ой якую невясёлую, гэта выклікала ў Радзівона ўсмешку ці, можа, нешта падобнае на яе – самому ж нявідна.

Як кажуць, свету цяпер хоць і мала было насупраць Чубара, аднак і таго хапала, каб убачыць і адчуць яго харство. У безвыходным становішчы чалавек асабліва ўспрымае яго з сумам, канечне, бездапаможнасцю і бясконцым жалем. Думаецца, і гэта вельмі няпоўны пералік вызначэнняў, пачуцці чалавечыя багацейшыя за словы. А прыгажосць, харство сапраўды не радавалі – бянтэжылі; цяпер, у становішчы асуджанага, нават працяглы час, які ў самым лепшым выпадку мог падараваць Чубару лёс, здаваўся, вярней, успрымаўся імгненнем. І гэта Чубар усведамляў даволі рэальна, з відавочнай выразнасцю. Але апошні дзень дазволіў яму далучыцца да яшчэ большага харства, яшчэ большай прыгажосці.

Чым даўжэй немцы трымалі палоннага пад павеццю валасной управы, тым яскравей станавілася, што ў іх разам з гэтым з’явілася нейкая мэта, нешта яшчэ патрэбна было ім ад яго.

Між тым над мястэчкам раптам два разы праляцеў самалёт. Чубару замінала бачыць яго стрэшка павеці, але няцяжка было вызначыць нават безвач, што пасля другога палёту над мястэчкам той сеў недзе за былым панскім, а затым калгасным садам, які цяпер невядома каму належаў; менавіта ў тым баку доўга чмыхаў матор, пакуль зусім не заціх.

Немец, што стаяў на варце каля павеці, мусіць, згледзеў самалёт у небе яшчэ першы раз, бо чамусьці ўсміхнуўся Чубару, заківаў галавой: «Гут, гут»[1], усё роўна як дасюль сапраўды чакаў з'яўленне яго. Але найбольш зацікаўлены былі ў прылёце самалёта, як высветлілася потым, афіцэры. Гэта яны выклікалі яго сюды з аэрадрома ў Сешчы. Бадай, яшчэ не паспеў недзе астыць матор, як у валасным упраўленні пачуўся рух – загрукалі дзверы, затупалі ногі, а на ганку, што выходзіў у двор, з'явіўся бургамістр Брындзікаў.

Раней Чубар не ведаў, што старшыня спажыўсаюза валодае чужой мовай, але тут ён сказаў штосьці па-нямецку вартавому, той зварухнуўся, прыставіў к назе вінтоўку, выструніўшыся раптам, а калі бургамістр вярнуўся ў будынак, зноў паклаў на левую руку вінтоўку, пачаў прыспешваць Чубара: «Аўштэйн, аўштэйн! Шнэлер, шнэлер!»[2] Чубар намацаў правай нагой аглоблю, надзіва лёгка саскочыў з двухколкі. Немец тут жа паказаў яму рукой на ганак, загадаў: «Форвэрц!» Нібыта адчуваючы на адлегласці за спіной вастрыё штыха, Чубар ступіў на ганак і праз дзверы, якія пакінуў расчыненымі Брындзікаў, зайшоў і спыніўся ў сенцах, губляючыся ў здагадках, куды кіравацца далей. Але канвойны немец ведаў, дзе ім належала быць. Ён загарадзіў вінтоўкай дзверы ў валасную кантору, зноў скамандаваў: «Форвэрц!», няйначай, упэўнены, што сэнс гэтага нямецкага слова вядомы ўсяму свету.

Праз сенцы яны выйшлі на другі ганак, на местачковую вуліцу. Тут стаяў грузавік, у закрытым кузаве якога сядзелі немцы і рускія добраахвотнікі. Чубару таксама загадалі лезці ў кузаў. Побач з ім на бакавой лаўцы размясціўся і немец-канвойны, хоць у кузаве і без таго хапала ўзброеных салдат. Сярод добраахвотнікаў, якіх пазней пачалі называць то «ронаўцамі», то «ўласаўцамі», то «народнікамі», нікога тут не было, што ўчора мелі справу з Чубарам. Бадай, ніхто яго не бачыў дасюль, таму і цікавасці асабліва не выклікаў. Але грузавік крануўся з месца толькі пасля таго, як наперад выехаў бранявік, а за ім чорны легкавы аўтамабіль з афіцэрамі.

Самалёт сапраўды сядзеў на роўным полі за местачковым садам. Чубар убачыў яго пасля таго, як апынуўся на зямлі, але да таго часу зусім не здагадваўся, што вязуць сюды. Яму здавалася, што машыны накіроўваюцца за мястэчка, каб недзе падалей ад людскога вока расстраляць яго. Тады ён ужо канчаткова развітаўся з гэтым светам, а паколькі выбар быў зроблены яшчэ ўчора і пра смерць думалася, бадай, увесь час, лічы, з самага таго моманту, калі ачуняў на правым беразе Бесядзі, то і цяпер знясільваючага, брыдкага жаху, што адбірае моц у чалавека, пазбаўляе жыцця па

[1] Добра, добра (ням.).
[2] Устаць, устаць! Хутчэй, хутчэй! (ням.).

сутнасці яшчэ да моманту самой смерці, па-ранейшаму не было ў ім. Але цяпер зноў нешта мянялася.

У самалёце яшчэ хапала месца. Занятая была толькі правая бакавая лаўка. Чубара пасадзілі на левую. Побач апусціўся канвойны. Але матор лётчыкі запусцілі не адразу. Маёр нешта сказаў цывільнаму. Той пачаў тлумачыць Чубару. Уласна кажучы, гэта было не тлумачэнне. Загад. І гучаў ён зусім проста, калі ў пераказе: вось зараз мы зробім на самалёце аблёт той тэрыторыі, што размешчана за Бесяддзю. Там суцэльныя лясы. Але гэта ўжо наша праблема. Для вас галоўнае – паказаць з самалёта размяшчэнне партызанскага атрада Нарчука. Спадзяюся, вы пазнаеце зверху?

Чубар выслухаў цывільнага, перавёў позірк на камандзіра карнага атрада. Маёр моўчкі кіўнуў – так, так. А цывільны пасля гэтага дадаў:

– Ад таго, якую паслугу вы акажаце нямецкаму камандаванню, будзе залежаць ваша жыццё. Такім чынам, ваш лёс у вашых руках. Думайце, пакуль ёсць час.

Усё роўна як ратуючыся, каб не адказваць, Чубар азірнуўся, глянуў у круглае акенца. На носе самалёта тым часам ужо рабіў першыя абароты прапелер.

Самалёт зрабіў цераз правае крыло разварот, зямля пад ім нібыта перакулілася, але праз момант нанова выраўнялася – здаецца, лётчыкі бралі курс яму рукой на ганак, загадаў: «Форвэрц!» Нібыта адчуваючы на адлегласці за спіной вастрыё штыха, Чубар ступіў на ганак і праз дзверы, якія пакінуў расчыненымі Брындзікаў, зайшоў і спыніўся ў сенцах, губляючыся ў здагадках, куды кіравацца далей. Але канвойны немец ведаў, дзе ім належала быць. Ён загарадзіў вінтоўкай дзверы ў валасную кантору, зноў скамандаваў: «Форвэрц!»[1], няйначай, упэўнены, што сэнс гэтага нямецкага слова вядомы ўсяму свету.

Праз сенцы яны выйшлі на другі ганак, на местачковую вуліцу. Тут стаяў грузавік, у закрытым кузаве якога сядзелі немцы і рускія добраахвотнікі. Чубару таксама загадалі лезці ў кузаў. Побач з ім на бакавой лаўцы размясціўся і немец-канвойны, хоць у кузаве і без таго хапала ўзброеных салдат. Сярод добраахвотнікаў, якіх пазней пачалі называць то «ронаўцамі», то «ўласаўцамі», то «народнікамі», нікога тут не было, што ўчора мелі справу з Чубарам. Бадай, ніхто яго не бачыў дасюль, таму і цікавасці асабліва не выклікаў. Але грузавік крануўся з месца толькі пасля таго, як наперад выехаў бранявік, а за ім чорны легкавы аўтамабіль з афіцэрамі.

Самалёт сапраўды сядзеў на роўным полі за местачковым садам. Чубар убачыў яго пасля таго, як апынуўся на зямлі, але да таго часу зусім не здагадваўся, што вязуць сюды. Яму здавалася, што машыны накіроўваюцца за мястэчка, каб недзе падалей ад людскога вока расстраляць яго. Тады ён ужо канчаткова развітаўся з гэтым светам, а паколькі выбар быў зроблены яшчэ ўчора і пра смерць думалася, бадай, увесь час, лічы, з самага таго моманту, калі ачуняў на правым беразе Бесядзі, то і цяпер знясільваючага, брыдкага жаху, што адбірае моц у чалавека, пазбаўляе жыцця па сутнасці яшчэ да моманту самой смерці, па-ранейшаму не было ў ім. Але цяпер зноў нешта мянялася.

[1] Наперад! (ням.).

У самалёце яшчэ хапала месца. Занятая была толькі правая бакавая лаўка. Чубара пасадзілі на левую. Побач апусціўся канвойны. Але матор лётчыкі запусцілі не адразу. Маёр нешта сказаў цывільнаму. Той пачаў тлумачыць Чубару. Уласна кажучы, гэта было не тлумачэнне. Загад. І гучаў ён зусім проста, калі ў пераказе: вось зараз мы зробім на самалёце аблёт той тэрыторыі, што размешчана за Бесяддзю. Там суцэльныя лясы. Але гэта ўжо наша праблема. Для вас галоўнае – паказаць з самалёта размяшчэнне партызанскага атрада Нарчука. Спадзяюся, вы пазнаеце зверху?

Чубар выслухаў цывільнага, перавёў позірк на камандзіра карнага атрада. Маёр моўчкі кіўнуў – так, так. А цывільны пасля гэтага дадаў:

– Ад таго, якую паслугу вы акажаце нямецкаму камандаванню, будзе залежаць ваша жыццё. Такім чынам, ваш лёс у вашых руках. Думайце, пакуль ёсць час.

Усё роўна як ратуючыся, каб не адказваць, Чубар азірнуўся, глянуў у круглае акенца. На носе самалёта тым часам ужо рабіў першыя абароты прапелер.

Самалёт зрабіў цераз правае крыло разварот, зямля пад ім нібыта перакулілася, але праз момант нанова выраўнялася – здаецца, лётчыкі бралі курс паўз дарогу на Кісялёўку, потым на Малы Хоцімск, каб зайсці на Забесяддзе недзе над Віроўкай ці Азёрным. Чубар мясцовасць вакол Верамеек ведаў няблага – і свой калгас быў немалы, у яго ўваходзілі некалькі вёсак, але ж і ў другія населеныя пункты, пакуль працаваў старшынёй у «Іскры», наведвацца паспяваў, балазе, сямейныя справы дома яго не трымалі, мог распараджацца вольным часам як хацеў, ды і справы заўсёды знаходзіліся, калі не ў адной гаспадарцы, дык у другой. Да таго ж гасцяваліся адзін у аднаго старшыні бліжэйшых калгасаў нярэдка, асабліва ў час раённых нарад альбо нейкіх куставых семінараў. Так што ведання мясцовасці Чубару сапраўды было не пазычаць. Іншая справа – як пазнаваць зверху тое, што бачыў дасюль толькі ўпоравень, – на самалёце Чубар ляцеў тут упершыню.

А самалёт нібыта слізгаў над зямлёй. Унізе лёгка прасочваліся не толькі абрысы пабудоў, але нават гаршкі на платах. Нібыта наскрозь прасвечваліся да самых каранёў гаі. Каля аднаго двара ў Кісялёўцы пасвілася на прывязі каза, дык і вяроўку Чубар прыкмеціў. І гэта выклікала ў яго ўсмешку, але тым жа часам і насцярожыла: аказваецца, зверху зусім няцяжка высачыць не толькі цэлы партызанскі атрад, а і аднаго чалавека, таксама звера, словам, не надта проста схавацца ад самапёта, які ляціць нізка над зямлёй. «Маёр гэты, – падумаў Чубар, – відаць, вопытны чалавек, нездарма задумаў такую справу. Але няхай».

За Малым Хоцімскам самалёт сапраўды лёг на левае крыло, стаў паварочваць якраз туды, як і думаў Чубар. А вось і Віроўка. Затым – Мокрае, Ягораўка, Жаркі, Машавая… А яшчэ праз нейкі час паказаліся Белы Камень, Бялынкавічы. Над Бесядцзю па загаду камандзіра карнага атрада адзін з лётчыкаў расчыніў дзверы. У сярэдзіну самалёта ўварваўся вецер, закружыўся, але тут жа неяк і аціх, нібыта расчараваны, што нікога не здолеў скрануць з месца.

– Ну! – ні то падахвоціў, ні то загадаў па-руску маёр.

Чубар пасунуўся на лаўцы да дзвярэй, узяўся за поручань і, падстаўляючы сябе моцнаму ветру, які схапіўся рваць-шкуматаць адзенне на ім, глянуў на зялёнае

разводдзе лясоў, паміж якіх блішчэлі цёмна-сінія люстэркі азёр. Раптам высветлілася для яго, што іх на гэтай зямлі шмат. Толькі паміж Зацішшам, Верамейкамі і Мамонаўкай ажно чатыры. Але гэта ён добра ведае, не раз здаралася бываць каля іх.

Словам, уся прыгажосць, усё харство забесядскага краю, дзе Чубар пражыў апошнія гады, па-сапраўднаму адкрыліся яму толькі цяпер, з вышыні гэтага палёту. Больш таго, ён нават не здагадваўся, што знаёмую мясцовасць, знаёмыя краявіды можна пабачыць, а найлепш – адчуць іначай, зусім па-іншаму… Пабачыць, адчуць і ўсё роўна як задыхнуцца ад захапляючага ўтрапення, калі да месца гэтакі выраз… А найперш – ад усведамлення сваёй прыналежнасці да ўсяго гэтага, ад сваёй прычыннасці, як чалавека і, можна сказаць, ужо тутэйшага жыхара, дарма што раней Чубар чамусьці не прылічаў сябе да мясцовых людзей, можа, таму, што ўсё жыццё па сутнасці вандраваў з аднаго месца ў другое… Так склалася ў яго гэтае жыццё… Ды нездарма кажуць: лепей позна, чым ніколі…

Самалёт тым часам ужо ляцеў над Шурышчам… Трохі збоч, бліжэй да верамейкаўскага лугу за Топкай Гарой… Але Чубар не глядзеў у той бок, акурат не хочучы нават такім чынам скіраваць увагу на Шурышча тых, хто прымушаў яго цяпер выдаць партызанскі атрад… Трымаючыся правай рукой за поручань, які хутчэй нагадваў звычайную жалезную скабу, Радзівон падняўся з лаўкі, стаў супроць расчыненых дзвярэй, нагнуўся і паляцеў уніз… Дзіўна, але нават у такім становішчы, на пачатку сваёй смерці, Радзівон зноў усломніў, не, дакладней, убачыў таго бешанковіцкага паўстанцу і ваенурача, якога ён забіў некалі на пясчанай выспе.

XVIII

Зазыба вярнуўся ў Шурышча з Панькоўскай Буды пасля позняга абеду, калі сонца ўжо стаяла недзе над Цяменскім возерам. Тут, у партызанскім лагеры, яно толькі зрэдку прасвечвалася скрозь шаты вялікіх дрэў, што засцілі зверху зямлянку, збудаваную яшчэ на пачатку мінулай зімы, і два даўжэзныя шалашы, пакрытыя яловай карой. У гэтай зямлянцы, уласна, крутагорскія партызаны і перазімавалі лершы год, балазе, людзей у атрадзе было зусім мала, а шалашы ставілі ўжо сёлетняй вясной, як пачалі прыходзіць у партызаны новыя народныя мсціўцы. Праўда, тэрмін гэты зрабіўся вядомы пазней, Дзяніс Яўменавіч упершыню пачуў яго, здаецца, толькі ўлетку ды і то не ў атрадзе, бо дасюль ва ўжытку былі дзве назвы: бандыт – партызан, партызан – бандыт. Усё залежала ад таго, хто гаварыў. Тым часам немцаў называлі немцамі, ну, часам, фашыстамі. Але была распаўсюджана і яшчэ адна назва – бобікі. Так звалі паліцаяў, дарма што мала хто адважваўся гаварыць ім гэтак у вочы. Вясковы народ увогуле здатны даваць розныя мянушкі, а тут яго яшчэ і падахвочвалі. Такім чынам, новая назва партызан не толькі дапаўняла сэнс гэтаму незразумеламу для мясцовага чалавека слову, аднак і нібыта надавала высакароднасці яму; народныя заступнікі заўсёды карысталіся пашанай; улады ж іх называлі не іначай, як разбойнікамі, бандытамі… Але ўсё гэта так, як кажуць, паміж іншым.

Паколькі Дзяніс Яўменавіч апынуўся ў атрадзе раней, чым другія сувязныя, Мітрафан Нарчук рашыў пачакаць, што стане рабіць пасля яго паведамлення аб карнай камандзе Скандзілаў. Ехаць у Панькоўскую Буду таксама не было сэнсу – фанабэрыстае стаўленне камандзіра спецатрада да ягонага запрашэння сюды, у раённы атрад, спярша абурыла Мітрафана Ануфрыевіча, затым выклікала ў душы штосьці падобнае на помслівую грэблівасць, якая неўзабаве і зусім адбіла ахвоту звязвацца з прышлымі, каб не сказаць – чужымі партызанамі. Ды бяда была ў тым, што сваімі сіламі ён не мог заступіць дарогу ў Забесяддзе карнікам. Таму ўвесь час даводзілася думаць, як усё-ткі аб’яднаць наяўныя паблізу партызанскія атрады. Але Нарчук ведаў пра гэта можна было меркаваць, бадай, дакладна, што акрамя атрада Скандзілава, які размяшчаўся ў Бабаеўскіх лясах, ды гэтага спецатрада, што з’явіўся раптам з-за лініі фронту, у Забесяддзі ніякіх партызан цяпер няма. На маскоўскіх партызан тым часам надзеі няварта было ўскладаць. Такі вывад зрабіў сам Мітрафан Ануфрыевіч. Зазыба на яго не наводзіў. Той толькі пераказаў яму сваю размову з камандзірам спецатрада, а ўжо Нарчук сам разважаў далей.

Між тым знаходзіцца без справы ў Шурышчы Зазыбу не хацелася, і ён папрасіўся ў Нарчука адскочыць налуг за Топкай гарой. Чамусьці думалася, што верамейкаўцы сёння таксама паехалі ўсёй вёскай. Прынамсі, Кузьма Прыбыткоў з Масеем сапраўды збіраліся дакошваць палосы, дарма што ўчора і яны разам з іншымі ўцякалі з лугу пад свідруючы віск нямецкіх куляў. Але ж надвор’е не заказваюць. Не ўхопіш сёння на лузе ношку травы карове, заўтра будзе позна. Да таго ж цяпер, пры аднаасобным жыцці, належала карміць селяніну не толькі карову, але і каня, іншую жыўнасць, ад якой за калгасам былі пазбавіліся. Так што сенам на зіму неабходна было запасацца ўдосталь, каб не пабірацца потым па дварах у навакольных вёсках.

Адна справа жабраваць сярод багатых людзей, іншая – прасіць у такіх жа, як сам. Таму, трэба думаць, мала хто з вяскоўцаў пабаіцца ўчарашніх куляў, злашча што і сёння штосьці падобнае магло паўтарыцца. Праўда, Зазыбу чамусьці здавалася, што немцы не маюць намеру ў хуткім часе перапраўляцца зноў на гэты бок Бесядзі. Тады навошта было пакідаць Забесядцзе ўчора? З Бялынкавіч альбо з таго ж Белага Каменя дарогі сюды нават карацейшыя. Што ж датычыць лесу, дык ён тут скрозь, адно апыніся за ракой, як не ўбачыш ні канца, ні краю. Абмінаючы вёскі, па ім можна прайсці ажно да самай Клетні. Гэта толькі звычайная назва – лес, а то ў народзе часцей кажуць – лясы. Забесядскія лясы, Клятнянскія лясы, потым Бранскія… А па той бок Бесядзі – бліжэй за ўсё Чачэрскія і так далей, да самых Палескіх балот… Тым не менш немцы не сталі доўга затрымлівацца ў Бабінавічах. Аднак лепей па парадку.

Верамейкаўцы і праўда сёння дакошвалі свой луг за Топкай гарой. Дакладней, хто як – адны ўжо скідвалі сена ў копы, другія сапраўды яшчэ налягалі на косы; Масей таксама паспеў управіцца са сваёй пожняй, памагаў цяпер касіць Кузьму Прыбыткову. Дзяніс Яўменавіч прайшоў міма паласы Ганны Карпілавай. Андрэя Марухіна там не было, значыць, падумаў Зазыба, гэта яго накіраваў Нарчук у Трусак, каб звязацца з атрадам Скандзілава. Ганна ўбачыла Зазыбу, нахмурылася – Дзяніс Яўменавіч адчуў у яе маўчанні папрок, хоць зусім не вінаваты быў, што паласа Ганчына стаяла яшчэ, лічы, непачатая. «Трэба папрасіць Масея, – зноў падумаў Дзяніс Яўменавіч, – няхай пакладзе і яе пожню, раз ужо гэтак набіў руку ў сёлетнюю касавіцу. На адзін дзень пазней, на адзін – раней, што з таго? Канечне, сена траціць ад спазнення калорыі, як гавораць вучоныя аграномы, але дзе ў мужыка не прападала!.. Праз гэтую вайну і чалавеку няцяжка згінуць!.. У адным суцяшэнне – не ўсім людзям наканаваны аднолькавы лёс, значыць, і не ўсе памруць…»

Учора на іхніх палосах стаяла смачная трава, сёння – скрозь сена; Марфа Давыдаўна сваё ўжо раскідала граблямі і цяпер падварушвала, каб яшчэ пры гарачым сонцы пачаць ставіць копы; тым часам на паласе Кузьмы Прыбыткова стаячай травы яшчэ хапала на цэлы пракос, і Масей са старым, дабіваючы яго, рухаліся з косамі адзін аднаму насустрач; Кузьмова нявестка таксама завіхалася з граблямі на сваёй паласе, але ўсё роўна як у нерашучасці, чакаючы, пакуль мужчыны скосяць і гэтую апошнюю жывую нітку травы.

Калёсы без коней таксама стаялі на ўчарашнім месцы, але Дзяніс Яўменавіч не думаў затрымлівацца на ўзлеску, прайшоў адразу на сярэдзіну сваёй паласы, дзе знаходзілася Марфа Давыдаўна. Няйначай, тая прыкмеціла мужа яшчэ здалёку, таму нават не падняла галавы, дарма што сказала нібыта ўзрадавана:

– Ну во, і гаспадар нарэшце на двор з’явіўся.

– Так, з’явіўся, – усміхнуўся Зазыба.

– Дак памагай.

– Дзе тут памагаць ужо… Самі нядрэнна спраўляецеся. А вось Ганне Карпілавай…

– Ты ўсё пра Ганну!

– Не зімаваць жа ёй тут, на лузе.

– Дак…

– Трэба падказаць Масею.

– Дак… Няхай бы самі дамаўляліся.

– І я таксама пасаблю. Касу маю ўзялі з дому?

– А я й не помню.

Дзяніс Яўменавіч рушыўда Кузьмы Прыбыткова. Сказаў, акурат вылаяўся, усміхаючыся, што гэтак доўга адсутнічаў:

– А вы тут, гляджу…

– Дак… – Стары перастаў махаць, паставіў пяткай перад сабой касу. – А дзе ета цябе і сянні насіла?

– Чорт работу знаходзіць…

– Трэба меней каля балота бадзяцца.

– Ці ж цяпер толькі тыя чэрці, што ў балоце?

– Ды ўжо ж… Што новае на свеце?

– Немцы недзе ў Бабінавічах.

– Дак гэта яны ўчора тута стралялі?

– Яны.

– Дак багата… З імі вам адным не справіцца. Дзяніс Яўменавіч, усё роўна як здзіўлены, пастаяў насупраць Кузьмы, тады кіўнуў галавой, маўляў, так, не справіцца. Але сказаў іншае:

– Ганне Карпілавай трэба памагчы…

– Дак учора мы намякнулі ёй пра ета… дак закрычала, маўляў, ёсць каму пожні касіць!..

– Ну, учора адно было, сёння – другое.

– Дак… А дзе ж прымак? Можа, ужо сабакам сена косіць?

– Заняты.

– Ну, тута справа такая – альбо ў прымах сядзі, альбо ў партызанах хадзі.

Зазыба нахмурыўся, нічога не сказаў. Тады зноў пачаў:

– Трэба кабеце памагчы.

– Дак а ці я проці?

– А я і не кажу, што ты проці! Але ці ўзялі маю касу з дому?

– Здаецца, Масей клаў на воз. Спытай яго, ато й сам схадзі паглядзі.

Чапляючыся ботамі за сена, Дзяніс Яўменавіч падаўся ў другі канец Кузьмовай паласы. Масей рухаўся з касой ад Бесяддзі.

– Ты б пабыў ужо дома, – сказаў ён бацьку, – а то…

– Я гляджу, вы хутка справіліся, – быццам не пачуўшы сына, усміхнуўся Зазыба. – А вось Ганне трэба памагчы. Ты касу маю прывёз?

– На калёсах.

– То пойдзем, сын, паможам Ганне.

– А як яна не захоча, каб мы памагалі?

– Ну, гэта яе справа, але на Андрэя гіакуль мала надзеі.

– Што так?

– Ну, заняты…

– Ах, я і забыў, што ў вас з ім партызанскія тайны.

– Ты таксама, як Кузьма…

Масей сгіыніўся, пачаў мянташыць касу.

– Дык што Кузьма?

– А нібыта зайздросціць таму ж Андрэю.

– Адкуль гэта ты ўзяў?

– Узяў вот, і ўсё!..

– Ладна, бацька, – усміхнуўся Масей, – бяры сваю касу, ідзі наймайся ў Ганны. А я даганю гэты шнур, таксама прыйду.

Так яны і працавалі да канца дня – Масей дапамог Кузьме Прыбыткову пакласці на ягонай паласе апошні пракос, тады следам за бацькам падаўся касіць Ганне Карпілавай. Ганна не пярэчыла, бо разумела, што Зазыбавы мужыкі ўзяліся дапамагаць не таму, што на сваёй паласе няма чаго рабіць – Марфа Давыдаўна адна зграбала сена ў копы; Ганна нарэшце зразумела, што Андрэя і сёння не будзе; учора ён амаль не касіў, прабегаў, лічы, увесь дзень, а цяпер і зусім недзе прапаў; праўда, яна і да Зазыбы не кінулася распытваць пра Андрэя, злашча што Дзяніс Яўменавіч сам толькі здагадваўся, куды мог падацца той; і ўсё-ткі скасіць Ганчыну паласу не паспелі; начаваць паехалі дамоў, у Верамейкі.

Дзень для Зазыбы выдаўся доўгі, як сама вечнасць. Ён ужо нават, здаецца, не помніў, дзе і калі пачынаў яго. Але перад тым, як абначыцца ў Верамейках, яшчэ раз успомніў пра Чубара. Сапраўды, дзе ж Радзівон? І ўдзень у Шурышчы Чубара не было, іначай бы трапіўся на вочы…

* * *

Тым часам ад Скандзілава з Батаеўскіх лясоў чалавека не было. Але і немцы, здавалася, не збіраліся выступаць з Бабінавіч. Рабілі аблёты Забесяддзя на самалёце, да нечага прыглядваліся, нешта вывучалі, аднак ні на адной з дарог, якія вялі з мястэчка да ракі, карнікі не паяўляліся. Што-што, а дарогі тыя Нарчук найперш узяў пад нагляд. Калі б нават самае нешматлікае падраздзяленне немцаў паспрабавала прайсці ці праехаць па іх, у Шурышчы стала б вядома адразу. Можа, якраз вось гэтая акалічнасць, што немцы заставаліся ў мястэчку, і стала прычынай, што Мітрафан Ануфрыевіч і на другі дзень пасля паездкі Дзяніса Зазыбы не спяшаўся падавацца ў Панькоўскую Буду. Ён разумеў, канечне, што справа з арганізацыяй супраціўлення павінна ажыццяўляцца не так, як цяпер, але што зробіш – кожны сабе гаспадар. Некалі, на пачатку партызанскай дзейнасці, яму здавалася, што раённы атрад, створаны мясцовымі савецка-партыйнымі ўладамі сумесна з армейскімі органамі, стане галоўным, калі можна так сказаць, арганізуючым, вакол якога будуць групавацца іншыя падобныя ўтварэнні, аднак нічога такога не атрымалася. Скандзілаўцы імкнуліся ўвесь час дзейнічаць самастойна, можа, не так самастойна, як з пэўнай аддаленасцю, праўда, гэта не дужа засмучала камандзіра раённага атрада,

урэшце, самае галоўнае цяпер – дзейнічаць, а не адседжвацца, і так зашмат часу дарэмна патрачана за зіму; затое паводзіны прышлых партызан, дакладней, тых, што з'яўляліся ў Забесяддзі з-за лініі фронту, выклікалі занепакоенасць: задужа выразным было імкненне іх падмяць пад сябе мясцовых партызан, прынамсі, калі і не падмяць, то хоць паказаць сябе; разам з тым такія атрады доўга і не затрымліваліся ў мясцовых лясах; гэты атрад, што цяпер у Забесяддзі, па словах Зазыбы, таксама збіраецца падавацца далей… І тым не менш Нарчук разумеў, што ўхіляцца ад бою з карнікамі ніхто не меў права, незалежна ад таго, у каго якія планы.

Нарэшце на трэці дзень з Трусака вярнуўся Андрэй Марухін. Сказаў Нарчуку, што скандзілаўцы падаліся ў Клятнянскія лясы, да Яроміна. Хто той Яромін, Андрэй не ведаў, аднак чакаць дапамогі ад скандзілаўцаў ужо не раіў. Усё вырашала цяпер – ці адважацца немцы рухацца за раку? І калі?

Між тым некаторыя з партызан раілі камандзіру не станавіцца на дарозе ў карнікаў, прапусціць іх, маўляў, ніхто ж не ведае, дзеля чаго яны ўвогуле з'явіліся тут. Былі і другія падказкі: чаму б не напалохаць немцаў, адна справа, што сіл не хапае, але ж і немцы не ведаюць дакладна, што ў нас у наяўнасці, таму нават нашым малалікім атрадам трэба выйсці да броду на Бесядзі; адна справа пайсці ў наступ на адкрытай мясцовасці, зусім іншае, калі іх сустрэць агнём з лесу. Ёсць два ручныя кулямёты, нават адзін нямецкі аўтамат, які дастаўся партызанам яшчэ ўвосень, калі напалі на грузавую машыну на бабінавіцкай дарозе; тады яны забілі двух паліцэйскіх, адзін з якіх быў узброены нямецкім аўтаматам; у астатніх партызан – вінтоўкі: на адлегласці імі яшчэ зручней даставаць праціўніка… «Уласна кажучы, – думаў Ёіарчук, – атраду нічога не застанецца ўрэшце, як выйсці сапраўды к броду на Бесядзі; да таго ж, нават аб'яднанымі сіламі лепш за ўсё пераймаць карнікаў ля ракі», – словам, чым даўжэй Мітрафан Ануфрыевіч разважаў над праблемай, якая не толькі нечакана паўстала перад атрадам, аднак і ўскладнялася з кожным днём, тым мацней пераконваўся, што гэты раз размінуцца з немцамі не ўдасца; давядзецца прымаць канкрэтнае рашэнне.

Мітрафан Ануфрыевіч паступова ўпэўніўся ў гэтым, тады адкрыта сказаў пра сваё рашэнне Паўлу Чарнагузаву, камісару Баранаву… Пярэчанняў не было. Але з'явілася думка параіцца з усімі партызанамі, бо рана ці позна, аднак давядзецца ставіць задачу перад атрадам, дык лепей быць гатовымі да бою зараней. Таму, калі з мястэчка прыйшло паведамленне ад Абабуркі, што карны атрад збіраецца нарэшце выступіць, псіхалагічна партызаны ўжо былі падрыхтаваныя да гэтага. Але праз таго ж сувязнога ад Абабуркі паступіла таксама паведамленне, што сярод карнікаў местачкоўцы бачылі… Чубара!.. Нарчук тут жа выклікаў у Шурышча Зазыбу. Дзяніс Яўменавіч ад нечаканасці няверліва глянуў на камандзіра атрада: не можа таго быць!.. Зноў, але цяпер падрабязна ўжо, давялося расказваць, дзе і як яны разлучыліся ў час нядаўняй паездкі. Дзіўна, аднак у атрадзе нібыта ўпершыню задумаліся – ну так, дзе ж гэта Чубар?..

Разгубленыя Зазыба з Нарчуком колькічасу сядзелі, разважалі… Аднак далей вось гэтага ў сваіх разважаннях не пайшлі: ці здольны Чубар навесці немцаў на сваіх?

Зазыба замахаў рукой, каторы ўжо раз гаварыў – не. Між тым неабходна было спяшацца.

Мастоў на Бесядзі далёка тут не было, людзі хадзілі і ездзілі цераз брады. Насупраць Верамеек бьша раней плаціна каля вусаўскага млына. Але яна ў мінулым годзе ажно некалькі разоў бралася гарэць. Так што немцам, калі яны сапраўды наважыліся з Бабінавіч у Забесяддзе, таксама дарога сюды толькі цераз брады. А іх налічвалася па рацэ ажно некалькі, бадай, насупраць кожнай вёскі. Таму партызанам належала пільнавацца цяпер перапраў і каля Гончы, і каля Вусаўкі, і каля Мамонаўкі, і каля Малога Хоцімску…

Тым часам было падобна на тое, што немцы ўсёй калонай кіраваліся к Вусаўцы. На нейкі час яны затрымаліся ў Зялёнкавічах, гэта дазволіла партызанскім назіральнікам дакладна вызначыць, да якога броду атраду патрэбна спяшацца на засаду.

К Бесядзі выйшлі акурат разам – Нарчук са сваімі партызанамі стаяў ужо каля дубоў, што абступалі верамейкаўскую дарогу, па-над самай ракой, калі па крутым схіле ў катлавіну ў Вусаўцы пачала спускацца і нямецкая калона. Мітрафан Ануфрыевіч схапіўся за бінокль, навёў акулярамі спярша на прагарэлую вусаўскую плаціну, затым на брод, што знаходзіўся лявей ад яе. Калона толькі падступалася да пясчанай водмелі. Першы ў калоне рухаўся бранявік. За ім – некалькі грузавікоў накрытых тэнтамі. Пешых і конных з артылерыяй пакуль не відно было за гарой, але па тым ужо, што апынулася ў полі зроку бінокля, можна было меркаваць, што варожая сіла ў Забесяддзе накіроўваецца вялікая. Нарчук ажно прысвіснуў хвіліны праз тры, калі з-за гары на вясковую вуліцу ўступіла нарэшце і асноўная частка калоны. Праз шкельцы добра відаць было ўсё: і як карнікі размаўлялі між сабой, і як смяяліся, якую мелі зброю; але дзіўна было бачыць сярод немцаў людзей у савецкай вайсковай форме; якраз гэтыя выглядалі ў калоне найболын зваруіштівымі і вялікімі… Механізаваная частка калоны спынілася каля вады яшчэ да таго, як Нарчук адняў ад вачэй бінокль, паглядзеў на сваіх. «Ну што?» – спытаў трохі насмешлівы ягоны позірк. «Ат, – махнуўрукой камісар Баранаў, – трэба хоць напалохаць. Паратунак на нашым баку». Ён паказаў назад, на лес. Камандзір кіўнуў, але насмешлівага выгляду не змяніў. Пастаяў трохі, тады зноў прамовіў, але ўжо ўсё роўна як уваходзячы ў азарт: «Выйдзе ў нас сёння няйначай, як у той прыказцы – забілі зайца, не забілі, а груку многа нарабілі». – «Але ж некалі трэба адважыцца», – сказаў камісар. «Ды ўжо ж», – уздыхнуў хтосьці за спіной у Мітрафана Ануфрыевіча.

Камісар убачыў Зазыбу, кіўнуў галавой, каб той падышоў. Дзяніс Яўменавіч праціснуўся праз натоўп, стаў побач. Баранаў сказаў: «Ты, Дзяніс Яўменавіч, бяры хоць чыйго тут каня, скачы ў вёску, няхай людзі ўцякаюць у лес, а мы пачнем бой». Зазыба доўгім, акурат няверлівым позіркам паглядзеў на камандзіра. Той кіўнуў у знак згоды з камісарам, але не адвярнуўся, зняў з шыі бінокль, падаўДзянісу Яўменавічу: «Глянь».

Зазыба паднёс к вачам бінокль. Учора яму зацяло пра Чубара, таму цяпер адразу пачаў шукаць Радзівона сярод карнікаў. Аднак за Чубараву постаць Зазыба ні разу не зачапіўся. «Значыць, – падумаў ён, – пра Радзівона альбо плёткі пускаюць, альбо…» Але пра гэта вось апошняе, якое пачыналася з таго ж «альбо», усё роўна як не хацелася дадумвацца… Зазыба нарэшце перастаў глядзець у бінокль, аддаў Нарчуку.

– Ну што? – спытаў той.

– Баюся, шго ты сасваёй прыказкай сёння… І тым не менш трэба альбо тут, сярод гэтых дубоў, выбіраць месца засады, альбо падысці зусім да ракі.

– Я таксама пра гэта думаю. Але як пусціш іх на дарогу сюды, то ўжо не затрымаеш.

– Яно так, – кіўнуў Зазыба.

– Ну а?..

Зазыба не стаў чакаць, пакуль камандзір скажа пра Чубара, адмоўна крутануў галавой:

– Магу паручыцца – няма яго сярод іх.

– Ну, няма, дык і няма, – лёгка згадзіўся Нарчук. – Я і сам не бачыў. Камісар мае рацыю, ты, Дзяніс Яўменавіч, сапраўды паспяшайся ў вёску, ды і на пасёлках таксама трэба людзей папярэдзіць. Няхай хаваюцца ў лесе. Ці мала што!..

Паміж двух дубоў па левы бок дарогі стаялі два кані. Аднаго Зазыба ведаў – Нарчукоў. Другі Дзянісу Яўменавічу быў незнаёмы, але і гэты быў пад сядлом. Зазыба імкліва крутануўся да дубоў, ступіў нагою ў стрэмя і лёгка перанёс цела ў сядло. Ён і ў часе свайго старшынства ў калгасе часта ездзіў верхам, але кавалерыйскі спрыт заставаўся яшчэ з грамадзянскай вайны. Конь адразу адчуў на сабе ўладнага седака, вынес яго з-пад дубоў на дарогу.

Першыя стрэлы каля вусаўскага броду Зазыба пачуў ужо амаль у Верамейках – заставалася ў Замасточчы прамінуць грэблю, каб трапіць па ёй у Падліпкі. Тым часам стралянііна з кожнай хвілінай часцела. Насупраць Меляшонкавага двара стаялі гуртам кабеты. Для іх стралянііна за лесам была нечаканай, таму яны пакуль яшчэ толькі трывожна прыслухоўваліся да яе, прыкідваючы, дзе гэта. Са з’яўленнем Зазыбы, вядома, канчалася іхняе няведанне. Але як толькі стала зразумела, што трэба забіраць дзяцей ўцякаць з вёскі, жанчыны пачалі ціха наракаць паміж сабой, навошта было, маўляў, чапаць немцаў: «Ну, едуць, дак і праедуць!.. Хіба ета першы раз?.. А цяпера во!..»

Зазыба тым часам ужо гнаў каня далей, узбураючы ўсю вёску.

XIX

З дзённіка баявых дзеянняў ахоўных войск групы армій «Цэнтр». 13.7. Паказанні палонных пацвярджаюць яшчэ раз дадзеныя аб добра арганізаванай бандыцкай разведвальнай сетцы… 14.7. Камандаванне групы армій аддало загад аб стварэнні з вопытнага злучэння «Граўкопф» зондаркаманды ддя асобага прызначэння… Начальнік штаба на самалёце вылецеў у Гомель, у 221-ю ахоўную дывізію, і ў Новазыбкаў для абмеркавання абстаноўкі. 221-я дывізія паведамляе аб далейшых моцных сутыкненнях з бандамі ў раёне Почапа. 221-й ахоўнай дывізіі загадана стварыць усходні батальён «Дзвіна». Камандзір асобай замежнай руска-нямецкай каманды СС маёр Дарніц паранены ў баі з партызанамі на р. Бесядзь у вёсцы Вусаўка (Прудок). 15.7. Паступіла паведамленне аб тым, што накіраваны ў разведку казацкі эскадрон на поўдзень ад Бялынічаў акружаны партызанамі. На выручку накіравана паліцэйская рота з Магілёва. 203-я дывізія дакладвае, што партызаны забілі каменданта Мар'інай Горкі. 286-я дывізія паведамляе пра аперацыю супроць партызан, якую праводзіў 61-ы ахоўны полк у раёне на поўнач ад Оршы… Удалося акружыць праціўніка, аднак камандзір палка спыніў аперацыю, бо нібыта авалоданне лесам на поўдзень ад дарогі Орша – Віцебск было немагчымае з-за вялікай плошчы балот… 16.7. Паступілі аператыўныя загады 286-й ахоўнай дывізіі на аперацыю «Адлер» («Арол») і каменданта Смаленска на аперацыю «Нордполь-1» («Паўночны полюс-1»), 18.7. Дарога паміж шасейнай магістраллю VII і Магілёвам у сувязі з пастаянным мініраваннем часова закрыта. Каля Баравухі партызанамі падбіты Ю-52, які зрабіў вымушаную пасадку. Экіпажу ўдалося прабіцца да сваіх. 20.7. Паступіла тэлеграма ад вышэйшага начальніка СС і паліцыі з загадам высякаць лясныя палосы каля аднаго кіламетра па абодва бакі чыгуначных ліній. 22.7. З лагера ваеннапалонных Асінторф (торфзавод) збегла 39 ваеннапалонных. 23.7. У аперацыі «Арол» галоўны ўдар праціўнік накіроўвае супраць рускага батальёна «Днепр».

XX

Немцы дакладна адзначалі ў дакументах як свае перамогі, так і страты. Іншая ўжо справа, як падавалася гэта. Але ў дзённіку баявых дзеянняў ахоўных войск таксама дакладна было засведчана, што «ў баі з партызанамі на р. Бесядзь» паранены камандзір руска-нямецкай каманды СС, той самы маёр, які дапытваў Чубара, а потым вазіў на самалёце над Забесяддзем. Канечне, бою вялікага той раз на Бесядзі не адбылося. Аднак маёр Дарніц усё-ткі быў падстрэлены, з усяго карнага атрада адзін камандзір. Па яго тут жа прыляцеў з Бабінавіч самалёт, забраў і кудысьці павёз.

Зазыба тады не адразу вярнуўся да месца засады партызан – грэба ж было праімчаць на кані Верамейкі ва ўсе канцы, каб падняць людзей, затым паспяшацца ў Мамонаўку, у Кулігаеўку… Ну а пасля, вядома, падаць голас і ў Гутцы, і ў Варопаўцы, і ў Кавычычах. Паўсюды ж людзі! Словам, страляніна на Бесядзі як усчалася без Дзяніса Яўменавіча, так і скончылася. Пасля ўжо Нарчук расказаў Зазыбу: партызаны падкраліся да ракі непрыкметна, спыніліся крокаў за дзвесце ад броду. У весну ў тым месцы звычайна ўтвараюцца глыбокія вымоіны, акурат дзюны на беразе мора, – чым не гатовыя траншэі для вайны? У іх і заселі партызаны, маючы за спінамі лес для адыходу, а спераду каржакаватыя вербы для абароны ад куляў. З засады правы бок Бесядзі выглядаў як на далоні: вёска стаяла на стромым беразе, уздоўж ракі, дарога з Бабінавіч спускалася крута, але катлавіна з адкрытым прырэчным бокам была вялікая. Механізаваная галава калоны тым часам ужо стаяла ля краю вады, хоць з гары ўсё яшчэ спускаліся іншыя падраздзяленні эсэсаўскай каманды, збочвалі здарогі, запаўняючы такім чынам катлавіну. Можна было падумаць, што карнікі збіраліся стаяць там лагерам. Прынамсі, Нарчуку ў бінокль было відаць, як некаторыя салдаты – і немцы, і рускія – разбягаліся па вусаўскіх дварах, шнарылі па падворках і хлявах, хапаючы, што трапляла пад рукі – дзіва што, звычайныя рабункі акупантаў Ды не так. Каля пераправы раптам у суправаджэнні двух немцаў паявіўся нейкі мясцовы мужык з доўгім боўталам у руцэ, усё роўна як ішоў лавіць рыбу, скінуў штаны і пачаў мераць ад таго да гэтага берага раку. Немцы стаялі на мокрым пяску, штосьці падказвалі яму, тыцкаючы рукамі то ў адзін, то ў другі бок. Адбывалася гэтае сноўданне амаль паўгадзіны. Але вось мужык вылез з вады, схапіў свае штаны, якія перад тым павесіў на корань, што вытыркаўся з высокага схілу, стаў нацягваць на мокры зад. Немцы на тым беразе заварушыліся. Нарэшце пярэдні грузавік зрушыўся з месца, уехаўу ваду і нібыта пагглыў па Бесядзі. Здавалася, ён так і пераедзе свабодна на гэты бок ракі, але ж нездарма кажуць – чужая рака як нерат: метраў за дваццаць ад берага грузавік раптам зачмыхаў пускаючы дым над вадой, спыніўся. Было відаць, як шафёр у кабіне нейкі час спрабаваў яго раскатаць, націскаючы на газ і пераключаючы хуткасці, аднак дарэмна, добра, калі грузавік толькі торгаўся. Тады з кузава з-пад тэнту пачалі саскокваць салдаты, не разумеючы і не скідаючы з сябе адзення. Тым часам наступны грузавік таксама ўжо знаходзіўся ў рацэ, патрохі набліжаўся да першага. Нарэшце салдаты выпіхнулі грузавік з каўдобіны, у якую трапілі колы, лічы, на руках панеслі з вады на сухое. І ў гэты момант Мітрафан Ануфрыевіч махнуў партызанам рукой. Першы ўдарыў па машынах кулямёт, за якім ляжалі Павел Чарнагузаў і Андрэй

Марухін, дарма што кулямётчыкам у атрадзе быў акружэнец Дзям'ян Кажанаў але той захварэў і цяпер заставаўся ў партызанскім лагеры ў Шурышчы. За кулямётам пасыпаліся вінтовачныя стрэлы. Але на тым беразе Бесядзі ўсё роўна як не чакалі засады. Тыя немцы, што выпіхвалі грузавік з каўдобіны ад гэтай нечаканасці папрысядалі ў вадзе, круцячы галовамі паміж стрэламі і сваім бокам, дзе знаходзілася іхняе ка- мандаванне. З другога грузавіка ніхто не выскокваў але ён таксама спыніўся. Як і бывае ў такіх выпадках, якія наступаюць пасля бяспечнасці, у катлавапе раптам запанавала збянтэжанасць, нават не было відаць асаблівага зварушэння. Стралялі пакуль адны партызаны. Але паколькі яны мецілі па грузавіках і па тых, хто апынуўся ў вадзе, у катлаване ачомаліся даволі хутка. Няйначай, там раздаліся каманды, бо ўжо праз нейкі момант пачуліся стрэлы і з таго боку. Стралялі з вінтовак. Канечне, палілі немцы наўгад, не бачачы праціўніка, але кулі тым не менш ціўкаліякраз там, дзе размяшчалася партызанская засада. Колькі хвілін працягвалася звычайная перастрэлка. Праўда, партызаны бачылі перад сабой праціўніка, нават паасобку. Немцы ж рабілі гэта сапраўды невідушча, па гуку. Але неўзабаве з іхняга боку паляцелі міны. Дарэчы, за імі можна было сачыць, пакуль яны пераляталі з аднаго берага на другі. Шчасце, што ўсе яны пакуль падалі і разрываліся на самым узлеску, абмінаючы веснавыя вымоіны паміж вербаў, дзе заляглі партызаны. Здавалася, гэтакае няведанне будзе працягвацца ўвесь час. Аднак паступова адлегласць пачала скарачацца, і вось нарэшце першая міна выбухнула пасярод партызанскай засады. Спярша абрынулася на зямлю адна верба, затым другая… Партызаны ўціснуліся ў белы пясок, перасталі страляць. Мітрафан Ануфрыевіч хоць і ляжаў у яміне, якая магла засланяць ад куль, але разумеў, што ад мін гэта не абарона, між тым сёй-той з партызан перабягаў ужо з аднаго месца ў другое. Неабходна было выводзіць людзей з небяспечнай зоны. Аднак з камандай ён марудзіў. І ажно датаго моманту, калі яна стала не патрэбнай. Перабягаючы з аднаго месца ў другое, партызаны неяк зусім непрыкметна самі пакінулі небяспечную зону, і камандзіру давялося адыходзіць апошняму. Зусім не змаўляючыся, сышліся пад тыя ж дубы на беразе Бесядзі, адкуль ішлі на засаду. Усе былі ўзбуджаныя, здавалася, не знаходзілі сабе месца, але ніхто не пацярпеў. Немцы тым часам не пераставалі абстрэльваць левы бераг да самага лесу.

– Ну што, пачакаем іх цяпер тут? – не з меншым узбуджэннем, чым іншыя, спытаў партызан Нарчук: першая сутычка з ворагам усё роўна як абнадзейвала, што і далей гэтак лёгка будзе ўцякаць ад небяспекі ў лесе.

– Пачакаем, пачакаем, – загаварылі ў адказ партызаны, аднак захаплення вялікага на тварах ні ў кога не было.

І тым не менш Нарчук аддаў загад распалажыцца абапал дарогі, што вяла ў Верамейкі. Партызаны заляглі, сцішыліся. Вусаўскі катлаван і адсюль добра прагледжваўся ў бінокль, але што рабілася на Бесядзі, не было бачна. Праз хвілін колькі спыніўся мінамётны абстрэл. Ужо не стралялі адтуль і з вінтовак. Аднак карнікі па-ранейшаму знаходзіліся ў Вусаўцы. У кожным разе, у бінокль Нарчуку было відаць, што ўсё там заставалася на ранейшым месцы і, бадай, у тым жа стане. Да таго ж не

надта лёгка можна было распаўсюдзіцца з катлавана. Адна справа ўвайсці ў яго, зусім іншая павярнуць і выйсці. А тым больш, калі і мэты такой не ставіць. Як хто, а Нарчук чамусьці не верыў, што немцы адмовяцца ад пераправы на гэты бок. І тым не менш у варожым стане адбылося замяшанне. Як пасля высветлілася, адна з куль патрапіла ў камандзіра карнага атрада. Хутка па яго прыляцеў самалёт з Бабінавіч, забраў і паляцеў у Сешчу, на ваенны аэрадром за смаленскай Воргай, каб пакласці ў шпіталь. Але пра гэта стала вядома потым. Цяпер жа партызанам было відаць, як садзіўся за вёскай самалёт, як затым узлятаў, а немцы ўсё заставаліся ў Вусаўцы. Тым часам чакаць – не даганяць, дарма што іншы раз кажуць, што гэта амаль адно і тое ж. У гэты дзень карнікі не адважыліся пераадолець Бесядзь, не зрушылі з месца і тады, як праз гадзіну наляцелі на Забесяддзе самалёты і пачалі бамбіць верамейкаўскі бераг ад ракі да лесу.

* * *

Тым не менш партызаны заставаліся каля верамейкаўскай дарогі да самага вечара. Тут іх і знайшоў Дзяніс Зазыба, які вярнуўся пасля аб’езду навакольных вёсак.

– Можа, яшчэ й дарэмна людзей успалашылі, – сказаў камандзір атрада Дзянісу Яўменавічу. – Бачыш, немчура прыціхла. Панюхала трохі ды й стаіць амаль цэлага паўдня ў Вусаўцы.

– Думаеш, супакояцца?

– Можа, да заўтрага, – няўцям паціснуў плячамі Нарчук. – Але штосьці не падобна. Нешта большае мы сёння парушылі.

Мітрафан Ануфрыевіч меў рацыю. Ужо ў цемры з Вусаўкі вярнулася разведка – аказваецца, удзень партызаны падстрэлілі камандзіра эсэсаўскай каманды, і цяпер немцы пакідалі вёску. Партызанскаму атраду заставацца каля Бесядзі таксама не было сэнсу. Ва ўсякім разе, не вісець жа ластаўчыным гняздом тут над ворагам. Да таго ж не надта верылася, што немцы паварочвалі назад у Бабінавічы дзеля нейкага часовага манеўра. Страта камандзіра, няйначай, падзейнічала на іх. Таму пасля разваг партызаны недзе апоўначы вырашылі зняцца з засады. Нарчук павёў атрад у лагер. Зазыба, аддаўшы каня партызанам, падаўся дамоў у Верамейкі пешкі.

– Я па цябе прышлю, калі што, – сказаў яму наўздагон, акурат суцяшаючы, Мітрафан Ануфрыевіч. На другі і на трэці дзень у Верамейкі даходзілі чуткі, што карнікі яшчэ стаяць у мястэчку. Потым стала вядома, што ўся змешаная каманда СС нарэшце выступіла кудысьці за Камароўшчыну, дзе канчалася Беларусь і пачыналіся заходнія землі Арлоўшчыны. Людзі ў Забесяддзі ўздыхнулі ад гэтага з палёгкай, сталі зноў уваходзіць у звыклую каляіну сялянскага жыцця – найперш трэба было падганяць перад жнівом летнія работы, якія яшчэ заставаліся ў ліпені месяцы, а тады ўспомнілі раптам, што трэба рыхтавацца да паездкі ў Бабінавічы хрысціць дзяцей: і тых, што нарадзіліся ўжо ў вайну, і тых, што бегалі ў вёсцы нехрышчоныя ад савецкай улады.

XXI

Змаўляцца з бабінавіцкім папом Дворскім – калі везці дзяцей у мястэчка – верамейкаўскія кабеты хадзілі ажно колькі разоў. Спярша бацюшка быў у нейкім ад'ездзе, здаецца, хрысціў у Малым Хоцімску; пасля, якраз на Сымона і Юду, прымаў гасцей у сваім доме і нават не выйшаў да верамейкаўскіх кабет; на Кузьму і Дзям'яна хадакі з Верамеек таксама былі ў мястэчку, тады і змовіліся – на дзень Марыі Магдаліны, гэта на чацвёртае жніўня, калі ўжо з зяблівам скончана, а жніво яшчэ толькі пачынаецца.

Звычайна гэтай парой у іншыя гады ў Забесяддзі стаялі над зямлёй хмары, ішлі пераходныя дажджы, засцячы ад вачэй і поле і лес. Нездарма ў народзе кажуць: «Магдалена – вады па калена». Аднак сёлета было не так – ужо ад Іллі за адны суткі неба ачысцілася, стала падвышаным. Цыклон, які панаваў амаль над усёй Беларуссю, пайшоў далей, на ўсход.

Верамейкаўскія салдаткі ды і іншыя кабеты, у якіх былі малыя дзеці, шукалі хросных бацькоў. Дзяніс Зазыба з Андрэем Марухіным рашылі не ехаць у Бабінавічы – ці мала што магло здарыцца, калі ў Верамейках ведалі, што яны звязаны з паргызанамі, дык нішто не выключала, што ў воласці таксама маглі знаць пра гэта. Затое Масей даў згоду стаць хросным дзяцей у Ганны Карпілавай і былой старшыніхі Гаўрыліхі. Былі, вядома, і другія спробы наняць яго, аднак на сямейным савеце ў Зазыбаў вырашылі, што хопіць Масею і гэтых – у Ганны двое хлапчукоў ды ў Гаўрыліхі ажно чацвёра дзяцей, якіх належала хрысціць, бо іншыя двое хлопцаў – Хведзька і Мікола – лічылі ўжо сябе для такой справы пераросткамі.

Выехалі ў мястэчка ў познюю раніцу. Сабраўся на вёсцы цэлы абоз. Здаецца, нават на кірмаш у добрыя часы з Верамеек столькі народу не зрушвала. Праўда, раней падобныя выезды з вёскі і не надта бачны былі: звычайна канаплёўцы за раку выбіраліся сваім шляхам, гэта значыць, праз Халазонава кацішча і далей да руму; канечне, ехалі сваёй дарогай – паўз Гогалеву ніву, а тады скіравалі да вусаўскай плаціны, дарма што можна было карыстацца бродам; з Падліпак таксама свае дарогі былі, тут, як кажуць, абы толькі карацей. А скарачаць іх заўсёды была патрэба. Тым часам сёння ўсё складвалаея іначай. Паколькі верамейкаўскія кабеты, што хадзілі змаўляцца ў мястэчка, выступал і там за ўсю вёску, то і ехаць цяпер на хрышчэнне належала разам. Прынамсі, да гэтага ўжо ўчора схілілася большасць вяскоўцаў, уцягнутых у справу. Ды і тое сказаць – хто не меў дачынення да яе? Калі не сваё дзіця, то кум ці кума. У Масея было дзве кумы – на Гаўрылішыных дзяцей Анюта Прыбыткова, на Ганчыных – Таццяна Несцерава, яшчэ сама як дзіця. Але стаць хросным бацькам ці хроснай маці здаўна было ў пашане. Лічылася, што ў такім разе старонні чалавек станавіўся на ўсё жыццё хросніку калі не сапраўдным бацькам, то ўжо зусім не чужым чалавекам. Таксама і маці. Ну а кум з кумой… Пра іх у Забесядцзі хадзіў жарт: панеслі Іван ды Ганна хрысціць у царкву малога, а дарога была праз лес, от і гаворыць кума да кума: «Ты, кум, не баішся? Вунь хтосьці на дарозе стаіць!..» Збочылі ў бярозавы зараснік, каб схавацца, а як выйшлі зноў на дарогу праз колькі

часу, то ўжо без дзіця на руках; спахапіліся толькі ў царкве, што забылі малога… Гэты жарт не прамінуў расказаць учора і Мікіта Драніца, калі ўбачыў Масея на вясковай вуліцы. Абодва, як водзіцца, пасмяяліся, тым больш што Мікіта Драніца таксама меўся ў кагосьці быць за хроснага бацьку. «Ты бліжэй да мяне трымайся, – казаў ён Масею з выглядам чалавека, які шмат пра што ведаў. – Я етай справай не першы раз займаюся. Пасля пачостка будзе, як тэй таго, дак…» Цяпер Мікіта ехаў недзе спераду.

Малыя з Гаўрыліхай сядзелі на калёсах, дарослыя ішлі побач – Ганна Карпілава, Масей, Анюта Прыбыткова і Таццяна Несцерава. І ўсе адчувалі сябе ўжо больш, чым суседзі, дарма што Ганна Карпілава хрысціла чужых дзяцей і раней, напрыклад, у мінулую восень з Іванам Хахлом дачку Сахвеі Меляшонкавай. Але тады, здаецца, гэтай справе такога значэння не надавалася – звычайная рэч. Цяпер жа адбывалася штосьці падобнае на свята, можа, таму, што ехалі ў царкву цэлай вёскай, ва ўсякім разе, сярод верамейкаўцаў сёння адным часам назіралася і ўзварушэнне, якое ўвогуле непазбежна пры зборах у вялікую дарогу, тым больш ужо ў самой дарозе, і захапленне, альбо нешта падобнае на яго. Прынамсі, здавалася, што ніхто з Масеевых аднавяскоўцаў і думаць не думаў пра тое, што ехаць у Бабінавічы даводзілася амаль пад прымусам. Як кажуць, што богу пажадана, то людзям на карысць. Дык пры чым тут пагроза? Асабліва калі яна недзе далёка: вось ужо праўда – смерць не блізка, значыць не страшна, а як блізка падыдзе, не пазбегнеш. Ну а што датычыць самога Масея, то браўся ён хрысціць дзяцей з адчуваннем чагосьці дужа новага ў сваім жыцці, быццам гэтым самым ён браў на сябе дадатковы абавязак – сапраўды, жыў адзін і клопат меў толькі аб сабе, не лічачы маці з бацькам, а тут раптам чужы клопат, і ўспрымаўся ён не так, як звычайная падтрымка чалавека, работа ці спагада; не, у гэтым было штосьці глыбейшае, можна сказаць, жывейшае, што ўжо само па сабе выводзіла чалавека на новую ступень існавання. Вядома, падобныя адчуванні можна было звесці зноў да таго ж дадатковага абавязку, аднак аднаго гэтага для вызначэння яго цяперашняга стану не хапала. Проста можна было згадзіцца, разважаючы далей, што праз сённяшні дзень, праз гэту паездку, ён нанова моцна звязваўся і з Верамейкамі, і з яе насельнікамі, і наогул з усёй тутэйшай зямлёй.

XXII

З дзённіка баявых дзеянняў ахоўных войск групы армій «Цэнтр». 24.7. Нарада паходу аперацыі «Арол». Кальцо акружэння планамерна сціскаецца, праціўнік сістэматычна пацясняецца ў сярэдзіну катла. Камандзір дывізіі дакладвае, што часці падтрымліваюць сувязь адна з адной. У той час як на поўдні кальца праціўнік аказвае моцнае супраціўленне, на астатніх участках катла адбываюцца сутычкі толькі з баявымі аховамі і баявымі дазорамі. Паступіла паведамленне, што буйныя бандыцкія групы набліжаюцца да торфазавода «Асінторф» і іх разведка паявілася ўжо на торфапрадпрыемстве. Згодна з паведамленнем каменданта Смаленска, 237-ы ахоўны батальён на чыгунцы Смаленск – Віцебск арыштаваў двух партызан, што належаць маршаваму батальёну, які сфарміраваны пад Масквой і праз Асташкаў-Тарапец па лініі фронту перайшоў на тэрыторыю аператыўнага тылу. Аддзел № 1 «в» групы армій паведамляе, што 2-я танкавая армія па-ранейшаму не вяртае ў тыл ні 701-ы ахоўны батальён, ні 1-ю роту 432-га латышскага батальёна. Камандаванне 9-й арміі таксама пярэчыць супроць вяртання 222-га і 738-га ахоўных батальёнаў. 25.7. Павелічэнне тыражу і колькасці мясцовых газет на тэрыторыі тылу выклікае неабходнасць прызначэння цэнзара… 26.7. Аперацыя «Арол»: з баямі заняты Клічаў; праціўнік у катле адыходзіць на поўнач. Камандаванне армейскай групы паведамляе, што адказнасць за барацьбу супроць партызан на тэрыторыі Беларусі ўскладзена на рэйхсфюрэра СС. Мерапрыемствы па блакіраванні на граніцы праводзяць вермахт і пагранічная ахова. 28.7. Тэлефонная размова першага аддзела з аператыўным аддзелам 221-й ахоўнай дывізіі з прычыны прасочвання ў Чачэрскія лясы партызанскіх груп з-за лініі фронту. Не выключана магчымасць аперацыі на поўнач ад Чачэрска… 29.7. Паліцэйскі полк «Цэнтр» унёс прапанову аб правядзенні аперацыі «Паўночны полюс-III» адразу ж за аперацыяй «Паўночны полюс-I». Аперацыя «Паўночны полюс-III» адразу ж за аперацыяй «Паўночны полюс-I». Аперацыя «Паўночны полюс-II» у гэты час праводзіцца падраздзяленнямі 2-й танкавай дывізіі. Паступіла паведамленне аб планамерным разгортванні аперацыі «Арол». Спробы прарыву праціўніка з катла адбіты. 30.7. …Транспартная камендатура Мінска пастаянна патрабуе выдзялення канвойных і суправаджальных каманд. 31.7. Дыверсіі на чыгуначных лініях групы армій «Цэнтр» зноў узраслі… Выдадзены загад аб змене ўсіх савецкіх (рускіх і беларускіх) назваў на нямецкія. 1.8. Новы камандуючы 2-м ахоўным палком, палкоўнік Грау, з’явіўся да камандуючага генерала. Да камандуючага генерала з’явіўся таксама камандзір першага французскага батальёна 633-га пяхотнага палка маёр Лацроікс. Ноччу з 31.7. на 1.8. ажыццёўлена аперацыя «Паўночны полюс-III» затрыццаць кіламетраў ад Смаленска. 2.8. Аперацыя «Арол»: кальцо акружэння працягвае сціскацца… Усё мужчынскае насельніцтва на дарогах і ў вёсках арыштоўваецца… Можна разлічваць, што баявы батальён «Волга» больш не вернецца ў вопытнае злучэнне «Граўкопф», застанецца пры камандуючым. 3.8. Наведанне камандуючым генералам і начальнікам штаба 201-й ахоўнай дывізіі з мэтай абмеркавання на месцы надзвычай напружанага становішча, якое склалася ў

Полацкім раёне. Камандзір дывізіі сказаў, што ўсе намаганні, накіраваныя на барацьбу супроць партызан, застануцца дарэмныя да таго часу, пакуль не будзе спынены праход падмацаванняў праз «акно» ў лініі фронту на ўчастку 59-га армейскага корпуса. 4.8. Ноччу з 3.8. на 4.8. партызанская банда, узброеная цяжкой пяхотнай зброяй і артылерыяй, ажыццявіла нападзенне на чыгуначны мост праз Дрысу. Працягваюцца карныя акцыі супроць бандытаў і мірнага насельніцтва ў тых пунктах, дзе адбываюцца нашы баявыя аперацыі. Зноў выяўлена яўрэйскае насельніцтва, якое захавалася пры дапамозе мясцовага насельніцтва на тэрыторыі тышу: гэты раз карную аперацыю супроць яўрэяў намечана правесці сіламі мясцовай камендатуры ў Бабінавічах, туды звозіцца яўрэйскае насельніцтва з інптых месц.

XXIII

Зазыба ўжо думаў, што сёння на ўвесь дзень застанецца ў вёсцы, таму дачакаецца, вядома, і вяртання з Бабінавіч хрышчонага абозу. Тым часам ён нават работу прыдумаў сабе. Хоць што яе прыдумваць? Каля хаты ў гаспадарцы яе заўсёды хапае. Але Марфа ўжо каторы раз прасіла паправіць у агародзе расадніцу – кожную вясну гаспадыня сама спраўлялася там, мяняючы збуцвелыя дошкі, аднак цяпер, відаць, сапраўды была неабходнасць прыкласці да расадніцы мужчынскія рукі, нездарма ж Марфа Давыдаўна ажно раззлавалася – цябе, маўляў не дапрасіцца!.. І тым не менш перш чым ісці на гарод з сякерай ды рыдлёўкай, Дзяніс Яўменавіч заскочыў па завулку ў сваю лазню – учора мыліся, і там заставаўся непарадак, трэба было хаця збольшага прыбрацца. Так ён і зрабіў. Ды на гарод падацца ўсё роўна не давялося. Раптам па завулку праскакаў коннік, пастукаўся ў Зазыбавы весніцы. Дзяніс Яўменавіч адчыніў. То быў знаёмы партызан з атрада Нарчука, злашча што прозвішча Зазыба не помніў.

– Конь у вас ёсць? – спытаў партызан.

– Ёсць, – адказаў Зазыба, – як жа без каня ў гаспадарцы? А навошта?

Партызан не адказаў. Спытаў яшчэ:

– А сядло?

– І сядло знойдзецца, дарма што даўно не ездзіў верхам.

– То сядлайце. Мітрафан Ануфрыевіч кліча.

– Куды гэта?

– Паедзеце за мной, тады і пабачыце.

– Што за сакрэтнасць?

– Ніякай сакрэтнасці, – усё роўна як вінавата сказаў вершнік. – Атрад цяпер у Азёрным.

– І то радасць, а то я ўжо думаў…

Зазыба не дагаварыў, ён тут жа ўспомніў што на іхнім кані толькі што павезлі ў мястэчка хрысціць дзяцей. Сказаў партызану:

– Конь-то ёсць, аднак… У рабоце сёння.

– Вазьміце з работы.

– Не, гэта не такая работа, адтуль яго не забярэш.

– Ну, тады… – партызан задумаўся.

У гэты момант на ганак у двор, як заўсёды ў такіх выпадках, выйшла з сенцаў Марфа Давыдаўна.

– Што тама яшчэ? – аклікнула яна мужа.

– Ды вось, чалавек па мяне, – чамусьці ўсміхаючыся, павярнуўся да яе Дзяніс Яўменавіч.

– Дак заві ў хату.

– Не, тут спешная еправа.

Але Марфа Давыдаўна акурат як не паверыла, падышла да весніц.

– Дак што тута за спешная справа, што нават у хату няма як? – насуплена пазіраючы на партызана, сказала яна.

Тады і Зазыба нібыта спахапіўся.

– Ай і праўда, – сказаў ён партызану, – можа б, зайшоў?

– Малачка б дала, – палагаднела Марфа.

– Малачка… малачка можна і тут папіць, калі вынесеце, – усміхнуўся партызан. – Аднак я не за гэтым.

Марфа Давыдаўна зразумела, што яна тут як бы лішняя, але яшчэ трохі патапталася каля мужыкоў тады вярнулася ў сенцы.

Партызан сказаў:

– Дык што будзем рабіць без каня?

Зазыба развёў рукамі, але зусім без блазенства, нават са скрухай.

– Можа, папросіце каня ў каго з суседзяў? – падказаў партызан.

– Дык… – Зазыба пацёр пальцамі кончык носа. – Нават цяжка прыдумаць, у каго. Здаецца, усе паехалі ў Бабінавічы.

– Гэта чаму?

– Дык… – Зазыбу пэўна што не хацелася гаварыць, што верамейкаўцы падаліся сёння ўсёй вёскай у мястэчка хрысціць дзяцей, таму ён ажно замуляўся, прыкідваючы тым часам, у каго б сапраўды мог застацца ў двары конь.

Між тым з сенцаў зноў выйшла Марфа Давыдаўна, несучы аберуч гладыш і чысты ручнік на плячы; на гладышы стаяў карэц. Партызан адразу ўхапіўся за карэц, падставіў пад струмень малака, што пацякло з нахіленага гаспадыняй гладыша. Піў ён доўга, смакуючы, ажно колькі разоў падстаўляючы карэц, пасля гэтак жа доўга, усё роўна як напаказ выціраў ручніком ніжнюю частку твара, дарма што скроні і лоб таксама блішчэлі, узмакрэлыя ад сонца і хуткай язды на кані. Зазыбу якраз хапіла гэтага часу, каб рашыцца на далейшую размову.

– Я, канечне, папытаю ў вёсцы, хто мог бы пазычыць каня, – сказаў Дзяніс Яўменавіч, – але гэта… словам, за час, які патрацім на пошук, можна дабегчы да таго Азёрнага.

Партызан кінуў дзякуй гаспадыні, усміхнуўся з Зазыбавых слоў:

– Я – на кані. А вы будзеце следам бегчы.

– Ну што ж…

– Тады рушым.

Марфа Давыдаўна па старой звычцы спыталася ў Зазыбы:

– Куды ж ета?

– У Азёрны.

– Калі назад?

Зазыба паціснуў плячамі. Тады Марфа Давыдаўна спытала ў партызана:

– Калі вы яго адпусціце?

– Нарчук ведае. Ды, можа, сам бог Саваох.

Дзіўна, але гэта ўсё роўна як раззлавала Марфу Давыдаўну.

– Нешта вы дужа на бога спасылацца сталі?

– Пад богам ходзім, – усміхнуўся партызан.

Зазыба не стаў заходзіць у хату – сапраўды, што там?

Каб не мазоліць вяскоўцам воч, Дзяніс Яўменавіч не стаўтаксама выбіраць дарогу праз вёску, тым больш не адна яго воля была ў гэтым; выйшаўшы за весніцы, Зазыба павярнуу у завулку да могілак, адкуль вяла сцежка паўз вёску. Колькі часу яны рухаліся так – партызан на кані, Зазыба – пешкі. Але за могілкамі партызан запыніў каня, саскочыў з сядла.

– Сядайце, – сказаў ён.

Зазыба не даў сябе далей упрошваць, паставіў левую нагу ў пустое стрэмя і лёгка ўскочыў на каня. Думаў мала, усё глядзеў быццам зачараваны, на палеткі – ад Верамеек да Мамонаўкі і Кулігаеўкі, а тады проста да Азёрнага, мінаючы Зарэчча, што на беразе Бесядзі супроць Малога Хоцімска. Найбольш урадзіла сёлета жыта, яно жаўцела ўжо, гатовае класціся пад серп ці конную жатку, але стаяла пакуль, трымаючы ў каласах набухлае зерне. Каму яно дастанецца гэты раз? Добра, калі людзям, што сеялі!..

У Азёрным было людна. Але не за лік тутэйшых мужыкоў ды баб. Больш кідаліся ў вочы чужыя, няйначай, партызаны. Зазыба шмат каго ведаў у атрадзе, аднак новых байцоў за гэты час таксама паболела. Можа, з тае прычыны, што і Дзяніса Яўменавіча многія з партызан не адзін раз сустракалі ў Шурышчы, то і здзіўленне, здаецца, мала хто выказаў, убачыўшы яго на чужым кані.

Пасёлак Азёрны знаходзіўся, лічы ўжо, на самай мяжы з Расіяй; недзе за паўвярсты пачыналіся абшары сапраўды рускія – і па старым часе, і па цяперашнім; тут была даўняя граніца, якая не зруйнавалася з памяці нават у савецкі час. Ну, што раней гэтай мяжы, можна сказаць, людзі пільнаваліся, зразумела: граніцы заўсёды падзялялі на сваіх і чужых нават сваякоў; але ж у савецкі час дзяржава, якая засяродзіла ўсю сілу ў інтэрнацыянальнай Маскве, імкнулася калі не знішчыць, дык ужо згладзіць у свядомасці людзей такое паняцце, як граніца ў сярэдзіне дзяржавы, гэта значыць пасярод Савецкага Саюза; і толькі, бадай, амаль умоўны адміністрацыйны падзел, з яго мясцовымі, раённымі і абласнымі цэнтрамі, захоўваў адносна пэўнае ўяўленне калі не аб сапраўдным пагранічча, то хоць аб нейкім дзяржаўна-тэрытарыяльным сумежжы. І тым не менш граніца тут паміж Расіяй і Беларуссю была, дарма што, як кажуць, зусім празрыстая. З гэтага ж Азёрнага вока сягала ледзь не да самага Забор’я – ні лесу, ні пералеску добрага, нават дзіўна, чаму партызаны спыніліся, лічы, сярод поля.

Штабныя ў пасёлку стаялі ў хаце Хведара Пацюпы. Гэта Зазыба адразу зразумеў яшчэ як апынуўся ля коўрат, балазе, само паселішча вырасла пакуль невялікае, таму і вуліца цягнулася не за край, льга было нават ад коўрат палічыць на ёй з канца ў канец двары, можа, акрамя як у тых рукавах, што браліся колькі разоў і ўправа, і ўлева, акурат нарасці на дрэве. Дык хата Хведара Пацюпы якраз стаяла пасярэдзіне пасёлка і выпірала трохі на вуліцу; уласна кажучы, гэта была хата ягонага бацькі, Хведар сваёй

не будаваў, бо, здаецца, ужо даўно адбіўся ад вясковага жыцця, а загнала яго сюды зноў вайна.

Цяпер каля Пацюпавай хаты найбольш тоўпілася партызанскага люду, усё роўна як нечага чакалі там альбо дзівіліся з нечага. Яно і праўда, як праз хвіліну-другую высветлілася, дзівіліся. Пад'ехаўшы да натоўпу, Зазыба і сам нямала здзівіўся. Але яго здзіўленне было ўжо нечаканай збянтэжанасцю: пад плотам, звязаны па руках і нагах вяроўкамі, сядзеў збіты на восеньскі яблык, Брава- Жыватоўскі. На шыі і на твары ў паліцая не было жывога месца, скура быццам запяклася, а правае вока выцекла… Зазыба колькі часу, аднак не надта каб, нема паўзіраўся ў знявечанага аднавяскоўца; у галаву роем шуганулі думкі, пачынаючы з тае, дзе і як трапіўся верамейкаўскі паліцай партызанам, але радасці, што нарэшце Жыватоўшчык схоплены, Зазыба чамусьці не адчуў; больш таго, стала раптам сорамна, што сёй-той з прысутных ведае, што яны з адной вёскі… Між тым раней Зазыба нават не мог падумаць, што падобнае адчуванне магло ўзнікнуць у ім. Але ратавала Дзяніса Яўменавіча, што Брава-Жыватоўскі не падымаў галавы, сядзеў унураны і толькі час ад часу хрыпеў няйначай, ад болю ўсярэдзіне. Зазыба злез з каня, аддаў повад партызану, з якім прыехаў, і моўчкі, з нейкаю незнаёмай дагэтуль цяжкасцю патупаў да ганка.

Нарчук у хаце быў не адзін. З ім тут знаходзіліся Сцяпан Баранаў і Павел Чарнагузаў.

– Ты прыехаў, Дзяніс Яўменавіч, – не то спытаў, не то проста засведчыў камандзір атрада.

Зазыба сеў на ўслон спіной да сцяны, хацеў штосьці сказаць на камандзіравы словы, але той апярэдзіў:

– Бачыў свайго паліцая?

– Бачыў.

– Ён думаў, што доўга будзе хадзіць з яйцамі.

Зазыбу яшчэ цяжка было адысці ад збянтэжанасці, ад таго, што ўбачыў на вуліцы, таму ён цяпер нічога выразнага не вымавіў: нешта перашкаджала яму пераламіць сябе, і ён не ведаў чаму. Відаць, і Нарчук ужо таксама здагадаўся пра гэта, бо сказаў раптам, быццам дакараючы:

– Няма чаго шкадаваць, – ведаў, на што ішоў! Але я не за гэтым цябе паклікаў. У нас бяда большая. За падстрэленага ў Вусаўцы немца ў горадзе арыштавалі партызанскія сем'і. Вось мы сядзім тут і думаем.

Зазыба ўсё роўна як няверліва глянуў на камандзіра, тады перавёў позірк на камісара. Той кіўнуў галавой.

– А ты бядуеш пра паліцая, – дадаў Нарчук, акурат наўздагон.

– Супакойся, Мітрафан Ануфрыевіч. – Павел Чарнагузаў паклаў на плячо камандзіру закарэлую руку – вочы ў яго былі чырвоныя ці то ад кароткага сну, ці то ад гарэлкі, але ў кожным разе поўныя невымернай тугі.

Зазыба помніў ягоную сям'ю, заязджаў да Чарнагузава, калі быў па заданні партызан у Крутагор'і мінулай восенню, і жонку, і, здаецца, двух хлопчыкаў. Нарчуковых Дзяніс Яўменавіч нікога не бачыў. Ну, а Баранаў сваіх, казалі, паспеў

вывезці з Крутагор’я, цяпер жылі недзе ў эвакуацыі. Але ж не адных гэтых вярнуліся летась сем’і ў горад – былі там жонка і дзеці Данілы Афончанкі, таксама Дарашэнкі… Канечне, можна было нарэшце зразумець сённяшні стан партызанскіх камандзіраў, як кажуць, не давядзі бог… Тым часам Зазыба не хацеў штучнасці ці хоць бы якой знарочыстасці ў адносінах, бо што б ні сказаў у гэты момант, усё гучала б не так, як трэба; чалавеку ўвогуле не заўсёды трапляе адразу знайсці адпаведны тон у звычайнай сітуацыі, дык што тады казаць пра цяперашнюю. Таму Дзяніс Яўменавіч прапусціў міма і апошнія словы Нарчука. Аднак спытаў:

– Калі гэта здарылася?

– На другі дзень пасля вусаўскай аперацыі, – адказаў Зазыбу Сцяпан Баранаў – камісар, няйначай, павінен быў адчуваць сябе паміж камандзірам і начальнікам разведкі ніякавата, што яму пашанцавала з сям’ёй, аднак з выгляду гэтага не паказваў; да таго ж стаяў каля стала такім чынам, што прыцемак, які яшчэ не ўвесь быў высвечаны сонечным святлом у хаце, калі не зацяняў цалкам ягонага твару, то размываў выразнасць рысаў на ім.

– Дык гэта ўжо нямала часу прайшло, – нарэшце зноў азваўся Зазыба, пасля дадаў: – А мы і не чулі. – Гэтым вясковым «мы», зразумела, было сказана не толькі пра сябе.

Баранаў кіўнуў.

Нарчук тым часам заварушыўся за сталом, усё роўна як уладкоўваючыся зручней.

– Вось і не вер цяпер снам! – усклікнуў ён у адчаі. – У тую восень мне сон быў, нібыта жор сам сябе, сваё мяса еў. Выходзіць, што праўда!..

– Ты як скажаш!.. – уздыхнуў Павел Чарнагузаў.

– Як жа гэта здарылася?.. – паспрабаваў удакладніць Зазыба.

– А так і здарылася, што ўсіх нашых у адну ноч пабралі, – адказаў Павел Чарнагузаў.

– Цяпер немцы патрабуюць, каб мы з’явіліся ў райцэнтр, здаліся ім, а то паб’юць сем’і, – сказаў Нарчук. – Дык мы таксама вось пра што думаем, Дзяніс Яўменавіч.

– Ну-ну…

– Ці не ўдасца абмяняць нашых на каго-небудзь? На паліцаяў, напрыклад. Адзін ужо ёсць. Можна яшчэ сяго-таго злавіць.

– Патрэбны ім паліцаі! – паморшчыўся Павел Чарнагузаў. – Вось каб маёра таго не падстрэлілі, а ўзялі ў палон!

– З абменам нічога не выйдзе, – пацвердзіў Сцяпан Баранаў. – І ўвогуле, гэта не тая ідэя. Яна не дасць жаданага выніку. Гэта ідэя-фікс.

– А якая тады твая? – нездаволена глянуў на яго Нарчук.

– Каб жа я ведаў! – прызнаўся Баранаў. – Але гэта… Тут для іх стаўка вышэй за аднаго немца, нават за маёра-карніка. Ім выдаўся выпадак абезгаловіць цэлы партызанскі атрад. Як кажуць, гульня вартая свечак.

– А як па мне, то варта было даўно паклапаціцца пра вашыя сем'і, – са скрухай сказаў Зазыба.

– Сам жа ездзіў у Крутагор'е, – паціснуў плячамі Нарчук, – бачыў, што яны ўвесь час там пад наглядам.

– І ўсё-ткі, – сказаў Зазыба.

– Ну вось, ад каго не чакаў пачуць гэта, дык ад цябе! – з дакорам адгукнуўся Нарчук.

– Дзяніс Яўменавіч праўду кажа, – стаў за Зазыбу Баранаў.

– Ну так, табе лёгка гаварыць, – незалюбіў Чарнагузаў, – тваіх няма там!

– Вашы цяпер – гэта, лічы, і мае, – мякка, але ўпарта прамовіў Баранаў.

Нарчук тым часам адарваўся ад стала, павысіў голас:

– Не хапала, каб мы пасварыліся тут!

– А што, я няпраўду сказаў? – усё роўна як узбурыўся Чарнагузаў.

Хто яе цяпер ведае, гэту праўду!..

Чарнявы ад прыроды Мітрафан Ануфрыевіч выглядаў яшчэ чарнейшым і моцна спакутаваным; вочы яго правaліліся, быццам у яміны, блішчэлі здаўнелымі, акурат атрапінавымі слязамі. То ўжо быў зусім не той Нарчук, якога бачыў Зазыба апошні раз, перад засадай на Бесядзь. Дзіўна, але якраз гэтай перамены Дзяніс Яўменавіч не заўважыў адразу, як зайшоў у Пацюпаву хату. «Ну так, яму нялёгка цяпер, – паспачуваў Зазыба, – аднак жа… Некалі штосьці падобнае павінна было здарыцца».

Здаецца, Дзяніс Яўменавіч нарэшце вызваліўся ад таго цяжкага ўражання, якое зрабіла на яго нечаканая сустрэча, – гэта толькі сказаць – сустрэча, – з Брава-Жыватоўскім, асабліва паліцаеў выгляд, – і цяпер ён паступова пачынаў яскрава ўсведамляць становішча кіраўнікоў партызанскага атрада: яно было проста жахлівае, калі не горш; але даць нейкае рады сваім пабрацімам няздольны быў; разам з тым да яго прыходзіла таксама разуменне, што не толькі ад роспачы запрасілі яго сюды, хоць у небяспечным становішчы тапельцы звычайна хапаюцца і за саломінку.

Тое, што здарылася ў Крутагор'і з сем'ямі партызан, пагражала таксама трагедыяй і для атрада, магло моцна адбіцца на далейшым лёсе той справы, якую распачалі ў раёне. Пасля гібелі раённага падпольнага камітэта ўся надзея на барацьбу з акупантамі ўскладалася Дзянісам Яўменавічам спярша на групу Нарчука, пасля на цяперашні атрад. Між тым чамусьці дужа выразна прыйшла на памяць размова з Чубарам, які адчуваў, нават прадбачыў штосьці падобнае, дарма што да канца не гаварыў пра гэта.

Дзе Чубар?

Хадзілі розныя чуткі пра яго. Але ніхто дакладна нічога не ведаў. Радзівон быццам абсек за сабою канцы. Гаварылі, што хтосьці бачыў яго ў мястэчку сярод немцаў, аднак то былі толькі чуткі. Нічога пэўнага.

Пакуль у Пацюпавай хаце панавала маўчанне, Зазыба паспеў сягнуць думкамі і туды, і сюды, але душа яго засталася ўсё адно як на раздарожжы. Ён з цяжкасцю прымушаў сябе разабрацца ў сітуацыі і чым больш намагаўся рабіць гэта, тым больш

апынаўся ў роспачы. Яму было проста шкада і Нарчука, і Паўла Чарнагузава, ды і ўсіх крутагорскіх, якія трапілі ў аднолькавае становішча.

Між тым гаворка ў хаце праз якую хвіліну зноў аднавілася.

– Словам, трэба думаць і, хоць… – Нарчук не дагаварыў. Успомніў: – Колішні сон мой, здаецца, спраўджваецца…

– Кінь ты пра сон, – са злосцю сказаў на гэта Чарнагузаў.

– Сапраўды, сон, можа, тут і ні пры чым, – згадзіўся Нарчук, – але справы нашы дрэнь, дарагія таварышы. Самае жахлівае, што вызваліць сем'і мы не здольны цяпер. Там вялікі гарнізон. У лоб не возьмеш. А так…

Баранаў выйшаў на светлую палавіну хаты, пратупаў да печы, тады назад. Бадай, толькі ён здольны быў больш-менш спакойна разважаць, аднак таксама наўрад ці меў што карыснае падказаць, асабліва пры відавочнай знерваванасці сваіх таварышаў. Тым больш што да з'яўлення Зазыбы амаль усе варыянты збаўлення сем'яў з жахлівага становішча былі ўжо не адзін раз абмеркаваны. Але Баранаў усё яшчэ лічыў патрэбным шукаць выйсця, можа, нават не так шукаць, як не маўчаць, бо гэта магло ўспрымацца за звычайную адмежаванасць, нездарма ж Павел Чарнагузаў нават у прысутнасці Зазыбы сгірабаваў ускінуцца, можна сказаць, невядома за што на яго, быццам і праўда чалавек займеў перад ім віну тым, што паспеў сабраць сваіх у эвакуацыю раней.

Змераўшы колькі разоў падлогу ад печы да стала, за якім сядзелі Нарчук з Чарнагузавым, Баранаў раптам выказаў якраз тое, пра што думалі, няйначай, і іншыя, аднак гаварыць не адважваліся.

– Я маю ў запасе яшчэ адзін ход, – сказаў ён, – хоць, можа, гэта пакажацца вельмі незвычайным. Але такі ход можа спрацаваць і даць вынік. Я маю на ўвазе Рослаўцава. Трэба наладзіць з ім сувязь.

– Ты верыш Рослаўцаву? – зверавата глянуў на камісара сваімі чырвонымі вачамі Чарнагузаў. – Думаеш, ён зразумее нас і пойдзе насустрач?

– Калі ўсё прадумаць як след… – Баранаў паціснуў плячамі: ён пэўна што хацеў даць магчымасць паразважаць над сваёй прапановай астатнім; але ўсе насцярожана чакалі; тады камісар пачаў смялей: – Тут важна адразу высветліць, за што яго падчапіць. Напрыклад, ёсць жа ў яго родзічы і не ўсе яны жывуць у Крутагор'і. Урэшце, можна папаляваць за жонкай, дзецьмі… Раз яны на такое пайшлі, каб заложнікаў браць, то і мы маем поўную падставу.

– Значыць, шантаж?

– А называй гэта як хочаш, Мітрафан Ануфрыевіч! – адказаў Баранаў. – Што абмен, што шантаж, абы справа выгарала.

– Я не супраць, каб усё выкарыстаць, – стомлена сказаў Нарчук, – але таксама мала шанцу.

– А я б паспрабаваў – павярнуўся да Нарчука Павел Чарнагузаў. – Ва ўсякім разе, адмаўляцца няварта. Дзе мы набярэм паліцаяў на абмен? Ды і не стануць немцы доўга чакаць.

– Не, ім патрэбны мы з табой, Павел Ягоравіч, – пакруціў галавой Нарчук. – Паліцаі для іх такое ж смецце, як і ўсё іншае тут у нас. Я думаю, што і з Рослаўцавым… Словам, не стануць яны нават з-за начальніка раённай паліцыі справу з намі мець. Трэба звязацца са Скандзілавым. Можа, разам можна будзе напасці ўначы на турму. Неяк жа прасочымся ў горад, а там – бог бацька.

– Вось ужо не думаў, што ўсё так выйдзе, – уздыхнуў Чарнагузаў. – Праўда, у душы заўсёды чакаў што дабром не скончыцца. Значыць, у іх увесь час была свая тактыка. Пакуль мы не дужа актыўна дзейнічалі, яны і сем'і нашы не чапалі. А як атрад пачаў разрастацца ды ваяваць, адразу прад'явілі рахунак. А тут яшчэ трапіўся гэты немец на вусаўскім пераездзе!..

– Барацьба, – сказаў задуменна Нарчук. – Ды і чаго мы ўрэшце чакаем? Адно цешылі сябе!..

– Не ведаю, як вы, а я б дзейнічаў – азваўся Баранаў.

– Дзейнічаў дзейнічаў!.. – незалюбіў Нарчук. – Хто ж табе перашкаджае дзейнічаць? Улез бы ў нашы скуры, тады б!..

– А то я!..

Гаворка ўвесь час ішла цяжка, з надрывам, дарма што ўся яна складалася з разважанняў якія скіроўваліся на адно і тое ж, і ўсе былі заклапочаны аднолькава, але Зазыбу ўвесь час здавалася, што паміж прысутнымі ў хаце не хапала яшчэ кагосьці, можа, нават проста чужога чалавека, які б стаў вышэй над усімі; сам ён чамусьці сёння па-ранейшаму не ў стане быў падказаць людзям што-кольвеч пэўнае, хоць ужо і ўвайшоў цалкам у сутнасць справы. Зазыба зноў нібы засведчыў перад сабой у думках, што сапраўды гэтым людзям не пазайздросціш, тым больш – сваё гора і самому ж належыць агараць яго!.. Вайна, такім чынам, паказвала свой новы выскал, крывадушны і бязлітасны!.. Прыйшла раптам на памяць нядаўняя гаворка каля ранішняга вогнішча паміж Кузьмом Прыбытковым і Хведарам Пацюпам, калі той прыходзіў на луг па яго. Тады Кузьма нібыта прадбачыў штосьці падобнае, дарма што справа не датычыла таго, пра што ішла размова цяпер тут, у Пацюпавай хаце. Успомніў ён чамусьці і забітага паліцаевага сына ў Зацішшы. Тады, здаецца, Зазыба збіраўся нават пагаварыць з Нарчуком, бо мала разумеў чаму партызаны застрэлілі хлопца. Аднак сёння гэта ўжо не мела ніякага сэнсу. У кожным разе, не было надзеі, што ў такім стане людзі зразумеюць яго. Таму ён так і сядзеў адзінока, акурат безудзельны і абыякавы. А між тым, можа, як ніхто тут, ён разумеў, што мала было надзеі на выратаванне партызанскіх сем'яў. Ні адзін з варыянтаў вызвален ня заложнікаў не абяцаў поспеху. Яшчэ па грамадзянскай вайне Дзяніс Яўменавіч добра ведаў што абмен звычайна, як задумваўся, не ажыццяўляўся: то адзін бок нешта не захоўваў то другі да канца не прытрымліваўся абумоўленых правіл, а ў выніку – лішняя страляніна, дарэмныя ахвяры. Да таго ж Зазыба не верыў таксама, што Рослаўцаў стане дапамагаць партызанам у такой відавочнай справе.

Між тым Дзяніс Яўменавіч здагадваўся, што не на гэту параду паклікалі яго з Верамеек, Так яно і выйшла, але пасля ўжо, як у хату зайшоў Пацюпа. Разгарачаны, ён напіўся нагбом з вядра вады, аддыхаўся, выцер тыльным бокам рукі ўзмакрэлы лоб.

– Ну і гарачыня сёння! – сказаў тады ўбачыў Зазыбу: – І ты тут? Саўчук ўсё-ткі недзе заспеў цябе. Ну ды і я расказаў яму добра, дзе цябе шукаць.

Хутчэй за ўсё, што з'яўленне Пацюпы прыйшлося якраз дарэчы.

– Як з'ездзіў? – паглядзеў на яго Нарчук. Няйначай, з ягонай паездкай была нейкая таямніца, бо Пацюпа запытальна паглядзеў у адказ на камандзіра, затым акурат неўзнарок перавёў позірк на Зазыбу.

– Гавары, што тут ужо, – махнуў рукой Нарчук.

– Нявестка гатова ісці хоць зараз, – адказаў Пацюпа.

– А сам Раўнягін? Што Сідар пра гэта думае?

– Дык… – развёў рукамі Пацюпа. – Але не пярэчыў каб нявестка пайшла ўрайцэнтр.

– То і добра, – здаволена сказаў Нарчук і паглядзеў на Зазыбу. – Мы вось дзеля чаго пазвалі цябе сюды, Дзяніс Яўменавіч: не выключана, што атрад адсюль перабярэцца ў другое месца. У Чачэрскія лясы. Таму дадзім табе сувязь. Ты ў Сілічах Лукаша Пытаенку ведаеш?

– Здаецца, не, – паціснуў плячамі Зазыба.

– Ну, гэта і не так важна. Галоўнае – запомні, што пра нас ад яго неўзабаве пачуеш. А кал і раптам самому спатрэбіцца знайсці нас, то таксама да яго звернешся. Двор яго насупраць былой царквы. Так што…

– А не мог бы я памагчы чым у вашай бядзе? – спытаў Зазыба. – Я вось слухаю…

– Не ведаю, пакуль не ведаю.

Дзяніс Яўменавіч зразумеў, што заставацца далей у Пацюпавай хаце яму ўжо не было сэнсу, таму падняўся з услона. Затрымаўся на момант, тады ступіў да Нарчука, паклаў яму руку на плячо.

– Трымайся, Мітрафан, – сказаў ён. – І ты, Павел Ягоравіч. Ды і ўсе. Трэба спадзявацца – неяк абыдзецца.

Нарчук у адчаі пахітаў галавой:

– Адно што спадзявацца. Але нават самаму лютаму ворагу такога не пажадаеш!.. У мяне ўжо на целе сыпка выступіла!..

Праводзіць Зазыбу вызваўся Сцяпан Баранаў. Уласна, ён нічога не абяцаў, проста выйшаў з Дзянісам Яўменавічам на ганак, пайшоў па вуліцы поплеч.

Брава-Жыватоўскага ўжо не было каля плота – няйначай, партызаны кудысьці схавалі паліцая, каб з вачэй далей. Але для Зазыбы гэта было і дарэчы, бо другі раз не хацелася бачыць знявечанага аднавяскоўца, хоць Дзяніс Яўменавіч разам з тым разумеў, што пасля, як прыйдзецца жыць, можа, давядзецца нават пашкадаваць, што не перакінуўся цяпер словам. Таксама віна…

– Бачыце, Дзяніс Яўменавіч, у які пераплёт мы трапілі?.. – сказаў праз нейкі момант Баранаў.

– Ды ўжо ж…

– Нават баюся што і думаць, чым усё гэта можа скончыцца.

– Самае лепшае было б адбіць сем’і.

– А як гэта зробіш? Ды ладна, гэта ўжо не ваш клопат.

І ўсё-ткі Зазыба спытаў і пра Брава-Жыватоўскага:

– Дзе вы яго ўзялі?

– Перастрэлі па дарозе ў Бабінавічы. Відаць, ішоў з Верамеек. Прыцемкам. Праўда, дужа адбіваўся, але стрэліць не паспеў. Хацелі прывезці да вас у Верамейкі, каб прынародна судзіць за супольнасць з акупантамі, а тут гэта бяда. Ды вы не клапаціцеся, Дзяніс Яўменавіч, пра яго. Што зарабіў – тое і атрымае.

За коўратамі ў канцы пасёлка Баранаў яшчэ спытаў:

– Як жа ваш сын, што ён думае? Я гэта таму, што сустракаўся з ім некалі. Тады я ў Магілёве вучыўся, а ён у Мінску. Студэнтамі яшчэ былі.

– Яму таксама нялёгка.

– Цяпер усім цяжка, Дзяніс Яўменавіч, вайна. Чулі, немец зноў ачухаўся, папёр на поўдні?

– Чытаў лістоўку.

Зазыба падаў камісару руку, выйшаў да сцежкі пасярод высокага жыта і пакрочыў па тупкай, яшчэ трохі вільготнай ад колішніх дажджоў сцежцы.

Баранаў пасля гэтага доўга стаяў ля коўрат, пазіраў услед Дзянісу Яўменавічу, а тады павярнуў на вуліцу. Яму таксама было нялёгка, можа, горай, чым каму. Таму ісці назад, у Пацюпаву хату, яму не хацелася. Ён мог нават растлумачыць чаму, але, бадай, толькі сабе, другім не стаў бы цяпер гаварыць.

Тым часам Зазыбу таксама адольвалі згрызотныя думкі. Яшчэ ў мінулую восень Дзяніс Яўменавіч не чакаў што партызанская барацьба стане набываць такія жудасныя формы. Значыць, мала хто з яе выйдзе без гора і слёз. Да таго ж не быў бы Зазыба таксама бацькам, каб не ўспомніў пры гэтым сам пра Масея, на долю якога пакуты наогул чамусьці выпалі не з таго боку. Сёлетняй зімой Зазыба ўсё ж даў сябе ўгаварыць выслухаць сына пра ўсё, што з ім здарылася, пра суды, турмы і лагеры і цяпер шмат чаго ведаў з таго, аб чым страшна было нават падумаць, не тое што сказаць каму… Але ж нездарма кажуць – кажух з-за вошай не кідаюць!.. Цяпер трэба было думаць, як бараніцца ад чужога нашэсця, як ратаваць краіну.

XXIV

З канаплёўскага канца Верамеек дарога ў Бабінавічы спярша вяла праз Халахонава хацішча. Іэта адна назва, што хацішча. Месца тое, дзе некалі жыў Халахол, пра якога ў Верамейках ужо нічога не ведалі, дзічэла цяпер недзе ў лесе, але мясцовасць вакол усё яшчэ называлася так. Была тут некалі і рэчка, што цякла з верамейкаўскага возера. Толькі і ад яе дасюль засталіся ўсяго дзве сажалкі, дарогу паміж якіх часта гацілі, утвараючы грэблю, якой хапала звычайна да вялікіх дажджоў. Таму без перашкоды праехаць сёння пашанцавала толькі першым вазам. Пад колы наступных верамейкаўцам зноў давялося насіць алешнік, балазе без сякеры ў вялікую дарогу тутэйшыя людзі ніколі з вёскі не выбіраліся. Затрымка на Халахонавым хацішчы выйшла хоць і нядоўгай, аднак пасля грэблі, каб паспець да прызначанага часу ў мястэчка, шкадаваць коні ўжо не было як. І тым не менш у Бабінавічы верамейкаўцы патрохі спазняліся. На Бесядзі каля рума зноўдавялося стаяць – раптам абоз перастрэлі нейкія ўзброеныя людзі. Іх было двое. Пачалі прыставаць да вяскоўцаў – маўляў куды ды адкуль? А хтосьці ўзяў ды прызнаўся – едзем усёй вёскай хрысціць дзяцей. Здавалася б, што асаблівага? Але ж не – маўляў заварочвайце коні назад! Ну і пайшло-паехала. Першыя ўзбурыліся верамейкаўскія кабеты, тады пачалі патрохі высоўвацца наперад мужыкі. Усчалася ледзь не бойка. Над румам павіс бязладны крык і лямант. Збоку, няйначай, магло здавацца, што чужынцы не вытрымаюць, пачнуць страляць. Аднак да гэтага не дайшло. Незнаёмыя адступілі, амаль з жахам пазіраючы на ўзбураных верамейкаўцаў

Масею не давялося прыняць удзелу ў патасоўцы, бо не з’явілася ў гэтым патрэбы, але ён нечакана здзіўлены быў гэтакай рашучасцю сваіх аднавяскоўцаў. Аказваецца, калі людзі разам ды заадно, то і ўзброеная перашкода ні па чым. Нават Мікіта Драніца, які пачакаў на другім баку Бесядзі Масееў воз, і той быў у захапленні – во бабы, як тэй таго, дак бабы!

– Ды ўжо ж, – чамусьці няпэўна, але з выразнай насмешкай сказала яму на гэта Гаўрыліха, што ўсю дарогу, нават на грэблі, не выпускала з рук лейцаў.

Затое Ганна Карпілава гучна засмяялася з Мікітавых слоў:

– Дак што ж нам рабіць, Аляксеевіч, калі мужыкі?..

– А што мужыкі? Што мужыкі? – зачасціў Драніца.

– Сам жа, нябось, пад калёсы схаваўся?

Мікіта, відаць, не чакаў, што такім чынам трапіць на язык бабам, таму пачаў пераводзіць размову на іншае, няйначай, ведаючы, што сапраўды лепшы метад абароны – нападзенне.

– Ета ж ты вінавата, Ганна, што етыя бадзягі прычапіліся да нас.

– Чаму ета? – адразу натапырылася жанчына.

– Дак, як тэй таго… – Пэўна, шукаючы падтрымкі, Драніца кінуў позірк на Масея.

– Ну-ну!

– Сама ж не дурніца, – адважыўся сказаць Драніца. – Няйначай, ета нейкія сябры-таварышы твайго Андрэя? Во калі б і прымак твой, як тэй таго, паехаў з намі, дак і етыя не чапіліся б.

– Калі б ды каб, як тэй таго!.. – перадражніла Ганна. – Дак Андрэю ж няма калі ездзіць. Ды і не яго ета дзеці. Цяпера во Дзянісавіч у іх за бацьку будзе. А што? Хросны часам бывае лепей нават за свайго, роднага!

Мікіта зноў зірнуў на Масея, падміргнуў яму, а тады засмяяўся:

– Дурня знайшла, як тэй таго. Як даваць, дак!..

Гаворцы, якая пачалася за Бесяддзю паміж Мікітам Драніцай і канчанскімі кабетамі, ужо няцяжка было пераскочыць на варожасць, Масей гэта адчуў, як Ганна Карпілава пачала налівацца злой чырванню, таму сказаў дакорліва:

– Навошта так, Мікіта Аляксеевіч?

Гаўрыліха таксама падхапіла Масееву строгасць:

– Пабойся бога, Мікіта, дзеці ж на возе!

– А яму, етаму Мікіту!.. – грэбліва адвярнулася Ганна. Мікіта нарэшце зразумеў, што і цяпер не ў тое рэчышча трапіў, лепей бы маўчаць увогуле, бо сёння, бадай, хоць якая дурнота між людзей непройдзе, што ні кажы, ада царквы едуць; але паколькі помслівая настырнасць няскора міналася ў чалавека, ён і тут адказаў з фанабэрыстасцю вясковага недарэкі:

– Я не да яе прыйшоў, як тэй таго!

– Да каго б ні прыйшоў, – сказала на гэта Гаўрыліха, – аднак няварта забываць, што і на воўка здараецца памоўка.

Тады Мікіта, распасціраючы рукі, дурасліва кінуўся да маладзейшых, да Анюты Прыбытковай і Тані Несцеравай:

– Во, мае любачкі, во, мае дзевачкі!

Тыя не сталі разбягацца, адно пырснулі смехам; Мікіта ўсё роўна як пратачыўся паміж іх, абхапіў абедзвюх рукамі і нібыта павіс на плячах.

– О, што гэта вы такое робіце, дзядзька Мікіта? – усклікнула Таццяна Несцерава, спрабуючы адкараскацца ад яго.

Анюта была дужэйшая, таму цярпела Мікітаў цяжар, але ўсё роўна як вінавата бліскала вачамі спадылба на Масея.

Мікіта трохі паблазнаваў такім чынам, затым супакоіўся, выпусціўшы з абдымкаў дзявок. Дзіўна, але Масею чамусьці ажно непрыемна зрабілася, што Драніца гэтак блізка і нахабна падступаўся да Анюты Прыбытковай. Але ўмешвацца больш не стаў адно нахмурыўся, адстаў трохі ад воза. Тут да яго адразу падбег Гаўрылішын сярэдні хлопчык, якога маці звала Іванкам, а за ёй і ўсе астатнія ў вёсцы. Хлопчык даверліва падаў Масею руку. Яны сябравалі ў гэтае лета – Іванка і Масей. Здаецца, дзе толькі не пабывалі разам. І ў лесе, і ў полі. Сямігадовы Іванка ўжо скончыў да вайны клас, умеў чытаць, а найбольш – пытацца, хоць таксама даваў калі можна сказаць так, кансультацыі па грыбах, ягадах; ведаў здаецца, ці не ўсё пра птушак, лёгка расшукваў гнёзды; словам, быў хлопчык цалкам вясковы, з душой чулай і ўражлівай. Масей шкадаваў, што верамейкаўскія дзеці за ваенны час адстануць ад

школы, бо ддя Верамеек так і не знайшлі ў воласці настаўнікаў, таму нават адзін час сам хацеў узяцца вучыць, але яго адгаварылі ў сям'і. Затое гэты Гаўрылішын хлопчык заўсёды мог задаволіць ад яго сваю цікаўнасць ва ўсім.

Між тым абстаноўка каля воза, на якім ехала Гаўрыліха, паступова набывала ранейшую супакоенасць, як гэта і належыць сярод суседзяў, нягледзячы, што Мікіта Драніца ўсё яшчэ не адставаў ад іх. Пазіраючы на Масея з Гаўрылішыным хлопчыкам, усе неяк падабрэлі адразу, нават Ганна Карпілава не пашкадавала ўсмешкі, дарма што свае дзеці сядзелі на возе.

Кажуць, да бога дарога лёгкая. Аднак, калі на праўду, дык таксама колькі чаго на гэтай дарозе!

За другім лесам, які пачаўся за паўвярсты ад Бесядзі, верамейкаўскаму хроснаму абозу трэба было паварочваць направа, каб выехаць на гасцінец, што ўжо проста кіраваў адтуль да мястэчка. Але тыя, што ехалі наперадзе абозу, выбралі цішэйшую дарогу – паўз дуброву, тады паўз местачковы сад. Ну а раз паехалі па ёй першыя падводы, то ўжо наступныя пацягнуліся за імі самі па сабе. Раней гаварылі: цішэй едзеш – далей будзеш. Але тады гэта гучала ў сэнсе – марудней, павольней. Цяпер слова «цішэй» набывала і іншае, можа, найпершае значэнне. Таму «цішэйшая дарога» і прывабіла верамейкаўцаў, а не гасцінец, на якім самога д'ябла можна сустрэць. А цяпер – тым больш. Дык навошта гэта чалавеку, які наважыўся з самім богам сустрэцца?

За садам ужо відаць стала мястэчка з яго бляшанымі дахамі і белакаменнай царквой, няхай што і без пазалоты на купалах. Але выгляд яе тым не менш зрабіў моцнае ўражанне на верамейкаўцаў. Паязджане заціхлі, нібыта ва ўтрапенні, і потым ажно нямала часу прайшло, пакуль зноў загаманілі, быццам сапраўды прамінулі страшнае месца; нават дзеці і тыя пачалі саскокваць з вазоў; надзетыя па-святочнаму, хто ў што, але дзеля сённяшняга дня хлапчукі і дзяўчаткі ўсё роўна як спяшаліся пахваліцца ды паказаць сябе не толькі дарослым, але ўсяму беламу свету.

Дзіўна, але Масею ў гэтыя хвіліны здавалася, што з Верамеек дарога сапраўды пралягае к богу, а ён вядзе туды за руку малога чалавечка, пад вышэйшай апекай якому, магчыма, пашанцуе выжыць у бязлітаснай вайне, каб пасля паглядзець на яе вачамі, удумлівымі і пільнымі.

А ў Бабінавічах тым часам мясцовыя паліцаі пад камандаю Гуфельда расстрэльвалі яўрэяў. Кроў мяшалася з вадой і цякла па рэчцы Чарняўцы насустрач верамейкаўскаму хроснаму абозу. Ад яе на лузе шалелі каровы…

XXV

З дзённіка баявых дзеянняў ахоўных войск групы армій «Цэнтр». 5.8. Камандуючы генерал вылецеў у 286-ю ахоўную дывізію. Аперацыя «Арол», як мяркуюць, будзе закончана раніцай. 8.8. (Клічаўскі раён). Генерал загадаў адразу ж за аперацыяй «Арол» пачаць новую буйную аперацыю ў раёне Смаленск – Віцебск – Орша. Філіял галоўнага камандавання вермахта, генеральная кватэра паведамляюць аб ясабходнасці падрыхтоўкі да перадыслакацыі на тэрыторыю армейскага тылу 4-х матарызатаных і 10-ці танкавых дывізій. 8.8. Паведамленне венгерскай акупацыйнай групы-каманды: партызанская банда колькасцю ў тысячу чалавек пасля бою каля Сямёнаўкі, на чыгуначнай лініі Навазыбкаў – Ноўгарад – Северск, накіравалася на тэрыторыю тыла армейскай групы «Поўдзень»… У Крутагор'і (раённы цэнтр) былі ўзяты ў якасці заложнікаў сем'і мясцовых партызан з банды Нарчука, якая дзейнічала на тэрыторыі раёна. Партызанскім кіраўнікам было прапанавана з'явіцца ў ваенную камендатуру з павіннай, аднак яны спалохаліся адказнасці. Заложнікі расстраляны… 11.8. Без асаблівых падзей. 12.8. Камандуючы генерал і начальнік аператыўнага аддзела вылецелі ў 1-шы батальён 638-га французскага пяхотнага палка на нараду аб выкарыстанні французаў для аховы сплаву па Бярэзіне… 1.9. У выніку дыверсій на чыгуначнай лініі на поўдзень ад Полацка затрымліваецца адпраўка 406-га пяхотнага палка на аперацыю № 33.5.9. Начальнік штаба адбыў для даклада галоўнакамандуючаму групай армій «Цэнтр». Прычынай паслужылі дыверсіі на вялікіх чыгуначных магістралях… 11.9. Па распараджэнні групы армій на запытанне галоўнага камандавання выкладзены пункт гледжання на падрыў моста праз раку Начу. Пункт гледжання гл. ўдадатку № 80.22.9. Бандыцкая дзейнасць на усёй тэрыторыі тылу ўзрастае ў жахлівых памерах. Дывізіям дадзены адпаведныя ўказанні. 23.9. Начальнік аператыўнага аддзела падпалкоўнік ад'язджае ў адпачынак. 26.9. Камандаванне ваенна-паветраных сіл «Усход» паведаміла, што паводле загада рэйхсмаршала часці 1-га егерскага парашутнага палка, якія раскватараваны на тэрыторыі тылу, павінны прымаць удзел у ахове чыгунак… Паступіў загад галоўнага камандавання групы армій «Цэнтр» аб падпарадкатанні рускіх батальёнаў ва ўсіх адносінах ахоўным дывізіям. Прычынай для выдання падобнага загаду з'явіўся бунт у батальёне «Бярэзіна». 3.10. Падпалкоўнік генеральнага штаба Хофман накіраваны для кантроля дарогі па абодва бакі Клясціц, афіцэр артылерыі пры штабе падпалкоўнік Райхельм з такім жа заданнем камандзіраваны ў Асіповічы, начальнік адцзела 1 «Д» капітан Фёрстэр накіраваны з аналагічным заданнем на чыгуначную лінію Рагачоў – Магілёў. 221-я ахоўная дывізія паведамляе аб арышце пяці савецкіх парашутыстаў на паўднёвы захад ад Гомеля. 18.10. У галоўную кватэру корпуса прыбыў новы камендант Смаленска генерал-маёр Пёль. 19.10. Ад галоўнага камандавання групы армій паступіў загад аб тым, каб па загаду фюрэра ва ўсіх буйных гарадах пачалі ствараць часці баявой гатоўнасці, у якія трэба ўключаць усіх раскватараваньгх ваеннаслужачых вермахта і ваенна-паветраных сіл і ў выпадку неабходнасці выкарыстоўваць для абароны гарадоў. 25.10. Генерал-маёр Гартман, камандзір 390-й дывізіі па будаўніцтву палявых умацаванняў, прызначаны

начальнікам гарнізона Магілёва. 28.10. У загадзе па корпусу яшчэ раз нагадваецца, што ў перыяд з 1 па 7.11. неабходна разлічваць на ўмацаванне бандыцкай дзейнасці, таму што савецкае камандаванне абвясціла заклік адзначыць такім чынам 25-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі. З 18.00 хвалевыя налёты рускай авіяцыі на Смаленск. Звыш 150 бомбаў скінуты пераважна на паўночны раён. 4.11. Нарада ў начальніка генеральнага штаба з начальнікамі аператыўных аддзелаў ахоўных дывізій. Абмеркатаны пытанні: бандыцкая абстаноўка на тэрыторыі армейскай групы; ахова чыгунак; аперацыі супроць партызан; рускія батальёны; мабілізацыя на працу ў Германію; работа разведаддзелаў; узаемадзеянне з гаспадарчымі ўстановамі. 9.1 і. 1-я пяхотная брыгада СС дакладвае, што ў раёне Чэрвеня знаходзяцца вялікія запасы збожжа і жывёлы – неабходна арганізаваць тэрміновую вывазку. 17.11. Транспартная камендатура Мінска паведамляе пра наступнае. Цягнік Мінск – Полацк быў абстраляны бандай, узброенай цяжкой зброяй. У часе бою перабіта ахова. 25.11. Снег. Завіруха… 1.12. Напружаная абстаноўка на ўчастку фронту пад Белай. 2.12. Прыбыў палкоўнік Карэці, накіраваны камандаваннем сухапутных войск на пасаду камандзіра 700-га рускага батальёна асобага прызначэння. Начальнікам нямецкай каманды ва ўсходнім батальёне «Прыпяць» прызначаны капітан запаснога палка «Цэнтр» Хольфельд. 6.12. Паступіў загад армейскай групы, што з 7.12. ахову дарогі Смаленск – Віцебск да лініі размежавання 9-й арміі прымае на сябе група Шэвалеры. 7.12. Меры па мабілізацыі насельніцтва для работы ў Германіі набываюць усё большую жорсткасць. Людзі ад мабілізацыйных кампаній уцякаюць у лясы. Пісьмы тых, хто працуе ў Германіі, аб дрэнных адносінах і дрэнным харчаванні, адпуджваюць моладзь, таксама дарослых ад паездкі ў Германію. 8.12. У сувязі з частковым адыходам нашых войск група армій аддала загад аб новай граніцы паміж тылам і 4-й арміяй. Раёны Ершачы, Рослаў і Стадолічы адыходзяць да 4-й арміі. 9.12. Група армій паведаміла, што Лёзненскі раён 11.12. будзе ўключаны ў тыл армейскай групы «Цэнтр». 10.12. Паступіў загад фюрэра аб нарыхтоўцы запасаў ддя ўсіх апорных пунктаў. 17.12. У Смаленску ў камандуючага генерала адбылася кансультатыўная нарада аб становішчы на франтах. Германскія войскі спыніліся на Волзе ў раёне Сталінграда. З пераменным поспехам ідуць баі на Каўказе. У паласе групы армій «Цэнтр» таксама без перамен. Стабілізавалася абстаноўка пад Ленінградам. 286-я ахоўная дывізія паведамляе, што абоз 633-га ўсходняга батальёна, які накіроўваўся з Магілёва ў Бярэзіна, бясследна знік па дарозе. Камандзір 700-га ўсходняга батальёна асобага прызначэння асабіста выехаў у Бярэзіна. Адцадзены загад аб прысваенні часцям 201-й і 286-й ахоўных дывізій наймення дывізіі «Рьгхтэр». 20.12. З дывізіі «Рыхтэр» паступіла паведамленне аб правядзенні аперацый «Вальдвінтэр» («Цёмны лес»). 600-ты казацкі батальён і 2-гі грэнадзёрскі полк перакідваюцца ў раён баявых дзеянняў чыгуначным транспартам. Усе астатнія часці – пешьгм парадкам. 21.12. З камандаваннем ваенна-паветраных сіл «Усход» ажыццёўлены перамовы аб паветранай ладтрымцы дывізіі «Рыхтэр». 24.12. Паведамленне камандзіра 700-га ўсходняга батальёна аб абвастрэнні абстаноўкі ў раёне Бярэзіна – Чэрвень. 27.12.

Дывізія «Рыхтэр» сутыкнулася з моцным супраціўленнем праціўніка, асабліва на цэнтральным участку. 28.12. Зачытаны новы загад фюрэра аб бязлітаснай барацьбе супроць бандыцкіх фарміраванняў у тыле ўсіх груп армій. 30.12. Зноў абвастрылася абстаноўка ў раёне 221-й ахоўнай дывізіі. З поўдня спрабуюць пранікнуць паміж Іпуццю і Бесяддзю вялікія партызанскія сілы. 31.12. Адбылася нарада генерала фон Шэнкендорфа з фельдмаршалам. Фельдмаршал павіншаваў ахоўныя войскі з Новым годам. Над армейскім тылам стаяць халады. Завеі. Мы зноў зімуем у большасці сваёй у Беларусі ў абдымках лютых марозаў і варожых настрояў.

1963 г.

Іван Навуменка

Апавяданне «Сямнаццатай вясной»

Мне ішоў семнаццаты год. Мая семнаццатая вясна была вельмі багатай на кветкі, на цеплыню, на тыя цудоўныя дні, калі, здаецца, сама зямля спявае песню сонцу, жыццю, высокаму сіняму небу.

Даўно ўжо з усіх кветак я найбольш палюбіў бэз. Бэз расцвітаў якраз у час нашых школьных экзаменаў. Букет ружова-сініх кветак заўсёды стаяў на стале, засланым чырвоным абрусам. За сталом сядзелі строгія экзаменатары, а на стале былі акуратна раскладзены білеты. Зверху білеты былі ўсе аднолькавыя. Які выбраць?

Падыходзячы да стала, я заўсёды хваляваўся. У такія хвіліны я, вядома, не звяртаў увагі на бэз, хоць стаяў ён у мяне пад самым носам. Затое пасля экзамену пах бэзу да самага вечара п'яніў мне галаву...

Ніколі яшчэ бэз не расцвітаў так, як сёлета. Ён сінеў цэлымі азяркамі па садах, палісадніках, у нашым станцыйным скверыку.

Але бэз у гэтую вясну на першым часе не хваляваў мяне і не радаваў зусім. Упершыню за многія гады і мне, і маім сябрам не трэба было здаваць экзаменаў. Не было і настаўнікаў, якія вучылі нас у школе. Адны з іх пайшлі на фронт і ваявалі пад Ржэвам, а можа, пад Севастопалем, а другія таксама не задавалі нам урокаў, бо на фасадзе нашай школы трапятаў чужы сцяг з чорнай свастыкай.

У нашай школе цяпер размясціўся нямецкі камендант. Ён не думаў аб тым, што нам трэба вучыцца. Камендант дбаў аб другім. Ён павесіў загад, за невыкананне якога дакляраваў адну толькі смяротную кару. Камендант абяцаў смерць кожнаму, хто захоўваў агнястрэльную зброю, хто распаўсюджваў злосныя чуткі пра непераможную германскую армію, хто мог паявіцца на вуліцы ў начны час.

Што датычыць мяне і маіх сяброў – Цішкі Дразда, Міколы і Сымона Біцюгоў, – то мы пакуль што добрасумленна выконвалі толькі апошні пункт загаду. Як гэта і было дазволена, мы расхаджвалі па вуліцы толькі да адзінаццаці гадзін вечара.

Часцей за ўсё мы наведваліся ў наш станцыйны скверык. Пад вечар там збіралася моладзь. На лавачках сядзелі хлопцы і дзяўчаты. Яны размаўлялі і нават іншы раз смяяліся, быццам на свеце не было ні каменданта, ні вайны. Іншы раз у скверыку рыпаў гармонік, а на заасфальтаванай яшчэ да вайны пляцоўцы наладжваліся танцы. Ніхто з нашай чацверкі ні разу не пайшоў танцаваць. Мы лічылі, што весяліцца, танцаваць у такі час, калі ідзе вайна, калі ліецца кроў, проста ганебна.

– Здраднікі, – са злосцю пазіраючы на тых, што танцуюць, шаптаў Мікола Біцюг. – Знайшлі час весяліцца – гранату б сюды.

– Не трэба раскідвацца гранатамі, – падсякаў Міколу Сымон Біцюг. – Дый у цябе ж яна толькі адна.

Мікола, які заўсёды выказваў самыя крайнія погляды, насупліваўся і змаўкаў, а ў вачах у Цішкі Дразда запальваліся вясёлыя агеньчыкі. Цішка наогул любіў пасмяяцца, любіў вясёлыя гісторыі, і цяпер пасля Сымонавых слоў ён, мабыць, маляваў сабе

карціну, як доўгі і няскладны Мікола шпурляе гранату ў дзяўчат, што танцуюць на заасфальтаванай пляцоўцы.

Нягледзячы на рознасць поглядаў і характараў, мы ўчатырох сыходзіліся ў адным: нельга сядзець склаўшы рукі, трэба дзейнічаць. Мы лічылі сябе баявой групай, і на гэта былі ўсе падставы. На нашым узбраенні ўжо быў вінтовачны абрэз, дзве лімонкі з капсулямі, з паўпуда аманалу і кавалак бікфордавага шнура. Мы былі заклапочаны планамі далейшага ўзбраення і ў хуткім часе збіраліся аб'явіць германскаму фашызму бязлітасную вайну.

А пакуль што мы з горда ўзнятымі галовамі праходзілі па скверыку, скоса пазіраючы на нямецкія франтавыя зводкі, павешаныя на дошцы аб'яў. Па праўдзе кажучы, асаблівай увагі на гэтыя зводкі не звяртаў ніхто. Дый весялосць тут, у скверыку, працягвалася нядоўга. У палавіне адзінаццатай на алеі паяўлялася здаравенная постаць паліцэйскага Кірылы Сёхмана, і ўсе збіраліся дамоў. Кірыла тут, у скверыку, адчуваў сябе вельмі значнай асобай. Ён быў важны, надзьмуты і раз-пораз пазіраў на свой наручны гадзіннік, які раздабыў нядаўна.

Цішка Дрозд у такія хвіліны сіпеў прыдушаным смехам, і мы, каб быць далей ад граху, шыбавалі дадому. Мы добра ведалі, што за птушка Кірыла Сёхман. Да вайны стаяў ён пры дзвярах клуба кантралёрам, але абакраў касіра, і яго засудзілі. А цяпер ён зноў аднекуль прыплыў. Не варта было з такім тыпам звязвацца.

Адным словам, на нашу агульную думку, усе мы ўчатырох былі добрымі хлопцамі. Мы ні разу не паддаліся на прыманку маладосці, не пайшлі танцаваць, не зналіся з дзяўчатамі. Мы рыхтавалі з сябе барацьбітоў, бязлітасных, мужных, зацятых. І хоць на зямлі была вясна, хоць так прывабна расцвітаў бэз, мы трымаліся стойка, адкладваючы сардэчныя справы на час пасля вайны.

Першым здрадзіў нашай агульнай справе я. У гэты час, калі ішла вайна і калі там, на фронце, паміралі сапраўдныя героі, я, чалавек, які не зрабіў у жыцці яшчэ ніводнага подзвігу, закахаўся самым ганебным чынам.

Пачалося ўсё вось з чаго. Аднойчы ў скверыку я ўбачыў незнаёмую дзяўчыну. У белай сукенцы, з белым капялюшыкам на галаве, яна мне адразу кінулася ў вочы. Яна была зусім не падобная на дзяўчат, якіх я сустракаў дагэтуль. Трымалася яна смела, незалежна і, шчабечучы нешта вясёлае, звонка смяялася.

Я ўбачыў белую тоненькую дзяўчыну і ў першы вечар, і ў другі, і ў трэці. І ўвесь час яна была вясёлая, смяялася.

Першы час я праходзіў міма дзяўчыны з самым незалежным выглядам. Я не кінуў у яе бок ніводнага прыязнага позірку, стараўся на яе не паглядаць. Я лічыў яе асобай пустой, нікчэмнай, не вартай увагі наогул. У думках я вінаваціў тоненькую дзяўчыну за яе бестурботны смех, за яе звонкае шчабятанне. Як магла яна смяяцца ў такі час!

Вядома, дзяўчына ў белай сукенцы нічога не ведала пра мае абвінавачванні. Яна кожны вечар прыходзіла ў скверык, яе жывыя сінія вочы весела пазіралі на свет, і яна, нібы назло мне, звонка шчабятала.

Я быў поўны абурэння і гневу. Справа ў тым, што хоць я яшчэ і не зрабіў ніводнага подзвігу, але ў глыбіні душы лічыў сябе здольным на гераічныя ўчынкі. У

сваім уяўленні я маляваў сябе ў розных геройскіх ролях. Вось я на вачах у дзяўчыны забіваю нямецкага каменданта, забіваю Кірылу Сёхмана, забіваю цэлы дзесятак фашыстаў, нарэшце, падаю забіты сам... Белая дзяўчына перастала смяяцца, у яе вачах захапленне, роспач, пакута. Яна плача, вінаваціць сябе за свой смех. Яна становіцца другой...

Адзін раз дзяўчына прыйшла ў сквер з кветкамі. У яе руках быў бэз і белая чаромха. Яна трымала кветкі беражна, як трымаюць якую-небудзь вельмі каштоўную рэч. Яшчэ праз колькі часу я пачуў, як яна спявала. Яе голас можна было пазнаць сярод тысячы другіх галасоў... І вось хутка я адчуў, што мне няма куды схавацца ад жывых сініх вачэй з-пад белага капялюшыка, ад звонкага шчэбету, ад гэтай цудоўнай белай птушкі. Яе вобраз стаяў перад маімі вачамі, дзе б я ні быў, што б я ні рабіў. Я ўжо не мог пражыць дня, каб пад вечар не схадзіць у скверык, не пабачыць тоненькай дзяўчыны.

Я стаў задумлівы, разгублена адказваў на пытанні сваіх сяброў і свой душэўны стан не змог схаваць ад іх вачэй.

– Ты гэта што ж, Цімох, можа, хочаш у кусты? – грозна падступіў да мяне аднойчы Мікола Біцюг. – Нешта ты круціш, хаваешся ад нас. Кожны вечар у скверы тырчыш. Ты вады не муці, кажы праўду. Спалохаўся?..

Я ледзь не кінуўся на Міколу з кулакамі, каб змяшаць яго з граззю за яго дурныя здагадкі. Цішка Дрозд мірыў нас пасля гэтага цэлую гадзіну. Сябры ўздыхнулі лягчэй, бо ўбачылі, што адступацца ад іх я не збіраюся. І ўсё ж я не мог расказаць ім праўды.

Хутка я ўжо ведаў імя дзяўчыны – Стася. Нядаўна яе прыслалі аднекуль працаваць у нашу аптэку. Там жа ў аптэцы, у доміку, схаваным у засені бэзавых кустоў, Стася і жыла.

Мне было непрыемна, што Стася працуе ў нямецкай установе. З другога боку я апраўдваў Стасю тым, што аптэка нарэшце не такая ўжо фашысцкая ўстанова. Можа, Стасю прымусілі працаваць, можа, без працы ёй нельга. Яна ж жыве адна, без бацькі і без маці...

Я нячутна паўтараў імя Стасі тысячу разоў у дзень, яно звінела ў маіх вушах як музыка. Я мог думаць пра сваю дзяўчыну цэлымі гадзінамі, прыдумваў розныя варыянты нашай размовы, нашай сустрэчы. Але пакуль што ніякай размовы не было, я не сказаў сваёй каханай ніводнага слова. Я прыходзіў у скверык, і калі заўважаў Стасю, сэрца ў грудзях пачынала біцца, нібы птушка, злоўленая ў сіло.

Аднойчы, калі я праходзіў міма лавачкі, на якой сядзела Стася са сваімі сяброўкамі, мая дзяўчына акінула мяне хуткім позіркам. Мне здалося, што гэты позірк быў насмешлівы. Мой твар гарэў ад сораму, мне было ў той вечар балюча і крыўдна як ніколі. Не сказаўшы нічога сваім сябрам, я падаўся дадому. І тут, па дарозе да роднай хаты, на адзіноце, я неяк нечакана ўпершыню паглядзеў на самога сябе збоку, чужымі вачамі.

Так, выгляд мой быў зусім не фацэтны, ён ніяк не падыходзіў для таго, каб знаёміцца з гэтай чыстай, белай дзяўчынай. На нагах у мяне было штосьці накшталт чаравікаў. Але што гэта былі за чаравікі! Гэта былі нейкія чарапахі, шырокія, распоўзлыя. Чаму я не заўважаў раней, што мае штаны даўно час павесіць на пудзіла ў агародзе? Гэтыя штаны мелі дзве латкі на каленях і ў дадатак яшчэ два агромністыя

акны ззаду. Вырас я і з сарочкі; тое, што ў мяне былі закасаны рукавы, мабыць, мала дапамагала справе. Эх ты, кавалер, закаханы рыцар!..

У тую ноч я не спаў. Выхаду са свайго становішча я не бачыў ніякага. Святочных гарнітураў у мяне не было, і зарабіць або купіць іх па тым часе нечага было і думаць.

Памятаю, што такія разважанні мяне нават супакоілі, а тоненькая чыстая дзяўчына зрабілася для мяне крыху далёкай і чужой. «Няхай ходзіць у сваёй чысценькай сукенцы, – помсліва думаў я. – Справа ж не ў капялюшыках і сукенках. Знайшлася княгіня!..»

Некалькі дзён я не хадзіў у скверык. Якраз у гэты час разнесліся чуткі, што немцы думаюць аднаўляць чыгунку. Чуткі гэтыя пацвердзіліся, бо на чыгунцы ішла ліхаманкавая работа. Мы вырашылі, што надышоў час дзейнічаць. Мікола Біцюг высушыў аманал на печы, Цішка Дрозд сцягнуў старую бабуліну кофту з шырокімі рукавамі. Адзін рукаў мы напакавалі аманалам, зашылі і гэтую нашу міну схавалі да часу. Было аднагалосна вырашана, што сваёй мінай мы ўзарвём масток кіламетры за чатыры ад станцыі. Масток хоць і невялікі, але ў вызначаны дзень немцы па нашай чыгунцы не паедуць. Паедуць яны жыватамі...

Якраз у гэты час адбыліся падзеі, якія прымусілі нас яшчэ больш сур'ёзна паставіцца да задуманай дыверсіі. У ясную вясновую ноч ні з таго ні з сяго згарэла парня. На гэтай парні гнулі вобад, які адпраўлялі некуды на нямецкіх машынах. Апрача гэтага, у некалькіх месцах нашага раённага гарадка былі расклеены антыфашысцкія лістоўкі, надрукаваныя на машынцы. Гэтыя падзеі нас і ўзрадавалі, і засмуцілі.

Мы былі перакананы, што спалілі парню і расклеілі лістоўкі партызаны, якія ноччу прабраліся ў гарадок. З невялікім партызанскім атрадам, які дзейнічаў кіламетраў за сорак ад нас, у другім раёне, мы мелі ўжо сувязь, хоць і нетрывалую. Калі ўсё гэта зрабілі нашы партызаны, то чаму яны наважыліся абысціся без нас? Сякія-такія паслугі мы ж ім ужо рабілі. Можа, партызаны нам больш не давяраюць?

Каб вывесці ўсё гэта на чыстую ваду, Сымон Біцюг адправіўся ў госці да сваёй цёткі. Цётка, канечне, была тут толькі прыклёпам, Сымон пайшоў на сувязь з нашымі партызанамі.

Мы ж утраіх таксама не спалі ў шапку. У гэтыя дні мы выказалі вялікае жаданне нанасіць сваім маткам арэхавых кійкоў на фасолю і пад памідорныя кусты. Кійкоў мы нанасілі на пяць гадоў уперад, але справа зноў жа была не ў кійках. Арэшнік рос якраз недалёка ад мастка, які мы наважылі пусціць у паветра. Масток і подступы да яго мы агледзелі добра, самаробную міну занеслі і схавалі паблізу ад мастка.

Былі ў нас поспехі і ў справе самаўзбраення. Нам удалося разжыцца старой заржавелай вінтоўкай, якую мы ўтраіх чысцілі і прыводзілі ў належны выгляд цэлы дзень. Цяпер мы ў дадатак да абрэза мелі сапраўдную вінтоўку, з якой не сорамна было прыйсці да партызан.

Праўда, на грунце асабістай прыналежнасці вінтоўкі паміж намі адбылася спрэчка. Мікола Біцюг патрабаваў, каб вінтоўку аддалі яму. Свае патрабаванні Мікола падмацоўваў тым, што ён здаў норму на поўнага варашылаўскага стралка, а мы з

Цішкам – толькі на юных стралкоў. Міколу мы далі суровы адпор, і ён, пакіпяціўшыся, быў вымушаны здацца.

Адным словам, цяпер мы адчувалі сябе больш упэўнена. Мы чакалі Сымона, чакалі вестак ад партызан, і ва ўсіх нас быў прыўзняты, гераічны настрой. У адзін з тых дзён я зноў пайшоў у скверык і зноў убачыў Стасю.

Праходзячы паўз яе, я стараўся не пазіраць у яе бок. І не вытрымаў. А яна – мне гэта ніколькі не здалося – паглядзела на мяне зусім сур'ёзна. Яна не насміхалася з мяне! Я зноў стаў вясёлы, расказваў цікавыя гісторыі сваім сябрам, і яны смяяліся. Я хацеў, каб Стася звярнула ўвагу на наш смех, на мяне. Здаецца, яна глядзела ў мой бок.

Раптам я прыдумаў выхад, адзіны, які толькі мог быць на свеце. Мой бацька, чыгуначнік, яшчэ да вайны выпісаў сабе форменны сіні касцюм. Гэта быў выдатны касцюм, нездарма з бацькавага заробку вылічвалі за яго пакрысе амаль цэлы год. Цудоўнае сіняе сукно было, мабыць, самага вышэйшага гатунку. Бацька толькі і паспеў адзін раз на Першае мая перад самай вайной апрануць касцюм. Цяпер касцюм быў клапатліва схаваны, як самая каштоўная рэч у хаце, і неаднойчы ў цяжкія часіны я чуў, як асцярожна маці намякала, што за яго, каб прадаць, далі б хлеба пудоў дзесяць...

Разлічваць на тое, што мне дадуць апрануць сіні касцюм, не прыходзілася. Прасіць аб гэтым было б проста сорамна. Я наважыў зрабіць усё інакшым парадкам. Прасцей за ўсё было вынесці адзенне ў адрыну і там паціху апрануцца, а пасля скінуць. Тым больш што ўвесь касцюм мне быў не патрэбен. З мяне хопіць адных сініх штаноў. І нічога ім за адзін вечар не зробіцца...

План мой быў разлічан да дробязей. Увесь наступны дзень я гарэў ад нецярпення, уяўляючы, як падыду да Стасі, як загавару з ёй, што ёй скажу. Пад вечар мне ўдалося ажыццявіць першую частку майго плана як найлепш. Я выйшаў агародам у новых сініх штанах, з-пад якіх зусім не відаць было маіх чаравікаў-чарапах, у вымытай кашулі. Я быў ужо ў скверыку і чакаў, што вось-вось прыйдзе мая белая дзяўчына...

Але прыйшла не Стася. Прыбег узбуджаны Мікола Біцюг і рашуча пацягнуў мяне ў цёмны куток сквера.

– Цімох, пайшлі, – уладарна сказаў ён мне. – Заўтра раніцай першы цягнік пойдзе. Хутчэй...

Што ж, трэба было ісці...

Я нічога не сказаў Міколу наконт новых сініх штаноў, а ён, усхваляваны, нават не заўважыў іх. Трэба было зайсці яшчэ па Цішку Дразда. Ён жыў на Вакзальнай вуліцы, якая цягнулася поруч з чыгункай, і ад яго нам лепш за ўсё было выходзіць, бо не трэба было перасякаць пераезда.

Дачакаўшыся, пакуль зусім сцямнее, мы выйшлі. Мы захапілі з сабой абрэз і дзве гранаты, вінтоўка была схавана ў лесе. Да арэшніку мы зрабілі вялікі крук на поплаве, потым ішлі жытамі. Мае новыя сінія штаны прамоклі ад расы да самых каленяў, але я лічыў, што гэта дробязь – высахнуць. Ішлі мы смела, бо ў нас была зброя.

Нам прыйшлося чакаць у арэшніку да самай поўначы. Запелі першыя пеўні, дзесьці ў кустах трывожна закігікала нейкая птушка. Тады мы, прыгнуўшыся, пабеглі да мастка. Мы ведалі, што чыгунка ахоўваецца не надта. Узброеная варта была толькі ў будках. У паўкіламетры ад мастка гарэў агонь, і каля яго сядзелі дзядзькі з доўгімі кійкамі.

Гэта была так званая «добраахвотная» варта чыгункі, у якую фашысты заганялі сілком.

Мікола з вінтоўкай залёг на насыпе, а мы з Цішкам завіхаліся каля міны. Пад мастком было сыра і глуха. Здаецца, прайшло вельмі многа часу, пакуль мы прыладзілі бікфордаў шнур і ўставілі запал. Чыркнулі сярнічкай, і шнур затрашчаў, выпускаючы цэлыя пучкі іскраў. Мы беглі ад мастка што было сіл.

Выбух засціг нас ужо ў арэшніку. Гэта быў страшэнны выбух. Здаецца, асвяціўся ўвесь лес. Мы ўпалі, потым зноў пабеглі ў самы гушчар. З будкі пачалася бязладная стральніна. Мы адбегліся, мабыць, кіламетраў пяць. З мяне пот ліў цурком, а мокрыя сінія штаны лёпалі па нагах так гучна, нібы хто-небудзь біў па голым целе далоняй.

Каля будкі ўжо не стралялі, і мы прыпыніліся. Трэба было вызначыць цяпер, дзе мы. Моўчкі мы прайшлі цугам, адзін за другім, яшчэ з паўкіламетра і выйшлі на сенажаць. Над ёй густой шчыльнай заслонай вісеў туман. Гэта была Гарадзінка, асушанае яшчэ да вайны балота. Тут мы адшуквалі некалі яйкі дзікіх качак, кнігавак, пекураў, аднойчы збіралі стрэленыя гільзы пасля вайсковых манеўраў. Сенажаць мы ведалі, і можна было тут, у кустах, схаваць нашу зброю. Але рабіць гэтага ніхто з нас не захацеў. Упершыню ў жыцці мы адчулі, што значыць зброя ў руках. З ёю можна было ісці смела, не баючыся ніякага д'ябла. Са зброяй мы крочылі гаспадарамі па роснай топкай Гарадзінцы.

Недалёка ад Цішкавага двара быў вялікі кар'ер. Тут капалі гліну ўсе, каму яна была патрэбна. Мы якраз і збіраліся спусціцца ў кар'ер, каб абмеркаваць нашы далейшыя паводзіны. Але тут здарылася нечаканае.

– Стой, рукі ўгору! – раўнуў нехта немым голасам, і ў некалькіх кроках ад нас проста з зямлі вырасла чорная постаць. Мы рванулі назад, а той, што крычаў, стрэліў. Куля свіснула каля самых маіх вушэй. Мы ўпалі на зямлю, а чорная постаць, клацаючы затворам, насоўвалася на нас. Я чуў, як Мікола спусціў курок. Асечка. Постаць упала. У тое ж імгненне Цішка бухнуў са свайго абрэза, а я, ірвануўшы чаку, шпурнуў лімонку...

Страшэнны, дзікі крык падняў мяне з зямлі і кінуў у кар'ер. Гэты крык стаяў у маіх вушах, калі я каціўся на дно кар'ера, калі поўз агародамі, прабіраючыся праз парканы і драцяныя агароджы. Маіх сяброў побач не было. Я вырашыў паўзці дадому. Увесь шлях да роднай хаты думка ў мяне працавала чотка і ясна. Я рабіў перадышкі, вымяркоўваў, кудой мне найлепш прабірацца.

І вось я ў сваёй адрыне. Я адразу схаваў прамоклае адзенне і перааапрануўся ў старое. Дзесьці там, на станцыі, усё яшчэ раз-пораз стралялі. Захліпаючыся, брахалі сабакі. За сцяной глуха ўздыхала карова, пераможваючы жвачку. Рыпнулі дзверы, і да хлява, ледзь чутна ступаючы босымі нагамі па зямлі, падышла маці. Не адчыняючы варот, яна спалоханым шэптам дакарала мяне за тое, што я не шаную ні сябе, ні сям'і.

А я, стараючыся гаварыць сонным голасам, спытаў, дзе гэта і чаму страляюць. Няхай пакуль што нічога не ведае маці. Ёй будзе так спакайней.

Калі развіднела, я агледзеў сваё адзенне. Ад новых сініх штаноў засталося адно толькі званне. Яны падраліся ў некалькіх месцах, а на левай калашыне не хапала вялікай латкі. І тут толькі я адчуў, што ў мяне баліць нага. Галёнка была распаласавана, мабыць, аб калючы дрот.

Увесь дзень я, здаецца, зусім не думаў пра Стасю. Пасля ўсяго, што здарылася, яна стала маленькай, непрыкметнай і адышла ў думках кудысьці далёка-далёка. Я трывожыўся аб сябрах. У поўдзень мне расказалі, што на наш гарадок рабілі налёт партызаны, што яны ўзарвалі мост і паранілі Кірылу Сёхмана, які пад раніцу сканаў. Па загаду каменданта на станцыі і каля школы спешна будаваліся дзоты. Пра сваіх сяброў я не пачуў нічога страшнага і паступова супакоіўся.

Нямецкі поезд у той дзень не пайшоў...

А яшчэ праз два дні да мяне завітаў Сымон. Ён вярнуўся з сувязі і прынёс добрыя весткі. Партызаны пра нас ведаюць, і сувязь цяпер будзе рэгулярная.

– Мікола за новую міну ўзяўся, – паведаміў Сымон. – Ён на сёмым небе і цябе, ого, як хваліць...

Я паказаў Сымону нагу. Рана нарывала, я лячыў нагу сам як мог. Сымон занепакоіўся.

– Ты нікуды не выходзь, – папярэдзіў ён. – Я прынясу ўсё, што трэба. І наогул нам не трэба разам хадзіць.

Ён вярнуўся толькі пад вечар. Прынёс бінты, ёд, нейкую слізкую мазь. Я паглядзеў на сябра здзіўленымі вачамі.

– Мы, брат, дурні вялікія, – бінтуючы мне нагу, гаварыў Сымон. – Ходзім табуном, самі ж стараемся выдзяляцца, у вочы кідацца. Людзі ў сто разоў разумней за нас робяць. Ты думаеш, парню спалілі і лістоўкі раскідалі партызаны? Такія ж, як і мы, партызаны, толькі не такія вароны.

– Сымон, – не вытрымаў я, – скажы, ты хадзіў у аптэку?

Сэрца ў мяне тахкала так моцна, што, мабыць, пачуў і ён.

– Хадзіў, але ты нічога не ведаеш, – жорстка паглядзеў на мяне Сымон. – Нічога не ведаеш, зразумеў? Запамятай гэта...

Не, цяпер я ведаў усё. Ведаў, якім быў сляпым і недалёкім. Такую дзяўчыну хацеў прывабіць сінімі штанамі. Эх ты, дурніца... Тоненькая белая дзяўчына паўставала цяпер у маіх вачах у нейкім новым, казачным святле.

У гэтую вясновую ноч я зноў пачуў, як прыемна пахне расцвіўшы бэз. Ён пахнуў так заўсёды, калі мы хадзілі здаваць экзамены.

1956 г.

Апавяданне «Хлопцы самай вялікай вайны»

I

Пасля Бранска стала ясна, куды кіруецца эшалон. Станцыя Фаянсава, горад Кіраў, палявая пошта 07121. Хлопцы, каго тыдні на два прызвалі раней, паспелі прыслаць адтуль трохкутнікі.

Станцыя Бранск-I, як і Бранск-II, – у развалінах. Сякія-такія задымленыя каробкі прыстасаваны пад памяшканні ваеннага каменданта, перасыльнага пункта, санпрапускніка, прадпункта. Пуці адрамантаваны. На іх безліч вайсковых эшалонаў. Бранск-I, як і Бранск-II, – станцыі ўсё-такі вялікія.

Віктару Пасашку, можна сказаць, шанцуе. Па-першае, трапіў у добрую цяплушку. Двух'ярусныя з неачэсаных дошак палкі на месцы, на падлозе ніхто не спіць. Ёсць жалезная пячурка з выведзенай у столь, а не ў акно трубой. Трэба толькі ўвесь час падкладваць дровы, бо калі хоць на гадзіну пячурка астывае, то на сценах вагона, асабліва ля дзвярэй і па кутках, адразу выступае белая намаразь. Але вагон дружны, дровы хлопцы дастаюць. У ход ідуць снегаахоўныя шчыты, уцалелыя парканы і нават дошкі з чужых вагонаў.

Пасашка задаволен і тым, што едзе са знаёмымі і блізкімі людзьмі. У вагоне Саша Чарняўка, Васіль Міхальчук – хлопцы, з якімі Віктар вучыўся ў адным класе. Адам Пасашка, стрыечны брат, сусед, жылі на адной вуліцы...

Але ёсць у вагоне людзі, знаёмствам з якімі Пасашка асабліва ганарыцца. Гэта партызаны. Іх, бадай, палавіна. З местачковых хлопцаў, якія едуць у вагоне, толькі адзін Віктар быў у партызанах, і па гэтай прычыне ён як бы звязвае маладых местачкоўцаў з тубыльцамі навакольных сёл, вёсак, якія паспелі панюхаць пораху. Зрэшты, і раней так было. Саша Чарняўка, Васіль Міхальчук, якія партызанскіх даведак не маюць, тым не меней у небяспечных справах удзельнічалі. Сярод іх быў і Пасашка, з той толькі розніцай, што ён і тады трымаў сувязь з партызанамі...

II

У Бранску-II удала дасталі вядро кіпятку. Быў ужо надвячорак. Эшалон стаяў. Хлопцы сталі развязваць торбы і сідары, каб падсілкавацца.

Пасашка ўжо месяц, як зноў савецкі. Ім валодае дзіўны, узбуджаны і прыўзняты настрой, хоць сякія-такія рэчы, якія ён назіраў у мястэчку за гэты месяц, яму не зусім падабаюцца. Ён заўважыў: партызаны і наогул усе тыя, каму прыйшлося хадзіць не прамымі, а звілістымі, пакручастымі сцежкамі вайны, не надта раскрываюцца перад байцамі, камандзірамі, што мералі да прыдняпроўскага мястэчка крывавыя кіламетры ад самай Волгі. Вайскоўцы іх проста не разумеюць. Яны гордыя пройдзеным шляхам, перамогамі і як бы забываюць, што акрамя сорак трэцяга года быў сорак першы, калі гэтая самая дарога пятляла адступленнямі, акружэннямі, калі па ёй панура пляліся доўгія калоны ваеннапалонных.

У сваю чаргу партызаны не надта прызнаюць тых, хто, чым мог, шкодзіў немцам, не адрываючыся ад сям'і і роднага паселішча...

Зрэшты, вагон прымірыў супярэчнасці. Наперадзе вайна. Немцы вунь зноў захапілі Жытомір, ірвуцца да Кіева...

Вячэраюць, разбіўшыся на купкі. Так здарылася, што Віктар раскрывае брызентавы сідар не ў кампаніі стрыечнага брата Адама ці аднакласніка Сашы Чарняўкі, а ў кружку, які як бы ўзначальвае шыракатвары, павольны ў рухах партызан Сяргей Рагазуб. Можа, таму, што разам з гэтым Сяргеем яму аднойчы прыйшлося ляжаць у засадзе, а ў час асенняй блакады ён суткі прастаяў побач з ім па шыю ў балотнай твані... Дый пуставатыя сідары ў партызан. Местачкоўцам сяго-таго паклалі ў торбы маткі. А ў партызан толькі тое, што далі на паёк у ваенкамаце. Са сваіх хат яны нічога не маглі ўзяць, бо хаты і вёскі спалены... Павячэралі някепска. Сухары, ваенкаматаўскі шпіг, у якім на скурцы стаяць сінія казённыя пячаці, дамашнюю цыбулю запілі падсалоджаным кіпятком. Эшалон усё яшчэ стаіць. Відаць, у першую чаргу прапускаюць тыя эшалоны, якія кіруюцца на фронт. А іх маршрут – у тыл, можна і не спяшацца. У праём дзвярэй, калі хто-небудзь адчыняе іх, каб вышмыгнуць па патрэбе на двор, глядзіць цёмная снежаньская ноч. У вагоне ж пячурка да чырвані распалена. Нехта зайграў на нямецкім губным гармоніку. А ўвогуле трэба спаць. Можа, іх апошняя ноч у эшалоне.

Віктар заснуў імгненна. Прачнуўся, бадай, пазней за ўсіх – ад таго, што замерзлі калені. Усю дарогу, калі пячурка астывала, у яго мерзлі калені. Убачыў: дзверы расчынены, у вагоне бязладны рух. Значыць, прыехалі...

Тыя, хто прарочыў, што станцыі Фаянсава з ходу не праскочыць, не памыліліся. Гэта была іменна яна – некалькі прысадзістых, на скорую руку адноўленых каменных будынін, зацярушаныя снегам домікі пасёлка. А вакол лес – векавечныя сосны, хмурыя, урачыста стоеныя елкі. Туды, у лес, вяла шырока пратаптаная ў снезе дарога...

Калону пастроілі па чатыры ў рад, далі каманду рушыць. Убогі, непрывабны выгляд мела яна. Дзіравыя ватоўкі, шэрыя сялянскія світкі, латаныя-пералатаныя кажухі. У гэта быў апрануты пераважна люд цывільны. Закураныя шынялі розных армій – чырвонаармейскія, нямецкія, мадзьярскія, славацкія і яшчэ Бог ведае якія неслі на сваіх плячах партызаны. Сярод абутку былі лапці, чуні, апоркі, розных відаў і фасонаў разбітыя чаравікі і, мабыць, на тры ці чатыры сотні людзей ніводнай пары прыстойных ботаў. Можа, за гэты ўбогі выгляд на ўсіх тых, хто крочыў у калоне, з нечуванай лютасцю накінуліся бабы, што гандлявалі тут жа, на станцыі, піражкамі з мерзлай бульбы, махоркай і малаком.

– Сволачы праклятыя!.. Нашы даўно галовы палажылі, а яны толькі ідуць!..

– Ваякі няшчасныя! Спалі з жонкамі на печы...

– Глядзі, ражку наеў, патрыёт...

– Будуць хваліцца потым, што ваявалі...

– Вочы б мае не глядзелі на вас, ірадаў...

– Дэзерціры...

– Кулачугі...

– Пад спадніцамі ў жонак хаваліся...

Віктар, калі вучыўся перад вайной у дзевятым класе, не раз спрабаваў сабе ўявіць, як пойдзе ў армію. Тых, хто паспеў пайсці ў авеяныя ружовым мроівам мірныя гады, праводзілі з аркестрамі, гармонікамі, прамовамі. А табе, браце, вось які аркестр!..

Дні тры мабілізаваных трымалі ў санітарным ізалятары. Ізалятар гэты – як схованка ляснога пустэльніка. Некалькі вялікіх халодных зямлянак, з земляными, засланымі яловымі лапкамі нарамі. Харч – тым жа сухім пайком...

Нарэшце каманда:

– У лазню!

Старэйшыя, тыя, хто ў свой час паспеў прайсці прызыў, ведалі, што гэта значыць. На хаду зрывалі з сябе шынялі, кажухі, пінжакі, нават сарочкі, тапталі, хавалі ў снег. Некаторыя ляцелі ў лазню ў адных парудзелых сподніках. На Віктару была ніштаватая паддзёўка, якую ён раздабыў, калі грамілі ўласаўскі абоз. Куртачка-талстовачка мела бліскучы замок-маланку. Свае скарбы Віктар таксама старанна затаптаў у снег.

З лазні выходзілі прыгажунамі – хоць у каноплі стаўляй. Шынялі – БВУ, ватнікі, гімнасцёркі – БВУ... Асабіста для Віктара гэта значыла, што атрымаў стары, доўгі, з прапаленым крыссём кавалерыйскі шынель, вышмаргаваныя да глянцу, няпэўнага колеру ватнікі і адносна прыстойную гімнасцёрку. Ватнік, праўда, быў караткаваты, а гімнасцёрка шылася як бы на волата. Чаравік увогуле не ўзяў...

Дык вось ён, запасны полк, палявая пошта 07121. Новыя, у струнку пастаўленыя баракі, пасыпаныя жоўтым пясочкам дарожкі, шырокі пляц, на якім пад гукі аркестра разыходзяцца раніцай роты на баявую вучобу. І ўсё пад навіссю векавых, меднаствалых хвой, так што зверху, мабыць, ніякая авіяцыя не прыкмеціць.

Барак, у які трапіў Віктар, змяшчае на сваіх трох'ярусных нарах восемсот чалавек. Віктару дасталося месца на трэцім паверсе, пад самым дахам. Ён дзівіўся: праз ладную шчыліну ў вільчыку падміргваюць зоркі, рукой можна дастаць да зімы, аднак гэтак цёпла ў бараку, што можна спаць не акрываючыся. На другі ці трэці дзень смяшлівы чарнамазы тубылец барака, запыніўшы Віктара, торкнуў пальцам яму ў жывот, запытаў:

– Ты патрыёт?

Віктар не ведаў, што адказаць.

– Патрыёт, патрыёт, запяе твой жывот, – загугнявіў чарнамазы і рушыў сваёй дарогай.

Жывот не запеў, а нават затрубіў вельмі хутка. Не прадбачачы нічога благога, Віктар не хаваў сідара, у якім заставаўся яшчэ ладны прыпас сухароў. Прыпас растаў на вачах. Кармілі ж па трэцяй катэгорыі: шэсцьсот пяцьдзесят грамаў хлеба на дзень, дзесяць грамаў цукру, а на прыварак – што Бог пашле. Тытунёвае забеспячэнне трэцяя катэгорыя ўвогуле не прадугледжвала.

Хлебная пайка лёгка ўмяшчалася на далоні, так што пакуль Віктар стаяў у чарзе за супам ці баршчом (стравы гэтыя адрозніваліся пераважна назвай), то паціхеньку адшчыкваючы ад хлеба, з'ядаў яго ўвесь. Заставалася толькі запіць цвёрды харч супам ці баршчом.

А баявая падрыхтоўка ішла як мае быць. Акрамя яе вялося будаўніцтва новых памяшканняў. Раніцай замест зарадкі трэба было прынесці з лясной дзялянкі бервяно. У абед і перад вячэрай – яшчэ па адным. Бярвенні ніштаватыя: трошкі даўжэй за тэлеграфны слуп і, відаць, трошкі таўшчэй. Адлегласць – два кіламетры ў адзін канец. Бервяно няслі ўтрох, а Віктар – высокі ростам. На першым часе ён думаў, што не вытрывае... Але, зрэшты, гэта былі дробязі. Галоўнае было не ў гэтым, а ў тым, што ён, Віктар, прылучан да вялікай, святой справы, за якой сочыць увесь свет, якая

вырашае лёс будучых пакаленняў. Хіба лёгка было ўявіць у сорак першым, што немцаў з іх армадамі танкаў, самалётаў пагоняць назад, будуць наладжваць ім «катлы», акружэнні, не горшыя, чым некалі наладжвалі яны самі. Дзеля гэтага напнулася, як сталёвая струна, уся агромністая краіна...

Асаблівыя хвіліны натхнення, узлёты духу перажываў Віктар, калі раніцай на палкавым пляцы пачынаўся развод вучэбных рот. Бліскучыя трубы выдыхалі са сваіх медных горлаў маршы і мелодыі баявых ваенных песень, гулка бухаў вялізны турэцкі барабан, мерна чаканілі крок тысячы людзей, трымаючы раўненне на застылага, з узнятай пад казырок рукой пасівелага палкоўніка, і, захоплены магутнай плынню музыкі, адчуваннем еднасці, блізкасці з усімі гэтымі людзьмі, урачыстай велічнасцю моманту, Віктар забываў пра галодны жывот, пра тое, што на ім целяпаецца няўклюдны шынель, а ад правага чаравіка зусім адстала падэшва. Тое самае, здаецца, адчувалі ўсе...

Маршыруй, пакаленне!.. Самой гісторыяй наканавана табе суровая дарога. На ёй ліецца кроў, губяцца маладыя жыцці, але твае бясцэнныя ахвяры не прападуць. Грыміце, трубы, і чаканьце крок, салдаты самай вялікай вайны!..

Малады васемнаццацігадовы жывот, аднак, нельга было замаліць ніякімі, няхай сабе ўзвышанымі і святымі лозунгамі. Ён патрабаваў харчу, і пры гэтым не толькі ў калорыях, а і ў пэўным аб'ёме. Пасля разводу на пляцы Віктар адразу пачынаў марыць пра абед, пра духмяную пайку, да якой было яшчэ далёка. Іншы раз ён маляваў ва ўяўленні, колькі б мог з'есці хлеба. Адной буханкі здавалася мала, ён тады дабаўляў другую, нарэшце, трэцюю. Ён бы мяў і камячыў гэтыя буханкі, адламваў хлеб вялізнымі кавалкамі і еў бы адразу з дзвюх рук...

На нарах пасля адбою таксама шапталіся пра харч. Ішло паспяховае наступленне на Украіне: немцаў зацiснулі пад Корсунь-Шаўчэнкаўскім – і хлопцы марылі трапіць туды, на паўднёвыя франты. Усё-такі там хлебны край: пшаніца, кукуруза, а якія там з белай мукі паляніцы пякуць!..

Ірваўся ў маршавую роту, на фронт, і малады партызан суседняга з Віктаравым раёна Вася Гайчук. Дзіўны, няўрымслівы ён чалавек!.. Ад недаядання шырокі, добразычлівы Васеў твар азыз і пасінеў, стары, мабыць, яшчэ часоў грамадзянскай вайны, шынель вісіць на ім як на калку, але ў Васі тым не меней не ўбавілася ні гумору, ні рухавасці. Увесь свой час, нават той, які адпушчан на асабістыя патрэбы, ён праводзіць ля кулямётаў. Ручны кулямёт Дзегцярова ён можа сабраць і разабраць за лічаныя імгненні і прагне гэтак жа лёгка валодаць станковым.

Насядзеўшыся ля кулямётаў, Вася прыходзіць у курылку зацягнуцца «бычком».

– Вось сюды, – ён торкае пальцам у вялізную масляністую пляму над левай кішэнькай гімнасцёркі, – Міхаіл Іванавіч прывінціць мне залатую зорачку.

– Які Міхаіл Іванавіч?

– Вядома які. Калінін. Усесаюзны староста.

– За што?

– Як за што? Нашаткую гансікаў, як капусты. Сумняваецеся?..

Зрэшты, тыя, што былі з Васем разам у партызанах, словы яго за жарт не прымалі. Яны ведалі, што ён удзельнічаў у падрыве дзевяці эшалонаў, два ці тры разы яго прадстаўлялі на ордэн, але ўзнагароды не дачакаўся – пайшоў на фронт.

Вынікам размоў і трызненняў пра харч сталася тое, што Віктар выцягнуў з-пад матраца паддзёўку і куртачку з бліскучым замком, якія ў свой час закапаў у снег, і, улучыўшы прыдатную часіну, рушыў са сваім скарбам да галасістых баб на станцыю Фаянсава. Купляць цывільную вопратку ў вайскоўцаў яны, відаць, прызвычаіліся: за дзве каштоўныя па ваенным часе рэчы Віктар ледзь-ледзь выкленчыў семсот рублёў. Затое на тавар уласнай вытворчасці бабы ўзвінцілі цэны як мае быць: невялікі праснак-скавароднік каштаваў сто рублёў, паўлітра малака – пяцьдзесят. Віктар за набыты капітал выпіў бутэльку малака, купіў пяць праснакоў і дзве шклянкі махоркі. Тры праснакі ён з'еў па дарозе і два прынёс – падзяліцца з хлопцамі...

Усё ж паход на станцыю Фаянсава прынёс немалую карысць. Віктар пайшоў у армію па чарговаму прызыву, і як годны да вайсковай службы, але не абвучаны і пры ўсім гэтым як чалавек з пэўнай адукацыяй, ён мусіў вучыцца ў палкавой школе шэсць месяцаў. Але ён нават не мог сабе ўявіць, што цэлыя паўгода пратарчыць тут. На фронт трэба!.. Там і кормяць лепш, і ўвогуле павага франтавіку...

Ёмістая жменя махоркі, перасыпаная ў кішэню ротнага пісара, зрабіла сваю справу. Хітраваты, увішны пісар вельмі спрытна перарабіў апошнюю пяцёрку на тройку ў чатырохзначнай лічбіне, якая азначала год нараджэння, і з гэтай хвіліны Віктар амаль механічна перайшоў у катэгорыю тых, хто з дня на дзень мог чакаць залічэння ў маршавую роту...

Перад адпраўкай на фронт Віктару пашанцавала: трапіў у нарад на кухню. Жалезнымі ламамі яны адкалвалі камлыгі ўшчэнт зледзянелай бульбы, адпарвалі ледзяшы ў катле з цёплай вадой, затым сяк-так бульбу абіралі. Да раніцы суп для многіх соцень салдацкіх жыватоў быў гатовы. Хлопцы пранюхалі, што Віктар на кухні, і не прамінулі пакарыстацца выпадкам. Аж па тры разы прыбягалі праз заднія дзверы стрыечны брат Адам, Пятро Герасімаў, аднакласнік Саша Чарняўка...

У хлопцаў ад слабага харчу парос на тварах нейкі кволы пух. Віктару было шкада хлопцаў. Ён радаваўся, што яны хоць раз удосталь наядуцца...

Тады, калі Віктар апрануў новы шынель, гімнасцёрку, ватнік, яму стала шкада запаснога палка. Усё-такі былі тут свае святыя мясціны. Апрача пляца, дзе пасля ранішняй паверкі разводзілі роты, была яшчэ сушылка, цёмны, цёплы закутак барака, дзе стаяла печка, зробленая з жалезнай бочкі, і дзе, павячэраўшы, салдаты курылі, спявалі песні, варылі бульбу. Па некалькі бульбін у кішэнях заўсёды прыносілі тыя, каму пашэнціла трапіць на кухню. Тут харч па-брацку дзялілі. Прыходзіў на зборышчы і камандзір узвода, немалады, прысадзісты, трохі рыжаваты малодшы лейтэнант. Сядзеў на драўляным чурбачку перад грубкай і маўчаў. Яму таксама выдзялялі дзве-тры бульбіны і на працягу ўсяго вечара давалі закурыць.

Хораша спявалі. Пра каханне, пра дзяўчат. Віктар у душы радаваўся таму, што мае цяпер поўнае права спяваць «Зямлянку». Гэтая песня была складзена як бы пра яго таксама, хоць дзяўчыны, якая б думала аб ім, пакуль не было...

Калі на станцыі Фаянсава ішла пагрузка ў эшалон, бабы, што гандлявалі праснакамі, малаком і махоркай, былі на месцы. Але іх адносіны да салдат у новых шынялях былі зусім не такія, чым да абарванцаў, што месяц назад сюды прывандравалі.

– Сыночкі, канчайце хутчэй вайну. Ужо дыхаць болей нельга.

– Выганяйце немца – і дадому...

– Божа, Божа, якія маладзенькія. Як дома тым маткам...

– Бач, шыя тоненькая. Які ён салдат – дзіця...

Некаторыя з баб выціралі ражкамі хустак слязіну...

І вось зноў цяплушка. Усе, хто ў вагоне, думаюць, што пасылаюць на Ўкраіну. Сухі паёк выдалі на пяць сутак і на двое – НЗ.

У Віктара трымціць надзея, што паедуць праз местачковую станцыю. Месяц не быў дома, а як засумаваў. Для маці падрыхтаваў падарунак – спецыяльна не скарыстаў дзве метровыя байкавыя прасцірадлы, выдадзеныя на анучы.

Добрая выйдзе з іх для маці кофта...

Пасля Смаленска мары пра Ўкраіну пачалі згасаць. У Сычоўцы Віктар вылез з вагона і за нікчэмныя бульбяныя піражкі прадаў байкавыя прасцірадлы. Было ясна – вязуць пад Ленінград. Блакада з яго канчаткова не знята...

Потым была вайна – залітыя ржавай балотнай вадой акопы пад Нарвай, нудная, двухмесячная перастрэлка з немцамі, якія, адкаціўшыся ад Ленінграда, зацята агрызаліся і не хацелі здаваць Прыбалтыку. Віктар пакрысе прывыкаў да салдацкага бытавання. Навучыўся спаць на снезе, засланым толькі яловымі лапкамі, кіпяціць у кацялку чай, маючы пад рукамі жменю ці дзве сухіх бадылькоў. Кармілі цяпер па першай катэгорыі, давалі болей хлеба, і прыварак быў някепскі, але пачуццё голаду, абуджанае месячным знаходжаннем у запасным палку, не праходзіла.

Між тым пачыналася вясна. На балацянках пад Нарвай стала яшчэ горш, чым было зімой. Дарогі зусім расквасіла, паўсюдна, заліваючы акопы і бліндажы, стаялі азярыны талай вады. Але менавіта ў гэты час дывізію, у якой служыў Віктар, правёзшы ў эшалоне праз напаўразбураны Ленінград, перакінулі на Карэльскі перашыек. Баямі на гэтым перашыйку пачалося гарачае, наступальнае лета сорак чацвертага года...

На вайне такой жа вострай патрэбай, як харч, з'яўляюцца лісты. Без лістоў з дому ці з якога-небудзь іншага месца салдат ваяваць не можа. На Карэльскім перашыйку, пад Ленінградам, загінулі Сяргей Рагазуб і ўсе іншыя партызаны, якіх Віктар ведаў. Былі вельмі моцныя доты на Карэльскім перашыйку...

Віктар, паранены ў шыю і ў руку, ляжаў у шпіталі і чакаў лістоў ад хлопцаў, якія ўсё яшчэ праходзілі падрыхтоўку ў запасным палку. Знаёмых побач не было, ён застаўся адзін... Васю Гайчука ў першы ж дзень наступлення прадставілі да ўзнагароды медалём «За адвагу». Ён трохі неабдумана вырваўся са сваім станковым кулямётам за баявыя парадкі роты, і яго параніла ў галаву асколкам са снарада, пушчанага нашай жа самаходкай...

Пачалі наступленне тры Беларускія франты. Хлопцы ўжо былі на вайне. Ад іх сталі прыходзіць лісты-трохкутнічкі, але невясёлыя. Стрыечны брат Адам загінуў ля Дняпра, калі абыходзілі Воршу, Пеця Герасімаў дайшоў аж да Горадні. Ля Нёмана яго цяжка параніла, і некалькі дзён ён яшчэ жыў...

Васіль Міхальчук прапаў без вестак...

Ужо ва Ўсходняй Прусіі Віктар атрымаў ліст ад свайго аднакласніка Сашы Чарняўкі. Ліст ішоў усяго толькі тры дні, Саша быў побач. Віктар узрадаваўся, марыў аб тым, каб як-небудзь пабачыцца. Але хутка не стала вестак і ад Сашы...

Вайна яшчэ не скончылася, а хлопцаў нараджэння дваццаць пятага года, з якімі разам хадзіў у школу і якія пайшлі на фронт, Віктар жывога не памятаў ужо ніводнага...

1970 г.

Аповесць «Вір»

I

За вокнамі вецер. Нават у змроку відаць, як хвоя хістаецца ўлева-ўправа, махнатая галіна матляецца перад самай шыбінай. Пакой дацэнта Несцяровіча на другім паверсе адмыслова выштукаванага з сасновага цёсу двухпавярховага дома, вокны якога якраз дасягаюць шатаў дрэў.

Вецер мацнее. Пошум сосен зліваецца ў суцэльны гул: доўгі, працяглы, чымсьці самотны, трывожны. Несцяровіч любіць летнія навальніцы, доўгую асеннюю непагадзь, нават вось такія зімовыя завірухі. Але гэта тады, калі на душы спакой, раўнавага. Цяпер жа душа ўзрушана, прыгнечана, і Несцяровіч не ведае прычыны гэтага.

Пачалася зімовая сесія студэнтаў, два тыдні Несцяровіч вольны, як вецер, і ён прыехаў у гэты бласлаўлёны Дом творчасці пісьменнікаў што-небудзь напісаць. Бо ён не толькі выкладчык універсітэта, літаратуразнавец, а і пісьменнік-празаік.

Дом творчасці – былая паляўнічая рэзідэнцыя высокага ўрадавага чыноўніка. Чыноўніка з пасады турнулі, дом, у якім налічваецца чатырнаццаць пакояў, аддалі пісьменнікам. Пішыце, маўляў, тварыце, праслаўляйце бацькаўшчыну. Відаць, сам Бог паспрыяў, каб пісьменнікі займалі гэты дом. Бо куды б дзеўся Несцяровіч ці такія, як ён, службоўцы-літаратары, каб не гэты схаваны ў лесе, за два дзесяткі кіламетраў ад Мінска, дом. Тут пануе цішыня і някепска харчуюць. Галоўнае, што сюды можна ўцячы ад гарадскога тлуму, мітусні, сходаў, паседжанняў.

Пакой дастаўся Несцяровічу добры, з вокнамі на густы зялёны сасоннік.

З таго часу, як Несцяровіча прынялі ў Саюз пісьменнікаў, ён некалькі разоў бываў у Доме творчасці. Летам, восенню, зімой. Ведае тут амаль усе пакоі.

Раніцай Несцяровіч вярнуўся з Мінска, з пагулянкі. Дзень прапаў, бо за пісьмовы стол ён так і не сеў. Шумела ў галаве, ён быў млявы, разбіты. Адзначаў саракапяцігоддзе дэкан філалагічнага факультэта, і не пайсці было нельга.

Сорак пяць гадоў – не прычына для балявання, але дэкану якраз далі ордэн, і ён не мог ухіліцца, каб не пачаставаць тых, з кім разам працуе.

Несцяровіч, дзе б там ні было, не перапівае, не было выпадку, каб ён перабраў. Ён і на баляванні ў дэкана не перапіў, але мінулі суткі, а ён не можа прыйсці ў норму. У дадатак няпэўная, няясная трывога вярэдзіць душу.

Лес за акном шуміць усё гучней. Асабліва глухія ўздыхі даносяцца з сярэдзіны: там нешта трашчыць, ломіцца, валіцца. Раптам шугануў снег, ды такі густы, напорны, што нават сасны пад акном стала не відаць. Зіма нарэшце канчаткова ўсталявалася. Доўга, чатыры ці нават пяць месяцаў, будзе вісець над зямлёй цёмнае неба і сыпаць снегам, будуць свістаць-разгульваць вятры. Лясныя жыхары пахаваюцца ў норкі, дуплы, і адзін толькі дзяцел будзе дзюбаць жалезным носам па амярцвелай галіне ці вяршаліне сасны.

Несцяровіч не любіць зіму. Ён вырас у небагатай шматдзетнай сям'і – тры хлопцы і дзяўчына, бацька працаваў стрэлачнікам, і ягонага заробку нават на хлеб не

хапала. Малы Алесь зімою заўсёды мёрз. Бо не насіў ні кажуха, ні валёнак, ні нават добрага цёплага паліто. Не было ў бацькі капіталаў, каб купляць такія рэчы...

Даўно спіць Дом творчасці. Хоць, можа, які-небудзь дзівак, наморшчыўшы лоб, сядзіць за сталом (ёсць пісьменнікі-начнікі). І кампанія не брындае па дарозе: у такую віхуру носа не вытыркнеш з дому.

Несцяровіч рассцілае пасцель, выключае настольную лямпу, кладзецца ў ложак. Ён нажыў сабе хваробу, хоць яшчэ не стары: марудна, пакутліва засынае. Гадзіну ці нават больш варочаецца ў ложку, успамінае розныя падзеі ці мясціны, пакуль сон канчаткова не адолее.

Ён нарэшце засынае. Але праз нейкую гадзіну падхопліваецца. Яму раптам робіцца яснай прычына душэўнага неспакою. Неяк не так, не як звычайна, паводзіла сябе на банкеце жонка. Яна ўвогуле эмацыянальная, мае ў характары штосьці ад артысткі і любіць верхаводзіць за сталом. Несцяровічу нават падабалася, што жонка дасціпная, добра валодае гумарам, здольная ажывіць любую кампанію.

Аднак на ўчарашнім вечары жонка была непадобнай на сябе. Занадта вогненна-вясёлая, яна мітусілася, прамаўляла тосты, закрануўшы кепікамі ледзь не ўсіх прысутных на банкетаванні людзей.

Такой сваёй Галіны Мікалаеўны Несцяровіч яшчэ не бачыў. У гэтай яе няўрымслівай мітусні як бы адчуваўся нейкі надрыў. Што магло здарыцца?

Несцяровіч жанаты другі раз. Можна сказаць, што гэта ягоная драма і нават трагедыя. Ён ажаніўся з дзяўчынай першага, яшчэ школьнага, кахання, хоць прадчуваў, што гэтага не трэба было рабіць. Але ён не мог пераступіць праз пачуццё, якое гарэла ў душы амаль дзесяць гадоў. Гэта было безагляднае юнацкае каханне, якое не прымае ў разлік жыццёвай прозы, не звяртае ўвагі на супярэчнасці жыцця. Цяпер, з цягам часу, ён разумее, што Ізольда, першая жонка, яго зусім не любіла, звяртаючы ўвагу толькі на сваю асобу. Ён ёй, вядома, трохі падабаўся, але не больш, чым іншыя. Не была яна, дачка настаўніка, асаблівай прыгажуняй, не вызначалася здольнасцямі да навук. "Цвёрдая пасрэдніца", – неяк сказаў пра яе завуч дзесяцігодкі, якую дзяўчына заканчвала. Яна рана пачала знацца з хлопцамі. Мяняла іх як пальчаткі. Можа, па гэтай прычыне і на шлюб глядзела як на нейкі ўзаконены саюз, дзе зусім не абавязковая ўзаемная адданасць мужа і жонкі. Ёй думалася, што пры такой адданасці будзе аднастайнае панылае жыццё, якое не прынясе жанчыне ніякай радасці.

Вось такая была Ізольда, першая жонка Несцяровіча. Чаму ж ён з ёй ажаніўся? Быў верны абавязку: яна зацяжарыла і сказала пра гэта. Уцякаць у кусты ён не мог. Не паважаў бы самога сябе. Пазней, перабіраючы ў памяці акалічнасці сваёй жаніцьбы, ён вельмі засумняваўся, што іменна ад яго Ізольда зацяжарыла. З горам папалам прабіўшыся ў настаўніцкі інстытут, яна (да Несцяровіча даходзілі глухія чуткі) вяла там вельмі вольнае жыццё.

У дваццаць шэсць развёўшыся з Ізольдай, пакінуўшы ёй трохгадовага сына (аліменты па тым часе складалі ледзь не палавіну заробку Несцяровіча, бо "добраахвотная" падпіска на аблігацыі клалася цалкам на ягоную долю заработнай

платы), Несцяровіч вельмі падазрона стаў глядзець на дзяўчат і жанчын. Яны наогул здаваліся яму хцівымі, легкадумнымі, здрадлівымі істотамі.

З ранніх гадоў Несцяровіч чытаў кнігі, і, відаць, яны дапамаглі яму стаць зацятым рамантыкам. У яго склаўся нейкі стэрэатып паводзін юнака і дзяўчыны: хлопец змагаецца за жыццёвы поспех, дасягае яго і як дар кладзе да ног каханай, а яна ва ўзнагароду дорыць яму сваё сэрца. Відаць, так паводзілі сябе сярэдневяковыя рыцары, і гэта Несцяровічу падабалася.

Тут таксама паўставала пытанне аб прыгажосці, бо кахання без прыгажосці не бывае. Ізольду Несцяровіч лічыў вельмі прыгожай, а сябе – не. У Германіі, калі скончылася вайна, ён некалькі разоў сфатаграфаваўся. І – здарыўся цуд. На фатаграфіях ён выглядаў не проста самым звычайным, а нават вельмі прыгожым хлопцам. Нібы брыдкае качанё ператварылася ў лебедзя. Прывабны выгляд на фотакартках Несцяровіч прыпісваў майстэрству нямецкіх фатографаў.

Пасля вяртання з фронту Несцяровіч схуднеў, зблажэў. Па-першае, харч быў не надта добры. Падругое, пакутаваў ад розных згрызот. Два гады ён быў у акупацыі, год ці болей памагаў партызанам, затым і ў атрад пайшоў. Але такіх, як ён, усё адно не надта прывячалі. У грамадстве тады панавала дурнота, якую цяпер называюць чужаземным словам "таталітарызм". Нібы нараджаўся новы клас. Не разбіраючы, разумныя яны ці не надта, валодаюць арганізатарскімі здольнасцямі ці не, тых, хто вярнуўся з фронту, не быў у акупацыі, прызначалі на кіруючыя пасады: старшыня калгаса, загадчык, кіраўнік прадпрыемства. Былым палонным, акружэнцам або тым, хто жыў пры акупацыі ды яшчэ дзенебудзь працаваў, дарога на такія пасады была перакрыта.

Несцяровіч заўсёды думаў пра вучобу. Дарма не прапусціў не тое што года, а нават месяца. Ён быў нібы створаны для чытання кніг, якія падштурхоўвалі да роздуму аб усім навакольным.

З другой жонкай, Галінай Мікалаеўнай, Несцяровіч сыходзіўся марудна, пакутліва. Мабыць, прычынай гэтага была першая жаніцьба. Ён стварыў сабе вобраз ідэальнай дзяўчыны, якая беражэ сябе для абранніка, якога настойліва чакае, не пускаючыся ні ў якія авантуры. Толькі жыццё было іншым. Несцяровіч не хацеў разумець, што дзяўчына, якая заканчвае інстытут, мае перспектыву атрымаць дыплом, а значыць, і работу, не надта баіцца памыліцца ў абранніку. Дрэнны будзе адзін, дык знойдзецца другі.

Дзіўна пазнаёміўся Несцяровіч з Галінай Мікалаеўнай. Не жаніўся ён пяць гадоў. Жыў па аспіранцкіх інтэрнатах, абараніў дысертацыю, працаваў выкладчыкам, падрабляў у маладзёжным часопісе. Матэрыяльна быў незалежны, хоць аліменты адбіралі значную частку заробку.

Знаёмы выкладчык Федзя Чашчавік, які таксама скончыў аспірантуру і працаваў ва універсітэце, аднойчы паклікаў яго да сябе. Яны не былі сябрамі, і недаверлівы Несцяровіч напачатку рашыў не ісці. Але пайшоў: штосьці ў Федзевым голасе было загадкавае, таямнічае. У трохі большым, чым меў сам Несцяровіч, пакойчыку за

сталом гудзела невялікая кампанія. Дзяўчаты былі незнаёмыя, акрамя даўганосай выкладчыцы Хадакоўскай, зямлячкі Несцяровіча, якая паходзіла з адзінай у іхнім раёне лясной шляхецкай вёскі.

Федзя Чашчавік нездарма паклікаў да сябе Несцяровіча: ён прывёз сабе і яму кандыдацкія дыпломы па даверанасці універсітэцкага аддзела кадраў.

Несцяровіч кінуўся за бутэлькай, але Чашчавік спыніў яго царскім жэстам. Не клапаціся, маўляў. Усё ёсць. Пачастуеш кампанію іншым разам.

Гэта ўжо быў другі дыплом Несцяровіча. Першы ён атрымаў пяць гадоў назад пасля заканчэння універсітэта. І зараз ён не таіў радасці і піў колькі налівалі. І сп'янеў.

З кампаніі, якая сядзела за сталом, яму кінулася ў вочы пышнацелая, з буйнымі завіткамі валасоў дзяўчына. Можна лічыць, яна верхаводзіла кампаніяй. Сыпала, як з мяшка, жартамі, дасціпнымі словамі, весяліла гасцей.

– Раю пазнаёміцца! – гучна сказаў Федзя, звяртаючыся да Несцяровіча. – Мая лепшая студэнтка (Чашчавік па сумяшчальніцтве і ў інстытуце народнай гаспадаркі выкладаў). Ты, мармыза, ходзіш у задрыпаным паліто, хоць і кандыдат навук, а яна працуе толькі другі год і ўжо намеснік дырэктара ГУМа. Адчуваеш тэмп? Будзеш жыць як у Бога за пазухай.

Несцяровіч мала што памятае з таго вечара. Пелі, нават танцавалі пад патэфон, затым ён наважыўся ісці з вуліцы Маскоўскай, дзе жыў Федзя, у свой інтэрнат на вуліцы Свярдлова. З ім пайшла Галя, але Несцяровіч ледзь валачыўся, запляталіся ногі, і дзяўчына рашуча завярнула яго ў завулак, які размяшчаўся ледзь не насупраць інтэрната на Маскоўскай.

Прачнуўся ён на канапе, побач з Галяй, у маленькім, але ўтульным пакоіку, сцены якога былі абклеены сінімі шпалерамі. Пакоік меў асобны ўваход. Фактычна гэта была аднапакаёвая кватэра, якую здолела атрымаць у малаадбудаваным Мінску ўчарашняя студэнтка, а сёння намеснік дырэктара галоўнага універсальнага магазіна. Вось што значыць гандаль!

– Кватэру малодшы брат падарыў. Ён падпалкоўнік інжынерных войск. Мінск адбудоўваў. Цяпер яго паслалі ў другі горад.

Так завязалася знаёмства Несцяровіча з Галяй. Штосьці падабалася ў яе твары, адкрытым і вясёлым, а галоўнае, у характары – вогненна-дзейсным і незвычайна актыўным. І ён ёй спадабаўся. І, здаецца, болей чым яна яму. Бо не было дня, каб яна яго не наведала ці хоць не пазваніла на работу. Ён чытаў лекцыі, але найбольш часу, пачынаючы з дванаццаці гадзін, праводзіў у рэдакцыі часопіса "Юнацкі свет". Часопіс толькі-толькі пачаў выходзіць. Тут упершыню Несцяровіч пачаў сустракацца з пісьменнікамі, сталічнымі журналістамі, а таксама з мастакамі, якія афармлялі часопіс.

Бачыў ён і Якуба Коласа, але гэта было раней, калі ён працаваў у рэдакцыі рэспубліканскай газеты "Звязда". Ён ганарыўся, што працуе ў газеце, якая выходзіла яшчэ да рэвалюцыі. Ён ужо там друкаваў нарысы, якія займалі палавіну газетнай старонкі.

Несцяровіч думае пра літаратуру. Нідзе, ні ў якім падручніку не напісана, што звычайная проза мае рытм, інтанацыю, якія ствараюць настрой, што нібы закалыхвае, зачароўвае чытача. Вялікае значэнне мае само слова, яго эмацыянальная афарбоўка, свежасць, гучанне.

Несцяровіч збіраецца нават напісаць апавяданне, якое ўражвала б мілагучнасцю мовы, але пакуль не адважваецца.

II

Як у віхурным танцы, закружылася каханне Несцяровіча і Галі. Ён спазнаў яе пры першым спатканні, калі яна прывяла яго да сябе начаваць. У дрызіну п'яны, не маючы ў адносінах да дзяўчыны ніякіх сур'ёзных намераў, што ён мог памятаць? Тады, калі сустракаўся з Ізольдай, гэтая акалічнасць не мела значэння. Цяпер мае. Цяпер ён ведае, што ад такіх рэчаў можа паламацца жыццё. Сеяць па свеце дзяцей ён не збіраецца. Калі з-за нявернасці кінуў адну жонку, то другую, якая народзіць дзіцё, не кінеш. Інакш зломіш жыццё канчаткова.

Ён патрабаваў ад Галі споведзі: каго любіла, з кім была блізкай. У такія хвіліны яна выбухала гневам і абурэннем, з ходу адмятала яго пытанні. Якое права ён мае на допыты? Сам быў жанаты, плаціць аліменты, а тут патрабуе нейкай незвычайнай чысціні!

Яны сыходзіліся і разыходзіліся. Але паступова Галя ўзяла Несцяровіча пад поўны кантроль. Яна знаходзіла час зазірнуць у інтэрнат ці хоць пазваніць у рэдакцыю. Гэтая настойлівасць падабалася Несцяровічу. Калі Галя гэтак да яго цягнецца, то, відаць, яна да яго не абыякавая. Ізольда ніколі такога не рабіла. Не распытвала, дзе быў, як жыў, з кім бавіўся. Да ягонага жыцця яна была абыякавая. Галю, наадварот, цікавіла ўсё, звязанае з ім. Яна досыць начытаная, хоць вучылася ў наргасе, дзе літаратуру нават не выкладаюць. Гаворку з ёй можна весці на любую тэму. І розум у яе дасціпны, і гумарам валодае.

Пазней Несцяровіч зразумеў, што была яшчэ адна, можа быць, самая галоўная прычына, якая з'яднала яго з Галяй. Ён быў мяккі, сузіральны, яна – дзейсна-актыўная.

Яны абое выхоўваліся ў бадай аднолькавым асяроддзі. Галя родам са Слуцка. Несцяровіч з вялікага, раскіданага мястэчка, больш падобнага на вёску. Але і ў Слуцку, і ў Несцяровічавым мястэчку было шмат вуліц, чыгуначная станцыя, па нядзелях ладзілі базары, і ў той жа час там і там панаваў чыста сельскі ўклад: многія жыхары трымалі кароў, свіней, курэй, мелі агароды, умелі таўчы ў ступах крупы, а ў ліхую гадзіну на жорнах малоць муку.

Перад самай вайной бацькі Галіны разышліся. Малодшы брат вучыўся ў ваенным вучылішчы, а старэйшая сястра ў апошні перадваенны год паступіла ў медыцынскі інстытут. Бацька пераехаў у Мінск і забраў з сабой Галю. Ён болей не жаніўся, і Галя змалку навучылася гаспадарыць. Бацьку пры вызваленні Мінска ад немцаў, хоць быў немалады, забралі ў армію. Восенню сорак чацвёртага года ён загінуў. Галі тады было пятнаццаць гадоў.

У Слуцк Галя не вярнулася. У Мінску жылі цёткі, бацькавы сёстры, якія мелі свае дамкі, і Галя тулілася каля іх. Не, яна з іх нічога не цягнула, нічога ад іх не патрабавала. Навучылася жыць сваёй галавой. У невялікі магазінчык, які гандляваў бульбай, агароднінай, яна ўладкавалася забеспячэнцам, скуплівала ў насельніцтва буракі, капусту, і, дзякуючы яе намаганням, магазінчык, які жыў на грунце дзяржаўнага закупу, нават працвітаў. Галя яшчэ і цёткам памагала.

Яна скончыла школу, паступіла ў інстытут. Папераменна жыла ў цётак, дамкі якіх размяшчаліся ў процілеглых канцах горада. Брат, падпалкоўнік, з'явіўся пазней і, па сутнасці, не Галі, а старэйшай сястры Святлане, якая, скончыўшы медыцынскі інстытут, працавала на раёне, завяшчаў кватэру.

У той час, калі Несцяровіч пазнаёміўся з Галяй, старэйшая сястра рабіла ўсялякія захады, каб перабрацца ў Мінск, але ёй гэта пакуль не ўдавалася. Быў яшчэ адзін брат, які жыў недзе ва Уладзівастоку і даваў знаць пра сябе вельмі рэдка.

Беглі дні, месяцы. Мінула два гады, як Несцяровіч пазнаёміўся з Галяй, але яны ўсё яшчэ блукалі па вуліцах, высвятлялі адносіны. Ладу, згоды між імі не было.

Памёр Сталін. Несцяровіч успрыняў гэта як вялікую трагедыю. Галя між тым пасмейвалася:

– Пражывём. Гэта толькі ў газетах пісалі: "Сталін – родны бацька". Па такім бацьку можна і ногі выцягнуць...

У час бурлівых сутычак з Галяй Несцяровіч на кароткі час знаёміўся з другімі дзяўчатамі. Адна скончыла інстытут замежных моў і ў тым жа інстытуце засталася лабаранткай. Калі ён прыходзіў да яе ў пафарбаваны ў жоўты колер дамок у адным з трох чыгуначных завулкаў за каменным мастом, яна давала яму ў рукі альбом, дзе былі дзесяткі яе фатаграфій: на пляжы ў купальніку, на валейбольнай пляцоўцы ў спартыўнай форме, на лясной паляне, дзе загарала.

Другую дзяўчыну – аспірантку-хімічку, пышнацелую, ганарлівую – ён запрасіў у кіно. Няўпэўнены ў поспеху, ён не разгледзеў, што купіў білеты на розныя месцы, і разгневаная аспірантка па дарозе ў інтэрнат з ім зусім не размаўляла, падбіваючы наском чаравіка, каціла перад сабой круглы лядзяш.

Не, Галя з ім так не абыходзілася. Яна не таіла радасці, калі ён прыходзіў, старалася нават накарміць яго, зацыраваць шкарпэткі.

У рэдакцыі часопіса "Юнацкі свет" працавала стыль-рэдактарам Зіна Засуліч, не вельмі прыгожая жанчына, затое вельмі гаваркая, паслужлівая. Яна Несцяровічу дала раздзелы сваёй недапісанай дысертацыі пра Максіма Танка, і ён імі з поспехам пакарыстаўся.

Несцяровіч ведаў Зінінага мужа, з якім разам працаваў у "Звяздзе". Мяккі, абыходлівы, разумны чалавек. Зіна тым часам круціла з паэтам, які пісаў гучныя лозунгавыя вершы да пэўных дат, а па натуры быў надзвычай настырны, нават нахабны.

Дык вось гэтая Зіна, чуючы аднойчы, як безуважліва Несцяровіч з Галяй размаўляе па тэлефоне, сказала:

– Гэта табе адгукнецца. Жанчыны такога не даруюць...

Цяпер, гэтай бяссоннай ноччу ў Доме творчасці, з параненай душой, ушчэнт разгублены і, можна нават сказаць, знішчаны, Несцяровіч успамінае словы Зіны Засуліч. Бо Галя, хутчэй за ўсё, збіралася кідаць яго...

Яны ўсё-такі пажаніліся.

Добра яны пражылі сем гадоў. Ён не пайшоў да яе на кватэру, на якую прэтэндавала сястра. У хуткім часе тая яе ахвотна заняла. Знайшоўшы мужа-фельчара, нарэшце пераехала з ім у Мінск.

І Несцяровіч прывёў Галю ў інтэрнат, у невялікі пакойчык, які на час за ім пакінулі, дзякуючы падтрымцы сакратара універсітэцкага парткама.

Добра ім было ў тым інтэрнаце! Гудзелі-шумелі да поўначы студэнты, ледзь не кожную ноч наладжвалі пагулянкі суседзі-аспіранты.

У час танцаў, нібы слон, тупаў нагой аб падлогу таўставаты аспірант-журналіст, да якога між іншым ахвотна прыхінулася аспірантка-хімічка, якую Несцяровіч так няўдала звадзіў у кіно. Яшчэ праз месяц журналіст (месца яму далі ў газеце "Фізкультурнік Беларусі") ажаніўся з дзяўчынай. Жылі яны таксама ў гэтым жа інтэрнаце, але разам пражылі нядоўга, штосьці з паўгода, і разышліся як у моры караблі. Бо не ўмела хімічка ні гатаваць, ні мыць бялізну, наогул уцякала ад усялякага быту.

У інтэрнаце асталяваліся два каты. Каб жыццё грунтавалася на разумных пачатках, то каты маглі пароўну падзяліць уладанні. Кожнаму прыпала б па два паверхі з мноствам масіўных чыгунных урнаў, куды студэнты зносілі недаедкі. Але каты сыходзіліся каля якой-небудзь адной урны на другім ці трэцім паверсе, біліся і наладжвалі такія дзікія канцэрты, ад якіх прачынаўся ўвесь інтэрнат. Катоў разганялі, але праз гадзіну яны зноў сыходзіліся і пачыналі лямантаваць.

Але Несцяровіч з маладой жонкай займалі вуглавы пакойчык, і не ўсе гукі чатырохпавярховага інтэрната да іх даляталі.

Несцяровіч па начах піша, бо днём не мае часу. Ён усё-такі цягне дзве нагрузкі: праца ў рэдакцыйным аддзеле і выкладанне ва універсітэце. Часопісу ён аддае нават больш увагі, чым лекцыям.

"Юнацкі свет" друкуе першыя апавяданні Несцяровіча. Іх даволі хутка заўважаюць. У літаратурнай газеце нават з’яўляецца рэцэнзія, прысвечаная творам маладога, невядомага пісьменніка.

Час першай цаліны. У далёкі казахстанскі стэп адбываюць з гарадоў эшалоны маладых і не вельмі маладых заваёўнікаў неасвоеных мясцін. У паветры носіцца штосьці новае, незнаёмае. Нібы подых нязнанай раней свабоды. Дваццаты з’езд з дакладам Мікіты Хрушчова аб кульце асобы Сталіна ўражвае, узрушвае Несцяровіча да глыбіні душы. Асабіста яго культ асобы не закрануў. Хіба толькі нашкодзіў атмасферай падазронасці. Іхнюю падпольную групу, баявую, з канкрэтнымі вынікамі, якія лёгка праверыць, да гэтага часу афіцыйна не прызналі.

Але ў памяці ўсё ўсплыло: трыццаць сёмы год, калі з іхняга канца вуліцы бясследна знікла чатыры ці пяць чалавек; арышты чыгуначнікаў, пераважна палякаў,

якія прыехалі на станцыю яшчэ ў першую вайну пасля заняцця немцамі Баранавіч; бессэнсоўнае раскулачванне, калі непісьменнага, заскарузлага Пятра Сколіча, які хадзіў у дзіравых шарачковых портках, свяціў праз дзіркі задам, затое быў страшэнна працавіты і ў запасе меў некалькі высокіх дубовых бочак збожжа, разам з жонкай і глухой сястрой пасадзілі ў вагон і звезлі невядома куды. Пятро быў родны брат бабкі Аўгінні, і яе праклёны сельсаветчыкам прайшлі праз усё дзяцінства Несцяровіча.

Не было павагі да асобы, да канкрэтнага чалавека – іменна гэта зразумеў Несцяровіч пасля закрытага прачытання пісьма на сходзе камуністаў універсітэта, і ад гэтага найбольш пакутавала душа. Чалавека маглі зняважыць, арыштаваць і нават расстраляць за нішто. Такое яшчэ неяк можна апраўдаць у гады рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, але ніякім чынам у мірны час.

Якраз тады Несцяровіч пачаў пісаць. Пісаў праўду: пра самаахвярнасць сяброў-таварышаў, якія добраахвотна ўдзельнічалі ў падполлі, ішлі ў партызаны, на фронт. Іх ніхто не арганізоўваў, не даваў заданняў, яны, калі гаварыць высокімі словамі, па ўласнай волі рызыкавалі сваімі жыццямі і нават жыццямі родных, блізкіх. Гэта былі нявыдуманыя гісторыі, але яны, як і ўсё ў літаратуры, узнікалі на хвалі натхнення, вымыслу і домыслу.

Несцяровіч актыўна абураўся парадкамі, заснаванымі на панаванні культу асобы. За тым, што гаварыў, не сачыў. Выказваўся шчыра, адкрыта, часам нават гнеўна. А ў рэдакцыі, аказваецца, былі розныя людзі. Нават такія, што слухалі і запаміналі, перадавалі тое, што ён гаварыў, куды трэба. Прытым, відаць, у пісьмовым выглядзе, магчыма, з уласнымі дабаўкамі і перабольшваннямі.

Вынік не прымусіў чакаць. У мястэчку, дзе Несцяровіч нарадзіўся і дзе жыў у пасляваенныя гады, працуючы карэспандэнтам абласной газеты, брындала па вуліцах звольненая з настаўніцкай пасады пані Кульбацкая. Пра яе было вядома, што ў час акупацыі пісала даносы на савецкіх актывістаў, падпольшчыкаў, якіх немцы арыштоўвалі і нават расстрэльвалі.

І вось слаўныя работнікі нябачнага фронту не знайшлі нічога лепшага, як даручыць Кульбацкай выліць на Несцяровіча вядро бруду. Што яна напісала, Несцяровіч не ведае, але па абрыўках размоў, якія пачуў ад правяраючых, там было несусветнае глупства. Ходу справе не далі.

Хоць свабода не спяшалася паўсюдна запанаваць, а ўжо такім, як Кульбацкая, разгарнення не было.

III

Доўга насіў Несцяровіч боль, узрушанасць, трывогу ад таго, што пачуў пра Сталіна.

Нейкую ролю ў яго прасвятленні адыграў Ямпольскі, з якім Несцяровіч гады два-тры жыў у інтэрнацкім пакоі. Ямпольскі якраз на асуджэнні культу асобы цяпер рабіў кар’еру. Выкладчыка з яго не атрымалася. Ён перайшоў у акадэмічны інстытут, сыпаў артыкуламі ў газетах, у тоўстых часопісах, пра якія Несцяровіч нават не марыў, граміў

пісьменнікаў за ідэалізацыю жыцця, лакіроўку, заклікаў рашуча выяўляць супярэчнасці ў грамадстве.

Тым часам Несцяровіч ведаў ранейшыя намеры Ямпольскага. Аднойчы ў таго вырвалася: "Буду змагацца за чысціню партыйнай лініі ў літаратуры". Ідэямі змагання была прасякнута кандыдацкая дысертацыя Ямпольскага. Ён шчыра паверыў, што такія пісьменнікі, як Язэп Пушча, Уладзімір Дубоўка, Адам Бабарэка, былі ворагамі савецкай улады, скрыўлялі партыйную лінію ў літаратуры. Прозвішчы іх ён пісаў з малой літары.

Але вось арыштаваных пісьменнікаў пачалі рэабілітаваць. З далёкай высылкі вярнуліся Пушча і Дубоўка.

Ямпольскі між тым рыхтуе дысертацыю да выдання. З незвычайнай лёгкасцю ён мяняе мінус на плюс. Цяпер учарашнія ворагі ў ягонай кнізе паўстаюць як героі, барацьбіты-пакутнікі. І зусім не трывожыць Ямпольскага, што ў дысертацыі інакш пра іх напісана, што нехта, калі захоча, можа прачытаць гэтую дысертацыю.

Яшчэ са студэнцкіх гадоў – як выскаляюцца універсітэцкія вастрасловы – Ямпольскі піша "роман". Свой "роман" студэнт, затым аспірант, нарэшце навуковы супрацоўнік Ямпольскі ахоўвае аж залішне пільна. Рукапіс з трыма ці нават чатырма папкамі-варыянтамі "романа" ён трымае ў ёмістым чамадане, які аддае каменданту інтэрната на схоў. Калі едзе дамоў, у слуцкую вёску, бярэ чамадан з сабой.

Несцяровіч пасля прачытання таго рамана не выказаў захаплення, і з-за гэтага ягоная дружба з Ямпольскім пайшла на спад. Тым часам, дзякуючы Ямпольскаму, ён зразумеў, што мае ўласны матэрыял для твора, можа, нават багацейшы, чым у Ямпольскага. Бо быў у сапраўдным падполлі, у партызанах, апошнія два гады – на фронце.

На першым часе Ямпольскі яшчэ завітвае ў інтэрнат, дзе асталяваўся Несцяровіч з Галяй. Але ў далейшым прыходзіць радзей і радзей.

Несцяровіч, вядома, зрабіў памылку. Не трэба было ганіць раман таварыша. Другія пісьменнікі, якія яго чыталі, рабілі інакш. Нешта хвалілі, нешта трохі крытыкавалі. Бо самалюбівы народ пісьменнікі. І Ямпольскі не выключэнне.

За свой промах Несцяровіч атрымаў па заслугах. Нідзе ніколі не мільганула ў крытычных аглядах Ямпольскага прозвішча нядаўняга сябра. Як бы не жылі разам, не спрачаліся, не сядзелі ў застоллях. Вось так. Вучыся, браце, жыць.

Добра Несцяровічу з Галінай. Лепшай жонкі не трэба. Яна, намеснік дырэктара буйнога магазіна, устае на золку, калі студэнты яшчэ спяць. На агульнай кухні гатуе сняданні, абеды. І гатаваць умее.

Магла б лепш апранацца жонка кандыдата навук, а ў хуткім часе і дацэнта. А яна ходзіць у адной і той жа зялёнай сукенцы, якую, відаць, пашыла яшчэ ў студэнцкія гады. І туфлі не надта добрыя ў яе. Са стаптанымі абцасамі.

Ледзьве не кожную ноч Несцяровіч працуе над сваімі творамі. За адно толькі лаецца Галя: курыць папяросу за папяросай, і ў маленькім пакоіку столькі дыму, што

немагчыма спаць. Аляксандр Іванавіч расчыняе дзверы: пакой бакавы, і ніхто ў гэтую частку калідора не завітвае.

Мінаюць гады. Выходзяць кнігі: адна, другая, трэцяя. Нават нейкае імя ўжо мае Несцяровіч. І вось нарэшце раман.

Паабяцаў аўтар часопісу апавяданне. Два разы прыязджаў сюды, у Сосны, і ніяк яго не мог закончыць.

Цяпер ужо гутарка ідзе пра аповесць. Але і аповесць не можа змясціць матэрыялу, які сядзіць у душы і патрабуе выйсця. Несцяровіч піша пра сваё юнацтва, горкае, абпаленае вайной, але незабыўнае і дарагое. Яны, местачковыя хлопцы, учарашнія школьнікі, стварылі баявую групу.

Не толькі слухалі радыё, друкавалі лістоўкі, а і зброю збіралі, чынілі сякія-такія дыверсіі. Самі, без ніякай прынукі. Агромністая трывога за радзіму, яе лёс панавала ў душах, дыктавала ўчынкі, прымушала забыць пра ўсё астатняе. Не ў кожнага пакалення бывае такі зорны час. А вось на долю гэтага выпаў. І трэба было быць вартымі гэтага вялікага часу, не хаваць галаву, як страус, у пясок.

Тут Несцяровічу якраз і памог Ямпольскі. Бо і ён пісаў пра акупацыю. Раней, седзячы над апавяданнямі, малады творца нават не думаў, што з матэрыялу, якім валодае, можа атрымацца раман. І ў архівы ён не заглядваў. Хапіла таго, што добра ведаў сам.

Раман убачыў свет хутка. Выйшаў асобнай кнігай адразу пасля надрукавання ў часопісе.

Старэйшыя пісьменнікі, адзначаючы юбілеі, сталі запрашаць Несцяровіча разам з Галяй. У нейкай ступені гэта было прызнаннем ягоных творчых магчымасцей.

Доўга, пакутліва ішла барацьба за кватэру, бо Галя зацяжарыла.

Яны маглі даўно мець дзяцей, але то адчайна сварыліся, не ведаючы, ці сыдуцца, пажэняцца, то проста не было дзе жыць. У інтэрнаце дзіцячыя манаткі не сушаць. Дый не хацеў Несцяровіч жаніцца з прычыны таго, што дама сэрца цяжарная. Адзін раз такое высакародства ён праявіў. А цяпер толкам неведае нават, ці з'яўляецца бацькам сыну, на ўтрыманне якога вылічваюць ледзь не палавіну заробку. Яго першая каханая, як здаецца Несцяровічу, таксама не ведае гэтага, бо ад аднаго да другога пырхала як матылёк з кветкі на кветку, нібыта не здагадваючыся, што ад такіх залётаў-пералётаў бываюць дзеці.

Несцяровічу прыйшлося прысутнічаць на невялікім баляванні, якое арганізавалі работнікі ГУМа. У зальчыку-бакоўцы магазіна, дзе, відаць, праводзіліся нарады, сабралася народу няшмат: не больш дваццаці ці трыццаці чалавек. Толькі загадчыкі аддзелаў і іншае начальства.

Прычыны балявання Несцяровіч не ведаў. Нарэшце ён высветліў, што гасцей сабрала адна з намесніц дырэктара – паўнацелая, з фарбаванымі, узбітымі, як стог, валасамі, напарфумленая да немагчымасці матрона гадоў пад сорак. Яе жаніх, даволі відны круглатвары бландзін з бакамі, вусікамі і прыкметнай плешынай ў рэдкаватых валасах, таксама даўно развітаўся з часам квітнеючай маладосці.

Галя з гэтай кампаніі выбіваецца. Яна і тут бойкая, жывая, сыпле жартамі, у той час як астатняя публіка па-чыноўніцку строгая, маўклівая, прамаўляе панылыя, аднастайныя тосты. Госці сядзяць нібы аршын праглынуўшы.

"Што яднае двух гэтых людзей?" – думае Несцяровіч, гледзячы на жаніха, банкаўскага работніка, чымсьці падобнага на сытага, лянівага ката, і на нявесту, якая, як яму падаецца, усё зведала, перапробавала, перасмакавала і выходзіць замуж толькі дзеля таго, што ў яе гады заставацца незамужняй не прэстыжна.

Несцяровіч не вытрымлівае і, паколькі нявеста сядзіць блізка ад яго, задае ёй не зусім далікатнае пытанне:

– Што калі муж акажацца раўнівы? Вы на рабоце да ночы. Раптам хто-небудзь захоча вас правесці?

– Ну і што? Няўжо муж думае: пастаўлю яго фотакартку, стану на калені і буду на яе маліцца...

Несцяровіч адчувае, што немаладыя муж і жонка будуць жыць так, як жылі дагэтуль, – як хто хоча. Шлюб для бачнасці...

У кампаніі сядзяць два дацэнты і нават адзін прафесар. Эліта гандлёвая як бы зліваецца з элітай навуковай.

Несцяровіч ведае, што дырэктар магазіна мэблі піша дысертацыю. Яго работай кіруе доктар навук. Сумнення няма, дырэктар магазіна атрымае вучоную ступень: мадэрнавая мэбля цяпер у цане. Несцяровіч даўно выношвае думку: трэба як хутчэй вырваць Галю з асяроддзя хціўцаў і гандляроў.

Цяпер у Несцяровіча два малайцы, якія бадзёра дыбаюць па даволі прасторнай плошчы яго двухпакаёўкі. З першым хлопцам ледзь не тры гады малады дацэнт і трохі вядомы пісьменнік разам з жонкай пражылі ў "вагоне з тамбурам" – так Несцяровіч назваў кватэру-палутарку, якую яму выдзелілі пасля інтэрната.

Цяперашняя кватэра ніштаватая, але вельмі шумная, бо вокнамі выходзіць на праспект. Гэты шум трохі сціхае пасля поўначы, а на золку ўсчынаецца зноў.

Трэба думаць пра лепшую кватэру. Тым больш што будзе яшчэ адно дзіцё.

Несцяровіч не памыліўся, ажаніўшыся з Галяй. Гаспадарку яна цалкам узяла на сябе. Ноччу ўставала да дзяцей, даючы яму магчымасць выспацца. Так яны і жылі.

Яшчэ ў інтэрнацкі пакоік валам валілі Несцяровічавы землякі. Гэта былі пераважна раённыя службоўцы, што прабіліся ў партыйную школу.

Выйшаўшы з інтэрната, пасяліўшыся на першай кватэры, у "вагоне з тамбурам", Несцяровіч з Галяй наладзілі, можна сказаць, княжацкае застолле. У два прыёмы. За адзін дзень усіх гасцей прыняць не маглі: не дазваляла плошча. Два вечары і дзве ночы гудзела невялікая кватэрка ўзбуджанымі галасамі, песнямі.

Пачастунак Галя гатавала сама. Несцяровічу яна не дазволіла нават посуд вымыць.

Праз тыдзень рэдакцыйны фатограф Аляксандр Мендэль атрымлівае кватэру. Несцяровічаў, у якіх ён банкетаваў аж два дні, на сваё наваселле не запрашае.

Ланцужок няўдзячнасці цягнецца далей. Толькі невялікая частка гасцей, пераважна выкладчыкі універсітэта, адплацілі ўзаемнасцю, пазвалі Несцяровіча і Галю да сябе.

З землякамі Аляксандра Іванавіча наогул атрымалася смешна. Калі Галя з мужам прыехалі ў мястэчка, да бацькоў Несцяровіча, го адзін з найбольш частых наведвальнікаў іхняй кватэры, убачыўшы іх на станцыі, кінуўся наўцёкі. Зрабіў выгляд, што іх не ўбачыў. Астатнія аказаліся больш высакароднымі. Да сябе, аднак, не запрасілі. Са сваёй паўлітрай прыйшлі да бацькоў Неецяровіча. На гатовую, так сказаць, закуску.

Пасля нараджэння трэцяга дзіцяці, дзяўчынкі, Несцяровіч нарэшце дамогся, што Галя пакінула ГУМ. Але заставацца без работы яна не хацела. Федзя Чашчавік, які да таго часу стаў дэканам у наргасе, прыняў яе на выкладчыцкую работу. Галя ўзялася здаваць экзамены кандыдацкага мінімума. Ёй нават тэму дысертацыі зацвердзілі.

Яна гарэла энергіяй, бадзёрасцю. Жыла, радуючыся жыццю. Даглядаць дзяцей узялася адна з родных цётак Галі, кволенькая, ціхая, ветлівая. Дзеці яе любілі, і яна з імі добра ладзіла.

Аляксандра Іванавіча жонка аж залішне шанавала. Калі ён, стомлены, прыходзіў з лекцый (здаралася, па чатыры і нават па шэсць гадзін на дзень), яго чакаў не толькі добры абед, але і чарка гарэлкі. Паўлітэрак Галя не купляла – чацвяртушкі. Бутэлечкі хапала на тры дні.

IV

Тым часам у "Юнацкім свеце" ўзнікае непрыемная справа. Рэдактар Гулікоўскі напісаў аповесць "Краснасельцы". Несцяровіч да таго часу стаў рэдактарам аддзела прозы. Вядома, не ён вырашаў пытанне пра друкаванне таго ці іншага твора. Выносіў толькі прапанову.

Прачытаўшы аповесць, ён адчуў трывогу і, не тоячыся, выказаў яе галоўнаму рэдактару. Астатнія супрацоўнікі таксама занепакоіліся. Аповесць для "Юнацкага свету" (да таго часу ён стаў тоўстым часопісам) была небяспечная. У ёй аўтар намаляваў сапраўднага самадура, які кіраваў калгасам, і вельмі нярадаснае жыццё калгаснікаў.

Рэдакцыя думала, гадала, што рабіць. Змякчыць факты – сапсаваць твор. Параілі аўтару напісаць прадмову, у якой дэпутат Вярхоўнага Савета пачынаў размову, завяршаючы яе тым, што вінаватыя зняты з работы і нават аддадзены пад суд.

Але і дэпутат не дапамог.

Работнікаў ЦК камсамола, якія таксама кіравалі часопісам (ён быў і органам Саюза пісьменнікаў), Гулікоўскі называў мяшчанамі. І вось гэтыя "мяшчане" заварушыліся, як мурашкі. Асудзілі аповесць на сваім бюро і перадалі на бюро ЦК партыі.

Тым часам аповесць перадрукаваў зарубежны часопіс. Лёс Гулікоўскага быў вырашаны: зняць з пасады.

Несцяровіч сам звольніўся з рэдакцыі, бо пабольшала спраў ва універсітэце. Ды і для пісання трэба час.

Увогуле нялёгкае жыццё выкладчыка. Цяжка не лекцыі чытаць. Калі добра падрыхтуешся, асвоіш матэрыял, то стаяць за кафедрай прыемна. Бачыш перад сабой удзячныя твары студэнтаў і выходзіш з аўдыторыі з пачуццём выкананага абавязку. І яшчэ з пачуццём свабоды. Няхай сабе да наступнай лекцыі, якая будзе паслязаўтра ці нават заўтра.

І ўсё адно: чытанне лекцый – як прыгон. Выкладчык звязаны імі па руках і нагах. Бо калі лекцыя заўтра, то прыйшоўшы дамоў, паабедаўшы, пачынаеш пра яе думаць. І так месяц за месяцам, год за годам.

Гэта нібы ланцугі на нагах.

Надыходзіць і бласлаўлёная часіна – канікулы ці вось такія, як цяпер, фортачкі ў час экзаменацыйных сесій. Вырывайся ў Дом творчасці і пішы. Можна гадзіну, нават дзве пахадзіць па лесе, паразмаўляць з іншымі творцамі, адцягваючы час, калі трэба садзіцца за стол.

Аляксандр Іванавіч і дамоў звоніць. Бывае, па два разы на дзень. Відаць, гэта таксама падсвядомае адцягванне часу. Бо пісанне – пакута. Самая цяжкая работа, якая ёсць на свеце. Вядома, здараюцца выпадкі, калі пішацца лёгка, натхнёна. За адну ноч можа нарадзіцца апавяданне. Але такія ўзлёты духу бываюць рэдка. Галоўнае – праца. Сядзі, прымушай сябе жыць у часе, пра які пішаш, улазь у скуру герояў, у іхнія душы, выяўляй іх імкненні, жаданні. Пісьменнік – той жа артыст. Але своеасаблівы. Бо нават у невялікім апавяданні вымушаны іграць некалькі роляў. І не так проста даецца слова. Калі садзішся за стол, ёсць толькі агульнае адчуванне таго, пра што трэба пісаць. Ніякага плана няма. Калі і ёсць, то ён заўсёды сарвецца.

Нават газетныя нарысы Несцяровіч пісаў пакутліва. Паедзеш куды-небудзь, пагутарыш з людзьмі, назбіраеш процьму фактаў. Што рабіць з гэтымі фактамі?

Творчы працэс пачынаецца як бы па-за межамі свядомасці. Магчыма, у патаемных глыбінях душы нараджаецца патрэбная музыка, вымалёўваецца галоўная ніць апавядання. Так-так: пісанне пачынаецца з настрою, з музыкі. Яна – галоўнае. Але як пакутліва, марудна яна нараджаецца.

Несцяровіч нават у натхнёныя часы выдыхаецца за тры-чатыры гадзіны. Ён пасля ўпартага і тым больш удалага пісання нібы выціснуты лімон. Ён стомлены, шчаслівы і пусты.

Іншы раз Галя напісанае хваліць або ганіць. Галоўнае, што яна дае яму магчымасць пісаць, беручы бытавы клопат на сябе. З вядомых слоў паэта "не продаётся вдохновенье, но можно рукопись продать" яна найлепей разумее апошнія словы, хоць сама, перайшоўшы на выкладчыцкую работу, чытае лекцыі – па ўсім відаць, добра, – і ведае, што такое натхненне, бо сама трохі артыстка, і ў нудны курс нейкага там бухгалтарскага ўліку здольная ўнесці элемент займальнасці. Студэнты наргаса хваляць яе лекцыі.

Але Несцяровіч не толькі пісьменнік. Ён літаратуразнавец, выкладчык, і часам ловіць сябе на думцы, што сучаснае літаратуразнаўства мае вялікую хібу. Яно пераважна цікавіцца тым, што стварыў пісьменнік, тэмамі і праблемамі, стылем твораў, але зусім абмінае асабістае жыццё творцы. Вядома, калі гутарка заходзіць пра Аляксандра Пушкіна альбо Льва Талстога, тут акалічнасці асабістага жыцця вялікіх мастакоў навідавоку. Але не толькі Талстым і Пушкіным створана літаратура. За ёй сотні "добрых і розных пісьменнікаў", пра якіх, апрача іхніх твораў, шырокі чытач ведае вельмі мала.

Дый беларуская літаратура ў асаблівым становішчы. Многія яе лічаць другараднай. Мала таго што ў Мінску ніхто, апрача пісьменнікаў ды невялікай кучкі закаранелых беларусаў-настаўнікаў, пабеларуску не гаворыць, дык у школе нават беларускую літаратуру пачынаюць выкладаць па-руску.

Чаму так адбываецца? Недаспелая, не сфармаваная цалкам нацыя? І гэта ёсць. Несцяровіч памятае: ягонаму бацьку, стрэлачніку, было ўсё роўна – беларус ён ці не беларус. Размаўляў на "трасянцы", якая ў аснове сваёй была беларускай гаворкай, і цвёрда лічыў, што беларуская мова не патрэбна. Маўляў, і руская зразумелая. Дык навошта выдумляць яшчэ нешта?

Увогуле гісторыя пакрыўдзіла беларусаў. І моцна. Яшчэ ў сярэднявеччы яны мелі дзяржаву, няхай сабе пад чужой каронай. Але не адны яны былі такімі. Гэта было тыпова для сярэдніх вякоў. Францыю стварыла германскае племя франкаў, Іспанію – готы, таксама германцы. След германскага панавання прагледжваецца ў назвах французскай Андалузіі – тут засяродзілася нямецкае рабаўнічае племя вандалаў, у паўночнай частцы Італіі – Ламбардыі, дзе панавалі ў сярэднявеччы нямецкія заваёўнікі лангабарды, якія, мабыць, насілі доўгія бароды. Што з гэтага? Чужаземны элемент застаўся толькі ў назве. Беларусь, да прыкладу, яшчэ ў XIX стагоддзі называлі Літвой.

Дзве вялікія славянскія дзяржавы сціскалі Беларусь з двух бакоў, не жадаючы прызнаваць яе самастойнасць. Вядома, дрыгавічы, крывічы, радзімічы, якія склалі ў далейшым касцяк беларускай нацыі, – усходнія славяне. Яны бліжэй да рускіх, украінцаў, чым да палякаў і чэхаў. Але стагоддзі самастойнага існавання беларусаў нарадзілі своеасаблівы народны дух, норавы, мову, няхай сабе блізкую да рускай ці ўкраінскай, але ў корані самабытную сваёй музыкай, поглядам беларуса на свет, яго філасофіяй. Так-так, усё гэта ёсць у мове. Бракавала сялянскай беларускай нацыі толькі ўласнай інтэлігенцыі. Але рускія дваране, гэтак жа, як эліта іншых краін, таксама пагарджалі роднай мовай. Іншая справа, што лепшыя людзі з пануючага класа павярнуліся да родных каранёў яшчэ два-тры стагоддзі назад.

Несцяровічу падаецца, што ў глыбіні душы ягоная Галіна таксама не дужа цэніць занятак мужа. Па той жа прычыне, што і астатнія. Хоць, з другога боку, жанчына – тайна. Нават некаторыя жонкі геніяльных людзей не падзялялі думак сваіх мужоў, адстойвалі ўласную самастойнасць, незалежнасць. Можа, таму, што адчувалі: жыццё даецца адзін раз, і пражыць яго трэба так, як патрабуе душа.

V

Відаць, ніколі не забудзе Несцяровіч праклятую віхурную ноч, калі ў яго нарадзіліся думкі аб здрадзе Галіны.

Ён тлумачыць гэта цяпер выключнай стомленасцю, спустошанасцю душы пасля напісання рамана і падручніка. Ён у тую ноч заснуў толькі пад раніцу. Чуў, як аціхае віхура, не так глуха ўздыхае лес, не так шалёна свішча вецер.

Бура парушыла сувязь, і ў горад дазваніцца немагчыма.

Пасля бяссоннай ночы сядзець за сталом Несцяровіч не можа. Ён вандруе па занесеных сцежках, правальваецца ў снег, прокладваючы першы след.

Лес у яркім белым убранні. Сосны, елкі нібы ў карункавых сукенках. Але і заплаціў лес за снежную прыгажосць вялікую цану. Шмат танкаствопых хвоек пераламала папалам, некаторыя вывернуты з коранем. Паваленая сасна нават дарогу да сталовай перагарадзіла.

На ўскраіне лесу, сярод якога размешчаны Дом творчасці, стаіць адзінокі хутарэц: звычайная, крытая дранкай хата, з саламяным дахам скасабочаны хлевушок і яшчэ адна ахутаная снегам будыніна, відаць, паграбец.

Хутарэц належыць Івану Валавіку, высокаму, танклявому мужчыну гадоў пад пяцьдзесят, у якога кватаруе сястра-гаспадыня Дома творчасці Мар'я Іванаўна, яшчэ маладая ладная кабета, ветлівая і абыходлівая.

Якую ролю ў жыцці Дома творчасці адыгрывае сам Іван. Несцяровіч не ведае. Можа, ён лічыцца вартаўніком, можа, за ім запісаны якія-небудзь іншыя абавязкі. Бо нямала людзей, нават маладых хлопцаў, дзяўчат, туляцца каля пісьменніцкага дома. Сярод лесу, паблізу Дома, стаіць звычайная хаціна, у якой жывуць дзяўчаты, якія працуюць прыбіральшчыцамі, абслугоўваюць кухню. Маладыя хлопцы, якія колюць дровы, відаць, прыходзяць з вёскі.

Пра адну ролю Івана Валавіка Несцяровіч здагадваецца. Цісне хутаранін паціху самагоначку. Але збывае яе асабліва давераным пісьменнікам, улік якіх Несцяровіч не ўваходзіць.

За Іванавай хатай, каля самай шашы, абсаджанай прысадамі, чыстае поле. Быў тут, на ўзмежку з лесам, зарослы верасам дубняк, у якім нават раннія баравікі пракідваліся. Але дубкі выкарчавалі, і верас знік сам сабой.

Прыкладна за вярсту адсюль – невялікі пасёлак, забудаваны трохі абадранымі глінабітнымі дамкамі. Відаць, там жыве нейкае кіраўніцтва (зямля навакол саўгасная), бо часта па адзінай скразной вуліцы пракочваюцца легкавыя машыны.

Прыемна брысці, няхай сабе правальваючыся ў снег, ускрайкам лесу. Несцяровіч не першы сюды завітаў. Вось ужо і заяц паспеў праскакаць, пятляючы, маскіруючы пакручастыя скокі. І яшчэ ёсць след, які Несцяровіч не можа разгадаць. Можа, воўк бег, можа, хітрая лісіца.

Зімовы лес, асабліва сасновы, не багаты птушкамі. Але дзесьці паблізу дзюбае дзяцел, дабіраючыся на вяршаліне старадрэвіны да схаваных у яе стрыжані лічынак і чарвякоў.

Дзіўна стварыла прырода. Дзяцел тукае жалезным носам і летам, калі жучкоў, чарвячкоў, увогуле розных насякомых, у лесе аж занадта, і іх не трэба даставаць з-пад кары дрэва. Але Бог вызначыў: кожнаму сваё.

Стала прывычнай завядзёнкай, што перш, чым сесці за стол, Несцяровіч блукае па лесе. Ён у такія хвіліны любіць адзіноту. Проста глядзіць на лес, на дрэвы, на зямлю, думаючы аб усім, што ў гэтыя хвіліны набяжыць на душу.

Назаўтра сувязь з Мінскам аднаўляецца, і Несцяровіч размаўляе па тэлефоне з Галяй. У ягоным голасе яна адчувае нейкую трывогу, бо гадзіны праз дзве сама з'яўляецца ў Доме творчасці. Вясёлая, ажыўленая, бадзёрая. Гэта якраз не падабаецца Несцяровічу. Чаму яна так весяліцца, калі ў яго панылы і нават хваравіта-адчайны настрой? Есць жа нейкая прычына, што ў яе адкрылася нібы другое дыханне?

Галя яго супакойвае. Яна ў ім не расчаравана, не выстаўляе прэтэнзій, недакарае за якія-небудзь грахі. Ён праводзіць жонку да шашы, па якой ходзяць аўтобусы на Мінск, садзіць у аўтобус. Свет адноўлены.

Але душу Несцяровіча па-ранейшаму точыць чарвячок недаверлівасці. Ён аднак ведае, што нічым сабе не дапаможа. Вузел пытанняў, якія яго хвалююць, развяжа толькі час. Трэба адно: цярпець. Ён яшчэ не круглы ідыёт і дапускае, што прычына ў ім самім. Хутчэй за ўсё, ён вельмі стаміўся. На лекцыі, семінары, якіх у яго заўсёды было многа, наклаліся клопаты па выданні рамана і падручніка.

Падручнік для апошняга выдання Несцяровіч з калегамі перарабілі грунтоўна. За яго яны нават прэмію атрымалі, аб чым паведамлялася ў газетах.

Так ці інакш, а ў яго яўны ўпадак сіл. Да такога стану душы можа якая хочаш д'ябальшчына падключыцца.

Акрамя таго, падсвядома Несцяровіч адчуваў, што не народжаны апісваць вайну. Куды ахвотней ён пісаў бы пра звычайнае жыццё, гіра каханне, пра лес, поле, імкненні палымянага юнацтва. Тым часам юнацтва ў яго не было, яго ахінула чорным крылом вайна. Ён ведае акупацыю з яе патайной партызанскай барацьбой, фронт таксама ведае, бо апошнія два ваенныя гады прабыў на фронце.

Пішаш пра тое, што ведаеш. Бо немагчыма выдумаць пачуцці, настрой часу, у які адбываюцца падзеі. Дзіўна: пабачыўшы руйнаванне, кроў, смерць, Несцяровіч захаваў цвярозы погляд на жыццё, нават гумар. Відаць, гэта ідзе ад асяроддзя, у якім ён жыве. Людзі, якіх ён ведае, рэалісты па светаўспрыманні, але ў той жа час вясёлыя і гуллівыя.

Прыехаў Піліп Жарстак, ужо немалады пісьменнік, паэт і празаік. Ён, паходзячы з Заходняй Беларусі, адзінаццаць гадоў прасядзеў у турмах панскай Польшчы. І не зламаўся, не страціў бадзёрасці духу, вясёлага гумару. Праўда, нейкая хібіна ў ягоным поглядзе на свет ёсць. На людзей, асабліва тых, што выраслі ў Заходняй Беларусі, ён глядзіць выключна праз акуляры класавай барацьбы. Калі чалавек меў хутар ці

гектараў трыццаць-сорак зямлі, то ў вачах Жарстака ён быў эксплуататарам і фашыстам.

Рагоча Жарстак гучна, раскаціста: "Го-го-го". Ягоны круглы твар з чорнымі вачамі-свярдзёлкамі, вялікім наздраватым носам цалкам выдае пачуцці, якія валодаюць ягонай душой.

Калі Жарстак быў гадоў на дзесяць-пятнаццаць маладзейшы, то тут жа, у Доме творчасці, здарылася з ім даволі рамантычная гісторыя. Афіцыянткай у сталовай працавала маладая асоба, якая неяк вельмі хутка зачаравала пісьменніка. Жыла яна ў лясным дамку. І вось у час вясновага росквіту ў дамок стаў завітваць Жарстак. У новым касцюме, пры гальштуку, з гітарай у руках. Ён хораша іграў, спяваў дарэвалюцыйныя рамансы. Вынікам заляцанняў немаладога пісьменніка сталася тое, што маладая асоба ў хуткім часе прызналася: чакае дзіця.

– Нараджай! – выгуквае Жарстак. – Будзем выхоўваць.

Уласныя ягоныя дзеці амаль што дарослыя.

Дзіця нарадзілася, Жарстак штомесячна прысылаў грошы, а калі хлопчыку споўнілася гады трычатыры, стала ясна, што не пажылы пісьменнік ягоны бацька. Як дзве кроплі вады, хлапчанё падобна да ўвішнага, шустрага шафёра, які працаваў у Доме творчасці і, убачыўшы гэта, знік у невядомым напрамку.

Жарстак любіць пасядзець за чаркай, пабалагурыць, пасмяяцца. Рыхтуецца да гэтага, як да нейкага свяшчэннадзеяння. Не толькі адну-дзве паўлітэркі прывозіць, але і некалькі цыбулін, алею, воцату, каб прыправіць селядзец. Тым часам не ўсіх да сябе запрашае. Найбольш любіць пагаварыць адзін на адзін, без лішніх сведкаў.

Такіх, з кім любіць Жарстак пасядзець за сталом, усяго чалавек пяць. У іх ліку Несцяровіч.

Гадоў дваццаць назад Несцяровіч, калі быў яшчэ маладым хлопцам і працаваў у мазырскай абласной газеце, напісаў рэцэнзію на аповесць Жарстака "Пачатак". Ён не ведаў пісьменніка і назваў яго маладым. Жарстак не пакрыўдзіўся. Ён не быў закалыханы славай і, відаць, дзякаваў кожнаму, хто гаварыў пра яго добрае слова.

Стаўшы выкладчыкам універсітэта, складаючы па даручэнні кафедры праграму па беларускай літаратуры, Несцяровіч у раздзел па савецкай літаратуры, якую сам чытаў студэнтам, увёў творчасць Жарстака. Бо хіба ёсць другі, настолькі адданы ідэям рэвалюцыі, пісьменнік? Як творца Жарстак асаблівых вышынь не адолеў. Тым не меней і вершы ягоныя, і проза мастацкую вартасць маюць. Няхай сабе яны сярэдняга ўзроўню.

Несцяровіч пераканаўся, што Жарстак вялікі ідэаліст. Нядаўняй восенню ён зайшоў да суседа па кватэры, вядомага празаіка Івана Шацілы. Там сядзеў Жарстак. Несцяровіч якраз прынёс навіну пра зняцце з пасады Мікіты Хрушчова.

– Пайшоў у адстаўку, небарака, – першы падаў голас Жарстак. – Дзяржаўны воз нялёгка везці. Чалавек новага тыпу. За ўладу трымацца не будзе...

З гэтымі словамі і Шаціла пагадзіўся. Яны ўдваіх чакалі, што скажа Несцяровіч. Ён назваў іх летуценнікамі. Яшчэ не ведаючы падрабязнасцей ходу Пленума ЦК КПСС,

Несцяровіч адчуваў: Хрушчоў не сам адмовіўся ад пасады – знялі. Бо справа наперад не ішла. Бясконцыя, даволі пуставатыя прамовы, кукуруза, якая сілай навязвалася, словы пра сучаснае пакаленне, якое будзе жыць пры камунізме, – усё гэта вельмі пахла дэмагогіяй.

Назаўтра стала ясна: Хрушчова сапраўды знялі. Нават з трэскам. Перавярнулася яшчэ адна старонка сгракатай, супярэчлівай, імклівай, як вецер, савецкай гісторыі.

VI

Жыццё ўвайшло ў ранейшую каляіну. І ўсё ж сумненні ў душы Несцяровіча ёсць. Ён ужо не адчувае, што ў яго надзейны, жалезны тыл.

Пасля здрады Ізольды ім валодала пачуццё абразы, зняважанага мужчынскага гонару. Ізольдай ён даўно перахварэў. Даказаў сабе самому, што не варта пакутаваць з-за легкадумнай, самазакаханай верціхвосткі.

Несцяровіч перад першай жаніцьбай меў пэўныя сумненні наконт Ізольды. Але ў душы жылі рыцарскія пачуцці. Дзяўчына сказала, што цяжарная, і ён без ваганняў з ёй распісаўся. Нават з бацькамі не параіўся. А сын, вельмі магчыма, не яго. Не падобны на Несцяровіча ні тварам, ні постаццю. Нізкарослы, нявідны. Ды і каляндарныя даты – яны самі сабой запалі ў памяць – не сыходзяцца. Паводле іх, Ізольда павінна была нарадзіць дзіцё ў студзені. Нарадзіла ў снежні. У метрыках аднак запісала нараджэнне хлопчыка студзенем. Маўляў, каб не прыбаўляць сыну лішняга года.

За многія гады пасля развітання з Ізольдай Несцяровіч сёе-тое зразумеў, асэнсаваў некаторыя дробязі, над якімі раней не задумваўся. Яна не заўсёды сама кідалася да мужчын. На некаторых яе наводзілі. Тыя, каму гэта паложана па службе. Настаўніка-гісторыка, з якім яна звязалася пасля таго, як Несцяровіч паехаў з мястэчка паступаць у аспірантуру, юнаком немцы вывезлі ў Германію. Ізольда, выходзіць, правярала яго погляды і настроі.

Галя – мэтанакіраваная, актыўная. Нават аддалена не нагадвае Ізольду. А што калі ён, Несцяровіч, для яе, як і для Ізольды, толькі праграма мінімум? Калі гэта сапраўды так, то мужчына ён нікчэмны. Мужчынскай цвёрдасці ў ім, відаць, няма. Ад сапраўднага мужчыны жанчыны не бегаюць, наадварот, трымаюцца за яго колькі ёсць сілы!

Здаецца, усё прасцей простага. Калі ёсць падазрэнне, завядзі каханку і плаці жонцы той жа манетай, што і яна. Але не атрымліваецца. Нават на прыгожых жанчын, прыгажэйшых, чым Галя, Несцяровіч не надта кідае позіркі. Значыць, ён любіць Галю. Хоць каханне гэтае зусім не падобнае на папярэдняе.

Тое было фактычна першае, юнацкае, з трывалым запасам ідэалізму. Несцяровіч ніколі не сказаў сваёй дзяўчыне таго, што хацеў сказаць. Хваляваўся, нерваваўся і найчасцей маўчаў. Ён памятаў закуткі, лавачкі, месцы, дзе пастаяў ці пасядзеў з дзяўчынай. Праходзячы міма гэтых мясцін і год, і два пазней, ён адчуваў дрыготку ў сэрцы. Чысцейшы Дон Кіхот, які выдумаў Дульцынею Табоскую.

З Галяй было не так. Яны бясконца сварыліся, потым мірыліся, і ніякіх святых мясцін ён не памятае. Аднак жа і да яе прыкіпела сэрца, можа, нават мацней, чым у юнацкім узросце да Ізольды. Ён зразумеў, хто такая Ізольда, і выкінуў былую жонку з душы. Не адразу, вядома. Калі праз год разводзіўся з ёй у судзе, не меў ніякіх ілюзій і ні аб чым не шкадаваў.

А цяпер ён нават не шукае пацверджання здагадкам, падазрэнням у адносінах да Галі. Навошта яму шукаць? Канчатковая ісціна яму проста не патрэбна. Галю ён не пакіне. Бо сеяць дзяцей бяз бацькавічаў па свеце не збіраецца. Растуць пад бацькоўскім наглядам два хлопцы-малайцы і маленькая дзяўчынка, якая яшчэ хадзіць не ўмее, і няхай растуць. Можа, пакутуюць трохі ад неладоў, сварак, якія час ад часу ўзнікаюць між ім і жонкай, але тут ужо нічога не папішаш.

У тую зіму з Дома творчасці Несцяровіч прыехаў прыбіты, прыгнечаны. Дрэнна спаў, галава расколвалася ад болю, рукі, ногі дрыжэлі. Убачыўшы яго такога, Галіна спалохалася.

Несцяровіч аднак не згубіў здольнасць цвяроза разважаць і адчуваў: у тым, што здарылася, сышлося некалькі прычын. Па-першае, ён стаміўся. Чацвярцінкі таксама сыгралі ролю. Расхісталі псіхіку. Хоць па сваёй натуры ён не любіць гарэлкі. Не любіць быць п’яным, бо пасля выпіўкі баліць галава, настрой панылы. Піць малыя, але частыя чаркі прымушала нудная будзённасць, аднастайнасць жыцця. Бо што ён добрае бачыць? Выкладваецца на лекцыях, а ў такія вольныя часіны, як цяпер, едзе ў лес і там яшчэ больш выдыхаецца. Пісанне – цяжкая работа. Натхненне – птушка рэдкая, залятае ў душу ў лічаныя шчаслівыя імгненні.

Галоўная прычына – Ізольда, яе нечаканая здрада. Першае і такое працяглае ў часе каханне, што пачалося ў раннім рамантычным юнацтве, не магло не нанесці Несцяровічу незагойнай душэўнай раны. Ад гэтага нямала пацярпела і Галіна. Іх знаёмства, збліжэнне магло быць радасным і светлым. А яны толькі лаяліся і зневажалі адно аднаго. І дзіўна – не разышліся. Хоць магло гэта здарыцца шмат разоў.

Не хадзіце, дзеўкі, замуж за тых, хто быў жанаты. Бо яны, за малым выключэннем, людзі сапсаваныя.

Узрушэнне, перажытае ў лесе, настолькі моцнае, што Несцяровіч на працягу некалькіх дзён не можа заснуць, звычайныя таблеткі ад бяссонніцы не дапамагаюць. Галіна знаходзіць выйсце: дастае аміназін. Яго даюць толькі псіхічна-хворым.

Несцяровіч глытае кругленькую, жоўтую, падобную на вітаміннае дражэ таблетку і спіць цэлыя суткі.

Мінае месяц, другі. Несцяровіч пакрысе пачынае забывацца на ўспышку рэўнасці, якая выбухнула ў Доме творчасці. Тым часам недарэчны выпадак зноў кідае яго ў вір насцярожанасці і падазронасці. Галіна, звяртаючыся да яго з нейкім пытаннем, раптам называе яго Грышам.

Яго завуць Аляксандрам і гэта, як гавораць у Адэсе, дзве вялікія розніцы. Галіна спахоплівaецца.

– Гэта я пра брата думала. Таго, што ва Уладзівастоку...

Старэйшы брат Галіны сапраўды жыве ва Уладзівастоку і служыць у параходстве. Несцяровіч яго бачыў толькі адзін раз. Хлюставаты, хітры і, здаецца, не вельмі разумны. Гэтаму брату не шанцуе з сям'ёй. Жэніцца ці не трэці раз. І наогул, жанчыны ў яго жыцці займаюць вялікае месца, бо калі прыязджаў у Мінск, то па чарзе наведаў некалькіх былых каханак.

Несцяровіч адразу прымярае нечаканага Грышу да мужчын, якія прысутнічалі на баляванні з нагоды дня нараджэння і ўзнагароджання дэкана факультэта, дзе вельмі віхурна, не так, як звычайна, паводзіла сябе Галіна. Там, аказваецца, было аж два Грышы. Адзін, добра знаёмы, выкладчык марксізму-ленінізму, увесь час пакручваўся каля яе, танцаваў, аказваў розныя знакі ўвагі. Нядаўна ён прынёс Несцяровічу артыкул, надрукаваны на машынцы, просячы змясціць яго ў "Юнацкім свеце", дзе Несцяровіч застаўся членам рэдкалегіі.

Артыкул прагледзела і Галіна, сказаўшы даволі зняважліва:

– Адны цытаты.

Думаць, што Грыша-марксіст заляцаецца да Галіны, перашкаджае яшчэ адна акалічнасць. Вельмі ўжо нягеглы гэты Грыша, а з твару зусім непрыгожы. Як бы ляпіў гэты твар нядбайны майстар і кінуў справу дзесьці на палавіне. Атрымаўся дрэнна абчэсаны клін: вострае падбароддзе, нібы касой разрэзаны рот з тонкімі губамі, такі ж тонкі доўгі нос, глыбока схаваныя вадзяністыя вочы, над якімі навісае вузкі лоб. Ну, як з такім кавалерам можна пацалавацца...

Праўда, фігура Грышы-марксіста файная, спартыўная, на жывоцік, які прыкметна выпіраецца ў Несцяровіча, нават намёку няма.

Другі Грыша – рэдактар вядомай газеты, у якой у свой час працаваў Несцяровіч. У гэтага твар шырокі, з вялізным, вытыркнутым наперад носам. І сам ён вялізны, марудлівы і важыць, мабыць, болей за цэнтнер. Некалі Несцяровіч паважаў рэдактара: узначальвае такую важную газету. З часам расчараваўся: пісаць ён зусім не ўмее.

Раней Галіна расхвальвала Несцяровіча, высока яго ўзносячы: прыгожы, статны, прыстойны мужчына. Ён і сам, відаць, часткова паверыў у пахвальбу. І быў спакойны за будучыню: ад прыгожых мужчын жанчыны не бегаюць. Як цяпер расцаніць факт, што жонка трызніць нейкім Грышам? Можа, памылка? А калі – не?

Мінаюць дні, месяцы.

Несцяровіча ахоплівае трывалы панылы настрой. Жыццё шматграннае. Жыве з ім Галіна даўно, ведае яго не толькі з добрага, а і з дрэннага боку. І што яму за шчасце, калі даведаецца, што ў жонкі ёсць сімпатыя? Кінуць яе ён не можа, трое дзяцей – не жарты. Адзін ужо гадуецца на аліменты, ніякай цягі да бацькі не праяўляючы.

Жыві, квітней, Галіна Мікалаеўна, толькі не называй мужа Грышам. Гэта, канечне, не доказ здрады. Аднак на сумныя думкі невядомы Грыша наводзіць.

Некалі новыя кіраўнікі выкрылі Сталіна, але новых ідэй у замен не прапанавалі. Жыццё ішло па старой накатанай каляіне, хіба што не саджалі ў турму невінаватых. Хоць і гэта здаралася. У Віцебску і, здаецца, у Мазыры былі расстраляны ілжыва

абвінавачаныя людзі, якія прызналіся ў нібыта здзейсненых злачынствах. Доказы міліцыя здабыла па старой схеме – у выніку фізічных катаванняў.

Добра хоць тое, што справы гэтых невінаватых раскруцілі і справядліва далі па шапцы высокім міліцэйскім і судовым чыноўнікам.

Вярнуліся з далёкіх калымскіх, сібірскіх лагераў некалькі пісьменнікаў. Яны расказваюць жудасныя рэчы. Улады – палітычныя, юрыдычныя, сілавыя – свядома тварылі злачынствы на самым высокім узроўні нібыта дзеля апраўдання вышэйшых дзяржаўных інтарэсаў.

Несцяровіч аднак піша пра другое. Пра пакаленне ідэалістаў, якое было досыць шматлікім як у перадваенны час, так і ў віхурныя дні вайны.

Ён, Несцяровіч, не ідэалізуе літаратурных герояў – падпольшчыкаў, партызан, воінаў-франтавікоў. Паказвае такімі, якімі бачыў, бо былі яны звычайнымі людзьмі. Відаць, з яго боку гэта падсвядомае апраўданне часу. Бо былі не толькі даносчыкі-стукачы, каты-следчыя, нікім не выбраныя правадыры, якія пры жыцці давалі ўласныя імёны вуліцам, гарадам (а самаму вялікаму правадыру ўсіх вякоў і народаў ставілі помнікі-манументы нават у заштатных гарадках і пасёлках).

Іронія часу: высокае, гераічнае жыло побач з нізкім, агідным, мірна з ім суіснуючы. Ніхто не пратэставаў. Са школьных часоў Несцяровіч памятае шматлікія радкі з "Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну". Пісьмо гэта напісалі самыя славутыя беларускія пісьменнікі, у іх ліку Янка Купала і Якуб Колас.

Цяпер Несцяровіч ведае, як пісалася пісьмо. Пісьменнікаў сабралі ў Доме творчасці пад Пухавічамі, далі па пакоі, бясплатна харчавалі, а яны сядзелі і пісалі.

Былі харошыя, пранікнёныя радкі ў тым "Пісьме". Напрыклад, гэтыя:

Адважна і пільна ўзлятае высока,
Краіну сваю аглядае штодня,
І цешыцца сэрца, і цешыцца вока –
Якое раздолле, прастор, шырыня!..

Школьнікам Несцяровіч захапляўся гэтымі радкамі, бо яны адпавядалі яго ўнутранаму настрою, марам, летуценням. Ён марыў аб далейшым навучанні, інстытуце, горадзе.

Першыя творы ён напісаў у сярэдзіне пяцідзесятых гадоў, іх настрой супаў з тым настроем, які запанаваў пасля дваццатага з’езда. Аднак як пісьменнік ён належыць да пакалення шасцідзесятнікаў. Але менавіта ў тыя гады ў яго душы прарастаюць першыя парасткі нязгоды з найбольш радыкальнымі дзеячамі, публіцыстамі, якія на выяўленні злачынстваў у час культу асобы будуюць уласную кар’еру. Пушкін, Лермантаў, Някрасаў ды і Талстой з Дастаеўскім, якім прыйшлося жыць, пісаць у эпоху прыгоннага права, фактычна напаўрабства, таксама не ўхвалялі грамадскія парадкі. Сваю нязгоду з імі яны выяўлялі праз даследаванне ўнутранага свету герояў, праз глыбіннае разуменне душы, праз стварэнне філасофіі чалавечага быцця.

У зеніце славы Ямпольскі: носіцца па сталіцах, па загранiцах. Па ягоным рамане хіба толькі балет не пастаўлены. А так ва ўсіх жанрах ён існуе. Хоць кнігу цяжка чытаць. Аж сківіцы баляць ад пазяхання. Вось так: адмятаем адну няпраўду, на ёй расце, як пустазелле, другая...

Гэта пачалося яшчэ з дзён акупацыі, калі па мястэчку праходжваліся немцы. Афіцэры ў седлаватых шапках, з вузенькімі пагонамі на мудзірах і салдаты ў звычайных пілотках. У мястэчку яны прабылі трохі болей, чым два гады. Але і за гэты не надта доўгі час Несцяровіч сёе-тое ўведдў.

Немцы лічылі сябе вышэйшай арыйскай расай. У школе гісторыю выкладалі дрэннавата. Несцяровіч чытаў шмат кніг, у тым ліку гістарычных, але пра арыйцаў, нардычную расу, амаль нічога не ведаў.

Пра сваю вышэйшасць немцы прама не гаварылі і не пісалі. Пачаўшы чытаць нямецкія газеты з першай ваеннай зімы, стараючыся дазнацца, што робіцца на фронце, Несцяровіч толькі зрэдку натыкаўся на незразумелыя, двухсэнсоўныя сказы, накшталт такіх: "Сталіца готаў размяшчалася паўднёвей Кіева", "Крым нарэшце зноў стаў нямецкім", "Рускую дзяржаву, як і краіны ледзь не ўсёй Еўропы, стварылі германскія плямёны".

Яшчэ тады, у акупацыю, прынёсшы з разрабаваных бібліятэк процьму кніг. Несцяровіч пачаў корпацца ў энцыклапедыях, даведніках, шукаючы звесткі пра арыйцаў. Дазнаўся аднак няшмат: пра гэта не пісалі нават дарэвалюцыйныя выданні. З артыкула пра арыйцаў, змешчанага ў энцыклапедычным слоўніку Брокгаўза і Эфрона, Несцяровіч даведаўся: арыйцы – адно з іранскіх плямён, а само слова азначае – высакародныя. У шырокім сэнсе, тлумачыў даведнік, арыйцамі можна называць усе індаеўрапейскія народы, і славян таксама.

Маючы такі грунт, падмурак, Несцяровіч, які ўжо мог і просценькую нямецкую фразу скласці, аднойчы адважыўся выказаць немцу-аграному, які за дзесяць яек выпісваў кілаграм нашай жа савецкай солі, што ўсе народы роўныя, у тым ліку рускія і немцы.

Той не раззлаваўся, толькі здзіўлена паглядзеў на семнаццацігадовага Несцяровіча.

– Не роўныя, – сказаў аграном. – І не гавары болей так. Зразумеў?..

Несцяровіч ягоныя словы ўсвядоміў трохі пазней, калі немцы пачалі выпальваць сёлы, вёскі разам з дзецьмі, дзядамі, жанчынамі. Народ еўрапейскай цывілізацыі, культуры, які даў свету славутых філосафаў, музыкантаў, паэтаў, паліў жывых людзей.

У пасляваенны час савецкія газеты, пішучы пра чалавеканенавісніцтва немцаў, прыводзілі прыклад: у Чэхаславакіі фашысты спалілі вёску Лідзіцэ, у Францыі – Арадур.

Несцяровіч не ведае, колькі было такіх Лідзіцэ і Арадураў у захопленай немцамі амаль усёй Еўропе.

У не надта вялікай Беларусі іх было спалена сотні. Толькі ў Несцяровічавым раёне салдаты дывізіі СС "Варшава" разам з салдатамі вермахта вынішчылі сорак восем паселішчаў з шасцідзесяці. Тры ці чатыры вёскі пусцілі дымам разам з людзьмі.

Зразумела, што нейкіх там беларусаў немцы не лічылі за людзей. Хоць гэтыя "недачалавекі" зрэшты добра давалі заваёўнікам у зубы. Бо грымела чыгунка, ляцелі пад адхон воінскія эшалоны, у вёску, размешчаную ад гарнізона за якія-небудзь пяць-шэсць кіламетраў, фашысты маглі паткнуцца, маючы не меней узвода салдат.

У пасляваенныя гады, вучачыся ва універсітэце, у аспірантуры, стаўшы выкладчыкам, Несцяровіч усур'ёз заняўся пытаннем пра арыйцаў і так званую арыйскую расу.

Ён перачытаў шмат кніг, у тым ліку на нямецкай мове, і зразумеў, што самаўслаўляць сябе немцы пачалі даўно. Яшчэ з XIX стагоддзя. Так нарадзілася захапленне Несцяровіча параўнальным мовазнаўствам. Бо менавіта яно давала ў рукі галоўны козыр: немцы – ніякая не вышэйшая раса, у еўрапейскай моўнай сям'і яны роўныя сярод роўных. Стаўшы на дарогу аналітычнага развіцця, нямецкая мова нават страціла сякія-такія яркія старажытныя формы. Бо бліжэй да санскрыта – самай старажытнай пісьмовай мовы індаеўрапейцаў – стаяць не германскія мовы. Бліжэйшыя сваякі санскрыта мовы армянская, грэчаская, лацінская, балтыйскія і нарэшце славянскія мовы. У тым ліку беларуская. Вось так, панове арыйцы. Кожная мова ўдасканальваецца. Ідзе сваёй дарогай. У нямецкай мове чатыры склоны, у рускай і ў беларускай – шэсць, у фінскай аж чатырнаццаць.

У мовах аналітычнага складу (centum) кіраванне словамі ў значнай меры ажыццяўляецца праз прыназоўнікі, у мовах сінтэтычнага кірунку (satem) праз склонавыя формы.

Ва ўсякім выпадку сістэма індаеўрапейскіх моў адна, марфалагічныя, сінтаксічныя формы кожнай з іх блізкія паміж сабой у параўнанні, скажам, з мовамі ўрала-алтайскімі ці цюркскімі.

VIII

Бяда не ходзіць адна. Падручнік Несцяровіча, трэцяе выданне якога пайшло па школах, відаць, пабачыла Ізольда. Пра заробкі пісьменнікаў, навукоўцаў чуткі заўсёды перабольшаныя, асабліва ў мяшчанскім асяроддзі. Несцяровічу вядома, што, калі выйшла ягоная першая тоненькая кніжачка, па родным мястэчку папаўзлі чуткі, нібыта атрымаў ён неверагодна высокую суму – аж сто тысяч рублёў. На самай справе ганарар быў нават ніжэйшы за месячны заробак дацэнта, з якога Ізольда атрымлівала аліменты. Фактычна яна брала ледзь не палавіну заробку, бо з той часткі, якая заставалася Несцяровічу, вылічвалі яшчэ значныя сумы дзяржаўнай пазыкі (на аблігацыі дацэнты ў форме добраахвотнага прымусу падпісваліся на два месячныя аклады). Але тады Ізольда яшчэ мела трохі сумлення і не квапілася на ягоныя ганарары за літаратурныя творы.

Несцяровіча выклікаюць ва універсітэцкую бухгалтэрыю, паказваюць выканаўчы ліст, прысланы з суда, а таксама даведкі з выдавецтваў аб суме яго ганарару за апошнія тры гады. Ад страху ён ледзь не млее.

За неспагнаныя аліменты з заработнай платы могуць вылічаць палавіну, і калі з палавіны, што застанецца Несцяровічу, забяруць працэнты на дзяржаўную пазыку, то яму застануцца капейкі. За што карміць дзяцей? Жончына зарплата не вельмі... Кніга пішацца два, нават тры гады, і бываюць выпадкі, калі ён па году-два не атрымлівае ніякіх ганарараў.

Якая ўсё-такі дрэнь Ізольда! Сама разваліла сям'ю, звязаўшыся ў першы месяц яго ад'езду ў Мінск з новым, прысланым у школу настаўнікам, а цяпер помсціць. Несумленны яна чалавек у сямейных справах. Несумленны і ва ўсім астатнім.

Не бывае аднак благога без добрага. Як ветрам выдзьмула рэўнасць з душы Несцяровіча. Пра жыццё трэба думаць, а не пра ўсялякае глупства.

Несцяровіч едзе на радзіму. Два ці нават тры гады не быў ён дома. А там усё мілае, ранейшае. Хоць вока прыкмячае перамены. Станцыя, атуленая аграмаднымі, як воблакі, шатамі таполяў, здаецца, трохі змізарнела. Будынкі асядаюць, перон вышчэрбліваецца, на ім лужыны вады. Размешчаны ўздоўж чыгункі дрывяны склад, адкуль Несцяровіч у дзяцінстве цягаў плашкі, каб маці магла прапаліць печ, апусцеў, нейкая частка яго зямлі засаджана бульбай, нават нехта там забудаваўся. Вагавая будка, прылеглыя да тупіковых пуцей склады, пабудаваныя ў апошнія гады перад вайной, ад дажджоў, вятроў пачарнелі, збуцвелі.

А вось іхні агарод. Несцяровіч, калі вяртаўся з паездак, заўсёды ішоў агародам. Аб ногі цёрся бульбоўнік, агурэчнік, разлапістае, стромае лісце кіяхоў – так у іх мясцовасці называюць кукурузу.

Выпетраная, як цявіна, маці, твар якой яшчэ болей пацямнеў, змаршчыніўся, і хворы бацька, які з цяжкасцю ўстае з ложка, сына не чакалі, але ўзрадаваліся ягонаму прыезду.

Бацька, адпрацаваўшы ўсё жыццё стрэлачнікам, проста марыў аб пенсіі. Ён пайшоў на яе нават раней тэрміну. Хацеў свабоды, незалежнасці. Бо стрэлачнік – самая няўдзячная пасада на чыгунцы. Яна проста гняла бацьку. Ды і хворы ён. З маладых гадоў займеў рэўматызм: хадзіў на паляванне і праваліўся ў балотную "чортаву" яму.

Толькі цяпер, стаўшы службоўцам, Несцяровіч зразумеў: у бацькі было вельмі высокае пачуццё адказнасці за даручаную справу. На станцыі стрэлачнік адказвае ледзь не за ўсё. Не на той пуць прыме цягнік – крушэнне. Не гэтак стрэлку перавядзе, цягнік парэжа стрэлку ці сыдзе з рэек. Таму бацька вельмі старанна рыхтаваўся да дзяжурстваў – дзённага і начнога. Як бы набіраўся сілы. А ў доме вечная нястача, бо заробку стрэлачніка пры чатырох дзецях нават на хлеб не хапала. Таму былі нярэдкімі сваркі, звяга.

– Не шанцуе табе, сын, – гаворыць бацька. – У вайну мог лёгка галаву скласці. І мы дрыжалі: вінтоўкі, гранаты цягнуў у двор. А ўзнагароды няма. Пішуць, зневажаюць...

– Нічога, бацька. Сабака брэша, вецер носіць. Пісьменнік – не апошні на свеце чалавек. Ды яшчэ і дацэнт.

– Цяперашні муж тваёй нарачонай, як толькі заступіць на дзяжурства, пячонку ў буфеце заказвае, – азываецца маці. – Не корміць яна яго, не даглядае. І хвастом зноў круціць. Па людзях чутно...

Мястэчка занепадае, хоць называецца горадам. Раён ліквідавалі, цяпер гэта толькі цэнтр сельсавета. Жыццё прыкметна змяніла пульс. Машын стала менш, няма ранейшага руху.

Сюды на перавыхаванне прысылаюць з горада розную навалач. Цыганы аселі ў мястэчку. Маюць коней, аруць людзям агароды і страшэнна крадуць. Прыязджаюць сюды і жанчыны лёгкіх паводзін. На варотах некаторых двароў хоць чырвоны ліхтар вешай. Добрае гаспадарчае сяло з палямі, сенажацямі, лесам, цвёрдымі сялянскімі норавамі ператвараецца ў чорт ведае што.

Куды ісці Несцяровічу? У яго нават думкі не ўзнікае завітаць у школу, дзе працуе Ізольда, пагаварыць з дырэктарам Марыяй Мікітаўнай Весялоўскай, папрасіць, каб паўшчувала былую жонку. Відаць, гонар не дазваляе Несцяровічу зрабіць гэта.

Вечарам ён садзіцца ў мясцовы цягнік, які кіруе па аднакалейнай ветцы на паўднёва-прыпяцкае мястэчка Хвойнае. Праехаўшы дванаццаць вёрст, ён сыдзе, пакрочыць у сяло Міханавічы, дзе жывуць бацькі Ізольды, старыя настаўнікі.

Цяпер Несцяровіч разумее, што з маладых гадоў Ізольда лічыла сябе несусветнай прыгажуняй. Пры такой красе, думала, навошта займацца навукай, чытаць кнігі. Прыгажосць сама па сабе выведзе да багатага жыцця...

Ужо верасень, прыцемак наступае рана. Станцыйныя серабрыстыя таполі шчодра засыпаюць лісцем перон, рэйкі, пуці. З даваеннага часу любіць Аляксандр Іванавіч станцыю, вячэрнія цягнікі, вось гэтыя таполі з шатамі, падобнымі на воблакі. Ён любіць нават цягнік на Хвойнае з абшарпанымі вагонамі, у якіх ніколі не адчыняюцца вокны, пахне пылам, махорачным кіслым дымам. Цягнік марудлівы, ён не імчыць, а фактычна паўзе, адольваючы сорак кіламетраў за дзве гадзіны. Бо пуці з пакарабачанымі партызанамі рэйкамі так ніхто і не перамяніў з часу вайны. Іх толькі скарацілі і прыбілі да шпал на жывую нітку.

Вагон ціха пагойдваецца на ўкарочаных рэйках, праз замутнелае, нямытае акно праплываюць у шэрані вечара дрэвы, кусты, агні далёкіх будынкаў. Рыпіць стары вагон, які даўно пара спісваць. Пасажыраў мала.

Аляксандр Іванавіч выбраў асобнае купэ. Святла няма. Ён глядзіць на шэрыя краявіды і думае пра тое, што ў ягоныя маладыя гады зусім другой здавалася дарога на Міханавічы. Нават сэрца пачынала біцца часцей пры думцы, што ён хутка пабачыць Ізольду. Каханне на свеце ёсць, але, відаць, нярэдка яно ператвараецца проста ў падман. Куды падзелася каханне Несцяровіча да Ізольды? Яно цягнулася дзесяць гадоў, перажыло вайну, доўгае расстанне. І адразу рассыпалася ў пыл, як толькі ён дазнаўся, што Ізольда яму здраджвае з гісторыкам. Нехта ёй параіў гэта зрабіць, хоць і самадзейнасцю ў любоўных справах Ізольда з ахвотай займаецца. Ледзь з’яўляецца

цікавы чалавек, як яна пачынае каля яго круціцца. Відаць, лічыць, што так робяць усе. Шлюб для яе – афіцыйнае прыкрыццё свабоднага кахання. Адзін і той жа чалавек нават за год збрыдзее. Як жа з ім правесці цэлае жыццё? Вось такая нескладаная філасофія Ізольды...

У вёсцы Шабуны, суседняй з Міханавічамі, шчодра свецяцца агні. Шабуны – прыстанішча шафёраў. Узбоч яе пралягае шаша, бадай, адзіная ў гэтым лясным і балотным краі. Але нават не шаша галоўнае. Пры шашы стаіць "зялёны змей"– гандлёвая кропка, у якой заўсёды ёсць гарэлка і сякаятакая закуска. Што шафёру яшчэ трэба? Купіць бутэльку, завітае да якой-небудзь удавіцы. Не на ложку пераначуе, дык на лаве.

А вось і Міханавічы. Станцыі тут няма. Стаіць невялікая будачка, у якой жыве пуцейскі абходчык. У дождж ці снег нават схавацца няма дзе. Праўда, абходчык у такіх выпадках пускае людзей у калідорчык свайго дамка.

Па дарозе ад чыгункі да сяла – могілкі. У паўзмроку ночы паўстае атулены дрэвамі цёмны ўзгорак. Не без прытоенага ў глыбіні душы страху праходзіў некалі міма гэтага месца Несцяровіч. Але ніколі нічога страшнага не здаралася. Мірна спалі нябожчыкі. Нездарма па-нямецку могілкі называюцца "Friendhof" гэта значыць – мірны двор. Дажыві да сваёй пары, чалавек, кладзіся ў вечны ложак, адпачывай. Ні табе кахання, ні здрады, ні знявагі.

Колькі часу не быў Несцяровіч у Міханавічах? Відаць, гадоў дзесяць. Але ён лёгка знаходзіць сцежку, якая выводзіць яго на вуліцу сяла. Вось і гаспадарка Ізольдзіных бацькоў. Дом, палісаднік, сад зліваюцца ў суцэльную пляму. Да гэтага цемнаватага ў шэрані ночы востраа не падступіцца. Высокі дашчаты паркан з нацягнутым наверсе калючым дротам, наглуха зачыненыя вароты, весніцы. Навагу акно нельга пастукаць: яно ў палісадніку, за парканам.

Але Несцяровіч знаходзіць выйсце. Побач з домам вузкі, глухі завулак, які вядзе ў поле. Там агарод былых родзічаў.

Паркан, аказваецца, пастаўлены і там, толькі калючы дрот зверху не нацягнуты. Аляксандр Іванавіч сяк-так пералазіць праз агароджу, ні за што не зачапіўшыся і не парваўшы штаноў. Ён ідзе ў двор, ступае на абвіты дзікім вінаградам крыты ганак, стукае ў дзверы.

У хуткім часе ў сенечках чуюцца крокі.

– Хто там?

Несцяровіч называе сябе.

Яму адразу адчыняе дзверы Сямён Іванавіч, бацька Ізольды. Ён трымае ў руках ліхтар "лятучая мыш".

У пакоі (іх у доме тры) ужо гарыць дванаццацілінейная лямпа. Сямён Іванавіч за час, які не бачыў яго Несцяровіч, яшчэ болей высах, выпетраў, зблажэў. Звычайны дзядок з лысай галавой, з вялікімі акулярамі на тоўстым носе. Затое Матыльда Вацлаваўна, былая цешча, раздалася ўшыркі. Гэтая нездаровая распоўзлая паўната ўразіла Несцяровіча.

Як здалося Аляксандру Іванавічу, былыя родзічы не здзівіліся яго раптоўнаму начному прыезду. Як бы чакалі яго. Не спыталі нават, у якім месцы ён пералез праз паркан.

"Ведаюць, чаго прыехаў", – падумаў Несцяровіч.

Былая цешча, па ранейшым звычаі, раскладае на прыпечку агонь, каб сашкварыць яечню і пачаставаць былога зяця.

Гадзіна ночы. У тры з паловай гадзіны ідзе з Хвойнага той самы абшарпаны цягнік, якім Несцяровіч прыехаў. Яму трэба паспець на яго. Таму ён адразу прыступае да справы.

Аргументы ў яго наступныя. Ізольда атрымлівае прыстойныя аліменты. Столькі, колькі зарабляе сама. Прачула пра падручнік і рашыла, што ён зарабляе Бог ведае якія грошы. А ён за падручнік атрымаў капейкі. Тым часам закон дазваляе вылічваць нават палавіну заробку, калі ёсць запазычанасць па аліментах. На год ці два Ізольда можа пакінуць ягоных дзяцей без сродкаў на існаванне.

Старыя маўчаць. Відаць, была ў іх з дачкой і новым зяцем гаворка пра гэта.

– Хлопцу шаснаццаць гадоў, – працягвае Несцяровіч. – Праз два гады ён будзе паступаць у інстытут. Хто яму дапаможа?

Зноў старыя не гавораць ні слова.

Несцяровіч бачыць, што рабіць болей нечага. Адмовіўшыся ад пачастунку, развітваецца з былой раднёй. Ён повен злосці, хоць не выказвае яе. Ён як-небудзь выберацца з бяды. Не можа быць, каб перамаглі гэтыя прагныя тарбахваты. С

Сямён Іванавіч праводзіць былога зяця да веснічак, закрытых на некалькі запораў.

Несцяровіч зноў ідзе праз могілкі. Дзеля чаго жылі людзі, што ляжаць тут? І ўвогуле, што азначае жыццё, калі яно такое кароткае, і чалавек не паспявае разабрацца ў самых простых рэчах? Ён жыве, не задумваючыся, пакуль не прыйдзе смерць. Гэтак на працягу многіх пакаленняў. У былыя гады на могілках жыла сава. Сярод ночы яна кігікала, наводзячы страх на прахожых. Цяпер савы не чуваць.

Несцяровіч даходзіць да паўстанка. Вісіць над зямлёй глухая, без зыкаў і рухаў, ноч. Неба ад краю да краю густа засеяна зоркамі. Такое неба бывае толькі ў жніўні-верасні, калі лета канчаецца, а восень яшчэ не наступіла.

Прысеўшы на ганак будкі абходчыка, Несцяровіч адчувае, што ён тут не адзін. Здагадка пацвярджаецца. Аддзяліўшыся ад сцяны, да яго падыходзіць чалавек. Ноч светлая, і Аляксандр Іванавіч бачыць немаладога, апранутага ў доўгі плашч дзядзьку з капелюшом на галаве. Дзядзька аднак гаворкі не зачынае, і Несцяровіч рад гэтаму. Ён пасядзіць і падумае. Калісьці гэты паўстанак, будка абходчыка, навакольнае поле, лес-сасоннік мелі над ім вялікую ўладу. Бо па гэтых мясцінах хадзіла Ізольда.

...Смотрю на тёмную вуаль
И вижу берег очарованный
И очарованную даль...

Адкуль гэта? Здаецца, з Блока. Паэт быццам таксама быў няшчасны ў сваім каханні. Трэба падчытаць пра Блока. Ён быў рамантык і сімваліст. Свет для яго поўніўся чароўнымі, загадкавымі вобразамі.

Вялікая сіла – пачуццё. У апошнія год-два перад тым, як ажаніцца з Ізольдай, Несцяровіча пачала запыняць супрацоўніца райвыканкама, якая ў вайну служыла ў арміі. Паўнацелая, ветлівая, з прыемным адкрытым тварам, яна падабалася Несцяровічу. Для яго не мела ніякага значэння, што яна была на год ці два старэйшая за яго. На жаль, да душэўнай блізкасці ў іх не дайшло. Як заноза, сядзела ў сэрцы Ізольда.

Тая дзяўчына доўга не палятала вольнай птушкай. Дэмабілізаваўся капітан ці маёр, нават далёкі родзіч Несцяровіча, і, пахадзіўшы з ёй два ці тры дні, павёў яе ў загс.

Несцяровіч не ведае, дзе яна цяпер, але падсвядома адчувае: яна яго дзяўчына. Толькі ўпусціў ён сваё шчасце. Іначай, відаць, не магло быць. Ён вельмі кансерватыўны ў пачуццях. Ізольда нібы ланцугом прывязала яго да сябе. І ён не змог проста так пераступіць праз пачуццё, якое так глыбока і так даўно ўсталявалася ў душы.

Несцяровіч крыўдуе на сяброў-таварышаў і проста на знаёмых. Ведалі Ізольду, яе звычаі, характар. Не папярэдзілі, не сказалі. Нават блізкія людзі. Тая самая дырэктар школы Марыя Мікітаўна Весялоўская. Тады, калі здарыўся разрыў, напаткаўшы Несцяровіча, яна сказала: "Я ведала – яна табе не пара". Магла б раней сказаць...

Высвечваецца даволі цьмянае вока цягніка, які ідзе з Хвойнага. Пыхкаючы, цягнік спыняецца. Пасажыраў толькі двое – Несцяровіч і дзядзька, які, здаецца, хацеў, але не асмеліўся завесці з ім гаворку.

Яны абое садзяцца ў купэ, якое асвятляецца не электрычнай лямпачкай, а свечкай, устаўленай у падвешаны да столі ліхтар. Пахне пылам, газай, чыгуначнай жарствой. Аблічча суседа здаецца Несцяровічу знаёмым: вузкі твар, шчуплая постаць.

– Я ведаю вас, – нарэшце азываецца спадарожнік. – І вы мяне ведаеце. Вы працавалі ў газеце і часта пісалі пра леспрамгас. У асноўным у адмоўным плане. Маё прозвішча Андрэенка. Я быў намеснікам дырэктара леспрамгаса.

– Насілі дублёны чырвоны кажушок, – успамінае Несцяровіч.

– Была такая апранаха, лёгкая і цёплая. На жаль, знасілася.

Яны разгаварыліся. Высветлілася, што леспрамгаса ў мястэчку даўно няма. Бо няма спелага лесу. (Толькі цяпер Несцяровіч успомніў, што лесасклад, размешчаны ўздоўж чыгуначных путей, пусты. На той зямлі, здаецца, бульба пасаджана, нейкая хата стаіць.)

У Несцяровіча, хоць ён сапраўды крытыкаваў леспрамгас (план заўсёды выконваўся са скрыпам), добры ўспамін пра яго супрацоўнікаў. Там не крыўдзіліся на карэспандэнта, разумеючы, што інакш ён напісаць не можа. Ды і памяркоўная была яго крытыка, без абразы, навешвання ярлыкоў.

Несцяровічу падаецца, што Андрэенка хоча яму нешта сказаць і разам з тым мнецца, не адважваецца.

– Можа, падумаеце, маю доўгі язык, – нарэшце пачынае ён. – Ды справа не ў гэтым. І ўвогуле вас цяпер не датычыць.

– Гаварыце, – просіць Несцяровіч.

– Пра вашу жонку хачу сказаць. Былую. На лесаскладзе быў інжынер па эксплуатацыі. Разведзены. Вельмі яна каля яго пакручвалася. Хацела, відаць, каб узяў яе замуж. Іншы раз, прыязджаючы ў Міханавічы, нават да бацькоў не заходзіла, адразу да яго. Частавала інжынера. Прывозіла выпіўку, закуску. Тым часам інжынер з другой ажаніўся. А яна не ведала і прыехала. Што там было, не ведаю, але рабочыя паўгода рагаталі...

Несцяровіч пра гэта ўжо штосьці чуў. Гэтак жа ўпарта Ізольда дагаджала настаўніку, якога прыслалі ў рускую дзесяцігодку. Нічога не атрымалася, хоць яна так задобрыла кавалера, што той амаль згадзіўся на шлюб. Але ў апошнюю хвіліну перадумаў...

Несцяровіч упэўніваецца, што Ізольда хацела мець інтэлігентнага мужа. На першым часе яна нават пахвалялася: выйдзе за генерала. Але паколькі ў наваколлі не размяшчаліся воінскія часці, якімі б камандавалі генералы, ад мары прыйшлося адмовіцца.

Пасля працяглых пошукаў Ізольда выйшла замуж за станцыйнага змазчыка Мікалая Халюту, які тры ці чатыры гады адсядзеў у турме за тое, што сарваў у вагоне пломбу і выкраў некалькі садовых саджанцаў, якія чыгунка везла для нейкай замежнай краіны.

Несцяровіч ведае Мікалая. Ён з ім вучыўся ў першым класе. Пасля выкліку настаўніка Коля ўставаў і не адказваў ні на адно пытанне. Стаяў і маўчаў. Так і прастаяў увесь першы клас, застаўшыся ў ім на другі год.

Коля – чалавек ціхі, памяркоўны, але бацькі ў яго драпежныя. Вельмі любілі грошы. Відаць, гэта спрыяла ягонай жаніцьбе. Ізольда сама атрымлівала зарплату ды яшчэ і аліменты мела неблагія.

Не жадаючы выйсці з інтэлігенцкага кола, Ізольда і тут не ўдарыла тварам у гразь. Сама паступіла ў педагагічны інстытут, мужа паслала ў вячэрнюю дзесяцігодку. Толькі з гэтага, здаецца, нічога не выйшла.

Цяпер Несцяровіч да Ізольды не адчувае ні любві, ні нянавісці. Шкада толькі мінулага, мар, летуценняў, звязаных з яе вобразам. Бо з Галінай было не так. Ён, бадай, вінаваты перад Галінай. Іх адносіны пачаліся з прэтэнзій і прыдзірак. Ён апёкся на Ізольдзе і раўняў да яе дзяўчат, з якімі знаёміўся. Галі ён аднак падабаўся, і яна не пакінула яго. Пазней яму самому стала страшна, што Галя магла гэта зрабіць. Бо ён гэтага заслугоўваў.

IX

Выніку паездка ў Міханавічы не дала. Трэба шукаць другое выйсце. Зрэшты, навошта шукаць? Тое, што расказаў Андрэенка, сам па сабе харошы факт. І яшчэ падобныя факты ведае Несцяровіч. Колькі разоў ні прыязджаў ён у мястэчка, яго заўсёды лавіла гарэзлівая, пышнацелая крамніца.

– Няўжо не разумееш, хто цябе запрашае? – звужаючы жоўтыя кашэчыя вочы, пытала крамніца. – У некаторых жанчын пачуцці яшчэ не патухлі...

Несцяровіч здагадваўся: запрашае Ізольда. У яе пачуцці ён не верыў. Можа, хацела выхваліцца, што былы муж па-ранейшаму да яе бегае...

Цяпер ён хоча пабачыць Ізольду. Нават трохі яе прыстрашыць. Яна, магчыма, хоча мець грошы на любоўныя ўцехі. Не атрымаецца. Пасаду дацэнта ён пакіне. У выніку яе аліменты прыкметна зменшацца. Ды і ў суд ён напіша заяву: пры трох дзецях Ізольда хоча за яго кошт раскашаваць.

У мястэчку яшчэ жыве стары сябар Іван Млыноўскі, які працуе ляснічым. Яго сына, падлетка, яны пасылаюць паклікаць Ізольду.

Яна не тое што прыйшла, а, можна сказаць, прыляцела.

– Які ты прыгожы! – усклікнула, убачыўшы Несцяровіча. – Дурная была, што абедзвюма рукамі за цябе не трымалася.

Пачатак як бы абяцаў поспех. На стале ўзнікла бутэлька гарэлкі, сякая-такая закуска. Ізольда прыгубіла чарачку, расчырванелася, яшчэ больш павесялела.

– Праз два гады Вадзім скончыць школу, – гаворыць Несцяровіч. – Куды збіраецца паступаць?

– Не ведаю. Няхай сам рашае...

– Хочаш аграбіць маіх дзяцей – Вадзіма аграбіш...

– Трэба яму новую вопратку справіць, абутак. Твой сын...

У гэтую хвіліну адчыняюцца дзверы, і ў хату ўвальваецца Мікалай Халюта, другі муж Ізольды. Ён раззлаваны да шаленства.

– Усё хвасгом круціш! Тайныя спатканні наладжваеш! – лямантуе ён. – Едзь з ім у Мінск. Ні стравы не ўмееш згатаваць, ні сарочку памыць...

Іван асаджвае Мікалая.

– Не крычы. Тут я гаспадар. Да мяне таварыш прыехаў, якога ты хочаш абабраць да ніткі...

– Нічога я не хачу. Я нават нічога не ведаю...

Ізольда падхопліваецца, лашчыцца, прыціскаецца да Мікалая.

– Ён пазваў. Наконт аліментаў. Не хоча плаціць...

Калі Ізольда з Мікалаем пакідаюць хату, Млыноўскі гаворыць:

– Твой сын падказаў. Вадзім. Бачыў майго хлопца. Душа Несцяровіча поўніцца гневам. Навошта яму прыніжацца? Прасіць літасці ў тарбахватаў? Няхай яны просяць...

X

Кола замкнулася. Несцяровіч зноў у Доме творчасці. Цяпер як вольны казак. Ён можа месяц тут прасядзець, можа больш. Два гады – без лекцый, семінараў – яму вызначана на напісанне доктарскай дысертацыі.

Цяжкі быў год. Усё круцілася нібы ў віры. Адна нечаканасць змяняла другую. Ён, вядома, неўрасценік. Такіх раней называлі іпахондрыкамі. Можа прыдумаць гісторыю, паверыць у яе. Хоць у цяперашнім свеце трымай вуха востра. Гісторыя, з-за якой ён пакутаваў, здараецца на кожным кроку.

Несцяровіч адчувае: адзін адрэзак жыццёвага шляху пройдзены, пачынаецца другі. Дзесяць гадоў прастаяў ён за кафедрай. Шкада, не знайшлося студэнта, які б падрабязна канспектаваў яго лекцыі. Можна было самому пашукаць такога студэнта. Бо ён не толькі паўтараў нешта вычытанае, але іншы раз імправізаваў, выказваючы тое, што нарадзілася ў душы. Як прыдаўся б цяпер Несцяровічу канспект уласных лекцый...

Восень. Стаяць у золаце бярозы; нібы барвова-чырвоныя вогнішчы, свецяць сярод астатніх дрэў асіны. Ціха, аднастайна-таямніча шумяць хвоі.

Даўно пасябраваў з лесам Несцяровіч. Яшчэ ў раннім дзяцінстве. Лес навяваў мары, летуценні, як бы рыхтуючы юнака ў далёкую жыццёвую дарогу. Лес і лячыць можа, супакойваць, уціхамірваць, калі мары не спраўджваюцца.

Вірлівы, пакутлівы быў год, і як узнагарода – лясная цішыня. Падае пажухлы ліст, шасціць пад нагамі. На аголеным цёмным вецці вырасце наступнай вясной новы, зялёны, сведчачы, што жыццё не спыняецца, ідзе на новы круг.

1997 г.

Георгій Марчук

Навела «Канон Гарыні»

Рака не чалавек, яна злой не бывае. Шуміць, бяжыць вада Гарыні, і куды яна нясе нашыя гады? Так, відаць, думае рыбак, што сядзіць у носе лодкі з вудаю ў руках і кідае суровы погляд на гурбу падлеткаў, якія, як жарабяты, выкідваючы ўперад ногі, з галёканнем скачуць у ваду. А можа, гэта нам хочацца, каб ён думаў пра хуткаплыннасць жыцця, а ён разважае пра звычайнае, простае і больш нервуецца, што неслухмяныя хлопцы распужаюць усю рыбу. А вас не цікавіла, аб чым думае рыбак, седзячы на беразе ракі? Не хочацца верыць, што толькі пра рыбу. Вада, як і агонь, сваей зменлівасцю падштурхоўвае да разваг. Дрэва статычнае. Атрымаў асалоду ад яго прыгажосці, ідзеш далей, ад вады ж вачэй не адарваць. Ракой не грэбуюць і не абагаўляюць, як дзе небудзь, проста ставяцца да яе паважна, як да старэйшай сястры. Яе някідкую прыгажосць ацэньваюць у сталым узросце, добра павандраваўшы па свеце і пабачыўшы шмат. Спачуваюць гаспадару дома, які стаіць над ракой:

— От, неспакой. Жыві і заўсёды думай, коб вада не знесла. Знай мерай бераг: ці з'ела яго вада?

У векавой барацьбе вады і сушы найчасцей перамагае вада. Але аб гэтым не думаеш, здаецца, усё нязменнае... нізенькі беражок, якому ярка-зялёная трава дапамагае ўтрымліваць плынь ракі які дзесятак гадоў. А бяссільны пясок у адну ноч змывае: глядзіш, о дзіва, пасярод ракі выросла сакавіта-жоўтая пясчаная каса. Рыбак сям'ю не пракорміць, от, забаўкі дзеля, аднак гарадчукі здзекаў з рыбакоў не дазваляюць сабе. Няма такой сям'і, у якой не любілі б ці не ўмелі б варыць юшку. Яна, рака, першай і выхоўвае, загартоўвае характар чалавека, не толькі дорачы штодня сотню-другую верхаводак, але і ўмацоўваючы слабыя ад недаядання мяса мышцы — летам у купанні, а зімою на каньках. Не кожны з падлеткаў ды з дарослых дасць ныpца з парэнчаў высокага моста ў ваду. Рака мае свой нораў, паказухі, дурноты не даруе. Тапельцаў, здараецца, знаходзяць за тры — пяць кіламетраў ад месца трагедыі.

— Не ходзі, дзіцятко, адзін на бераг, коб не ўпасці.

І ўсё ж яна добрая. На Макавея, у дзень свята кветак, жанчыны кідаюць з моста адну-дзве кветкі з букеціка, які толькі што асвяцілі ў царкве. Плывуць гладыёлусы, бархоткі, бяссмертнікі, астры. Ціха прымае дары рака. Далека плывуць кветкі, не тонуць... нібыта Млечны Шлях на шырокай сінявата-зеленаватай роўнядзі. Вербы, лозы, таполі, гледзячыся ў ваду, робяць яе зялёнай. Жанчыны з незвычайнымі, прасветленымі тварамі доўга з налётам суму глядзяць, як знікаюць удалечыні кветкі... сплываюць мары і надзеі, няспраўджанае шчасце... Ніхто з людзей не помніць, не засталося сведак, а рака памятае, як з яе лёду на Хрышчэнне выпілоўвалі вялікія крыжы, у якія ўстаўлялі свечкі. Таямнічы месяц у небе не так прыцягваў да сябе

позіркі, як гэтыя крыжы, што свяціліся на лёдзе. Відавочна адчувалася тады боская сувязь зямлі і неба...

Памёр дзевяностагадовы майстар, які адзін умеў рабіць давыд-гарадоцкія дубы-лодкі. Ніхто яго смерці не заўважыў, як звычайна не заўважаюць яе ў вельмі старых людзей. Рака заўважыла. Яна без лодкі, як гарод без кветак. Такое адчуванне, што маторныя лодкі яе раздражняюць, а вясло яна сама лашчыць. Бяжыць вада, цячэ рака, куды яна нясе мары? Так соладка ляжаць на цёплым пяску і спадзявацца, што наперадзе толькі добрае. І гэта сапраўды так. Бо ўсё даецца чалавеку на радасць, а каб ён усвядоміў гэту радасць, часам пасылаецца і гора. Проста на рацэ гэтая благадаць жыцця больш адчувальная. Чарпануў прыгаршчамі рыбак вады, амыў ёю твар. Спякотна. Птушка ляціць — не чуваць. Толькі ў гарадку і ўмеюць вудзіць рыбу жанкі.

— Олена паставіла на газ бульбу, побегла да ракі, навудзіла рыбы, вярнулася, дык яшчэ і бульба ў гаршку не зварылася. О, спрытная! — не вераць аж, апавядаюць адзін аднаму пра такі «фінт» гарадчукі.

Вада цёплая. Рыбак акунае ўсю кепку ў ваду і надзявае яе, мокрую, на галаву, папярэдне выкруціўшы, каб не цякло на патыліцу. Смехата. Ваду з ракі для піцця і на чай не бяруць: багата ілу, колісь, калі ўсюды і ўсё было больш чыстым, бралі. У туманныя дні з моста моладзь з замірaннем сэрца кідае ў ваду камяні. Усе чакаюць з таямнічай усмешкай, калі камень булькне. Хто не пачуе гуку свайго каменя, жаданні ў гэтым годзе не будуць здзяйсняцца. Усіх, чые хаты стаяць на набярэжнай, клічуць рыбакамі. Не крыўдуюць. Дзяцей адных гуляць у лодкі не пускаюць, крый Божа. Тыя любяць спусціць босыя ногі ў ваду і боўтаць. Сварацца на дзяцей за самавольства і б'юць трохі нават папругай. Увечары закаханыя блізка да вады не падыходзяць... ідуць на Царкоўную гару, адтуль відаць, як у вадзе адлюстроўваюцца зоркі. Так ціхая гаспадыня гарадка і жыве: як сімвал вечнага жыцця, як памочніца, як таямніца, як райская асалода, як доктар, які лечыць бясплатна, здымаючы нервовы стрэс, і як гонар: «А ў вас такой прыгожай ракі няма, як у нас». Ніхто на яе не крыўдуе, што яна перажыла дзевяцьсот пяцьдзесят тысяч жыццяў гарадчукоў ад дня існавання і невядома колькі яшчэ гэтых тысяч перажыве.

Садзіцца за таполямі сонца. Вялікае чырвонае сіта. І заўтра будзе светлы, цёплы дзень. Дай, Божа, яго ўсім сустрэць. Рыбак не ідзе дахаты — хоць ты заманьвай яго, не заманьвай. Не дае спакою думка, які год не дае: аб чым можа думаць прыгорблены ўжо трохі, трохі ссівелы, але яшчэ ў сіле рыбак, які ляніва месіць пальцамі левай рукі мякіш белага хлеба.

Бяжыць рака, шуміць вада, нешта пяе па-свойму, не прасі яе, не пачакае, забярэ і знясе і твае гады. Гарынь мая, Гарынь.

2006 г.

Навела «Канон Маці»

Я ад цябе далека, у іншым горадзе. Ты нават не ведаеш, калі б прыйшла на некалькі хвілін у свой дзень анёла адтуль, адкуль яшчэ ніхто не вяртаўся, якімі б словамі я цябе сустрэў. Я здагадваюся, чым пацікавілася б ты, угледзеўшы мае трохі азызлыя шчокі і глыбокія маршчыны на лбе: «Ці не хварэеш, сынок?» Папрасіла б паказаць праўнучку, якую назвалі тваім імем, пацікавілася б: «Дзе ўсе нашыя, як хата?»

Нашых і не паменшала, і не пабольшала. На месца тых, хто пайшоў за табой, прыйшлі, дзякаваць Богу, новыя сваякі. Нешта вельмі даўно ніхто не дасылае лістоў і пасылак з яблыкамі ды салам. Сяброўкі-аднагодкі твае ўсе паўміралі, а мае аднакласніцы ўсе пайшлі на пенсію. Хаты няма. На нашым пляцы чужыя людзі збудавалі камяніцу. Царкву, у якой ты вянчалася і ў якой цябе адпявалі, адрадзілі, адрамантавалі наноў Адсвяткавалі дзевяцісотгоддзе гарадка. Які ж прыгожы, велічны помнік паставілі заснавальніку князю Давыду. Шкада, што стаіць ён горда адзін, без людзей, якія з ім прыехалі. Нашы продкі. Людзі зноў баяцца голаду, як і колісь, і меней нараджаюць дзяцей. Па-ранейшаму ўсе гандлююць насеннем і гуркамі Гоняць кароў на пашу ды моляцца, каб быў ураджайны на бульбу год. Ты сварылася: «Не прыдумляй, сынок, кажы праўду, біць не буду». А я прыдумляў і стаў пісьменнікам. У творах малюю твой партрэт і пішу твой характар, даруй. Як ты і ўсе гарадчукі, люблю кіслае малако, топленае і бабку на патэльні. Старэйшыя за мяне сын тваёй сястры Коля і яе дачка Маня. За мной ідуць дзеці тваіх братоў Таня, Маруся, Лена. Мы ўсё бліжэй і бліжэй да вахты, да якой ты не дажыла, бо пайшла вельмі маладой. Я ахвотна пішу і пра гарадчукоў, часцяком іх прыхарошваючы, бо людзі, як і пры табе, сустракаюцца розныя: і злыя, і нядобрыя, і зайздросныя. Як успомню, што й яны ўсе памруць, то й нечу іх ганьбіць.Не асуджаю. Словы «так» і «не» належаць Богу, і чалавек мусіць выкарыстоўваць іх вельмі асцярожна. Ты прывяла мяне на Божы свет, узяла за руку, паказала вуліцы, царкву, вадзіла на навагоднюю ёлку і да прычасця, прывяла ў школу, на старым-старым цвінтары паказала магілы продкаў. Я іх не запомніў, каюся. Грэшны. Мала часу-цябе ўжо анёлы прыспешваюць. Трэба казаць тое, з чаго пачаў. Дык вось, я цябе сустрэў бы словамі: «Мамо, не было і дня, каб я не ўспамінаў цябе».

Хачу... каб палажылі ў роднай зямельцы на старэнькіх могілках, якія маўкліва ахоўваюць продкі: жвавы дзед, сціплая бабуля, ласкавая маці, працавітыя дзядзькі ды ўвішныя цёткі. Калі ж не знойдзецца месца, хачу, каб паклалі ля царквы, каб хоць духам,ценем, а ўсё бліжэй да Гарыні хуткаплыннай, Царкоўнай гары, роднай вуліцы. Як гэта прыемна–быць сярод таго, што ўтварыла характар, паўплывала на пачуцці і замацавала адметнае.

Хачу...каб побач спяшаліся дзеткі ў школу, каб прыселі на лаўку старыя дзяды, нетаропка пагаманілі. Хачу, каб грукацеў воз па бруку і каб у святы, асабліва на Вялікдзень, дзеці бегалі вакол царквы, кідалі ўгару запаленыя шышкі...можа, адна з іх

ўпадзе з неба і на мяне. Хачу чуць лёгкі пошум ясеняў, ліпаў закасцельных, звон бомаў над галавой. Сонца асабліва прыгожа, асвятляючы купалы, пасылае ад іх промні на вокны і дахі хат. У прастольныя святы, на Казанскую прыедуць з суседніх мястэчак і вёсак па міласціну жабракі, сляпыя музыкі. О, колькі радасці будзе ад сціплых гукаў гармоніка. Хачу, каб лашчыў, лятаў нада мною даўка-прыемны пах чаромхі і густы пах бэзу. Хачу...чуць, як радуецца жыццю на званіцы ластаўка, як спявае шпак і сварацца вароны. Уначы ляжаць не боязна. Будуць вяртацца з вяселляў, улазінаў, адведак, будзе гаспадар, выпіўшы, спяваць, а жонка таўчы яго ў плечы. Хачу чуць іх песні, лаянку, лпч дзіцяці, якога, як колісь мяне, прынясуць у храм хрысціць. На Радаўніцу, Пакровы нехта абавязкова прыйдзе, пакладзе на магілку чырвоныя яйкі, пасху, чарачку, свечачку, кветачку. Распусціцца акацыя. Дзіця, седзячы на плячах у бацькі, пацягнецца да бялюткіх ландрынак дрэва. У суботу ды нядзелю, калі моладзь збярэцца ў клуб на танцы, будзе пранізваць марозную прастору, несціся аж да зорнага неба шчымліва-журботная мелодыя танга, гарэзлівая полька.

Хочу...каб роснай раніцаю ў першым жнівеньскім тумане гналі побач па вуліцы на пашу каровак, авечак, каб ляніва брахаў сабака, падганяючы іх. Толькі тут, у родным мястэчку, ціша будзе не палохаць, а лашчыць раўнавагай і спакоем. Як хораша! Усё побач. Усё тваё. Роднае. Вечна зменлівае і пастаяннае ў нязменнасці.

Яшчэ хач... ...у...

Не хачу...не хачу...паміраць не хачу!

Мне падалося, што пасля гэтых слоў ты, як заўсёды, падтрымаеш мяне і ўмацуеш мае жыццёвыя сілы: «Так, сынок, не памірай. На зямлі столькі добрага, прыгожага, столькі любові разліта, што не паспяваеш наталіць душу і напалову. Прызнавайся ўсяму жывому ў каханні, бо ў старасці на гэта не хопіць часу».

У царкве Казанскай Божай Маці спяваў невялікі хор мясцовых пеўчых. Спявалі, як заўсёды, хораша і ўзнёсла. У паўсілы пеўчыя не спяваюць. Я стаяў як зачараваны ля царкоўнай брамы і слухаў, слухаў, слухаў...Сцішылася прырода. Аж да нябёсаў неслася: «Господи, да исправится молитва моя…»

2006 г.

Навела «Канон Школе»

Як нялёгка першы раз адчыняць за масіўную ручку цяжкія дзверы школы першакласніку і як лёгка адчыняць у апошнім класе гэтыя дзверы нагой — дзеля форсу, разумеючы, што гэта некультурна. Ратуючыся ад голаду, з Усходу прыехала ў школу маладая пара настаўнікаў. З адным чамаданам, вазонам фікусам, без мэблі і посуду. Усё іх здзівіла: і адносна ладныя хаты, і звычаі, і норавы людзей. А дзеці? Дзеці ўсюды аднолькавыя: цікаўныя, гарэзлівыя, непаслухмяныя і добрыя. Цікаўнасць пераходзць у веды, рухавасць — у самадысцыпліну, непаслухмянасць — у годнасць. Яны, гэтыя чужыя настаўнікі, слухаючы гаманлівых смуглявых жанчын і рана палыселых мужчын, не разумелі іх гаворкі: «Отакешаньке. Муло. Абу шчо». На «вялікім і магутным» даводзілі дзецям свае:

— Этнос. Стержень порядочности. Самообразование. Толерантность. Гармония. Духовность.

Адны пераходзілі з класа ў клас у чаканні новага адкрыцця свету, іншыя — у чаканні першага пацалунка. Але каб не на людзях. Барані Божа. З заплюшчанымі вачыма. У напапову цёмным калідоры, бо ў цёмны клас яна баіцца зрабіць крок. Каб класны кіраўнік 8 «А» не прыкмеціў, каб класная кіраўніца 8 «Б», яго жонка, не заўважыла. Вуліца выяўляе таленты, школа садзейнічае іх развіццю. На вуліцы воля была ўсёабдымнай: хочаш, гуляй у хованкі, у вайну альбо ідзі гнуць на першым лёдзе «рагожу», каб аж сэрца заходзілася ад рызыкі — ці трэсне лёд пад нагамі, ці правалішся, ці паспееш збегчы з палонкі. У школе ўсё іншае: свабода падпарадкоўваецца дысцыпліне і абавязкам. Хадзіць па веды яшчэ не ходзяць, не разумеюць, што веды палягчаюць жыццё, бо, як вучаць бацькі,— грашыма палягчаюць жыццё і толькі імі. Ідуць, каб атрымаць адзнаку па прадмеце, каб быць усім разам у класе, на танцах, на ўборцы бульбы, буракоў, кукурузы альбо на святочнай дэманстрацыі, на канцэрце. Бацькам спакайней, калі дзеці ў школе. Першая работа, хоць і грошай не плацяць.

Класныя не стамляюцца паўтараць:

— Навучыцеся бачыць прыгажосць і цаніць яе. Любіце Радзіму, упрыгожвайце яе сваімі талентамі.

У царкве што — натхняюць тых, хто ўпаў духам, настаўляюць на шлях дабрадзейнасці. Гарадчукі не наіўныя, але сентыментальныя. Што ёсць, то ёсць. У школе, неўпрыкмет сталеючы, увесь час круцішся вакол прывычкі да працы і вакол стрыжня прыстойнасці. Паміж сабой царква і школа тут не спрачаюцца. Усе дзеці хрышчоныя, дома ўсе вераць у Бога, а ў школе робяць выгляд, што згодны з гісторыкам-атэістам.

— Только благодаря атеизму человечество приблизило прогресс.

Прастора замкнутая... але душы не ўтрымаць — яна недзе высока і вольна лунае па-за межамі класа. Над вухам, як надакучлівая муха, лётаюць словы пра геаметрычныя фігуры і матэматычныя формулы (каб яны былі праклятыя), а перад

акном расцвіў бэз... з радыё, якое вісіць на слупе «хіміі» машынна-трактарнай станцыі, далятае сюды неўміручая мелодыя «Бесаме муча». Нудзіцца душа. Разамлела цела. Цягне невядома куды, але ж упарта цягне. Хутчэй бы гэты апошні званок...

Ніхто за вушы ў выдатнікі не цягне. Здольныя ад прыроды да навукі ў пяцёрачнікі выб'юцца самі. Калі ж падчас канікулаў інтарэсамі завалодвае Дом піянераў — там більярд і танцы ў паўзмроку,— школа з цёмнымі вокнамі выгляд мае непрыкметны, аж жахліва. Нічога так яе не зневажае, як адсутнасць званкоў і дзіцячых галасоў.

У маладой прыгожай пары класных кіраўнікоў нарадзілася другая дачушка. Ехалі часова, каб перакантавацца год-другі, ехалі без цёплага сподняга і зімовай шапкі. У вайсковым галіфэ і фрэнчы ён хадзіў на ўрокі аж восем гадоў. Неўпрыкмет перабраліся з цеснай камуналкі ў сваю хату. Купілі ровар, лодачны матор «Вихрь» і тэлевізар. Патроху звыкліся з мясцовым людам, які не разумелі і не ўсё прымалі. Цяпер жа на «конікі» самі настаўнікі апранаюць маскі Чорта, Дзеда, Бабы, Казы, Мядзведзя, Коніка, улазяць у старыя лахманы, мяняюць галасы і ходзяць у марозную ноч калядаваць, спяваючы «Шчодры вечор». Ідуць у хату да бацькоў сваіх дзяцей. Ніхто і не здагадваецца, адкуль «конікі», з якіх кварталаў: з Аселіцы, Мельнікаў, Гары, Вугоня, Навасёлля, Радзічаў? А гэта ўсходнікі — нязломныя атэісты. Смеху варта. Фізік Ёшка любіў апранацца ў цыганку. Для сугрэву ды каб весялей было возьме сто грамаў белай. Трыццаць — пяцьдзесят хат пакуль з віншаваннем абыдзеш, збіраючы харчы і грошы, натомішся, як трактарыст на ворыве.

— Так. Стоп. Дзяўчаты направа, хлопцы налева. А ты куды, Ёшка? За дзеўкамі? Забыўся, кім нарадзіўся? Аёй, аёй...

Рогат на ўсю вуліцу. У мяцеліцу хадзіць яшчэ казачней і для тых, хто «конікаў» водзіць, і для тых, хто чакае. Больш веры ў цуд, у спраўджванне мараў. Вясна, паколькі яе найбольш чакаеш — надакучае за пяць месяцаў зіма, хоць і не студзёная, але снежная,— пралятае, як камета. Вось і ластаўка пад страхой вывела птушанят. Кажуць, Бог асабліва беражэ тую школу, у паддашшы якой гняздуюцца ластаўкі. Заўтра апошні званок. Дык які сэнс жыцця, пытаецца вулічны філосаф — мясных спраў майстра? А Бог яго ведае.

— То паслухай, скажу. Расце дрэва. А навошта? На зіму спілавалі, нарэзалі дроў, дровы далі дым, дым пайшоў у неба і там з іншымі дымамі ўтварыў хмару. Праліўся дождж. З зямлі з зярнятка вырастае новае дрэва, падобнае на тое, што спілавалі. І яго спілуюць, і яно дасць дым. І так бясконца. Дрэва расце, каб яго спілавалі.

Апошні званок — урачыстасць не толькі школы, усяго гарадка. Прыйшлі Олена, Валодзя, Іван, Надзя, Грыцко, Люба, Паўло, Наталка, Якаў, Лісавета, Яўхім, Марыя і Васіль. Ад званка да выпускнога адзін крок, усе спакойныя, бо не было такога выпадку, каб на экзаменах камусьці паставілі двойку. Нервуюцца больш бацькі, бо дзеці добры год ужо ходзяць парамі. Нехта больш смелы марыць увосень падаць заяву на шлюб. Сустракаюцца ўсе выпускнікі на Царкоўнай гары, каб сустрэць усход

сонца. Больш заможны прыходзіць з відэакамерай. Божа, колькі разоў сустракалі ўсход з бацькамі на рыбе, на сенажаці... Чаму ж сёння, чаму такі ён шчымлівы? Чаму пасля гучнага «ўра-а!» раптам усе замаўчалі? Чаму выцер крадком слязу класны кіраўнік 11 «А» і чаму класная кіраўніца 11 «Б» адвярнула галаву ўбок? Заўтра воля. Не, сёння воля! Вось яно і прыйшло, першае выпрабаванне адзінотай. У каго душа яшчэ не зусім прачнулася, таму лягчэй. Бывай, школа. Чаго плакаць? Заўтра будзе інстытут, тэхнікум, а хоць бы і вучылішча, але не будзе больш ніколі таго, хто сёння побач, разам, не будзе роднага класа, які прывучыў аддаваць дабро іншаму. Школа навучыла трохі ўсіх быць людзьмі, бо навучыць адразу на ўсё жыццё немажліва. Не шукайце сабе новых сяброў, лепшых за школьных, іх усё адно не будзе. Прыйдуць дахаты класныя кіраўнікі. Кветкі ў вазах, кветкі ў слоіках, на стале, на табурэтках. Стаміліся, перахвалявaліся ад светла-сумнай радасці, а спаць не хочацца.

Віншую цябе, любая, вось і яшчэ адзін год.

– Ага. А дзесяць не хочаш?

– Няўжо дзесяць? Не верыцца.

Даўно не ўспамінаюць пра пераезд у вобласць ці, на крайні выпадак, у раён. Школа стала сваей. У новым навучальным годзе класная пойдзе на павышэнне: завучам. Абяцалі дырэктарства і класнаму, скроні якога, нягледзячы на яшчэ маладыя гады, кранула сівізна. Куды ехаць? І гарадок зрабіўся сваім. Трэба тут дзяцей ставіць на ногі.

— Спі, любая. Заўтра трэба будзе наведацца ў школу. Наша XX стагоддзе, а ім аддамо XXI.

Жонка ўжо не чуе апошніх слоў, яна соладка спіць, прыціснуўшы да грудзей малодшую дачушку. Не пабудзіць іх і птушка івалга, якая заліваецца ў садзе. Пачынаецца новы дзень салодкай катаргі, якую называюць жыццём. Спявай, івалга, загойвай нашы душэўныя раны.

2006 г.

Янка Сіпакоў

Аповесць «Кулак»

Зіма, 1929 год

– Айё, айё, а хатачка ж ты мая родная... З самаробнай драўлянай скрынкі, што стаяла на снезе, ён узяў у пальцы бліскучы, новенькі (нядаўна панакупляў у раёне) цвік – во яшчэ цвікі купляў: жыць тут збіраўся! – і міжволі адчуў, што ў яго дрыжаць рукі.

Прытрымліваючы локцем дошку, нагнуўся зноў, падняў з гурбы снегу тапор і, быццам праз які засціл, што раптам павіс перад вачыма, засланіўшы ўсё на свеце, пачаў, асабліва не разбіраючы, малаціць як папала абухам – абы толькі трапляць па плешцы цвіка.

З тапарышча абсыпаўся наліплы снег, дошка спружыніла, гула так, як звычайна гудзе труна, калі прыбіваюць века перад тым, як назаўсёды апусціць у магілу гэтую цесную і цёмную хату. У яго сціснулася сэрца – яму здалося, што і сам ён не забівае вокны, а напраўду закалочвае труну. У яго яшчэ болей пацямнела ўваччу, стала горка ў роце, пачало рэзаць у вачах – як усё роўна ў іх сыпануў хто жарствою.

Адразу ж, адно пачуўшы грукат, нібы яна толькі і чакала гэтых першых удараў тапара, загаласіла яшчэ гучней, заплакала, як па нябожчыку, жонка:

– Айё, айё, а хатачка ж ты наша родная! А навошта ж ты нас адпускаеш у такую далёкую дарожачку. А ўчапіся ж ты сваімі вугалочкамі, сваімі клямачкамі, сваімі сенейкамі, сваімі ганачкамі і ўтрымай нас ля сябе. А я ж ужо цябе болей ніколі-ніколі не пабачу, а ты ж ужо не абзавешся да мяне сваімі дзверцамі, не ўсміхнешся сваімі воканкамі. А мая ж ты хатачка... І маснічанкі твае не скрыпнуць больш пад маімі нагамі, і печачка ж твая не прывеціць мяне сваім полымкам. А мая ж ты матулечка... А я ж не пагрэюся ў табе ад марозу ўзімачку, а ты ж не схаваеш мяне ад спёкі лецечкам. Айё, айё...

Юстына, як нешта жывое, роднае, абдымала вугал хаты – то гладзіла яго далонямі, то пачынала драпаць кіпцюрамі, то церлася шчокамі – і адной, і другой – аб шаршавыя, грубавата абрэзаныя звонку бёрны. Яна не адчувала, што ёй баліць, што паабдзірала ўжо ўвесь твар, што з ссадзін сочыцца кроў, а ўсцёрлася і цёрлася і галасіла:

– Айё, айё, а хатачка ж ты мая родная, а як жа я табе радавалася, калі пераступіла твой парожачак, як я табой весялілася, як на цябе ўсё глядзела і нагледзецца ніяк не магла. А ты ж мне была за сяброўчку, а ты ж мне была за матулечку, а ты ж мне была за сястрычачку... А на каго ж я цябе, маю гаротніцу, пакідаю... Ціту і самому хацелася перавярнуць тапор – не абухам, а лязом да акна – пасеч, пашчапаць усе дошкі, са злосцю паададраць іх, толькі што прыбітыя, ад рамы, але ён разумеў, што перарабіць зараз што-небудзь немагчыма: дакументы ўжо на руках, усё лішняе, што не возьмеш з сабою ў дарогу, прададзена, грошы на

перасяленне атрыманы, а на вуліцы ўжо стаіць трое саней, на якія пагружана ўсё тое, што ён хоча давезці да Сібіры.

Засталося толькі прадаць хату, але ён не стаў гэта рабіць наспех: зараз у Сібір перасяляецца многа гаспадароў, і таму хаты зусім абясцэніліся – усюды так і кідаюцца ў вочы аб'явы: "З выпадку майго пераезду ў Сібір прадаецца хата..." Шкада прадаваць яе за капейкі – столькі ж працы ўкладзена! – можа, потым, калі скончыцца перасяленне, яны зноў набяруць цану, ды і савецкая ж улада абяцала памагчы ў продажы, таму ён папрасіў Васіля, свайго суседа, прыгледзець пакуль за хатаю, а як знойдзецца добры, гаспадарлівы пакупец, то і прадаць. Ён толькі прасіў суседа не аддаваць хату якому-небудзь гультаю, свістуну, абібоку, пры якім яна, раскрытая і скасабочаная, падгнілая і гаротная, будзе гібець недагледжанаю. Злуючыся на сваю бяду, на сваю бездапаможнасць, Ціт адно настойліва малаціў па цвіках – спяшаўся як найхутчэй закончыць гэтую непрыемную работу. Ля вугла ўсё галасіла Юстына:

– А хатачка ты мая родная, а як жа я без цябе жыці буду...

– Сціхні ты, Юстына, – супакойвалі яе жанчыны, якія сабраліся, каб правесці іх з вёскі.

– Вы ж там, у Сібіры, лепшую сабе пабудуеце.

– А не хачу ж я лепшае. А я ж хачу ў сваёй хатачцы родненькай жыці, па сваёй ласкавенькай зямельцы хадзіці. Убачыўшы, што Ціт, забіўшы адно акно, пераходзіць да другога, Юстына загаласіла яшчэ адчайней:

– А мая ж ты хатачка... І тут жа сціхла – нібы папярхнулася чым – і па вугле абсунулася, аб'ехала на снег. Да яе падбегла Ляксандра, Васілёва жонка, паспрабавала падняць адна, але тая пластом, мяшком ляжала на снезе, і толькі па тым, як уздрыгвалі яе плечы, можна было зразумець, што яна зайшлася ў бязгучным рыданні. Да іх падбеглі яшчэ колькі жанчын, разам яны паднялі Юстыну і спрабавалі паставіць на ногі, аднак яна ўсё роўна вісела ў іх на руках.

Тым часам Ціт забіў і другое акно. Як толькі ён з тапаром у адной руцэ і драўлянай скрыначкай у другой накіраваўся да ганка, да дзвярэй у сенцы – тры астатнія акны ён забіў раней, яшчэ ўчора ўвечары, калі не было дома жонкі: яна хадзіла да сябровак развітацца, – Юстына вырвалася ад жанчын і што ёсць сілы, блытаючыся ў полах кажуха, пабегла напярэймы мужу.

– Няруш! – прахрыпела яна. Ціт моўчкі, спакойна, стрымана, але настойліва, адсланіў жонку, ды так настойліва, што яна перад самым ганкам упала на снег, а сам, не зважаючы на гэта – нават не зірнуў у той бок, не тое што кінуўся памагаць ёй, – цяжка ступаючы падшытымі валёнкамі, не спяшаючыся падняўся на ганак і, патузаўшы замок – ці добра ён замкнёны, ці не адчыніцца, калі нехта захоча ўлезці ў хату, – узяўся за дошкі, якія, падрыхтаваныя загадзя, ужо стаялі прыслоненыя да сцяны і тут. Пачуўшы, што Ціт забівае і дзверы ў сенцы, – забірае апошнюю надзею астацца дома, – Юстына падняла галаву і толькі прастагнала:

– Што ты робіш, ірад?

І зноў упала тварам у снег, загаласіла ў гурбу яшчэ прарэзлівей, адчайней, няўцешней і пачала грэбці рукамі, разграбаць ва ўсе бакі снег – нібы спрабавала

дагрэбціся да самай зямлі. Яна і праўда, як толькі паказалася шэрая мёрзлая зямля, пачала выкалупваць яе, зледзянелую, пальцамі, пазногцямі і, шырэй расхінуўшы расшпілены кажух, як вар'ятка,узялася запіхваць выграбёнае за пазуху.

– Мамка, няможна так, – падбегла да яе Любка, сярэдняя дачушка. – Прастудзішся. Любка паспрабавала падняць маці, але тая адсланіла яе і запрычытала:

– А зямелька ж ты мая родненькая, а я ж цябе з-пад сваіх ганачак награбу, каб усю тую Сібіру табою засыпаць. А можа ж, ты і там уродзішся, ускалосішся і ў зернейка пераклнешся. Айё, айё, айё...

Падышлі жанчыны, пачалі памагаць Любцы падняць маці, але Юстына не давалася. На нейкі час яна замоўкла, перастала нават грэбці пад сябе зямлю са снегам, нібы задумалася, а потым падняла галаву, села на снег і, ужо зусім супакоеная, дужа рашуча і ўпэўнена сказала:

– А нікуды я, бабы, адсюль не паеду.

Тым часам Ціт скончыў сваю працу, правёў даланёю па дошках, незаўважна, нібы выпадкова, нібы саромеючыся сваёй узрушанасці, пагладзіў дзверы пад імі, затым зняў шапку і нейкую хвіліну стаяў з голай галавою, абводзіў вачыма сваю хату – развітваўся з ёю, як з нябожчыцай. Пасля, ужо нікога не баючыся і ні ад кога не хаваючыся, пацалаваў хату ў дзверы, у вугал, стаў на калені і надоўга прыклаўся губамі да мокрага, яшчэ ў снезе, парога ў сенцы, не спяшаючыся падняўся, рашуча насунуў на галаву шапку, пацягнуў яе за вушы, каб лепей узлезла на галаву, у левую руку ўзяў скрынку з інструментам, куды загадзя паклаў і тапор, падышоў да жонкі, якая ўсё яшчэ сядзела на снезе, моўчкі сачыла за тым, што робіць муж, і, цвёрды і моцны, другою, вольнаю, рукою згроб яе за каўнеркажуха, адным рыўком падняў з гурбы, паставіў на сцежку і так, быццам несучы перад сабою які куль саломы, – Юстына дрэнна стаяла на нагах, ледзь перабірала валёнкамі па снезе, – пайшоў да веснічак. Ён ішоў павольна – нібыта выпіхваў жонкаю ўсіх вяскоўцаў са свайго двара, і тыя паслухмяна паварочваліся да варот і паціху выходзілі на вуліцу. Юстына зараз не супраціўлялася. Толькі ля самых веснічак яна нібы апамяталася, нібы зразумела, што з ёю робяць, і ўчапілася за шула абедзвюма рукамі, але падышоў старэйшы сын, Ягорка, ададраў яе пальцы ад шула, і яна, нібы змірыўшыся з усім, пакорліва пайшла ўжо сама – не супраціўлялася да самых саней. І толькі там зноў вырвалася з Цітавых і сынавых рук, упала на дарогу, зноў пачала выграбаць з-пад палазоў снег і зноў загаласіла:

– А вулачка ж ты мая родненькая, а ты ж болей не падсцелешся пад мае ножачкі. А зямелька ж ты мая даражэнькая, а я ж ужо не ўбачу цябе зялёненькай... Жанчыны плакалі – хто, адвярнуўшыся, мыляў губамі, спрабаваў стрымаць у сабе слёзы, хто сціраў іх з вачэй і шчок ражком хусты, а хто крывіўся, трымаючыся з апошніх сіл, каб не расплакацца, не загаласіць услед за Юстынаю. Ціт жа, здавалася, быў зусім спакойны. Ён, не звяртаючы зноў жа ўвагі на жонку – ну ўпала дык і ўпала, няхай сабе паляжыць, ну галосіць, то няхай сабе і пагалосіць, – не спяшаючыся падышоў да воза, знайшоў на ім зручнейшае месца, не зусім вольнае, але ўсё ж не так закіданае, доўга корпаўся там, пакуль не паставіў надзейна скрынку з інструментам, яшчэ раз

пакратаў, ці моцна стаіць, і толькі ўпэўніўшыся, што яна не выпадзе з саней па дарозе, падышоў да жонкі, якая ўсё яшчэ галасіла, зноў жа адным рыўком падняў яе са снегу і пасадзіў у перадку саней на сена, засланае дзяружкаю.

Неяк бяжком, нібы яна баялася спазніцца, да саней падбегла Васілёва Ляксандра, якая ўжо трымала на руках меншанькага сына Ворашняў – гадкоў пяць яму ўсяго – нагнулася над Юстынаю, абтрэсла снег з яе кажуха і пасадзіла Трахімку Юстыне на калені. Тая няўцямна, нібы ў сне, абняла сына рукамі, прытуліла да сябе, а сама, як звар'яцелая, астоенымі, быццам у мёртвай, вачыма ўгледзелася ў сваю хату. Яна маўчала і не міргаючы глядзела ў адну кропку, здаецца, у акно, нібыта старалася нешта ўспомніць ці нешта разгледзець за дошкамі, за зашморгнутаю, чыстаю і белаю фіранкаю. Ціт зноў зняў шапку, у пояс пакланіўся сваёй хаце, потым тымжа паклонам пакланіўся людзям, што праводзілі іх, сказаў:

– Не памінайце нас, людзі, злом, памінайце нас, людзі, дабром. Жыві здаровенькая, Кросніца!

Надзеў шапку, зашпіліў армяк на ўсе гузікі, паволі абышоў вакол саней, нібы аглядаючы, ці не забыўся што, і сеў уперадзе побач з жонкаю, – але ўжо з другога боку. Азірнуўся, пасачыў, ці ўсе паселі, хто едзе, і толькі тады крануў коней.

Загаласілі жанчыны, пабеглі ўслед за санямі. Яны махалі рукамі, нешта крычалі, але Ціт не чуў іх – дужа і не ўслухоўваўся і не стараўся зразумець, што яны крычаць. Як ні дзіўна, маўчала, сядзела, як мумія, нават і Юстына – каб нехта ўбачыў усё гэта збоку, мог бы падумаць, што шкадаваць рэба якраз тых, хто застаецца тут, што ўсе нягоды і горасці чакаюць не тых, хто сабраўся ў дарогу, а тых, што бягуць услед за санямі і плачуць.

Раніца пачыналася прыгожая. Сонца яшчэ не ўзышло, – зімою, калі і хмар няма, яно паказваецца толькі недзе к абеду, – але ў вёсцы было светла, чыста і празрыста. Паабапал вуліцы дрэвы стаялі ў белым інеі – мусіць, якраз гэты іней, і гэтая белізна асвятлялі ўсё навокал – хаты, вароты, платы і нават сам снег, які ад такой падсветкі, ад унутранага святла здаваўся яшчэ бялейшым. Кросніцкая вуліца зімою заўсёды прыгожая. А ў такія дні – з інеем і чыстым снегам – ён, бывала, любаваўся ёю – калі надаралася вольная часіна, а ўзімку ж, не сакрэт, селяніну крыху вальней, чым летам, выходзіў з хаты і падоўгу, пакуль холад не заходзіў у валёнкі і пад кажух, стаяў ля сваёй хаты і нічога не рабіў – проста стаяў, глядзеў, маўчаў. Зараз ён на ўсю гэтую прыгажосць злаваўся і нават ненавідзеў яе – знарок апускаў вочы долу, каб не бачыць ні самой вуліцы, ні заінелых вакол яе дрэў. Так яны і ехалі – наперадзе ён з Юстынаю і маленькім Трахімкам, за імі, на другіх санях, Ягор з Любкаю, старэйшы сын і сярэдняя дачушка, а ў канцы, на апошнім возе, сядзелі разам Захарка, Лявон Мукасей і Юзік Туміловіч, добрыя людзі, якія аджалелі сваіх коней і сваіх саней, каб давезці перасяленца да чыгуначнай станцыі. Праўда, падрадзіліся на гэтую работу яны не адразу і не бясплатна, – Захарка і Туміловіч, можа, і са спагады памаглі б, а Мукасей нават і з Кросніцы не рыпнуўся б – трэба яму толькі за "дзякуй" аж трыццаць вёрст каня муліць да той станцыі! Ціт ужо нікога і нічога не заўважаў на вуліцы. Усё яшчэ як нежывая, ціхая і, здаецца, абыякавая да ўсяго сядзела і Юстына.

Людзі выходзілі з хат, стаялі ў дварах і за веснічкамі, кланяліся ім, махалі рукамі і нешта гаварылі – мусіць, жадалі шчаслівай дарогі. І толькі, калі Ворашань убачыў, што ля свае хаты стаіць і Харлам Шрубянок і таксама махае рукою і таксама нешта гаворыць, ён зморшчыўся, як ад чаго дужа кіслага ці горкага, нібы ачуўшыся, трасянуў галавою і ў злосці пачаў сцябаць каня, каб толькі хутчэй праехаць і гэтае месца, і гэтага праклятага чалавека, якога ён ненавідзеў усёю душою. Сустрэча са Шрубянком была непрыемная яму: сэрца, якое дасюль маўчала, як каменнае, – ён і не чуў яго ў грудзях, – зараз затрапяталася, забілася ў неспакоі і ў трывозе. Ціт зноў убачыў, якія прыгожыя заснежаныя хаты, дрэвы, сама вуліца ў Кросніцы, і ён нібыта вось толькі зараз, ужо выездзе з вёскі, зразумеў сэнс Юстынінага галашэння: дык яму ж ужо і напраўду ніколі не пабачыць вось гэтых хат і дрэў, вось гэтай вуліцы... І Ціту, як і жонцы, захацелася загаласіць, завыць на ўсю вёску самому.

Конь, падагнаны пугаю, нейкі час бег наўскач, але ўбачыўшы, што яго болей не трывожаць, зноў перайшоў на звычайную хаду. Тады іх дагнаў Лявон Мукасей – Ворашань аж уздрыгнуў, калі той як не над самым вухам нечакана закрычаў:

– Майго каня, Ціт, не сцябай. Дарога далёкая, яшчэ, крый бог, да дыхавіцы загоніш. Тады і грошы мне твае не нада будуць.

Сказаў і спыніўся ўзбоч дарогі – чакаць сваіх саней. Выехалі на поле. І яно было белае-белае і чыстае-чыстае – снег, што панападаў гэтаю ноччу, не паспеў яшчэ забрудзіцца, на ім, апрача толькі дарогі, па якой нехта паспяшаўся праехаць перад імі, не было пакуль ніякіх слядоў. Снег, прыхоплены марозікам, ляжаў белы аж да галубіны, кожны кусцік у полі і кожнае дрэва ў прысадах стаялі ў пушыстым светлым інеі, і было так ціха і спакойна, і было так прыгожа, што ад усяго гэтага, каб у іншы час, нельга было б адарваць вачэй. Але зараз і поле яго раздражняла – ён ненавідзеў і поле. Азірнуўся на вёску, убачыў ля балота сваё гумно, свой ток, убачыў сваю бярозку, якую сам, яшчэ малы, пасадзіў прутком ля свае палоскі, – хаты, што стаяла з таго боку вуліцы, не згледзеў, яе засланілі стрэхамі, дрывотнямі ды хлявамі бліжэйшыя двары, але і не ўбачыўшы, ён уявіў яе, зараз нямую і сляпую – без людскіх галасоў, з забітымі вокнамі, – і ледзь стрымаўся, каб не закрычаць ад роспачы. Зямелька наша родная! Ты ж і прыгожая, ты ж і жаданая, ты ж і ласкавая, ты ж і шчодрая. У цябе ж і снягоў хапаіць, і дажджоў даволі. На табе ж і спёка не страшная, і маразы не смяротныя. І поле тваё мякенькае, і рэчка твая чыстая, і лес запаслівы, і луг твой – увесь у красках. Нашто ж мы пакідаем цябе?! Што шукаем у чужых землях? Куды едзем і навошта?! Я ж, да прыкладу, любіў цябе ўсё сваё жыццё, і ты сама, адчуваючы маю любоў і ласку, таксама гарнулася да мяне. Дык чаму ж мяне разлучаюць з табой? Дык чаму ж не даюць нам спакойна жыць і работаць на табе?! За што здзекуюцца з нас?! За што ненавідзяць?! За што караюць?! За што?!

– За што?! – як рэха, паўтарыла за ім Юстына, ён толькі зараз зразумеў, што апошнія словы вымавіў услых. І яму стала няёмка за сябе – во, мужчына, ледзь не расплакаўся, як баба.

– За што? – яшчэ раз выдыхнула, як крыкнула, Юстына, зноў загаласіла і, мацней прыціскаючы да сябе Трахімку, паспрабавала злезці з саней. – А Ціточак жа ты мой, а родненькі, а даражэнькі, а давай жа мы з табою дамоўкі вернемся... Ціт адну руку цяжка паклаў жонцы на плячо, моцна, нібы ўціскаючы Юстыну ў сена, прыціснуў яе да саней, а другою, у якой была пуга, рашуча ўзмахнуў у паветры і без разбору, бе пярэдыху пачаў сцябаць каня. Ён круціў пугаю над галовамі ўсіх, хто сядзеў у санях, і стараўся ямчэй і балючай дастаць ёю каня. Часам яму здавалася, што гэта не Лявонаў, а ягоны жарабок, але і з-за таго ў Ціта не з'яўляліся жаласлівасць і шкадаванне да жывёліны. За ім гнаўся і нешта злосна крычаў Лявон – вядома ж, лаяўся, што Ціт так б'е каня, вядома ж, патрабаваў, каб паклаў пугу, каб не сцябаў ягонага стаенніка, ягонага кармільца: яшчэ ж такая доўгая дарога, а ён так яго гоніць... Мукасей бег услед, стараўся дагнаць пярэднія сані, каб адабраць у Ціта вожкі і пугу, але Ціт, не зважаючы ні на што, усё падганяў і падганяў Лявонавага каня, і той, хоць і так ужо бег як не галопам, пасля кожнага новага ўзмаху пугі аж вылузваўся са збруі, з аглабель. Астатнія вазы адсталі далёка ззаду, а яны вельмі хутка даімчалі да лесу. У лесе было ціха, аж закладала ад цішыні вушы, і конь пайшоў спакойнай хадою.

Азірнуўшыся і апошні раз убачыўшы з лесу ў прагале дарогі за белым полем шэрыя хаты сваёй роднай Кросніцы, Ціт Ворашань зноў падняў пугу, зноў са злосцю сцебануў каня – каб і гэтая апошняя відзежа знікла хутчэй, але прытомлены ад нядаўняга бегу конь не дужа адазваўся на пугу: адно толькі падабраў заднія ногі, але не пабег, а ішоў і далей сваёй жа хадою. Ціт, нібы супакоіўшыся і сам, перастаў яго падганяць, тузаць, злавіў на ляту кончык пугі, падабраў, прыціснуў яго да пугаўя, і так разам з пугаўём паклаў каля сябе. Не, Юстына, назад ужо нам з табою няма вяртання. Назадзе ўжо ў нас нічога няма, нічога не асталося. Усё наша, Юстына, толькі наперадзе. Пра тое, што было, забывацца нада. І пра коней, і пра хату, і пра поле. Коней папрадалі, аджалелі – вунацька нават расстрыга кросніцкі, былы бацюшка Раман купіў, але я за яго спакойны, у яго сена ёсць, а во чым будзіць карміць майго каня да травы Паласаты, шылахвост гэты, дык я і сам не ведаю. І хату пакінулі з забітымі вокнамі... Не, Юстына, нам пара думаць пра новую хату. У старой нам ужо не жыць. Значыць, Юстына, зараз мы з табою ніхто і нішто. Нас, Юстына, няма. І таго, што ў нас было, ужо няма, і таго, што яшчэ будзіць, – таксама няма. Знікні мы зараз, і ніхто не заўважыць, не парупіцца, дзе Ворашні падзяваліся: і адсюль выехалі, і туды не прыехалі. Спярша Ціт і не думаў нікуды выбірацца са сваёй Кросніцы. Жыў сумленна, працаваў многа. Бацька, падзяліўшыся, крыху даў зямлі, а астатнюю сам, сваім гарбом зарабіў, за свае мазалі прыкупіў. Сорак дзве дзесяціны меў. Во гэтая зямля многім у вочы і калола. У жываглоты залічылі. Кулаком абазвалі. Ну няхай ужо я кулак. А то ж і Юзік Туміловіч – таксама кулак. Смехата! А бацюхны мае родныя, што ж гэта робіцца – а ў таго ж кулака толькі дзевяць дзесяцін зямелькі ўсяго. І хутар свой ён атрымаў толькі ў сталыпіншчыну. А яны ледзь што – кулаччо. "Ну што, наелі пузы на чужым хлебе?" – "На чыім жа гэта – чужым?" – хочацца запытацца ў іх. Можа, на вашым? Ага, разяўляй рот шырэй – на вашым хлебе наясі пуза – з голаду памрэш. Можа, на Казябавым хлебе мы пасыцелі? А ў яго і хлеба нямаш. А хто вінаваты? Я? Ці,

можа, Юзік Туміловіч? Піхума! Сам Казяба вінаваты. Рабіць нічога не ўмеець ды і не хочыць. Вунацька хаты і то не накрыець. Стаіць расхрыстаная. А што, я яму хату крыць буду? На яго страху палезу? О, ён бы, стадыр малахольны, не адмовіўся, каб яму гэта нехта зрабіў. Стаяў бы, грыбы развесіўшы, ды яшчэ б і злаваўся, што не па-ягонаму крыеш. Свістуны! Прывыклі – рукі ў кішэні і свішчуць. Але калі толькі дзе якая заварушка пачнецца, дзе нешта дзяліць пачынаюць – яны тут як тут: дзе дзеляць, што дзеляць?.. Мы беднякі, мы батракі. А нам, а нам. Горла вялікае, балбатаць умеюць, а рукі ў рацы. Вунацька той жа самы Юзік Туміловіч спрашыіць у сельсавеце ў Поклада: "Чаму гэта мне такі вялікі падатак запісалі?" – "Бо ты багаты. Ты ж у лесе пяцьдзесят рублёў зарабіў". А чаму гэта вы, вашы гультайскія вялічаствы, не зарабілі, у лес не паехалі? Хто вам не даў зарабіць? Ці унь як я цэлую восень каменне з поля вазіў, пасмейваліся: дурную работу Ціт робіць. А як я прадаў тое каменне ў горад – эх, заварушыліся: Ціт займеў многа грошай, абкласці яго дадатковым падаткам, а то і ўвогуле адабраць усё, што ён за каменне атрымаў. Піхума, а чаму ж вы не звозілі тое каменне? У вас жа зямля аж стогніць ад яго. Дык не, яны, піхума, цэлую зіму ў карты рэжуцца, а Юзік з Цітам працуюць. А дзяліць тое, што Юзік і Ціт зарабілі, пароўну хочуць: і мне дай, і мне дай. І на ўсіх сходах канькаюць: нам дай, бо мы беднякі, нас ад падатку вызвалі, бо мы батракі. А мне, вунацька, як і Юзіку, толькі падатак набаўляюць. І я быў спытаўся ў Поклада, як ён справаздачу ў сельсавеце даваў: "Чаму мне за пяць гадоў ні разу не скінулі ні падатку, ні штрахоўкі?" – "Таму што ты – кулак і без гэтага багаты", – выскаліўшы гнілыя зубы, зарагатаў той. А яны ўсё мне ў падатак залічылі, нават няўдобіцу, хаця па закону нельга няўдобу нікуды залічаць. А на маю дурную галаву, дык я б гаспадароў ад падатку вызваляў, бо яны ж працуюць, а на іх, гультаёў, у трайным бы памеры паборы накладаў. А, у вас нічога няма? А чаму няма? Таму што лянуецеся, лынды б'еце? Таму і плаціце за гэта. Хто ж вас бясплатна карміць будзіць? Маеш зямлю, дык і плаці. Хопіць савецкай уласці гультаёў разводзіць. А яны хочуць, каб ім нехта ўсё на талерачцы паднёс. Громаадвода паставіць самі не могуць, піхума. Крычаць: "Мы баімся грому, гром – наш вораг, памажыце нам з ім ваяваць, пастаўце громаадвод". А самі вы чаму не паставіце? Чакаеце, калі Ціт вам паставіць? Усё ім падай, піхума. Абдэмухі! Улетку унь я мост стары забраў. Пабудавалі новы, а гэты валяецца. Гнісці пачаў. То я і забраў яго. На дровы. Парэзаў, пакалоў, у касцёр склаў. Прыгожы такі дрывоўнік выйшаў. Дагэтуль ніхто не бачыў таго моста. А тут, як ім вочы хто прадраў, усе ўбачылі. Божа мой, што тут пачалося! "Кулак забраў сабе стары мост на дровы. А ў нас ёсць беднякі, якім больш патрэбны апал". Дык што, я гэты мост павінен быў Казябу на двор завезці? А ў яго ж і двара нямашака. А чаму ён сам, скажыце, не разабраў гэты мост, калі ў яго апалу няма? Дык за палена зачэпіцца, а не падымець, гультай гэтакі. І мосту таму ён бы не дадумаўся, як рады даць. А як толькі я парэзаў, усе ўбачылі. Харлам Шрубянок, сапло гэтае, нават у газету напісаў, як кулакі ў Кросніцы здзекуюцца з беднякоў. Піхума! Камісія прыязджала. Пастанавілі, каб я гэтыя дровы сваімі коньмі Казябу завёз. Ага, чакайце, я гэтаму абібоку яшчэ дровы павязу. Можа, і нос яму падціраць Ціту загадаеце? Не дачакаецеся! Я-то і завёз

тыя дровы, але за вёску, у ямы. Там агонь наклаў. Усю ноч паліў вогнішча. З суседніх вёсак аж людзі папрыбягалі. Думалі, Кросніца гарыць. А ўраніцы пайшоў да Шрубянка і кажу яму: "Схадзі да Казябы і перадай свайму другу: няхай мае дровы ў ямах забіраець. А заадно і каня яму свайго дзеля гэтай справы дай". А дзе ж ён, Шрубянок, каня таго возьмець? І ў яго ж, як і ў Казябы, каня няма – на пячэнні праеў. Во гультаі, во абібокі, апанавалі, абселі сумленных, руплівых гаспадароў, што тыя і паварушыцца не могуць. "Кулаччо"... Во скураты няшчасныя. Яны ўжо, ці бачылі вы іх, свае патаемныя сходы праводзяць, куды нас не пускаюць. О, піхума! А што гэта за сакрэты такія ў вас? Юзік вунацька схадзіў быў аднаго разу, пагаварыў з імі. "Чаго гэта нас падзяляюць? Мы ж такія, як і вы. Усе мы аднолькавыя". А яны яму: "Не, не такія – вы кулаччо, а мы беднякі". І выгналі Юзіка, як сабаку, з хаты. Во выступіў дык выступіў на бядняцкім сходзе. Тут, праўда, ужо і заможнік Саўка Церах раззлаваўся – у ягонай хаце гэтая сходка была: у іх жа ні ў кога і хаты людскай нямашака, каб сабрацца, ва ўсіх адны кануркі. Раззлаваўся, значыць, Саўка, нават лямпу забраў – крычыце, галадранцы, упоцемку. Дзіва дзіўнае, калі гэта было, каб сваім нядбайствам, гультайствам людзі хваліліся? А цяпер хваляцца – я бядняк, у мяне нічога няма, бо я ляны, не хачу працаваць, а хачу кіраваць. Але ўсіх жа ўсё роўна ў кіраўнікі, у дэпутаты не выбераш. Таму і самі між сабою грызуцца. І бабы як паашалелі таксама. "Мы ўсе хочам быць дэлегаткамі, усе хочам вучыцца". А на мой дурны розум, дык нашто вам гэтае дэлегацтва? Калі ты дзеўка, то гуляй з хлопцамі, калі старая – сядзі з дзецьмі. Сядзі за печкаю, чаго ты ў той Савет лезеш? Калі ты гаспадыня, шчыравальніца ў хаце, дык табе заўсёды работа і дома знойдзецца – няма калі па тых Саветах бегаць. А калі табе, гультайцы, дома няма чаго рабіць, то і Савету ты не паможаш. Як вунацька Казябака Яўсцыся – куды ты яе ні выбірай, з яе, лайдачыны, усюды наедку, як з той таркі. А яна ўсюды лезець, усюды крычыць: "Цяпер наша ўласць, беднякоў". Не беднякоў, а гультаёў. Вывалачні, трутні, піхума. Так во ў Саветы і зараз выбіралі. Без нас. Усе Каляды па хатах асобна збіраліся. Заможнікаў і то рэдка калі да сябе падпускалі. Ужо не гаворачы пра нас, "кулаччо". "Не пусціць кулацкія кандыдатуры ў Саветы". "Не дадзім кулакам і падкулачнікам ніводнага голасу на перавыбарах". Во абібокі дык абібокі. А хто ж тады свіней пасвіць будзець, калі мы ўсіх чалядак у Саветы выберам? Вунацька і Юзік Туміловіч, хоць яго і выгналі са сходу, усё роўна ў Савет хацеў прайсці. Нават пазычаў беднякам па пуду жыта, каб яны толькі за яго галасавалі. Дзе там! Колькі ваўка ні кармі, ён усё роўна ў лес глядзіць. І жыта Юзікава з'елі, і Юзіка ў Саветы пракацілі. А Яўсцысю Казябішку – выбралі... Дурнота, піхума. А праўду скажаш – не любяць. А хто яе, тую праўду, любіць?! "Чаго раскрычаліся? – пацяшаюцца. – Што, жываты забалелі? Ну пакрычыце, пакрычыце, можа, і перастануць. Ды і што вам у нашых бядняцкіх Саветах нада?" А і праўда, што нам там нада? Што мы там забыліся? Канечне, мне той іхні Савет не нада, але ўсё ж... Еду я неяк з лесу, бачу, людзі спяшаюцца да Бубчонкавай хаты. І хатка тая цесненькая, і вокны ў ёй пазамёрзлыя – нічога не відаць, а мне так ужо моташна на душы стала: мяне ж там у гэтай хаце не чакаюць, мяне ж туды дайжа не пусцяць. Я адшчапенец, я пазбаўлены голасу, я лішэнец... А які ж я такі праступнік, каб мяне на сход не пускаць? А ў чым я перад

зямлёю сваёю правінаваціўся? Ды і перад тымі ж самымі беднякамі? Толькі тым, што я працую больш за іх? Што, як вол, свету божага не бачу за працай?

Канечне, і я б мог так жыць, як вунацька Аўлас Доўгі жывець. Устаніць, памыецца, прычэшацца – валасінку да валасінкі, .мокрыя, прыложыць, – паснедаець, выйдзіць на вуліцу і на сонца глядзіць: а яно ўжо недзе к абеду падкочваецца. "Ого, як яшчэ рана", – скажыць і на лаўку – гэп! – сядзіць. Сенакос не сенакос, жніво не жніво, а ён сядзіць і сядзіць. Таму ўсе свае пожні пакосяць, а ягоная стаіць. Гаспадары чакаюць, чакаюць, пакуль ён скосіць, а пасля па яго траве і хадзіць і ездзіць возьмуцца. Во тады Аўлас і злавацца пачынаіць, і судзіцца ў акругу ездзіць. А чаму ты, выradак, не скасіў сваю пожню, як усе касілі? Божа мой, а чым я вінаваты перад гэтым абібокам Доўгім?! Перад Казябам і яго Яўсцысяю? А Сапло ж і за іх мяне вінаваціць. А каго ён не вінаваціць, гэты Сапло? Унь нават лесніка аббрахаў: той, ці бачылі вы яго, звязаўся з кулакамі і аддаець сваю сенажаць касіць не беднякам, а кулаку Шаблоўскаму. Але Слыш, праўда, яго адбрыў. Кажыць: "Не торкай ты, Харлам, свайго носа ў маю дзюрку. Што я з вамі, галотай, займацца . буду? Вы ж работаць не ўмееце. Вы, слыш, па маёй сенажаці месяц поўзаць будзеце. А Шаблоўскі паставіць адразу дзесяць касцоў, дык яны за адзін дзень усё і скосяць". Ну і свістуны! Што ты зробіш, цяпер іхняя ўласць – яна дужа чамусьці за гультаёў заступаецца. Але наедку з гэтага пакуль што няма. Дык што яны, піхума, і праўда хочуць дзяржаву гультаёў сабе абкалкаваць, ці што? А хто ж работаць будзіць, хто ж іх, абібокаў, карміць будзіць у той дзяржаве? Беднасцю сваёю хваляцца. Дык вы ж, паразіты, самі ў сваёй беднасці вінаватыя. Рабіць нічога не хочаце, дык адкуль жа яму, багаццю таму, брацца? Багацце ж, яно ў вашых руках, на вашых далонях завязваецца. А яны беднасцю адзін перад адным выхваляюцца. І першыя ў арцелі бягуць – несці ж туды ім няма чаго. Лёгка з пустымі рукамі бяжыцца. Зямлю ім аддаюць, а тыя не ведаюць, што з ёю рабіць. Яны і сваю, калі была якая ў іх, – адна барана два загоны займаець – не любілі, а вы хочаце, каб лежабокі арцельную шанавалі.

Калгазаў нарабілі. П'яніцы ў іх сабраліся. Гультаі збегліся туды. Ага, тут яны першыя. Ім абы смачна паесці ды павесяліцца. Ніводнай вечарынкі не прапусцяць. Абы напіцца, абы напіхацца, а то каму і ў морду даць. "За здароўе ваша ў горла наша..." Піхума! А працаваць не хочуць. Вунацька ля вёскі валяецца многа здохлай жывёлы. І ніхто не здагадаецца яе прыбраць. Апокі, лайдакі. Зямлю спустошаць, а тады з торбамі пойдуць. Землебудаўніцтва нейкае прыдумалі. А нашто яе, зямлю, будаваць, калі яна і да нас ужо была пабудаваная. Будзь на ёй гаспадаром, жалкуй яе, будзь зямлі і сынам і бацькам, ды і ўсё. А то землебудоўляю заняліся. Будаўнікі гэтыя, піхума... Шматполлі нейкія павыдумлялі – і пяціполлі, і шасціполлі, і васьміполлі дайжа. І ніхто не думаіць, што пры шматполлі жытам даводзіцца займаць даволі малую частку поля. Без хлеба ж будзеце, галадранцы, сядзець. Шматполле ж патрабуе высяваць мала хлеба, а ўсё больш траву. А траву ж есці не будзеш. Ай, а ім, завалам, якая розніца, што і як у зямлю кідаць. Яны ўсё нявееным насеннем сеюць. Абкалоцяць са снапа аб якую калодку ды і сеюць. Вунацька Ламаку як сказалі, што

насенне нада веяць, чысціць, дык той аж здзівіўся, аж рот раскрыў: "Што вы гаворыце? Няўжо праўда, што нада чысціць? А навошта? Яго ж усё роўна неўзабаве ў зямлю кідаць. Тады вецярком і адвеецца ўся мякіна. І зямлю яшчэ ўгноіць..." Свістуны! Спрадвеку ленаваліся, а цяпер з іх хочуць гаспадароў нарабіць. А гультаю давай ці не давай зямлю, ён яе ўсё роўна не скарыстаець. А яна ім і не нада, тая зямля. Ім абы яе ў гаспадароў адабраць. Каб і ў тых не было. Каб і тыя голыя былі, як і яны самі. Я не маю, дык і ты не май. У мяне няма, няхай і ў цябе не будзіць. Як кажуць, і сам не гам,і другому не дам. Піхума! Яны і бедных, хто працаваць хочыць, ненавідзяць. І пакусалі б, здаецца, ад злосці – а як жа, ён іхнюю гайню пакінуў, іхняй кумпаніяй пагрэбаваў. Унь як Захарка з Чырвонай Арміі прыйшоў... Бядняк бедняком – анічога не маець. Далі яму кавалачак зямлі ў садзе, ён хатку там маленькую-маленькую паставіў і з жонкаю і двума дзеткамі жывець там, робіць. І ўсё стала ў яго неяк палучацца. І сад ён даглядаіць, і свая зямля ў яго родзіць, і хлеб у яго дзетак ёсць. Бо яны ж з жонкаю работаюць, як валы, – ад цямна да цямна. Не спадабалася гэта гальцяпе. На яго "маёнтак" паяглілася. У іх свая зямля ёсць, яны яе не засяваюць, а гэту ў Захаркі з рук ірвуць. Шрубянок ірвець, Казяба рвець. Абы адабраць: яна ім не нада, гэта ж абы чалавеку не даць. І сельсавет за імі пайшоў, Сымон Поклад аддаў свістунам Захаркаву зямлю. Цяпер яны ўжо Захарку з хаты гоняць: хата ж ужо ягоная, выходзіць, на чужой зямлі стаіць. А Юрку Казака дык увогуле спалілі – не спадабалася, што той таксама працаваць стаў. Запалку пад страху – і ўсё: свішчы, як і мы. А на маю думку, дык сельсавет не можыць адабраць зямлі – гэта толькі суд можыць. Калектывамі хваляцца. А што ў тых калектывах? Ураджай горшы, чым у гаспадароў. Дзе ім цягацца – вунацька сяляне-даследчыкі па сто дваццаць пудоў з гектара жыта ўзялі. А яны і тое, што вырасцілі, убраць у час не змаглі. Авёс не ўвесь, праўда, але ж многа засталося пад снегам. Бульбу выбіралі позна – як маразы ўжо трашчалі. Ды і таму, што ўбралі, рады не далі. Работнікі, піхума! Збожжа ў стайню ссыпалі. Дошкі паклалі проста на зямлю і ссыпалі. Збожжа сагрэлася, сапрэла, сплеснявела, скарэла ў адну цвёрдую, як камень, пліту. Рыдлёўкамі потым секлі гэтую пліту. А навошта? Каб перакінуць у другі ссыпнік, які яшчэ больш не прыстасаваны пад зерне быў. Там яно і зусім дайшло. Тады і раздалі гэтыя камлыжкі членам арцелі. А што рабілі з імі калгазнікі – адзін Бог святы ведаіць. Іх жа свінні і то наўрад ці кінуліся б есці. Гаспадары, піхума. Жыта напалову з'елі мышы, віка пагніла. А яны як узяліся малаціць, дык да самага чэрвеня, амаль да новага жніва малацілі. Пуня раскрытая, гумно таксама. І зерне, і сена, якое туды складаюць, гніець. Ім накрыць бы іх хутчэй, а яны замест гэтага скотны двор пераносяць, які пакуль што і на старым месцы пастаяў бы. Не, як няма гаспадара, дык і парадку не будзіць. А яны толькі курсы ўсё ладзяць, усё вучацца. А чаму яны там вучацца? Смеху варта! Як правільна карміць кароў, як правільна даіць іх.

Не, часам і яны нешта разумнае могуць прыдумаць. Як вунацька з траецкім умайваннем. На Тройцу ж столькі бярозак высякаецца – кожны ж ля сваіх варот хочыць дрэўца паставіць. Ён і сам жалкаваў, што столькі лесу ідзець на гэты "май". А яны во прыдумалі: далоў забабоны, замест высякання бярозак, пасадкаю лесу будзем займацца. Хаця ў іх нічога з гэтага не палучыцца. Прыдумаць-то яны

прыдумалі, а работаць – не хочуць. Ой не хочуць, піхума. Унь і Харлам Шрубянок рабіць нічога не хочыць, а ўсё ведаіць, усё ўсім указваець. Да ўсяго яму дзела ёсцека, ва ўсе дзіркі шчэміцца. А сам жа гультай гультаём. Бацькаву гаспадарку разбурыў і бацьку самога з хаты выгнаў – той ходзіць па хатах, есці просіць у чужых людзей. Актывіст, піхума, парцееец. Хоць і бацька, кажуць, несумленна гэтую зямлю нажыў, але ўсё ж.

Кажуць, што яшчэ за царом ён у карчме ў Стайках быў. А тут нейкі заезджы купец у карчму зазірнуў. На яго п'яныя мужыкі напалі, біць яго ўзяліся. А ў купца кашалёк – туга-туга напакаваны – вываліўся. Харламаў бацька яго хуценька схапіў і, пакуль ніхто не бачыў, уцёк. Вось за тыя грошы, што былі ў кашальку, ён тады і купіў зямлю. А гэты дурань усё спусціў, што бацька нажыў: зараз у яго ні зямлі, ні хаты людскай. А клок няўдобіцы, што астаўся, не родзіць. Будынкі развaліліся, поле пустое, жонка і трое дзетак сядзяць без хлеба. Калі людзі ў полі, Харлам цэлымі днямі сядзіць то ў сельсавеце, то ў кааперацыі, то з тростачкаю ходзіць па вёсцы. Начальніка з сябе корчыць. Па судах сведкаю ходзіць. Можа за каго хочаш пасведчыць. Ідзець у суд, і ніхто не знаіць, за каго ён сведчыць будзіць. І вось гэты аблакат – як завець яго дзядзька Яловік – грошы за свае сведчанні ў людзей бярэць. Возьмець, а тады ў краме пячэння панакупляіць і есць сабе сам. З кішэні дастаець і есць. А дзецям, якія галодныя сядзяць, не занясець. Пакуль усё не паесць, нелюдзь, дамоў не пойдзіць. Працаваць Харлам не хочыць, а ўсё парадкі наводзіць. А сам жа дызерцір. Ён жа з Чырвонай Арміі ўцёк, як туга прыйшлося на фронце. Латышскі полк злавіў. Вайсковы трыбунал быў. Паслалі яго на нарыхтоўку дроў у лес. Во пра гэта ён маўчыць. Толькі выкручваецца: я, маўляў, тады быў дома, бо быў нейкі ўпаўнаважаны. О злодзей, піхума. Знаем мы такіх упаўнаважаных. І пра тое, як у дзядзькі Яловіка сала краў, таксама маўчыць. І пра тое, як дзіця сваё задушыў, не гаворыць. Дзядзька Яловік кажыць, што Харлам нядобры чалавек, бо работаць не хочыць. Ну ў Яловіка ўсё работаю вымяраецца: хочыць работаць – добры чалавек, не хочыць – дрэнны. Не хочыць Харлам работаць, ой не хочыць. А ўсім пагражаіць, страшыць усіх, што ён селькор, адвакатам самазваным задзелаўся, гультай. Свістун, піхума! Праведнік! Нягоднік ты, а не праведнік! Селысор, называецца. Пра ўсё пішыць. А чаму ж ты, гніда, не напісаў, як у сельсавеце муку дзялілі? Хто сядзіць без хлеба, таму далі па пяць хунтаў, а старшыня сельсавета, Поклад твой, і сакратар па пуду сабе ўзялі. Дык чаму ж ты, калі за праўду стаіш, не напісаў пра гэта? А таму, што яны і табе, праведніку, паўпуда далі. Аблакат чортаў... Ці чаму б табе, актывісту, не напісаць, скажам, у газету, як камісія сельсавета, у якую ўваходзіў і ты, перапісвала жыўнасць у гаспадароў. Як заможнік Стульба схаваў парсюка пад печ, а Найдовіч свінню ў камору замкнуў. Камісія гэтага не заўважыла. І ты, актывіст, таксама не заўважыў, хоць і ведаў. Ведаў і маўчаў, бо заможнікі вам гарэлкі паабяцалі паставіць. І паставілі! А ў іншых дык ты ўсё бачыш. Унь і Шабуню да турмы давёў, і гаспадарку яго разбурыў, і ягоных дзяцей, змей, без хлеба і без хаты пакінуў.

А чым жа ён табе не спадабаўся, гэты Шабуня? Жыў чалавек спакойна, нікому не замінаў, усё сваім гарбом нажываў. Дык жа не, як прычапілася гэтае Сапло, усё цяўкала і цяўкала, усё брахала і брахала, усё сапела і сапела, пакуль у турму чалавека не ўпіхнула. Во тады супакоілася. А то ўсё не так – то абрэзкай зямлі яго страшыць, то батракоў яму ў вочы торкаіць, то, ці бачыце, яму не падабаецца, што Шабуня плаціць абкладання аж трыста рублёў, а ён толькі семнаццаць. Усё пісаў, усё селькорыў.

Як ён толькі не падпісваўся ў газетах – і "Хомка Косы", і "Няўгамонны", і "Савецкае вока", і нават "Сябра". Во мярзотнік! "Сябра" гэтакі Шабуню знайшоўся! Ах каб ты адубеў! Ну што, лягчэй табе стала, "сябра", калі Шабуню ні за што пасадзіў? А ты знаеш – лягчэй. Ёсць жа такія людзі, якія радуюцца, якім дужа добра робіцца, калі другім дрэнна. Калі нехта шчаслівы побач ёсцека, яны цярпець не могуць: іх і круціць і ламаіць, нібы ад нейкай хваробы. А як напаскудзяць чалавеку, зламаюць яму жыццё, адразу весялеюць, самі ад шчасця аж захліпаюцца. Харлам з такіх, бачыце, і Шабуневых дзетак не пашкадаваў. Значыць, сядзіць Шабуня па Шрубянковым даносе. А на гаспадарцы жонка адна асталася. Слабая, змардаваная, хворая на сухоты – як ёй з тою гаспадаркаю без мужчыны справіцца? А тут яшчэ ўсе свінні паздыхалі – пошасць на іх нейкая найшла. Ціт і сваіх ледзь адратаваў. Чума, кажуць, навалілася. Свінні не ядуць, кашляюць, ірвота ў іх паяўляецца, яны зарываюцца ў посціл і здыхаюць. Усіх сваіх свіней Шабуніха вывалакла. А неўзабаве трох коней у яе ўкралі. Гаспадара няма, баяцца няма каго, зладзеі замкі пазбівалі і ўсіх коней павывелі. А што той гаспадар? Тут і гаспадар часам не паможыць. А што унь толку, што ты гаспадар, што ў цябе замкі і завалы ёсцека? І ў цябе ж самога карову ўкралі. Была ў полі – і як праз зямлю правалілася. Хоць і прыкметная дужа была: у яе ж рог збіты і пяць цыцак, але так нідзе і не знайшлі. Я неяк пражыў, а Шабуніха ўпала ў адчай: муж у турме, сама хворая... А Сапло ходзіць ды яшчэ страшыць, пасміхаецца: "Скора мы тваю зямлю, твае харомы беднякам аддадзім. Пажыла ты, цяпер няхай яны пажывуць". Тут Шабуніха і ашалела: ах, каб маю хату ды аддалі гэтай гальцяпе, гультаям гэтым?! Не будзіць такога! Тады яна запалкі ў рукі, дзяцей да сябе, і падпаліла будоўлю. І сама здзецьмі згарэла. Кажуць, што дзеткі вырываліся з агню, але яна не адпусціла іх. Толькі большанькі, мацнейшы крыху, вырваўся і ў акно выскачыў. А чацвёра разам з ёю згарэла. Во азлавалася Шабуніха дык азлавалася. Давялі во такія харламы, такія шрубянкі. Яны каго хочаш давядуць. І яе ж яшчэ, мёртвую, ведаеш, вінавацяць потым: яна, маўляў, знарок падпаліла сваю хату, каб пагарэлі і суседзібеднякі. Яно і праўда, шэсць бядняцкіх гаспадарак ля Шабуневага селішча полымя як языком злізала. Але ж я не думаю, што яна хацела іх папаліць. Свая хата ёй ненавіснаю стала. А на пажары яшчэ адна бяда здарылася. Хоць са спазненнем, але на пажар прыехала пажарная дружына. А ёю кіраваў Марка Плешка. Хоць пра нябожчыкаў дрэннае і не гавораць, але ж гэта быў свістун са свістуноў. Таксама ж селькор, такі ж пісун, як і Шрубянок. "Ваду сюды, ваду туды". Бегаіць і крычыць. А тут і Будай на пажар як знарок з тапаром прыйшоў. А Будай – заможнік, ці, як гэтыя шэльмы лічаць, – кулаччо. Яго гаспадарцы пагражала абрэзка лішняй зямлі. Тады ён хуценька разводзіцца з жонкаю, у іх палучаюцца ўжо дзве гаспадаркі, і ім, замест абрэзкі, патрэбна дарэзка. Вось тут

Плешка са Шрубянком і ўзяліся за Будая: "Фіктыўны развод, фіктыўны развод...", "Развод на паперы, развод на паперы..." Беднага Будая ледзь да турмы не давялі. Вось тут, на пажары, ён і задумаў, відаць, адпомсціць сваім крыўдзіцелям. Пакуль Плешка кіраваў: "Помпу сюды, шланг туды", Будай падышоў да яго ззаду і – абухом па галаве. Той яшчэ павярнуўся да яго тварам, а Будай перакруціў тапор і – лязом па твары. І пабег шукаць Харлама. Але не знайшоў – Харлам, хітры змей, уцёк, схаваўся, зашыўся, як мыш, некуды ў шчэлку. А Будая злавілі. Ды ён і сам не ўцякаў, не супраціўляўся. Спакойна абцёр палою ад крыві лязо тапара ды і кажыць: "Шкада, што яшчэ не ўсё зрабіў".

Ну і чаго Будай дабіўся? Цяпер сам кайданамі грыміць, а Шрубянок і сёння парадкі ў Кросніцы наводзіць, рукі ў кішэні ўсунуўшы, свішчыць. А Будай, мусіць, нічога і не дабіваўся – проста цярпець болей не змог, піхума. Крычаць: тэрор, тэрор... Унь Бохан сваіх сабак у сваім двары трымаець не на прывязі – тэрор: "Кулак Бохан хочыць пакусаць беднякоў злымі сабакамі". Смеху варта! А які ж гэта, ці чуеце, тэрор, калі гэта ўсяго толькі абарона. Свістуны, абібокі, гультаі крыўдзяць шчырых гаспадароў, якія ўсё сваё жыццё толькі тое і ведалі, што рабілі, а здачы ім і не думай даваць: дзяржава за іх заступаецца. Божа мой, што гэта толькі і робіцца ў тваім свеце?! Кажуць, што неўзабаве ўсіх гаспадароў агулам у калектыўныя гаспадаркі сілаю заганяць будуць. Як жывёлу ў хлеў. Дык гэта ж, піхума, прыгон будзіць. Гаспадары самі не хочуць ісці ў арцелі з беднякамі, бо ў іх гаспадаркі моцныя, а ў беднякоў нічога няма. А як ім з намі зраўняцца, беднякам? А дужа проста – адно работаць так, як мы. А то рукі ў кішэні і свішчуць. О, латругі, піхума! Божа мой, падкажы, як гэта навучыць гультаёў работаць? А іх, замест таго каб да працы прыбіваць, у Саветы выбіраюць. Ой, насавецяць, абібокі, у тых саветах, ой, насавецяць... Яны ўжо і так абленаваліся, не прывядзі ты Бог. Вунацька летась піянеры палолі бядняцкія палоскі. Чакайце, а чаму піянеры палолі? А яны самі што ў гэты час рабілі? А нічога сабе не рабілі! Гулялі! Рукі ў кішэні і свісталі. Абэйдалы! Латругі! Гультаі! Толькі ўсё зямлі просяць. З той, што ў іх ёсць, не ведаюць, што рабіць, а ім яшчэ дай. Унь і Паласаты просіць. Бядняк! У яго ж толькі шэсць дзесяцін! А што і тую ён спустошыў – нікога не чапаіць. Лекарам зрабіўся. На ваду шэпчыць. За бутэльку нашаптанай вады бутэльку гарэлкі бярэць. А зямля быльнягом, крапівою зарасла. Тады ён такому ж самаму п'яніцу, як і сам, у арэнду яе здаў. І той ёй рады зноў не можыць даць – карову пасець, і ўсё. А Паласаты яшчэ зямлі просіць. І што ты думаеш – яму дадуць! Ён жа бядняк! У цябе адрэжуць, а яму, піхума, дадуць. Данадзеляць малазямельнага! І так ужо наразаць гультаям чужую зямлю ўзяліся, што каморнікаў не хапаіць. Ходзяць у акругу і канькаюць – кожны для сваёй вёскі землямера выпрошваець. А паколькі гаспадароў да ўлады не падпускаюць, дурноты многа робіцца. Ой многа дурноты... Унь у чэрвені курсы для сялян зрабілі. Паздурнелі вы, ці што? Улетку, калі столькі работы, курсы? А зімою што вы рабілі? У карты зіму прайгралі. А цяпер жа і папар нада араць, і да сенакосу рыхтавацца, і будавацца. Лета ўвогуле не для курсаў, а для працы. А яны – курсы... Не, такое могуць прыдумаць

толькі тыя, што ніколі на зямлі толкам не рабілі. А то ўзялі раптам усе жорны пасабралі, звезлі пад Шрубянкову хату, пад вугал пазлажылі. А тыя, у каго засталіся, Шрубянок сам апячатаў – ліст паперы на бечаю прыклеіў: не чапаць без мяне, не малоць у жорнах! Чаму? Нашто? Хто прыдумаў? Аказваецца, Яўсцыся Казябава прыдумала. Аказваецца, каб культурнымі быць, бо жорны – гэта, на яе дурную галаву, перажытак мінулага. Толькі ў млын нада везці! А там чарга, сварацца. Ды і так бываіць: прыедзіць гаспадар малоць, а ў млыне дроў няма ні палена. Ён скідаець свае мяхі і едзіць у дровы. Прывязець, тады ўжо яму мелюць. Ды і так бываіць, як намелюць, што хоць адразу ўсё высыпай. "Калі млынару лапатачкі не дасі, то свіннямі паясі". Во дурнота, піхума...

Вунацька Мукасей зняў быў тую пячатку Шрубянкову, парваў паперыну і намалоў сабе. Дык яго, як несазнацельнага элемента петрылі, на чорную дошку павесілі. А яму гэта і не да галавы – Лявон жа чытаць дайжа не ўмеіць. Кажуць во, што і арцелі знарок прыдумалі, каб і хлеб, і жывёлу ў гаспадароў забраць. Што сабе забяруць, а што і гультаям параздадуць. І праўда, бяры колькі хочаш, гаспадара ж у калгаса няма, ніхто не запярэчыць, ніхто не абстаніць. Кажуць, што дзяржава накладзець такія падаткі, што ў сялян і валасоў на галаве не хопіць, каб разлічыцца. Будуць забіраць усё, а сяляне за адны палачкі працаваць будуць. Дзень і ноч. Не, прымус ніколі к дабру не прыводзіў. А вы мне, піхума, такі калгас прыдумайце, каб я, гаспадар, сам туды ісці захацеў, бегма пабег. А яны – трактары, трактары... Трактароў будзіць многа... А што мне твой трактар? Трактар – не конь: і арэць мелка, і зямлю топчыць, і гною не даець. Ён жа як папаездзіць па зямлі, дык і з поля дарогу зробіць. А мне і з канём нядрэнна было і будзіць. Ой многа дурноты.

Ой дурноты многа. Дык раней хоць людзі хавалі гэтую дурноту, саромеліся яе. А цяпер хваляцца ёю, напаказ выстаўляюць. Унь Казяба на ўсю акругу заявіў: "Я, селянін вёскі Кросніца, Хама Казяба,першы выйшаў у свята на бязбожнае спаборніцтва і, узяўшы ў рукі касу, стаў касіць". Ды яшчэ ж на спаборніцтва і гаспадароў заклікае. А навошта гаспадарам на свята касіць? Яны і так справяцца, і будніх дзён ім хопіць. А пра ўсю гэтую лухту нават газета пішыць: Казяба – герой! А як жа – Казяба бязбожнік! Ды што там Казяба! Папы вунацька паздурнелі. Адмаўляюцца ад сваіх прыходаў. Ну няхай ужо поп Белабжэцкі са Смаллян адмовіўся. Яму ўсё роўна: папом быць ці каровам хвасты закручваць. Унь паехаў быў збіраць свой поп-падатак па вёсках, дык так, гіцаль, напіўся, што валёнак па дарозе згубіў і не адчуў гэтага. Нагу адмарозіў, адпілаваць давялося. А які ж з яго поп на адной назе?

А то ж і наш, кросніцкі поп, айцец Раман, таксама расстрыгся. Унь як ён у газеце ад царквы адхрышчваўся: "Усвядоміўшы, што рэлігія перашкаджае сацыялістычнам будаўніцтву, я адмаўляюся ад рэлігійнага дурману, здымаю з сябе сан папа і пачынаю займацца працаю на сельскай гаспадарцы". Піхума! Хаця, калі з другога боку паглядзець, дык што яму рабіць аставалася? Царкву ж з дзяржаваю разлучылі, заступіцца няма каму, храмы ламаюць, алтары выкідаюць, зямлі папам не даюць – усё беднякам, беднякам, а поп жа – чалавек вольнай прафесіі. Хочаш ці не хочаш, а трэба расстрыгацца, піхума... Многія зараз свяшчэннікі адмаўляюцца: "Я канчаткова

парваў усялякую сувязь з царквой", "Я адмовіўся ад службы папа", "Рэлігія з'яўляецца вялікай перашкодай". Дзіва дзіўнае – папы ў хлебаробы пайшлі. Уласць з папоў сялян пачала рабіць... А такі ж ужо прыгожы поп быў. Многія дзяўчаты і ў царкву хадзілі толькі, каб на яго паглядзець: Бабы-парадзіхі не праміналі ніводнай службы, каб адно на айца Рамана наглядзецца. Унь і Юстына, як Трахімкам хадзіла, гаварыла бабам: "А я ў царкве ўсё гляджу і гляджу на нашага бацюшку, хачу, каб і маё дзіця было такое ж красівае, як і ён". Мы тут і самаабкладанне на царкву правялі – па тры рублі ад двара аджалелі. Я і сам траячку аддаў. І во на табе – расстрыгся. Ой дурнота, ой дурнота! А ў што ж мы тады верыць будзем, калі не ў Бога? У нешта ж чалавеку верыць нада. І баяцца нечага. А так жа без гэтай веры і боязні распуста пачынаецца. Забіць? Калі ласка! Украсці? Звычайна! Вунацька колькі і коней, і кароў, і свіней у акрузе пакралі.

Кожны дзень, лічы, крадуць. І рабуюць. Ішоў Церах з Кросніцы на кірмаш, каб карову купіць, з лесу выйшлі людзі, сто пяцьдзесят рублёў адабралі – і шлэпай сабе назад. Ці унь як Шчамяля, заможніка з Гулідаўкі, парашылі бандыты. Дазналіся, што ў яго грошы ў хаце ёсць, і за нейкіх трыста рублёў усю сям'ю пастралялі. Батрачка ноччу ўбачыла, што па двары нехта ходзіць. Разбудзіла гаспадара. Той выйшаў. Яны распыталі, хто яшчэ ў хаце ёсцека, а тады абрэз да вуха – і ўсё. І ў хаце ўсіх пастралялі – і дзяцей, і дарослых. А батрачка пад ложак схавалася. Стрэлілі і туды – гаспадар праўду расказаў, хто ёсць у хаце. А тады выцягнулі яе і галавой аб мост: "Усе гатовы". Падпалілі хату і пайшлі. А дзеўка жывая была. Выпаўзла з хаты. Там яшчэ дзіця плакала, жывое таксама асталося, але яна яго не ўзяла з сабою – пабаялася, што і яе даб'юць. Так і згарэла дзіцё. Во што значыць, ні ўва што не верыць – ні ў Бога, ні ў чорта. Разбэсціліся без Бога, распусціліся. Ніякага стрыму на іх няма, ніякага хамута. Байструкоў, піхума, панаштругалі, а аліменты плаціць не хочуць. А як прыціснуць, тады яны, як вужакі, круцяцца, а бываець, і жанчыну, і сваё ж дзіця забіваюць, – абы толькі аліменты не плаціць. Душаць абаіх, у калодзеж кідаюць. Унь і Шрубянок, кажуць, задушыў сваю чатырохмесячную дачку, якую ён прыжыў Мар'і Будкевіч. І выкруціўся. Запалохаў Мар'ю, дык тая і змаўчала. Гэта ж страшна! Гэта ж крывапіўцы! Задушыць сваё дзіця, няхай сабе і незаконнае. Вампіры! Магільнікі! Я кацянят не магу ўтапіць, а яны дзяцей душаць.

А унь Аксеня са Стаўроў на ігрышчы абліла Палагею карболаўкай – не падзялілі кавалера! – дык тая і аслепла. Во да чаго мы дажыліся без Бога. Во што вы, адмовіўшыся ад царквы, нарабілі, расстрыгі няшчасныя. І ўсё гэта басота давяла людзей да такога жыцця. Хлеб вязуць прадаваць сяляне – заградзіцельныя атрады ці адбяруць, ці назад вернуць, а як перакупшчыкі едуць, ніхто іх і не пытаець, ніхто іх і не спыняець. А як мяне самога толькі не абзывалі: і кулаччо, і міраед, і эксплататар, і жываглот, і скула... Загналі, піхума, Ціта ў кут, ой загналі. І выйсця ніякага няма. Батракамі папікалі. Скажыце, а хто б вашых батракоў карміў, каб не мы, гаспадары? Хто б ім есці даў? Што, можа, Харлам Шрубянок накарміў бы? Не, ад Сапла вы гэтага не дажджэцеся. Яму і самому няма чаго есці. А вунацька прагнаў я з гаспадаркі батрачку Суконку, бо ленавалася працаваць (ды і год няўдалы выйшаў: лета было

халоднае, па ападках – дажджлівае, па ветры – ветранае, а пасля яшчэ і град памалаціў ніву) – дык ніхто яе і не накарміў. Хадзіла, прасілася, а вы, гультаі, ні проста і чулі. Ці вунь як Бохана арыштавалі, яго батрачка, Аўдоцця, галодная і халодная хадзіла, плакала, а вы ёй і дзвярэй не адчынілі, і ў хату не пусцілі. Чаму ж вы, такія вумнікі, не памаглі ім? Дык не, чакаеце, калі Ціт паможыць, калі Ціт накорміць. Бачыце, калі Ціт з Боханам не накормяць, то ніхто і скібкі хлеба не дасць беднякам. Конечне, я чалавек жаласлівы, як вярнулася Суконка, я пакінуў яе ў сябе – няхай есць, не збяднею. І не таму пакінуў, што яна гаспадарцы нада была, а таму, што ёй няма куды дзецца. Але ж колькі мне Харлам у вочы торкаў за тых батракоў. Ой гэты Шрубянок! Папсаваў ён, піхума, мне крыві. Многа папсаваў. Век буду помніць. Не забудуся. А тут яшчэ стаіць і рукамі, дабрадзей, махаіць. Не, Юстына, няма нам куды варочацца. Нацярпеліся мы там, куды ты вярнуцца хочаш. І што крыўдна, чым лепш і больш стараўся працаваць, тым горш было. Дык, а можа, увогуле гэтай уласці не падабаецца, калі чалавек добра працуець? Можа, ёй якраз не трэба, каб людзі працавалі? Дык а што гэта тады за ўласць такая, калі яна адных гультаёў плодзіць? Які ж тады мёд будзіць, калі ў вуллі адны трутні астануцца? А ў нашым вуллі дужа ж ужо многа трутняў сабралася. І ўсіх іх аберагаюць. Унь Казябу і Шрубянка нават на курорт пасылалі. У Лівадзію актывісты ездзілі. Перапаботаліся, піхума. Стаміліся, спрацаваліся, абібокі, ручкі-ножкі навярэдзілі. Не, гаспадара яны не пашлюць, а во такога гарлапана і са сметніка дастануць, абчысцюць, абмыюць і ў царскі палац завязуць: пажыві, Харлам, у ахвотку, адпачні. Раней цар у беласнежнай ванне мыўся, а цяпер Казяба там свае мошчы палошчыць. Раней цар па царскай дарожцы, пасыпанай пясочкам, хадзіў, а цяпер Шрубянок са сваёй тростачкай топчыць яе. О шолудзі магучыя, піхума. О гультаі і абібокі! Хто іх так шануець? І навошта? Лянуешся працаваць – табе ўсе дапамагаюць. Працуеш як вол – усім не падабаецца, усё тое, што ты зрабіў, адабраць хочуць. Ды са злосцю кідаюцца на тваё. Як ваўкі з зубоў дастаюць, у рот сваімі лапамі лезуць. А зайздросцяць – не давядзі ты Бог! Вунацька як выцягнулі ў мяне ваўкі чатырох падсвінкаў і свінню-матку з хлява – ну і што, што хлеў харошы быў, што запораў многа: запоры не для ваўкоў – падкапаліся яны пад сцяну і выцягнулі, – дык Шрубянок з Казябам цэлы тыдзень ад радасці самагонку пілі: "Нарэшце і ваўкі зразумелі, каго раскулачваць нада". І мне нідзе пажаліцца не давалі: "Ты ж багаты". А хто мне тое багацце даў? Можа, ты, Сапло? Ці, можа, Казяба на талерачцы прынёс? Чакай, піхума, Казябы табе прынясуць. Адабраць-то яны адбяруць, на гэта яны спяцы, а во прынесці...

Не, на такую работу ў іх рукі ў тым месцы, адкуль пахніць. Во так яно, Ціт, і палучаецца. Хочыць чалавек нешта добрае, карыснае зрабіць, яму не даюць. А як толькі што дрэннае замыслiў, – калі ласка, рабі: не толькі мяшаць не будуць, а яшчэ з радасцю і памогуць. Усе на помач прыбягуць. Гэта ўсё таму, што злыя людзі адзін на аднаго сталі – здаецца б, як сабакі, перакусаліся... Дзіўная нейкая ўласць у нас. Спачатку яна абнадзейваець, памагаець гаспадару. Кажыць: "Будуй, Ціт, сабе добры дом і жыві ў ім, як чалавек". Крэдыт дала, лесу выпісала. А як пабудаваўся – кажыць: "Ты, Ціт, кулак. Аддавай, багатыр, нам свой дом, мы ў ім клуб зробім". Дык а чаму ж

вы адразу клуб не будавалі? Чакалі, калі Ціт вам пабудуець? Вумнікі, піхума! Ці во зноў жа з гэтай зямлёю. То яе даюць, то яе адбіраюць. Унь прыехаў аграном з акругі. Начаваў у мяне. Я яму чарку, канечне, паставіў. Закусіць даў. Праўда, і за гэтага агранома мне дасталося. "Ага, – крычала Яўсцыся, – і аграномы ўжо толькі да кулакоў ездзяць. І начуюць у іх. А беднякам і не паказваюцца. З беднякамі ім і гаварыць не хочацца, бо ў тых няма нічога. А Ворашні і самагонкі паднясуць, і яечню сасмажаць. Канечне, чаму ж ім і не памагчы".

Ай, не звяртай на іх, Ціт, увагі – няхай плявузгаюць, злыдні. Дык вось гэты аграном мне тады і будзіць гаварыць: "Баішся, дзядзька, што абрэзку зробім, што раскулачым?" – "А чаго мне баяцца, я ж не кулак". – "А хто ж ты тады, ласкавы пане? У цябе ж сорак дзве дзесяціны!" – "Я проста гаспадар". – "Э не, дзядзька, не дуры, ты кулак". – "О, так вы хутка ўсіх гаспадароў кулакамі аббрэшаце. А кулаком жа, газета пісала, лічыцца не той, у каго ёсць зямля, многа жывёлы, а той, хто скарыстоўваець непрацоўныя даходы. А я ж са свайго мазаля жыву". – "Не выдумляй, дзядзька, абычаго. Усё роўна абрэжуць. Такі зараз час. А калі хочаш, каб цябе не чапалі, зрабі на сваіх дзесяцінах культурную гаспадарку. Купі сельскагаспадарчыя машыны і прылады, разбі сваю зямлю на шматполле, і тады яна будзіць лічыцца культурнаю, а сам ты станеш селянінам-культурнікам". Паслухаўся яго, чорта лысага. Купіў, усё купіў, што ён раіў. Купіў малатарню, каранярэзку, канюшынацёрку, купіў завадскога жарабка племяннога – таго, што зараз расстрыга-айцец Раман забраў. На шматполле зямлю, як гэта мне ні цяжка было, разбіў. Разбіў, піхума. Травою, дурань, поле засеяў. І сяджу, радуюся – цяпер жа мяне не зачэпяць, у мяне ж культурная гаспадарка. Зачапілі, піхума, абрэзалі, хоць кажуць, што сельсавет не маець права адбіраць зямлю, што гэта толькі суд можыць. Абрэзалі! Дваццаць дзесяцін мне пакінулі, а астатняе на пяцёх гультаёў падзялілі. Казябу далі і другім такім Казябам парасторкалі маю зямлю. А яны ж яе ўсё роўна спустошаць, паганцы. Сапсуюць, запусцяць. Яна радзіць у іх перастаніць. Абразаюць, паскуднікі, і яшчэ здзекуюцца. Унь і каморнік таксама: "Падрыхтуй мне слупкі, колікі". Што? Ён мяне абіраіць, рэжыць па жывому, а я яму яшчэ колікі рыхтаваць буду?! А каб ты адубеў! Ніколі! "Табе нада, смаркач, ты і рыхтуй, а я вам не парабак, я гаспадар, і тваімі колікамі займацца мне няма часу". А трэба было турнуць яго з аселішча... Нахабнічаюць, здзекуюцца, піхума. І цярпі. А вунацька Бохан дык і з даўбнёю пайшоў на каморнікаў. Бохан – не я: не сцярпеў. А я доўга цярпеў. І што ні рабіў – ніхто і слухаць не хочыць. У Дом селяніна пісаў, кажуць: "Звярніцеся ў РВК". У выканкоме быў, у райземе таксама, у міліцыю заходзіў, да акругі дапяў... "Усё правільна, – кажуць. – Не хадзі болей і не дуры нам галавы: ніхто табе не паможыць. Ты – кулак". І ўсё тут. Ты кулак – значыць, вінаваты. Значыць, ніхто з табою і не пагаворыць, як з чалавекам. Быццам праклянцце якое. А самі яны – хто? Можа, святыя? Ого, дай, Божа, здароўя такім святым ці, можа, адбяры крыху. Унь сам райзем вазьмі. Як кажуць, і п'ець, і курыць. На яго ўжо колькі ні пісалі, а яму хоць бы што. Ты пана клянеш, а ён ад гэтага тлусцеіць, у яго ад гэтага пуза расцець. "А я, – кажыць, – піў і буду піць, быў Шарпілам і буду ім!" І што ты з ім здзелаеш, калі і ён са свістуноў. А

начальнік міліцыі дужа любіць у ачко гуляць. Як выйграе – усё добра, грошы сабе забіраіць. А як толькі прайграў, адразу, кажуць, за наган хапаецца: "Не чапай, такую тваю разгэтакую, мае грошы – прыстралю". І ніхто яму па мордзе не дасць. І чысткі ён ніякай не баіцца. Вот жа як яно, Ціт, палучаецца: бацька ў яго гарадавым быў, а сын – парцеец. І ён ні ў чым не вінаваты. А ты вінаваты ва ўсім. Хоць і твой бацька, і твае дзяды-прадзеды заўсёды зямельку аралі, сеялі на ёй. У міліцыі, суччы сын, ваўчанё дзяржыць, злоўленае больш года назад, і ніхто яму дайжа слова не скажыць. Для пацехі жывёліну трымаець. Але ж воўк ёсць воўк: то курыцу задушыць, то парася, а нядаўна нават вялікую свінню хацеў залупіць, але, на шчасце, яна ўцякла. Ды і людзі баяцца ў міліцыю заходзіць – там жа воўк жывець. Звярынец нейкі, а не міліцыя! А яму што – сам уласць: што хачу, тое і раблю.

Ды што начальнік міліцыі! Віцінар і той хвост кандзібоберам дзяржыць, пана з сябе выдумаў. Захварэў унь у Захаркі конь, пазычыў ён кабылу ў Саўкі і паспяшаўся па віцінара. А той адмовіўся на санях ехаць. Кажыць: "А ты прыедзь па мяне ў вазку". А сам жа пень пнём. Ні бэ ні мэ ні кукарэку. Унь як мой конь захварэў на паляруш – скрыпяць заднія ногі, ён іх не паднімаець, а цягніць па зямлі, дык гэты конскі доктар прыехаў у Кросніцу, а што рабіць, піхума, не знаіць. А ён ужо, ці бачылі вы, пан! А якога з сябе начальніка ляснік корчыць! Слыш ходзіць як ураднік. Прыйшоў неяк да мяне і кажыць: "Слыш, я не хачу шукаць у цябе самарубу, хоць і ведаю, што каб пашукаў, то знайшоў бы". Прыйшлося гарэлкі яму паставіць. Дык ён напіўся, а тады выпаўз з мае хаты і давай страляць са свае дубальтоўкі. Убачыў на страсе ў Бубчонка курыцу і па ёй бабахнуў. У курыцу, канечне, не папаў, тая зляцела, але вось клочча ад пыжа звалілася на страху і падпаліла хлеў. Пакуль агледзеліся, то і хлеў, і хата Бубчонкавы згарэлі. І хто вы думаеце вінаваты? Ляснік? Дзе вы гэта бачылі! Ціт, піхума, вінаваты. Ціт! Ён жа напаіў лесніка. А што я сілаю яму ў горла тую гарэлку ліў? Сам жа жлукціў. А вінаваты я, бо кулак! І хацеў спаліць хату бедняка. Во як. Адзін толькі разумны чалавек быў у нас – старшыня сельсавета ранейшы. Той заўсёды казаў: "Вы, Ціт Ляксандравіч, не кулак. Вы гаспадар". Бывала, сустрэніць, пагамоніць, пра гаспадарку распытаецца. Разумны быў чалавек, несправядлівасці не любіў. Піянераў і камсамольцаў шпіёнамі зваў. За тое, што на бацькоў сваіх даносяць. І што вы думаеце – з'елі! Разумныя людзі Казябам не нада. А цяпер вунацька паставілі дурня Сымона Поклада – і радыя-радыя, як усё роўна царкву абярнулі. І Сапло адразу ж да Поклада прыліп – як смоўж. А той п'яніца. На сваім вяселлі напіўся – самагон насілі цэбрамі, – што чуць адратавалі. З рота гарэлка сінім агнём выходзіла. Мужчыны ў рот нават яму лілі, каб аджывіць. Прыйшоў у сельсавет і адразу дваццаць коп гонты ўкраў. Не бойся, Поклад дурань для іншых, толькі не для сябе. Ён сапраўдных кулакоў ад абрэзкі ўтойваў – за гарэлку, канечне. А заадно і мяне Поклад са Шрубянком есці ўзяліся. З двух бакоў. За калашынне, бывала, як схопяць – толькі гыр-гыр-гыр! Як сабакі тыя, піхума. Дачуўся я, што сялянам, у каго сын у войску, ці то падатак змяншаюць, ці то батракоў дазваляюць трымаць. Я і напісаў заяву. І праўда, адгукнуліся – зменшылі мне падатак. Як дазналіся пра гэта Поклад са Шрубянком, як падключылі Казябу з Яўсцысяй, як пачалі ва ўсе бакі пісаць: "Ворашань кулак. Ён батракоў дзяржыць, а яму падатак змяншаюць". Як паднялі гвалт

– аж на тым баку зямлі, мусіць, чуваць было. Адмянілі ранейшае сваё рашэнне, прыслалі мне пісульку: "Кулацкая гаспадарка не вызваляецца ад індывідуальнага абкладання па той прычыне, што сын папаў у Чырвоную Армію. Калі будзе высветлена, што ён – сын кулака, яго выключаць з арміі". І праўда, Ягорка неўзабаве вярнуўся дадому – вытурылі, піхума, з арміі. Дзякуй табе, Шрубянок, за гэту абразу – за ўсе гэтыя абразы я табе і з Сібіры, памятай, смоўж, помсціць буду. Не дарую я табе, Харлам, нічога. Запомні гэта добра. І таго не забудуся, як вы, галадранцы, з Любкі маёй здзекаваліся. Усіх дзяўчатак, дачок гэтых абібокаў, на рабфакі пасылаюць. А мая Любка папрасілася – адмовілі: ты сюды і не суйся, ты кулацкая дачка. І нават у яселькі нашых дзетак не бяруць – кулацкае адроддзе!.. Для добрых хлопцаў мянушкі нейкія дурныя прыдумляюць, абзываюць іх: "Камсамольцы-падкулачнікі". Што і да чаго? Адным словам, гальцяпа... Балбесы. Божа, дык што ж гэта за праклятце такое нада мною вісіць, што за кляймо нязводнае – кулак. Няўжо не толькі мне, але і дзецям маім, унукам маім, усё сваё жыццё з гэтым кляймом жыць?! А я і сам хацеў, каб Любка з'ехала куды з Кросніцы. Пасля тагояк з яе паздзекаваліся, зняславілі ў Целяшове. І зноў жа гэтыя гультаевічы, піхума. Як бацькі работаць не ўмеюць, так і дзяцей сваіх не прывучылі. Адна дурнота ў іх наўме. Я даўно казаў сваёй, чаго ты да гэтай Мархвы прыліпла, чаго ты з ёй, камсамолкай, дружыш. Яе ж і бацькі век з людзьмі не ўмелі ладзіць, ніколі чужою радасцю не парадаваліся. І дачка такая ж. Дык жа не, усё роўна дружыць. І тая ў Кросніцу як не кожан дзень прыбягаець, і мая да яе бегаець. Во пайшла на Каляды ў Целяшова і займела сабе спагуду. На ўсё жыццё займела. Казаў жа, не хадзі. Пайшла. Пайшла, няслушніца. І вярнулася – зняслаўленая. Пасля ігрышча Мархва начаваць да сябе Любку папрасіла – бацькі калядуюць недзе ў другой вёсцы, а ёй страшна адной. А тая, дурніца, і згадзілася. Двое хлопцаў правялі іх да хаты, у хату зайшлі. А тады Мархва недзе прапала. А тыя амбалы да яе прыставаць. Любка ў мяне дзеўка ёмкая, спрытная, уся па мне – у крыўду сябе дужа лёгка не дасць – адбілася, выгнала гэта дураччо, а сама зашчапілася. Тады пачаў грукацца ў дзверы, прасіцца і лямантаваць малодшы Мархвін брат – аказваецца, яна асталася не адна, а з гэтым саплюганам. Ну як ты яго не пусціш? Гаспадар жа. Пусціла, адшчапіла. А той нешта ходзіць па хаце, міскамі грыміць, чыгункі соўгаець – ці то вячэраць збіраецца, ці то жджэць каго. А потым лямпу, шкарадзь саплівая, як бы незнарок, патушыў. Тады ў хату і тыя хлопцы ўбеглі, якіх Любка перад гэтым выгнала, – яны, аказваецца, у сенцах стаялі. Любка кажыць, што не толькі тыя двое, а яшчэбольш паршыўцаў набілася ў хату. Учатырох ці ўпяцёх насільнічалі. Ды яшчэ і той саплівы піянер памагаў. Галота! Гальцяпа! О каб я тады ведаў, каб на той час аказаўся ў Целяшове. Паадсякаў бы ўсім неданоскам галовы. Няхай бы потым судзілі, няхай бы і самога расстралялі. Такі здзек таксама цярпець няможна. Любка гаворыць, што ў той кампаніі і Казябаў камсамолец быў. Во каму галаву б расшчапіць не зашкодзіла. Першаму! А бацька, кажуць, дачуўся пра гэта, ды яшчэ, няўдаліца, і пацяшаецца: "А што тут такога? Ну, залупілі спадніцу на дзеўцы, ну і што? Хіба-та на ёй першай? А калі няславы баіцца, то няхай выходзіць за майго Ярмолу замуж. Ён не пагрэбуець, возьміць – не паглядзіць, што сапсаваная". У-

у, мярзотнік, у-у, недарэка! "Возьміць"... "Не пагрэбуець"... Нада нам тваё "возьмець". Таксама мне сват знайшоўся. Гарчыцы жывой ніколі не бачыў, не ведаіць, што гэта такое. Унь на Покладавым вяселлі глядзеў-глядзеў на яе, а тады і кажыць: "Усе я стравы перапробаваў, а гэтай – не". Тады Слыш зачэрпнуў яму поўную лыжку гарчыцы і даець: "На, папробуй". Ён цэлую лыжку і злізаў. Доўга маўчаў. І не дыхаў. Слёзы коцяцца, а ён не дыхаіць. Калі адышоў крыху, пакруціў галавою, а тады і кажыць: "Во, бляха, каб знаў, хто такой яды дурной прынёс, яй жа богу б, галаву адарваў". Во прыдурак, піхума, во ёлупень. Нада мне такі "сват". І такая "свацця". І падумаць дайжа не магу, каб Яўсцыся, гэтая лахудра, з маімі ўнукамі гуляла... Не, не нада мне, гультаі, ваша вазьменне! Мая Любка нідзе не прападзець. І зняслаўленая. Яна ж, кажу, па мне – рабацяшчая. Хаця і праўда, тут ёй не жыць было – кожны б смаркач пальцам торкаў. Я ўжо думаў яе за Гомель пасылаць да сястры Юстынінай – там бы прыжылася, ніхто б там не знаў пра яе спагуду, замуж бы выйшла, дзяцей нараджала б, і жыла б сабе, як усе, – а тут раптам гэтая во Сібір падвярнулася. Не, Юстына, назад, да гэтых вурдалакаў, да Сапла і Поклада, да Казябы і Яўсцысі, нам дарогі няма. Нам трэба ехаць толькі наперад... Загналі нас з табою, Юстына, у кут, і дарога наша адсюль, з Кросніцы, толькі ў Сібір.

– Тр-р-р! – раптам пачулася зусім блізка – як не над самым вухам. Коні спыніліся – і сустрэчны, на якога нехта так патрабавальна і гучна крыкнуў, і яго, Цітаў, а правільней, Лявона Мукасея конь, які да гэтага спакойна сабе ішоў ціха, і якога Ціт, задумаўшыся, патануўшы ў сваіх клопатах, нават не трывожыў – ні лейцамі, ні пугай.

Зараз снег ззяў яшчэ болей – за гэты час хмары разышліся, і на блакітным, амаль вясеннім небе з'явілася сонца. Сняжынкі іскрыліся, і на белай чыстай прасторы аснежаных палёў самі сабой успыхвалі яркія, як асколкі шкла, іскры, яны непрыемна халадзілі вочы, балюча калоліся.

– Што гэта ты, Ціт, аглух, ці што? Крычу-крычу, каб дарогу даў, а ён і не чуіць. Мяне з палазні спіхнуў, уцэла ехаць змусіў.

– Дык а хто ж каму дарогу ўступаць вінен? Ты ж парожні едзеш, ты і ўступай, – Ціт, падняўшы вочы, крыху атросшыся ад сваіх цяжкіх думак, пазнаў Гаўрылу Рыжанькага з Дзяднёў, што ў повен рост стаяў, як на парадзе, у санях. – А дзе ж ты свой груз падзеў, што парожні рыпіш?

– А там, мусіць, куды і ты свой вязеш. На станцыі.

– А чаму ты адзін? Хіба на адны сані можна ўсё забраць?

– Канечне, не. Мужчыны разгрузіліся раней, раней дадому паехалі. Ты хіба іх не сустрэў.

– Не, не сустрэў, – адказаў Ворашань, але сам усумніўся: а можа, яны і праехалі, пакуль ён сядзеў, задумаўшыся.

– А куды ты, Ціт, сам далёка сабраўся? – спытаўся Рыжанькі.

– У Сібір, Гаўрыла, у Сібір.

– А што ты там, у тым Сібіры, забыўся? Ты думаеш, там золата лапатаю грэсці будзеш? Дудкі! І там работаць нада.

– Мяне работай не спужаеш. Абы добрыя людзі былі.

– А тут што, дрэнныя? І тут добрыя. А ты думаеш, там дрэнных няма? Усякія людзі і тут, і там ёсцека. Свет, Ворашань, такі.

– Гэтыя ўжо мне плеш, Гаўрыла, пераелі, а тых я яшчэ не знаю.

– Пазнаёмішся. І на станцыі нават. Я ж туды во толькі што Дамарада завёз.

– З Дамарадам мне знаёміцца не нада. З Ігнатам мы яшчэ, як маладымі былі, за аднымі дзеўкамі бегалі. Харошыя Дамарады людзі. А што, і яны перасяляюцца?

– Ага. Можа, вы якраз да аднаго пня і едзеце. Харошыя людзі, кажаш? А харошым людзям жа заўсёды не вязло. Гэта ў нягоднікаў усё чыста, лёгка і гладка палучаецца. А добрым мучыцца наканавана. Яшчэ людзі і да той Сібіры не даехалі, а ўжо намучыліся, не давядзі ты бог. І ўсё гэтыя бюракраты няшчасныя, каб на іх пярун. У райвыканкоме Ігнату выпісалі дакументы на льготны праезд да станцыі Карталы. Ну Ігнат забраў свае рэчы, падрадзіў коней, згрузіў свае рэчы на сані і прыехаў во на станцыю. За сорак вёрст! А тут і пачалося. Начальнік станцыі доўга глядзеў на Ігнатавы дакументы, круціў іх і так і гэтак, пераварочваў і чытаў, а пасля аддаў зноў Ігнату: "Яны несапраўдныя". – "Як гэта несапраўдныя – мне ж іх у райвыканкоме далі". – "Я не знаю, дзе табе іх далі, але яны несапраўдныя. Я гэта добра ведаю". – "А чаму несапраўдныя?" – "Таму што ў маім даведніку няма такой станцыі". – "Як гэта няма? Дык я ж толькі што там быў, зямлю на сябе запісаў, а вы кажаце, што няма". – "Не дуры мне галавы. Табе можна ехаць толькі да станцыі Гранук". – "Ну дык дайце мне тады білеты хоць да таго Гранука". – "Не магу, бо дакументы твае выпісаны да Карталоў". – "Дык а што ж мне цяпер рабіць?" – "А што хочаш. Гэта ўжо не мой клопат".

– Дык а што, Ігнат ужо быў там, ездзіў у Сібір раней?

– А як жа, з'ездзіў. На Урал з'ездзіў. І нават зямлю на сябе запісаў. Э не, Дамарад проста так тпруці не паедзіць. І тут ён думаў, ужо ніякіх клопатаў не будзіць. Ажно загвоздка палучылася. Пагаварылі яны, пагаварылі з жонкаю: што рабіць?

Назад рэчы з намі адпраўляць у Дзядні ці тут выгружаць. Думалі, думалі і рашылі, што лепей іх згрузіць тут, на станцыі – на снег і мароз, – чым ехаць дамоў, разгружаць, затым прасіць коней, зноў грузіць і зноў везці сюды. Так і вывалілі ўсё на снег. Ігнат у раён паехаў – праўду шукаць, – а жонка з дзецьмі за рэчамі назірае і ў пачакальні грэецца, ну а я дадому парыпеў. Няхай ім, добрым людзям, шанцуець. Дарога ж яшчэ – уга! – якая далёкая. А ў дарозе ўсялякае бываіць. Там, кажуць, і забіваюць, а часцей – толькі грошы забіраюць, а саміх адпускаюць. У перасяленцаў жа грошай многа. Усю гаспадарку, лічы, вязець у кашальку: і хату, і каня, і карову – усё з сабою...

Рыжанькі, можа, яшчэ б доўга гаварыў, але конь, якому надакучыла стаяць па пуза ў снезе – аб'язджаючы Ворашня, Гаўрыла загнаў яго ў круты сумёт, – сам скрануў сані і паціху, выбіраючыся са снегу, кіруючы на дарогу, пайшоў наперад. Але за першымі санямі ўжо стаялі, пад'ехаўшы, і другія, і трэція – усе, хто сядзеў на іх, моўчкі слухалі, пра што гавораць Ціт з Гаўрылам – і каню зноў даводзілася адварочваць ад дарогі, у самы глыбокі снег, каб аб'ехаць гэты абоз, што стаяў на палазні. Ужо калі

конь, абмінуўшы сані, выбраўся на цвёрды снег дарогі, Рыжанькі павярнуўся і спытаўся:

– А ў якую ты вобласць едзеш?

– У Канскую акругу, Гаўрыла, хачу.

– А дакументы ў цябе ёсць?

– Ёсцека, ёсцека дакументы.

– Ну тады шчаслівай дарогі! Калі добра будзіць – напішы. Можа, і я пасля да цябе прытарабаню. Нечакана, раптоўна выкулілася з саней Юстына – перад гэтым яна абачліва ссадзіла з каленяў сына – і, грузнучы ў глыбокім снезе, раскаўзаным Гаўрылавым канём, пабегла ўслед за санямі Рыжанькага. Ціт таксама злез з саней і, абыходзячы іх з другога боку, моўчкі пайшоў жонцы наперарэз. Ён не спяшаўся – ведаў, што па такім снезе дужа не ўцячэш. Перастрэў жонку, без адзінага слова павярнуў яе зноў да сваіх саней – Юстына хоць і ўпіралася, але ўсё ж ішла. Зноў пасадзіў яе, зноў даў на рукі Трахімку і сеў сам. Шмаргануў лейцамі, і конь, які таксама крыху застояўся, ахвотна, паслухмяна пайшоў па дарозе, асабліва, праўда, не разганяючыся. Ды і Ціт не падганяў яго, нават і не браў у рукі пугі – няхай сабе ідзе, як яму хочацца: ладную палову дарогі яны праехалі ўжо, а да вечара яшчэ далёка, паспеюць з козамі на торг. Сустрэча з Рыжанькім таксама расхвалявала і Ціта. Ворашань паклаў на сена лейцы, памацаў рукою кішэнь, знарок прышытую да нацельнай сарочкі, – каб было куды хаваць у небяспечнай дарозе грошы, – яна была тоўстая і без прывычкі крыху замінала (а што ж, у Сібіры ўсё давядзецца купляць, і таму грошы там ой як будуць патрэбны), дастаў з-за пазухі паперы, загорнутыя ў хусцінку – усе гэтыя дазволы на перасяленне і іншыя даведкі, – разгортваць не стаў, ведаючы, што ў яго ўсё ў парадку, і зноў паклаў іх туды, дзе ўзяў. Не, у яго з усімі гэтымі паперамі парадак, ён, здаецца, усё прадугледзеў, не тое што Ігнат. Але ж і Ігнату, мусіць, здавалася, што ў яго ўсё як і трэба, а прыехаў, бач, на станцыю, а там і пачалося – і гэта, піхума, не так, і тое не гэтак.

Дамарад нават, бачыш, з'ездзіў туды, у Сібір, запісаў на сябе зямлю. Гэта ж не тое што ён сам, як з завязанымі вачамі, едзіць: нідзе не быў, нічога не ведаіць. Праўда, пра Урал, куды Ігнат пераязджаець, ён і сам чытаў у газетах. Нават выразаў тыя заметкі, з сабою вязець. Там дзве акругі адкрылі для перасялення – Троіцкую і Ірбіцкую. У адной з іх ён ніколі б не згадзіўся жыць. Там і снегу, і дажджоў мала, рэчак амаль няма. Толькі Урал ды яшчэ нейкая дзіўная – не выгаварыць – Йу. Абедзве, пішуць, уброд перайсці можна ў любым месцы. Меншыя рэчачкі ўсе перасыхаюць, вада ўлетку толькі ў вірах астаецца. Станіцы вялікія – па пяцьсот двароў. І паселішчы рэдкія. Людзі адно з рыбалоўства і палявання жывуць. А во ў Ірбіцкай вобласці, здаецца, яму б ужо і спадабалася. Там участкі наразаюць у лясістай зоне. Рэчак многа. Клімат, праўда, суровы – зіма доўгая, марозная, халодная, лета спякотнае... Але так жа, здаецца, па ўсёй Сібіры. У жніўні ўжо замаразкі. Глеба бедная, але ж буйны спелы лес усюды. У лясах густая трава – па пояс чалавеку. Гатовых, лёгкіх для распрацоўкі плошчаў няма, і самае цяжкае для перасяленца – высячы тайгу, расчысціць зямлю пад ворыва і пакосы. Цяжка будзіць і Дамараду. Але ж Ігнат гаспадар сапраўдны, а

гаспадару нічога не страшна – работа такім не ў навіну. Толькі, бачыш, і яму, піхума, дапяклі, і ён ужо цярпець не змог, калі ў Сібір выбраўся. У яго ж зямлі болей было, чым у мяне. Намнога болей. Нават маёнтак свой меў. Спачатку адабралі ўсё, калектыўную гаспадарку на яго зямлі зрабілі, а пасля, здаецца, у дваццаць трэцім годзе зноў вярнулі ўсё Ігнату і нейкую нават ахоўную грамату яму сам Наркамзем даў – маўляў, яго гаспадарка мае даследча-паказальнае значэнне, нават навуковае, а сам Ігнат лічыцца не селянінам, а вучоным-даследчыкам. Праўда, у апошні час Дамарад больш увагі звяртаў на развядзенне міртаў і пальмаў у сваіх аранжарэях, чым на садоўніцтва, – а што, за міртамі і пальмамі да яго яўрэі з усёй акругі прыязджалі, добра плацілі пад час сваіх святаў, дык ён і займаўся імі. Канечне, мірты і пальмы даход вялікі Ігнату давалі. А што з тых яблыкаў наедку? Усё роўна пагніюць ці скаціне скорміш. Потым, праўда, пачалі і да Ігната чапляцца – і ахоўная грамата ўжо не памагала. То ён беднякоў скарыстоўваець толькі за хлеб, за расаду, за саджанцы, то ён увогуле эксплуататар, крывапійца, жываглот. А пасля і яго, піхума, як усіх гаспадароў, абрэзалі, пакінулі яму той зямлі столькі, колькі і гультаям. Во ён і абразіўся, во і навастрыў лыжы на Сібір. Божа, каму гэта нада, каб селянін, які хочыць работаць на сваёй зямлі і жыць, як чалавек, так мучыўся, пакутаваў і гараваў?! А што ў той Сібіры чакаець іх? Ігнат жа во хоць з'ездзіў туды, мусіць, знаець, што і як. А ён жа дык саўсім уцёмную едзіць. Нічога не знаіць, нічога не ведаіць. Нідзе не быў, нічога не відзіў. Сабраўся, прадаўся і паехаў. Смелы ты чалавек, Ціт. А чаму смелы? Рукі ў мяне ёсць, работаць я ўмею, ленавацца там не будзіць калі. Не бойся, піхума, будзем жыць, Ціт, і там, у Сібіры. Хоць пасля сустрэчы з Гаўрылам Рыжанькім, які расказаў пра Ігнатавы няшчасці, яму нібыта зрабілася крыху халадней і неяк ужо зябчэй зараз думалася пра Сібір, а станцыі, куды яны ехалі, Ціт нават і пабойваўся: раптам і ў яго паперах начальнікі знойдуць нейкія хібы, і яму, як і Ігнату, давядзецца мітусіцца і шукаць выйсця? Ды хіба толькі адной станцыі ён баяўся? А дарога? Ворашань баяўся і дарогі. Ён жа унь колькі грошай вязець з сабою. Раней і не бачыў столькі. А тут – цэлы жмут. Украдзі іх толькі – і ён самы бедны чалавек у свеце. Ды не, не самы бедны: ён будзіць проста ніхто. Яму тады астанецца адно: шукаць які-небудзь моцны кедравы сук і чапляць на яго вяроўку... І Юстыне, і дзецям таксама. А колькі, ён чуў, абкрадаюць перасяленцаў. Грошы забіраюць, а дакументы, а білеты на праезд, піхума, кідаюць у спецыяльныя скрыначкі. А іх, кажуць, там па ўсёй Сібіры на кожнай станцыі вывешваюць. А калі вывешваюць многа, значыць, і крадуць многа. А дзе ты іх, тых злодзеяў, у той Сібіры паловіш! Шукай ветру ў полі, а злодзея ў тайзе! А многа гаспадароў пераязджаюць, родную зямельку навек пакідаюць, ой многа. У наркамземах парог абіваюць, пісьмы пішуць, дазвол на перасяленне выпрошваюць. А куды едуць? А навошта? Гэта ж нада, піхума, так давесці чалавека, каб яму родная зямліца такою нялюбаю стала. Чытаў я ў газеце, што кожны год з Беларусі ў Сібір будзіць выязджаць каля дзесяці тысяч чалавек. Не, гэта, канечне, гаспадары едуць. Тыя, хто на свае сілы спадзяецца, хто работаць умеець. Не, казябы ды шрубянкі, канечне, туды не паедуць. Казябам і покладам там няма чаго рабіць. А ўся-го, пісалі, задумана ў Сібір перасяліць больш за

паўмільёна беларусаў. Пачакай, а хто ж тады тут астанецца? Дык жа ўсе, хто ўмеець з зямлёю гаварыць, павыедуць. А хто ж у нашых Кросніцах астанецца? Адны гэтыя свістуны, адны гэтыя гультаі, адны гэтыя лежабокі? Дык па іх жа, піхума, неўзабаве ўся зямля крапівою і быльнягом зарасцець. А табе, Ціт, якое дзела да таго, зарасцець яна ці не зарасцець? Ты паехаў, і з табою ўсё паехала, і зараз тваё ўжо дзела маленькае. Яны астануцца, яны няхай і думаюць, што ім са сваім полем рабіць. Не, Ціт, няма ўжо табе як вяртацца назад. Сцябай во каня ды і думай, каб і на станцыі, і ў дарозе ў цябе ўсё было добра. Ды і ў самой Сібіры таксама. Ты ж едзеш не на гатовае. Табе і там адразу шукаць давядзецца, дзе сваю галаву прысланіць. Там, кажуць, ужо хадакі ўсю зямлю лепшую разабралі, на сябе пазапісалі. Адна тайга засталася. І то горшая. Бліжэйшыя да дарог і землі і тайга ўжо занятыя. Засталіся найбольш цяжкія для засялення ўчасткі. Недзе ў паўночнай тайзе. Таму і пазыку тым, хто едзіць на гэтыя ўчасткі, большую даюць – да чатырохсот на душу плоцяць. Нічога, Ціт, не бойся. Рукі ў цябе ёсць, тапор знойдзецца, а астатняе па часе прыкладзецца. Усё будзіць! Ты ж ведаў, калі толькі збіраўся ехаць, што расчыстка тайгі – работа, канечне ж, нялёгкая. Але ж ты, піхума, кедраў і лісцвеніц тых не баішся. Канечне, трэба было папярэдне самому з'ездзіць, усё нагледзець, зямлю на сябе запісаць. Тым болей што гэта абышлося б не так і дорага. Дзяржава ж даець хадакам ільготны праезд – за трэць платы можна катацца па Сібіры ў вагоне трэцяга класа. Мулка, але нічога, седаўку б дужа не намуляў. Затое б сам усё паглядзеў, рукамі памацаў. Зямлю ж папярэдне трэба было б вывучыць, каб пасля, распрадаўшыся, не вяртацца на бацькаўшчыну. Паехаў бы, пабываў бы ў канторах загадчыкаў, якія размяркоўваюць перасяленцаў. Яны б расказалі пра вольныя ўчасткі, ці ёсць на іх рэчка, ці ёсць лес, як туды ісці ці ехаць, дзе ўзяць правадніка. Ды і там, ужо на месцы, сам бы на свае вочы пабачыў зямлю, з людзьмі б пагаварыў. Мясцовых бы аграномаў распытаў пра ўмовы, з перасяленцамі, якія раней прыехалі, словам бы другім перакінуўся. Пра цэны б даведаўся, што трэба браць з сабою, а што можна купіць і на месцы, знаў бы, залічыў бы зямлю за сабою, а тады б і паехаў дамоў – рыхтавацца да перасялення. Але ж і хадакі, бываіць, не ведаюць, дзе ёсць вольныя землі, блытаюцца па тайзе, па ўсёй Сібіры, марна грошы трацяць ды і вяртаюцца адтуль, так нічога і не знайшоўшы, жабракамі. Можа, трэба было б да якой групы прыстаць? Так жа таксама робяць. У каго няма столькі грошай, каб паехаць самому ў Сібір зямлю выбіраць, тыя складаюцца некалькі сем'яў і пасылаюць аднаго хадака. А той на іх усю зямлю, якая спадабалася, і запісваець. Праўда, не ён запісваець, а загадчык засялення пазначаець, што ўчастак заняты, і ён будзіць захоўвацца за даручыцелем цэлы год. За гэты час нада пераехаць і абжыць тайгу. А то на каго другога запішуць. Канечне, яно б, можа, і нядрэнна было адразу знаць, куды едзеш, але ён не хочыць даручаць гэта хадакам – усё хочыць сам зрабіць. А то вунь у Ліхінічах даверылі чалавеку, грошай яму сабралі, той, праўда, і паехаў. Бандыт, рабаўнік, злодзей, а паехаў. Хто ж не ведаў Сціблу-Рыштанта? Усе ведалі – столькі чалавек у турмах адседзеў. Аж на табе, змог усё-ткі пераканаць столькі людзей, што ён іх зробіць шчаслівымі. Для гэтага, маўляў, нада толькі яго ў Сібір паслаць, як упаўнаважанага. Са спраўкаю. Ён там зямлі ім

панахапаіць – усім хопіць, дайжа астанецца. Паверылі, паслалі. Неўзабаве ён вярнуўся адтуль. І праўда, усё зрабіў чын чынам. Нават дакументы прывёз на тое, што ў Іркуцкай акрузе ён залічыў для тых, хто яго пасылаў, зямлю аж на дзве сотні душавых доляў. "Зямлі ў Сібіры многа. Прадавайцеся, – кажыць, – мне дайце яшчэ пяць тысяч, дык я паеду зноў, замацую тую зямлю, карчаваць пачну і вас буду ждаць". Дык гэта ж здорава! І зручна як, зірніце: прыехаў, а там ужо цябе свой чалавек чакаіць. Зямлю запісаў, колікамі яе абабіў, і сам, піхума, стаіць між колікамі і чакаець. Вот вам і Сцібла, вот вам і Рыштант! Некаторыя, і праўда, пачалі прадаваць ужо сваю маёмасць, каб Сціблу пяць тысяч сабраць на замацаванне. Але тут выявілася нечакана, што ўсе дакументы, якія Рыштант быццам бы прывёз з Сібіры, падложныя – не, Сцібла ёсць Сцібла, яго ты голаю рукою не возьмеш! Аказваецца, ён і ў Сібіры той не быў, і зямлі ніякай не запісаў – паехаў у акругу ды і піў там цэлы месяц. А што – грошай жа ў яго поўныя кішэні. Ды ён і зараз вунацька гарэлку п'ець. А людзі плачуць. Расстраляць яго, мярзотніка, патрабуюць. Ці зноў у турму хоць забраць. А ён толькі выскаляецца: "А што,я ў вас краў тыя грошы, з рук выхопліваў, з кішэняў выцягваў? Вы ж мне самі іх на далонь паклалі – выпі за наша здароўе, Трахімавіч". Дык ён і п'ець, а людзі плачуць. Не, з гэтымі хадакамі таксама, піхума, гора і клопату не абярэшся. Даеду да Чалябінска, там ёсць рэгістрацыйны пункт, там і падкажуць, дзе вольную зямлю шукаць. Адтуль і Канск свой хутчэй знайду – пішуць адтуль, хто даехаў, што там харашо. І не цесна, і зямля добрая, і тайга не дужа страшная. Добра было б, каб там зямлі яшчэ і мне хапіла. А тады ўжо няхай бы і закрывалі засяленне. А чаго табе туды так заманулася? Можа, дзе і лепей ёсць, чым у Канску, ды не ведаеш. Ну і што, што адтуль пішуць, што там добра. "Да рэвалюцыі ў нас было дзве сенакасілкі, а зараз пятнаццаць". А многа гэта ці мала, я не ведаю. А ці хапаіць іх пад час сенакосу? Ніхто табе, Ціт, такога не патлумачыць.

Многа дурноты і ў нашым райвыканкоме ёсць. Ой многа. Ніхто нічога не знаіць, ніхто ні пра што не думаіць. Едзь, і ўсё – як сам знаеш, куды сам хочаш. А ёсць жа, кажуць, нейкія спецыяльныя маршруты для перасяленцаў. І пра іх павінны ведаць у зямельным аддзеле. А то так бываець накруцяць у райвыканкоме, што людзі лішні месяц блытаюцца ў дарозе. З Сібіры ўжо нават пішуць: "Спыніце бузу. Не пасылайце людзей у зачыненыя раёны". А яны ўсё роўна пасылаюць. І зямлі ўжо вольнай няма, а яны ўсё людзей туды піхаюць. Мусіць, каб знарок гаравалі. Мусіць, гэта планавыя здзекі над перасяленцамі. І хоць бы хто стрымаў, абнадзеіў, спытаўся: "Куды ты едзеш? Чаго? Свая ж зямля ў цябе ёсць харошая. Работай, а мы табе паможам". Дык не, вумнікі, не скажуць, піхума, такога, ад іх не дажджэшся спагады. Дробязныя людзі! І па-дробязнаму помсцяць нават. Унь Саўка Церах яшчэ ў студзені падаў у земчастку заяву з просьбаю выдаць яму пасведчанне на льготны правоз перасяленцкага грузу да Тарскай акругі – ён таксама з гультаямі не сышоўся. І да сёння ўсё жджэць дазволу. А ўсё таму, што ён некалі на райвыканком пісаў – скардзіўся, што яму няўдобіцу ў падатак запісалі. А унь Лявона Мукасея дык і ўвогуле нікуды не пускаюць. Мяне вязець, а сам паехаць не можыць. Хоць ён сам і ў Сібір з'ездзіў, і

зямлю там у Абанскім раёне запісаў на сябе, і дакумент на гэта маець, а райвыканком яму адмовіў. І на той падставе, што ён самаволец – сам паехаў, яго ніхто не пасылаў. Колькі самавольцаў ехала – і ўсё добра, а як Мукасей папаўся – трымай яго за крысо, каб не ўцёк у тую Сібір. А прычына простая – не, не тое, што ён самаволец. А тое, што на перавыбарах заявіў адвод аднаму з кандыдатаў, якіх выстаўляў сам старшыня райвыканкома. Не, галубок, мы табепакажам, як сваю думку мець, не, мы цябе ў аглоблі паставім, у баранні рог скруцім. І будзеш ісці праменька, і тузацца не захочаш. Іш, якія помслівыя. Парцейцы, піхума! Слова свайго не дадуць сказаць, усё падтаквай ім, усё гавары так, як яны хочуць. Ага, нарабіла гэтае перасяленне людзям клопату. Гэта ж столькі хвалявання, столькі турбот. А чаго ж мы шукаем, калі ў нас усё ёсць? А куды ж мы рвёмся, калі родная зямля сама просіць у нас помачы? Куды бяжым? Куды, піхума, уцякаем? І навошта? І ці наша ў гэтым ахвота? Божа мой, чаму ж нам на сваёй зямлі не даюць жыць так, як мы хочам?! Ага, хадакі, канечне, добра, з хадакамі яно лепш, але ж і з імі не зусім спакойна гаспадару. Унь некаторыя перасяленцы дык увогуле разумна робяць. Не ўсе адразу едуць. Спачатку едуць самыя моцныя мужчыны. Там яны лесу на ўсю будоўлю нарыхтуюць, а то што-небудзь і пабудуюць ужо. Коней купяць, інвентар сякі-такі прыдбаюць, расчысцяць і ўзаруць, якую змогуць, плошчу. Яны ж таксама, во як і я, зімою едуць, каб вясною ўжо трошку і засеяцца. А сем'і дома пакуль застаюцца. Яны сваё поле і дома засеюць, і ўраджай з яго здымуць, і прададуць, і грошы атрымаюць. А тады ўжо можна і да мужчын у тую Сібір ехаць. Ага, піхума, пакутуець гэты чалавек і ўсё думаець, што яму скора лепей станіць, бяжыць наперад, верыць, што там яго нешта лепшае чакаець, а таго шчасця наперадзе ўсё няма і няма. Можа, яго і ўвогуле нідзе няма, гэтага шчасця? Я, прыкладам, быў бы шчаслівы, каб мне не шкодзілі работаць на зямлі. Я люблю работаць. Араць люблю, сеяць люблю, жаць люблю, малаціць люблю. Гной вазіць люблю. Як пахніць гной, люблю. Некаторыя насы вернуць, а я люблю. Дайце мне рабіць на маёй зямлі тое, што я сам хачу! І я шчаслівы буду. Дайце мне рабіць тое, што я хачу і ўмею, – працаваць. Не даюць. Як толькі ўбачаць, што ў мяне палучаецца, – з усіх бакоў, піхума, кідаюцца і як за штаны не хватаюць, галадранцы, – гыр-гыр-гыр! Чаго яны так? Злыя? Зайздросныя? Не хочуць, каб у мяне палучалася? Не хочуць, каб я быў шчаслівы? Не, што ні кажыце, ёсць у.чалавеку нешта дужа брыдкае, цёмнае. Яно, мусіць, з зайздрасці пачынаецца: "А ў таго яблык у садзе большы", "А ў таго хата лепшая". Дык а хто табе не даець? Пасадзі лепшую яблыню. Пастаў і ты лепшую хату. Дык жа не, сабе ён хату ставіць не хочыць, бо ведае, што гэта цяжка, што папацець і пакрахтаць давядзецца, але ж і табе ў тваёй хаце жыць таксама не дасць: усё будзіць рабіць, каб яна ці згарэла, ці каб яе ў цябе адабралі – або падпаліць, або адсудзіць. Свістуны, піхума! О, якая для іх радасць, калі яны бачаць, што чалавек пакутуець. Якія яны шчаслівыя тады, калі іншаму чалавеку дрэнна. Чужыя пакуты – для іх за радасць. А чалавек жа не для пакут радзіўся. Нашто яны чалавеку? Не, гэта, мусіць, адзінае, што чалавеку не нада. Пакуты чалавек сам сабе прыдумаў. Ад Бога гэтага не было. Няхай жывець і радуецца чалавек, казаў Бог. Не, пакуты – наш лішні цяжар. Хаця – няпраўда. Нада! Нада, піхума, пакуты чалавеку! Каб чалавек чалавекам станавіўся. З пакутамі ён радавацца будзіць

больш, кожнай дробязі будзіць рады. Кажаш, нада пакуты, а сам уцякаеш ад іх. Пакутаваў бы на сваёй роднай зямлі, дык жа не, едзеш некуды, шукаеш нечага. А ты думаеш, там табе лепей будзіць? Ты думаеш, там табе волю дадуць? Думаеш, здзекавацца перастануць? Думаеш, там во такіх во харламаў шрубянкоў няма, казябаў не будзіць? Усюды яны ёсць! І нікуды ты ад іх не дзенешся, і ўцякай ці не ўцякай – не ўцячэш. Казябы і шрубянкі вечныя. Яны ўсюды ёсць. Мусіць, для нейкай дурной раўнавагі Бог іх прыдумаў. Калі ёсць харошыя людзі, то павінна ж і гэта мярзота быць. Калі ёсць чалавек, які ўмеець і любіць работаць, то нада, каб быў і той, хто нічога і не ўмеець, і не хочыць рабіць. Адно толькі зайздросціць. Раўнавага! Але ж навошта чалавеку гэтая неразумная раўнавага?

Дык во ўцякаеш ты, Ціт, ад Соплаў гэтых, а яны, казябы, шрубянкі ды яўсцысі, цябе ўжо там, куды ты спяшаешся, чакаюць. Не, канечне ж, не яны самі, а такія ж прыдуркі, як і гэтыя абэлтухі. Чакаюць і радуюцца: ага, ён хутка прыедзіць, во ўжо адвядзём душу, во наздзекаваемся. І тут, у Кросніцы, таксама, піхума, радуюцца. А чаму ж ім, гультаям, не радавацца? Усё ім Цітава засталося. І сад застаўся. Такі сад! Хацеў высекчы, дык сказалі: нельга, няруш. Судом прыгразілі, турмою. Так і застаўся, Ціт, твой сад без гаспадара. І зямля твая засталася. Паехаў во сам, і за табою ўсё паехала. Толькі во і твайго, што на санях. Я пытаўся, ці можна вярнуцца з тае Сібіры назад, на сваю зямлю, калі там не ўжывешся, калі не спадабаецца. Вяртайся, кажуць, але ўжо не на сваю зямлю. Тваю зямлю мы раздадзім. Ты ўжо на яе не будзеш мець права, як паедзеш. Вунацька акруговая зямельная камісія ўжо і рашэнне на тваю зямлю падрыхтавала: перадаць яе малазямельным сялянам. Казябу перадаць, Шрубянку перадаць, Суконцы перадаць... Што?! Маю зямлю гальцяпе?! Каб яны яе спустошылі? Каб яна ў іх здзічэла? Не аддам!

– Не па-е-д-у-у-у! Спачатку яму нават здалося, што закрычаў ён сам. Але, схамянуўшыся, зразумеў, што па-ваўчынаму вые Юстына – ён не паспеў схапіць яе за руку, яна зноў выкулілася з саней, цягнула за сабой і Трахімку, але Ціт здолеў яго ўтрымаць на возе, – хуценька падхапілася і зноў уцэла па снезе, тонучы, як нядаўна ў прыдарожных сумётах, галосячы, абмінаючы сані, кінулася бегчы назад – дадому. Жончын плач нібыта разадраў яму павекі – дагэтуль Ціт ехаў як з заплюшчанымі вачыма: нічога не бачыў вакол сябе – і яго зараз асляпіла сонца, якое, хоць і было ўжо на захадзе, свяціла ярка і шчодра. І Ворашань, быццам упершыню, убачыў усю светлату непарушанага снегу, убачыў, як чыста і бела ў полі, як ззяюць навокал некранутыя і, здавалася, адвечныя сумёты – як усё роўна кожны промень у бялюткіх снежных гурбах знаходзіў менавіта сваю сняжынку і выкрасаў з яе халодную і вусцішную, як нязведаная дарога, іскру.

Зусім ужо блізка была станцыя – над яе прыземістымі будынкамі высока ўзвышалася воданапорная вежа з белаю халоднаю шапкаю снегу на ёй...

– Но, піхума! – прарэзліва, аж здрыгануўся Трахімка, крыкнуў на каня Ціт і тут жа завыў яшчэ больш па-ваўчынаму, чым Юстына: – У-у-у-у-у!

З усёй рукі Ворашань уліў пугі каню, і той, звыкшы ўжо, што яго ніхто не чапае, не торгае, ад першага ж падхлёсту пугаю ўпудзіўся, пабег як не ўгалоп, а Ціт, устаўшы на санях у повен рост, раз'юшана, разлютавана ўсё сцябаў і сцябаў яго. У сваёй злосці ён спачатку не заўважыў, што конь чамусьці паварочвае ўлева, закручвае назад, нібы спяшае за Юстынаю, а як заўважыў, зразумеў, што ляйчына звалілася з воза і трапіла пад полаз. Нагнуўшыся, стаўшы ў санях на калені, ён выбраў яе з-пад полаза, але разварочваць каня не стаў, а ўтрапёна, як звар'яцелы, усё сцябаў яго пугаю – нібыта спяшаўся дагнаць Юстыну. Спалохана кінуўся яму наперарэз Лявон, закрычаў: "Што ты робіш, псіхапат! Аглоблі паламаеш! Каня заб'еш!" – але, убачыўшы перакошаны ў нейкім адчаі, у нейкай нечалавечай злосці Цітаў твар, саступіў яму дарогу. Ціт дагнаў Юстыну, тая ўзялася за аглоблю і бегла зараз побач з канём. Ворашань раз'юшана, не шкадуючы ні каня, ні жонкі, сцябаў іх абаіх – то па кані, то па Юстыне, – але яна, замест таго каб уцякаць ад пугі ці плакаць ад болю, шчасліва, як вар'ятка, смяялася. Мужчыны, сабраўшыся ў гурт, крыху пастаялі, пагаманілі, – чакалі, што Ціт урэшце апамятаецца, пасадзіць жонку на сані, паверне каня і, супакоіўшыся, зноў выедзе на дарогу, што прастуе да станцыі, да якой ужо было рукою падаць, – але, убачыўшы, што ён нават і не думае гэта рабіць, а ўсё спяшаецца і спяшаецца, каб хутчэй, мусіць, знікла з вачэй ненавісная яму зараз станцыйная вежа, разышліся да саней і паціху, спакойна пачалі разварочваць у другі бок і іх. Ціт назад не азіраўся – быццам яго і не цікавіла, едуць за ім астатнія ці не едуць. Ён усё яшчэ сцябаў і сцябаў каня. Ён ведаў, што дома яму будзе яшчэ цяжэй і невыносней жыць, чым у той невядомай Сібіры, але ўсё ж так і не развярнуў саней.

Конь бег з усіх ног, і Юстына, трымаючыся за аглоблю, спатыкаючыся, але не адстаючы, бегла побач з ім. І ўсё яшчэ, шчаслівая, смяялася. Калі б хто-небудзь незнаёмы ўбачыў яе вось зараз, мог бы падумаць, што жанчына звар'яцела: яе сцябаюць пугаю, а яна смяецца. Калі б хто-небудзь мог убачыць зараз зблізку і Ціта, заўважыў бы, што ў яго вачах стаялі слёзы: Ворашань, замест таго каб радавацца – дамоў жа вяртаецца! – плакаў.

Вясна, 1986 год

– Айё, айё, а хатачка ж ты мая родненькая, а чаго ж мяне з табою разлучаюць, а навошта ж мяне адрываюць ад цябе, чаго ж, маю сіраціначку, пакідаюць тут пуставаць адну-адненькую. А зямелька ж наша ласкавая, а чаго ж мы такія гаротныя, што нас увесь час зганяюць з тваіх нівак і сенажацяў, з тваіх лужочкаў і баразёначак, а чаму ж не даюць нам любіць цябе так, як мы хочам і ўмеем. А мамачка ж мая залаценькая, а ты ж дзяржалася за сваю зямельку абедзвюма ручачкамі і грэла на ёй да самай сваёй смертайкі свае вочачкі. А ты ж уцякала, бегла да яе з усіх пасяленняў-высяленняў сваіх... А татачка ж ты мой даражэнечкі, а ты ж вучыў нас не пакідаць сваёй зямелькі ніколі, не расставацца з ёю векі вечныя, то ж навучы і зараз, як гэта зрабіць, каб і ў бяду гэту страшную астацца з ёю, нашай шчодраю карміцелькай і паіцелькай. А ты ж і сам, наш работнічак, і нагараваўся на ёй, і наплакаўся, хоць уся твая і віна была, што любіў і ўмеў працаватайкі, што ніколі не сядзеў склаўшы ручанькі. І хоць ты гараваў на

сваёй на зямелечцы, але ж сам пакінуць яе не адважыўся. А нагараваўся ж ты, напакутаваўся, горам і бядою перасыціўся, і жыццём усім заплаціў чарцям за сваю любоў да зямелечкі. Сам не змог ніяк адарвацца ты ад свае зямлічачкі, дык цябе сілаю адарвалі ад яе і сілаю павезлі ў тую Сібір, якая, як здавалася табе некалі, можа быць тваім паратуначкам. А татачка ж ты мой, а родненькі, а ты ж сваёй рыштанцкаю кухваечкай папавыцер усю Сібір тую, саграваў яе і цяплом сваім, і работаю. А на ягельніках наляжаўся ты, а кедраў таўстых наваліўся ты, а хлеба лагернага, хлеба горкага панаеўся ты. А ты ж любіў сваю зямелечку, таму цябе і разлучылі з ёй, і пасля смертайкі унь злучыцца з ёй не дазволілі, і я й сёння не ведаю, дзе твая магілачка, у якой жа вечнай мерзлаце ляжаць твае костачкі ці якія дрэўцы вырастаюць з тваіх грудачак. А татачка ж ты мой, а родненькі, а цябе ж сілаю адарвалі ад роднай зямелечкі, ад роднай хатачкі, а зараз во і мяне адрываюць. Кажуць, што і нас павязуць у тую Сібіру далёкую, якая з'ела цябе і не наелася, і паселяць там на векі вечныя. А людцы добрыя, а чым жа мы правінавацілiся, а як жа нам без зямлі сваёй у Сібіры той абыходзіцца? А дзе ж ён, змей страшэнны той, вораг ненаедны той, які пагражаець і нашай зямелечцы, і нам усім? А я ж яго вочачкамі не бачу, вушачкамі не чую, ні ротам, ні носам не адчуваю, і далонямі не магу засланіцца, не магу адпіхнуць яго, бо змей гэты – нявідзімы нам...

На вуліцы каля веснічак прарэзліва сігналіў дапатопны яшчэ, здаецца, пасляваенны аўтобус: дзе яны яго толькі і знайшлі, гэтыя эвакуатары? Але старая ўсё стаяла ля ганка і ніяк не магла адважыцца пайсці з двара.

– Баба Люба, няможна так. Садзіцеся хутчэй, – ужо з аўтобуса прасіла старую Верачка, большанькая ўнучачка.

– Паехалі, а то ж мы ўсе абпраменімся.

– А ўнучачкі ж вы мае родныя, а і праўда, едзьце ж вы хутчэй і жывіце ж вы, жывенькія і здаровенькія, дзе хочаце, а мяне ж, старую бабу, не чапайце і не вязіце нікуды.

– Ну, бабуля, – захныкаў і меншанькі ўнучак, але баба Люба нібы і не чула яго. – А нікуды ж я, мае ўнучачкі, не пайду і не паеду адсюль. Я ж хачу ў сваёй роднай хатачцы памерці, і ў сваёй роднай зямельцы ляжаць, і чуць, як нада мной родныя красачкі цвітуць, родныя дрэўцы шумяць, родныя птушачкі лятаюць.

– Любоў Цітаўна, паехалі. Убачыўшы, што да яе падыходзяць міліцыянер і старшыня сельсавета, баба Люба борздзенька, як маладая – адкуль у яе ўзяўся гэты спрыт? – узбегла на ганачак, кінулася ў сенцы, спяшаючыся, зачыніла дзверы за сабою, зашчапілася і там, ля дзвярэй, заціхла – мусіць, прыслухоўвалася: ці будуць ламаць?

Але ламаць дзвярэй ніхто не стаў. Аўтобус яшчэ пастаяў крыху, пасігналіў ды і паехаў, – нехта з эвакуатараў падаў думку, што бабу Любу, калі яна супакоіцца, астыне, можна будзе забраць наступным рэйсам.

1989 г

.

Алесь Андрэевіч Марціновіч

Апавяданне «“Гетман-кларнет” на службе ў муз»

(прысвечан Міхалу Казіміру Агінскаму)

У Рэчы Паспалітай паведамленне аб смерці Жана Жака Русо (пайшоў з жыцця вядомы французскі філосаф, палітык і мысліцель 2 ліпеня 1778 года) сустрэлі не адназначна.

Тыя, хто стаяў за моцную дзяржаву з захаваннем ў нязменнасці ўсіх яе інстытутаў, ніяк не маглі дараваць яму напісанне працы «Меркаванні аб спосабе праўлення ў Польшчы і аб праекце яго змянення, складзеным у красавіку 1772 г.», у якой канстатавалася цяжкае становішча сялян у Польшчы, Літве і на Беларусі і называліся практычныя меры вызвалення іх ва ўсіх правінцыях. Гэта ўспрымалася многімі, як умяшанне ва ўнутраныя справы краіны, якое вядзе да падрыву спакою і стабільнасці ў грамадстве, а таму яны вестку аб адыходзе аўтара падобных рэкамендацый у іншы свет успрынялі з непрыхаваным задавальненнем, цешачы сябе тым, што на аднаго бунтаўшчыка стала менш.

Прыхільнікі ж рэвалюцыйных пераўтварэнняў, удасканалення інстытутаў улады, наадварот, смуткавалі, бо разумелі, што са смерцю Русо менш трывалай становіцца тая аснова, на якой трымаюцца найлепшыя памкненні ва ўпарадкаванні грамадскага жыцця. Сярод іх, бадай, асабліва балюча сустрэў паведамленне аб смерці філосафа Антоній Тызенгаўз, які, як вядома, у мясцовых умовах развіваў ідэі Русо аб неабходнасці ўсталявання цвёрдай законнасці ў дзяржаве і забеспячэння неабходных патрэб усяго насельніцтва, а яшчэ прапаноўваў пасяліцца яму пасяліцца ў Гродне ці ў Белавежскай пушчы.

Але ў асяродку прыхільнікаў знакамітага філосафа і мысліцеля ўсё ж найбольшую ўвагу да сябе ў сувязі з яго смерцю выклікаў вялікі гетман Вялікага княства Літоўскага Міхал Казімір Агінскі. Праўда, сваё стаўленне да канчыны Русо ён не абнародаваў, а толькі выказваў каралю Станіславу Аўгусту Панятоўскаму, ды, як амаль заўсёды бывае тады, калі адбываецца штосьці надта неарднарнае, пагалоска пайшла далёка. Тым больш, што выпадак гэты інакш, як да анекдатычных, не аднясеш.

Як толькі сумная вестка дайшла да Варшавы, Агінскі паспяшаўся да Панятоўскага. Яго адносіны са Станіславам Аўгустам былі далёкімі ад сяброўскіх, але, па-першае, кароль з'яўляўся кузенам жонкі Міхала Казіміра, а па-другое, нягледзячы на рэальнасць, часам любіў засведчыць, што ў іх з вялікім гетманам стасункі самыя прыязныя, таму ў неабходных выпадках Агінскі і спяшаўся да яго. А цяпер, на думку гетмана, якраз і быў такі выпадак, калі ён проста не мог не выказаць каралю сваё стаўленне да канчыны Русо. Не зважаючы на тое, што Панятоўскі не надта хацеў закранасць гэтую тэму.

Убачыўшы ў сваім кабінеце Агінскага, Станіслаў Аўгуст паспяшаўся яму насустрач. На твары караля расплылася прыязная ўсмешка — калі б за гэтым назіраў хто-небудзь з тых, хто не ведаў пра яго сапраўдныя адносіны з наведвальнікам, можна было б падумаць, што Панятоўскі толькі і жыў чаканнем Міхала Казіміра:

— Рад бачыць вас, вялікі гетман літоўскі!

Здаецца, яшчэ імгненне і кароль працягнуў бы рукі, каб абняць Агінскага. Аднак Міхал Казімір нават для прыліку не падаў выгляду, што яму гэта будзе прыемна. У адказ на словы Панятоўскага прамовіў надзіва самотліва і разам з тым да таго цвёрда, што ніводзін мускул не ўздрыгнуў на ягоным твары:

— Не бачу падстаў для радасці, ваша вялікасць.

Станіслаў Аўгуст разгубіўся, бо не чакаў падобнай рэакцыі, але хутка саўладаў з сабой:

— Прабачце, пане Агінскі...Прабачце... Як гэта я і забыўся, — пачаў ён апраўдвацца. — Сапраўды, як можна радавацца. Усе мы на гэтым свеце не вечныя, а тут памёр такі чалавек...

Цяпер ужо здзівіўся Міхал Казімір. У ягонай галаве маланкава прамільгнула: «Няўжо і Панятоўскі шчыра смуткуе з нагоды смерці Русо? Гэта штосьці новае! »

Але Станіслаў Аўгуст зняў усе ягоныя сумненні:

— Памёр жа польны гетман Сасноўскі. Светлая яму памяць...

Сапраўды, амаль адначасова з Русо адышоў з жыцця і Сасноўскі. Таму кароль і падумаў, што менавіта смерць апошняга і засмуціла Агінскага, але той, на здзіўленне Панятоўскага, не хаваючы раздражнення запярэчыў:

— Пры чым тут Сасноўскі!

— Нічога не разумею, — зусім разгубіўся Станіслаў Аўгуст. — Тады ў чым прычына вашага смутку?

— А што тут разумець! Мой сябар памёр!

— Ваш сябар? — Станіслаў Аўгуст працягнуў правую руку, паволі паціснуў руку Агінскаму. — Яшчэ раз прабачце, пане вялікі гетман. Прабачце і прыміце мае самыя шчырыя спачуванні. Але дазвольце ўсё ж запытацца ...

— Хто мой сябар?

— Канечне, канечне...

— То хіба не чулі, ваша вялікасць?

— Прабачце, пане Агінскі, не чуў.

— Вы не чулі пра смерць Русо?!

— А прычым тут Русо?

— Ваша Вялікасць, ды ён жа — мой сябар!

Панятоўскі глядзеў на вялікага гетмана літоўскага так, як звычайна глядзяць на нешта надзвычайнае, на тое, пра з'яўленне чаго менавіта ў гэты момант і падумаць не маглі, але, як высвятляецца, яно — рэальнасць. Аднак якім вялікім не было ягонае здзіўленне, Станіслаў Аўгуст усё ж дазволіў сабе засумняцца:

— Русо — ваш сябар, шаноўны вялікі гетман?

Чакаў, што падобнае запытанне можа выклікаць уАгінскага рэзкую рэакцыю, што за вялікім гетманам літоўскім часта назіралася, калі ён быў нечым асабліва не задаволены, але, на здзіўленне караля, той павёў сябе даволі спакойна і на пытанне адказаў пытаннем:

— Вы, мабыць, ведаеце, што Русо напісаў музыку да оперы «Вясковы чараўнік»?

Усё ж па тым, якім тонам гэта было прамоўлена, адчуувалася, што Міхал Казімір сумняваецца ў добрым веданні ім творчасці Русо, але Панятоўскі вырашыў прамаўчаць, і ніяк не зрэагаваў, хоць наўрад і ці паспеў бы гэта зрабіць, бо Агінскі выпаліў на адным дыханні:

— Я ж таксама напісаў лібрэта і музыку да операў, якія былі пастаўлены ў Слоніме. Ці забыліся, ваша вялікасць?

— Як вы можаце казаць такое? — Станіслаў Аўгуст ужо не змог стрымаць сябе і шчыра абурыўся.

— То чаму не разумееце тады, што Русо ў гэтым сэнсе, можка сказаць, — мой калега. І не толькі калега, — спахапіўся Міхал Казімір, — а і сябар.

Панятоўскаму нічога не заставалася, як выказаць Агінскаму самыя шчырыя спачування ў сувязі са смерцю ягонага сябра ... Жана Жака Русо. І хоць прамаўляў гэта кароль з цяжкасцю хаваючы іронію, вялікі гетман літоўскі прыняў іх усур'ёз і яшчэ падзякаваў, што ў асобе Панятоўскага знайшоў чалавека, які, як ніхто іншы зразумпеў цану той страты, якую ён, Агінскі, панёс.

Ці то сам Панятоўскі прагаварыўся, ці нехта з блізкага каралеўскага акружэння пачуў, пра што ішла гаворка, але неўзабаве Агінскага за вочы інакш, як сябрам Жана Жака Русо і не называлі. Ды пра гэта Міхал Казімір наўрад ці здагадваўся. Як і пра тое, што знаходзіліся ахвочыя даваць яму такія нядобразычлівыя ацэнкі, як «аперэтачны воін», «элегантны панок». І нават — «мокрая курыца».

Хоць, магчыма, асобныя з гэтых ацэнак, як і некаторыя іншыя, і даходзілі да яго, ды надта не засяроджваў на іх увагу. Хто-хто, а сам добра ведаў, што жыццё вядзе такое неўтаймаванае, калі часта даводзіцца трапляць у пераплёты, з якіх далёка не кожнаму ўдаецца выйсці з гонарам, а да паводных паводзін цяжка паставіцца адназначна. Таму і знаходзяцца жадаючыя папляткарыць. То няхай хоць у гэтым сабе задавальненне маюць, калі на штосьці большае няздатныя. Як у той у прымаўцы: «Мялі языком Апанас, твой цяпер час». Яму ж што — калі трэба, перачакае, пакуль абгаворы скончацца, а не, дык такой бяды, усё адно валасы з галавы ад гэтага не ўпадуць.

Праўда, была ўсё ж адна мянушка, да якой Агінскі, калі чуў пра яе, не мог паставіцца абыякава. Аднак не абураўся, хоць падобная рэакцыя ўспрымалася б заканамернай, а, наадварот, пачутае выклікала ў ягонай непрыхаванае задавальненне, бо часам Агінскага называлі «гетманам-кларнетам». А што можа быць больш прыемнае для чалавека, які не толькі да самазабыцця любіў тэатр, оперу, музыку, а і сам пісаў яе, а таксама небыякавы быў да паэзіі?!

Гэтая любоў была настолькі моцнай, што нават многія іншыя справы станавіліся для яго неістотнымі ў той момант, калі далучаўся да прыгожага, ці жыў прадчуваннем сустрэчы з ім. Нядобразычліўцы ж былі ўпэўнены, што не да твару вялікаму гетману літоўскаму, дзяржаўнаму дзеячу займацца такой несур'ёзнай справай. Ды Міхал Казімір, не зважаючы на папрокі і кпіны, прыкладаў усе намаганні, каб яго галоўная рэзідэнцыя, што знаходзілася ў Слоніме, адпавядала б найменню «сядзіба музаў» ці «палескія Афіны», а гэта ўжо ацэнка зробленага ім тымі, хто ведаў сапраўдную цану здзейсненаму «гетманам-кларнетам».

...Агінскія — адзін са старадаўніх магнацкіх родаў, які меў герб «Агінец». Карані гэтага роду дакладна не ўстаноўлены. Самі Агінскія сваё паходжанне выводзілі ад Рурыкавічаў. Аднак існуе і версія, паводле якой іх родапачынальнік — смаленскі князь Іван Васільевіч Глушонак. Гэты Глушонак у пачатку 1480-х гадоў перайшоў на службу да вялікага князя маскоўскага Івана III, але ягоныя сыны Дзмітрый і Іван засталіся ў Вялікім княстве Літоўскім і сталі заснавальнікамі двух, пазней вядомых родаў — Агінскіх і Пузынаў. Калі ж канкрэтней, дык ля вытоку роду Агінскіх стаіць сын старэйшага сына. Глушонка.

Дзмітрый Іванавіч атрымаў ад вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Аляксандра маёнтак Агінты пад Коўнам. Потым Агінты па спадчыне перайшлі сыну Дмітрыя Іванавіча Багдану, які, як і яго бацька, яшчэ насіў прозвішча Глушонак, але, калі ў 1510 годзе пацвердзіў свае правы на Агінты, памяняў прозвішча і стаў Агінскім. У далейшым Агінскія адыгрывалі значную ролю ў дзяржаўным, грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі, Літвы, Польшчы і Расіі.

У сям'і троцкага ваяводы Тадэвуша Юзафа Агінскага і яго жонкі Ганны, у дзявоцтве Вішнявецкай, у 1728 годзе нарадзіўся сын, якога бацькі назвалі Міхалам Казімірам. Праўда, ў беларускіх энцыклапедыях і энцыклапедычных даведніках згадваецца 1730 год, але, відаць, усё ж правільней называць 1728-мы, якога прытрымліваецца найбольш дасведчаны даследчык жыцця і дзейнасці Агінскага, аўтар кнігі «Міхал Казімір Агінскі і яго «сядзіба музаў» у Слоніме» Анджэй Цеханавецкі.

Міхал Казімір быў адзіным хлопчыкам у даволі вялікай сям'і Агінскіх і выхоўваўся ў асяродку сваіх шасці сясцёр. Гэта ў пэўнай ступені наклала ў будучым адбітак на ягоны характар. Па сведчанню таго ж Цеханавецкага «асабліва на яго вельмі дзіцячае ці, хутчэй, жаночае самалюбства, на ўвагу да свайго вонкавага выгляду». Пацвярджэнне апошняму і выпадак, які згадвае Юльян Нямцэвіч.

Калі Нямцэвіч неяк разам з Агінскім разглядаў яго партрэт з часоў юнацтва, дык заўважыў вялікае падабенства з «арыгіналам», на што Міхал Казімір незадаволена запярэчыў: «Я — прыгажэйшы».

А ўвогуле абставіны складваліся так, што Агінскі з маленства мусіў знаходзіцца пад уплывам самых розных людзей, паколькі рана страціў бацьку. Бацькава маці і бабуля Міхала Казіміра Элеанора, якая была жонкай віленскага ваяводы, хоць і праславілася сваімі дзівацтвамі, у сітуацыі, што склалася, дзейнічала разважліва і

рашуча. Яна адразу ўзяла ўсю маёмасць пад свой часовы арышт, каб не знайшліся ахвочыя паквапіцца на спадчыну ўнука.

Апекуном жа Міхала Казіміра спачатку быў дзед па матчынай лініі гетман Вішнявецкі, а калі ён у 1744 годзе памёр, аб ім рупіўся блізкі сваяк, віцебскі ваявода Марцыят Агінскі. Аднак і гэта доўжылася нядоўга, бо ў справу ўмяшаўся нават сам кароль і са згоды яго чарговым апекуном Міхала Казіміра стаў князь-канцлер Міхал Чартарыйскі, які, безумоўна, аказаў немалы ўплыў на фарміраванне ягонага светапогляду, шмат паспрыяў у атрыманні належнай адукацыі.

Праўда, наконт грунтоўнасці адукацыі Агінскага даследчыкі разыходзяцца. Адны схільны меркаваць, што Міхал Казімір усё ж меў па асноўных навуках павярхоўныя веды. Іншыя ж упэўнены, што ў авалодванні імі праявіў сябе належным чынам. Добра разбіраўся нават у галіне механікі, але асноўнай ягонай схільнасцю былі музыка і выяўленчае мастацтва. Няблага маляваў, а таксама навучыўся ігры на скрыпцы і арфе. Аднак апошняе захапленне, бадай, прыйшло крыху пазней, таму што спачатку было не да гэтага, бо ў раннім юнацтве далучыўся да актыўнага грамадскага і палітычнага жыцця.

Ужо 18 верасня 1744 года яму даверылі пасаду вялікага літоўскага віначэрпія. 20 чэрвеня 1748-га быў прызначаны польным літоўскім пісарам. Яшчэ праз тры месяцы, 20 верасня 1748 года прысвоілі званне генерал-маёр.

Падобны хуткі службовы рос, зразумела, не быў бы магчымым, калі б Міхал Казімір не меў такога аўтарытэтнага і ўплывовага апекуна, як Чартарыйскі, які, між іншым, прапанаваў яму цалкам звязаць свой лёс з арміяй і Агінскі, паслухаўшыся яго, напачатку выбраў ваенную кар'еру. Нельга не прымаць таксама пад увагу і яго знатнае паходжанне. Але, несумненна, і тое, што Міхал Казімір належаў да людзей, якія сваімі справамі хутка прыцягваюць да сябе ўвагу, а таму і знаходзяць належную падтрымку.

Так адбылося і ў тым жа 1748 годзе, калі праходзілі чарговыя выбары ў сейм. Дваццацігадовы Агінскі без асаблівых цяжкасяцяў стаў дэпутатам. На гэты ж час прыпадае і ўпарадкаванне яго маёмасных спраў. Да атрыманых каронных маёнткаў потым была далучана Пінская эканомія, а яшчэ пазней шэраг старостваў, у прыватнасці, такія , як Чачэрск, Мерач, Пінск і іншыя. Аб'яднанне іх з багатай спадчынай бацькі адразу ж зрабіла Міхала Казіміра вельмі багатым чалавекам.

З 1748 годам даследчыкі звязваюць і выпадак, які, на іх думку, праспрыяў таму, што Агінскі ў далейшым шмат рабіў дзеля навядзення ў сваіх уладаннях парадку, пачынаючы ад добраўпаракавання дарог і завяршаючы будаўніцтвам будынкаў культурнага прызначэння. Калі ж прытрымлівацца гэтага меркавання, з дарогі ўсё і пачалося.

На другі дзень калядных святаў, няблага адпачыўшы, Міхал Казімір захацеў больш "вострых" адчуванняў, а паколькі з павагай ставіўся да простага люду, чаго нельга сказаць пра большасць тагачасных магнатаў, выказаў жаданне папрысутнічаць на імшы ў звычайнай вясковай хаце. А ягонае слова для падначаленых — закон. Тут

жа была пададзена раскошная карэта, а яшчэ праз нейкалькі мінут гэтаксама раскошна апрануты Агінскі, усеўся ў яе і ў суправаджэнні слуг накіраваўся ў шлях.

Але чым далей ад'язджалі ад дому, тым менш радасці станавілася ад гэтага падарожжа. Дарога была да таго кепская, што карэта моцна пахіствалася з боку на бок, гатовая паваліцца. Усе гатовы ўжо былі павярнуць назад. Усе, аднак толькі не Міхал Казімір. У яго і ў думках не магло з'явіцца жаданне аб «адступленні».

Не астудзіў рашучасць Агінскага і мост, што паказаўся наперадзе. Правільней, тое, што засталося ад яго. Па логіцы цяпер трэба было б абавязкова павярнуць назад. але самалюбства не дазваляла Міхалу Казіміру прыняць такое рашэнне. Са слугаў жа ніхто па-ранейшаму не асмельваўся яму запярэчыць. хоць і кожны добра разумеў, што пераадоленне гэтай перашкоды дабром не скончыцца.

Коні, відаць, таксама адчувалі небяспеку, таму, калі па загаду Агінскага той слуга, якія сядзе наперадзе, моцна сцебануў іх лейцамі, імкліва рванулі з месца, спрабуючы з ходу праскочыць дзіравы і хісткі насціл. І гэта ім, бадай, удалося, да другога берага заставалася ўсяго нейкага паўметра, але карэта да таго расхісталася, што не ўстаяла і звалілася ў ваду. Спужаныя ж коні ўсё ж ўтрымаліся на мастку, але, зразумела, да іх цяпер нікому не было ніякай справы.

Усе кінуліся ратаваць Агінскага, аднак Міхал Казімір, не запанікаваў і сам здолеў вылезці з карэты. І адразу ж апынуўся ў вадзе. Балазе рэчка аказалася не глыбокай, а таму, брудна лаячыся, без чыёй-небудзь дапамогі выбраўся на бераг. Калі ж крыху прыйшоў у сябе, заявіў:

— Трэба будаваць дарогі! —і дадаў: — Масты таксама!

Магчыма, і сапраўды было так. Але нельга адмаўляць і таго, што на падобнае рашэнне Агінскага нямала паўплывала і ягонае знаходжанне за мяжой, куды неўзабаве паехаў і дзе паспеў пераканацца, наколькі там больш удзяляецца ўвагі добраўпарадкаванню дарог, тэрыторый, населенных пунктаў, чым на радзіме.

Аднак, несумненна, мэта паездкі была іншай. Маладому, энергічнаму генерал-маёру хацелася і свет пабачыць, і сябе свету паказаць. А паколькі лічыў сябе прыгожым (у чым яму і сапраўды нельга было адмовіць), дык і спадзяваўся весела правесці час у лепшых арыстакратычных салонах, завёўшы шэраг знаёмстваў з прадстаўніцамі прыгожай палавіны чалавецтва, якія гэтаксама, як і сам ён, любілі амурныя прыгоды.

Усё гэта, канечне, было. Дарэчы, адна з падобных прыгод (якая канкрэтна, сказаць немагчыма) на пэўны час затрымала яго ў Берліне, але не настолькі, каб мог страціць галаву ад пачуцця, якое нечакана напоўніла ягоную душу. Не абышлося без умяшання Амура і ў Вене, куды перабраўся з Берліна. Не сказаць, каб адмаўляўся ад амурных паходжанняў і ў Парыжы, які быў наступным горадам яго замежнага ваяжу. Але менавіта Парыж стаў для Агінскага і горадам, які ў многім паўплываў на яго далейшае жыццё.

Адкінуўшы поспехі на любоўным фронце, а таксама ўдзел у паходзе герцага Арлеанскага (пад час другога наведвання Парыжа Міхал Казімір ў 1757 годзе

з'яўляўся яго ад'ютантам), паколькі ўсё гэта ў той ці іншай ступені звязана з ягоным авантурызмам, пастаяннай прагай чагосьці незвычайнага, нельга не сказаць, што пражыванне ў сталіцы Францыі паспрыяла і ягонаму культурнаму росту, і наладжванню кантактаў, карысць ад якіх была відавочнай.

На першы план трэба аднесці знаёмства Агінскага з Дзідро. Паспрыяла гэтаму тое, што Міхалу Казіміру быў заказаны артыкул пра арфу для першага выдання Французскай энцыклапедыі, што само па сабе сведчыць аб значнасці ягоных пазнанняў у галіне музыкі. А ёю захапляўся і Дзідро. У тым ліку і ігрой на арфе.

Пры якіх абставінах яны сустрэліся, сказаць немагчыма, але Дзідро настолькі быў уражаны майстэрствам Міхала Казіміра, што яго выкананне на арфе шэрагу мелодый слухаў на працягу трох гадзін. А праз некаторы час пісьмова засведчыў вялікія тэхнічныя магчымасці Агінскага ў гэтым накірунку, як і адзначыў яго таленавітасць.

Менавіта Міхалу Казіміру прыпісваюць і ўдасканаленне згаданага музычнага інструмента. Выказваецца меркаванне, што ніхто іншы, а Агінскі, вынайшаў для арфы падножку, а ўжо Эрард давёў яе да ладу.

Хутчэй за ўсё Дзідро слухаў і ігру Міхала Казіміра на скрыпцы, бо, па некаторых сведчаннях, ён і скрыпкай валодаў гэтаксама дасканала. як і арфай. Са скрыпкай, між іншым, звязаны яшчэ адзін анекдатычны выпадак у жыцці Агінскага (калі б сабраць іх усе разам, відаць, атрымаўся такі вясёлы жыццяпіс гэтага неардынарнага чалавека, што можна было б пасмяяцца ад душы).

Калі Міхал Казімір вымушаны быў на некаторы час пакінуць Радзіму, хаваючыся ад праследавання расійскіх уладаў, ён з'явіўся ў Парыжы перад адным сваім знаёмым са скрыпкай і карцінай у руках і прамовіў: «Вось тое, што сёння будзе мяне ўтрымліваць у жыцці!» Нельга не ўбачыць ў гэтым і пэўнай тэатральнасці, жадання зрабіць эфектнае ўражанне, але сутнасць тым няменш падобныя яго паводзіны гавораць шмат. Калі Агінскі і разлічваў на эфект, дык гэта рабіў там, дзе для гэтага былі падставы і тады, калі разлічваў, што яго намаганні належным чынам ацэняць.

Знаходжанне ў Парыжы звяло яго і з князем Рэпніным. Карыснасць гэтага знаёмства Міхал Казімір (хоць і не ставіў пры знаёмстве перад сабой якой-небудзь карыслівай мэты), адчуў пазней, калі пасля падзелу Рэчы Паспалітай Рэпнін стаў рускім губернатарам літоўскага краю. У асобе Рэпніна Агінскі знайшоў прыхільніка, што асабліва спатрэбілася пасля таго, калі над гарызонтам Міхала Казіміра згусціліся чорныя хмары. Менавіта Рэпнін, дзякуючы свайму вялікаму ўплыву і, безумоўна, правам, якія былі дадзены яму, паспрыяў таму, што Агінскаму ўдалося захаваць свае асноўныя ўладанні...

Сталіцу Францыі ён пакідаў па настойлівай просьбе свайго апекуна Чартарыйскага. Адна з прычын Міхалу Казіміру была добра вядомая: 12 кастрычніка 1760 года памёр падканцлер літоўскі Міхал Антон Сапега, трэцяй жонкай якога з'яўлялася дачка Чартарыйскага Аляксандра. Агінскі мог здагадвацца, што ягоны апекун цешыць сябе спадзяваннем аддаць яе замуж менавіта за яго.

З Аляксандрай Міхал Казімір быў знаёмы, але, разумеючы, што яна замужам, якіх-небудзь планаў адносна яе перад сабой не ставіў, хоць Аляксандра і спадабалася яму. Не асмельваўся завесці з ёй і раман, бо разумеў, чым гэта можа скончыцца. І не столькі самога Сапегі баяўся, колькі Чартарыйскага, бо неаднойчы мог ўпэўніцца, які страшны князь, калі на некага разгневаўся. Цяпер Аляксандра — свабодная, свабодны і ён сам...

Аднак не толькі з падобнай нагоды адклікаў Чартарыйскі Агінскага з-за мяжы. Была і іншая, пры чым няменш істотная, а ў нечым і больш значная. Паспеўшы добра прыгледзецца да Міхала Казіміра, Чартарыйскі не мог не зразумець, што ягоная кандыдатура пры належнай падачы яе можа стаць добрай казырнай картай у вострай палітычнай барацьбе паміж рознымі магнацкімі групоўкамі. Зразумела, на яго, Чартарыйскага боку.

Князю якраз і не ставала чалавека, падобнага Агінскаму. Ён падыходзіў Чартарыйскаму ва ўсіх адносінах. Малады, карыстаецца аўтарытэтам, паспеў многага дасягнуць, а яшчэ, што таксама немалаважна, не пазбаўлены самалюбства, таму, калі з'явяцца прапановы павесці барацьбу за ўладу, ахвотна згодзіцца. А якраз яго і ставіў Чартарыскі на першае месца ў сваіх далёка ідучых планах, якія не спяшаўся абнародаваць. Пакуль жа хацеў ажаніць Міхала Казіміра на сваёй дачцэ-удаве.

Але ні сам Чартарыскі, ні тым больш Агінскі і не здагадваліся, што ўжо з'явіўся ўплывовы прэтэндэнт на руку Аляксандры — Юзаф Сангушка. Чартарыйскі пэўны час знаходзіўся ў няведанні, бо дачка, захоўваючы жалобу па мужу, не магла аддаваць каму-небудзь перавагу з тых, хто, карыстаючыся момантам, пачаў заглядвацца на яе, а Сангушка спачатку маўчаў аб сваіх намерах. Тым больш далёкім быў ад усіх гэтых перыпетый, знаходзячыся за мяжой, Агінскі.

Прыехаўшы на радзіму без канкрэтнага намеру адносна Аляксандры, Міхал Казімір, аднак, калі даведаўся, што ягоны апекун і сапраўды не супраць, каб менавіта Агінскі стаў яго зяцем, пачаў бліжэй прыглядацца да маладой удавы. Чуткі ж, што прасіць руку Аляксандры збіраецца Сангушка, выклікалі ў яго жаданне любой цаной адпрэчыць з дарогі свайго суперніка, а што Сангушка — ягоны супернік, ужо нікольки не сумняваўся. Неспакойная натура Міхала Казіміра прагнула перамогі. Ён зразумеў, што ніколі не даруе сабе, калі ўпусціць птушку шчасця са сваіх рук. А галоўнае, пераканаўся, што кахае Аляксандру.

Схіліць маладую ўдаву на свой бок яму ўдалося без асаблівай цяжкасці, бо меў тое, чаго не ставала Сангушку: вытанчанасць манераў у паводзінах (знаходжанне за мяжой не прайшло бясследна), цудоўная ігра на скрыпцы і арфе, уменне маляваць. А хіба шмат трэба, каб заваяваць сэрца ўражлівай жанчыны?! І Аляксандра хутка ўпэўнілася, што кахае Агінскага.

То было каханне, якое хутка ўспыхвае на кастры колішняй прыхільнасці, прысак ад якога яшчэ не паспеў астыць. То была любоў, пра якую кажуць, што яна — незямная. Не хаваў сваіх пачуццяў і Міхал Казімір, прамаўляючы сваёй абраніцы пяшчотныя словы, а гэта ён умеў рабіць. Праўда, калі ў іншых выпадках гаварыў іх не

надта задумаючыся над сэнсам сказанага, абы толькі паланіць сэрца той, на каго скіраваў свае памкненні, дык цяпер рабіў гэта шчыра. Прынамсі, так падавалася яму.

Вяселле гулялі ў Волчыне 18 кастрычніка 1761 года — праз год і шэсць тыдняў пасля смерці папярэдняга мужа Аляксандры. Памятаючы пра гэта, вырашылі не рабіць пышных урачыстасцяў, таму ўсё адбывалася вельмі сціпла. Магчыма, нават празмерна сціпла. Ды ні Аляксандра, ні Глінскі гэтаму не надавалі аксаблівай увагай. Яны былі па-сапраўднаму шчаслівымі, яны проста хацелі быць разам. Таму неяк звыкла выслухвалі віншаванні. Спакойна паставіліся і да слоў, прамоўленых кузенам нявесты Станіславам Панятоўскім. Яшчэ не каралём, а звычайным літоўскім стольнікам. І не Станіславам Аўгустам, а Станіславам Антоні. Аўгустам ён стане, калі ўзначаліць Рэч Паспалітую. Праз тры гады, у 1764-м.

Лёс наканаваў ім быць жонкай і мужам трыццаць сем гадоў (Аляксандра памрэ 28 жніўня 1798 года). Менавіта быць, але не жыць, бо хутка зразумелі, што па сутнасці чужыя адзін аднаму. На адчужанасць шмат паўплывала і тое, што не мелі дзяцей, але не ў меншай, а ў чымсці і ў большай ступені сказвалася рознасць інтарэсаў. Таму кожны быў прадастаўлены самому сабе, а праз некаторы час пасля вяселля нават дайшло да таго, што рэдка сустракаліся. Аляксандра ў асноўным турбавалася сваёй рэзідэнцыяй у Седльцах, дзе і жыла, а Міхал Казімір паступова ўсё больш пачаў любіць Слонім, які і ператварыў у галоўную рэзідэнцыю.

Слонімская эканомія дагэтуль належала Міхалу Антону Сапегу, які, трэба аддаць яму належнае, апекаваўся навукамі. І, відаць, утрымліваў маёнтак ў належным стане, бо Чартарыйскі, арганізаваўшы ў 1756 годзе з'езд вышэйшых дзяржаўных асоб Вялікага княства Літоўскага з прыцягненнем уплывовай шляхты, месцам правядзення яго выбраў менавіта Слонім, а пасля завяршэння з'езда ўсіх запрасіў у дом свайго зяця. Але менавіта пры Агінскім гэты, на той час невялікі гарадок, набыў сусветную вядомасць, ператварыўшыся ў сапраўдную «сядзібу музаў», стаўшы «палескімі Афінамі», як называлі Слонім тыя, каму тут пашчасціла пабываць і пры самім Міхалу Казіміру і пазней, калі яшчэ быў відавочны плён ягоных намаганняў у галіне культурна-тэатральнага будаўніцтва. Праўда, саму рэзідэнцыю Агінскі пашырыў, шмат займаўся павелічэннем тэрыторыі парку, узвядзеннем новых будынкаў, тым самым пераўтвараючы яе ў непаўторны паркава-сядзібны ансамбль.

Але ў Слоніме ён з'явіўся не адразу. Як і не адразу прыйшоў да высновы, што менавіта тут трэба зрабіць сваю галоўную рэзідэнцыю. Пасля жаніцьбы з жонкай паехаў у Пецярбург, але разам з ёй там знаходзіўся нядоўга. Аляксандра хутка пакінула сталіцу Расіі і паехала ў свой маёнтак. Адлучаўся з Пецярбурга і сам Міхал Казімір, але па іншай прычыне.

У 1762 годзе Агінскі арганізаваў абарону Волчына і, нягледзячы на адсутнасць ваеннага вопыту, дзейнічаў так паспяхова, што яму прапанавалі пасаду віленскага ваяводы. Нічога супраць не меў і кароль, але Міхал Казімір ваяводам так і не стаў, бо вымушаны быў адмовіцца ад гэтай пасады на карысць Караля Станіслава Радзівіла, больш вядомага як Пане Каханку. Аднак з-за гэтага асабліва не перажываў, бо разумеў, што як яго прыхільнікі, так і праціўнікі маюць свае ярка выражаныя

палітычныя інтарэсы, яму ж яшчэ хацелася знаходзіцца па-за палітыкай. І не ўдавалася. Асабліва пасля таго, як ім па-сапраўднаму зацікавіўся дацкі пасол у Варшаве Зігфрыд фон Остэн.

У поле зроку барона Агінскі трапіў раней, але акурат цяпер, калі не стала караля Рэчы Паспалітай Аўгуста III, Остэн далучыўся да закулісных гульняў, якія вяліся адносна будучага стаўленніка на каралеўскі трон, і пачаў ускладаць на Міхала Казіміра вялікія спадзяванні, як на таго, хто можа стаць яго фаварытам. А паколькі ў сітуацыі, якая ўзнікла, апошняе слова заставалася за расійскай імператрыцай Кацярынай II, Остэн вырашыў пазнаёміць з ёю Агінскага.

Авантурнасць намераў дацкага пасла была больш чым відавочная, як і камічнасць сітуацыі, у якую ён хацеў уцягнуць Міхала Казіміра. Аднак сам Агінскі пра гэта не здагадваўся. Дый і была прычына, якая падштурхоўвала яго пабыць у ролі каханка Кацярыны II. Як вядома, у якасці прэтэндэнта на каралеўскі прастол выступаў і Панятоўскі, з якім у Агінскага адносіны не складваліся. Значыць, з'яўлялася магчымасць даказаць, хто з іх абодвух варты большага.

Таму згадзіўся з прапановай Остэна, пры дапамозе якога і апынуўся пры царскім двары, дзе знаходзіўся каля года. І нават меў сустрэчы з Кацярынай II, якая спачатку паставілася да яго прыхільна, але потым Міхал Казімір ёй чымсьці не спадабаўся. Кацярына II не толькі не жадала яго бачыць, а і пагарджала ім. А каралеўскі прастол, як вядома, заняў Панятоўскі.

Падобнае завяршэнне залятанняў да расійскай імператрыцы стала для Агінскага сапраўдным ударам. Узненавідзеў усіх. І Панятоўскага, і Остэна, і саму імператрыцу. Першаму разам з жонкай паслаў халоднае віншаванне. Остэна пачаў пазбягаць. Нянавісць да Кацярыны II стала часткай нянавісці да ўсёй Расіі.

Адно ўсцешвала Міхала Казіміра: у гэты цяжкі для яго момант руку падтрымкі прапанаваў Пане Каханку. Перад тым, як апынуцца ў эміграцыі, Кароль Станіслаў прысвоіў яму тытул віленскага ваяводы. Калі раней да ўсяго гэтага Агінскі ставіўся спакойна, дык цяпер згаданы тытул хоць неяк кампенсаваў перажыванні. Аднак меў і матэрыяльнае задавальненне, бо да яго перайшоў шэраг маёнткаў, а таксама радзівілаўскі квартал Юрыдыка ў Вільні. Падоранымі маёнткамі Міхал Казімір валодаў да вяртання Пана Каханку з эміграцыі, пасля чаго аддаў іх законнаму гаспадару. За гэта Кароль Станіслаў 29 лютага 1768 года ўручыў яму булаву вялікага гетмана літоўскага.

Але ні Вільня, ні той жа Слонім пакуль не прыцягвалі ўвагу Агінскага. У 1766 годзе ён набыў маёнтак Нябораў, што знаходзіўся непадалёку ад Варшавы. Ва ўладанні яго перайшоў і тамашні замак. Відаць, Міхал Казімір хацеў ператварыць Нябораў у сваю галоўную рэзідэнцыю, бо пачаў шматлікія рэстаўрацыйныя работы. Гэта тычылася і паляпшэння знешняга выгляду замка, і ягонага ўнутранняга аздаблення.

Рукі да Слоніма пакуль не даходзілі і па іншай прычыне. Неяк незаўважна ўсё больш пачаў цікавіцца палітычным жыццём. Актывізацыя падобных яго памкненняў

стала ў многім вынікам перажытага пасля таго, як не змог заняць каралеўскі трон (што ён не "падыходзіў" для Агінскага, іншая справа). Цяпер хацеў хоць у нечым навярстаць упушчанае. А яшчэ на гэта паўплывала правядзенне Панятоўскім пры пастаянным націску Кацярыны II прарасійскай палітыкі, што Агінскаму не падабалася.

Аднак пакуль трымаўся крыху абасоблена, не шукаючы саюзнікаў. І толькі тад, калі пераканаўся, што адзін мала што можа зрабіць, далучыўся да ўдзельнікаў Барскай канфедэрацыі — ваенна-палітычнага аб'яднання часткі польскай шляхты і некаторых магнатаў Рэчы Паспалітай для барацьбы супраць Панятоўскага і Расіі.

Гэты рух якраз і ўзмацніўся, стаў больш уплывовым якраз пасля таго, як Міхал Казімір 7 верасня 1771 года апублікаваў свой маніфест аб падтрымцы канфедэратаў. І словы Агінскага не разыйшліся са справай, бо заўсёды, калі за нешта браўся, прывык дзейнічаць рашуча. Са сваім войскам смела рушыў на расійскія пазіцыі. Чым нямала здзівіў. Наўрад ці хто-небудзь нават з бліжэйшага акружэння вялікага гетмана верыў у поспех, бо дагэтуль Міхалу Казіміру, не лічачы поспеху пад Волчынам, не даводзілася ўдзельнічаць у сур'ёзных баявых аперацыях.

Не ўспрынялі ўсур'ёз ягоны намер і самі канфедэраты. Дый у распалажэнні рускіх войск спакойна паставіліся да ўсяго. І зрабілі непапраўную памылку, бо адбылося, здавалася б, немагчымае: Агінскі пад Бездзежам разбіў праціўніка.

Усё ж Міхал Казімір быў улюбёнцам лёсу. Калі не шанцавала яму, дык у асобных выпадках, а так часта ішоў па жыцці не надта абцяжарваючы сябе намаганнямі, робячы ўсё лёгка і эфектна. Але бяда ў тым, што калі яго нечакана напаткоўваў які-небудзь поспех, часта станавіўся падобным на глушца, які, спяваючы, да таго захапляецца, што нічога навокал не заўважае і з-за гэтай адчужанасці можа трапіць у небяспеку.

Падобная сітуацыя назіралася і пасля ўдалага разгрому Агінскім расійскага войска. Іншы б на месцы Міхала Казіміра, радуючыся такой бліскучай перамозе, зрабіў бы ўсё магчымае, каб, падначаленыя яму людзі, перажываючы эйферыю ад такога поспеху, не забывалі, што наперадзе будуць іншыя, пры тым больш цяжкія баі, да якіх трэба старанна рыхтавацца, каб не быць разгромленымі. А што ў хуткім часе неабходна чакаць сутычкі, сумнявацца не даводзілася. Але Агінскі нічога гэтага рабіць не збіраўся. Ведама які быў з яго стратэг. А да ўсяго, як і падначаленых, ап'яняючае ўсведамленне, што ім спадарожнічае сама фартуна, настолькі авалодала ім, што па сутнасці забыўся аб усім на свеце. Нават забыўся аб усякай асцярозе і лагера не была выстаўлена належная варта.

Праціўнік жа не драмаў. Дый разведка ў рускіх вялася належным чынам. таму данясенні яе пацвердзілі, што сапраўды Агінскі, хоць і мае званне генерал-маёра, у ваеннай справе разбіраецца слаба і цяжка сказаць, як яму пад Бездзежам удалося перамагчы. У далейшым жа яго не толькі не трэба асцерагацца, а і неабходна хутчэй узяць ініцыятыву ў свае рукі.

Непадрыхтаванасць Міхала Казіміра да вядзення далейшых баявых дзеянняў, а таксама ягоную бесклапотнасць і выкарыстаў Суворaў, атрады якога ў ноч з 22 на 23 верасня 1771 года акружылі войска вялікага гетмана пад Сталовічамі і цалкам

разграмілі іх. Самому Агінскаму, праўда, удалося ўцячы. І гэтым разам яму, калі можна так сказаць ў дачыненні да сітуацыі, што склалася, пашанцавала. Паспеў выскачыць праз вакно, калі хату, у якой знаходзіўся, акружалі расійскія салдаты.

Магчыма, яны не прынялі пад увагу, што гетман можа кінуцца ў вакно, таму сачылі за ўваходам. А магло стацца і так, што не здагадваліся аб яго знаходжанні там, таму асаблівай асцярогі і не праявілі.

Па некаторых звестках Міхал Казімір у гэты момант быў у адных сподніках, бо, няблага правёўшы час з каханкай, моцна і бяспечна спаў з ёю ў ложку, а таму не чуў ні выстралаў, ні крыкаў і толькі калі салдаты былі зусім блізка прачнуўся і, цалкам не ўцяміўшы, што і да чаго, кінуўся ў вакно.Пагаворвалі і аб тым, што якраз у час наступлення Суворава, на Агінскага найшло чарговае творчае натхненне, таму з вялікім задавальненнем пісаў ... оперу. Захапіўшыся так, што забыўся, дзе знаходзіцца.

Абодва варыянты праўдападобныя, бо абодва маюць пад сабой глебу. Калі Міхал Казімір аддаваўся свайму першаму, ці другому захапленню, для яго сапраўды больш нічога на свеце не існавала. І. вядома ж, ніхто ў гэты момант не мог патрывожыць яго.

Адзінае, што заставалася Агінскаму пасля разгрому пад Сталовічамі, гэта — уцячы як мага далей, дзе яго не змогуць знайсці. Гаворкі ж пра тое, каб сабраць сваё войска, якое ў паніцы таксама разбеглася, не магло ісці А ўратаванне для Міхала Казіміра існавала адно: падацца за мяжу, а там ужо, ведаючы, што Кацярына II яго не дастане, супакоіўшыся, вырашыць, як быць далей.

За мяжу накіраваўся праз Кёнігсберг. Ды не быў бы Агінскі Агінскім. Хоць і паводзіў сябе, як звычайны палахлівец, пра што, дарэчы. адразу ж стала вядома ў вышэйшых колах Рэчы Паспалітай, калі прыйшоў у сябе, стараўся трымацца, наколькі гэта магчыма, годна, таму ў адным з лістоў так падаў сваё паражэнне: «Усё я страціў: грошы, рэчы і паперы, але ніколі не страчу стойкасці, мужнасці і мкнення да абароны краіны».

Толькі ні для кога не з'яўлялася сакрэтам, што за падобнымі развагамі — нішто іншае, як боль сэрца, а яшчэ закранутае самалюбства і ўсё гэта Міхал Казімір спрабаваў хоць неяк прытупіць напышлівымі словамі. А душэўных пакут яму ставала. Асабліва пасля таго, як пагардліва паставілася да яго Кацярына II. І так Агінскага за вочы, пра што не мог не ведаць, называлі няўдалым каханкам расійскай імператрыцы, а тут адбылося тое, што яшчэ больш падахвоціла нядобразычліўцаў кпіць з яго.

Калі Міхал Казімір знаходзіўся ў Кёнігсбергу, аднойчы паведамілі, што Кацярына II падрыхтавала яму падарунак, які неўзабаве перададуць. Вельмі здзівіўся, бо даўно паміж імі прабегла чорная кошка. Дый пра які падарунак ад расійскай імператрыцы можа ісці гаворка пасля таго, як прымаў удзел у баявых дзеяннях супраць Расіі. Аднак не адмовіўся атрымаць яго. Звычайная цікаўнасць узяла верх. Дый, відаць, спадзяваўся, што, магчыма, Кацярына II (чаго не бывае!) змяніла свой

гнеў на літасць і выбрала менавіта такі момант, калі яму асабліва цяжка і не стае падтрымкі.

Ды калі пабачыў падарунак, ад абурэння ледзь не вылаяўся. Ніхто дагэтуль яго так не абражаў: у маленькім пакуначку, які перадалі яму, знаходзілася парфума, а ў дадатак атрымаў ад імператрыцы некалькі музычных інструментаў. Падтэкст быў відавочны. Нагадвала, што не мужчына, а звычайная баба. Напамінала, каб займаўся сваёй музыкай, іграў на скрыпцы і флейце і не лезь у палітыку. Не твая гэта, маўляў, справа. Моцныя, валявыя там патрэбны, а ты...

Пасля гэтага ён прасякнуўся яшчэ большай нянавісцю і да Расіі, і да той, хто з'яўляўся яе ўвасабленнем. Але як адпомсціць і за гэтую знявагу, як і за аплявухі, што атрымаў, калі быў адлучаны ад царскага двара? Як адплаціць за паражэнне пад Сталовічамі? Выйсце бачыў у адным: неабходна знайсці тых, хто згодзіцца паслаць на дапамогу канфедэратам войскі. Таму і пачаў весці наконт гэтага перамовы.

Але ні ў Берліне, ні ў Вене так і не знайшоў паразумення. Пасля гэтага ўскладаў немалыя садзяванні на сустрэчу з Людовікам VI. Аўдыенцыі з ім дамогся 6 жніўня 1772 года, аднак і яна нічога канкрэтнага не дала, усё абмежавалася агульнымі развагамі, але Міхалу Казіміру не развагі былі патрэбны, а канкрэтныя дзеянні. І чым хутчэй, тым лепш.

Становішча станавілася ўсё больш безнадзейным. І чым пакутлівей абдумваў сітуацыю, у якой апынуўся, тым больш схіляўся да высновы, што яму нічога не застаецца, як паспрабаваць наладзіць масты, якія сам жа спаліў. А дапамагчы ў гэтым, канечне ж, можа Панятоўскі, які з'яўляецца для Расіі сваім чалавекам, а і знаходзіцца ў блізкіх стасунках з Кацярынай, таму яна не толькі ўплывае, а ў некаторых выпадках і прыслухоўваецца да ягоных меркаванняў. А значыць Станіслаў Аўгуст можа паўплываць на імператрыцу адносна яго, Агінскага лёсу. Таму і пачаў з Панятоўскім перапіску, у лістах да якога выказваў жаданне пайсці на пэўны кампраміс.

Адчуўшы, што Станіслаў Аўгуст да ягоных прапаноў паставіўся празмерна спакойна, не сумняваўся ў боязні караля прымаць якое-небудзь важнае рашэнне, не параіўшыся з Кацярынай II. А што ў сваіх здагадках не памыліўся, пераканаўся, калі ў чарговым адказе Панятоўскі запатрабаваў ад яго поўнага адмаўлення ў далейшым ад якой бы там ні было барацьбы. Безумоўна, сам Станіслаў Аўгуст прад'явіць яму ледзь не ўльтыматум не мог. Не такі смелы, бо ведае, хто перад ім. Папярэдне параіўся з Кацярынай II, а тая і паставілася да ўсяго належным чынам.

Але ад усведамлення гэтага лягчэй не станавілася. Поўнасцю здавацца ён, праўда, не хацеў, але з атрыманнем гэтага запатрабавання Панятоўскага яшчэ раз упэўніўся, што апынуўся ў тупіку, у які сам сябе і завёў і з якога не бачылася ніякага выйсця. А каб выжыць, яго трэба было абавязкова знайсці. Грошы заканчваліся, на чыю-небудзь фінансавую падтрымку разлічваць не даводзілася. І ў гэты момант ён гатовы ўжо быў пайсці на любую авантуру.

І трэба ж так надарыцца, што якраз цяпер, калі жыццёвы небасхіл апальнага вялікага гетмана не проста завалаклі свінцовыя хмары, а такія, што гатовыя

разрадзіцца ўдарамі маланкі, на ягоным шляху сустрэлася адна з тых жанчын, напаткаўшы якіх, Міхал Казімір адразу губляў галаву.

Маладая, прыгожая, разняволеная ў паводзінах, яна з першай жа сустрэчы лёгка пакарыла сэрца шчадралюбнага Агінскага. Можна толькі здагадвацца, якія ласкавыя словы гаварыў ёй Міхал Казімір — на кампліменты ён быў мастак.А калі яшчэ даведаўся, што Алі Амета — так звалі гэтую красуню — цудоўна іграе на арфе, хораша малюе і з'яўляецца неблагім знаўцам архітэктуры, дык Агінскі гатовы быў пайсйці за ёй хоць на край свету.

Аднак, як высветлілася, ўвесь свет Амету не цікавіць, а толькі Расія. Тая Расія, якую гэтак ненавідзеў Міхал Казімір. Не сказаць, праўда, каб яе асабліва любіла і Амета, але яна, у адрозненні ад Агінскага, проста не магла жыць без гэтай краіны, бо менавіта з ёю звязвала сваю шчаслівую будучыню.

Міхал Казімір і не здагадваўся, што перад ім была тая самая авантурыстка Алі Амета, якая больш вядомая як княгіня Вальдамірская, а ў гісторыю ўвайшла пад прозвішчам Тараканавай.

У адрозненні ад Аметы ён хоць і з'яўляўся ў душы авантурыстам, усё ж разважаў крыху больш цвяроза, таму і не падтрымаў яе намераў авалодаць царскай каронай. А мо таму і не падтрымаў, што гэтая самая карона «чакала» яго новую знаёмую менавіта ў Расіі, а ў Расіі яму самому нішто не свяціла. Нават карона.

Што дзіўна, дык тое, што ва ўзаемаадносінах з Аметай абмежаваўся звычайным знаёмствам, а пасля перапіскай. Гэта так не падобна на Агінскага, які заўсёды з жанчынамі, што падабаліся яму, дзейнічаў рашуча. І, бадай, за выключэннем Кацярыны II, ніколі не цярпеў паражэння.

Але падобныя паводзіны няўдалага палкаводца няцяжка апраўдаць, калі прыняць пад увагу, што ён, лёгка паверыўшы ў тое, што ў Аметы ў Персіі знаходзяцца мільённыя багацці, хацеў за яе кошт паправіць сваё фінансавае становішча. Верыў, Міхал Казімір і ў тое, што яна і-княжацкага паходжання. А апёкшыя на імператрыцы, асцярожна ставіўся і да «княжны».

Разумеў: каханку, пры жаданні, заўсёды можна знайсці, а мільёны на дарозе не валяюцца. Таму і хацеў атрымаць ад Аметы як мага большую прыхільнасць, выстаўляючы сябе ў ролі сур'ёзнага мужчыны, стаўленне якога да багатай жанчыны самае паважлівае. Дзеля гэтага пайшоў нават на тое, каб нейкаму Эмбсу, які суправаджаў «мільянершу» і інакш, як «баронам», сябе не называў, прысвоіць званне афіцэра літоўскага войска.

Багацця аднак ад гэтай авантурысткі не атрымаў, узаемнасці хутчэй за усё не меў, інакш наўрад ці заставаліся б іхнія ўзаемаадносіны на мяжы звычайнага сяброўства. Дый хутчэй патрэбен быў Амеце толькі для таго, каб дапамагчы ў авалоданні царскай кароны. А няма кароны — няма і мільёнаў.

Раставаліся без асаблівага шкадавання, бо абодва цудоўна разумелі, што не каханне звяло іх разам, а жаданне кожнага атрымаць ад гэтага знаёмства як мага значную выгоду.Хоць Агінскі адчуваў сябе куды ў больш незайздросным становішчы,

чым яго новая знаймая. Прыкра станавілася ад таго, што яго без асаблівых цяжкасцяў абвяла вакол пальца звычайная авантурыстка. Сябе ж, вядома, авантурыстам ён ніколі не ўспрымаў.

Калі што і заставалася, дык, забыўшы ўсе крыўды і суняўшы хоць крыху самалюбства, вяртацца на Радзіму. Што будзе, тое і будзе. Адкладваць надалей ад'езд не выпадае.

У канцы 1774 года і падаўся назад, па сутнасці едучы ў невядомасць, бо ніякіх гарантый адносна свайго будучага лёсу не меў.

Радзіма ж спаткала Міхала Казіміра няветліва. Ды і як яшчэ магла сустрэць, калі пакідаў яе як палахлівы ўцякач, а вяртаўся ў няменш прыніжаным стане. Ды трэба было не звяртаць увагі на гэта, думаць, як і на што жыць. Адчуваючы фінансавыя цяжкасці, прадаў Нябораў сваёй пляменніцы і яе мужу. Цяжка было развітацца з маёнткам, у які ўклаў столькі грошай і працы, аднак іншага выйсця не заставалася, бо яго ўладанні, што знаходзіліся за рускай мяжой, секвесціравалі, а потым і ўвогуле канфіскавалі — так Кацярына II пакарала Агінскага за выступленне супраць Расіі. Для паляпшэння фінансавага становішча мусіў і частку сваіх маёнткаў прадаць пляменніку Міхалу Клеафасу Агінскаму.

Адабраныя ж уладанні спрабаваў вярнуць. Каб дабіцца праўды, звяртаўся і да самой імператрыцы, і да іншых уплывовых асоб, але гэта нічога не дало. Давялося задавальняцца тым, што засталося. У гэты, вельмі цяжкі і неспрыяльны для яго час, і вырашыў зрабіць Слонім сваёй галоўнай рэзідэнцыяй, а таксама ператварыць яго ў сапраўдную «сядзібу музаў».

Дзеля гэтага і пачаў прымаць захады па далейшаму добраўпарадкаванню маёнтка, а таксама па ўзвядзенню новых будынкаў, найперш для культурных патрэб. У шэрагу першаступенных планаў Міхала Казіміра было і будаўніцтва асобнага тэатральнага памяшкання, у якім маглі б ставіцца оперныя спектаклі, так званага «Опергаўза».

Для ажыццяўлення сваёй задумы запрасіў вядомага італьянскага дэкаратара Іначэнца Мараіна, які апроч гэтага праславіўся і як выдатны архітэктар па ўзвядзенню тэатральных будынкаў. Мараіна, азнаёміўшыя з ваколіцамі замка, заявіў, што найлепшае месца для «Опергаўза» — участак за замкам, поруч з ракой.

З такой прапановай Агінскі пагадзіўся і 21 красавіка 1780 года падпісаў з Мараіна кантракт. Пасля гэтага і пачаліся будаўнічыя работы, якія вяліся вельмі хутка. Ва ўсякім разе, калі чакалі візіту ў Слонім Панятоўскага, які адбыўся ў верасні 1784 года, яны былі ўжо практычна закончаны і толькі сёе-тое даводзілі да ладу, каб яшчэ больш ўразіць саноўнага госця. Праўда, рабілася гэта ў адсутнасці Агінскага, не было яго і ў час візіту караля.

Панятоўскі пабачаным застаўся задаволены, бо і сапраўды тэатр уразіў. А як выглядаў «Опергаўз», сёння можна даведацца па тых сведчанных, што дайшлі да нашых дзён. Праўда, запісы рабіліся несістэмна і з рознай нагоды, пры тым рознымі аўтарамі і ў розны час, але ўсё ж малюнак атрымліваецца даволі пераканаўчым.

Паколькі тады ў Вялікім княстве Літоўскім асабліва славіўся Радзівілаўскі тэатр, дык слонімскі міжволі параўноўвалі з ім. Гэтае супастаўленне, праўда, было не на карысць таму, які узвёў Мараіна, бо ёнз'яўляўся ў два разы меншым за нясвіжскі, які меў не двухярусныя, а чатырохярусныя ложы. Але гэта ніякім чынам не паўплывала на ўнутранае аздабленне.

У кожнай ложы, як і ў лепшых тагачасных тэатрах, паслалі паркетную падлогу і ўстанавілі камін. Каралеўскую ж упрыгожваў картуш з гербам караля. Для асвятлення памяшкання выкарыстоўваліся некалькі раскошных крыштальных люстраў, а таксама мноства свяцільнікаў, размешчаных ля сцен. На саміх жа сценах знаходзіліся спецыяльныя свяцільнікі з падтаўкамі.

Для таго, каб можна было ставіць спектаклі, найлепш набліжаныя да самога жыцця, былі ўзяты на ўзбраенне найноўшыя для таго часу тэхнічныя сродкі, якія дазвалялі лёгка мяняць дэкарацыі, а пры неабходнасці «выводзіць» на сцэну нават сапраўдныя караблі. Дзеля гэтага яна была падзелена папалам. Пярэдняя частка, як і традыцыйна ў тэатрах, выкарыстоўвалася па свайму непасрэднаму прызначэнню, на ёй ігралі акцёры.

Задняя ж пры неабходнасці лёгка запаўнялася вадой. Ажыццяўлялася гэта праз сістэму труб, што праходзілі да самых тэатральных падмосткаў. Паступала ж вада з сажалкі, што знаходзілася непадалёку ад будынка. Гэтая частка сцэны аказвала добрую паслугу і тады, калі па ходу спектакля разгортваліся баявыя дзеянні, ці неабходна было паказаць войскі на маршы. У гэтым выпадку ваду спускалі, а зверху клалі тоўстыя шчыты. З тыльнага ж боку сцэны адкрывалася вялізная брама, пра з якую магла ўварвацца кавалерыя ці прайсці пяхота.

У рэшце рэшт у гэтым нічога новага не было. Штосьці падобнае можна было назіраць і ў іншых тэатрах. І не толькі ў тых, што працавалі на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, а і ў Польшчы, замежных краінах. Прынамсі, сваім хуткім пераабсталяваннем сцэны славіўся венскі. Але такое параўнанне служыць толькі на карысць таму, што Агінскі ў сваіх тэатральных памкненнях не шкадаваў грошай і арыентаваўся на лепшыя сусветныя дасягненні.

Як і шмат рабіў для таго, каб у яго рэзідэнцыі працавалі таленавітыя акцёры, танцооўчыкі, музыканты, а іх патрабавалася нямала, бо ставіліся оперныя і балетныя спектаклі з немалым прыцягненнем дзейных асоб, шматлікім па колькасці выканаўцаў быў і слонімскі аркестр. Некаторыя даследчыкі называюць яго лічбу ў 53 чалавекі, а гэта толькі спецыялісты вакальнай і інструментальнай музыкі. Дырыжорамі з'яўляліся канцэртмайстар Юзаф Паўлі і капельмайстар Алясандра Данесі, які ў тэатры Агінскага сфарміраваўся як выдатны знаўца сваёй справы, але асабліва праславіўся пазней, калі пачаў працаваць у Нясвіжы.

Італьянцамі па паходжанню былі і асобныя спевакі. Прынамсі, некалькі месяцаў у Слоніме выступала італьянская прымадонна Ганна Давія дэ Бернуцці, якая стала чарговай каханкай Міхала Казіміра. Яны пазнаёмілія падчас яе гастроляў у Варшаве ў 1776 годзе. І хутка зблізіліся. Амурныя справы не перашкодзілі Агінскаму прыняць і

канкрэтныя захады, звязаныя з ягоным тэатрам. Ганна пайшла яму насустрач і дала згоду на працягу трох гадоў жыць у Слоніме. Зразумела, пастаянна выходзячы на сцэну. Дамова наконт гэтага завяршылася кантрактам, падпісаным 1 сакавіка 1777 года. Ды, мабыць, паміж любоўнікамі прабегла чорная кошка, бо Бернуцці, як хутка прыехала ў Слонім, так хутка і пакінула яго.

Сярод дырыжораў, інструменталістаў Слонімскага тэатра сустракаліся і немцы, чэхі, а гэта гаворыць аб тым, што Міхал Казімір ахвотна шукаў лепшых спецыялістаў за мяжой. Часам запрашаў да сябе і прафесійных музыкантаў з Ружан ці Нясвіжа. Аднак многія аакцёры, танцоўчыкі музыканты рыхтаваліся з таленавітых юнакоў і дзяўчат, якіх гетман шукаў у навакольных вёсках, а таксама ў іншых сваіх уладаннях, а затым пасылаў на вучобу.

Якк вядома, Агінскі быў не толькі выдатным арганізатарам, а чалавекам, па сапраўднаму захоплены музыкай, тэатрам, таму ён не мог стаяць у баку ад таго шматграннага мастацкага жыцця, што, дзякуючы ягоным намаганням, і сапраўды ператварыла ціхі правінцыйны гарадок у «сядзібу музаў». Менавіта у гэты, слонімскі перыяд у жыцці Міхала Казіміра і з'явілася мянушкі, на якую ён не крыўдзіўся.

Ды і як крыўдзіцца было, калі амаль штодзённа ці то іграў сольную скрыпку ў сваім аркестры, ці то выконваў партыю ў яго суправаджэнні. Часам «гетман-кларнет» адважваўся нават на цэлы канцэрт і прысутныя віталі яго выступленне дружнымі воплескамі. І не за павагі да яго, як гаспадара рэзідэнцы, а гэтак аддзячвалі яму за высокае майстэрства. Не ў апошнюю чаргу скрыпічнае, бо ёсць звесткі, што ён браў урокі ў самога Джвані Бацісты Віёці, калі той знаходзіўся ў Рэчы Паспалітай пры каралеўскім двары. Былі гледачы і ў захапленні тады, калі на сцэне ажывалі вобразы ў спектаклях, да якіх Агінскі меў дачыненне, як аўтар музыкі.

Хуткаплынны час зрабіў сваю справу і сёння цяжка дакладна сказаць, якія канкрэтна творы былі напісаны самім Міхалам Казімірам, а якія народжаны фантазіяй ягонага пляменнніка, аўтара знакамітага паланеза «Развітанне з Радзімай» Міхала Клеафаса Агінскага. Часам сёе-тое з мастакоўскай спадчыны апошняга прыпісваецца першаму, нярэдка аўтарства асобных паланезаў, якія бытавалі тады (гэты музычны жанр быў вельмі распаўсюджаны) увогуле не ўстаноўлена.

Няма пэўнасці і наконт опернай музыкі Міхала Казіміра. Многія сыходзяцца толькі ў тым, што ён аўтар лібрэта і музыкі да оперы «Елісейскія палі, якая была пастаўлена ў Слоніме ў 1788 годзе і адразу ж увайшла ў другі том "Баек і не баек"» Міхала Казіміра. Не адмаўляецца і яго аўтарства музыкі да оперы «Цыгане» (лібрэта Ф. Князніна). Не выклікае сумнення, што Міхал Казімір напісаў і оперу «Зменены філосаф». На карысць гэтага, які мяркуе Цеханавецкі, сведчыць і вершаваная прадмова да яе:

Польская опера. Пэўна, праца таго
Чалавека, які поўнасцю сябе бацькаўшчыне прысвяціў.
Бо ён не толькі здзейсніў вялікія спправы,
Але ён прыдаў яшчэ большы бляск тым,
Што дабрачыннасць уславіў, а заганы выкрыў.

(Пераклад Уладзіміра Сакалоўскага)

Дакладна немагчыма сказаць і якія кнігі выдаў Агінскі. Калі наконт ягонага аўтарства «Баек і не баек» сумненняў няма, а тым больш — «Гістарычных і маральных аповесцяў, напісаных грамадзянінам са Слоніма», дык нельга адназначна паставіцца да «Кніжкі ў вялікую актаву». А тым больш да некалькіх паэтычных твораў. Яны хутчэй прыпісваюцца Міхалу Казіміру, як і пераклады п'ес Кацярыны II «Ашуканец» і «Імяніны пані Варчалкінай».

Адно несумненна: да ўсяго Агінскі яшчэ валодаў і дзівосным талентам арганізатара, меў гаспадарскую жылку. У Слоніме апроч тэатра стварыў таксама некалькі прадпрыемстваў, заснаваў друкарню. Але, безумоўна, асабліва праславілі яго слонімскі аркестр і опера. І водгукі сучаснікаў, якія дайшлі да нас, пацвярджаюць, што падобныя цуды не часта можна ўбачыць.

Уражанне многіх, хто наведваў тады Слонім (і несумненна — найперш сваё) найлепей перадаў у панегірыку «Да Агінскга, Вялікага Гетмана Літоўскага» Каятан Вянгерскі:

Калі між вамі генія няма,
Хай хоць на момант хто спусціцца ў Слонім.
Ён ветлівей, чым у доме Лота, напэўна, будзе там прыняты,
Адчуўшы сорам, што спяваў: святы, святы. святы,
А музыку зямную, параўноўваючы са сваім хорам,
Не ведаю, ці ён не стане неба дэзерцірам.
Агінскі! Перш чым анёл прыйдзе цябе наведаць,
Мушу яго я, пэўна, шчыра папярэдзіць.
І мушу быць хоць раз у жыцці шчаслівым:
Бачыць цябе ў Слоніме і цуды ўсе тыя,
У якіх знойдуць асалоду анёлы і святыя,
Каб у пекных рыфмах памяць вечную пакінуць.

(Пераклад Уладзіміра Сакалоўскага)

Памяць аб сабе Міхал Казімір пакінуў і дзякуючы штучнай воднай артэрыі, збудаванай ім на Палессі, якая носіць назву канал Агінскага, Вялікі Пінскі канал, Порт Агінскага. Правільней насіла, бо сёння гэтая частка воднага шляху з дняпра ў Нёман, якая злучае прыток Прыпяці Ясельду і Шчару (прыток Нёмана) і складае з Выганаўскім возерам 54 кіламетры, не суднаходная, а калі і прыгадваюць яе, дык у асноўным мясцовыя жыхары, звесткі пра канал Агінскага можна напаткаць толькі ў даведніках, а таксама ў спецыяльнай літаратуры.

Марыў аб гэтым штучным водным шляху яшчэ Багуслаў Радзівіл, які ў сваёй «Інфармацыі дамашняй і палітычнай» —свайго роду запавеце, пакінуў і такі запіс: «Калі б хто з нашчадкаў маіх хацеў бы пакінуць па сабе памяць, то няхай закончыць ці

распачне тое, што я хацеў паспрабаваць, а менавіта Днепр з Нёманам злучыць праз раку Лошу. Запэўніваю, што ён зробіць справу, вартую памяці».

Гэтую ідэю канкрэтызаваў пінскі мечнік і гарадскі суддзя Марцін Бутрымовіч, які з 1767 года быў блізкім да двара Міхала Казіміра, а потым арандаваў частку ягоных маёнтках. Безумоўна, і сам Агінскі разумеў, што пабудова гэтага канала адкрые шырокія магчымасці для экспарту лесу, а таксама іншых тавараў праз балтыйскія парты. Сваімі планамі ён падзяліўся на Варшаўсакім сейме 1768 года. Сейм не толькі падтрымаў прапанову Міхала Казіміра, а нават падарыў яму мястэчка Лагішын і вёску Мышкоўцы з прылеглымі землямі, а на перспектыву дазволіў спаганяць мыта «па 8 злотых з вясла ці ад спіцы».

Работу на будаўніцтве канала праводзіліся з перапынкамі, што было звязана з адлучкамі Агінскага за мяжу, асабліва калі ён знаходзіўся ў эміграцыі. Але справа паступова рухалася. Важна і тое, што не засталіся ў баку ад будаўніцтва і дзяржава. За яе кошт ачышчаліся рэкі, у тым ліку і Нёман, прыводзіліся ў парадак прылеглыя дарогі.

У 1775 годзе, хоць канал і не быў яшчэ цалкам добраўпарадкаваны, сейм аб'явіў аб пачатку сплаву. Не спыніліся работы і пасля таго, як гэтая тэрыторыя далучылася да Расіі, бо новыя ўлады таксама разумелі важнасць такой воднай артэрыі. Былі нават прыцягнуты афіцэры Генеральнага штаба, якія праводзілі інструментальныя здымкі, ажыццяўлялі рэкагнасцыровачныя работы, прамервалі глыбіню канала, правяралі яго прапусную здольнасць. А поўнасцю канал уступіў у строй толькі ў 1804 годзе і меў 10 шлюзаў...

Упарадкаванне «сядзібы музаў», працяг будаўніцтва канала, пракладванне дарог праз палескія балоты, забірала няма часу. З-за гэтага Агінскі на некаторы час адышоў ад актыўнага грамадскага жыцця, але гэта не значыць, што заставаўся пасіўным назіральнікам працэсаў, што адбываліся ў краіне і за мяжой.

Не парываў сувязі з масонскай ложай, у якую, мабыць, уступіў яшчэ пад час свайго першага наведвання Францыі. І нават спрыяў распаўсюджванню гэтага руху, за што на агульным сходзе прадстаўнікоў масонскіх ложаў, які прысвячаўся гэтай праблеме, 27 снежня быў выбраны «Дэпутаваным вялікім майстрам правінцыі Літва».

Зрабіў працяглую паездку за мяжу, наведаўшы некалькі краін. Нямала, у прыватнасці, дало яму знаходжанне ў Англіі, дзе далучыўся не толькі да багатай культуры, а і знаёміўся з развіццём прамысловасці. Паездка, відаць, паспрыяла таму, што ў хуткім часе наладзіў габеленавую і дывановую вытворчасць у Слоніме, пабудаваў фаянсаавую фабрыку ў Целеханах, бо ў англічан шмат чаму навучыўся.

І яшчэ меркаваў, што хоць неяк удасца аслабіць расійскі ўплыў. Пэўныя спадзяванні ў сувязі з гэтым ускладаў на Прусію, бо знаходзіўся ў някепскіх адносінах з Фрыдрыхам Вільгельмам II, з якім быў добра знаёмы па масонскай ложы. Марыў аб заключэнні саюзу з Прусіяй, што дазволіць павялічыць войска, якое б знаходзілася ў яго рапараджэнні, як вялікага гетмана літоўскага.

У Берліне ж да ўсяго паставіліся холадна, бо не хацелі абвастраць адносін з Расіяй А тут яшчэ ўзнікла Таргавіцкая канфедэрацыя — саюз магнатаў Рэчы Паспалітай, якія пераканаліся ў бесперспектыўнасці далейшага супрацьстаяння з

Расіяй. Акт гэтай канфедэрацыі назваў расійскія войскі сяброўскімі. Да яе Агінскі не далучыўся, але 6 ліпеня 1793 года склаў з сябе гетманскія паўнамоцтвы на карысць пляменніка. Ды Міхал Клеафас вялікім гетманам так і не ўстаў, бо ўмяшаўся расійскі генерал Я. Сіверс.

Добраахвотнае адмаўленне ад гетманства можна расцэньваць, як не жаданне Міхала Казіміра несці хоць якую-небудзь адказнасць за Таргавіцкую канфедэрацыю. Але ўсё ж да падобнага яго ўчынку нельга паставіцца адназначна, бо, ідучы на такі крок, Агінскі меў і матэрыяльную выгоду. У якасці свайго роду кампенсацыі пляменнік заплаціў свайму дзядзьку 300 тысяч злотых. Дый з канфедэратамі Міхал Казімір падтрымліваў цесныя сувязі, а з некаторымі і пасябраваў. Кіраўніку ж іх Шчаснаму Патоцкаму нават наладзіў урачысты прыём у Седльцах.

Але чыста па-чалавечы Агінскага можна зразумець. Наблізілася старасць, а з ёй прыйшлі хваробы. Дый пераканаўся, што ад яго ўжо мала што залежыць, бо адзін у полі — не воін. Таму і хацеў знаходзіцца далей ад палітычнай барацьбы, якая паступова ўсё далей адыходзіла ў бок ад агульнадзяржаўных інтарэсаў, а тычылася задавальнення амбіцый асобных магнатаў.

Калі што і радавала яго яшчэ, дык ранейшае захапленне музыкай. Яна стала для Міхала Казіміра духоўнай аддушынай і ў час паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Ккасцюшкі. А яшчэ ўсцешвала сяброўства з Гайднам, які з разуменнем паставіўся да ягонага таленту, падказваў тэмы новых твораў.

Калі адбыўся Трэці падзел Польшчы, Агінскаму, як ні цяжка было яму адважыцца на падобны ўчынак, нарэшце прысягнуў на вернасць Кацярыне II, ды ўсё адно мала што змяніла што ў ягоным жыцці. Імператрыца ўсё адно канфіскавала Слонім, вырашыўшы размясціць там губернскія ўлады і адмяняць сваё рашэнне не збіралася. Гэта ажыццявіў толькі Павел I. Дапамог і даўні знаёмы Рэпнін, якія вярнуў яму частку даходаў ад Пінскай эканоміі. Нарэшце, удалося атрымаць назад маёнткі, у свой час прададзеныя Міхалу Клеафасу.

Фінансавае становішча палепшылася, аднак гэта прынесла мала радасці, бо ўжо даўно не быў тым маладым і прыгожым мужчынам, які любіў жанчын, амурныя прыгоды. А на ўсё патрабаваліся грошы. Шмат грошай. І ён іх ніколі не шкадаваў. На жанчын і на музыку, на мастатцва.

Музыка па-ранейшаму і заставалася тым адзіным, што хоць крыху прыхарошвала аднастайнае жыццё некалі бравага «гутмана-кларнета», які бавіў свае апошнія дні (памёр Міхал Казімір 31 мая 1800 года) ў маёнтку Галенаў і толькі зрэдку наведваўся ў Варшаву, пасяляўся ў ёй на вуліцы Рымарскай у палацы, які атрымаў у спадчыну ад сваёй цёткі Ганны Агінскай. Каб паехаць куды-небудзь далей, не ставала сіл, таму больш так і не наведаўся ў Слонім, а калі б і прыехаў, то ад пабачанага яшчэ больш самотліва стала б у яго на душы.

Яшчэ нядаўна выдатны архітэктурны комплекс, цудоўны тэатр, якія прыцягвалі ўвагу многіх і куды нават наведваліся шматлікія замежныя госці, паступова разбураліся, бо да іх нікому не было ніякай справы. А старадаўні парк прыходзіў у

запусценне. Вароны ж, якія гнездаваліся на векавых дрэвах, агалошваючы сваімі крыкамі наваколле, выклікалі ў душы, асабліва восенню, калі і так было ёй балюча-тужліва, гнятлівыя думкі. Асабліва назойлівым станавілася ўсведамленне ад таго, што нічога вечнага няма на гэтай зямлі і самая пекная прыгажосць з гадамі блякне, а найлепшыя людскія пачынанні бясследна знікаюць, як адыходзіць у нябыт і ўсё жывое. Калі што і ўсцешвала, дык тое, што яно дае працяг у сабе падобных. А следам зноў наступалі журботныя думкі: зробленае ж людзьмі апантанымі, на жаль, далёка не заўсёды знаходзіць сваіх належных прадаўжальнікаў...

Падобныя думкі не пакідалі і Міхала Казіміра. І тады ён браў у рукі старую скрыпку, што яшчэ памятала ягоныя чуйныя пальцы. Яны ў яго ўжо страцілі былую гнуткасць, часта балелі, але калі пачынаў іграць гэтага не заўважаў. І стараўся гэтаксама, як і раней, упэўнена трымаць смычок, што лёгка кратаўся струн. І толькі мелодыя, якая нараджалася ад судакранання, была куды больш самотлівая, а часам і зусім нейкая жаласлівая, нібыта і струнам станавілася балюча, як і ягонаму сэрцу.

Балюча па тым, што адышло ў нябыт.

Балюча ад усведамлення, што жыццё заканчваецца...